Хроніка парушэньняў правоў чалавека
ў Віцебскім рэгіёне

# ШЭРАЯ КНІГА

**студзень – снежань**

**2021 года**



Віцебск, 2022

**АГЛЯД ПАРУШЕННЯЎ ПРАВОЎ І СВАБОД У БЕЛАРУСІ ЗА 2021 ГОД**

Выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі ў жніўні 2020 года, і масавыя пратэсныя выступленні, якія адбыліся пасля іх, на працяглы тэрмін вызначылі ў 2021 годзе палітычную сітуацыю ў Беларусі.

Гвалт, рэпрэсіі, знішчэнне грамадзянскай супольнасці, стварэнне атмасферы ўсеагульнага страху сталі інструментамі ўтрымання ўлады замест электаральнай падтрымк.

Прававая сістэма прадэманстравала сваю нядзольнасць абараніць правы чалавека і свабоды, поўную залежнасць ад дзейнай улады і актыўна ўключылася ў ажыццяўленне палітычных рэпрэсій у дачыненні да грамадзян.

Асноўнымі інструментамі ўтрымання ўлады і рэпрэсій у дачыненні да апанентаў, крытыкаў рэжыму і іншадумцаў сталі крымінальны і адміністрацыйны пераслед, адвольныя арышты, звальненне з працы і выцясненне з краіны.

У Беларусі на 1 студзеня 2022 года налічваецца 969 палітвязняў, прызнаных такімі праваабарончымі арганізацыямі ў адпаведнасці з Кіраўніцтвам па вызначэнні паняцця “палітычны зняволены”. За год іх колькасць павялічылася на 800 чалавек. Пры гэтым больш за 100 чалавек, прызнаных палітвязнямі ў 2021 годзе, былі вызваленыя.

Зараз вядома пра не менш за 1 285 асуджаных па палітычна матываваных крымінальных справах за 2021 год. Таксама праваабаронцы маюць звесткі пра 6 443 затрыманых і не менш чым 3 060 накладзеных адміністрацыйных спагнаннях за ажыццяўленне сваіх правоў і свабод, з якіх 2 186 – адміністрацыйныя арышты і 836 – адміністрацыйныя штрафы.

За мінулы год уладамі не было праведзена належнага эфектыўнага расследавання гібелі ўдзельнікаў мірных сходаў А. Тарайкоўскага, Г. Шутава і Р. Бандарэнкі, смерці А. Віхора і В. Ашурка.

Таксама ўладамі не праведзена належнага расследавання каля пяці тысяч зваротаў (у тым ліку больш за 100 ад непаўналетніх) аб расследаванні і прыцягненні да адказнасці вінаватых у катаваннях і іншых актах забароненага абыходжання ў дачыненні да ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту і іншых асоб, якія паступілі ў следчыя органы, у тым ліку 680 заяў аб катаваннях у ізалятарах г. Мінска непасрэдна пасля выбараў у жніўні 2020 года, калі тысячы затрыманых удзельнікаў пратэстаў у Мінску і іншых гарадах краіны былі мэтанакіравана падвергнутыя катаванням і іншым відам жорсткага, бесчалавечнага і зневажальнага абыходжання.

На дадзены момант ПЦ «Вясна» задакументавана больш за 1 000 сведчанняў ахвяр катаванняў. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць, што катаванні насілі масавы, сістэмны характар і з'яўляліся арганізаванай, палітычна матываванай карнай акцыяй уладаў па застрашванні беларускага грамадства.

Улады працягваюць актыўна прымяняць рэпрэсіі ў дачыненні да журналістаў у сувязі з іх прафесійнай дзейнасцю: паводле звестак БАЖ, 32 журналісты і супрацоўнікі СМІ на дадзены момант пазбаўленыя волі, 113 журналістаў былі затрыманыя, 29 разоў яны адбывалі адміністрацыйны арышт, за год праведзена 146 ператрусаў;

Практычна ўсе сябры ПЦ «Вясна» на працягу года падвяргаліся рэпрэсіям у розных формах, у тым ліку затрыманням і адміністрацыйным арыштам. У СІЗА па розных надуманых абвінавачваннях утрымліваюцца каардынатарка валанцёрскай службы ПЦ «Вясна» Марыя (Марфа) Рабкова, старшыня «Вясны» Алесь Бяляцкі, сябра Рады арганізацыі Валянцін Стэфановіч, юрыст і каардынатар кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Уладзімір Лабковіч і валанцёр арганізацыі Андрэй Чапюк; кіраўнік гомельскай філіі «Вясны» Леанід Судаленка і валанцёрка Таццяна Ласіца асуджаныя адпаведна да трох і двух з паловай гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі; у праваабаронцаў праведзена не менш за 86 ператрусаў, яны падвергліся не менш за 146 допытам.

Судовая сістэма ўключылася ў працэс рэпрэсій, ігнаруючы стандарты справядлівага суда; адвакатура страціла рысы незалежнага самакіравальнага інстытута; адвакаты ажыццяўляюць сваю дзейнасць ва ўмовах сталага ціску, пагроз і пераследу.

Рэспубліка Беларусь працягвае прымяняць смяротнае пакаранне. На працягу года быў вынесены смяротны прысуд у дачыненні да аднаго чалавека; у СІЗА ў чаканні выканання смяротных прысудаў утрымліваліся ад трох да пяці чалавек, як мінімум адзін з якіх сёлета, магчыма, быў пакараны, а двое – памілаваны.

Палітычныя рэпрэсіі 2021 г. з’яўляюцца па шэрагу паказчыкаў самымі масавымі ў найноўшай гісторыі Беларусі і сведчаць аб глыбокім крызісе з правамі чалавека ў краіне, які прывёў да міжнароднай ізаляцыі Беларусі і санкцый з боку краін ЕС, ЗША і Вялікабрытаніі. Адзіным адказам уладаў на патрабаванні палітычных пераўтварэнняў у краіне з боку большасці беларускага грамадства з'яўляецца ўзмацненне рэпрэсій і імітацыя агульнанацыянальнага дыялогу па г.зв. канстытуцыйнай рэформе. Дадзеная палітыка ўладаў толькі ўзмацняе крызіс і стварае перадумовы для яго далейшага развіцця ў будучыні.

Усе, што адбывалась у мінулым годзе у Віцебскай вобласці было адлюстрананнем працэсаў, якія працікалі ў палітячнай і грамадскай сферах ў межах Беларусі. Дадзенае выданне, ў храналагічным парадку, прадстаўляе чытачам факты парушэння правоў чалавека ў 2021 годзе ў Віцебскім рэгіёне.

## Факты парушэньняў грамадзянскіх і палітычных правоў




04.01.2021 Суд Віцебскага раёну 4 студзеня паўторна разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні 19-гадовай Ангеліны Туравец, абвінавачанай ва ўдзеле ў маршы памяці Рамана Бандарэнкі (ч.3 арт. 23.34 КаАП) 15 лістапада. Суддзя Наталля Траццякова прызнала дзяўчыну вінаватай і пакарала штрафам у памеры 40 базавых велічынь.

«Ці справядліва пакаралі? Канечне, не! Я проста гуляла з сяброўкай... Яны думаюць, што штрафамі ды суткамі напалохаюць нас. Але я працягну гуляць і надалей», – сказала пасля суду Ангеліна Туравец.

23 лістапада Ангеліна Туравец, якая на той момант знаходзілася пад вартай у СІЗА, была прызнаная ў гэтай жа справе невінаватай (суддзя Міхаіл Зубеня). Але начальнік Віцебскага РАУС Іваноў абскардзіў тое рашэнне ў абласным судзе, у выніку справу накіравалі на новы разгляд. Разбірала яе гэтым разам суддзя Наталля Траццякова.

Паводле пратаколу, Ангеліна Туравец 15 лістапада ўзяла ўдзел у несанкцыянаваным вулічным шэсці з мэтай выказвання пратэсту супраць парадку правядзення выбараў і гвалту. Сваёй віны дзяўчына не прызнала. Патлумачыла, што проста гуляла па вуліцы Леніна разам з сяброўкай.

На міліцэйскім відэа Ангеліна знаходзілася на пэўнай дыстанцыі ад калоны пратэстоўцаў. Тым не менш, суддзя палічыла, што чалавек, які да гэтага 4 разы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці паводле арт. 23.34, не мог выпадкова апынуцца ў месцы правядзення акцыі пратэсту.

Суддзя прызнала Ангеліну Туравец вінаватай і пакарала яе штрафам у памеры 40 базавых велічынь (1160 рублёў).

Сапраўды, пасля прэзідэнцкіх выбараў Ангеліну Туравец да гэтага 4 разы прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці паводле арт. 23.34. Яе каралі штрафамі і адміністрацыйнымі арыштамі. Агулам у віцебскім СІЗА дзяўчына правяла 10 сутак. На сённяшні суд таксама прыходзіла з так званым «камплектам для СІЗА» ў заплечніку.

04.01.2021 У нядзелю 3 студзеня міліцыянты прыйшлі з ператрусам да Валянціны Крыштопенка – жанчыны з інваліднасцю 1-й групы, якая жыве ў пасёлку Кастрычніцкая Віцебскага раёну. Супрацоўнікі Віцебскага РАУС зрабілі агляд памяшкання, у якім Валянціна жыве разам з дачкой і ўнучкай. Канфіскаваныя два мабільныя тэлефоны.

«Пагрукалі ў дзверы з самага ранку. Па праўдзе, мы чакалі зусім іншых гасцей, бо ў мяне сёння дзень народзінаў – тым больш, нядзеля, выходныя. Ніякіх папераў на рукі не далі, сказалі, што будуць рабіць агляд...» – расказала дачка Валянціны Крыштопенка Святлана.

У выніку агляду супрацоўнікі Віцебскага РАУС канфіскавалі два мабільныя тэлефоны, адзін з якіх належыць дачцэ Валянціны Крыштопенка.



Як зразумела спадарыня Валянціна,ператрус прайшоў у межах чарговай адміністрацыйнай справы паводле арт. 23.34, якую завялі на жанчыну за адзіночнае пікетаванне. На думку міліцыі, менавіта Крыштопенка ўдзельнічала ў здымках відэаролііка, змантаванага з фотаздымкаў, на якіх жанчына пазуе ў тым ліку на фоне міліцэйскага аўто, прыкрываючы твар плакатам. У якасці закадравага тэксту аўтары відэа выкарысталі верш Андрэя Дзяменцьева «Власть воюет с собственным народам».

Міліцыянты забралі з кватэры Валянціны Крыштопенка таксама плакат з біблейскай цытатай: «Когда господствует нечестивый, народ стенает». Жанчына паведаміла, што сама аддала ім гэты плакат.

56-гадовую Валянціну Крыштопенка, якая мае інваліднасць 1-й групы і перасоўваецца на вазку, ужо тройчы судзілі летась паводле арт. 23.34 КаАП за ўдзел у пратэставых акцыях. Першы раз папярэдзілі, другі раз аштрафавалі на 7 базавых велічынь, трэці раз – на 25 базавых.

**05.01.2021** 5 студзеня суд Кастрычніцкага раёну пакараў 66-гадовага віцябляніна Чэслава Салодкага штрафам у памеры 12 базавых велічынь за ўдзел у вулічным шэсці і ў несанкцыянаваным пікетаванні (ч.1 арт. 23.34 КаАП). Удзельнікам пікетавання мужчыну прызналі толькі праз тое, што ўвечары ён прагульваўся міма дэкаратыўнай скульптуры мядзведзя, на якім быў нібыта накінуты бел-чырвона-белы сцяг…

Справу разглядаў суддзя Уладзімір Царыкаў.

Міліцыянты склалі на пенсіянера і інваліда 2-й групы Чэслава Салодкага два пратаколы. У першым яны абвінавацілі яго ва ўдзеле ў вулічным шэсці пенсіянераў 16 снежня, калі 8 пажылых віцяблян прайшлі па двары аднаго з дамоў на вуліцы Берасценя, скандуючы лозунгі. Паводле пратаколу, Салодкі трымаў у руках «бел-чырвона-белае палотнішча». Згодна з другім пратаколам, 17 снежня пенсіянер размясціў БЧБ-палотнішча на дэкаратыўнай скульптуры мядзведзя каля кавярні «Бацькава хата» на Маскоўскім праспекце.

Чэслаў Салодкін быў затрыманы ўвечары 17 снежня падчас вечаровага шпацыру на Маскоўскім праспекце. Яго, і яшчэ трох затрыманых, адвезлі ў Кастрычніцкі РАУС, дзе пенсіянеру стала блага. У абласной лякарні, куды мужчыну даставіла хуткая дапамога, дыягнаставалі гіпертанічны крыз.

На судзе Чэслаў Салодкі запэўніў, што да таго, як яго забрала хуткая, на яго ніхто не складаў пратаколаў, а значыцца, яны былі складзеныя без яго ўдзелу. Яго таксама ніхто не азнаёміў з правам мець абаронцу. Расказаў, што перад ад'ездам у больніцу супрацоўнік міліцыі гвалтам вырваў з ягоных рук тэлефон – нібыта ў заклад.

Што да выстаўленых абвінавачанняў, Салодкі не аспрэчваў, што 16 снежня прайшоўся разам з іншымі пенсіянерамі ў двары дому 48 на вуліцы Берасценя, але ўвесь ягоны «ўдзел» доўжыўся хіба 6-7 секунд, бо шпарка ісці не мог.



«Я штодзень гуляю па вуліцах гораду, каб паправіць здароўе, бо перажыў нядаўна трэці інсульт… Нікога з тых людзей асабіста не ведаў і нічога не скандаваў. А ў руках трымаў зусім не «палотнішча бел-чырвона-белага» колеру, а наш нацыянальны сцяг, якому калісьці прысягаў. Я лічу яго святым! Таму і далучыўся да шэсця», – патлумачыў на судзе Чэслаў Салодкі.

Наконт эпізоду з «палотнішчам» на скульптуры мядзведзя, якое нібыта з'явілася там 17 снежня, мужчына заявіў, што нават не заўважыў той скульптуры і не ведае, дзе яна знаходзіцца. Магло здарыцца, проста праходзіў у той вечар міма яе.

Адвакатка Чэслава Салодкага звярнула ўвагу суду на шматлікія парушэнні міліцыянтамі працэсуальных норм пры складанні пратаколаў, а таксама на малазначнасць дзеянняў абвінавачанага. Прасіла з гэтых прычын скасаваць справу.

Але суддзя Уладзімір Царыкаў прызнаў Чэслава Салодкага вінаватым па абодвух пратаколах і пастанавіў пакараць яго штрафам у памеры 12 базавых велічынь (348 рублёў), а таксама адмяніць арышт тэлефона.

Суд над пенсіянерам і інвалідам 2-й групы доўжыўся больш за тры гадзіны.

Чэслаў Салодкі збіраецца абскардзіць рашэнне ў Віцебскім абласным судзе.

**06.01.2021** У Віцебску 11 студзеня зачыніцца ўпадабаны многімі гараджанамі і турыстамі арт-паб «Торвальд» на вуліцы Талстога,1. Пасля правядзення санітарных дзён увосень (тады такім чынам многія далучыліся да нацыянальнага страйку ў сувязі з інаўгурацыяй Лукашэнкі) установа перастала адпавядаць патрабаванням бяспекі. Такое тлумачэнне з'явілася на старонках «Торвальду» ў сацсетках, піша TUT.BY.

«Дарагія сябры! Апынулася, што праводзіць санітарныя дні ўвосень – дрэнная прыкмета. Раптоўна ў памяшканнях, якія мы займаем і якія існуюць ужо больш за 150 гадоў, выявіліся надзвычай сур'ёзныя недахопы: прыступкі занадта высокія, а калідоры – неймаверна вузкія. Гэтыя недасканаласці, разам з адмысловымі службамі, што вельмі клапоцяцца аб нашай з вамі бяспецы, вымушаюць нас прыпыніць сваю дзейнасць.

Мы будзем старацца ва ўсю моц, каб зрабіць «Торвальд» законным зноў, захаваўшы наш стыль і дух і не разбіўшы аніводнага хрустальнага сасуду, але ж вы самі ўсё разумееце.

Таму, калі вы нас любіце і планавалі зайсці да нас, тады зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. «Па ашчушчэніям», гэта можа быць нашым апошнім спатканнем», – гаворыцца ў звароце працаўнікоў «Торвальду» да наведнікаў.

Таксама арт-паб запусціў акцыю «Разбяры «Торвальд» на сувеніры». Можна прыйсці ва ўстанову і купіць усё, што вам спадабаецца: карціны, мэблю, кнігі, часопісы, магнітолу, кубкі для піва, сцягі і г.д.

«Гэта дасць вам магчымасць узгадваць пра нас праз доўгія гады, а нам – сродкі, каб перажыць гэты час і зрабіць рамонт. Як бы ўсё ні скончылася, верым, што ў кожным з нас застаецца часцінка Торвальда, якую мы заўжды носім з сабой. Так і менавіта так «Торвальд» быў, ёсць і абавязкова будзе», – абяцаюць кіраўнікі арт-пабу.

Арт-паб «Торвальд» у ірландскім стылі адкрыўся ў Віцебску ў 2015 годзе. Спачатку ўстанова размяшчалася ў жылым доме на вуліцы Камсамольскай, затым пераехаў на вуліцу Талстога.

«Торвальд» – аўтэнтычнае месца ў Віцебску: тут вялікі выбар піва, добрая кухня, а таксама рэдкі дзень без культурнай праграмы. У арт-пабе праводзіліся канцэрты, лекцыі, сустрэчы з вядомымі людзьмі, вечарынкі, кінапаказы, інтэлектуальныя гульні, спартыўныя трансляцыі. Доўгі час тут праходзілі заняткі бясплатных курсаў па беларускай мове «Мова нанова». Для мерапрыемстваў у «Торвальдзе» ёсць асобная зала.

**11.01.2021** 11 студзеня суд Кастрычніцкага раёну Віцебску пачаў разглядаць крымінальную справу 25-гадовага віцябляніна Арцёма Ісакава, абвінавачанага паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Раней да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці Ісакаў не прыцягваўся. Цяпер яму пагражае да 6 гадоў пазбаўлення волі.

Справу разглядае суддзя Сяргей Будрэвіч. Сярод удзельнікаў працэсу – дзевяць пацярпелых міліцыянтаў, якія на першым паседжанні давалі свае паказанні. На пачатак працэсу ўсе ахвотныя не трапілі, у тым ліку журналісты.

Арцём Ісакаў быў затрыманы 25 кастрычніка ў межах адміністрацыйнага разбору. За парушэнне закону аб масавых мерапрыемствах яго аштрафавалі на 10 базавых велічыняў. У межах крымінальнай справы знаходзіцца ў СІЗА ад 28 кастрычніка.

Паводле пракуратуры, 25 кастрычніка Арцём Ісакаў узяў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным масавым шэсці. Абвінавачанне сцвярджае, што Ісакаў не менш двух разоў "распыліў струмень пярцовага газу ў бок твараў і тулаваў міліцыянтаў Вайцяхоўскага, Іванова, Сянкевіча". Гэтымі дзеяннямі Ісакаў, паводле пракуратуры, перашкодзіў міліцыянтам затрымаць нецвярозага грамадзяніна, які выкрыкваў абразлівыя словы ў іх бок. Сцвярджаецца, што Ісакаў таксама выкрыкваў нецэнзурныя словы, паказваў сярэдні палец левай рукі, пасля чаго збег з месца злачынства. Дзеянні Ісакава былі кваліфікаваныя паводле арт. 364 КК – як гвалт у дачыненні супрацоўнікаў унутраных справаў з мэтай перашкоды іх службовай дзейнасці.

Пазней, падчас свайго затрымання ў раёне вуліцы Чкалава, Ісакаў, паводле абвінавачання, не менш трох разоў распыліў пярцовы газ у бок міліцыянтаў Аненкава, Дунца, Лазукі, Радкевіча, Ратнікава. Гэтым нібыта прычыніў фізічны боль супрацоўнікам міліцыі (дзеянні кваліфікаваныя таксама паводле арт. 364 КК).

Арцём Ісакаў прызнаў сваю віну часткова.

У першы дзень судовага даследавання суд пачаў апытваць пацярпелых міліцыянтаў. Усе яны паведамілі, што ў той ці іншай ступені пацярпелі пасля распылення Ісакавым пярцовага газу. У найбольшай ступені пацярпеў Мікалай Вайцяхоўскі, які, з ягоных слоў, змог вярнуцца да выканання сваіх абавязкаў толькі праз хвілін 30-50. Казаў, што газ яму трапіў непасрэдна ў твар.

Пацярпелыя міліцыянты 25 кастрычніка былі апранутыя ў цывільнае адзенне і выконвалі свае службовыя абавязкі, знаходзячыся ў калоне пратэстоўцаў. Паводле супрацоўнікаў, яны меліся спыняць супрацьпраўныя дзеянні: канфіскоўваць незарэгістраваную сімволіку ці затрымліваць нецвярозых грамадзян.

Супрацоўнікі МУС паведамілі ў судзе, што ў дачыненні да іх «грамадзяне былі настроеныя агрэсіўна, заклікалі пераходзіць на бок народу, абражалі крыўднымі словамі».

Суд працягнецца 12 студзеня (пачатак у 10.30).

**13.01.2021** Ранкам 13 студзеня ў лесе за чыгуначнай станцыяй «Лучоса» пад Віцебскам былі затрыманыя 6 жанчын сталага веку, сярод іх – актывістка і маці палітвязня Таццяна Севярынец. Жанчыны меліся зладзіць шпацыр са скандынаўскімі палкамі, але былі дастаўленыя ў Першамайскі РАУС. Затрымлівалі іх 12 супрацоўнікаў МУС.

Як стала вядома, пяць з затрыманых жанчын правядуць ноч да суду ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ), які зараз месціцца ў будынку СІЗА-2.

Жанчын больш за 8 гадзін трымалі ў Першамайскім РАУС. Супрацоўнікі міліцыі адмовіліся ўзяць для затрыманых харчы і ваду. Як расказала дачка затрыманай Раісы Кухто, недзе ў 18.30 маці паспела паведаміць ёй па тэлефоне, што іх усіх вязуць у ІЧУ. Разам з Раісай Кухто знаходзіліся Людміла Камінская, Людміла Валадкевіч, Алена Каснова і Тамара Ільіна.

За гадзіну да гэтага ў суд адвезлі Таццяну Севярынец, але паседжанне было перанесенае на 19 студзеня – актывістку адпусцілі. Паводле спадарыні Таццяны, на ўдзельніц шпацыру складаліся пратаколы паводле арт. 23.34 КаАП.

«Маёр Склімянок, які складаў пратакол на мяне, напісаў, што я, знаходзячыся ў лесе – грамадскім месцы, размахвала сцягам...» – распавяла Таццяна Севярынец.

Суды над затрыманымі жанчынамі, якіх адвезлі ў ІЧУ, пройдуць заўтра, меркавана – ад 10-й раніцы.

**13.01.2021** 13 студзеня Віцебскі абласны суд разгледзеў скаргі незалежнай журналісткі Алены Шабуні і трох грамадскіх актывістаў на рашэнні раённых судоў Віцебску і суду Докшыцкага раёну. Скаргі разглядалі суддзі Святлана Іванова і ІрынаСмалякова. Ніводная з пададзеных скаргаў не была задаволеная.

Суддзя Святлана Іванова разгледзела скаргу незалежнай журналісткі Алены Шабуні на пастанову суду Першамайскага раёну Віцебску ад 17 лістапада. Паводле арт. 22.9 КаАП суд прызнаў Алену вінаватай у вырабе прадукцыі СМІ і аштрафаваў журналістку на 35 базавых велічыняў (945 рублёў). Матэрыял быў размешчаны на сайце «Белсату». З судовай пастановай Першамайскага суду Шабуня не пагадзілася.

У сваёй скарзе журналістка пераконвала, што сваімі дзеяннямі не нанесла дзяржаве ніякай шкоды. Яе дзеянні не паўплывалі на дзяржаўную бяспеку ці грамадскі парадак. Вынесенае судом адміністрацыйнае пакаранне Шабуня палічыла неабгрунтаваным і патрабавала пастанову адмяніць, а справу спыніць праз адсутнасць складу адміністрацыйнага правапарушэння.

Свае патрабаванні, выказаныя ў скарзе, журналістка падтрымала і ў судзе, але на рашэнне гэта не паўплывала. Святлана Іванова пакінула вынесеную судом Першамайскага раёну пастанову без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

Вазочніца Валянціна Крыштопенка аспрэчвала рашэнне суду Віцебскага раёну ад 4 снежня. Пасля забойства Рамана Бандарэнкі жанчына 15 лістапада ўзяла ўдзел у несанкцыянаваным уладамі шэсці. Паводле ч.1 арт.23.34 КаАП суд аштрафаваў Валянціну на 25 базавых (675 рублёў). Суддзя Святлана Іванова пакінула скаргу без задавальнення.



Студэнт ветакадэміі Уладзіслаў Гаголка спрабаваў абскардзіць пастанову суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, вынесеную паводле ч.1 арт.23.34 і арт. 23.4 КаАП. Штраф па абодвух артыкулах склаў 15 базавых велічынь (405 рублёў). Суд прызнаў Гаголку вінаватым у несанкцыянаваным пікетаванні 1 верасня каля будынку ВДУ імя Машэрава і 2 верасня – каля будынку акадэміі ветэрынарнай медыцыны. У задавальненні скаргі суддзя Іванова таксама адмовіла.

Скаргу жыхаркі Докшыцкага раёну Таццяны Дорц разглядала суддзя Ірына Смалякова. 30 лістапада Докшыцкі раённы суд паводле ч.1. арт. 23.34 аштрафаваў Таццяну Дорц на 40 базавых велічынь (1080 рублёў) за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве 13 лістапада. Скаргу таксама не задаволілі і пастанову не змянілі.

**14.01.2021** 14 студзеня віцебскія суды пачалі разглядаць справы пяці жанчын, затрыманых днём раней у лесе за чыгуначнай станцыяй «Лучоса» пад Віцебскам. Яны больш за суткі знаходзіліся пад вартай, а ноч правялі ў віцебскім СІЗА. Пенсіянерка Тамара Ільіна трапіла ў лякарню.

Раніцай 13 студзеня віцяблянкі меліся папрактыкаваць у лесе скандынаўскую хаду, але праз 15 хвілін па прыездзе іх акружыў тузін супрацоўнікаў Першамайскага РАУС – загадалі праехаць з імі ў пастарунак.

На Таццяну Севярынец, Людмілу Камінскую, Людмілу Валадкевіч, Алену Каснову, Тамару Ільіну і Раісу Кухто міліцыянты склалі пратаколы за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні «з выкарыстаннем бел-чырвона-белага палотнішча» (арт. 23.34 КаАП). Таццяну Севярынец яшчэ ўвечары 13 студзеня паспелі адвезці на суд, але суддзя перанёс разгляд справы на 19 студзеня, і Таццяна аказалася на свабодзе.

Астатніх жанчын таксама меліся адпусціць, але каля 19.00 на выхадзе з РАУС зноў затрымалі, змясцілі ў боксы і ўначы адвезлі ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ), дзе яны знаходзіліся аж да судоў 14 студзеня. Пенсіянерцы Тамары Ільіной зрабілася ў пастарунку блага, на «хуткай» яе адвезлі ў лякарню.

14 студзеня суд Кастрычніцкага раёну Віцебску пачаў разбіраць праз скайп справу Алены Касновай, якая з пратаколам не згадзілася і сцвярджала, што прыехала ў лес, каб заняцца спортам.

«Мы нават не размаўлялі пра палітыку. У мяне была адзіная мэта: я хачу пахудзець… У руках я не трымала ніякіх палотнішчаў, і ніякага пікетавання не было», – заявіла па скайпе з ІЧУ Алена Каснова.

Суддзя Вераніка Барысава прыняла рашэнне аб'яднаць справу Касновай са справай Таццяны Севярынец і разгледзець абедзве ў адным працэсе 19 студзеня (пачатак 11.00). На паседжанне ў якасці сведак будуць запрошаныя міліцыянт Пагарэльскі, які пісаў рапарт, а таксама маёры міліцыі Склімянок і Казлоўскі. Каля 12.30 Алену Каснову вызвалілі з ІЧУ, які размяшчаецца зараз у будынку СІЗА-2.

Падобнае рашэнне, але ўжо пасля абеду, прыняў у дачыненні Людмілы Камінскай, Людмілы Валадкевіч, Раісы Кухто і суд Кастрычніцкага раёну Віцебску. Суддзя Уладзімір Царыкаў пастанавіў разгледзець тры справы, заведзеныя на жанчын, у адным працэсе і, праз немагчымасць забяспечыць у гэты дзень яўку сведкаў – супрацоўнікаў Першамайскага РАУС, абвесціў перапынак да 20 студзеня. Разгляд справаў пачнецца ў 9.30. Каля 15.00 затрыманыя жанчыны выйшлі на волю.

Адміністрацыйную справу ў дачыненні Тамары Ільіной пакуль не разбіралі: жанчына дагэтуль знаходзіцца ў лякарні.

**15.01.2021** 13 студзеня віцябляніну Уладзіміру Малахоўскаму, на якога была заведзеная крымінальная справа паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»), змянілі меру стрымання з падпіскі аб нявыездзе на заключэнне пад варту. Калі адбудзецца суд – пакуль невядома.

Уладзіміра Малахоўскага ўзялі пад варту 13 студзеня ў будынку следчага камітэту, куды мужчына прыйшоў разам з адвакатам. Раней у якасці меры стрымання да яго была ўжытая падпіска аб нявыездзе. Цяпер Малахоўскі знаходзіцца ў СІЗА-2. Калі над ім адбудзецца суд – пакуль дакладна невядома. Праваабаронцы мяркуюць, што працэс можа распачацца ўжо праз некалькі тыдняў.

Міліцыянты затрымалі Уладзіміра Малахоўскага летась на вулічным шэсці 13 верасня падчас сутыкнення пратэстоўцаў і супрацоўнікаў міліцыі на скрыжаванні пр. Чарняхоўскага і Будаўнікоў. Пры затрыманні яму пашкодзілі пальцы на руцэ. Спачатку Малахоўскага ўтрымлівалі ў СІЗА, але потым змянілі меру стрымання на падпіску аб нявыездзе. Мужчына мае інваліднасць 3-й групы і змагаецца з анкалогіяй.

На волі ў яго засталіся жонка і двое няпоўнагадовых дзяцей.

Уладзіміру Малахоўскаму інкрымінуюць злачынства, прадугледжанае арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Яму пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

**16.01.2021** 15 студзеня ў Дуброўне міліцыя затрымала 38-гадовага прадпрымальніка і актывіста Міхаіла Чамураку. Мужчыну вінавацяць у тым, што ён у грамадскім месцы райцэнтра вывесіў бел-чырвона-белыя стужкі. У доме актывіста і ў яго сваякоў прайшлі ператрусы. Канфіскаваныя паветраныя балонікі, якія віселі на акне…

Жонка Міхаіла Чамуракі Людміла пераконвае, што муж ніякіх стужак у горадзе не развешваў. Як расказала «Віцебскай Вясне», учора каля 15-й гадзіны яе муж пайшоў у краму, а ўжо вярнуўся дамоў у суправаджэнні міліцыянтаў. Супрацоўнікі МУС не назваліся, паказалі пастанову на агляд памяшкання. Людміла прапанавала запрасіць іншых панятых, але службоўцы адмовілі.

«З пастановы вынікае, што бел-чырвона-белыя стужкі вывесіў муж. У доме правялі агляд. Шукалі камп'ютарную тэхніку і стужкі. З вокнаў знялі белыя і чырвоныя балонікі і павезлі ў РАУС. Праз паўгадзіны я даведалася, што Міхаіл затрыманы», – распавяла Людміла Чамурака.

Адбыўся вобшук і ў доме маці Міхаіла, а потым міліцыянты прыйшлі з ператрусам і да ягонай сястры, але яе не было ўдома.

Пасля затрымання мужа Людміла Чамурака напісала заяву, каб быць ягонай прадстаўніцай у адміністрацыйным працэсе, але ніякага адказу пакуль не атрымала.



Прыняць ежу і рэчы ў пастарунку адмовіліся. Стала вядома, што праз 7 гадзін пасля затрымання Міхаіла перавезлі ў ІЧУ Воршы. Таксама жонка напісала заяву ў суд, каб пра пачатак судовага разбору яе папярэдзілі загадзя, каб паспець азнаёміцца з матэрыяламі справы.

Людміла Чамурака перакананая, што мясцовая міліцыя мэтанакіравана пераследуе іх сям'ю.

«Мяне нават не здзівіць, калі раптам аднекуль з'явяцца сведкі, якія бачылі, як мой муж развешваў тыя стужкі. Падчас апошняй адміністрацыйнай справы міліцыя пераконвала, што Міхаіл паслаў на тры літары намесніка начальніка РАУС. Але ж такога не было, і справу ў судзе яны не выйгралі. Гэтая адміністрацыйная справа паводле арт. 23.34 будзе чацвёртай па ліку. Ужо былі і суткі, і штрафы…» – падсумавала Людміла Чамурака.

**17.01.2021** У Віцебску 16 студзеня адбыўсяператрус у студэнта ВДТУ Цімафея Журкевіча. Міліцыянты забралі жорсткі дыск камп'ютара і тэлефон. Самога Цімафея затрымалі, ён знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). Паводле маці студэнта,ператрус праходзіў у межах крымінальнай справы: следчыя шукаюць доказы датычнасці да яе Цімафея Журкевіча.

Маці Цімафея Журкевіча расказала, што каля 13.00 у суботу ёй патэлефанавалі са следчага камітэту, а потым прыехалі на працу і паказалі пастанову на вобшук з санкцыі пракурора.

«Я пабачыла ў тым дакуменце, што 25.08 была распачатая крымінальная справа па факце пагрозы гвалтам у дачыненні вайскоўца, прозвішча там было, але не запомніла. І праводзіцца праверка па факце датычнасці майго сына да гэтай справы. Ім патрэбны быў ягоны камп'ютар…» – распавяла маці студэнта.

У выніку праведзенагаператрусу быў канфіскаваны жорсткі дыск камп'ютара і тэлефон. Сам Цімафей, які жыве з бацькамі, на момант вобшуку знаходзіўся ўдома. Яму сказалі, што трэба праехаць паразмаўляць са следчым. Па словах маці, сына адвезлі ў СК, але пасля размовы затрымалі і змясцілі на 72 гадзіны ў ІЧУ, які зараз месціцца ў будынку віцебскага СІЗА-2. У справе працуе адвакат.

Раней Цімафей Журкевіч прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці паводле ч.1 арт. 23.34 за ўдзел у зборы подпісаў 1 верасня з патрабаваннямі да дэпутатаў зрабіць справаздачу перад народам.

Стала таксама вядома, што па тым жа сцэнары – зператрусам і адабраннем жорсткага дыску – 16 студзеня ў Віцебску былі затрыманыя Глеб Івашкевіч і студэнт Мікіта Кохан.

Нагадаем, у Віцебску працягваецца судовы працэс па крымінальнай справе (арт. 364 КК), распачатай па падзеях 25 кастрычніка супраць Арцёма Ісакава, якога вінавацяць ва ўжыванні падчас вулічнага шэсця газавага балончыка (пацярпелымі прызнаныя 9 міліцыянтаў).

**17.01.2021** У Віцебску 15 студзеня затрымалі студэнтку медычнага ўніверсітэту Паліну Нітчанка, паведамляе тэлеграм-канал «ВДМУ – разам».




У суботу суд Чыгуначнага раёну Віцебску прысудзіў ёй 7 сутак адміністрацыйнага арышту за ўдзел у відэазвароце да ўладаў, запісаным яшчэ ў кастрычніку 2020 году, піша TUT.BY.

15 студзеня Паліна Нітчанка патэлефанавала маці і паспела паведаміць, што «за ёй прыйшлі». Суд адбыўся на наступны дзень. Паліну прызналі вінаватай у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (ч.3 арт. 23.34 КаАП) і прысудзілі 7 сутак за ўдзел у відэазвароце студэнтаў Віцебску, запісаным у канцы кастрычніка, – яго палічылі несанкцыянаванай акцыяй.

Гэта быў ужо трэці яе адміністрацыйны працэс. Першы раз Паліну судзілі за ўдзел у вулічным шэсці 20 верасня. Другі – за студэнцкую акцыю салідарнасці 26 кастрычніка, у якой хлопцы праспявалі на вуліцы ля ўніверсітэту цоеўскую «Перамен!». Агулам студэнтку аштрафавалі раней на 44 базавыя велічыні (у 2020 годзе гэта было 1188 рублёў), трое сутак да судоў яна адбывала ў ІЧУ.

Нагадаем, 29 снежня за ўдзел у тым жа відэазвароце на 5 сутак арышту быў асуджаны студэнт тэхналагічнага ўніверсітэту Аляксандр Ткачоў. Студэнткі ВДТУ Яніна Вакар і Юлія Хомчанка былі пакараныя штрафамі адпаведна на 4 і 5 базавых велічынь.

**18.01.2021** 46-гадовы жыхар Віцебску Андрэй Цімафеенка, асуджаны 2 снежня да двух гадоў пазбаўлення волі (арт. 366 КК), прызнаны палітвязнем. Адпаведную заяву з патрабаваннем перагляду прысуду і вызвалення Цімафеенкі 16 студзеня прыняла праваабарончая супольнасць Беларусі. Палітвязнямі прызнаныя таксама мянчук Дзмітрый Караткевіч і гамяльчук Сяргей Яфімаў.

Андрэй Цімафеенка быў затрыманы 30 верасня 2020 году. Яму выставілі абвінавачанне ў гвалце альбо пагрозе ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвала службовыя абавязкі (ч.1 арт. 366 КК). Падчас вулічнага шэсця 6 верасня ў Віцебску Цімафеенка адпіхнуў далонню вайскоўца ў ланцугу – менавіта гэта яму і інкрымінавалі (праваабаронцы прызналі гэтыя дзеянні «неабходнай абаронай»). Судовы працэс пачаўся 24 лістапада ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску. Справу разбірала суддзя Сняжана Кіндзеева. Яна прызнала віцябляніна вінаватым і 2 снежня агучыла вырак: два гады калоніі агульнага рэжыму.

«Працягласць або ўмовы пазбаўлення волі ў такіх прысудах відавочна непрапарцыйныя (неадэкватныя) правапарушэнню, па якім асоба была прызнаная вінаватай. Усе гэтыя акалічнасці даюць падставы сцвярджаць, што перaслед гэтых асобаў носіць палітычна матываваны характар, а самі асобы з'яўляюцца палітычнымі зняволенымі», – гаворыцца ў заяве праваабарончай супольнасці.

Па стане на 18 студзеня ў Беларусі прызнаныя палітвязнямі 185 чалавек. На сёння двое з іх – Андрэй Цімафеенка і Мікалай Чарняўскі, утрымліваюцца ў віцебскім СІЗА-2.

**20.01.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску распачаўся разбор справы ў дачыненні 22-гадовай Юліі Кашаверавай, якая ўжо тры месяцы ўтрымліваецца пад вартай у СІЗА-2.



Дзяўчыну абвінавацілі ў злачынстве, прадугледжаным ч.2 арт. 339 КК («Хуліганства»).
Ёй пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

Крымінальную справу разглядае суддзя Сяргей Будрэвіч. Паводле дзяржаўнага абвінаваўцы, 4 кастрычніка падчас вулічнага шэсця на Маскоўскім праспекце Юлія Кашаверава «з хуліганскіх намераў», «знарок, без падстаў і прычын» сарвала з супрацоўніка АМАПу Аляксея Альхімовіча медычную маску і форменную бейсболку. Пасля гэтага, як сцвярджае абвінавачанне, «абутымі нагамі» зрабіла некалькі ўдараў па мікрааўтобусе з амонаўцамі, чым нанесла шкоду транспартнаму сродку (агульная сума матэрыяльнай шкоды склала 841 рубель). Апроч таго, кінула ў бок мікрааўтобуса, які ад'язджаў, «драўляны прут», сцвярджае абвінавачанне.

Юлія Кашаверава, якую прывезлі на суд у кайданках, прызнала віну часткова.

Інцыдэнт здарыўся 4 кастрычніка каля дому №74 к.1 на Маскоўскім праспекце падчас сутычкі пратэстоўцаў з супрацоўнікамі МУС, якія жорстка затрымлівалі аднаго з удзельнікаў мірнага маршу. Грамадзяне спрабавалі вырваць пратэстоўца з рук міліцыі. У адказ службоўцы ўжылі супраць людзей газавыя балончыкі.

На першым судовым паседжанні апытваліся сведкі, у прыватнасці супрацоўнікі віцебскага АМАПу, якія 4 кастрычніка «суправаджалі калону грамадзян на мікрааўтобусах». Бусы не мелі ніякіх знакаў прыналежнасці да МУС і выглядалі як грамадзянскі транспарт.

Супрацоўнік АМАПу Аляксей Альхімовіч, з якога сарвалі маску і бейсболку, прызнаўся, што не бачыў, хто гэта зрабіў, бо на той момант затрымліваў пратэстоўца і знаходзіўся спінай да «натоўпу». Пра факт зрывання маскі не ўзгадаў нават у рапарце, які складаў. Хто наносіў удары па мікрааўтобусе, таксама не бачыў, бо знаходзіўся ўжо ў салоне. Пра тое, што бус пашкодзілі, даведаўся пазней.

Яшчэ адзін сведка-амапавец таксама заявіў, што не бачыў, як абвінавачаная зрывала маску і кепку з Альхімовіча, а гукі ўдараў па бусе толькі чуў, ужо знаходзячыся ўсярэдзіне аўтамабіля.

У якасці сведкаў заяўленыя як мінімум сем супрацоўнікаў МУС. Пасля абеду прадоўжыўся допыт сведкаў з боку абвінавачання. Каля 17.00 у працэсе абвясцілі перапынак да 4 лютага.

Віцяблянка Юля Кашаверава знаходзіцца пад вартай ад 20 кастрычніка. На момант затрымання яна працавала медсястрой у вайсковай частцы, але пазней яе папрасілі напісаць заяву аб звальненні. Дзяўчына мае прыроджаны парок сэрца.

**21.01.2021** 21 студзеня суд Дубровенскага раёну прысудзіў прадпрымальніку Міхаілу Чамураку 7 сутак адміністрацыйнага арышту паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. Бел-чырвона-белыя паветраныя балонікі, вывешаныя на акне прыватнага дому, суд палічыў публічным выказваннем грамадска-палітычных інтарэсаў. Актывіста ўзялі пад варту адразу пасля абвяшчэння прысуду.



Як паведамляла «Віцебская вясна», 15 студзеня ў Дуброўне на 72 гадзіны быў затрыманы мясцовы актывіст Міхаіл Чамурака. Праз трое сутак, 18 студзеня, яго прывезлі з ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) Воршы назад у Дуброўна, дзе меўся адбыцца суд, аднак суддзя адправіла пратакол на дапрацоўванне і перанесла паседжанне на 21 студзеня.

Адміністрацыйную справу, распачатую ў дачыненні да Міхаіла Чамуракі паводле ч. 3 арт. 23.34, разглядала суддзя Марыя Цыклінская. Па словах актывіста, ён быў вельмі здзіўлены, што пратакол, агучаны на судзе 21 студзеня, тычыўся балонікаў на акне, канфіскаваных міліцыяй падчас вобшуку, хаця падставай для ператрусу былі бел-чырвона-белыя стужкі, паразвешаныя на слупах у райцэнтры, – шукалі менавіта іх.

На судзе Чамурака заявіў, што бел-чырвона-белыя паветраныя шарыкі віселі на акне цягам 4-х апошніх месяцаў і нікому не шкодзілі. Дадаў, што на падваконні, апроч таго, красуюцца расліны зялёнага колеру. Але суд прапусціў гэты факт міма вушэй.

Актывіст таксама хадайнічаў, каб у суд былі пададзеныя запісы з камераў відэаназірання, бо сцвярджаў, што ў час, які пазначаны ў пратаколе, удома яго не было і, адпаведна, развешваць балонікі ён фізічна не мог. Аднак аказалася, што, паводле мясцовай міліцыі, 15 студзеня ніводная камера відэаназірання ў тым раёне не працавала.

Сведкам у судзе выступіў супрацоўнік міліцыі Сяргей Калінін, які пацвердзіў факт вывешвання Чамуракам БЧБ-шарыкаў 15 студзеня, але ніякіх канкрэтных доказаў гэтага суду не паказаў. Было лішнім: суд паверыў міліцыянту на слова... Рашэнне суддзі Марыі Цыклінскай: прызнаць вінаватым і пакараць адміністрацыйным арыштам на 7 сутак.

З улікам трох сутак, праведзеных у аршанскім ІЧУ да суду, Міхаілу Чамураку давядзецца адседзець яшчэ чатыры. Пасля судовага паседжання Міхаіла Чамураку адразу затрымалі. Выйдзе на волю 25 студзеня.

**22.01.2021** Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску 22 студзеня вынес рашэнне ў адміністрацыйнай справе паводле арт.23.34 КаАП у дачыненні да студэнтак 2-га курсу ВДМУ Паліны Нітчанкі і Анастасіі Лявонцьевай. Суддзя Уладзімір Царыкаў прызнаў удзел дзяўчат у не дазволеным уладамі пікетаванні даказаным і пакараў Паліну Нітчанку 10-цю суткамі арышту, Анастасію Лявонцьеву – штрафам у памеры 16 базавых велічынь.

14 снежня шэсць студэнтак на пятым паверсе будынку ВДМУ правялі акцыю ў падтрымку зняволеных навучэнцаў ВНУ. Дзяўчаты сфатаграфаваліся, трымаючы ў руках бел-чырвона-белы сцяг і плакаты з надпісамі: «Свабоду Яну Салановічу!», «Свабоду палітзняволеным студэнтам!».

Паводле пратаколу, Нітчанка і Лявонцьева (астатніх удзельнікаў акцыі міліцыя не ідэнтыфікавала) «ўзялі ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні з мэтай публічнага выказвання сваіх асабістых інтарэсаў»э



Адзначым, што Паліна Нітчанка мусіла 22 студзеня вызваліцца з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ), дзе адбывала пакаранне арыштам на 7 сутак за ўдзел у відэазвароце студэнтаў да ўладаў, але на волю так і не выйшла: міліцыя затрымала яе па іншай справе. У працэсе дзяўчына ўдзельнічала праз відэасувязь па скайпе.

Анастасія Лявонцьева ад свайго ўдзелу ў пратэставай фотасэсіі не адмовілася. Але паведаміла, што, акрамя сваёй сяброўкі Паліны, іншых удзельнікаў акцыі не ведае. Спаслалася таксама на арт. 33 Канстытуцыі, які гарантуе ёй «свабоду меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне».

Нітчанка ж заявіла на судзе, што нічога, акрамя экзамену, здадзенага ёй у той дзень, не памятае. Сябе на прадэманстраваным фота не пазнала.

Капітан Кастрычніцкага РАУС Віталь Праліч, які праводзіў праверку і рыхтаваў дакументы для передачы ў суд, патлумачыў, што Паліну Нітчанку на фота апазнаў ён, бо ведаў яе раней. Апазналі дзяўчыну і намеснікі дэкана універсітэту Святлана Казлоўская, Яраслаў Перавалаў і загадчыца інтэрнату №2 Валянціна Свірыдзенка.

Даследаваўшы матэрыялы справы, суддзя Уладзімір Царыкаў прыйшоў да высновы, што факт удзелу 14 студзеня Лявонцьевай і Нітчанкі ў несанкцыянаваным пікетаванні знайшоў сваё пацверджанне. Пастанавіў аштрафаваць Анастасію Лявонцьеву на 16 базавых велічыняў (464 рублі), а Паліну Нітчанку пакараць адміністрацыйным арыштам на 10 сутак. Такім чынам, Паліна агулам правядзе за кратамі віцебскага ІЧУ 17 сутак.

**22.01.2021** Суд гораду Наваполацку 21 студзеня вынес прысуд у крымінальнай справе супраць Віктара Шаўры і Віталя Шыцікава паводле арт. 342 КК (арганізацыя альбо актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак) за падзеі 10 жніўня ў Наваполацку. Суддзя Віталь Лапко асудзіў іх на два гады «хіміі» кожнага, паведамляе ПЦ «Вясна».

Нагадаем, Віктар Шаўра быў затрыманы ў Наваполацку ўвечары 10 жніўня. Віктар Шаўра быў прызнаны палітычным зняволеным, пазней яго выпусцілі пад падпіску. Віталь Шыцікаў таксама знаходзіўся пад падпіскай аб нявыездзе.

Паводле абвінавачвання, «Віктар Шаўра разам з Віталём Шыцікавым і іншымі неўстаноўленымі асобамі вечарам 10 жніўня прынялі актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак... разам з іншымі рухаліся па праезнай частцы вуліцы Маладзёжнай Наваполацку, ішлі наперадзе групы грамадзян, на забаронены сігнал святлафора, перакрывалі рух транспарту, гучна крычалі «Жыве Беларусь!», «Ганьба», «Позор», «Уходи!», пляскалі ў далоні, нецэнзурна лаяліся ў бок прадстаўнікоў праваахоўных органаў».

Суд гораду Наваполацку (суддзя Віталь Лапко) асудзіў Шаўру і Шыцікава на 2 гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.



**25.01.20214** студзеня ўладальнік сялянскай фермерскай гаспадаркі «Плавь» Віктар Быкаў з невялікай вёскі Канашы быў прыцягнуты да адказнасці паводле ч.1 арт. 23.34 КаАП. Гарадоцкі раённы суд пакараў 54-гадовага фермера адміністрацыйным арыштам на 10 сутак за ўзняты на падворку бел-чырвона-белы сцяг.

Як распавёў Віктар Быкаў, у канцы лістападу на знак салідарнасці са зняволенымі ўдзельнікамі масавых пратэстаў ён узняў над уласнай сядзібай бел-чырвона-белы сцяг. Палотнішча прычапіў на канец даўгога драўлянага шаста. Відаць было здалёк. Правісеў сцяг да 3-га студзеня.

«Здавалася, вісеў, нікому не замінаў. Аднак, відаць, нехта падказаў. Трэцяга студзеня прыехалі міліцыянты. Мяне ўдома не было, працаваў. Пакінулі позву на вечар, а гэта была нядзеля. Відаць па ўсім, вельмі карцела мяне забраць, бо прайшліся нават па суседзях, распытвалі, ці вяду агітацыю. Паехаў сам у той жа дзень, дый на 10 сутак там і застаўся», – расказаў Віктар Быкаў.

Суд адбыўся 4 студзеня. Быкаў на працэсе шчыра распавёў, што вывесіў сцяг на знак пратэсту супраць парушэння Канстытуцыі, фальсіфікацыі выбараў, супраць гвалту і беззаконня, якое запанавала ў краіне. Удакладніў, што сцяг вісіць ужо больш за месяц.

Суддзя Ганна Гурынава прызнала Віктара Быкава вінаватым у парушэнні парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства (палічыла сцяг над сядзібай несанкцыянаваным пікетаваннем) і пакарала 10-дзённым адміністрацыйным арыштам.

Віктар Быкаў паставіўся да такога пакарання па-філасофску:

«Меркаваў, абыдзецца штрафам. Не чакаў прысуду на дзесяць сутак, але сказалі, што па-іншаму ніяк. Можна было ці нельга, але факт такі. Ну, і добра!»

**28.01.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 28 студзеня адбылося чарговае паседжанне ў крымінальнай справе віцябляніна Арцёма Ісакава, абвінавачанага паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Яму пагражае да 6 гадоў калоніі.

У судовай зале прысутнічаў пацярпелы міліцыянт Мікалай Вайцяхоўскі, якому абвінавачаны ўжо кампенсаваў 500 рублёў шкоды.

На паседжанні 28 студзеня была апытаная сведка Галіна Ф., якая непасрэдна прысутнічала падчас канфлікту і бачыла ўсё, што адбывалася, на свае вочы. Паводле яе словаў, 25 кастрычніка яна выйшла з сяброўкай з кавярні на вуліцы Талстога і пабачыла вялікую групу людзей. Іх гэта зацікавіла, і яны далучыліся да грамады. У групе грамадзян прайшлі да скрыжавання вуліц Смаленскай і Праўды.

Падчас канфлікту жанчына знаходзілася каля пацярпелага міліцыянта Вайцяхоўскага, брала яго за руку, размаўляла з ім, спрабуючы такім чынам супакоіць супрацоўніка МУС у цывільным. Але, як кажа жанчына, мужчына паводзіў сябе вельмі агрэсіўна і быў узбуджаны.



«Склалася такое ўражанне, што ён хоча кагосьці пабіць», – заявіла сведка.

Спадарыня, паводле яе словаў, пасля ўжывання балончыку знаходзілася побач зі пацярпелым каля 3-4 хвілін.

«Ці праводзіў ён якія-небудзь дзеянні або маніпуляцыі рукамі з тварам, якія паказвалі б, што мужчына адчувае дыскамфорт?» – спытала адвакатка. «Маску ён не здымаў, твар не цёр. Я з ім размаўляла, і ён нічога не рабіў», – адказала сведка. Суддзя Сяргей Будрэвіч удакладніў: «Якія наступствы павінны былі наступіць з-за газу? Пра які дыскамфорт ідзе гаворка?» «Я так разумею, што калі чалавек пацярпелы, то ён павінен ад чагосьці пацярпець. Я, калі з ім размаўляла, ніякіх пакутаў не бачыла», – адказала сведка.

На яе думку, ніякіх пашкоджанняў ад газу пацярпелы не атрымаў.

Мікалай Вайцяхоўскі не пагадзіўся з паказаннямі сведкі. Сказаў, што ў яго пачаліся слязіцца вочы, але не адразу, а толькі праз некалькі хвілін, калі ўжо пачаў міргаць. Запэўніў, што паводзіў сябе на акцыі вельмі спакойна і ўраўнаважана. А потым увогуле заявіў, што не памятае, ці насамрэч размаўляў ён са сведкай на акцыі.

Тады адвакатка падала хадайніцтва паглядзець відэазапіс, на якім бачна, што супрацоўнік міліцыі размаўляе са сведкай. Суддзя хадайніцтва адхіліў.

Наступнае пасяджэнне, на якім пройдуць спрэчкі бакоў, адбудзецца 3 лютага (пачатак у 10.30).

**28.01.2021** 28 студзеня ў судзе Віцебскага раёну прайшло слуханне адміністрацыйнай справы паводле ч.3 арт. 23.34 у дачыненні жыхаркі віцебскага раёну Юліі Ўласенкі. На прадэманстраваным відэафайле суддзя Міхаіл Зубеня апазнаў толькі голас жанчыны, але палічыў яе віну ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні даказанай. Аштрафаваў спадарыню Ўласенку на 40 базавых велічынь (1160 рублёў).

Паводле пратаколу, 8 студзеня Юлія Ўласенка «з шэрагам нявысветленых асобаў (усе ў масках) узяла ўдзел у не дазволеным уладамі пікетаванні на тэрыторыі, прылеглай да кавярні «Сава» ў вёсцы Лучынаўка Віцебскага раёну». Удзельнікі масавага мерапрыемства выгуквалі лозунгі «Жыве Беларусь!», «Свабоду!», «Верым, можам, пераможам!» ды іншыя, сцвярджалася ў пратаколе.

Вінаватай сябе Юлія Ўласенка не прызнала. Пераконвала, што ўвесь дзень была ўдома. Заявіла хадайніцтва апытаць сведкаў – сяброўку Святлану Зайцаву, сваю маці Алену Янушкоўскую і супрацоўніка РАУС, які складаў пратакол. Але Янушкоўскую, затрыманую напярэдадні, і міліцыянта суддзя выклікаць адмовіўся.

Юлія патлумачыла, што 8 студзеня разам з мужам і дзецьмі, а таксама з маці, сяброўкай Зайцавай і яе дачкой знаходзілася ўдома. Малыя дзеці гулялі з яе тэлефонам і тэлефонам мужа. Юлія, каб пераключыць малых на іншыя справы, забрала тэлефоны і паклала ў сумку Алены Янушкоўскай. У 14.10 тая па сваіх справах з'ехала на маршрутцы.




Бліжэй да вечара спахапіліся і зразумелі, што тэлефоны з'ехалі разам з Аленай. Каля 20.00 пачалі тэлефанаваць, дамовіліся, што забяруць тэлефоны, калі муж Юліі павязе ў Суйкава Святлану Зайцаву (Янушкоўская жыве ў гэтай жа вёсцы).

На прадэманстраваных Юліі скрыншоце з відэафайлу і на відэа з ютубу яна сябе не апазнала. Заявіла, што не мае падобнай вопраткі, а шапку не носіць ужо гадоў 15.

У судовым паседжанні быў апытаны старшыня Воранаўскага сельсавету Юрый Осіпаў. Менавіта ён стаў ініцыятарам разбору з нагоды апублікаванага Аленай Янушкоўскай на канале «Сапраўдная Беларусь» відэа. 10 студзеня ў інтэрнэце старшыня сельсавету наткнуўся на відэа, на якім невядомыя асобы ля кафэ «Сава» «праводзілі несанкцыянаваны пікет». Осіпаў звярнуўся да ўчастковага міліцыянта, які і давёў справу да суду.

Сведка Святлана Зайцава пацвердзіла, што цэлы дзень знаходзілася з Юліяй Ўласенкай у яе доме ў Плешчаніцах. Увечары муж Юліі завёз Зайцаву ў Суйкава і забраў тэлефоны, пакінутыя ў сумцы Янушкоўскай.

Вывучыўшы матэрыялы справы і апытаўшы сведкаў, суддзя Міхаіл Зубеня заявіў, што, не зважаючы на сцвярджэнне Ўласенкі і сведчанне Зайцавай, у суду няма падставаў не верыць сваім вачам і вушам. Зазначыў, што на відэа выразна чутны голас Уласенкі – і ніякай экспертызы праводзіць не трэба. Так бы мовіць, «крыніца гуку» добра бачная.

Суд палічыў цалкам даказаным удзел Юліі Ўласенкі ў пікетаванні. З улікам звестак пра асобу і наяўнасці двух няпоўнагадовых дзяцей суддзя Зубеня прызначыў Юліі пакаранне ў выглядзе штрафу памерам 40 базавых велічынь (1160 рублёў).

**29.01.2021** У мінулую суботу, 23-га студзеня, Ганну Каваленку і Алену Філіповіч затрымалі супрацоўнікі райаддзелу міліцыі Кастрычніцкага раёну. Як потым напісалі ў пратаколе, дзяўчаты «зладзілі шэсце ад дому №36 да дому №40 па вуліцы Леніна, трымаючы ў руках кветкі на знак пратэсту супраць зняволення палітвязняў», паведаміла Беларускае Радыё Рацыя.

У Алены Філіповіч быў букет белых хрызантэм з адным чырвоным гваздзіком, у Ганны Каваленкі – толькі белыя хрызантэмы. За гэта на іх зладзілі аблаву, распавялі дзяўчаты: «На нас набеглі чалавек 10, з двух бакоў, звязалі нам рукі. Пыталіся ў нас : »Ну што, дабегаліся?» Ніхто з іх не прадставіўся, упіхнулі ў машыну, і ўсё».

«Спачатку нас павезлі ў РАУС для высвятлення асобаў. Сказалі, што высветляць і адпусцяць. Мы не супраціўляліся, добра, паедзем. Але потым трымалі 13 гадзін у боксе пасля высвятлення асобаў і завезлі ў ІЧУ», – расказалі віцяблянкі.

Пад вартай Ганна Каваленка і Алена Філіповіч правялі амаль двое сутак. У панядзелак, 25-га студзеня, суддзя Кастрычніцкага райсуду Уладзімір Царыкаў пачаў судзіць іх праз скайп. Ён пастанавіў дакументы накіраваць на дапрацоўку ў міліцыю, бо пратаколы былі складзены з памылкамі. Дзяўчат выпусцілі, перад тым забраўшы ў іх тэлефоны – маўляў, у заклад, што яны заплацяць прысуджаны штраф.

Працяг суду адбыўся 29-га студзеня, але выніку няма: суддзя другі раз накіраваў матэрыялы на дапрацоўку. Маёмасць дзяўчатам так і не вярнулі.

**29.01.2021** Суд Віцебскага раёну 29 студзеня прызнаў блогерку Алену Янушкоўскую вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні (ч.3 арт. 23.34 КаАП) і пакараў яе адміністрацыйным арыштам на 7 сутак. Такое рашэнне прыняў суддзя Міхаіл Зубеня. Янушкоўская мае інваліднасць трэцяй групы, яна знаходзіцца за кратамі віцебскага ІЧУ ад 27 студзеня.

8 студзеня 2021 году блогерка Алена Янушкоўская, вядомая сваімі стрымамі на канале «Настоящая Беларусь», узяла ўдзел у сяброўскай гулянцы ў кавярні «Сава» пад Віцебскам. Там жа зняла трохвілінны відэаролік, на якім сябры віншуюць адзін аднога і ўсю Беларусь з Новым годам і Калядамі. Відэа віншавання пабачыў на ютуб-канале старшыня Воронаўскага сельсавету Восіпаў – і адразу ж паведаміў у міліцыю…

Янушкоўскую затрымалі 27 студзеня і пасля складання пратаколу паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП кінулі ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ) – у судовым працэсе яна ўдзельнічала праз скайп.

Паводле міліцэйскага пратаколу, Алена Янушкоўская 8 студзеня ўзяла ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні, удзельнікі якога выкрыквалі лозунгі «Жыве Беларусь!», «Лукашэнку ў аўтазак!» ды іншыя. Сваёй віны жанчына не прызнала і тлумачэнні даваць адмовілася.

«Ваш закон пазбаўляе мяне права на выказванне ўласнай думкі нават на прыватнай тэрыторыі», – сказала толькі.

Суддзя Міхаіл Зубеня, які дзень таму за ўдзел у той жа вечарыне аштрафаваў на 40 базавых велічынь дачку Алены Янушкоўскай Юлію Ўласенку, прызнаў вінаватай і яе маці – і пастанавіў пакараць яе адміністрацыйным арыштам на 7 сутак (двое сутак Алена ўжо адбыла).

Алене Янушкоўскай 55 гадоў, яна мае інваліднасць трэцяй групы.

**31.01.2021** У Віцебску 30 студзеня прайшоў працэс, які мусіць увайсці ў гісторыю беларускага судаводства. Суддзя Вераніка Барысава ў выязным паседжанні ў будынку Першамайскага РАУС Віцебску да поўначы разглядала справу 13 віцяблян, абвінавачаных паводле арт. 23.34 КаАП. Дзевяці чалавекам прысудзіла па 15 сутак арышту, чатыром – велізарныя штрафы.

Пра прысуды, вынесеныя Веранікай Барысавай, паведамілі адвакаткі, якія выйшлі з будынку Першамайскага РАУС ужо апоўначы 31 студзеня. Па словах адной з іх, такіх працэсаў яна яшчэ ніколі не бачыла.

Паводле адвакатак, справы 13 чалавек былі аб'яднаныя ў адзін працэс, які пачаўся ў актавай зале РАУС прыкладна а 15-й гадзіне (затрыманых прывезлі ў РАУС значна раней, не даўшы паснедаць у ІЧУ) і цягнуўся да поўначы. Некалькі разоў абвяшчалі перапынкі, бо людзям станавілася блага, і яны прасілі выклікаць хуткую дапамогу. Па сведчаннях сваякоў і паплечнікаў затрыманых, якія больш за 12 гадзін чакалі выніку суду каля пастарунку, «хуткая» прыязджала як мінімум 5 разоў.

Людзей, якія чакалі пад аддзяленнем міліцыі, на суд не пусцілі. Супрацоўнікі МУС патлумачылі чакальцам, што «суд адкрыты, але праходзіць на тэрыторыі рэжымнага аб’екту, таму трапіць на яго не ўдасца».

Пасля таго, як стала вядома, што большасць асуджаных застануцца пад вартай, іх сваякі спрабавалі перадаць ім перадачы з харчамі і адзеннем, але міліцыянты браць адмовіліся.

Спаслаліся на тое, што ўсіх затрыманых 30 студзеня кармілі. Між тым, жанчыны, якім прысудзілі штрафы і якія выйшлі з РАУС ужо за поўнач, сцвярджалі, што ў пастарунку ніхто іх не карміў – адзінае, далі магчымасць падсілкавацца тым, што было пры сабе.

Алена Жыхарская, Ніна Скрыпец, Святлана Скакун і Ганна Куліева прысуджаныя да штрафаў ад 30 да 50 базавых велічынь. Яны правялі трое сутак пад вартай і зараз знаходзяцца на волі.

Адна з жанчын, вызваленая ўначы, расказала, што ўсіх прызналі вінаватымі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве («размахвалі сцягамі», «выкрыквалі лозунгі»), хаця ніякіх відэадоказаў вінаватасці міліцыянты ў суд не падалі. Пратаколы складаў маёр Вадзім Склімянок. «Суткі» ад Барысавай атрымалі нават тыя, хто прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці ўпершыню (ч.1 арт. 23.34).

Астатнія ўдзельнікі суботняга працэсу ў Першамайскім РАУС асуджаныя на 15 сутак арышту і былі этапаваныя з пастарунку ў віцебскі ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ), які месціцца зараз у будынку СІЗА-2. Гэта Караліна Цярэнцьева, Андрэй Кулакоў, Аляксей Санько, Алег Рубін, Юрый Міхейцаў, Дзмітрый Карняенка, Ігар Ісакоўскі, Вячаслаў Казлоў і дзяўчына Валерыя (прозвішча высвятляецца).

Большасць з пералічаных затрымалі 27 студзеня каля 22-х гадзін у мікрараёне Тарны нібыта за акцыю, якую хацелі зладзіць. Сярод затрыманых аказаліся цалкам выпадковыя мінакі – спадар Казлоў з сяброўкай, якую пайшоў праводзіць да дому (абодвум таксама прысудзілі па 15 содняў арышту).

**01.02.2021** 29 студзеня пробашча расонскага касцёла ксяндза Вячаслава Барка зноўку выклікалі ў следчы камітэт. Следчыя прызначылі яшчэ 11 экспертыз відэаблога, які вядзе святар. Пад увагу СК трапілі 8 відэаролікаў, перадае Беларускае Радыё Рацыя.

Ужо трэці месяц доўжыцца праверка зместу выказванняў Вячаслава Барка ў відэаблогу на YouTube, які мае каля 5 тысяч падпісчыкаў. Следчыя высвятляюць, ці няма ў выказваннях святара заклікаў да экстрэмізму і распальвання міжнацыянальнай варажнечы. Дзве праведзеныя лінгвістычныя экспертызы паказалі, што няма. Але наперадзе – наступныя.

«Лінгвістычныя экспертызы дзве атрымалі, з імі пазнаёмілі. Там напісана, што заклікаў да экстрэмізму няма, і няма падставаў распачынаць крымінальную справу. Будуць яшчэ псіхалагічныя экспертызы: псіхолагі будуць вывучаць, да каго прамовы скіраваныя і ці няма ў іх заклікаў да нейкіх груп у грамадстве, каб распальваць варожасць», – патлумачыў каталіцкі святар.

Ксёндз Вячаслаў Барок кажа, што следчыя прызначылі яшчэ 11 экспертыз і што пад увагу следчага камітэту трапілі 8 відэаролікаў ягонага блога.

Барок катэгарычна адмаўляе намеры дэструктыўнага ўплыву на грамадства. Цвердзіць, што вядзе свой відэаблог дзеля папулярызацыі Божага слова і дзеля хрысціянскага і патрыятычнага выхавання сваіх землякоў.

Ксёндз Вячаслаў кажа, што тыя ж мэты ён пераследаваў, размяшчаючы ў сацыяльных сетках твор Уладзіміра Цэслера «Стоп лукашызм». Аднак у снежні мінулага году ён быў асуджаны паводле адміністрацыйнага артыкула 17.10 («Прапаганда або публічная дэманстраванне і (або) распаўсюд нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі»). 10 сутак ксёндз правёў пад арыштам у віцебскім ізалятары часовага ўтрымання.

**02.02.2021** Асістэнта кафедры агульнай стаматалогіі Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэту



Аляксандра Маісеева азнаёмілі 1 лютага з загадам аб звальненні з працы праз прагулы без важкіх прычын. Тое, што выкладчык трое сутак знаходзіўся за кратамі ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) і фізічна не мог выконваць свае працоўныя абавязкі, кіраўніцтва ВДМУ не палічыла апраўданнем яго адсутнасці.

«Мяне азнаёмілі з загадам аб звальненні толькі ўчора, 1 лютага, хоць яшчэ раней я зразумеў, што штосьці не так: не пабачыў свайго прозвішча ў раскладзе заняткаў на будучы семестр. Лічу, што гэта несправядліва, тым больш што звальняюць мяне па артыкуле», – сказаў Аляксандр Маісееў.

Аляксандр распавёў, што міліцыянты затрымалі яго 20 студзеня ў Кастрычніцкім РАУС, куды запрасілі для размовы пра бел-чырвона-белыя шторы, якія вісяць на акне ягонай кватэры. Замест размовы супрацоўнікі склалі на мужчыну пратакол паводле арт. 23.34 КаАП (за «несанкцыянаваны пікет») і, калі той не прызнаў сваёй віны, кінулі на 72 гадзіны ў ІЧУ. Менавіта таму ад серады да пятніцы Аляксандр Маісееў адсутнічаў на працоўным месцы і мае пра гэта даведку. Пазней суд Кастрычніцкага раёну прызнаў яго вінаватым (суддзя Уладзімір Царыкаў) і пакараў за БЧБ-фіранкі штрафам у памеры 8 базавых велічынь.

Аб'ектыўныя прычыны сваёй адсутнасці Аляксандр Маісееў выклаў у тлумачальнай цыдулцы кіраўніцтву навучальнай установы. Але станоўчага выніку гэта не мела. Згодна з загадам, ён будзе звольнены 5 лютага.

Мужчына збіраецца абскардзіць рашэнне аб звальненні. На думку праваабаронцаў, яно незаконнае і мае палітычны характар.

Аляксандр Маісееў працуе ў ВДМУ тры гады. Ён выкладае студэнтам агульную стаматалогію.

**03.02.2021** У крымінальным працэсе супраць віцябляніна Арцёма Ісакава, які 25 кастрычніка 2020 году ўжыў газавы балончык падчас шэсця, адбыліся спрэчкі бакоў. Пракурор папрасіў суд прызнаць Ісакава вінаватым і пакараць 6 гадамі пазбаўлення волі. Гэта максімальны тэрмін, прадугледжаны арт. 364 КК РБ.

Пракурорка Крысціна Мацвеева папрасіла суд «прызнаць Ісакава вінаватым у гвалце ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў з мэтай перашкоды іх законнай дзейнасці і на падставе санкцыі арт. 364 КК прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 6 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму».

Пры гэтым абвінаваўца прызнала наяўнасць змякчальных акалічнасцяў, а менавіта ўжо выплачаную супрацоўніку МУС маральную кампенсацыю ў памеры 500 рублёў, а таксама станоўчыя характарыстыкі абвінавачанага.

Адвакатка просіць апраўдаць Ісакава
У сваю чаргу, адвакатка Арцёма Ісакава звярнула ўвагу суду на супярэчлівыя паказанні пацярпелых і сведак-міліцыянтаў, на адсутнасць аб'ектыўных доказаў таго, што Ісакаў сапраўды нанёс ім сваімі дзеяннямі сур'ёзныя пашкоджанні, а таксама на тое, што не ведаў, супраць каго ўжывае балончык, бо міліцыянты былі ў цывільным і не прадстаўляліся.

Апроч таго, па выніках экспертызы, сляды газу былі выяўленыя толькі на куртцы аднаго з міліцыянтаў. На шапцы, масцы, іншых дэталях адзення іх не знайшлі.

«Якім чынам Ісакаў мог вызначыць, што гэта супрацоўнікі міліцыі? Ніхто не сказаў, што хоць адзін з пацярпелых назваўся Ісакаву супрацоўнікам міліцыі, паказваў пасведчанне. І нават пры затрыманні, калі Ісакаў ляжаў на зямлі, ніхто не патлумачыў яму, у сувязі з чым ён затрыманы», – заявіла адвакатка.

«Ніхто не адмяняў Закону аб органах унутраных спраў, дзе дакладна прапісана, што пры затрыманні супрацоўнікі органаў мусяць прадставіцца.

Адпаведна, казаць аб наяўнасці складу злачынства арт. 364, я лічу, наагул абсурдна», – падсумавала абаронца.

Яна папрасіла суд вынесці апраўдальны вырак і вызваліць Ісакава ў зале суду.

Ісакаў: Прынясу больш карысці грамадству на волі
Арцём Ісакаў часткова прызнаў сваю віну, але не пагадзіўся, што быў актыўным удзельнікам масавага мерапрыемства, мэты нанесці шкоду супрацоўнікам міліцыі ў яго не было.

«У СІЗА я быў у атачэнні забойцаў і наркаманаў, і мяне гэта вельмі гняце. Было цяжка. Лічу, што прынясу больш карысці грамадству і дзяржаве, знаходзячыся на волі», – сказаў у апошнім слове Арцём Ісакаў.

Судовае рашэнне будзе агучана суддзём Сяргеем Будрэвічам (суд Кастрычніцкага раёну Віцебску) 4 лютага ў 10.00.

**03.02.2021** Суд Аршанскага раёну і Воршы 1 лютага агучыў прысуд у крымінальнай справе паводле ч.1 арт. 368 (Абраза прэзідэнта РБ), распачатай супраць мясцовага жыхара Уладзіміра Шынкевіча. Ён прызнаны вінаватым і пакараны пазбаўленнем волі на 1 год і тры месяцы.

Па версіі следства, Уладзімір Шынкевіч апублікаваў у сацыяльнай сетцы «Одноклассники» зневажальны пост у дачыненні Лукашэнкі, паведамляе партал orsha.eu. Што канкрэтна ўтрымлівала публікацыя, невядома, бо справа разглядалася на закрытым судовым паседжанні.

Аршанец прызнаны вінаватым і пакараны пазбаўленнем волі на 1 год і тры месяцы. Адбываць пакаранне будзе ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ва ўстаноўленым законам парадку, паведамляецца на афіцыйным сайце Вярхоўнага суду.

**04.02.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 4 лютага быў агучаны абвінаваўчы прысуд у дачыненні да 26-гадовага Арцёма Ісакава, які ўжыў газавы балончык у бок міліцыянта ў цывільным падчас шэсця 25 кастрычніка. Суддзя Сяргей Будрэвіч пастанавіў пакараць Ісакава 3-ма гадамі пазбаўлення волі.

Напярэдадні пракурорка Крысціна Мацвеева прасіла для Ісакава 6 гадоў калоніі.

Арцём Ісакаў прызнаны «вінаватым у гвалце ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў у мэтах учынення перашкоды яго законнай дзейнасці і прымусу да змены характару гэтай дзейнасці». На падставе арт. 364 КК РБ суд прызначыў віцябляніну пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 3 гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага



рэжыму.Апроч таго, суд прыняў рашэнне спагнаць з Ісакава працэсуальныя выдаткі (94 рублёў 80 капеек), а аўтамабіль, мабільны тэлефон, тэлевізар і іншыя канфіскаваныя рэчы – пакінуць пад арыштам. Газавы балончык, як прылада злачынства, павінен быць знішчаны, пастанавіў суддзя Сяргей Будрэвіч.

Тэрмін знаходжання пад вартай ад 28 кастрычніка 2020 году да 3 лютага 2021 года будзе залічаны ў тэрмін пакарання.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ў апеляцыйным парадку ў Віцебскім абласным судзе цягам 10 сутак з дня атрымання копіі прысуду.

**04.01.2021** 3 лютага Віцебскі абласны суд разгледзеў тры скаргі на пастановы суду гораду Наваполацку, скаргу на рашэнне Пастаўскага раённага суду і скаргу на рашэнне суду Першамайскага раёну Віцебску. Усе пяць рашэнняў судоў першай інстанцый суддзі Святлана Іванова і Ірына Смалякова пакінулі без зменаў, а скаргі без задавальнення.

Журналіст-фрылансер з Паставаў Зміцер Лупач аспрэчваў прысуд раённага суду ад 22 снежня. Паводле судовай пастановы па артыкуле 22.9 КаАП журналіст быў аштрафаваны на 47 базавых велічыняў (1269 рублёў). Суд прызнаў Лупача вінаватым у тым, што без акрэдытацыі ў якасці журналіста замежнага СМІ ён узяў інтэрв'ю у двух жыхароў вёскі Дразды Пастаўскага раёну. Пазней відэасюжэт быў размешчаны на ютуб-канале «Белсату», што, на пагляд суду, з'яўляецца незаконным вырабам прадукцыі СМІ.

У сваёй скарзе журналіст спасылаўся на парушэнне судом Канстытуцыі, міжнародных прававых нормаў. Пераконваў, што суд не падаў неабвержных доказаў яго віны. Прасіў адмяніць пастанову, а справу спыніць праз адсутнасць у ягоных дзеяннях складу правапарушэння.

У судзе Лупач скаргу падтрымаў і заявіў, што ютуб-канал не з'яўляецца СМІ. Адзначыў, што ў справе ёсць памылкі. Сцвярджаў, што відэасюжэт быў адзняты не 7 снежня, як пераконвалі сведкі, а 30 лістапада.

Суддзя Святлана Іванова аргументы, выказаныя Лупачам, пад увагу не ўзяла і падставаў для адмены рашэння Пастаўскага суду не знайшла. Пакінула пастанову без зменаў, а скаргу без задавальнення.

75-гадовага навапалачаніна Анатоля Куліка паводле ч.3 арт. 23.34 наваполацкі суд прызнаў вінаватым у несанкцыянаваных шэсцях і сваёй пастановай аштрафаваў на 50 базавых велічынь (1350 рублёў).

Разгляд скаргі Анатоля Куліка суддзя Святлана Іванова пачала з таго, што загадала прыбраць накінутую паўз плечы бел-чырвона-белую палярыну. Навапалачанін спачатку адмовіўся выканаць загад суддзі, але пасля замяніў бчб-палярыну на чорную, якую суддзя нібыта і не заўважыла.

Гэткім чынам Анатоль Кулік спрабаваў звярнуць увагу суддзі на штучнасць і надуманасць абвінавачанняў з боку судоў і міліцыі.

Выкладаючы свае аргументы, Анатоль Кулік параўнаў паводзіны сілавых структураў у рэагаванні на бел-чырвона-белыя сімвалы з рэакцыяй быка на чырвоную анучу. Наваполацкі актывіст заклікаў суддзю не ўдзельнічаць у «гэтым вар'яцтве».

«Не ўдзельнічайце ў гэтым. Я вас прашу. Адыдзіце, станьце збоку. Усё, што цяпер робіцца ў судах не мае нічога блізкага да закону і паважлівага стаўлення да правоў чалавека», – выказаўся Кулік.

Не зважаючы на працяглыя тлумачэнні Куліка і выступ ягонага адваката, Святлана Іванова рашэнне суду Наваполацку не адмяніла, а скаргу не задаволіла.

Не задаволіла Святлана Іванова і скаргу Наталлі Цітовай. Паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП суд г. Наваполацку аштрафаваў грамадзянку на 20 базавых, прызнаўшы яе вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным вулічным шэсці.

Суддзя Ірына Смалякова адмовілася задаволіць скаргу Таццяны Міхайлавай. 8 студзеня суд Наваполацку за ўдзел у несанкцыянаваным шэсці паводле арт. 23.34 КаАП асудзіў Міхайлаву на тры базавыя велічыні.

Таксама суддзя Смалякова пакінула без задавальнення скаргу віцяблянкі Алены Куставай. 23 снежня суд Першамайскага раёну аштрафаваў жанчыну на тры і пяць базавых паводле арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства) і арт. 23.4 (непадпарадкаванне законнаму патрабаванню супрацоўніка МУС).

**05.02.2021** 4 лютага інжынер па выпрабаваннях заводу «Візас» і маці дваіх дзяцей Ніна Скрыпец атрымала з працы апавяшчэнне аб звальненні «праз скарачэнне штату». Скрыпец – адна з затрыманых і пакараных вялікім штрафам у «справе трынаццаці». Суд адбыўся 30 студзеня, а загад аб звальненні падпісаны 1 лютага. Гэткае супадзенне жанчына лічыць невыпадковым.

Тры дні да суду пасля затрымання Ніна Скрыпец правяла ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). Як пасля распавялі яе калегі, у гэты час на завод да галоўнага інжынера прыходзіў прадстаўнік КДБ. Цікавіўся спадарыняй Нінай і, відаць, «параіў» прыбраць інжынера Ніну Скрыпец з займанай пасады.

«Яшчэ і ў сераду, 3-га лютага, «камітэтчык» прыходзіў. Мне ў кулуарах сказалі, што ёсць загад звольніць мяне з заводу», – кажа Ніна Скрыпец.

Паводле жанчыны, да гэтага яна і так працавала ўсяго па 48 хвілін у дзень – 4 дні на тыдзень. На заводзе вельмі складанае эканамічнае становішча, фонд заработнай платы скарачаецца, але кіраўніцтва прытрымліваецца загаду Лукашэнкі пазбягаць масавага звальнення працоўных.

«Нягледзячы на мізэрны працоўны дзень, мая пасада там неабходная, яна ёсць у штаце, без яе немагчыма праводзіць выпрабаванне станкоў, кантроль і прыняцце станкоў да эксплуатацыі», – распавяла звольнены інжынер.

Ніна тлумачыць, што, не зважаючы на маленькі заробак, працягвала працаваць, бо не хацела лічыцца «дармаедкай». Да таго ж трэба апекавацца дзецьмі. Пры звальненні прапаноўвалі папрацаваць да 25-га траўня тэхнікам, пакуль не выйдзе з дэкрэтнага адпачынку іншая жанчына.



«То бок бяруць кантралёрам, але гэта ўжо паніжэнне пасады і заробку. Да таго ж у гэтым выпадку я трапляю ў наўпроставае службовае падпарадкаванне да свайго мужа – начальніка АТК, што забаронена», – тлумачыць Ніна.

Скрыпец лічыць, што яе звальненне ёсць прыхаваным пераследам за яе палітычныя погляды і актыўную грамадзянскую пазіцыю.

«Звальняцца, канечне, непрыемна. Але сказаць, што я вельмі засмуцілася, – не! Усе мы ведаем, у якой краіне жывём. Непрыемна ад цынічнасці выканаўцаў. Калі мяне затрымалі, то запалохвалі, што звольняць, пазбавяць інтэрнату, забяруць дзяцей…» – распавядае Скрыпец.

Ніна Скрыпец кажа, што завод «Візас» па-ранейшаму выпускае запатрабаваную прадукцыю, нават на тых абгрызках вытворчасці, якія захаваліся. Аднак існуюць вялікія праблемы з запазычанасцю.

«Нашыя «моцныя гаспадарнікі» завод загубілі. Для сённяшняга кіраўніцтва галоўнае – пераседзець, абы не пасадзілі. Неяк боўтаемся, але ў кіраўніцтва няма зацікаўленасці, таму працоўных не цэняць. Завод тупа дабіваюць. Некаму гэта выгадна», – выказвае занепакоенасць жанчына.

Неўзабаве пасля размовы Ніна Скрыпец паведаміла па тэлефоне, што да яе ў дзверы грукаюцца супрацоўнікі міліцыі, каб даставіць у РАУС. Як стала вядома пазней, яе і яшчэ адну «фігурантку» справы 13-ці Алену Жыхарскую даставілі у аддзяленні міліцыі, дзе адбылася размова (дэталі пакуль невядомыя). Абедзве жанчыны цяпер на свабодзе.

**05.02.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 4 лютага працягнуўся крымінальны працэс у справе 22-гадовай віцяблянкі Юліі Кашаверавай – былой медсястры 103-й асобнай мабільнай брыгады. Дзяўчыну абвінавачваюць у злосным хуліганстве. Паводле следства, на маршы пратэсту 4 кастрычніка 2020 году яна пашкодзіла мікрааўтобус міліцыі і сарвала маску з амапаўца, піша TUT.BY.

На судзе выступіў супрацоўнік АМАП, які распавёў, што ў дзверы бусіку «урэзаўся» хлопец, якога яны затрымлівалі, а «натоўп спрабаваў адбіць яго».

Паводле следства, 4 кастрычніка мінулага года Юлія Кашаверова рухалася ў калоне разам з іншымі ўдзельнікамі несанкцыянаванага мерапрыемства. Каля дома № 74 на Маскоўскім праспекце да пратэстоўцаў пад'ехала міліцыя. Аднаго з мужчын затрымлівалі. Удзельнікаў шэсця гэта абурыла, яны спрабавалі адбіць яго. У адказ супрацоўнікі ўжылі газавыя балончыкі. Падчас сутычкі з міліцыяй Кашаверова, як сцвярджае следства, пашкодзіла мікрааўтобус Ford Transit, які належыць УУС аблвыканкаму: «ўдарыла па ім нагой не менш за тры разы, нанёсшы ўмяціну і драпіны, а таксама кінула ўслед аўтамабілю драўляную палку». Міліцыі рэгіёну прычыніла тым самым шкоду на 841 рубель, паведаміў дзяржабвінаваўца. Раней, дарэчы, сілавікі паведамлялі аб 405 рублях шкоды, частку сумы абвінавачаная ўжо кампенсавала.
Апроч таго, паводле дадзеных следства, Кашаверова сарвала медычную маску і форменную шапку з камандзіра звяна АМАПу Аляксея Альхімовіча.

На першым судовым паседжанні 20 студзеня Аляксей Альхімовіч распавёў, што ён і яго калегі па загадзе свайго кіраўніцтва затрымалі маладога хлопца, «які кіраваў калонай, быў, напэўна, яе арганізатарам».

Амапавец Кішковіч: «Стукнуўся ён аб машыну моцна...»
На працэсе 4 лютага яшчэ адзін сведка з боку абвінавачання – супрацоўнік АМАП Максім Кішковіч, паведаміў, што хлопец, якога затрымлівалі, бегучы, стукнуўся аб міліцэйскі мікрааўтобус: «Нам паступіла ўказанне затрымаць хлопца ў чырвонай куртцы… Мы падышлі да яго, каб затрымаць, але ён паспрабаваў уцячы. Бег і не заўважыў нашую машыну, стукнуўся аб яе, прама ў дзверы пасярод аўтамабіля, адскочыў і ўпаў. Я яшчэ здзівіўся: як можна было не заўважыць на сваім шляху немаленькі аўтамабіль?»

«Удар у аўтамабіль быў моцны?» – удакладніў суддзя Сяргей Будрэвіч. «Так, стукнуўся ён аб машыну моцна, на паскарэнні», – пацвердзіў амапавец. У мікрааўтобус хлопца закінулі і на ім жа даставілі ў РАУС.

У пашкоджанні гэтага самага аўтамабіля і вінавацяць Юлію Кашавераву.

Кішковіч распавёў на судзе, што чуў у той дзень размову калег, што, маўляў, пашкоджанне на мікрааўтобусе магло з’явіцца і ад таго, што ў яго «урэзаўся затрыманы».

«Як выглядала пашкоджанне? Гэта была ўмяціна ці драпіна, паласа?» – спытаў суддзя. «Гэта не тое што ўмяціна, хутчэй за драпіна з пацёртасцямі, пасярод дзвярэй. Вертыкальная, крыху касая, сантыметраў 20 даўжынёй. Можа, больш». – «Па пратаколе, на мікрааўтобусе было тры пашкоджанні. А вы заявілі пра адно. Чаму?» – «Я бачыў самую вялікую драпіну, якая на ўзроўні вачэй. Тое, што знаходзілася ніжэй, уважліва не разглядаў».

«Людзі спрабавалі нас спыніць...»
Па словах Кішковіч, дэманстранты перашкаджалі затрымліваць хлопца: «Людзі спрабавалі нас спыніць. Чапляліся за вопратку, тузалі за рукі, крычалі. У нейкі момант я ўбачыў, што на зямлі ляжыць форменная шапка. Падняў яе і закінуў у аўтамабіль. Чыя яна, ня высвятляў: там было не да гэтага, бо натоўп націскаў і замінаў нам. Ужо калі ад’язджалі, я чуў, што людзі білі па аўтамабілі», – расказаў амапавец.

Юлію Кашеверову амапаўцы затрымалі, калі шэсце ўжо завяршылася і дзяўчына выйшла з крамы на вуліцы Церашковай.

«Нам па рацыі прыйшла інфармацыя, што цяпер трэба затрымаць дзяўчыну ў бірузовай куртцы, якая нанесла ўдары па службовым мікрааўтобусе. Мы ўбачылі, што гэтая дзяўчына зайшла ў краму, і чакалі, калі яна выйдзе. Потым затрымалі і адвезлі ў райаддзел. Яна паводзіла сябе спакойна, прад’явіла дакументы, але сказала, што ні на якія пытанні без адваката адказваць не будзе», – патлумачыў сведка.

Сведка: «Ён ляжаў каля бардзюру і не варушыўся»
Сведка з боку абароны Арцём Філімонаў пацвердзіў, што хлопец, якога затрымлівалі амапаўцы, упаў на зямлю:

«Хлопец у чырвонай куртцы бег уздоўж мікрааўтобуса – і раптам упаў… Ён ляжаў каля бардзюру, без руху, то бок зусім не варушыўся. Людзі спалохаліся, кінуліся да яго, каб дапамагчы. Я таксама падышоў, таму што я медык і гэта мой абавязак. Але міліцыянты ўзялі яго, зацягнулі ў машыну і павезлі», – расказаў сведка.

Працэс над Юліяй Кашаверавай працягваецца 5 лютага.



**06.02.2021** Цягам тыдня суд Дубровенскага раёну разгледзеў дзве адміністрацыйныя справы ў дачыненні да сужэнцаў Міхаіла (арт. 23.34 КаАП) і Людмілы (арт. 17.1 КаАП) Чамуракаў. Абедзве справы суд спыніў праз недаказанасць віны.

2 лютага Людміла Чамурака наведала пракуратуру, каб паведаміць, што яе муж Міхаіл не зможа з’явіцца па позве на 3 лютага. Напярэдадні яго затрымалі. Людміла мела даверанасць прадстаўляць інтарэсы мужа ў адміністрацыйных справах. Хацела даведацца, з якой прычыны Міхаіла выклікаюць да пракурора.

Дзверы пракуратуры аказаліся зачыненымі, але Людміле адкрыла прыбіральшчыца, якая і правяла яе на другі паверх.

Пабачаўшы Людмілу Чамураку, супрацоўнікі пракуратуры абурыліся і абвінавацілі жанчыну ў самавольстве. Маўляў, пракурорскія самі спускаюцца да наведнікаў на першы паверх. Пасля непрацяглай размовы Людміла пагадзілася спусціцца і пачакаць унізе, але запатрабавала кнігу скаргаў і прапаноў.

«Ніякага самавольства не было. Прайшла з дазволу, следам за прыбіральшчыцай. А мяне ў дадатак звінавацілі ў тым, што я з непавагай стаўлюся да тэхнічнага персаналу. Хаця самі нават не павіталіся.
Я запярэчыла, сказала, што роўна стаўлюся да прадстаўнікоў усіх прафесіяў і паважаю любую працу. А ў дадзеным выпадку проста канкрэтызавала, хто мне адчыніў дзверы», – расказвае Людміла.

Як далей распавядае жанчына, пракурора давялося пачакаць. Калі ён спусціўся, то пачаў наракаць на ейнае «самавольства». Заявіў, што зараз з’явіцца міліцыянт і ва ўсім разбярэцца. Для Людмілы гэта стала поўнай нечаканасцю. Пракурор праверыў пашпарт і даверанасць, але прычыну, з якой мужа выклікаюць у пракуратуру, назваць адмовіўся.

Пасля з’яўлення міліцыянта Людмілу затрымалі. У РАУС на яе склалі пратакол за дробнае хуліганства, пратрымалі 4 гадзіны. Што праўда, далі патэлефанаваць сваякам, каб тыя паклапаціліся пра няпоўнагадовага сына.

5 лютага адбыўся суд. Суддзя Ігар Татаеў справу спыніў праз недаказанасць віны. Хаця сведкі пераконвалі, што Людміла нібыта перашкаджала працы пракуратуры, выказвала непавагу да грамадзянаў і без дай прычыны запатрабавала кнігу скаргаў і прапаноў.

Наперадзе Людмілу Чамураку чакае яшчэ адзін суд паводле арт. 23.34 КаАП – за БЧБ-балонікі на акне ўласнага дому. Міхаіла Чамураку за тыя ж балонікі суд ужо пакараў 7 суткамі арышту. Як лічыць Людміла, хутчэй за ўсё яе справу будзе разглядаць суд Аршанскага раёну.

3 лютага адбыўся суд і над Міхаілам Чамуракам (арт. 23.34 КаАП). Дубровенскага актывіста абвінавачвалі ў тым, што ён нібыта развешваў БЧБ-стужкі на парэнчах моста. Справа таксама спыненая праз недаказанасць вінаватасці.

А ўжо ў пятніцу 5 лютага да Чамуракаў прыйшла цэлая камісія, каб даследаваць, ці не знаходзіцца сям'я, якая выхоўвае школьніка, у сацыяльна небяспечным становішчы. Ніякіх парушэнняў не выявіла, але на 25 лютага бацькоў выклікалі на так званы савет прафілактыкі.

Людміла лічыць невыпадковым з'яўленне камісіі пасля кваліфікацыі яе паводзінаў паводле артыкулу 17.1КаАП (дробнае хуліганства). Гэты артыкул дае магчымасць чыніць ціск на сям'ю і падставу для пастаноўкі на кантроль.

**08.02.2021** У жыхаркі Віцебску Таццяны Юхо міліцыя забрала 500 нумароў дайджэста «Витебский вестник», камп'ютарную аргтэхніку і аўтамабіль. Спадарыня
Таццяна распавяла, што міліцыянты затрымалі яе ў прыватным сектары, завезлі ў РАУС Першамайскага раёна і некалькі гадзін распытвалі, адкуль у яе нумары

«Витебского вестника», ці распаўсюджвае яна гэтае выданне, хто яго выпускае і раздрукоўвае, піша служба маніторынгу "Беларускай асацыяцыі журналістаў".

«Потым мяне павезлі дахаты і правялі агляд кватэры. Забралі ўсю аргтэхніку, у тым ліку камп'ютар мужа і непрацоўны сістэмны блок, якім ніхто не карыстаўся. Забралі мабільны тэлефон, мае асабістыя запісы і нават паветраныя шарыкі белага, чырвонага і аранжавага колеру – я іх захоўвала, каб упрыгожыць кватэру ў дзень народзінаў. Таксама ў міліцыі застаўся мой аўтамабіль. Супрацоўнікі сказалі, што пакідаюць яго ў якасці закладу да выплаты штрафу, які, па іх меркаванні, накладзе на мяне суд», – распавяла Таццяна Юхо.

У дачыненні жанчыны міліцыя распачала адміністрацыйную справу паводле артыкула 22.9 КаАП. Працэс мае адбыцца 10 лютага а 14.30 у судзе Чыгуначнага раёна Віцебска.

Даведка: «Витебский вестник» — гэта дайджэст мясцовых і агульнабеларускіх навін, выдаецца і распаўсюджваецца неперыядычна і на валанцёрскіх пачатках. Міліцыя шукае распаўсюднікаў і выдаўцоў, бо выданне робіць публічнай тую інфармацыю, якую не размяшчаюць дзяржаўныя СМІ. Яно арыентаванае на людзей сталага веку, якія не карыстаюцца інтэрнэтам і звыклі да "газетнага" фармату навін.

**10.02.2021** 10 лютага ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску суддзя Алена Цыганкова, разгледзеўшы адміністрацыйную справу паводле арт. 22.9 КаАП у дачыненні да распаўсюдніцы незалежнай прэсы Таццяны Юхо, аштрафавала яе на 30 базавых велічынь. Як паведамляла «Віцебская вясна», грамадзянку затрымалі ў прыватным сектары Віцебску і абвінавацілі ў незаконным распаўсюдзе дайжэсту «Витебский вестник».

Як патлумачыла Таццяна Юхо, па дамоўленасці бакоў суд пачаўся раней прызначанага тэрміну, таму патрапіць на працэс не здолеў ніводзін з тых, хто прыйшоў падтрымаць абвінавачаную.

Пасля суду Таццяна Юхо патлумачыла, што ў прыватным сектары Віцебску яна раздавала людзям газету «Витебский вестник». Затрымаў яе міліцэйскі патруль. Чалавек, які патэлефанаваў у міліцыю, сцвярджаў, што ў газеце надрукаваныя матэрыялы, скіраваныя супраць міліцыі і АМАП.

«Зразумела, што гэта хлусня. Пісьмовыя паказанні сведкі часткова хлуслівыя. Акрамя той часткі, дзе сцвярджаецца, што я раскідвала газеты ў паштовыя скрыні. Але ж я не збягала, і сведчанні, пададзеныя ў газеце, не носяць экстрэмісцкага ці супрацьзаконнага характару», – кажа Таццяна.

На судзе Таццяна Юхо даводзіла, што арт. 22.9 КаАП выкарыстоўваць у дачыненні да фізічнай асобы, далёкай ад журналістыкі, нельга. Суддзя Алена Цыганкова ейныя довады праігнаравала.



Каб прызнаць Таццяну Юхо вінаватай у справе паводле арт. 22.9 КаАП суддзі Алене Цыганковай хапіла дадзеных, зафіксаваных у пратаколе. Сведка на судзе паказанні не даваў.

«Газета ўтрымлівае аб'ектыўную інфармацыю. Я лічу – праўдзівую. Гэтая газета годная таго, каб яе прачытала як мага большае кола асобаў», – лічыць Таццяна.

Сённяшнюю пастанову суду Чыгуначнага раёну Віцебску Таццяна Юхо мае намер абскардзіць у Віцебскім абласным судзе.

**11.02.2021** «Калі ўладарыць бязбожнік – народ стогне» – гэтак гаворыцца ў біблійных прыпавесцях. 56-гадовая Валянціна Крыштопенка сфатаграфавалася з гэтай цытатай на плакаце ў розных месцах пасёлку Кастрычніцкая Віцебскага раёну.

Міліцыянты пабачылі фотаздымкі ў «Тэлеграме» і завялі супраць жанчыны справу паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. 11 лютага суд Віцебскага раёну прызнаў Крыштопенку вінаватай…

Справу Валянціны Крыштопенкі разглядаў суддзя Міхаіл Зубеня.

Паводле міліцэйскага пратаколу, 24 снежня 2020 году жанчына, аказваецца, «узяла ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні»: «стаяла з плакатам «Когда господствует нечестивый, народ стенает» у розных месцах пасёлку». На думку супрацоўнікаў МУС, гэтым самым Крыштопенка і парушыла заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Міліцыянты сцвярджалі, што відэаролік, створаны на падставе фотаздымкаў, быў размешчаны абвінавачанай у тэлеграм-канале «Віцебск 97%».

Валянціна Крыштопенка сваёй віны не прызнала і заявіла, што ролік у «Тэлеграме» не размяшчала. На яе погляд, артыкул 23.34 быў ужыты да яе неправамерна. «Біблія ў Беларусі не забароненая!» – канстатавала яна на судзе. Больш ніякіх тлумачэнняў не давала.

Суддзя Міхаіл Зубеня, спаслаўшыся на ранейшыя паказанні жанчыны, прызнаў яе вінаватай і пакараў штрафам у памеры 40 базавых велічынь (1160 рублёў). Валянціна Крыштопенка мае інваліднасць 1-й групы і жыве з пенсіі.

Нагадаем, на самым пачатку 2021 году (3 студзеня) у кватэры Валянціны Крыштопенкі міліцыянты правяліператрус, у выніку якога канфіскавалі плакат з біблійнай цытатай і два тэлефоны.

Валянціну Крыштопенку ўжо тройчы судзілі летась паводле арт. 23.34 КаАП за ўдзел у пратэставых акцыях. Першы раз папярэдзілі, другі раз аштрафавалі на 7 базавых велічынь, трэці раз – на 25 базавых. Новы штраф (40 б.в.) – амаль максімальны.

**11.02.2021** Уначы з 9-га на 10-га лютага ў Віцебску адбыўся шэраг ператрусаў і затрыманняў. Паводле звестак праваабаронцаў, у горадзе і Віцебскім раёне прайшлі 9 начных вобшукаў, як мінімум чацвёра віцяблян затрыманыя і знаходзяцца зараз пад вартай. Меркавана, гэта была «зачыстка» перад так званым Усебеларускім народным сходам.

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, увечары 9 лютага былі затрыманыя актывісты Аляксандр Мацяюк і Алег Баразна. Папярэдне, іх падазраюць ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага арт. 328 КК («Незаконны абарот наркотыкаў»).

У ноч з 9-га на 10-га лютага бадай адначасова ў Віцебску і раёне прайшлі шматлікіяператрусы. Санкцыі на начныя ператрусы даваў новы пракурор Віцебску Андрэй Шклярэўскі.

Падчас ператрусу ў пасёлку Ноўка Віцебскага раёну была затрыманая маці актывісткі Ангеліны Туравец Таццяна. Яе абвінавацілі ў непадпарадкаванні законным патрабаванням міліцыі (арт. 23.4 КаАП) і абразе службовай асобы (арт. 23.5 КаАП). 10 лютага суд Віцебскага раёну (суддзя Міхаіл Зубеня) прызнаў яе вінаватай па абодвух артыкулах і аштрафаваў на 30 базавых велічынь (870 рублёў).

Аднак на выхадзе з судовай залы яе чакалі ажно 10 супрацоўнікаў Віцебскага РАУС і следчага камітэту. Таццяна Туравец была зноў затрыманая – цяпер на 72 гадзіны да выстаўлення абвінавачання ўжо паводле крымінальнага артыкулу (арт. 364 КК, «Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка УС»). Жанчына знаходзіцца пад вартай.

Таксама стала вядома пра затрыманне валанцёркі грамадскай арганізацыі YMCA («Хрысціянская супольнасць дарослых і маладых») Яўгеніі Пачэпкі.

**12.02.2021** Анатоля Каханчыка, што жыве ў Полацкім раёне, асудзілі на 7 сутак арышту. Уладам не спадабалася, што частка яго прыватнай хаты пафарбаваная ў бел-чырвона-белыя колеры. Гаспадара БЧБ-хаты прызналі вінаватым у парушэнні парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 23.34 КаАП), паведамляе «Новы час».

Анатоля Каханчыка з вёскі Алешча, што за 30 кіламетраў ад Полацку, затрымалі ўвечары 9 лютага. На яго склалі пратакол паводле традыцыйнага «народнага» артыкула 23.34 КаАП – парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў. Масавым мерапрыемствам палічылі тое, што частка ягонага дому пафарбаваная ў колеры нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга.

Анатоля Каханчыка некалькі дзён правёў у ІЧУ. А 11 лютага суддзя суда Полацкага раёну і Полацку Уладзімір Бясецкі асудзіў сп. Анатоля на 7 сутак адміністрацыйнага арышту.

Актывіст Мікола Шарах паведаміў на сваёй старонцы ў «Фэйсбук», што сябра Свабоднага прафсаюзу Анатоля Каханчыка пакаралі 7 суткамі зняволення «за прыгожа пафарбаваную хату».

Спадар Анатоль Каханчык працуе на чыгунцы. Ягоная хата добра бачная пасажырам цягнікоў, якія праязджаюць паўз яе.

**14.02.2021** Суд Кастрычніцкага раёну 12 лютага прызнаў віцяблянку Яўгенію Пачэпку вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні і вынес ёй папярэджанне. Увесь склад правапарушэння – бел-чырвона-белы сцяг у вакне і такіх жа колераў майкі на балконе. Двое сутак да суду Яўгенія Пачэпка правяла за кратамі ІЧУ.

Як расказала Яўгенія Пачэпка, рапарт пра БЧБ-сцяг у вакне кватэры, дзе яна жыве, міліцыянты склалі яшчэ летась 27 снежня. Але затрымалі дзяўчыну толькі праз паўтары месяцы – 10 лютага.

«Участковы прыехаў да мяне дамоў, папярэдне патэлефанаваўшы. Хавацца я не стала, бо бегаць ад іх не збіраюся. Думала, што абыдзецца складаннем пратаколу ў РАУС, без сутак. Але ў ноч з серады на чацвер мяне адвезлі ў ізалятар часовага ўтрымання», – патлумачыла Яўгенія

Пачэпка. Суд праз скайп адбыўся 12 лютага. Віцяблянка не аспрэчвала, што вывешвала сцяг, але сваёй віны ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні (ч.1 арт. 23.34 КаАП) не прызнала.

Суддзя Ілля Белавус вынес рашэнне папярэдзіць Яўгенію Пачэпку. Яна на волі.

**16.02.2021** На досвітку 16 лютага супрацоўнікі МУС прыйшлі зператрусам да бацькоў віцебскай праваабаронцы Ірыны Траццяковай. Як паведаміла сама Ірына, вобшук працягваўся больш за гадзіну.

«Міліцыянтаў цікавілі дакументы, літаратура, флэшкі, сімкі, але не забралі сістэмны блок ПК.

У мяне там шмат праваабарончай літаратуры, але канфіскавалі толькі адну кніжку пад назвай «Маніторынг аддзяленняў міліцыі», – паведаміла Ірына Траццякова.

У сувязі з чым прайшоў ператрус, пакуль невядома.

Ператрусы і затрыманні зранку 16 лютага адбыліся ва ўсёй краіне.

Каментарый СК

Ранішнюю аблаву на журналістаў і праваабаронцаў 16 лютага афіцыйна пракаментаваў Следчы камітэт. Паводле СК, працягваецца расследаванне крымінальнай справы паводле арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) Крымінальнага кодэкса Беларусі. «У межах папярэдняга расследавання з мэтай устанаўлення абставінаў фінансавання пратэставай дзейнасці следствам ініцыяванае правядзенне ператрусаў у арганізацыях, якія пазіцыянуюць сябе як праваабарончыя», – паведамілі ў СК. Ператрусы праводзяць супрацоўнікі ГУБАЗіК МУС і санкцыянаваныя Генеральнай пракуратурай, дадаецца.

**17.02.2021** 16 лютага адбыўся ператрус у вядомага віцебскага праваабаронцы Паўла Левінава. Яго затрымалі пасля 16-й гадзіны, вобшук скончыўся ў 22.30. Стала вядома, што следчыя шукалі не толькі ў кватэры Левінава, але і там, дзе раней жыла ягоная маці-нябожчыца. Пасля ператрусаў Левінава не затрымалі, ён на волі.

У Паўла Левінава быў канфіскаваны мабільны тэлефон, таму на сувязь ён пакуль не выходзіць.

Як паведамілі блізкія яму людзі, у выніку ператрусаў былі канфіскаваныя таксама іншыя лічбавыя носьбіты (флэшкі, планшэт, сістэмны блок ПК), усяго – 32 найменні. А таксама – 236 аркушаў друкаванага тэксту, нататнік, асабістыя грошы.

Ператрус праводзілі супрацоўнікі ГУБАЗіК. Паводле пастановы аб правядзенні вобшуку, ён праходзіў у межах папярэдняга расследавання крымінальнай справы паводле арт. 342 КК (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).

Пасля ператрусаў Паўла Левінава не затрымалі. Ён не мае прававога статусу і знаходзіцца на волі.

Нагадаем, што ў Віцебску 16 лютага ператрус таксама прайшоў у бацькоў праваабаронцы Ірыны Траццяковай.

**18.02.2021** Віцебскі прадпрымальнік і дырэктар фірмы Уладзіміру Пунько правёў 7 сутак у ІЧУ за чырвоную паласу на ўласным балконе.

Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаў яго вінаватым у правядзенні несанкцыянаванага пікетавання (ч.3 арт. 23.34 КаАП). Суддзя Іна Грабоўская разглядала справу Пунько на выязным пасяджэнні ў ізалятары часовага ўтрымання.

Як і многія беларусы, Уладзімір Пунько пачаў праяўляць грамадзянскую актыўнасць пасля прэзідэнцкіх выбараў. Неаднаразова ўдзельнічаў у мірных шэсцях, за што ў кастрычніку 2020 году адбыў агулам 17 сутак арышту (па дзвюх справах).

Тады ж, у кастрычніку, за чырвоную паласу на балконе быў складзены першы адміністрацыйны пратакол – паводле арт. 21.14 КаАП («Парушэнне правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў»). Разглядаць справу мелася спецыяльная камісія пры выканкаме, але чыноўнікі займацца гэтым не сталі – па сканчэнні тэрміну даўнасці справу спынілі.

Аднак 15 студзеня да Пунько прыехалі супрацоўнікі МУС і затрымалі дзяўчыну, аспірантку-медыка, якая гасціла ў яго. Яе даставілі ў Кастрычніцкі РАУС. Гаспадар кватэры паехаў у аддзяленне міліцыі, але быў там затрыманы і змешчаны ў ІЧУ.

Перш чым скласці пратакол, супрацоўнік міліцыі Віталь Праліч выставіў умовы: калі зафарбуе паласу на балконе – яго адпусцяць дамоў і пратаколу не будзе. Уладзімір адмовіўся.

«Гэта не сцяг, гэта вынік маіх памкненняў да прыгажосці, і зафарбоўваць не буду, бо мне падабаецца», – адказаў Уладзімір Пунько.

Трое сутак да суду, ад 15 да 18 студзеня, ён правёў за кратамі ІЧУ. На трэці дзень суддзя Іна Грабоўская прызнала яго вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні і пакарала 7 суткамі арышту паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. Суд праходзіў у ізалятары.

Выйшаўшы на волю, прадпрымальнік так і не зафарбаваў «чырвоную хвалю» на балконе.

**19.02.2021** 19 лютага ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску закончыліся судовыя слуханні ў крымінальнай справе віцяблянкі Юліі Кашаверавай, абвінавачанай у злачынстве паводле часткі 2 артыкулу 339 КК (злоснае хуліганства). Адбыліся судовыя спрэчкі бакоў. Прысуд агучаць 22 лютага.

Юлія Кашаверава прызнала віну часткова. Яна не адмаўляла, што пасля таго, як ёй не далі аказаць дапамогу пацярпеламу, не стрымалася і нанесла тры ўдары па задніх дзвярах міліцэйскага мікрааўтобуса. Але запэўніла, што па правых бакавых – udараў не наносіла, маску і кепку з супрацоўніка МУС не зрывала.

Пракуратура запатрабавала 6 гадоў
Пракурор Лабацкі 19 лютага пераконваў, што ўчыненае злачынства звязанае з актыўным непадпарадкаваннем супрацоўнікам МУС пры выкананні імі службовых абавязкаў. Прасіў прызнаць Юлію Кашавераву вінаватай ва ўчыненні злачынства паводле ч. 2 арт. 339 КК і прымяніць у дачыненні да яе ізаляцыю ад грамадства.

Настойваў лічыць яе дзеянні наўмыснымі, якія груба парушалі грамадскі парадак, выказвалі яўную непавагу да грамадства, і суправаджаліся пашкоджаннем чужой маёмасці.

Прасіў прызначыць Кашаверавай пакаранне ў выглядзе зняволення тэрмінам на 6 гадоў з адбываннем у папраўчай калоніі агульнага рэжыму.

Адвакатка просіць апраўдаць Кашавераву



Абаронца Кашаверавай звярнула ўвагу суду на супярэчлівыя сведчанні камандзіра звяна АМАПу Аляксея Альхімовіча, з якога Кашаверава нібыта сарвала маску і кепку. Між іншага, ён паказаў, што не бачыў моманту, калі яе зрывалі. Адвакатка настойвала, што супярэчлівыя паказанні Альхімовіча не могуць быць прызнаныя дакладнымі і пакладзенымі ў аснову абвінавачання.

Адвакатка нагадала, што першапачаткова пры выстаўленні абвінавачвання Кашевераву не вінавацілі ў зрыванні маскі, кепкі і ў пашкоджанні бакавых дзвярэй мікрааўтобуса. А дзеянні кваліфікаваліся паводле ч.1 арт. 339 КК (хуліганства).

Юлія Кашаверава неаднойчы запэўнівала, што кепку яна падняла з зямлі і перадала іншай дзяўчыне. Момант перадачы зафіксаваны на відэа.

Апытаныя ў судовым паседжанні сведкі паказалі, што пашкоджанне бакавых дзвярэй магло адбыцца ў выніку ўдару аб яе грамадзяніна, якога тады затрымлівалі. Ніхто з апытаных не засведчыў, што пашкоджанні маглі быць зробленыя Кашаверавай.

Яшчэ 2 кастрычніка ў Кастрычніцкім РАУС Кашаверава не адмаўлялася ад таго, што нанесла тры ўдары па задняй частцы аўтамабіля. Прызнанне было зробленае яшчэ да завядзення крымінальнай справы, што сведчыць пра праўдзівасць падабароннай, а паводле ч.1 арт. 169 КПК можа расцэньвацца як яўка з павіннай.

Сыходзячы з гэтага, адвакатка прасіла апраўдаць сваю падабаронную праз адсутнасць у яе дзеяннях складу злачынства паводле ч. 2 арт.339 КК.

Кашаверава: «Не пазбаўляйце мяне свабоды!..»
У апошнім слове Юлія нагадала, што з самага дзяцінства бацькі вучылі яе дабрыні, узаемадапамозе, клопату аб людзях. Менавіта таму яна і выбрала прафесію медсястры. Будучых медыкаў вучылі дапамагаць пацярпелым людзям незалежна ад іх статусу і ад таго, дзе здарылася бяда.

«4 кастрычніка ў натоўпе я пабачыла чалавека, які ляжаў тварам уніз. Першае, што прыйшло ў галаву, – гэта даведацца, што здарылася, ці не страціў ён прытомнасць, і дапамагчы. У гэты момант я прыгадала маці, за жыццё якой змагалася ўся сям’я», – тлумачыла Юлія.

Дзяўчына некалькі разоў спрабавала падысці да чалавека, а потым міліцыянты ўжылі газ, а на зямлі ўжо нікога не было – невядомы хлопец знік.

«Мне стала крыўдна за сябе, бо не здолела дапамагчы. Так, я прызнаю сваю віну: я ўдарыла па машыне тры разы. Я ўчыніла правапарушэнне, але не судзіце мяне строга. Не пазбаўляйце мяне свабоды!» – скончыла Юлія Кашаверава.

Прысуд будзе вынесены 22 лютага (14.10).

**19.02.2021** Полацкі суд 18 і 19 лютага «суткамі» і штрафамі пакараў семярых жыхароў гораду за тое, што яны нібыта фатаграфаваліся на фоне бел-чырвона-белага сцяга.

Чацвёра палачан атрымалі вялікія штрафы, трое прысуджаныя да арыштаў.

Увечары 16 лютага ў раёне «Аэрадрому» ў Полацку затрымалі сем чалавек – пяць жанчын і дваіх мужчын. Усіх абвінавацілі ў арганізацыі незаконнага масавага мерапрыемства: фатаграфаваліся на фоне сцяга і выкладалі фота ў тэлеграм-каналах. Затрыманыя сваёй віны не прызналі.

На судзе міліцыянты не падалі ніякіх доказаў вінаватасці затрыманых – не было ні фотаздымкаў, ні фактаў іх публікацыі ў інтэрнэце. Затое былі сведчанні палачанкі Тамашэвіч, якая нібыта бачыла, як грамадзяне фатаграфаваліся са сцягам.

Пазней аказалася, што гэта менавіта яна тэлефанавала ў міліцыю. Высветлілася таксама, што Алена Тамашэвіч – супрацоўніца СК. Затрыманнем жа мірных грамадзян 16 лютага кіраваў капітан міліцыі Сяргей Лемеш.

Судовыя паседжанні праходзілі па скайпе, калі затрыманыя знаходзіліся ў РАУС. Дзяніс Кухто асуджаны на 15 сутак арышту (суддзя Уладзімір Бясецкі), Павел Хошчанка – на 15 сутак (суддзя Людміла Блізнёва), Валянціна Сергіенка – на 7 сутак (суддзя Раіса Штуро), Вольга Папкова і Марына Белавус аштрафаваныя на 30 базавых велічынь (суддзя Віктар Баліка), Ірына Рабіза пакараная штрафам на 50 базавых велічынь (суддзя Дзергачоў), Алена Барздукова – на 30 базавых (Блізнёва).

У некаторых з затрыманых прайшлі ператрусы.

**22.02.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску 22 лютага пачаў разглядаць крымінальную справу 54-гадовага Уладзіміра Малахоўскага. Яго абвінавачваюць паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза гвалтам у дачыненні да супрацоўнікаў МУС»). Ад 13 студзеня мужчына ўтрымліваецца ў СІЗА-2. Ён мае трэцюю групу інваліднасці і хварэе на анкалогію.

Справу разбірае суддзя Таццяна Родзіна.

Паводле абвінавачання, агучанага 22 лютага пракуроркай, Уладзімір Малахоўскі падчас затрымання спрабаваў нанесці траўмуючыя ўдары па розных часцях цела міліцыянтаў, пашкодзіў форму, завалодаў міліцэйскім жэтонам, а пазней, ужо будучы затрыманым і знаходзячыся ў аўтазаку, распыліў газ з балончыку ў бок міліцыянтаў.

Сваёй віны Ўладзімір Малахоўскі не прызнаў.

За сарваны жэтон - 1000 рублёў
Пацярпелымі ў гэтай справе праходзяць трое супрацоўнікаў міліцыі – Юрый Качыхін, Аляксей Емяльянаў і Пазнякоў. На першым паседжанні іх апыталі.

Дзяржабвінаваўца (прозвішча ўдакладняецца) пачынала апытваць пацярпелых з пытання: «Ці вядомыя вам вынікі прэзідэнцкіх выбараў? Ці ведаеце, хто непасрэдна стаў пераможцам?» І толькі пасля гэтага пераходзіла да пытанняў, звязаных з абставінамі справы.

Паказанні супрацоўніка Чыгуначнага РАУС Віцебску Юрыя Качыхіна адрозніваліся ад тых, якія ён даваў падчас следства і якія фігуруюць у матэрыялах справы. Гэтак, на судзе ён заявіў, што падчас затрымання не выкрыкваў ніякіх папярэджанняў у бок абвінавачанага, а спрабаваў затрымаць яго моўчкі, бо «усё адбывалася вельмі хутка, і не было часу». Сцвердзіў таксама, што не бачыў моманту зрывання нагруднага знаку з формы і што заўважыў прапажу толькі праз 10 хвілін. У ранейшых паказаннях ён сцвярджаў, што папярэджваў абвінавачанага, а таксама адчуў як з сілай з яго быў сарваны жэтон.



Качыхін заявіў, што папярэднія паказанні не адпавядаюць рэчаіснасці, і папрасіў лічыць праўдзівымі тыя, што даў на судзе. За сарваны знак выставіў іскавыя патрабаванні ў памеры 1000 рублёў.

Бюлетэня не далі
Пацярпелы Аляксей Емяльянаў, які знаходзіўся ў аўтазаку ў момант распылення газу разам з Пазняковым, таксама выставіў маральную кампенсацыю ў памеры 1000 рублёў. Пры гэтым прызнаўся, што ніякіх пашкоджанняў цела ў яго не было. Хоча атрымаць кампенсацыю, бо «была трывога і ўнутраны дыскамфорт».

Расказаў, што на наступны дзень звяртаўся да афтальмолага, але бюлетэнь яму не далі. Міліцыянт прызнаўся, што медычную маску, якая была на ім у момант распылення газу і якая магла быць рэчавым доказам, ён пасля інцыдэнту памыў.

Пагражае да 6 гадоў
Уладзіміру Малахоўскаму 54 гады, выхоўвае двух няпоўнагадовых дзяцей. Ён сябра партыі БНФ. Па словах жонкі Ірыны, ён 4 разы праходзіў хіміятэрапію і зараз вельмі аслаблены, да таго ж у СІЗА прастудзіўся. Нягледзячы на кепскі стан здароўя, меру стрымання яму не змяняюць.

За дзеянні, якія інкрымінуюць віцябляніну паводле арт. 364 КК, яго могуць асудзіць на 6 гадоў калоніі. Суд працягнецца 23 лютага.

**23.02.2021** 23 лютага суд Кастрычніцкага раёну Віцебску завяршыў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 22-гадовай віцяблянкі Юліі Кашаверавай, якую прызнаў вінаватай у наўмысных дзеяннях, якія парушалі грамадскі парадак і прычынілі шкоду чужой маёмасці. Дзеянне кваліфікаванае, як хуліганства. На падставе ч.1 арт. 339 КК суд прысудзіў Кашавераву да пазбаўлення волі на 1 год і 6 месяцаў у калоніі агульнага рэжыму.

Да вынясення прысуду ў судовым паседжанні былі паўторна даследаваныя паказанні Юліі Кашаверавай, якія мелі пэўныя разыходжанні, а таксама параўнаныя два відэазапісы, пададзеныя рознымі бакамі судовага следства.

Як вынікае з канчатковага выраку, суд улічыў аргументацыю, выказаную адвакатам падчас слухання 23 лютага. Замест шасці гадоў зняволення, запатрабаваных пракуратурай паводле ч. 2 арт.339 («Злоснае хуліганства»), дзеянні Юліі Кашаверавай былі перакваліфікаваныя на частку 1 арт. 339 («Хуліганства»).

У тэрмін пакарання суд залічыў Кашаверавай час знаходжання пад вартай ад 20 кастрычніка 2020 году да 22 лютага 2021 году.

Суддзя Сяргей Будрэвіч адмовіў у задавальненні грамадзянскага пазову пракурору гораду Віцебску, заяўленага ў інтарэсах аўтагаспадаркі УУС аблвыканкаму. Арышт, накладзены на прыватныя рэчы асуджанай Кашаверавай, суд адмяніў.

**24.02.2021** 22 лютага суд Першамайскага раёну прызнаў 30-гадовага віцябляніна вінаватым у абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў.

У выніку бацьку двух дзяцей прысудзілі да двух гадоў «хіміі» за каментар у Instagram, якім нібыта ён абразіў міліцыянта, паведамляюць «Народныя навіны Віцебска».

Па версіі суду, 3 кастрычніка 2020 году віцяблянін абразіў міліцыянта – кіроўцу роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі АУС адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску, размясціўшы каментар, у якім змяшчалася выказанае ў непрыстойнай, лаянкавай форме абраза на адрас пацярпелага. Абвінавачаны негатыўна ацэньваў апошняга, паведамляе прэс-служба Віцебскага абласнога суду.

Як сцвярджаецца, на судзе мужчына цалкам прызнаў сябе вінаватым у інкрымінаваным яму злачынстве. Суд палічыў змякчальнымі абставінамі чыстасардэчнае раскаянне і наяўнасць двух малалетніх дзяцей. Раней мужчына да адказнасці не прыцягваўся.

У выніку, на падставе арт. 369 КК мужчыну прысудзілі да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на 2 гады. Апроч таго, у яго канфіскавалі смартфон «Xiaomi Redmi 7A» – як сродак здзяйснення злачынства.

Суд прызначыў віцябляніну амаль максімальнае пакаранне, прадугледжанае санкцыямі гэтага артыкула (да 3 гадоў абмежавання волі), хоць яны прадугледжваюць і больш мяккія віды ўздзеяння – штраф і грамадскія або папраўчыя работы.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ва ўстаноўленым законам парадку.

**25.02.2021** Жыхара вёсцы Алёшча Полацкага раёну Анатоля Каханчыка, які пафарбаваў фасад сваёй хаты ў бел-чырвона-белыя колеры, звольнілі з працы. Ён 38 гадоў адпрацаваў на чыгунцы. Не дапрацаваў да пенсіі тры гады.

«Пасля таго, як я адседзеў сем содняў у полацкім ІЧУ за нібыта несанкцыянаваны пікет, які, атрымліваецца, зладзіла мая хата, мяне выклікала кіраўніцтва аддзялення чыгункі ў Полацк. Запыталіся: ну што будзем з гэтым рабіць? Паразмаўлялі і вырашылі, што я напішу заяву аб звальненні па згодзе бакоў», – расказаў Анатоль Каханчык.

З ягоных словаў, кіраўніцтва ставілася да яго вельмі добра, але на кіраўнікоў націснулі.

Апошнія гады Каханчык працаваў брыгадзірам пуцейнай брыгады. Ён не дапрацаваў да пенсіі тры гады. Верыць, што, калі праз пару месяцаў у Беларусі ўсё памяняецца да лепшага, яму самі патэлефануюць з Полацку і прапануюць вярнуцца працаваць.

Анатоль Каханчык расказаў таксама, што ў міліцыі яго папярэдзілі аб тым, што калі не зафарбуе бел-чырвона-белы сцяг на сцяне дому, то яго зноў пасадзяць на суткі.

«Але я не зафарбую. Так ім і сказаў, што, маўляў, у вас адзін варыянт – трымаць мяне за кратамі, але хата ўсё адно застанецца бел-чырвона-белай», – кажа Каханчык.

Анатолю Каханчыку 61 год, ён мае траіх дарослых дзяцей і ўнукаў, якія цалкам яго падтрымліваюць. Анатоль – сябра КХП БНФ.

**26.02.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 26 лютага адбыліся спрэчкі бакоў у справе віцябляніна Уладзіміра Малахоўскага, якога абвінавачваюць паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза гвалтам у дачыненні да супрацоўнікаў МУС»). Журналістаў і сваякоў падсуднага на паседжанне не пусцілі – трапіла толькі жонка.

Яна паведаміла, што пракурорка запатрабавала прызнаць яе мужа вінаватым і пакараць пазбаўленнем волі на 6 гадоў.

«Пракурорка просіць пакараць майго мужа 6 гадамі калоніі. Адвакатка настойвае, што мера пакарання мусіць быць не звязаная з пазбаўленнем волі, бо Уладзімір мае інваліднасць, хварэе на анкалогію і выхоўвае дваіх няпоўнагадовых дзяцей. Прысуд абвесцяць у панядзелак 1 сакавіка», – паведаміла жонка Уладзіміра Малахоўскага Ірына.

Справу Уладзіміра Малахоўскага разглядае суддзя Таццяна Родзіна. Сваякоў падсуднага, паплечнікаў і журналістаў на працэс не пускаюць: спасылаюцца на тое, што ў зале суду мала месца.

Прапускаюць толькі жонку і ўдзельнікаў працэсу, у тым ліку трох пацярпелых міліцыянтаў. Па словах спадарыні Ірыны, 26 лютага ў судовай зале адна з лавак была перавернутая «дагары нагамі». Але нават у такой сітуацыі хапіла б месца, каб на паседжанні прысутнічалі іншыя слухачы.

Жонка абвінавачанага паведаміла таксама, што на паседжанні ў пятніцу яе муж выглядаў лепш, чым у сераду 24 лютага, калі Уладзіміра некалькі разоў выводзілі з залы «папіць вады». Падчас судовых спрэчак суддзя дазволіла Малахоўскаму, адказваючы на пытанні, не ўставаць з лаўкі. Жонка кажа, што яе муж у СІЗА прастудзіўся і зараз у яго бранхіт.

Паводле абвінавачання, Уладзімір Малахоўскі падчас затрымання на несанкцыянаваным шэсці 13 верасня спрабаваў нанесці траўмуючыя ўдары па розных часцях цела міліцыянтаў, завалодаў міліцэйскім жэтонам, а пазней, ужо будучы затрыманым і знаходзячыся ў аўтазаку, распыліў газ з балончыку ў бок міліцыянтаў.

Адвакатка падчас спрэчак сцвярджала, што факт ужывання балончыку ў аўтазаку застаўся недаказаным.

Пацярпелымі на працэсе выступаюць міліцыянты Юрый Качыхін, Аляксей Емяльянаў і Пазнякоў. Усе трое выставілі грамадзянскія пазовы аб маральнай кампенсацыі на суму 1000 рублёў кожны.

Прысуд агучаць 1 сакавіка ў 10.00.

**01.03.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 1 сакавіка вынеслі абвінавачвальны прысуд у дачыненні да 54 гадовага Уладзіміра Малахоўскага, якому інкрымінавалі гвалтоўныя дзеянні супраць міліцыянтаў (арт. 364 КК). Суддзя Таццяна Родзіна прызнала віцябляніна вінаватым і пакарала пазбаўленнем волі на 3 гады і 6 месяцаў у калоніі агульнага рэжыму.

«Тое, што мы пачулі, гэта, канешне, шок! Яны не ўлічылі наагул нічога: тое, што чалавек хворы на анкалогію, што чалавеку патрабуецца абследаванне два разы на год у абавязковым парадку. Яны не ўлічылі, што ў яго двое малалетніх дзяцей», – сказала пасля абвяшчэння прысуду сваячка Уладзіміра Малахоўскага Ларыса, якой удалося трапіць у судовую залу.

Журналістаў, праваабаронцаў і слухачоў на абвяшчэнне прысуду не пусцілі. Наагул, працэс над Малахоўскім праходзіў практычна ў закрытым рэжыме.

Згодна з прысудам, Уладзімір Малахоўскі мусіць таксама выплаціць агулам 3000 рублёў маральнай кампенсацыі пацярпелым міліцыянтам - Качыхіну, Емяльянаву і Пазнякову.

«А ён жа атрымлівае пенсію 247 рублёў. Я думаю Бог іх пакарае», – абурылася спадарыня Ларыса.

Нагадаем, супраць мужчыны было выстаўлена абвінавачанне паводле артыкулу 364 КК РБ («Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў»). Паводле абвінавачання, Уладзімір Малахоўскі падчас затрымання на несанкцыянаваным шэсці 13 верасня спрабаваў нанесці траўмуючыя ўдары па розных часцях цела міліцыянтаў, завалодаў міліцэйскім жэтонам, а пазней, ужо будучы затрыманым і знаходзячыся ў аўтазаку, распыліў газ з балончыку ў бок міліцыянтаў.

Малахоўскі сваёй віны не прызнаў.

Пракурорка падчас спрэчак бакоў прасіла для Малахоўскага 6 гадоў зняволення. Суддзя Таццяна Родзіна прысудзіла тры з паловай гады калоніі агульнага рэжыму. Прысуд не не набыў законнай моцы.

**02.03.2021** 25 лютага над глыбоцкім журналістам-фрылансерам Змітром Лупачом прайшлі адразу тры суды. У выніку за адзін дзень журналіст атрымаў штрафаў на 3045 рублёў (105 базавых велічынь). Лупача вінавацілі ў парушэнні Закона аб СМІ паводле ч. 2 арт. 22.9 КаАП (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ) за супрацу з тэлеканалам "Белсат", паведамляе служба маніторынгу Беларускай асацыяцыі журналістаў.

У першай палове дня яго судзілі ў Паставах і Глыбокім. Суддзя Пастаўскага раённага суду Наталля Максімовіч пакарала Змітра 30 базавымі велічынямі штрафу, што складае 870 рублёў. У Глыбокім жа суддзя Людміла Вашчанка прызначыла журналісту штраф у памеры 45 базавых велічыняў, што складае 1305 рублёў.

Пасля абеду суд адбыўся яшчэ і ў Шаркаўшчыне. Суддзя Аксана Табола таксама прызнала Змітра Лупача вінаватым у парушэнні заканадаўства аб СМІ і аштрафавала на 30 базавых велічыняў — 870 рублёў.

На кожным судовым слуханні апытвалі сведкаў — людзей, якіх Зміцер запісваў для сваіх сюжэтаў, на гэтым і грунтаваліся справы.

Толькі пастаўскім міліцыянтам было складана даказаць дачыненне журналіста да сюжэту пра закрыццё пастаўскай трэнажорнай залы "Рэжым", бо сведка не даў патрэбных ім паказанняў супраць журналіста. Тады яны прыехалі на працу да Змітра з санкцыяй пракурора на выманне і вобшук. Яны прапанавалі журналісту самому аддаць знятыя ў Паставах відэафайлы, а калі б ён не пагадзіўся, то зрабілі б ператрусы ў офісе і ўдома. Зміцер аддаў усе адзнятыя матэрыялы.

Журналіст адзначае, што ўпершыню ў яго жыцці было столькі судоў за адзін дзень. Але гэта ён не лічыць замовай, а, хутчэй, супадзеннем. Замовай лічыць ён тое, што ўлады яго пераследуюць ужо за кожны відэасюжэт для "Белсату".

Што рабіць далей у такіх умовах, калі цябе пераследуюць за кожны сюжэт, разважае сам журналіст: «Мяняць від дзейнасці зараз даволі цяжка. Я ведаю, што ў раёне ніякай працы не знайду. Можа б дзе на ферму і ўзялі, але сумняюся, што і туды траплю. Але ўвогуле, калі і мяняць штосьці, то на больш-менш аналагічнае. Што далей будзе, не ведаю. Пакуль нявызначанасць».

Нагадаем, сёлета ў дачыненні Змітра Лупача абдыліся ўжо чатыры судовыя працэсы паводле ч. 2 арт. 22.9 КаАП. Першы суд у Паставах суддзя Наталля Максімовіч спыніла, бо выйшлі тэрміны справы. А тры іншыя суды прызналі журналіста вінаватым і пакаралі штрафамі.

Летась на журналіста было складзена сем адміністрацыйных пратаколаў па вышэйзгаданым артыкуле.

**03.03.20211** сакавіка суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаў 23-гадовага віцябляніна вінаватым ў знявазе дзяржаўнага сімвалу (арт. 370 КК) і прысудзіў да 1 году абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, паведамляе прэс-служба Вярхоўнага суду.

Паводле абвінавачання, хлопец дастаў чырвона-зялёны сцяг з кранштэйна каля крамы «Веста» на вуліцы Міра, а затым «дэманстратыўна кінуў флагшток» на зямлю. Пры гэтым «наверша флагштока» разбілася. Сцвярджаецца, што ў гэты момант віцяблянін знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення.

Шкоду, учыненую краме, ацанілі на 21 рубель 77 капеек. Паведамляецца, што малады чалавек прызнаў віну, раскаяўся і кампенсаваў шкоду.

Хлопца прызналі вінаватым у знеслаўленні дзяржаўнага сцягу і прысудзілі да 1 году абмежавання волі ва ўстанове адкрытага тыпу.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ва ўстаноўленым законам парадку.

**05.03.2021** Жыхара Наваполацку, якому ўвосень удалося адбіцца ад абвінавачання ў «парушэнні архітэктурнага рашэння» за бел-чырвона-белы сцяг на балконе (арт. 21.13 КаАП), нядаўна абвінавацілі паводле артыкулу 23.34 КаАП. Наваполацкі суд прызнаў яго вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні і аштрафаваў на 25 базавых велічынь (725 рублёў), паведамляе gorod214.by.

Справу навапалачаніна 3 сакавіка разглядала суддзя Зінаіда Балаболава. Яна прызнала мужчыну вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.

Паводле пастановы, вывесіўшы сцяг на балконе кватэры на 6-м паверсе, мужчына публічна «выказваў свае грамадска-палітычныя перакананні». Гэтым самым – зладзіў несанкцыянаванае пікетаванне без адпаведнага дазволу гарвыканкаму».

Суддзя Балаболава пастанавіла ў выніку пакараць мужчыну штрафам у памеры 25 базавых велічынь (725 рублёў).

Нагадаем, у верасні 2020 году гаспадару кватэры ў доме на вуліцы Маладзёжнай, 45 у Наваполацку прыйшоў ліст з гарвыканкаму з папярэджаннем аб магчымым штрафе «за парушэнне архітэктурнага рашэння фасаду будынку». Тады мужчына напісаў у аблвыканкам, патлумачыўшы, што бел-чырвона-белы сцяг не забаронены ў Беларусі і адпавядае яго «эстэтычным уяўленням аб правільным спалучэнні колераў». Мужчына адзначаў у лісце, што не выкарыстоўвае сцяг на масавых мерапрыемствах, не вывешвае яго з балкона, а толькі прымацаваў да сцяны, што не з'яўляецца парушэннем заканадаўства.

1 кастрычніка аўтар ліста атрымаў адказ з гарвыканкаму. Яму паведамілі, што вывучылі «больш падрабязна сітуацыю, звязаную з палотнішчам сцяга» на лоджыі яго кватэры, і вырашылі, што гаспадар не парушае «архітэктурнае рашэнне фасаду будынку». А значыцца, адміністрацыйны працэс паводле арт. 21.13 КаАП у дачыненні да ўладальніка кватэры не будзе пачаты.

**08.03.2021** Пенсіянерка па інваліднасці Валянціна Крыштопенка напярэдадні жаночага свята даведалася, што яе асабісты рахунак, на які прыходзіць пенсія, недаступны – картка



заблакаваная. Такі падарунак жанчыне зрабілі судовыя ўлады, каб спагнаць з пенсіянеркі штрафы, прысуджаныя ёй за ўдзел у «несанкцыянаваных» шэсцях і пікетаваннях паводле колішняга арт. 23.34 КаАП.

«Такі падарунак зрабілі мне...»
«Я атрымліваю пенсію крыху больш за 400 рублёў, а агульная сума штрафаў, якія мне прысудзілі, ужо сягае амаль 1000 долараў. Уся пенсія ідзе на аплату кватэры, лекі і харчы, але ў лютым і сакавіку я адклала 70 рублёў і заплаціла за штрафы. Колькі магла! А ўчора пайшла да банкамату і даведалася, што мая картка ўжо заблакаваная. Такі падарунак зрабілі мне на 8 Сакавіка», – кажа Валянціна Крыштопенка.

Выканаўчае справаводства на пенсіянерку завялі 19 лютага.

Патрабаванне аб спагнанні сумы штрафу па адміністрацыйным правапарушэнні ў памеры 675 рублёў выдаў суд Віцебскага раёну. Гэты штраф – 25 базавых велічынь – Крыштопенцы прысудзіў 4 снежня суддзя Міхаіл Зубеня за ўдзел у шэсці памяці Рамана Бандарэнкі 15 лістапада. Але ўжо пасля гэтага той жа суддзя пакараў жанчыну штрафам у памеры 1160 рублёў за біблійную цытату пра «ўладаранне бязбожніка» («несанкцыянаванае пікетаванне»). Таму выстаўлены судовымі выканаўцамі рахунак будзе большы.

Прасіла растэрмінаваць - суддзя не дазволіў
Валянціна Крыштопенка тлумачыць, што звярталася ў суд з просьбай аб растэрміноўцы прысуджаных штрафаў на 6 месяцаў. Але суддзя Міхаіл Зубеня хадайніцтва адхіліў: нібыта Крыштопенка не паказала суду ніякіх доказаў абгрунтаванасці яе хадайніцтва.

«Такім чынам, улічваючы, што Крыштопенка В.В., з’яўляючыся інвалідам 1-й групы, безумоўна мае пастаянную крыніцу даходу ў выглядзе пенсіі, што дазваляе ёй выплачваць штраф, суддзя не знаходзіць магчымым задаволіць заяву аб растэрміноўцы аплаты штрафу», – гаворыцца ў пастанове суддзі Зубені.

**10.03.2021** 10 сакавіка суд Чыгуначнага раёну Віцебску вярнуўся да разгляду адміністрацыйнай справы праваабаронцы Беларускага Хельсінкскага камітэту Ірыны Траццяковай, абвінавачанай паводле ч. 1 арт. 23.34 КаАП за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце, які нібыта адбыўся яшчэ 19 чэрвеня 2020 году. Справа сталася «крэпкім арэшкам» для судовай сістэмы РБ. Чыгуначнаму суду ўдалося «раскалоць» яго толькі з трэцяй спробы...

Штрафавалі, адмянялі, вярталі
24 чэрвеня 2020 году паводле ч.1 арт. 23.34 суддзя Алена Грабянчук аштрафавала Ірыну Траццякову на 20 базавых велічынь. Пастанова была абскарджана ў абласным судзе.
16 верасня Віцебскі абласны суд адмяніў пастанову суду Чыгуначнага раёну і адправіў справу на новы разгляд.
31 снежня суд Чыгуначнага раёну вынес пастанову аб спыненні справы праз сканчэнне тэрміну прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці. Але суддзя Вольга Шапавалава ў сваёй пастанове памылілася – тэрмін прыцягнення да адказнасці не скончыўся. Траццякова звярнулася ў абласны суд з просьбай даць прававую ацэнку дзеянням суддзі. Аблсуд пакінуў пастанову Шапавалавай без зменаў, а скаргу – без задавальнення.



26 лютага 2021 году старшыня абласнога суду Федзюкевіч накіраваў справу на новы разгляд.

«Я разумела, што ў маёй краіне пачынаецца пекла…»

10 сакавіка справу праваабаронцы Ірыны Траццяковай разбірала суддзя Святлана Варатынская.

Ірына Траццякова ўдзельнічала ў працэсе 10 сакавіка праз скайп (яна на волі). Хадайніцтва праваабаронцы аб удзеле ў працэсе заяўленых ёй сведкаў (Левінава, Янушкоўскай, Корнышава, Петкуна, Склімянка, Зуева, Хамы) суддзя Святлана Варатынская адхіліла.

Паводле міліцэйскага пратаколу, 19 чэрвеня 2020 году, знаходзячыся каля дому №18 на вуліцы Леніна ў Віцебску, Траццякова ўзяла ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – пікетаванні.

А менавіта, стоячы ў «ланцугу салідарнасці», публічна выказвала свае грамадска-палітычныя інтарэсы, салідарнасць з грамадзянамі, затрыманымі з палітычных прычын. На патрабаванне міліцыі спыніць мерапрыемства не рэагавала.

Ірына Траццякова не пагадзілася з фактам адміністрацыйнага правапарушэння. Паведаміла, што 19 чэрвеня ў якасці доўгатэрміновага назіральніка кампаніі «Праваабаронцы за вольныя выбары» ладзіла маніторынг этапу збору подпісаў. Сцвердзіла, што каля дому 18 на вуліцы Леніна не знаходзілася, пастаянна перамяшчалася. Пры сабе мела накіраванне БХК.

Патлумачыла таксама, што на пададзеным у суд відэа – як доказу яе віны – яна стаіць побач з віцяблянінам Аляксандрам Корнышавым. У нейкі момант яны апынуліся побач з грамадзянамі, якія стаялі ў «ланцугу салідарнасці», бо вымушаныя былі прапусціць групу міліцыянтаў, якія рухаліся міма людзей і папярэджвалі іх. У групе грамадзянаў, якія стаялі ў ланцугу салідарнасці, не знаходзілася, бо гэта супярэчыць маральнаму кодэксу назіральніка і праваабаронцы, запэўніла Траццякова.

«Пры тым мне было непрыемна, што, выконваючы ролю назіральніка, я не магу быць салідарнай са сваім народам. Я разумела, што ў маёй краіне пачынаецца пекла, але я проста назірала і ў ланцугу грамадзянаў не знаходзілася», – выказалася праваабаронца.

Адвакатка: Няма ніводнага доказу

У якасці сведкі быў апытаны супрацоўнік Першамайскага РАУС Максім Дарагенскі. 20 чэрвеня паводле дадзенага яму відэа ён склаў пратакол і рапарт, абвінаваціўшы Траццякову ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мерапрыемстве. Патлумачыць у судзе, на падставе якіх дзеянняў Траццякова была прызнаная ўдзельніцай несанкцыянаванага мерапрыемства, міліцыянт не здолеў.

Адвакатка Траццяковай у сваім выступе адзначыла, што няма ніводнага доказу знаходжання Траццяковай ля дому №18 на вул. Леніна. Затое маецца пацверджанне таго, што Траццякова ў якасці назіральніцы была накіраваная БХК для маніторынгу выбарчай кампаніі. На міліцэйскіх відэазапісах Траццякова не пляскае ў далоні, не выказвае сваіх поглядаў, не знаходзіцца ў ланцугу салідарнасці, то бок не ўдзельнічае ў мерапрыемстве.

Патлумачыла, што на відэа бачна, як Траццякова стаіць поруч з Корнышавым і здымае на камеру тэлефона супрацоўнікаў міліцыі, якія праходзяць міма.

Адвакатка прасіла адміністрацыйную справу спыніць праз адсутнасць падзеі адміністрацыйнага правапарушэння.

Варатынская нават не паднялася...
Суддзя Святлана Варатынская абвесціла прысуд нават не ўзняўшыся і не зрабіўшы паўзы пасля выступу адвакаткі:

«Суд пастанавіў Ірыну Траццякову паводле ч. 1 арт. 23.34 КаАП падвергнуць адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу памерам 20 базавых велічыняў (580 рублёў)».

«Такога правасуддзя ў Беларусі быць не павінна»
Увесь гэты працяглы адміністрацыйны працэс Ірына Траццякова назвала «адміністрацыйным пераследам праваабаронцы, сябра БХК і незалежнага назіральніка».

«Такога правасуддзя ў Беларусі быць не павінна», – зазначыла Траццякова.

Адзначым, што суддзя Святлана Варатынская ўнесеная ў санкцыйныя спісы краін Балтыі.

**10.03.2021** 10 сакавіка Віцебскі абласны суд разгледзеў шэраг скаргаў грамадскіх актывістаў з Віцебску на рашэнні судоў першай інстанцыі. Скаргі пенсіянера Чэслава Салодкага і віцяблянкі Таццяны Юхо разбірала суддзя Святлана Іванова. Рашэнні раённых судоў яна пакінула без зменаў, а скаргі не задаволіла.

66-гадовы віцяблянін Чэслаў Салодкі спрабаваў абскардзіць пастанову суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 5 студзеня. Паводле ч. 1 арт. 23.34 КаАП за ўдзел у несанкцыянаваным вулічным шэсці (16 снежня) і пікетаванні (17 снежня) суддзя Уладзімір Царыкаў аштрафаваў віцябляніна на 348 рублёў.

З пастановай суду Кастрычніцкага раёну Чэслаў Салодкі не пагадзіўся. У скарзе настойваў, што пастанова супярэчыць Канстытуцыі і Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Прасіў пастанову суду ніжэйшай інстанцыі адмяніць, а справу спыніць праз адсутнасць у ягоных дзеяннях складу правапарушэння.

У судзе Чэслаў Салодкі падтрымаў сваю аргументацыю і патлумачыў, што, як інвалід 2-й групы, для падтрымання здароўя часта гуляе па горадзе. 16 снежня ён выпадкова ў двары сустрэўся з калонай пратэстоўцаў, прайшоў з імі не больш за 20 метраў, дакрануўся да бел-чырвона-белага сцягу, бо лічыць яго нацыянальнай святыняй. Што тычыцца 17 снежня, то, па словах Салодкага, ён наагул не бачыў ніякага пікету.

«Неабгрунтаванае, незаконнае, несправядлівае» рашэнне
У сваю чаргу, адвакатка Салодкага адзначыла, што рашэнне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 5 студзеня «неабгрунтаванае, незаконнае, несправядлівае і падлягае адмене». Адзінае парушэнне, якое судом ставілася ў віну Салодкаму, было «размяшчэнне ім бел-чырвона-белага сцягу на скульптуры мядзведзя 17 снежня». Гэтае дзеянне і было ўспрынятае судом як пікетаванне, хаця сам факт размяшчэння сцягу на скульптуры суд палічыў нявысветленым.

Што тычыцца 16 снежня, то ў аснову доказу віны Салодкага былі пакладзеныя сведчанні, узятыя з матэрыялаў справы іншай асобы, абвінавачанай у несанкцыянаваным шэсці.

У такім выпадку, пераконвала адвакатка, грамадзянка мусіла быць апытаная ў судзе ў якасці сведкі, але гэтага не адбылося. Апроч таго, сведчанні міліцыянта, які нібыта апазнаў Салодкага ў вечаровы час з адлегласці 100 метраў наагул не вытрымліваюць крытыкі.

Разам з тым, у матэрыялах справы адвакатка налічыла шэраг парушэнняў. На яе думку, справа не была падрыхтаваная да судовага паседжанняў у адпаведнасці з нормамі працэсуальнага заканадаўства.

«Дапушчальных, дастатковых, дакладных доказаў віны Салодкага суду пададзена не было», – сцвердзіла адвакатка.

Выслухаўшы аргументы аштрафаванага і яго адвакаткі, суддзя Святлана Іванова не знайшла падставаў для задавальнення скаргі. Пастанавіла пакінуць пастанову аб пакаранні без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

Тая ж суддзя не задаволіла 10 сакавіка і скаргу віцяблянкі Таццяны Юхо на рашэнне суду Чыгуначнага раёну Віцебску ад 10 лютага, які аштрафаваў яе на 870 рублёў за распаўсюд саматужнай газеты «Витебский вестник» (арт. 22.9 КаАП).

**11.03.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 11 сакавіка пачаўся разгляд грамадзянскага пазову былой студэнткі ВДМУ Паліны Нітчанкі да адміністрацыі ўніверсітэту аб адмене дысцыплінарных спагнанняў і аднаўленні яе ва ўстанове адукацыі. Грамадзянскую справу разбірае суддзя Марына Марозава.

На судзе інтарэсы Паліны Нітчанкі прадстаўляюць яе маці Наталля Котава і адвакатка. Бок адказчыка – начальнік юрыдычнага аддзелу медуніверсітэту Дзяніс Пузанаў.

Студэнтка другога курсу лячэбнага факультэту ВДМУ Паліна Нітчанка 1 лютага, пасля адбыцця 17 сутак адміністрацыйнага арышту (арт. 23.34 КаАП), выйшла з ізалятару і ў гэты ж дзень даведалася, што яе адлічылі з універсітэту за няяўку на экзамены. Напярэдадні, пакуль дзяўчына знаходзілася за кратамі ІЧУ, адміністрацыя вынесла ёй вымову.

«Вымову аб'явілі незаконна, з парушэннем працэсуальных нормаў, і адлічэнне таксама незаконнае», – лічыць маці былой студэнткі Наталля Котава.

«Паліна азнаёмілася з загадам аб вынясенні вымовы ад 20 студзеня толькі 3 лютага. Гэта значыць, што яе не азнаёмілі з ёй у трохдзённы тэрмін пасля вынясення вымовы», – патлумачыла на судзе маці Паліны.

На гэта ж звярнула ўвагу і абаронца. Дадала таксама, што на момант вынясення вымовы судовая пастанова (ад 15 студзеня), паводле якой Нітчанка адбывала пакаранне ў ізалятары, яшчэ нават не набыла законнай моцы.

Адвакатка заўважыла, што камісія ВНУ, абвясціўшы вымову ў адсутнасць Паліны, фактычна парушыла яе правы і пазбавіла яе магчымасці даваць тлумачэнні, а таксама – абскардзіць спагнанне.

Прадстаўнік ВДМУ Дзяніс Пузанаў згадзіўся з тым, што тэрміны азнаямлення студэнткі з вымовай былі прапушчаныя, але настойваў, што толькі па віне Паліны.

«Бо яна знаходзілася ў зняволенні, так бы мовіць, і мы не маглі ніякім чынам ёй перадаць паперу для азнаямлення. Нас туды дакладна не пусцілі б. Я лічу, што ВНУ дзейнічала ў межах сваіх паўнамоцтваў і закон не парушала», – сказаў Дзяніс Пузанаў.



Адвакатка паведаміла на судзе, што асабіста перадавала 19 студзеня заяву Паліны да адміністрацыі ВДМУ з просьбай перанесці ёй экзамен, але дэканат не даў ёй такой магчымасці. Прысутнічаць на экзамене Паліна не магла фізічна.

«Знаходжанне ў ІЧУ – няважкая прычына няяўкі на экзамен», – заявіў на гэта прадстаўнік ВДМУ. Ён прапанаваў выклікаць у суд дэкана лячэбнага факультэту Марыну Фаміну.

Наступнае судовае паседжанне, на якім мае выступіць дэкан, адбудзецца 18 сакавіка (пачатак у 10.00).

**12.03.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску адбыўся грамадзянскі працэс, ініцыяваны шасцю жанчынамі, якіх затрымалі ў лесе пад Віцебскам 13 студзеня і абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні.

8 гадзін іх трымалі ў пастарунку без ежы і магчымасці прыняць лекі, хоць чацвёра затрыманых жанчын ужо ў сталым веку. А на ноч да суду кінулі ў ІЧУ. Але суды ў выніку адмянілі іх справы, і жанчыны падалі пазовы на незаконныя дзеянні міліцыі, паведамляе Беларускае Радыё Рацыя.

«За нашае затрыманне, умовы ўтрымання і накіраванне ў ІЧУ. Мы прасілі прызнаць гэта незаконным. Толькі прызнаць! Мы не патрабавалі ніякіх маральных ці матэрыяльных кампенсацый. Хаця Тамара Ільина, прыкладам, на 10 дзён трапіла ў лякарню», – распавяла Таццяна Севярынец, адна з удзельніц «пікету са скандынаўскімі палкамі».

Пазоўныя заявы на міліцыянтаў падалі ў суд Людміла Валадкевіч, Тамара Ільіна, Людміла Камінская, Алена Каснова, Раіса Кухто і Таццяна Севярынец. Грамадзянскую справу разбірала суддзя Жанна Васільева.

На судзе за дзеянні сваіх падначаленых адказваў намеснік начальніка аддзелу міліцыі Першамайскага раёну падпалкоўнік Іван Доўгі. Ён моўчкі выслухаў прэтэнзіі жанчын, не задаўшы ніводнага пытання. І вельмі каротка патлумачыў уласную пазіцыю: маўляў, міліцыянты ўсё рабілі слушна. Бо заканадаўства дазваляе ўтрымліваць людзей за кратамі да суду цягам 72-х гадзін, калі гэтых людзей падазраюць у правядзенні несанкцыянаванага масавага мерапрыемства.

Пра ўмовы ўтрымання сталых жанчын падпалкоўнік Доўгі не сказаў ні слова.

Суддзя Жанна Васільева падтрымала яго пазіцыю: адхіліла ўсе 6 скаргаў і ўсклала на заяўніц абавязак заплаціць судовыя выдаткі – па 4 рублі 85 капеек з кожнай.

На думку Раісы Кухто, якая беспадстаўна правяла пад вартай больш за суткі, такі вынік суду быў прадказальны, але падпалкоўніку міліцыі ўсё адно было сорамна: «Я думаю, што ўсё было вырашана загадзя. Бо я назіраю за іншымі судамі, і там усё тое самае. Але я думаю, што яму было няёмка. Бо ў кожнага ёсць такі крытэр – сумленне. Я думаю, што яму было дрэнна».

Жанчыны не выйгралі суд, але гэта быў першы ў Віцебску выпадак, калі затрыманыя людзі вырашылі адстойваць свае правы на цывілізаванае стаўленне да сябе з боку міліцыянтаў.

**16.03.2021** Перад Днём волі студэнтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту просяць падпісаць паперы аб тым, што яны азнаёміліся са зменамі ў адміністрацыйным артыкуле 24.23 («Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў», колішні арт. 23.24). Але просяць так, што больш падобна да прымусу. Пра гэта сведчыць аўдыёзапіс, які «Віцебскай Вясне» даслалі нашыя чытачы з Полацку.

«Мы знойдзем час, каб вам гэта прачытаць і, адпаведна, зафіксаваць, што вы азнаёміліся. Можаце подпісы не ставіць. Але ў выпадку якіх, не дай бог, нюансаў, будзе зафіксавана, што вы подпіс не паставілі, а гэта ўжо будзе не зусім добра выглядаць, асабліва калі выпадкам нам трэба будзе даваць на вас характарыстыку. Таму падумайце, калі ласка, над гэтым пытаннем», – кажа адзін з прадстаўнікоў адміністрацыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэту падчас адмысловай сустрэчы са студэнцкай групай.

Паводле інфармацыі аўтараў аўдыё, у сустрэчы бралі ўдзел дэкан інжынерна-будаўнічага факультэту ПДУ Аляксандр Бакатовіч і асістэнт кафедры будаўнічых канструкцый Артур Гіль.

«Ёсць два варыянты. Альбо вы прачыталі самі – і распісаліся, альбо Артур Іванавіч вам зачытвае, і папера складаецца, што вы азнаёмленыя, але ўжо без вашага аўтографа. Але ў выпадку чаго – потым не крыўдзіцеся. Ну, рашэнне якое?..» – пытаецца на сустрэчы дэкан.

Студэнты адмовіліся ад абодвух варыянтаў.

«Проста мы не разумеем, у чым пытанне нежадання паставіць подпіс, што вы азнаёмленыя. За 10 гадзін пропускаў усе ж азнаёміліся і распісаліся. У чым адрозненні тут?.. Гэта не загад, гэта проста, каб мы ведалі, што вы ў курсе», – тлумачаць выкладчыкі.

На пытанне студэнтаў, навошта яны павінны гэта рабіць, гучыць адказ: «Таму што нам зверху, атрымліваецца, гэта далі».

На заўвагу аднаго са студэнтаў, што гэта палітыка, выкладчыкі зазначаюць, што «справа не ў палітыцы, а ў дысцыпліне паводзінаў».

«Пры чым тут палітыка? Што, масавыя мерапрыемствы звязаныя з палітычнымі матывамі нейкімі ці што? Вы самі пачынаеце накручваць сітуацыю. Проста пачытайце, дзе можна, дзе нельга і як гэта ўсё робіцца…» – кажа адзін з іх.

«А дзе можна?» – гучыць рытарычнае пытанне з аўдыторыі. «Дзе не забаронена, там можна», – адказваюць супрацоўнікі ПДУ.

Студэнты не паставілі подпісы пад паперай. Але тэкст артыкулу выкладчыкі пакінулі ў аўдыторыі.

Нагадаем, летась і студэнты, і выкладчыкі ПДУ выступалі супраць беззаконня і гвалту ў дачыненні мірных грамадзян у краіне. 8 сакавіка студэнты ПДУ ўзялі ўдзел у флэш-мобе салідарнасці «На што ты здольны дзеля мары?» – і пастрыгліся нагала.

**17.03.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску 17 сакавіка разгледзеў дзве адміністрацыйныя справы ў дачыненні да журналіста-фрылансера Зьмітра Казакевіча. Суддзі Андрэй Шыдлоўскі і Вераніка Барысава прызналі яго вінаватым у незаконным вырабе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі (ч.3 арт. 23.5 КаАП) і аштрафавалі агулам на 60 базавых велічынь (усяго 1740 рублёў).



Супрацоўнікі Першамайскага РАУС склалі на журналіста два пратаколы – за два артыкулы, апублікаваныя ў лютым на сайце belsat.eu. На пачатку першага судовага паседжання Зміцер Казакевіч хадайнічаў, каб справы аб'ядналі ў адну, бо яны аднолькавыя па сутнасці. Але суддзя Андрэй Шыдлоўскі хадайніцтва не задаволіў.

Паводле першага пратаколу, 2 лютага Казакевіч, выконваючы функцыі журналіста замежнага СМІ без акрэдытацыі ў МЗС, «злоўжываючы правамі і з парушэннем абавязкаў журналіста», незаконна стварыў матэрыял пад назвай «Выкладчыка віцебскага ўніверсітэту звольнілі за бел-чырвона-белыя фіранкі на акне», які быў размешчаны на сайце Белсату.

Журналіст сваёй віны не прызнаў, сцвердзіўшы, што адміністрацыйны пераслед у дачыненні да яго вядзецца выключна з палітычных прычын.

Падчас судовага паседжання журналіст цытаваў вытрымкі з раману Джорджа Оруэла «1984»: «Свабода – гэта свабода казаць, што двойчы два ёсць чатыры. Як толькі гэта будзе гарантавана, усё астатняе прыйдзе само сабой».

«Абвінавачваюць мяне толькі таму, што цягам многіх гадоў я спрабую казаць, што двойчы два – чатыры, а не пяць і не шэсць», – сказаў на судзе Казакевіч.

Якія-небудзь тлумачэнні па сваёй справе даваць адмовіўся.

«Бо сорамна мне нешта зараз тлумачыць і бараніцца, калі за кратамі знаходзяцца больш за 10 маіх калег, у тым ліку журналісткі Белсату Дар'я Чульцова і Кацярына Андрэева», – заявіў журналіст.

Нагадаў таксама, што ў Беларусі на сёння 291 палітзняволены.

Суддзя Шыдлоўскі пастанавіў прызнаць Змітра Казакевіча вінаватым і аштрафаваць яго на 30 базавых велічынь. Гэта максімальны штраф, прадугледжаны арт. 23.5 КаАП. Столькі ж, але за іншы артыкул на сайце, прысудзіла журналісту і суддзя Вераніка Барысава.

Зміцер Казакевіч збіраецца абскардзіць судовыя рашэнні.

**19.03.2021** 19 сакавіка ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску скончыўся разгляд грамадзянскага пазову адлічанай з другога курсу ВДМУ Паліны Нітчанкі. Студэнтка патрабавала адмяніць дысцыплінарныя спагнанні і аднавіць яе ў навучальнай установе, а таксама – спагнаць з універсітэту судовыя выдаткі. Суд адмовіў у задавальненні іску ў поўным аб'ёме.

Справу разбірала суддзя Марына Марозава. Матывацыя рашэння такая: «з боку пазоўніка мелі месца парушэнні абавязкаў навучэнцаў, і установа адукацыі мела падставы для прыцягнення студэнткі да дысцыплінарнай адказнасці».



Пры гэтым суд зусім не прыняў да ўвагі тыя парушэнні, якія дапусціла навучальная ўстанова пры вынясенні вымоў (прадстаўнік універсітэту не стаў іх аспрэчваць і нават пагадзіўся з імі). Нагадаем, кіраўніцтва ВДМУ правяло паседжанне дысцыплінарнай камісіі, калі Паліна Нітчанка знаходзілася за кратамі і не магла прысутнічаць фізічна і бараніць свае інтарэсы. Цягам трох дзён, як таго патрабуе заканадаўства, універсітэт не азнаёміў студэнтку з вымовай, вынесенай на камісіі. Апроч таго, судовае рашэнне, паводле якога Нітчанка адбывала адміністрацыйны арышт, на момант вынясення вымовы яшчэ нават не набыло законнай моцы.

Дэкан лячэбнага факультэту Марына Фаміна, якая выступала на судзе ў якасці сведкі з боку адказчыка, так нічога па сутнасці і не патлумачыла. На большасць пытанняў адказвала «Не ведаю», «Не памятаю» ці «Была на бальнічным». Заявіла толькі, што «адлічаная Нітчанка была за неліквідацыю акадэмічнай запазычанасці ва ўстаноўленыя тэрміны і сістэматычнае парушэнне абавязкаў навучэнцаў».

У сваю чаргу, начальнік юрыдычнага аддзелу медуніверсітэту Дзяніс Пузанаў заявіў, што ў адпаведнасці з лістом Міністэрства адукацыі, знаходжанне ў ізалятары не можа быць важкай прычынай для няяўкі на экзамен. Між тым, на пытанне адваката, ці ведаюць пра гэты ліст студэнты і ці данеслі да іх гэтыя правілы, заявіў, што «не, бо гэта для службовага карыстання».

Інтарэсы Паліны Нітчанкі на судзе прадстаўляла яе маці Наталля Котава.

Рашэнне суду не набыло законнай моцы і можа быць абскарджанае ў Віцебскім абласным судзе.

**22.03.2021** Віцебскія актывісты, якія раней прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34), пачалі атрымліваць позвы з міліцыі з патрабаваннем з’явіцца ў пастарунку ранкам 25 сакавіка.

Каб уручыць павестку, супрацоўнікі МУС прыязджалі да некалькіх віцяблян на працу. Паводле дакументу, які атрымалі актывісты, ім «належыць 25 сакавіка 2021 году ў 10.00 з’явіцца» ў аддзяленні міліцыі «для правядзення апытання». Пра што будзе апытанне і з якой прычыны яно будзе праводзіцца, міліцыянты не кажуць.

Праваабаронца Ірына Траццякова лічыць, што такім чынам міліцыя хоча цалкам ізаляваць людзей на Дзень волі – зрабіць так, каб іх не было на вуліцы.

«25 сакавіка яны будуць затрымліваць людзей да трох гадзін без усялякіх на тое прычын і падставаў. І ўсё толькі для таго, каб у гэты час людзі адсутнічалі на вуліцах гораду. Выклікаць у пракуратуру, выклікаць у аддзяленні ўнутраных спраў, на розных падставах запрашаць на размову ў апорныя пункты», – папярэджвае праваабаронца.

Паводле Ірыны Траццяковай, такія самыя позвы атрымліваюць зараз людзі ва ўсёй Беларусі. У сацсетках паведамляюць таксама пра бацькоўскія сходы, якія ў некаторых навучальных установах мяркуюць правесці акурат 25 сакавіка.



**24.03.2021** 24 сакавіка суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў журналістку-фрылансерку Алену Шабуню вінаватай у незаконным вырабе прадукцыі СМІ. Паводле ч. 3 арт. 23.5 КаАП суд аштрафаваў Шабуню на 30 базавых велічынь. Відэаматэрыял, які стаў падставай для абвінавачання, быў размешчаны на сайце тэлеканалу «Белсат».

Справу разбірала суддзя Вераніка Барысава. Паводле пратаколу, 1 лютага Алена Шабуня, знаходзячыся ў Паставах як журналістка замежнага СМІ, парушыла заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі. Не маючы акрэдытацыі, яна нібыта ўзяла інтэрв'ю ва ўладальніка трэнажорнай залы «РэЖым» Віталя Пахомчыка. Раённая міліцыя палічыла, што журналістка незаконна вырабіла рэпартаж, які пазней быў размешчаны на сайце «Белсату».

Віны сваёй Алена Шабуня не прызнала. Патлумачыла, што атрыманне і распаўсюд інфармацыі ёсць неад’емнай часткай правоў чалавека, гарантаваных Канстытуцыяй і міжнароднымі пагадненнямі, якія Беларусь узяла на сябе абавязкі выконваць. Абмежаваць гэтыя правы дзяржава можа толькі ва ўмовах надзвычайнага ці ваеннага становішча.

«У выпадку прыцягнення мяне да адміністрацыйнай адказнасці не за змест рэпартажу, а толькі за факт з’яўлення яго ў інтэрнэце, такое рашэнне можна будзе лічыць неабгрунтаваным абмежаваннем права на свабоднае выказванне думкі, права на атрыманне і выраб інфармацыі», – адзначыла Алена Шабуня. Яна папрасіла суд вынесці пастанову аб спыненні справы ў сувязі з адсутнасцю ў яе дзеяннях складу правапарушэння.

Пры дапамозе праграмы «Вайбер» у судовым паседжанні ў якасці сведкі быў апытаны ўчастковы інспектар па справах няпоўнагадовых Пастаўскага РАУС Ілля Чарняўскі. 1 лютага міліцыянт, знаходзячыся ў службовай машыне, назіраў, як журналісты Шабуня і Лупач сустрэліся з прадпрымальнікам Пахомчыкам. Пасля аналізу сюжэту, размешчанага на «Белсаце» і ў тэлеграм-канале «Паставы для жыцця» быў складзены рапарт і заведзеная адміністрацыйная справа.

У руках Алены Шабуні сведка нібыта бачыў прадмет, адназначна ідэнтыфікаваць яго як мікрафон міліцыянт не здолеў. Але паведаміў, што абодвух журналістаў ведаў раней у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў. Алену Шабуню ў судовым паседжанні Чарняўскі апазнаў.

Пасля аналізу ўсіх акалічнасцяў справы суддзя Вераніка Барысава не ўзяла пад увагу аргументацыю, выказаную Аленай Шабуняй, угледзела ў дзеяннях журналісткі склад правапарушэння і паводле ч. 3 арт. 23. 5 КаАП аштрафавала яе на 30 базавых велічынь (870 рублёў).

Выплочваць штраф Шабуні давядзецца з пенсіі. Спадарыня Алена патлумачыла суддзі, што з пенсіі ў яе ўжо вылічваюць 20% на штраф, які, па яе сцверджанні, яна ўжо аплаціла. Пасля гэтага на руках застаецца ўсяго 190 рублёў…

Такі самы штраф за той жа матэрыял пра закрыццё трэнажорнай залы ў Паставах раней быў прысуджаны глыбоцкаму журналісту Змітру Лупачу.

**24.03.2021** 23 студзеня ў Наваполацку падчас трэніроўкі ў спартовым клубе «Форвард» быў затрыманы ўдзельнік стачкі ААТ «Нафтан» Сяргей Лапуноў, паведаміла старонка «Стачкам ААТ «Нафтан» у Фэйсбуку. Паляванне на страйкоўцаў працягнулася і 24 сакавіка.

Сяргея Лапунова абвінавачваюць у правядзенне пікету. Напэўна, пад пікетам маецца на ўвазе відэа, запісанае сябрамі страйкаму «Нафтан» у падтрымку галасавання на платформе «Голас». Сяргей Лапуноў – працаўнік ААТ «Нафтан». Стаж працы – 20 гадоў. 12 снежня ён далучыўся да нацыянальнай стачкі.

Таксама затрымалі Андрэя Шкірэнку, работніка ААТ «Нафтан» з працоўным стажам 30 гадоў, які далучыўся да стачкі 4 снежня 2020 году. Андрэй Шкірэнка – намеснік старшыні першаснай арганізацыі Беларускага Незалежнага Прафсаюзу на ААТ «Нафтан».

У гэты ж дзень супрацоўнікі МУС наведалі кватэры і іншых сябраў стачкаму, але не засталі іх удома

Наступным днём, 24 сакавіка, у Наваполацку быў таксама затрыманы ўдзельнік стачкі Аляксандр Капшуль – былы юрысконсульт прадпрыемства «Нафтан». Яго затрымалі па дарозе ў суд, дзе мужчына меўся прадстаўляць інтарэсы свайго падабароннага.

Паведамляецца, што ў дварах дамоў, дзе жывуць астатнія стачкамаўцы, дзяжураць міліцэйскія аўтамабілі.

**25.03.2021** Ранкам 25 сакавіка ў Віцебску каля «сіняга дому» быў затрыманы вядомы апазіцыянер Барыс Хамайда. Ён выйшаў у цэнтр гораду на адзіночны пікет з выявай Пагоні – каб павіншаваць віцяблян з Днём волі. Супрацоўнікі МУС падышлі да пікетоўца літаральна праз некалькі хвілінаў. Барыса Хамайду затрымалі і адвезлі ў Чыгуначны РАУС Віцебску. Перад затрыманнем Барыс Хамайда расказаў што гэта яго 31-ы «свядомы Дзень волі».

«Гэта ж найвялікшае свята! Проста не магу сядзець у хаце, хоць разумею, што будуць наступствы. Узяў з сабой герб Пагоня, які быў намаляваны 12 гадоў таму вядомым віцебскім мастаком. Гэты герб паказвае маё асабістае стаўленне да гэтага свята», – сказаў Барыс Хамайда перад тым як стаць у пікет.

Ён адзначыў, што ў 1990-я на Дзень волі выходзіла шмат людзей. Пазней былі гады, калі людзей было вельмі мала, але пачынаючы з 2020-га году на плошчы беларускіх гарадоў выходзяць тысячы.

«Слухайце, самае галоўнае – трэба набрацца цярпення. Я ў жыцці аптыміст, і я веру ў тое, што прыйдзе час – і ён можа прыйсці вельмі хутка! – і мы мусім быць падрыхтаваныя і кансалідаваныя, нам не патрэбныя цяпер нейкія там «міжсабойчыкі», – лічыць Хамайда.

Ён раіць набрацца цярпення.

«Ведаеце, у Магілёве ў XVII стагоддзі, па-мойму, быў такі кліч: «Пара! Пара!» Як пачуем гэты кліч – і ўсё, тады ўсёй грамадой і выходзім на вуліцы. І мы пераможам, я ў гэтым упэўнены. Час зараз такі: у свеце пачаўся геапалітычны разварот. І нарэшце палітычны ківач кіўнуўся ў бок волі. Такога не было, а менавіта зараз гэта бачна. Так што трэба набрацца цярпення. Жыве Беларусь!» – сказаў Барыс Хамайда.

Як стала вядома, Барыса Хамайду пратрымалі ў пастарунку каля трох гадзін і вызвалілі, узяўшы тлумачэнні. Барысу Хамайду 73 гады, ён прынцыпова не сплачвае прысуджаныя судамі штрафы і не дае ў судах тлумачэнняў, бо лічыць іх нелігітымнымі.



**26.03.2021** Суд над затрыманай на Дзень волі ў Віцебску Крысцінай Юдзінай прайшоў на тэрыторыі ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ). Ёй прысудзілі 25 сутак арышту. Ці адбыліся суды над іншымі віцяблянамі, якіх затрымалі 25 сакавіка, у тым ліку над кіраўніком абласной філіі БНФ Кастусём Смолікавым, пакуль невядома. З пэўнасцю можна сказаць толькі тое, што яны не на волі.

25 сакавіка ў Віцебску быў затрыманы кіраўнік абласной арганізацыі БНФ Кастусь Смолікаў, разам з ім – віцябляне Алесь Вендт і Іван Казлоў. Затрымалі таксама 18-гадовага Руслана Яневіча і 21-гадовую Крысціну Юдзіну. У той жа дзень усіх кінулі ў ІЧУ. Прозвішчы іншых затрыманых высвятляюцца.

Інфармацыі пра тое, за што былі затрыманыя грамадзяне і ў чым іх абвінавачваюць, здабыць не ўдалося.

26 сакавіка, віцебскія журналісты спрабавалі даведацца, калі і дзе адбудуцца суды над затрыманымі, але ні ў водны раённы суд справы віцяблян не паступалі.

Толькі пасля абеду стала вядома пра вынік суду над Крысцінай Юдзінай, які прайшоў у будынку віцебскага СІЗА-2. Як стала вядома, суддзя Вераніка Барысава (суд Першамайскага раёну) на выязным паседжанні пакарала Юдзіну адміністрацыйным арыштам на 25 сутак. Меркавана – за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 24.23 КаАП).

Ці прайшлі суды над іншымі затрыманымі – немаведама.

**26.03.2021** 25 сакавіка ў Дуброўна ў прыватны дом, дзе жыве актывістка «Народнай Грамады» Наталля Стрэльчанка з дзецьмі, прыйшлі некалькі супрацоўнікаў міліцыі з пастановай на ператрус. Санкцыю на яго даў пракурор Міхаіл Пацееў. Паводле пастановы, нагодай для вобшуку стала нібыта абраза ў мэсэнджары старшыні суду Дубровенскага раёну Марыі Цыклінскай.

Па словах супрацоўнікаў МУС, якія праводзілі ператрус, неўстаноўленая асоба 13 лютага 2021 году з румынскай сім-карты накіравала праз «Вайбер» старшыні суду Дубровенскага раёну Марыі Цыклінскай абразлівае паведамленне. Дубровенскі РАУС мае звесткі, што гэтай «неўстаноўленай асобай» можа быць Наталля Стрэльчанка. Што гэта былі за абразы і ці заводзілася крымінальная справа, міліцыянты не паведамілі.

У выніку ператрусу ў актывісткі канфіскавалі сістэмны блок ПК і мабільны тэлефон.

Гэта не першы ператрус, які адбываецца ў Наталлі Стрэльчанкі: толькі ў канцы 2020 году прайшлі два вобшукі. Тады таксама сканфіскоўваліся мабільныя тэлефоны і камп’ютарная тэхніка. Але калі раней падставай была крымінальная справа, заведзеная супраць мужа актывісткі Віктара Бугаёва, якога абвінавачвалі ў абразе супрацоўніка міліцыі ў сацсетках, дык зараз падазраванай стала сама Наталля.

Нагадаем, Віктар Бугаёў быў вымушаны пакінуць Беларусь, хаваючыся ад пераследаў.

На думку актывісткі такім чынам мясцовыя ўлады проста хочуць яе запалохаць.

«Ужо ад кастрычніка мінулага году яны спрабуюць ціснуць на мяне. Спачатку ператрусы па абвінавачванні мужа, зараз вырашылі абвінаваціць мяне. Звязваю гэты ціск на мяне з маёй грамадзянскай пазіцый, а таксама – з адмовай падпісваць іх папярэджанні аб недапушчальнасці ўдзелу ў несанкцыянаваных мітынгах», – мяркуе Наталля Стрэльчанка.

Старшыня суда дубровенскага раёну Марыя Цыклінская, якую, па словах міліцыянтаў, хтосьці абразіў у мэсэнджары, вядомая сваім удзелам у працэсах над мясцовымі грамадзянскімі і палітычнымі актывістамі.

Яна неаднойчы выносіла абвінаваўчыя прысуды па арт. 23.34 КаАП (цяпер – арт. 24.23). Гэтак, 21 студзеня Цыклінская прысудзіла прадпрымальніку Міхаілу Чамуруку 7 сутак адміністрацыйнага арышту за бел-чырвона-белыя шарыкі, вывешаныя на акне прыватнага дому. Штрафавала таксама і Наталлю Стрэльчанку, якой прысудзіла летась быццам бы за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі 25 базавых велічынь

**27.03.2021** 27 сакавіка жыхарка Наваполацку Алена Вінакурава набыла букет, каб павіншаваць сваю дачку Кацярыну з днём народзінаў. Кветкі хацела аднесці дачцэ на працу, але па дарозе была затрыманая супрацоўнікамі МУС і пасля складання пратаколу кінутая ў мясцовы цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП), перадае Беларускае Радыё Рацыя.

«Мама гадзін каля 15-ці патэлефанавала, сказала: «Прабач, але мяне забралі ў пастарунак». Усё, што яна паспела паведаміць, гэта што набыла кветкі і ішла да мяне на працу, каб павіншаваць. Яе затрымалі, спачатку сказалі, што завязуць у пастарунак для высвятлення асобы, а потым склалі пратакол быццам бы за пікетаванне», – расказала Кацярына Вінакурава.

Дачка мяркуе, што маці несла белыя і чырвоныя кветкі.

Замест таго, каб адзначыць 28-я ўгодкі ў сямейным коле, Кацярына шукала маці ў пастарунку, а потым рыхтавала і насіла перадачу ў месца зняволення. Дзяўчына мяркуе, што судзіць маці будуць у аўторак 30 сакавіка.

Раней Алену Вінакураву ніколі не прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці. Але судзілі дачку – за бел-чырвона-белую стужку на сумцы. Праз гэта Кацярыну Вінакураву прызналі вінаватай у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і аштрафавалі на 10 базавых велічынь.

**30.03.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 30 сакавіка прайшоў судовы працэс у дачыненні да трох віцяблян, затрыманых на Дзень волі ля помніку князю Альгерду. Іх вінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні (арт. 24.23 КаАП). Суд пакараў мужчын адміністрацыйнымі арыштамі – агулам на 35 сутак.

Кіраўнік Віцебскай абласной філіі БНФ Кастусь Смолікаў і віцябляне Алесь Вендт і Іван Казлоў былі затрыманыя 25 сакавіка, а потым змешчаныя ў ізалятар часовага ўтрымання на 72 гадзіны. Іх вызвалілі ў нядзелю 28 сакавіка. Праз дзень адбыўся суд. Справу разглядаў суддзя Уладзімір Царыкаў.

«25 сакавіка з бела-чырвоным шалікам з надпісам «Жыве Беларусь! Беларусь за Мілінкевіча!» ўзяў удзел у пікетаванні: на знак абвяшчэння незалежнасці БНР знаходзіўся каля помніку Вялікаму князю ВКЛ Альгерду разам з Казловым і Смолікавым», – напісалі міліцыянты ў пратаколе Алеся Вендта.




У дачыненні да іншых удзельнікаў працэсу пратаколы ўтрымлівалі такія ж фармулёўкі, але ўдакладнялася, што шалік быў не ў іх.

Як патлумачыў на судзе Алесь Вендт, ён хацеў сустрэцца ў цэнтры з Кастусём Смолікавым і пайсці ў кавярню, каб пагутарыць і адзначыць свята.

«Мы хацелі паразмаўляць, прысесці на лаўку каля Альгерда. Прыпынак быў поўны, і там няма дзе было прысесці», – сказаў Алесь.

Каля прыпынку ж ён выпадкова сустрэў свайго знаёмага Івана Казлова, які проста падышоў павітацца – і быў затрыманы «прычэпам».

Як вынікае з рапарту, складзенага супрацоўнікам МУС Віталём Пралічам, «паводле інфармацыі неўстаноўленай асобы, было ўстаноўлена, што каля помніку Альгерду знаходзіцца група грамадзян, якія маюць пры сабе шалік бела-чырвонага колеру, а таксама палотнішча бел-чырвона-белага колеру. У ходзе выбыцця нараду ППС былі ўстаноўленыя і затрыманыя Вендт, Казлоў, Смолікаў».

Пры аглядзе асабістых рэчаў у Алеся Вендта сапраўды быў знойдзены БЧБ-сцяг, які ляжаў у падарункавы пакеце. Па словах Алеся, і гэта пацвярджае відэазапіс, прагледжаны ў судзе, сцяг з пакету не даставаўся.

Якім чынам «неўстаноўленая асоба» ведала пра знаходжанне ў пакеце сцяга, засталося загадкай.

Сам жа Віталь Праліч на суд не з'явіўся, хаця суддзя на пачатку працэсу казаў пра заяўленых сведкаў-міліцыянтаў.

«Калі б мы хацелі правесці масавае мерапрыемства, мы б яго правялі. І ў прынцыпе, нічога нам не замінала яго правесці. Але насамрэч мы з сябрам хацелі проста папіць кавы ці піва і каля Альгерда вырашалі, куды лепш пайсці», – сказаў Кастусь Смолікаў.

Суддзя Уладзімір Царыкаў прызнаў мужчын вінаватымі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні (арт. 24.23 КаАП). Кіраўнік абласной філіі БНФ Кастусь Смолікаў асуджаны на 12 сутак, Алесь Вендт – на 13, а Іван Казлоў – на 10 сутак адміністрацыйнага

арышту.

Рашэнне суду не набыло законнай моцы. Суддзя даў віцяблянам 5 сутак на абскарджанне пастановы. Пасля суду іх не затрымалі.

**31.03.2021** 31 сакавіка Віцебскі абласны суд разгледзеў скаргі праваабаронцы БХК Ірыны Трацяковай і жыхаркі Віцебскага раёну Таццяны Туравец на пастановы судоў ніжэйшай інстанцыі. Рашэнне суду паводле палітычна матываваных справаў сталіся прадказальнымі: суддзі Андрэй Прэйс і Святлана Іванова скаргі не задаволілі, а рашэнні раённых судоў пакінулі без зменаў.



Праваабаронца Ірына Траццякова брала ўдзел у судовым паседжанні праз відэасувязь, бо на той час знаходзілася па-за межамі Беларусі. Яна абскардзіла пастанову суду Чыгуначнага раёну Віцебску ад 10 сакавіка. У той дзень суддзя Варатынская паводле ч.1 арт. 23.34 КаАП аштрафавала праваабаронцу на 20 базавых велічынь (580 рублёў). Суд палічыў доказаным удзел Траццяковай у масавым мерапрыемстве (пікетаванні) без дазволу мясцовай адміністрацыі. Паводле судовай пастановы, праваабаронца стаяла ў ланцугу салідарнасці і выказвала падтрымку грамадзянам, затрыманым па палітычных матывах.

У сваёй скарзе Траццякова выказала нязгоду з пастановай суду. Свой удзел у пікетаванні аспрэчыла. Патлумачыла, што, як сябра Беларускага Хельсінкскага камітэту, ажыццяўляла маніторынг выбарчай кампаніі.

Прасіла адмяніць пастанову і справу спыніць у сувязі з адсутнасцю ў яе дзеяннях складу адміністрацыйнага правапарушэння.

У скарзе, пададзенай адвакаткай Ірыны Траццяковай, таксама выказвалася нязгода з судовым рашэннем. Звярталася ўвага на недакладнасцях у пратаколе. У скарзе сцвярджалася, што Траццякова, як зафіксавана на відэа, рухалася ўздоўж ланцугу грамадзян і ажыццяўляла функцыі назіральніка. Саступіць з вузкіх ходнікаў на прыступкі будынку вымушаная была толькі адзін раз, каб прапусціць групу міліцыянтаў, якія рухаліся, папярэджваючы грамадзянаў аб незаконнасці мерапрыемства. Менавіта гэты эпізод і быў зафіксаваны на скрыншоце, хаця адрас будынку, ля якога яна спынілася са знаёмым журналістам, указаны памылкова.

«Я не ўяўляю, хіба суду не зразумела, хіба асобным суддзям незразумелымі падаюцца падзеі 19 чэрвеня? Я доўгатэрміновы назіральнік БХК на электаральных кампаніях рознага ўзроўню ў краіне. І я ўпершыню сутыкнулася з такім непаразуменнем толькі на прэзідэнцкіх выбарах 2020 году. З улікам тых дакументаў, якія ёсць у матэрыялах справы, я спадзяюся на поўны і аб’ектыўны разгляд і веру, што суд прыме правільнае рашэнне. Я нават гатовая пагадзіцца на новы разгляд справы», – сказала Ірына Траццякова падчас паседжання ў абласным судзе.

Дадала, што прыцягненне яе да адміністрацыйнай адказнасці расцэньвае як супрацьдзеянне законнай дзейнасці БХК.

Адвакатка Ірыны Траццяковай назвала справу «доўгаграннай» і спынілася на яе асноўных аспектах. Зазначыла, што, як запэўнівала Траццякова, яна не ўдзельнічала ў несанкцыянаваным пікетаванні, не стаяла ў ланцугу салідарнасці, а назірала за санкцыянаваным уладамі зборам подпісаў. Ніводзін відэаматэрыял не пацвярджае аб’ектыўны бок адміністрацыйнага правапарушэння, ніводзін сведка не гаворыць пра месца знаходжання Траццяковай, а месца здзяйснення правапарушэння аб’ектыўна не ўстаноўленае.

Выслухаўшы аргументацыю Ірыны Траццяковай і яе адвакаткі, суддзя Андрэй Прэйс агучыў выніковую частку пастановы: «пастанову суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску ад 10 сакавіка 2021 году пакінуць без зменаў, а скаргу без задавальнення».

Суддзя Віцебскага абласнога суду Святлана Іванова таксама не задаволіла скаргу грамадзянкі Таццяны Туравец на рашэнне суду Віцебскага раёну. Паводле арт. 23.4 КаАП (непадпарадкаванне законнаму распараджэнню ці патрабаванню службовай асобы) і арт. 23.5 КаАП (абраза службовай асобы пры выкананні службовых паўнамоцтваў) суддзя суду Віцебскага раёну Міхаіл Зубеня аштрафаваў Туравец на 870 рублёў.

**02.04.2021** Крымінальную справу распачалі ў дачыненні 53-гадовай жыхаркі Воршы, якая нібыта размясціла ў «Тэлеграме» публікацыю з «не адпаведнымі рэчаіснасці і ганебнымі звесткамі» пра старшыню адной з выбарчых камісій Віцебску, паведамляе са спасылкай на следчы камітэт партал Orsha.eu.

Раней крымінальныя справы за абразу міліцыянтаў у інтэрнэце былі заведзеныя ў Воршы супраць Арцёма Кандрацьева і Максіма Шаўлінскага.

Аршанец Максім Шаўлінскі – былы супрацоўнік адной гандлёвай кампаніі. Пасля жнівеньскіх падзей 2020 году працаўнікі кампаніі ў сваім унутраным карпаратыўным чаце абмяркоўвалі палітычную сітуацыю ў краіне. Але з нейкіх прычын чат стаў даступны для міліцыянтаў, якія расцанілі некаторыя выказванні ўдзельнікаў як абразу ў дачыненні да сябе. Супрацоўнік кампаніі Арцём Кандрацьеў быў асуджаны на паўтара года абмежавання волі («хіміі»).

Цяпер следчыя ўзяліся за праву Максіма Шаўлінскага. На днях, як перадае Аршанскі рэгіянальны партал, ягоную справу перадалі ў пракуратуру. Магчыма, суд адбудзецца ўжо ў красавіку.

**06.04.2021** У Наваполацку затрымалі яшчэ аднаго ўдзельніка стачкі на прадпрыемстве «Нафтан» Аляксандра Сакалова. Пра гэта паведаміў стачкам на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку». Паведамляецца, што ён быў затрыманы па справе відэароліка, знятага ў падтрымку галасавання на платформе «Голас». Навапалачаніна, як і іншых затрыманых, вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыянаваным пікетаванні (арт. 24.34 КаАП).

«Сёння быў захоплены Аляксандр Сакалоў. Заўтра чакаецца суд, але наўрад ці варта спадзявацца на справядлівае рашэнне – нашаму таварышу пагражае як мінімум 15 сутак арышту», – піша «Стачкам ААТ «Нафтан».

Аляксандр Сакалоў працуе на «Нафтане» аператарам устаноўкі «Сумарныя ксілолы». У 2017 годзе афіцыйнае выданне «Веснік Нафтана» пісала пра Сакалова як пра моладзевага лідара і прэтэндэнта на перамогу ў намінацыі «Прызнанне» завадскога форуму, як аднаго з тых, хто «імкнецца развівацца шматгранна» і «дэманструе хуткі прафесійны рост».

Стачкам нагадвае, што дагэтуль за кратамі знаходзяцца яшчэ чацвёра ўдзельнікаў страйку – Аляксандр Капшуль, Аляксей Драбіцкі, Сяргей Лапуноў і Андрэй Шкірэнка. 25 сакавіка кожны з іх быў асуджаны на 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

Відэа ў падтрымку галасавання на платформе «Голас» («Твой голас – голас Беларусі») з'явілася ў інтэрнэце 20 сакавіка. Амаль адразу пачалося паляванне на тых страйкоўцаў, хто ўдзельнічаў у яго стварэнні. На кватэрах затрыманых удзельнікаў стачкі прайшліператрусы.

**07.04.2021** Віцебскі абласны суд разгледзеў 7 красавіка скаргі журналістаў-фрылансераў Змітра Казакевіча і Алены Шабуні, аштрафаваных у сакавіку за матэрыялы, якія былі апублікаваныя на сайце тэлеканалу «Белсат». Суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў іх вінаватымі ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ (арт. 23.5 КаАП). Журналісты з гэтым не пагадзіліся.

«Быў прызнаны вінаватым у тым, што, не маючы акрэдытацыі замежнага СМІ, вырабіў інфармацыйныя матэрыялы, якія былі размешчаныя ў інтэрнэце на сайце belsat.eu», – прачытала суддзя Святлана Іванова пастанову ў дачыненні да Змітра Казакевіча.

Віцебскі журналіст-фрылансер Зміцер Казакевіч 17 сакавіка быў аштрафаваны на 60 базавых велічынь у двух адміністрацыйных справах. А менавіта - за артыкул пра выкладчыка ВДМУ, звольненага з працы за бел-чырвона-белыя фіранкі на акне ўласнай кватэры, і за паведамленне з судовага працэсу над віцяблянінам Арцёмам Ісакавым. Рашэнні аб пакаранні штрафамі прымалі суддзі Андрэй Шыдлоўскі і Вераніка Барысава (абодва прысудзілі журналісту па 30 базавых велічынь).

Справу Алены Шабуні ў судзе першай інстанцыі таксама разбірала Вераніка Барысава. Паводле пастановы, Шабуня «прызнаная вінаватай у тым, што, знаходзячыся ў Паставах, выконвала функцыі журналіста замежнага СМІ без акрэдытацыі, брала інтэрв'ю і зрабіла відэасюжэт, які быў размешчаны ў камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт».

24 сакавіка Алену Шабуню пакаралі штрафам у памеры 30 базавых велічынь.

У скаргах віцебскія журналісты адзначалі, што былі парушаныя іх правы, гарантаваныя Канстытуцыяй і Міжнародным пактам аб палітычных і грамадзянскіх правах, якія дазваляюць грамадзянам свабодна збіраць і распаўсюджваць інфармацыю. Прасілі рашэнні суду Першамайскага раёну Віцебску адмяніць, а адміністрацыйныя справы спыніць праз адсутнасць складу адміністрацыйнага правапарушэння.

Суддзя Іванова не падтрымала іх довады і пакінула пастановы без зменаў, а скаргі – без задавальнення.

Справы Аношчанкі і Кухаронак
Не задаволіла Святлана Іванова і скаргі жыхароў Наваполацку Уладзіміра Аношчанкі і Вольгі Кухаронак.

Уладзімір Аношчанка быў аштрафаваны 3 сакавіка судом Наваполацку на 25 базавых велічынь за вывешаны на балконе бел-чырвона-белы сцяг. А Вольга Кухаронак была прызнаная вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсці. 26 лютага Наваполацкі суд аштрафаваў яе на 30 базавых велічынь.

Відэазапіс шэсця людзей з бел-чырвона-белымі сцягамі ў Наваполацку быў выкладзены ў Інтэрнэт. Сярод удзельнікаў, якія былі ў масках, супрацоўнікі МУС апазналі Вольгу Кухаронак. У абласным судзе Вольга заявіла, што не брала ўдзел у акцыі і знаходзілася ў гэты час удома са сваёй сям’ёй. Запэўнівала, што ідэнтыфікаваць удзельнікаў акцыі на відэа немагчыма.

«Вы мяркуеце, супрацоўнік міліцыі можа браць на сябе такую адказнасць і агаворваць чалавека? Якая ў яго прычына?» – удакладніла суддзя Іванова.

«Прычына такая, што мой муж працуе на «Нафтане» і знаходзіцца ў стачцы. Да таго, як мяне прывялі ў ГАУС, у кватэры быўператрус. Нібыта я сведка абразы супрацоўніка міліцыі ў сацсетках. Пасляператрусу мяне запрасілі ў следчы камітэт для дачы паказанняў, а там ужо мяне чакаў супрацоўнік ГАУС...» – адказала Вольга Кухаронак.

**09.04.2021** 8 красавіка Віцебскі абласны суд разгледзеў скаргу кіраўніка Віцебскай абласной філіі БНФ Кастуся Смолікава на пастанову суду Кастрычніцкага раёну Віцебску. 30 сакавіка Кастусь Смолікаў, Алесь Вендт і Іван Казлоў былі прызнаныя вінаватымі ў несанкцыянаваным пікетаванні і пакараныя адміністрацыйнымі арыштамі.



Справу разглядала суддзя абласнога суду Святлана Іванова.

25 сакавіка віцябляне сустрэліся ля помніка князя Альгерда і неўзабаве былі затрыманыя міліцыянтамі на 72 гадзіны. 30 сакавіка суддзя Уладзімір Царыкаў паводле ч. 1 арт. 24.23 КаАП пакараў віцяблян адміністрацыйнымі арыштамі. Кастусь Смолікаў атрымаў 12 сутак арышту.

У сваёй скарзе Смолікаў паказаў неабгрунтаванасць накладзенага на яго спагнання. Ён лічыць, што пастанова супярэчыць Канстытуцыі і Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Мяркуе, што сваімі дзеяннямі ніякага заканадаўства не парушыў. Смолікаў патлумачыў, што сустрэўся са знаёмымі ля помніка, каб дамовіцца, у якой кавярні правесці час. З улікам гэтага прасіў адмяніць пастанову і спыніць справу праз адсутнасць у яго дзеяннях складу правапарушэння.

У судовым паседжанні Кастусь Смолікаў звярнуў увагу Святланы Івановай на некалькі алагічных, на ягоную думку, момантаў, зафіксаваных у справе.

Па-першае, ніякімі фактычнымі дадзенымі не пацверджана, што ля помніка князю Альгерду ён знаходзіўся ад 17.00 да 17.25. Запіс на прадэманстраваным у судзе відэа пачынаецца з 17.25. Па словах Смолікава, каля помніку Альгерду ён са знаёмымі з’явіўся літаральна за хвіліну да прыходу міліцыянтаў. Задумы праводзіць пікет наагул не было.

Па-другое, Смолікаў выказаў неразуменне, чаму раённы суд узяў да ведама аргумент міліцыянтаў, што помнік Альгерду – месца збору апазіцыянераў. З гэтага вынікае, што ля помніка наагул нельга збірацца нікому.

Па-трэцяе, нельга браць пад увагу інфармацыю, узятую супрацоўнікамі міліцыі для доказу сваёй пазіцыі з тэлеграм-каналаў. Міліцыянты сцвярджаюць, што там быў размешчаны заклік збірацца 25 сакавіка ў цэнтры гораду. Паводле іх логікі, усе ведалі пра гэты заклік і кіраваліся ім. Смолікаў пераконваў, што такой інфармацыяй не валодаў. Ён не разумее, як такая інфармацыя можа сведчыць пра ягоную віну. А калі так, дык любы гараджанін, які апынуўся ў гэты дзень у цэнтры, мог быць затрыманы паводле арт. 24.23 КаАП.

Самай абсурднай часткай доказнай базы, як мяркуе Смолікаў, была даведка пра тое, што раённая адміністрацыя не давала дазволу на правядзенне масавага мерапрыемства. Як зазначыў скаржнік, у Віцебску вызначаныя ўсяго тры месцы для правядзення масавых мерапрыемстваў, і пляцоўка ля помніка князю Альгерду ў гэты пералік не патрапіла, таму адміністрацыя не магла выдаць такі дазвол. Па логіцы, адміністрацыя Кастрычніцкага раёну мусіла выдаць даведку, што гэтае месца не вызначанае для правядзення масавых мерапрыемстваў.

І па-пятае, Смолікаў пераконваў, што ніякай сімволікі ля помніка Альгерду ніхто не разгортваў. Ён нават не ведаў, што ў аднаго з ягоных знаёмых быў у пакеце бел-чырвона-белы сцяг, а пад вопраткай шалік гэтых жа колераў.

Смолікаў прасіў суддзю Іванову падтрымаць ягоную пазіцыю і скасаваць пастанову суду першай інстанцыі праз недаказанасць віны.



Вердыкт суддзі Івановай быў непахісны і прадказальны: «Пакінуць пастанову суду Кастрычніцкага раёну без зменаў, а скаргу – без задавальнення».

**13.04.2021** 12 красавіка ў Наваполацку адбыўся суд над удзельнікам стачкі на прадпрыемстве «Нафтан» Аляксандрам Кухаронкам. Нагодай для завядзення справы паводле ч.3 арт. 24.23 КаАП стала відэа, знятае страйкоўцамі ў падтрымку галасавання на пляцоўцы «Голас». Да суду мужчына правёў трое сутак у мясцовым ізалятары.

Аляксандр Кухаронак быў затрыманы 9 красавіка ў пад'ездзе свайго дому, калі вяртаўся дахаты.

«Я мужа папярэдзіла, што стаяла машына ў двары, потым ад’ехала. Яны ўвесь час тут пільнуюць, пастаянна сядзяць цэлы дзень у машыне», – распавяла Вольга Кухаронак, жонка асуджанага.

Відэаролік, за які быў пакараны Аляксандр Кухаронак, быў выкладзены ў інтэрнэт 20 сакавіка. У ім удзельнікі стачкі заклікалі грамадзян Беларусі ўзяць удзел у галасаванні на платформе «Голас». Адразу ж пасля размяшчэння відэароліка на ўдзельнікаў пачалося паляванне. Некалькі чалавек былі затрыманыя і асуджаныя.

«Чатыры чалавекі ўжо адседзелі па 15 сутак, іх выпусцілі, адзін знаходзіцца яшчэ за кратамі», – кажа Вольга.

Яе мужу таксама маглі даць 15 сутак, калі б судзілі паводле частцы 1 арт. 24.23. Але незадоўга да гэтага ў дачыненні да Кухаронка быў перагледжаны апраўдальны прысуд па адміністрацыйнай справе, разгледжанай яшчэ ў верасні 2020 года (яго судзілі за ўдзел у «шпацыры па горадзе ў дзень інаўгурацыі прэзідэнта»). Тады яго прызналі невінаватым. Але 18 сакавіка 2021 году суд перагледзеў рашэнне і прысудзіў яму штраф у памеры 30 базавых велічынь.

Аляксандр Кухаронак займаў на прадпрыемстве пасаду старшага аператара ўстаноўкі рэктыфікацыі. На прадпрыемстве адпрацаваў больш за 14 гадоў. 27 кастрычніка 2020 году ён далучыўся да агульнанацыянальнай забастоўкі і выклаў у інтэрнэт свой відэазварот да супрацоўнікаў прадпрыемства.

Яго жонка Вольга Кухаронак таксама была асуджаная па артыкуле 23.34. Яе прызналі вінаватай ва ўдзеле ў вулічным шэсці і аштрафавалі на 30 базавых велічынь.

**14.04.2021** 13 красавіка ў Докшыцах без усякіх на тое падставаў былі затрыманыя журналісты-фрылансеры Зміцер Лупач і Алена Шабуня. Тры гадзіны яны прабылі ў Докшыцкім РАУС, дзе з імі правялі прафілактычную размову, агледзелі тэлефоны і пасля гэтага адпусцілі. Без складання пратаколаў.

Як расказала Алена Шабуня, яна разам са Змітром Лупачом прыехала ў Докшыцы, каб падтрымаць на судзе знаёмага святара. Але на суд не трапілі, таму пайшлі гуляць па горадзе. Падчас шпацыру фатаграфаваліся. У нейкі момант недалёка ад іх спынілася міліцэйская машына.



Падышлі супрацоўнікі МУС, спраўдзілі дакументы, а потым папрасілі праехаць у аддзяленне міліцыі для высвятлення асобаў.

«Колькі я ім не даводзіла, што мы нічога не парушаем, а калі і здымаем на тэлефон – дык толькі для прыватнага карыстання, і што ехаць у РАУС няма ніякіх падставаў – пераканаць іх не ўдалося», – распавяла Алена Шабуня.

Паводле яе, у міліцыі правялі прафілактычную размову, агледзелі тэлефоны. Цікавіліся, якія каналы чытаюць у «Тэлеграме» і ці не з'яўляюцца адміністратарамі Тэлеграм-чатаў.

«Склалі нейкія паперы, але іх копіі нам не далі. Адпусцілі праз тры гадзіны», – удакладніла Шабуня. Яна кажа, што ў іх прысутнасці ніякія пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні не складаліся.

**14.04.2021** Камітэт па правах чалавека ААН устанавіў факт парушэння беларускай дзяржавай права жыхара Віцебскага раёну Леаніда Здрэстава на распаўсюд інфармацыі. Камітэт прапанаваў Беларусі прыняць адпаведныя меры для прадастаўлення Здрэставу адэкватнай кампенсацыі і кампенсацыі яго судовых выдаткаў, а таксама прыняць меры для прадухілення падобных парушэнняў у будучыні.

15 ліпеня 2013 гады жыхар Віцебскага раёна Леанід Здрэстаў падаў заяву на правядзенне 17 і 18 жніўня 2013 года адзіночнага пікету ў Віцебскім парку Савецкай Арміі з мэтай інфармавання жыхароў горада аб сістэматычным парушэнні яго правоў рознымі дзяржаўнымі органамі. Аднак улады забаранілі праводзіць пікеты на той падставе, што ён не прыклаў да сваёй заявы дамоваў з адпаведнымі службамі па падтрыманні грамадскага парадку і прадастаўленні медычных паслуг падчас мерапрыемстваў і па прыборцы тэрыторыі пасля правядзення пікетаў.

Прайшоўшы ўсе судовыя інстанцыі і не дамогшыся ў іх належнай абароны свайго права на распаўсюд інфармацыі, аўтар скаргі звярнуўся ў Камітэт.

Цягам чатырох гадоў ішла перапіска, у якой кожны з бакоў спрабаваў даказаць сваю правату. Дзяржава настойвала на тым, што правы Здрэстава не былі парушаныя і прасіла не рэгістраваць ягоную скаргу, а Здрэстаў абгрунтавана сцвярджаў пра парушанае права публічна распаўсюджваць крытычную інфармацыю. Відаць, аргументы Леаніда былі больш пераканаўчымі, і Камітэт прыняў рашэнне на яго карысць.

Акрамя прызнання беларускай дзяржавы парушальнікам права Леаніда Здрэстава на свабоду слова, КПЧ прапанаваў ураду перагледзець заканадаўчую базу ў адпаведнасці са сваім абавязкам перад міжнароднымі праваабарончамі арганізацыямі.

У прыватнасці, перагледзець рашэнне №881 Віцебскага гарвыканкаму і артыкулы Закону аб масавых мерапрыемствах і прывесці іх у адпаведнасць міжнародным стандартам з мэтай забеспячэння права грамадзян на свабоду слова і мірныя сходы.

З нагоды чарговага рашэння Камітэту віцебскі праваабаронца Леанід Свецік заўважыў, што гэта не першае і, вядома ж, не апошняе рашэнне Камітэту па правах чалавека ў скаргах віцебскіх

грамадзянскіх і палітычных актывістаў. Ён выказаў надзею, што ўлады перагледзяць нарматыўна-прававыя акты для спрашчэння працэдур атрымання дазволу на правядзенне масавых мерапрыемстваў і сходаў грамадзян у Віцебскім рэгіёне.

**15.04.2021** На досвітку 15 красавіка ў Віцебску быў затрыманы 62-гадовы актывіст Мікола Качурэц. Паводле інфармацыі, атрыманай ад жонкі Качурца, яго затрымалі нібыта з той прычыны, што меў не адбытыя 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Пасля затрымання віцяблянін знаходзіўся ў Першамайскім РАУС Віцебску.

Як расказала жонка Міколы Качурца Марына, яго затрымалі каля 6-й гадзіны раніцы.

«Мікола не аднойчы казаў мне, што яго пільнуюць супрацоўнікі РАУС, выведваюць нейкую інфармацыю пра яго ў суседзяў. Таму калі ён патэлефанаваў мне ў 5:56 і сказаў, што збіраецца ехаць у РАУС, я не вельмі здзівілася», – расказала Марына.

Паводле яе, у Міколы яшчэ са жніўня 2020 году заставаліся не адбытыя 10 сутак і пару гадзін адміністрацыйнага арышту. Ён быў затрыманы ў ноч з 9 на 10 жніўня, асуджаны паводле арт. 23.34 КаАП на 15 сутак і быў вызвалены з віцебскага СІЗА-2 без тлумачэння прычын 14 жніўня.

Жонка Міколы Качурца паведаміла таксама, што яе муж мае намер адмовіцца ад турэмнай ежы. Ён сказаў ёй пра гэта, калі апошні раз тэлефанаваў з Першамайскага РАУСу. Марына паспела перадаць мужу перадачу яшчэ ў аддзяленне міліцыі.

«Павезлі перадачу ў СІЗА, але там Міколы яшчэ не было. Прыйшлося ехаць у РАУС. На маё здзіўленне, там з намі размаўлялі ветліва, перадачу ўзялі без асаблівых спрэчак і нават пакінулі нумар тэлефона на выпадак, калі будуць пытанні», – паведаміла жонка Качурца.

Мікола Качурэц будзе знаходзіцца за кратамі да 25 красавіка.

**15.04.2021** Увечары 13 красавіка ў вёсцы Прусы Пастаўскага раёну быў затрыманы валанцёр «Краіны для жыцця» і былы палітвязень Андрэй Новікаў. Паводле жонкі Новікава, яму інкрымінуюць незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы (арт. 371 КК). У доме Новікавых прайшоўператрус: канфіскавалі аргтэхніку і дакументы.

Па словах жонкі Андрэя Новікава Вольгі, ён прыехаў дадому, каб дапамагчы адвезці дзіця на лячэнне ў Менск.

«Нашае дзіця мае патрэбу ў шпіталізацыі, і такая сітуацыя склалася, што не было каму нас адвезці ў Менск. Натуральна, што на фоне ўсяго гэтага муж вельмі за нас перажываў. Таму і вярнуўся...» – расказала Вольга.

Яна выказала здагадку, што ў міліцыю пра вяртанне Андрэя паведаміў хтосьці з аднавяскоўцаў. Цяпер Андрэй знаходзіцца ў Пастаўскім РАУС.

Андрэй Новікаў быў актыўным удзельнікам мінулай прэзідэнцкай кампаніі, з'яўляўся валанцёрам каманды для збору подпісаў за Святлану Ціханоўскую. У чэрвені 2020 году супраць яго была заведзеная крымінальная справа паводле ч.1 арт. 342 КК («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак»). Андрэй Новікаў быў прызнаны палітвязнем, 7 месяцаў ён правёў у менскім СІЗА, пасля чаго яго дэпартавалі ў Расею і забаранілі ўязджаць у Беларусь на 10 гадоў. Але ў Беларусі ў яго засталася жонка і двое дзяцей, адзін з якіх мае інваліднасць.

Андрэй Новікаў нарадзіўся на Пастаўшчыне, але мае грамадзянства Расейскай Федэрацыі. У Расеі ён шмат гадоў працаваў у сілавых структурах, быў звольнены ў запас у званні падпалкоўніка.

Апошнія гады, маючы від на жыхарства ў Беларусі, жыў у Пастаўскім раёне разам з сям’ёй.
**18.04.2021** На пачатку 2021 году Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3820/2020 індывідуальную скаргу Таццяны Севярынец. Грамадская актывістка лічыць, што беларускай дзяржавай было парушанае яе права на ўдзел у масавых мерапрыемствах.

Пастановай суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 21 сакавіка 2017 году Таццяна Севярынец была прызнаная вінаватай у тым, што паўторна цягам аднаго года пасля адміністрацыйнага пакарання за такое ж парушэнне ўзяла ўдзел у масавых мерапрыемствах. Акцыі не былі санкцыянаваная мясцовай уладай. На падставе часткі 3 артыкулу 23.34 КаАП Севярынец была аштрафаваная на 50 базавых велічынь, што на той момант складала 1150 беларускіх рублёў.

Для абароны свайго права на ўдзел у мірных публічных акцыях Таццяна Севярынец звярталася у вышэйшыя судовыя інстанцыі. Аднак беларускія суды адмовіліся абараніць яе правы. Свой адказ яны абгрунтавалі тым, што суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прыняў рашэнне паводле закону і на фактычных доказах.

Улічваючы правапрымяняльную практыку, якая сведчыць пра тое, што пракурорскі нагляд у Рэспубліцы Беларусь не эфектыўны, Таццяна Севярынец не звярталася ў гэты дзяржаўны орган. Аднак яе аргументы аб неэфектыўнасці працы органаў пракуратуры ў галіне абароны правоў і свабодаў улады палічылі несапраўднымі. Згодна са статыстычнымі дадзенымі за 9 месяцаў 2020 году, органамі пракуратуры краіны на пастановы па адміністрацыйных справах прынесены 2261 пракурорскі пратэст, з якіх задаволена 1978 (87,5%). Прыведзеныя лічбы сведчаць пра тое, што пракурорскі нагляд з’яўляецца дастаткова эфектыўным сродкам абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян. Таму ўлады палічылі, што Севярынец не прайшла ўсе стадыі абароны сваіх правоў і, у адпаведнасці з артыкулам 2 Факультатыўнага пратаколу Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, разгляд яе скаргі Камітэтам немагчымы.

Больш за тое, улады разглядаюць пададзеную скаргу як злоўжыванне актывісткай правам на зварот у Камітэт.

«Падобная пазіцыя дзяржавы па скаргах беларускіх грамадзян у Камітэт не дае станоўчага эфекту. Камітэт, які рэгіструе і прымае рашэнні па скаргах без зваротаў у органы пракуратуры, працягвае гэта рабіць, не звяртаючы ўвагі на пратэсты дзяржавы. І гэта правільна, бо беларуская пракуратура не апратэставала ніводнага (!) адмоўнага рашэння судоў адносна ўдзелу грамадзян у масавых мерапрыемствах. Беларуская пракуратура ў цяперашні час перастала быць органам праваахоўным, захавала толькі карныя функцыі», – патлумачыў сітуацыю праваабаронца Павел Левінаў.

Ён упэўнены, што скарга Таццяны Севярынец мае перспектыву разгляду Камітэтам па сутнасці, і, з вялікай верагоднасцю, КПЧ прызнае парушэнне дзяржавай права актывісткі на ўдзел у масавых мерапрыемствах.

**19.04.2021** За абразу камандуючага ўнутранымі войскамі Мікалая Карпянкова віцеблянін асуджаны на паўтара гады "хіміі", а за публічную абразу Аляксандра Лукашэнкі жыхар Полацкага раёну атрымаў пяцігадовы тэрмін з узмоцненым рэжымам адбыцця ў папраўчай калоніі. Прысуды ў законную сілу не ўступілі і могуць быць абскарджаныя і апратэставаныя ў апеляцыйным парадку ў вышэйстаячых судах.

Пракуратура Віцебскай вобласці падтрымала ў судзе дзяржаўнае абвінавачанне па крымінальнай справе ў дачыненні да 42-гадовага жыхара абласнога цэнтру А., якому інкрымінаваная публічная абраза прадстаўніка ўлады.

Як устаноўлена, А. 16 студзеня 2021, маючы намер на публічную абразу намесніка міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь - камандуючага ўнутранымі войскамі Мікалая Карпянкова, са свайго ўліковага запісу ў сацыяльнай сетцы «Укантакце» размясціў абразлівыя каментары да публікацыі аб выкананні пацярпелым сваіх службовых абавязкаў.

У судовым пасяджэнні А. сваю віну прызнаў і раскаяўся ў зробленым. Растлумачыў, што прычынай сталі негатыўныя эмоцыі пасля прачытання інфармацыі на рэсурсах у сетцы Інтэрнэт.

Заяўленыя іскавыя патрабаванні аб кампенсацыі маральнай шкоды на суму 1 тыс. рублёў А. кампенсаваў ў поўным аб'ёме, пералічыўшы грошы на разліковы рахунак дзіцячага дома.

З улікам пададзеных дзяржабвінаваўцам доказаў суд Першамайскага раёну Віцебску пастанавіў ў дачыненні да А. абвінаваўчы прысуд. На падставе арт.369 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь прызначыў яму пакаранне ў выглядзе 1 года 6 месяцаў абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу. У даход дзяржавы канфіскаваны мабільны тэлефон, з выкарыстаннем якога А. размяшчаў каментары.

Таксама абласная пракуратура падтрымала ў судзе дзяржаўнае абвінавачанне па крымінальнай справе ў дачыненні да раней нясуджаных 29-гадовага жыхара Полацкага раёну Л., якому інкрымінаваліся злачынствы супраць міру і бяспекі, а таксама парадку кіравання.

У ходзе судовага разбору ўстаноўлена, што Л. з кастрычніка 2019 году да ліпеня 2020 году ў сетцы Інтэрнэт размяшчаў каментары з заклікамі да гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў і прэзідэнта РБ, а таксама абразы на адрас кіраўніка дзяржавы. Сваю віну Л. прызнаў часткова.

Судовая калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду прызнала Л. вінаватым у наўмысных дзеяннях, накіраваных на рапальванне сацыяльнай варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, па ч.1 арт.130 КК РБ, публічнай абразе па ч.1 ст.368 і па ч.1 ст.366 пагрозе гвалтам у адносінах да кіраўніка дзяржавы.

Па сукупнасці злачынстваў суд прызначыў абвінавачанаму канчатковае пакаранне ў выглядзе 5 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

У даход дзяржавы канфіскаваны мабільны тэлефон, з выкарыстаннем якога Л. размяшчаў каментары.

**19.04.2021** Маці палітвязня Паўла Севярынца, які больш за 10 месяцаў знаходзіцца за кратамі, падзялілася, пра што піша сын у сваіх лістах да яе і бацькі. Па словах Таццяны Севярынец, яна атрымала ад Паўла 75 лістоў. Ён не падае духам: піша кнігу, посціць і прапаведуе ў камеры.

Рыхтуецца да Вялікадня
Цяпер – час посту, і, як праваслаўны вернік, Павел рыхтуецца да Пасхі. Нават посціць, хаця і знаходзіцца ў цалкам не спрыяльных для гэтага ўмовах.

«Уяўляеш, матулечка, як толькі я напісаў у лістах да вас, што збіраюся посціць - адразу з'явіліся біточкі, з'явіліся вараныя яйкі, чаго ніколі раней не было. А што ж рабіць? Прыходзіцца аддаваць сукамерніку. Ён вельмі задаволены, а я гартую сваю волю», - напісаў сын.

Некалі мы дамовіліся з ім, што ён ніколі не будзе галадаць, але па божым календары такія іспыты для сябе ён робіць», – распавядае Тацяна Севярынец.

Хоча паспавядацца, але святара не пускаюць

Па словах маці, Павел прасіў, каб да яго пусцілі святара. Духоўнік Паўла памёр, але некалькі святароў па сваёй волі пагаджаюцца да яго прыйсці. Адміністрацыя, аднак, спасылаецца на пандэмію і духоўныя патрэбы палітвязня ігнаруе.

«Хаця на Валадарку да Паўла з храму, што на вайсковых могілках, заўсёды хадзіў айцец Васіль. Дарэчы, там ёсць адмысловы малельны пакой, дзе любы зняволены можа паспавядацца», – удакладняе Таццяна Севярынец.

Падзякі за духоўны подзвіг
Маці палітвязня расказвае, што пэўны час з Паўлам у адной камеры сядзеў мужчына, зняволены паводле арт. 328 (незаконны абарот наркатычных сродкаў). І Паўлу ўдалося яго евангелізаваць. Былы наркаман прыйшоў да Госпада, пакаяўся ва ўжыванні і распаўсюдзе наркотыкаў, папрасіў, каб пахрысцілі ягонае дзіцяці, якое да таго было няхрышчанае.

Пасля гэткіх пераменаў сваякі зняволенага звязваліся з жонкай Паўла Вольгай Севярынец, дабраслаўляючы Паўла за ягоны духоўны подзвіг. Праўда, праз пэўны час мужчыну перавялі ў іншую камеру. Цяпер у Паўла іншы сукамернік.

Піша кнігу, адказвае на лісты з волі
За кратамі Павел працягвае пісаць чарговую кнігу «Беларусаліму». Маці нават прыспешвае яго, бо ёй вельмі цікава, што там будзе з галоўным героем.

«У другой кнізе распавядаецца пра вызваленне ад волі д'ябла. Там шмат прароцтваў. Неверагодна, але яны на кожнай старонцы, хаця кніга выйшла ўжо пасля таго, як Пашу зняволілі, і ён не быў сведкам шмат чаго», – тлумачыць Таццяна Севярынец.

Працуе, чытае і адказвае на кожны ліст з волі. За дзень атрымлівае 15-20 лістоў, адказвае на кожны. Што тычыцца затрымак, дык яны адбываюцца не па віне Паўла. Як распавяла Таццяна, цяпер сын атрымлівае яшчэ сакавіцкія лісты ад бацькоў. За час зняволення Севярынцы атрымалі 75 лістоў ад сына, а ён ад іх – пакуль 56.

Судзіць будуць у Магілёве
Тацяна Севярынец расказала, што спачатку справа Паўла была перададзеная ў Вярхоўны суд, але адтуль матэрыялы вярнулі ў пракуратуру, а з пракуратуры - перадалі ў Магілёўскі абласны суд. Найхутчэй справу будуць разглядаць менавіта там, разам са справамі Яўгена Афнагеля, Андрэя Войніча, Паўла Юхневіча, Максіма Вінярскага, Дзмітрыя Казлова і Ірыны Шчаснай.

Тэрмін утрымання пад вартай Паўла Севярынца Магілёўскі абласны суд падоўжыў да 7 траўня.

Нагадаем, Паўла Севярынца затрымалі 7 чэрвеня 2020 году ў Менску. Яму некалькі разоў падаўжалі тэрмін утрымання пад вартай. 20 жніўня ў дачыненні да Паўла распачалі крымінальную справу за ўдзел у масавых беспарадках (ч.2 арт. 293 КК РБ). Беларускія праваабаронцы прызналі Севярынца палітвязнем, а Міжнародная амністыя назвала яго вязнем сумлення.

**20.04.2021** 36-гадовага жыхара Віцебску Вадзіма Ермаловіча затрымалі 14 красавіка недалёка ад дзяржаўнай мяжы з Літвой. Мужчына знаходзіўся на падпісцы аб нявыездзе. На яго была заведзеная крымінальная справа за абразу прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК).

Па версіі следства, ён у Тэлеграм-чаце «Vitebsk_Юг» абразіў камандзіра менскага АМАПу палкоўніка Дзмітрыя Балабу.

Абразлівы каментар, паводле пастановы аб завядзенні крымінальнай справы, Вадзім Ермаловіч размясціў, «рэалізуючы намер на абразу прадстаўніка ўлады – камандзіра АМАП ГУУС Менгарвыканкаму палкоўніка міліцыі Балабы, з мэтай прынізіць яго гонар і годнасць у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў, кіруючыся нізкімі намерамі, якія выявіліся ў жаданні паказаць Балабу ў зневажальным становішчы ў вачах шырокай грамадскасці, з выкарыстаннем неўстаноўленай электроннай прылады з доступам у Інтэрнэт».

Як сцвярджаецца, паведамленне ў чаце было размешчанае 24 снежня 2020 году. Крымінальную справу распачалі 20 сакавіка 2021 году. У гэты ж дзень Вадзіма Ермаловіча ўзялі пад варту, а ў ягоным доме ўчыніліператрус: канфіскавалі камп'ютар, ноўтбук, нэтбук, флэшкі, мабільны тэлефон, а таксама грошы. Аднак праз 72 гадзіны па затрыманні (23 сакавіка) мужчыну вызвалілі з ізалятару пад падпіску аб нявыездзе.

14 красавіка Вадзім Ермаловіч быў зноў затрыманы непадалёку ад мяжы Беларусі з Літоўскай Рэспублікай.

«Яго затрымалі на мяжы з Літвой. Мяжу ён не перасякаў. Месца нам не агучылі», – расказала маці затрыманага Таццяна.

«Пасля гэтага яго адправілі ў СІЗА. Ніякіх спатканняў нам не абяцалі, сказалі нельга нам па гэтым артыкуле. А перадачы носім», – дадала.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў Вадзім Ермаловіч браў удзел у пратэставых акцыях, якія праходзілі ў горадзе. На адной з іх быў затрыманы і аштрафаваны па артыкуле 23.34 КаАП. Паводле маці, у Вадзіма «абвостранае пачуццё справядлівасці», і ён не мог вынесці тое, «што робіцца зараз у краіне, гэты жах».

Незадоўга да завядзення крымінальнай справы Вадзім Ермаловіч звольніўся з працы.

«Збіраўся ехаць у Польшчу на працу. Ужо пра ўсё дамовіўся. І месца працы, і страхоўка была аплачаная, і віза адкрытая. Усё было падрыхтавана...» – кажа спадарыня Таццяна.

Цяпер Вадзім Ермаловіч знаходзіцца за кратамі ў віцебскім СІЗА-2.

**20.04.2021** Увечары 19 красавіка з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) выйшла на волю Крысціна Юдзіна, якая была затрыманая на Дзень волі і адбыла за кратамі 25 содняў адміністрацыйнага арышту паводле арт. 23.34 КаАП. Сустракаць Крысціну да СІЗА-2 ў Віцебску прыйшлі яе сябры і знаёмыя.

«Забаронена амаль усё»
Па вызваленні Крысціна Юдзіна паведаміла, што ўмовы ўтрымання ў віцебскім ІЧУ значна пагоршыліся ў параўнанні з тым, як было раней. З 1 красавіка ў ІЧУ ўвялі рэжым, які прадугледжвае шмат забаронаў.

«Апошнія 19 сутак я правяла ў вельмі цяжкіх умовах: забаронена амаль усё. Нават кнігі і сшытак з асадкай выдаюць толькі на 30 хвілін у дзень. Па калідорах мяне вадзілі ў наручніках, нават у душ», – расказала Крысціна Юдзіна.

Прасіла лекі – прапанавалі весці здаровы лад жыцця



Паводле Крысціны, яе хацелі адправіць адбываць суткі ў камеру адну. Каб выказаць пратэст, яна адмовілася ад ежы. Толькі пасля гэтага дзяўчыну перавялі ў іншую камеру.

«Калі толькі трапіла ў ІЧУ, мяне апытаў лекар, пацікавіўся, ці ёсць у мяне хранічныя захворванні. Я пералічыла ўсе свае хваробы. Але гэта ніякім чынам не паўплывала на ўмовы адбыцця. Калі я прасіла таблеткі амепразолу ад гастрыту, лекарка мне адмовіла і параіла звярнуцца да сваякоў. А начальнік ІЧУ прапанаваў весці здаровы лад жыцця», – распавяла віцяблянка.

У палітычных забіраюць матрацы

Яна кажа, што цяпер ад 6-й раніцы і да самага адбою з камеры забіралі матрац і коўдру. Прыходзілася сядзець увесь дзень на лаўцы ці на падлозе, падаслаўшы ручнік.

«Як даведалася, матрацы забіралі толькі з тых камер, дзе сядзяць палітычныя. Сукамернікі, якіх перавялі з Полацку, таксама былі пазбаўленыя магчымасці карыстацца матрацамі днём. На гэтай падставе нават узнік канфлікт. Каб не рабіць нікога закладнікам гэтай сітуацыі, я папрасілася ў асобную камеру», – тлумачыць Крысціна.

Па яе словах, яна двое сутак адседзела ў камеры адна. Кажа, што, калі б яе не выводзілі на працу, то ў такіх умовах можна было б звар'яцець.

Перадачы забаранілі
«Перадачы ад 1 красавіка таксама забаранілі. Да гэтага часу я паспела атрымаць адну, астатнія, з пазнакай «возврат», я атрымала, калі выйшла з ізалятару. Прычым мне не перадалі нават сродкі гігіены, якія ў самім ізалятары ніхто не выдаваў», – паведаміла.

Таксама ад пачатку красавіка з’явілася новае правіла: пад’ём па 2 разы за ноч на праверку.

Пасля 25 сутак у такіх умовах Крысціна адчувае сябе не вельмі добра, па дарозе дахаты скардзілася на галавакружэнне і слабасць.

«Заплакала толькі аднойчы...»
«За 25 сутак я заплакала толькі аднойчы, хоць маю чуллівы характар. Я не хацела, каб міліцыя бачыла мае слёзы», – прызнаецца Крысціна Юдзіна.

**22.04.2021** Увечары 21 красавіка да пенсіянеркі па інваліднасці Валянціны Крыштопенка з пасёлку Кастрычніцкая Віцебскага раёну прыйшлі судовыя выканаўцы. Яны арыштавалі маёмасць жанчыны і яе дачкі на суму 615 рублёў. У пералік арыштаваных рэчаў, апрача тэхнікі, трапілі нават дэкаратыўны камін, ваза для цукерак і стары насценны гадзіннік...

Судовыя выканаўцы прыйшлі да Валянціны Крыштопенка разам з участковым. Паведамілі, што вымушаныя апісаць маёмасць, каб накласці на яе арышт, бо Валянціна своечасова не аплаціла штрафы, прысуджаныя ёй паводле арт. 23.34 КаАП.



Рэчы апісвалі ў прысутнасці дачкі Валянціны Святланы Шумаравай, якой належыць большая частка маёмасці ў кватэры. Спадарыні Святлане давялося даказваць гэта дакументальна. Тым не менш, судовыя выканаўцы арыштавалі набытыя Святланай тэлевізар Xiaomi і мікрахвалёвую печ Samsung.

У пералік трапілі нават дэкаратыўны камін памерам з далонь і карціна, падораная Святлане на дзень народзінаў.

Як расказала Валянціна, выстаўлены выканаўцамі кошт тэхнікі значна не дацягвае да рынкавага. Гэтак, набыты колькі гадоў таму за 900 рублёў тэлевізар судовыя выканаўцы ацанілі на 150 рублёў. А мікрахвалёўку – усяго на 20 рублёў. Агульная сума апісанай маёмасці складае 615 рублёў.

Валянціну папярэдзілі, што найбліжэйшым часам ёй неабходна аплаціць гэтую суму – або рэчы будуць канфіскаваныя. Дзе знайсці такія грошы, Валянціна пакуль не ведае.

«У гэтай кватэры, акрамя мяне самой ды маіх дачкі з унучкай, мне нічога не належыць, як і сама кватэра прынамсі», – кажа Валянціна. Дадала, што родных у яе не можа адабраць ніводны суд свету.

Прычынай прыезду судовых выканаўцаў сталі неаплачаныя штрафы, прысуджаныя Валянціне Крыштопенка па артыкуле 23.34. Пенсіянерка застаецца вінная дзяржаве больш за 1600 рублёў. 8 сакавіка жанчыне блакавалі банкаўскую картку, каб спагнаць штрафы з пенсіі. Раней, у студзені 2021 году, у кватэры Валянціны адбыўсяператрус.

Растэрміноўку аплаты штрафаў у Віцебскім раённым судзе Валянціне не далі, нягледзячы на маленькі памер пенсіі і неабходнасць рэгулярна набываць лекі. Рашэнне прымаў суддзя Міхаіл Зубеня.

**23.04.2021** Маці палітвязня Мікалая Чарняўскага, які адбывае пакаранне ў бабруйскай калоніі, расказала «Віцебскай Вясне», што яе лісты не даходзяць да сына. У лісце з калоніі ён паведаміў, што не атрымаў ад яе ніводнага. Напісаў таксама, што яго пазбавілі доўгатэрміновага спаткання.

«Мікалай піша, што ў яго ўсё нармальна. Але як можа быць «нармальна», калі піша, што яго пазбавілі доўгатэрміновага спаткання?» – хвалююецца маці палітвязня Людміла. Непакоіць яе і тое, што сын наагул не атрымаў ад яе ніводнага ліста. У апошнім напісаў, што гэта адбываецца праз тое, што лісты проста «не прапускаюць».

Пасля таго, як 27 сакавіка Мікалая Чарняўскага, этапавалі ў калонію, сямейнікі атрымалі ад яго ўсяго два лісты. Апошні пазначаны датай 12 красавіка. Пасля – ані званкоў, ані лістоў. Родныя хвалююцца. Перасталі атрымліваць адказы на свае лісты таксама сваякі і знаёмыя Чарняўскага. Маці тэлефанавала ў калонію. Там паведамілі толькі адно: Мікалая перавялі з каранціну ў пяты атрад.

Людміла Чарняўская кажа, што цяпер кожны дзень для яе пачынаецца са спадзеву на доўгачаканы ліст ад сына.



Паводле яе слоў, калі сына ўтрымлівалі ў віцебскім СІЗА-2, яна сустракалася з ім ці не кожны тыдзень. Праўда, пагаварыць асабліва не давалі. Спынялі на самых бяскрыўдных эпізодах.

«Сын заўжды быў у масцы, я бачыла толькі ягоныя вочы.

Аднойчы не вытрымала і сказала: «Сынок, пакажы твар, як ты там?» Вельмі здзівілася, што ён трапіў у ШІЗА, бо па сваім характары вельмі спакойны. Аказалася, проста за тое, што дрэнна пагаліўся», – прыгадвае Людміла Чарняўская.

Нагадаем, 33-гадовы жыхар Гарадку Мікалай Чарняўскі быў асуджаны на паўтара года зняволення паводле арт. 369 КК і арт.365 КК – за абразу прадстаўніка ўлады (за фразу «вырадак у пагонах») і ўмяшанне ў дзейнасць супрацоўніка ўнутраных спраў. Пастанову аб пакаранні прыняў 15 снежня 2020 году суд Гарадоцкага раёну. Скарга на прысуд у Віцебскі абласны суд выніку не дала. 9 сакавіка суд вышэйшай інстанцыі пакінуў рашэнне раённага суду без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

Мікалай Чарняўскі быў прызнаны праваабарончай супольнасцю палітвязнем.

Прызначанае пакаранне Чарняўскі адбывае ў ПК № 2 гораду Бабруйску.

Напісаць ліст палітвязню Мікалаю Аляксандравічу Чарняўскаму можна на адрас: 213800, Магілёўская вобласць, г. Бабруйск, вуліца Сікорскага, 1, ПУ «ПК-2», атрад №5.

Па стане на 23 красавіка ў Беларусі прызнаныя палітычнымі вязнямі 358 чалавек.

**24.04.2021** 24 красавіка пасля начной змены на прахадной наваполацкага заводу «Нафтан» быў затрыманы намеснік старшыні першаснай арганізацыі працаўнікоў прадпрыемства Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) Максім Шчуплянкоў. Пра гэта паведамілі сябры прафсаюзу на старонцы ў Фэйсбуку «Стачком ОАО «Нафтан».

Як паведамляецца, у Максіма Шчуплянкова заблакавалі пропуск, а пасля затрымання адвезлі ў ГАУС Наваполацку, дзе на актывіста склалі пратакол за абразу ахоўнікаў. Інцыдэнт з ахоўнікамі, якія напісалі заявы ў міліцыю, адбыўся яшчэ 21 сакавіка. Як сцвярджаецца ў паведамленні, Шчуплянкоў ужо быў асуджаны за гэтае правапарушэнне на 7 сутак адміністрацыйнага арышту.

Пасля складання пратаколу Максіма Шчуплянкова адпусцілі з аддзялення міліцыі, прызначыўшы дату суду. Ён пройдзе праз 15 дзён.

«З гэтага можна зрабіць выснову, што кіраўніцтва паставіла сабе за мэту пазбавіцца ад актывіста любымі спосабамі, нягледзячы на тое, што Максім ужо адказаў за свае дзеянні ў судзе і публічна выбачаўся за абразу», – так пракаментавалі затрыманне прафсаюзнага лідара ягоныя паплечнікі.

**24.04.2021** 15 красавіка суддзя суду Першамайскага раёну Віцебску Наталля Карабліна адмовіла віцяблянцы Таццяне Івановай у задавальненні хадайніцтва ў адтэрміноўцы аплаты

адміністрацыйнага штрафу. Штраф быў прызначаны суддзёй Карабліной за пікет, які правяла Іванова «шляхам вывешвання на лоджыі сваёй кватэры герба «Пагоня» на фоне бел-чырвона-белага сцяга».

Таццяна Іванова звярнулася ў суд з просьбай аб шасцімесячнай адтэрміноўцы выканання пастановы аб накладанні на яе адміністрацыйнага штрафу ў памеры 580 рублёў. Аргументамі для падачы хадайніцтвы стала тое, што сума штрафу ў паўтара раза больш, чым месячны даход жанчыны, а таксама тое, што ў яе на ўтрыманні знаходзяцца малалетнія дзеці 5-ці і 10-ці гадоў.

У судзе пацвердзілася, што на Іванову сапраўды накладзены штраф за пікетаванне ў памеры 580 рублёў, што яна працуе ў індывідуальнага прадпрымальніка спецыялістам па працы з кліентамі, зарабляючы штомесяц каля 380 рублёў, што складае 1,6 сумы штрафу. Пацверджана таксама наяўнасць ў яе двух малалетніх дзяцей.

Разгледзеўшы зварот актывісткі, суддзя Наталля Карабліна вырашыла, што, «нягледзячы на наяўнасць на ўтрыманні 2-х малалетніх дзяцей, дастатковых падставаў для адтэрміноўкі выканання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе штрафу па пастанове суддзі суду Першамайскага раёну Віцебску ад 28.01.2021 Іванова не мае». На погляд суддзі, «Іванова мае рэальную магчымасць выплаты штрафу ў тэрміны, прадугледжаныя Працэсуальна-выканаўчым кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».

Таксама суддзя Карабліна не палічыла патрэбным прапанаваць Івановай скарыстацца правам растэрмінаваць выплату сумы штрафу на 6 месяцаў .

«Гэта далёка не адзіны выпадак, калі віцебскія суды адмаўляюць грамадзянам у рэалізацыі права на атрыманне адтэрміноўкі ці растэрміноўкі аплаты адміністрацыйных штрафаў. Калі гэта звязана з тым, што людзі выказвалі свае палітычныя погляды падчас і пасля выбараў прэзідэнта, то мы маем недапушчальную дыскрымінацыю грамадзян па палітычных матывах», - выказаў сваю думку праваабаронца Леанід Свецік.

**25.04.2021** 25 красавіка з віцебскага СІЗА пасля чарговых 10 сутак адміністрацыйнага арышту выйшаў на волю 62-гадовы віцебскі актывіст Мікола Качурэц. Неўзабаве пасля сустрэчы з жонкай і сябрамі ён быў ізноў затрыманы – разам з жонкай Марынай. Але праз паўтары гадзіны іх выпусцілі з Першамайскага РАУС без складання пратаколу.

Мікола Качурэц адбываў 10 сутак арышту, якія нібыта не адседзеў да канца яшчэ ў жніўні 2020-га году, калі быў затрыманы ў дзень прэзідэнцкіх выбараў.

Да віцебскага СІЗА 25 красавіка сустрэць Качурца прыйшла ягоная жонка Марына і каля дзесяці сяброў і знаёмых. Аднак у прызначаны час (16.20) Мікола не выйшаў. Выпусцілі яго на дваццаць хвілін раней, перадаўшы супрацоўніку Першамайскага РАУС для правядзення прафілактычнай размовы. Таму доўгачаканая сустрэча з жонкай, сябрамі і журналістамі адбылася пазней на праспекце Будаўнікоў.

Праз 15 хвілін пасля сустрэчы Качурэц з жонкай зайшлі ў двор бліжэйшага дому, дзе і былі затрыманыя. Іх адвезлі ў Першамайскі РАУС, адкуль выпусцілі праз паўтары гадзіны. Мікола Качурэц кажа, што пратаколы на іх не складалі, але хацелі дазнацца, хто і навошта іх здымаў на камеру.

Рэжым утрымання – як у канцлагеры
Яшчэ да затрымання Мікола Качурэц паспеў расказаць, што рэжым утрымання для палітычных у віцебскім ІЧУ нагадвае зараз канцлагерны. За дзесяць сутак ахоўнікі далі курцам прыкурыць не больш за 5-6 разоў, ды і тое баяліся. Апраўдваліся, што, маўляў, не яны пішуць такі сцэнар.




У Качурца забралі кнігу Паўла Севярынца – «як экстрэмісцкую». Кажа, што давялося чытаць Івана Шамякіна, якую таксама забралі праз паўгадзіны.

Наракаў, што за суткі робяць пяць-сем праверак, і адну («а то і дзве-тры») уначы.

Мікола лічыць, што такія жорсткія ўмовы ўтрымання адміністрацыя СІЗА стварае адмыслова. Напрыклад, зранку з камераў забіраюць матрацы і коўдры, пераносяць у асобны пакой. А ўвечары праз тое, што і коўдры і матрацы маюць аднолькавыя колеры, людзям дастаюцца чужыя спальныя прыналежнасці.

Усцешыўся Качурэц хіба з таго, што гэтым разам у камерах не было аніводнага прыхільніка Лукашэнкі.

Даходзіла да катаванняў
«Паставілі неяк уначы ля сцяны на агляд. Ахоўнік загадаў паставіць ногі разам, але, як я гэта зрабіў, яму не спадабалася. Удар прыйшоўся па нагах ці то гумавай палкай, ці то абуткам. Разы тры ён мяне ўдарыў, але я не зварухнуўся. Наступны ўдар прыйшоўся па галаве, і я ўдарыўся скулай аб сценку. Нейкае беспантовае катаванне! Яны нават не разумеюць, што тэрмін праходзіць хутчэй, калі нейкі варушняк ідзе», – распавёў Мікола Качурэц.

Ён прызнаецца, што хоць не ўпершыню трапіў за краты, гэты арышт стаўся самым цяжкім.

**26.04.2021** Жонка палітвязня Дзмітрыя Кулакова, які адбывае «хімію» ў Шклове, адна выхоўвае дваіх дзяцей. Пасля таго як забралі мужа і бацьку, сям'я аказалася ў цяжкім фінансавым становішчы. На дапамогу прыйшлі неабыякавыя беларусы.

30-гадовага Дзмітрыя Кулакова з Шуміліна ў снежні 2020 году прысудзілі да трох з паловай гадоў «хіміі», прызнаўшы вінаватым у абразе супрацоўніка міліцыі (арт. 369 КК) і пагрозе ўжывання гвалту ў дачыненні да міліцыянта (арт.364 КК). Адбываць тэрмін палітвязня накіравалі ў горад Шклоў, а дома з двума непаўналетнімі дзецьмі засталася жонка Юлія.

Як расказала Юлія Кулакова, яе муж знаходзіцца ў шклоўскай папраўчай установе адкрытага тыпу №49 і працуе на пілараме. Да арышту Дзмітрый быў асноўным у сям’і «здабытчыкам», ездзіў па Беларусі – рабіў альтанкі і каркасныя хаты. Зараз жа ўсе фінансавыя клопаты ляглі на плечы Юліі.

Неабходна ўтрымліваць двух непаўналетніх дзяцей – дзевяці і трох з паловай гадоў, – вазіць прадукты мужу, дапамагаць яму з аплатай утрымання на «хіміі», а таксама аплачваць арэнду кватэры ды камуналку. Свайго жылля ў Кулаковых няма, у Шуміліна жывуць ад 2016 году (самі з Лепельшчыны).

Юлія працуе пазменна на мясцовым сырзаводзе (у рэжыме два дні праз два). Заробак невялікі, але лепшую працу ў Шуміліне знайсці немагчыма. Альбо сырзавод, альбо птушкафабрыка. Каб звесці канцы з канцамі, жанчына была вымушаная звярнуцца па дапамогу.

«1000 рублёў – бюджэт на 3 месяцы для ўтрымання мужа, частковую аплату камуналкі, рэчы першай неабходнасці для мужа і дзяцей (шкарпэткі, бялізна), для куплі праязнога (муж ездзіць на працу на аўтобусе)», – размясціла паведамленне на адной з платформаў.

Неабходная сума была сабраная вельмі хутка. «Я не ведала, што такое магчыма: я думала, што грошы не збяруцца», – дзеліцца Юлія.

Юлія збіраецца бліжэйшымі днямі з’ездзіць у Шклоў да мужа, якога не бачыла ўжо больш за месяц.

**28.04.2021** 19-гадовая навучэнка аднаго з віцебскіх ліцэяў Марыя Амасовіч ад 26 красавіка не выходзіла на сувязь. Як стала вядома, дзяўчына была затрыманая за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве (арт. 24.23 КаАП). Яна знаходзіцца ў віцебскім ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ) на вуліцы Гагарына.

Як паведаміла “Віцебскай вясне” сястра Марыі Амасовіч Святлана, з панядзелка Маша перастала адказваць на тэлефонныя званкі, хаця ў першай палове дня яшчэ прысутнічала ў сацыяльных сетках.

Каб даведацца пра лёс сястры, Святлана звярнулася ў Першамайскі РАУС Віцебску. Адказы былі не зусім уцямныя. Але стала вядома, што Марыю, быццам бы, выклікалі на размову ў аддзяленне міліцыіі - з пастарунку яна ўжо не выйшла. Яе затрымалі за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 24.23 КаАП). За што канкрэтна - інфармацыі няма.

Калі адбудзецца суд над Марыяй Амасовіч, таксама невядома.

Ліцэістку Марыю Амасовіч пасля выбараў 2020 году неаднойчы затрымлівалі, судзілі і каралі штрафамі і арыштамі. У снежні 2021 году адна з адміністрацыйных спраў Амасовіч была скасаваная, а суддзя прасіў у яе прабачэння.

**28.04.2021** 27 красавіка была затрыманая 23-гадовая выхавальніца дзіцячага садку ў Віцебску Лізавета Кірыенка. Бацькі пакуль не ведаюць, за што канкрэтна затрымалі дачку, але тое, што з палітычных прычын, не выклікае сумненняў. Лізавета знаходзіцца зараз у віцебскім ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). Маці паведаміла, што ў кватэры, якую здымае яе дачка, пройдзе ператрус.

«Нічога не ведаю. Яна мне ўчора пазваніла недзе а 15-й гадзіне, кажа: «Не хвалюйся, усё ў парадку». Я запыталася, ці можна ёй перадаць вадкасць для лінз, бо ў яе зрок «мінус 6».

Праз паўзу, бо, відаць, нехта сядзеў побач, адказала, што не, нельга. І ўсё, больш нічога не сказала. Толькі, маўляў, ты не перажывай, гэта адміністрацыйная справа», – расказала маці Лізаветы Святлана.

Але маці ўжо паведамілі, што ў кватэры, якую здымае яе дачка ў Віцебску, адбудзецца ператрус. Бацькі хвалююцца, каб пасля вобшуку справа не перарасла ў крымінальную.

Лізавета Кірыенка летась прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці. За ўдзел у мірных шэсцях яна была пакараная штрафам (арт. 23.34 КаАП). Дзяўчына працуе выхавальніцай у адным з садкоў Віцебску і завочна вучыцца на IV курсе Магілёўскага педуніверсітэту.

Падрабязнасці цяперашняй справы ўдакладняюцца. Меркавана, суд над Лізаветай Кірыенка адбудзецца 29 красавіка.

**29.04.2021** Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў 29 красавіка праз скайп справу Лізаветы Кірыенка і Марыі Амасовіч, якія ўжо трое сутак знаходзяцца за кратамі ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ). Як аказалася, іх затрымалі за лампадкі, якія яны запалілі ля царквы ў дзень Чарнобыльскай трагедыі.

Суд прызнаў іх дзеянні несанкцыянаваным пікетаваннем (арт. 24.23 КаАП) і пакараў абедзвюх дзяўчат арыштам.

Аб'яднаную справу Марыі Амасовіч і Лізаветы Кірыенка разбіраў суддзя Уладзімір Царыкаў.

Паводле міліцэйскіх пратаколаў, Амасовіч і Кірыенка ўвечары 26 красавіка супольна зладзілі несанкцыянаванае пікетаванне, запаліўшы на прыступках Ўваскрасенскага храму ў Віцебску дзве лампадкі чырвонага колеру. Супрацоўнік Кастрычніцкага РАУС Віталь Праліч, які складаў пратаколы, палічыў, што тым самым дзяўчыны публічна выказалі свае грамадска-палітычныя інтарэсы і парушылі заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 24.23 КаАП). Пасля затрымання і складання пратаколаў дзяўчыны былі кінутыя за краты ІЧУ, дзе правялі ўжо трое сутак.

Марыя Амасовіч і Лізавета Кірыенка сваёй віны не прызналі. Па словах падсудных, яны паставілі і запалілі лампадкі толькі з адной мэтай – ушанаваць памяць ахвяр катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Абедзве сцвярджалі, што ніякіх «грамадска-палітычных поглядаў» пры гэтым не выказвалі. Тым больш – публічна.

«Каля храму на той момант нават мінакоў мы не бачылі», – сказала на судзе Амасовіч.

Адвакатка прасіла спыніць справу
Як вынікала з рапартаў супрацоўнікаў МУС, дзяўчаты былі затрыманыя пасля таго, як пра запаленыя ля царквы лампадкі міліцыянтам паведаміў нібыта звычайны грамадзянін Ібрагімаў. Адвакатка Лізаветы Кірыенка хадайнічала, каб гэты грамадзянін быў апытаны ў судзе ў якасці сведкі, але суддзя хадайніцтва не задаволіў.

На погляд адвакаткі, сам прыход да храму яе падабароннай не даказвае, што яна ўдзельнічала ў пікетаванні. І мэтай яе дзеянняў было зусім іншае, а менавіта – ушанаванне памяці. Абаронца прасіла суд скасаваць адміністрацыйную справу праз адсутнасць складу правапарушэння.

Суддзя Уладзімір Царыкаў палічыў інакш. Ён пастанавіў прызнаць дзеўчын вінаватымі ў парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і пакараць Лізавету Кірыенка 10 суткамі адміністрацыйнага арышту (ч.1 арт. 24.23 КаАП), а Марыю Амасовіч – 20 суткамі (ч.3 арт. 24.23 КаАП).

Ператрус на кватэры Лізаветы
Стала таксама вядома, што ў кватэры, якую здымае ў Віцебску Лізавета Кірыенка, напярэдадні суду прайшоўператрус. Яго ўчынілі ў межах крымінальнай справы, распачатай паводле арт. 341 КК (але Лізавета ніякага статусу ў справе не мае). Канфіскавалі тэлефон і ноўтбук.

Лізавета Кірыенка мае 23 гады. Ужо 4 гады працуе ў Віцебску выхавальніцай у дзіцячым садку, завочна атрымлівае вышэйшую адукацыю (гістфак). 19-гадовая Марыя Амасовіч – навучэнка 1-га курсу аднаго з віцебскіх ліцэяў.




**30.04.2021** 29 красавіка пасля 20 сутак адміністрацыйнага арышту на волю выйшаў удзельнік стачкі на «Нафтане» Аляксандр Кухаронак. Аднак ў гэты ж дзень, незадоўга да вызвалення Кухаронка, былі затрыманыя чарговыя ўдзельнікі страйку – Ігар Бутоўскі, Віктар Акасевіч і Сяргей Лазарэнка. Наваполацкі рэпрэсіўны канвеер працуе ва ўсю моц…

Страйкоўцаў затрымлівалі ў Наваполацку раніцай невядомыя ў цывільным. Аднаго схапілі, калі выносіў смецце, другога – калі выйшаў пагуляць з дзіцём... Ігар Бутоўскі, Віктар Акасевіч,

Сяргей Лазарэнка таксама, як і Аляксандр Кухаронак, бралі ўдзел у запісе відэароліку з заклікам галасаваць на платформе «Голас». Гэта і стала прычынай адміністрацыйнага пераследу. Іх вінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі (арт. 24.23 КаАП).

30 красавіка адбыліся суды. Аляксандра Кухаронак, які ўжо быў на волі, паведаміў, што Ігара Бутоўскага прысудзілі да 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Пра рашэнні ў дачыненні астатніх не ведае, але мяркуе, што Акасевіч і Лазарэнка атрымалі столькі ж (інфармацыя ўдакладняецца).

Простыя «сутачнікі» дзяліліся ежай з палітычнымі

Па словах Аляксандра Кухаронка, умовы для палітычных у наваполацкім цэнтры изаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП) зрабіліся больш жорсткімі. Першыя чатыры ўдзельнікі стачкі, якія былі затрыманыя раней, сядзелі паасобку, разам са звычайнымі «сутачнікамі». Калі «палітычным» раптам забаранілі перадачы, дык простыя арыштанты сталі з імі дзяліцца ежай.

«І тады міліцыянты паглядзелі па відэакамерах, што дзеляцца, і перасадзілі ўсіх палітычных у адну камеру. Калі я «заехаў» 9 красавіка, палітычныя сядзелі ўжо асобна», – успамінае Аляксандр.

Расказвае, што па два разы штоноч ў камеру заходзілі наглядчыкі і будзілі іх для праверак. На шпацыр ва ўнутраны дворык палітычных вадзілі ў кайданках.

«Кайданкі адзявалі толькі «на асаблівых», як яны нас называюць», – кажа Кухаронак.

«Прыходзілі пагутарыць усялякія следчыя»

Калі ўсіх яго таварышаў адпусцілі, апошнія 8 сутак яму давялося сядзець у камеры аднаму. За ўсе 20 сутак арышту Аляксандру не дазволілі атрымаць аніводнай перадачы.

Тым не менш, ён не шкадуе, што далучыўся да стачкі і ўзяў удзел у запісе відэароліка.

«Прыходзілі там да мяне пагутарыць усялякія следчыя, пыталіся: «Можа вы хочаце стаць на «пуць ісціння»? Я адказваю: «Калі цягам 8 месяцаў у мяне быў адзін цвёрды пункт гледжання, дык думаеце за 20 сутак ён зменіцца?..» – пасміхаецца Аляксандр.



**30.04.2021** Сябра БНФ Алеся Вендта затрымалі на Дзень волі каля помніка князю Альгерду ў Віцебску разам з Кастусём Смолікавым і Іванам Казловым. Пасля трох сутак, праведзеных у ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ), іх вызвалілі з-пад варты. Але ўжо 30 сакавіка Вендта асудзілі на 13 сутак арышту (арт. 24.23 КаАП). Пра цяперашнія ўмовы ўтрымання ў ІЧУ ён расказаў «Віцебскай Вясне».

«Калі нас затрымалі 25 сакавіка ля помніка Альгерду, мне прыгадаўся жарт з дзяцінства: «Болей двух не збірацца. Тры – ужо банда. Можна браць». Паводле судовай пастановы я атрымаў 13 сутак арышту, Кастусь Смолікаў – 12, Казлоў – 10», – успамінае Алесь Вендт.

Адбываць прызначаны адміністрацыйны тэрмін Вендта забраў участковы міліцыянт проста са Смаленскага рынку. Спачатку адвезлі ў РАУС, а ўжо ўначы этапавалі ў СІЗА-2, у будынку якога зараз месціцца ІЧУ.

Як распавёў Алесь, у параўнанні з тым, як адбываў трое сутак у сакавіку, цяперашнія ўмовы ўтрымання кардынальна змяніліся. Гэта было тым відавочней, што ўсе шасцёра яго сукамернікаў былі асуджаныя па палітычным артыкуле 24.23 КаАП. Вендт мяркуе, што «палітычных» змясцілі ў адну камеру адмыслова, хаця, з другога боку, было добра, што ўсе побач былі паплечнікамі.

З'явілася агрэсія і нянавісць

«Трое сакавіцкіх сутак і дзесяць красавіцкіх – розныя рэчы. Стаўленне да так званых «БЧБ-затрыманых» стала яшчэ больш жорсткім. У дачыненні да асуджаных па палітычных матывах з’явілася дадаткова агрэсія, нават нянавісць», – кажа Алесь Вендт.

Як расказвае, за суткі ў камеры праводзілі 6 праверак: чатыры ўдзень і дзве ўначы. Зранку забіралі матрацы, чаго не было раней. Сядзець даводзілася на голых металёвых прутах шконак.

«Такое стаўленне – гэта дадатковы здзек, і гэтага не было раней. З іншых камер, дзе не было палітычных, матрацы не забіралі. Перад адбоем самі зняволеныя заносілі матрацы ізноў у «хату». Уначы – яшчэ дзве праверкі, а пасля – перыядычна лязгалі металёвай накрыўкай, якая закрывае вочка, то бок, мяркую, нам знарок не давалі спаць. І такія паводзіны ахоўнікаў ні ў якіх правілах не прапісаныя», – кажа Вендт.

Кайданкі на выхадзе

Алесь распавядае, што здзекаваліся і з тых, хто паліць. Недзе два-тры дні ім зусім не давалі прыкурыць.

Гаворыць, што з 1-га красавіка «ўвялі кайданкі». Іх надзявалі кожны раз, калі кагосьці выводзілі з камеры, прыкладам, для прафілактычнай размовы. Праўда, перад размовай наручнікі здымалі.

Таксама Алесь Вендт паведаміў, што ў адной камеры з ім сядзеў віцябчук Сяргей Думава, на якога завялі крымінальную справу.

Падставай для затрымання Думавы стаўся надпіс «Час прыйшоў! Горад наш», зроблены непадалёку ад месца ягонай працы. У гаражы знайшлі падобную фарбу. Праводзіцца расследаванне.

Пытанні наконт графіці былі ў следчага і да Алеся Вендта. На доме, дзе ён жыве, таксама быў пратэставы надпіс. Але для Вендта размова са следчым ніякага працягу не мела.

**01.05.2021** Хворы на анкалогію палітвязень Уладзімір Малахоўскі знаходзіцца ў віцебскім СІЗА амаль паўгода. 25 траўня абласны суд разгледзіць ягоную скаргу на рашэнне суду Першамайскага раёну, які прызнаў яго вінаватым у гвалце да міліцыянтаў і асудзіў да трох з паловай гадоў калоніі.

Нагадаем, што Уладзіміра Малахоўскага затрымалі ў цэнтры Віцебску 13 верасня 2020 году падчас разгону мірнага шэсця. Пры затрыманні яго моцна збілі і зламалі палец. За ўдзел у несанкцыянаванай акцыі віцябляніна аштрафавалі на 4 базавыя велічыні, але адначасна распачалі ў дачыненні да яго крымінальную справу паводле арт. 364 (Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў МУС). Пасля 6 дзён за кратамі Малахоўскага на час следства выпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. Але ў студзені 2021-га, незадоўга да пачатку судовага разбору, зноў арыштавалі.

На судзе Уладзімір заявіў, што на акцыі ні з кім у бойку не ўступаў, пры затрыманні супраціву міліцыянтам не чыніў. Наадварот, гэта на яго напалі некалькі супрацоўнікаў, і ён, каб не ўпасці, ухапіўся за кагосьці рукамі. У аўтазаку ў яго знайшлі газавы балончык, які супрацоўнік міліцыі тут жа забраў і выпадкова націснуў на яго. Калі пырснуў газ, міліцыянт пачаў крычаць, што яго хочуць атруціць. Вінаватым сябе Уладзімір не прызнаў і заявіў, што доказы фальсіфікаваныя. Суддзя Таццяна Родзіна гэтыя сведчанні, па сутнасці, праігнаравала. Вырак: тры з паловай гады калоніі.

«Сядзіць у кайданках на ланцугу і са мной размаўляе»
Ірына, жонка палітвязня, за час знаходжання яго ў СІЗА змагла атрымаць спатканне з мужам 5 разоў. Дваіх няпоўнагадовых дзяцей на спатканні з татам не пусцілі. Паводле адміністрацыі, гэта не дазволена.

«Ён на ланцугу там! Кажа, артыкул такі. Сядзіць у кайданках на ланцугу і са мной праз трубку размаўляе. На ланцугу, разумееце? І ў кайданках. Наагул, гэта як? Як быццам ён уцячы можа кудысьці!» – абураецца Ірына.

Вазілі на абследаванне ў шпіталь
Па яе словах, Уладзімір прайшоў курсы хіміятэрапіі, і яму неабходна пастаянна прымаць розныя лекі і рэгулярна праходзіць медычны агляд. Ірына напісала ліст у дэпартамент выканання пакаранняў з просьбай, каб яго накіравалі на абследаванне ў анкацэнтр. Да просьбы прыслухаліся: 14 красавіка Уладзіміра адвозілі ў анкалагічны цэнтр.

«Мы прыехалі з сястрой а 12-й гадзіне, бо ў яго талон быў на гэты час, і там ён павінен быў быць. Але яны яго зранку прывезлі вакольнымі шляхамі, каб ніхто не бачыў яго. На ланцугу яго там вадзілі, ён мне потым пра гэта напісаў», – падзялілася Ірына.

Накіроўваюць на МРЭК
Жонка вельмі турбуецца, што ўмовы ўтрымання ў ізалятары могуць пагоршыць стан здароўя яе мужа.



З яе слоў, у яго пастаянна нямеюць рукі і ногі. «Там нельга ляжаць, адразу стукаюць палкай у дзверы, не даюць прылегчы», – абураецца Ірына Малахоўская.

Апроч таго, у камеры, у якой знаходзіцца восем чалавек, увесь час паляць, Уладзімір перахварэў нядаўна на бранхіт і моцна кашляе.

Жонка палітвязня расказвае, што Уладзімір атрымлівае шмат лістоў падтрымкі з волі – ад розных людзей з усіх куткоў Беларусі. Але адказаць усім не паспявае. Сама Ірына атрымала за ўвесь час ад мужа каля 15 лістоў.

Ірына кажа, што неўзабаве Уладзіміра мусяць накіраваць на медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію (МРЭК). Жонка мяркуе, што яму хочуць перагледзець групу інваліднасці і пазбавіць пенсіі. У гэтым выпадку з грашыма стане зусім цяжка. Заробак самой Ірыны – усяго 370 рублёў.

Трэба глядзець за дзецьмі, купляць лекі для мужа і харчы для перадач. Апроч таго, трэба выплачваць 3000 рублёў кампенсацыі «пацярпелым» міліцыянтам

Падтрымайма жонку палітвязня!
Ірына Малахоўская не вельмі верыць у тое, што Віцебскі абласны суд зменіць прысуд, але надзеі і сілы духу не губляе.

Скаргу Уладзіміра Малахоўскага Віцебскі абласны суд будзе разглядаць 25 траўня (пачатак у 12.30).
Заклікаем выказаць салідарнасць і падтрымаць жонку палітвязня.

**03.05.2021** 3 траўня суд Віцебскага раёну пачаў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да жыхаркі пасёлку Ноўка Таццяны Туравец. Артыкул 364 КК (Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў УС), паводле якога абвінавачваюць Туравец, прадугледжвае да 6 гадоў пазбаўлення волі. Пацярпелымі ў справе праходзяць 4 міліцыянты.

Справу разглядае суддзя Наталля Траццякова. Паводле абвінаваўцы, уначы з 9 на 10 лютага Таццяна Туравец перашкаджала законнай дзейнасці супрацоўнікаў міліцыі, а менавіта – правесціператрус у яе доме. Жанчына нібыта чыніла актыўны супраціў, хапала іх рукамі, выпіхвала з дому, пагражала фізічнай расправай, абражала. Дзеянні Туравец у дачыненні да пацярпелых Сергіенкі, Старчанкі, Філіпенкі, Шутава пракуратура палічыла наўмыснымі. Міліцыянты вымушаныя былі ўжыць у дачыненні да яе фізічную сілу і надзець на рукі кайданкі.

Сваёй віны Таццяна Туравец не прызнала.

Пасля затрымання да Туравец прыехала следчая група і апытала яе паводле арт. 23.4 КаАП і арт. 23.5 КаАП. Жанчыну абвінавацілі ў непадпарадкаванні законным патрабаванням міліцыі і абразе службовай асобы.



Вобшук у доме прайшоў ужо пасля таго, як яе апытаў следчы.10 лютага суддзя Міхаіл Зубеня прызнаў яе вінаватай па абодвух артыкулах і аштрафаваў на 870 рублёў.

«Паклалі на падлогу» і ўжылі «загіб рукі»

На першым паседжанні апыталі пацярпелых супрацоўнікаў МУС. Міліцыянты ў адзін голас заявілі, што дзейнічалі ветліва і культурна. Нібыта ў адпаведнасці з законам назваліся, паказалі пасведчанні, пастанову абператрусе з санкцыі пракурора і запатрабавалі пусціць у дом. Рэакцыя Туравец падалася ім неадпаведнай іх дзеянням. Паводле іх сведчанняў, жанчына хапалася за пасведчанне, хацела сфатаграфаваць пастанову пракурора, зачыніла дзверы і заявіла, што праводзіць вобшук не дазволіць.

Калі дамовіцца з гаспадыняй не атрымалася супрацоўнікі ўнутраных спраў выкарысталі фізічную сілу «ў адпаведнасці з атрыманымі навыкамі». А дакладней – «паклалі на падлогу» і ўжылі ў дачыненні жанчыны «загіб рукі за спіну», каб надзець кайданкі.

Міліцыянты сцвярджаюць, што падчас гэтага «затрымання» Туравец укусіла за палец аднаго, пракусіла пальчатку другому і нанесла удар нагой у вобласць галавы трэцяму супрацоўніку.

Апроч таго, сведчылі, што жанчына называла іх «бандытамі», «фашыстамі» і «карнікамі».

Усё гэта адбывалася ўжо пасля палуначы 10 лютага.

Ператрус меўся адбыцца ў дачкі
Паказанні, якія дала ў судзе Таццяна Туравец, адрозніваюцца ад версіі абвінавачання.

Паводле яе, увечары 9 лютага яна вярнулася з працы і неўзабаве заснула. Прачнулася ад гучнага ўдару, падышла да дзвярэй. Спрасонку не зразумела, што адбываецца. Адчыніла дзверы і пабачыла незнаёмых людзей у цывільным, якія паказваюць нейкія дакументы і сцвярджаюць, што яны супрацоўнікі міліцыі.

Туравец кажа, што паводзіны начных візіцёраў не адпавядалі яе ўяўленням пра тое, як мусяць сябе паводзіць праваахоўнікі. Яна напружылася, занервавалася, а даведаўшыся, што вобшук праводзіцца ў сувязі з незаконным захоўваннем наркатычных рэчываў і пабачыўшы ў пастанове не сваё імя, вырашыла, што яе падманваюць.

Паводле пастановы,ператрус меўся адбыцца ў памяшканні яе дачкі Ангеліны, якая з маці даўно не жыве, і Таццяна не магла ўцяміць, чаму прыехалі да яе, да таго ж – уначы. Са словаў Таццяны, толькі ў гэты момант міліцыянты зразумелі, што перад імі не Ангеліна. Таццяна дазванілася да дачкі, спраўдзіла, што яна на волі. А вось дазваніцца да міліцыі, каб упэўніцца, што перад ёй сапраўдныя міліцыянты, не здолела. І гэта яшчэ больш абвастрыла сітуацыю.

«Было вельмі балюча»

Далей яе проста павалілі на падлогу і надзелі наручнікі. Таццяна сцвярджае, што ёй было балюча – балелі хворыя рукі. Папрасіла, каб заціснутыя ў кайданкі рукі былі не за спінай, а перад сабой. Прыняла лекі.

Туравец не адмаўляла, што ўкусіла Старчанку, бо той пры затрыманні пальчаткай на нейкі момант закрыў ёй рот. Патлумачыла: канчаткова зразумела, што перад ёй міліцыянты толькі пасля таго, як прыехаў следчы ў форменнай вопратцы. З яе словаў, паводзіў ён сябе вельмі карэктна.

4 траўня суд працягне апытанне сведкаў. Слуханні па справе пачнуцца ў 10.30.

**03.05.2021** Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3823/2020 індывідуальную скаргу Ірыны Траццяковай. Праваабаронца настойвае на тым, што беларуская дзяржава парушыла яе права на ўдзел у масавым мерапрыемстве.

Пастановай суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 27 сакавіка 2017 году Ірына Траццякова прызнаная вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення мітынгу і на падставе часткі 1 артыкулу 23.34 КаАП падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 690 беларускіх рублёў.

Для абароны свайго права на ўдзел у мірных публічных акцыях праваабаронца звярталася ў вышэй стаячыя судовыя інстанцыі. Аднак беларускія суды адмовіліся абараняць яе правы, матывавяўшы сваю адмову тым, што суд Кастрычніцкага раёну Віцебску вынес пастанову, заснаваную на законе, і абгрунтаваў сваё рашэнне фактычнымі доказамі.

Лічачы, што пракурорскі нагляд у Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца неэфектыўным, Траццякова не звярталася ў гэты дзяржаўны праваахоўны орган. Аднак беларускія ўлады, зыходзячы з таго, што Траццякова ня абскардзіла судовыя пастановы ў органах пракуратуры, лічаць, што яе скаргу трэба прызнаць непрымальнай.

Паводле беларускіх уладаў, за 9 месяцаў 2020 году органамі пракуратуры Беларусі на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях быў прынесены 2 261 пратэст, з якіх задаволена 1 978 (87,5%). Яны запэўніваюць, што прыведзеныя лічбы сведчаць аб тым, што пракурорскі нагляд па гэтым напрамку з’яўляецца дастаткова эфектыўным сродкам абароны правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

«Такім чынам, заяўнікам ня былі вычарпаныя ўсе наяўныя ўнутраныя сродкі прававой абароны, што ў адпаведнасці з артыкулам 2 Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах цягне немагчымасць прадстаўлення пісьмовага паведамленні на разгляд Камітэта», – упэўненыя ў свой праваце беларускі ўрад.

На гэтай падставе, улады лічаць, што зварот Ірыны Траццяковай ў КПЧ варта разглядаць як злоўжыванне правам на падаванне ёй паведамлення ў міжнародныя органы. Між тым, Камітэт па правах чалавека ААН індывідуальную скаргу праваабаронцы зарэгістраваў.

**04.05.2021** У апошнія дні красавіка суд Чыгуначнага раёну Віцебску прыняў рашэнне аб прызнанні чатырох Telegram-каналаў Віцебскага рэгіёну экстрэмісцкімі. Застаецца пакуль нявысветленым, была праведзеная незалежная экспертыза публікацый або суд прыняў забароннае рашэнне толькі на падставе суб'ектыўнага меркавання праваахоўных органаў.

У межах грамадзянскага працэсу суд прызнаў факты з'яўлення на старонках інфармацыйных рэсурсаў «Орша 97%», «Наваполацк і Полацк 97%», «Партызаны», «Vitebsk_Юг» матэрыялаў экстрэмісцкага зместу, а таксама паведамленняў з заклікамі да грамадзян ствараць перашкоды законнай дзейнасці дзяржаўных органаў.

На думку работнікаў праваахоўных органаў, па ініцыятыве якіх суд разглядаў справу ў дачыненні да Telegram-каналаў, публікацыі ўтрымлівалі відавочна характар падбухторвання да беспарадкаў, вандалізму, блакавання руху на аўтамабільных трасах і чыгуначных пуцях.

Суд пагадзіўся з тым, што матэрыялы каналаў ўтрымлівалі пагрозы прымянення гвалту і пашкоджання маёмасці прадстаўнікоў органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і суддзяў, а ў месенджары карыстальнікі пакідалі абразлівыя каментары, якія распальвалі варожасць і непрыязь з палітычных і ідэалагічных прычын.

Пасля таго як суд вынес сваю пастанову аб прызнанні каналаў экстрэмісцкімі, праваахоўнікі Віцебскай вобласці ўзмацнілі аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы па высвятленні асоб адміністратараў каналаў і праверцы датычнасьці гэтых рэсурсаў да арганізацыі экстрэмісцкай і пратэставай дзейнасці.

**04.05.2021** 4 траўня суд Віцебскага раёну працягнуў разбор справы Таццяны Туравец, якую вінавацяць у гвалце да супрацоўнікаў МУС (арт. 364 КК). Другое судовае паседжанне сталася непрацяглым. З прычыны няяўкі ў суд двух сведкаў суддзя Наталля Траццякова вымушаная была перанесці разгляд справы. Слуханні адновяцца 7 траўня.

Першым у судзе ў якасці сведкі быў апытаны начальнік крымінальнага вышуку Віцебскага РАУС Віктар Драгацэнны. Ён пацвердзіў, што 9 лютага ягоныя падначаленыя Філіпенка і Старчанка бралі ўдзел у тэрміновых следчых дзеяннях паводле арт. 328 КК. Выязджалі па азначаным адрасе ў Ноўку і затрымлівалі Таццяну Туравец, якая не пагаджалася на правядзенне вобшуку. Передаў ён і сэнс двух тэлефонных размоваў з падначаленым Старчанкам.

Пасля расповеду Драгацэннага адвакатка задала некалькі пытанняў наконт затрымання Таццяны Туравец. Адно з іх тычылася неабходнасці тэрміновага затрымання гаспадыні дому да прыходу прадстаўніка сельскага выканкаму. Адказы Віктара Драгацэннага зводзіліся да таго, што ва ўсіх эпізодах дзеянні яго падначаленых не супярэчылі дзейнаму заканадаўству.

Сведка з боку абвінавачанай Туравец Марыя Волкава паведаміла суду, што ў тую ноч у яе быў дзень народзінаў, і Ангеліна Туравец на ім прысутнічала. Таццяна Туравец званіла якраз на тэлефон Марыі, каб спраўдзіць, ці дачка па-ранейшаму з ёй. Тэлефон дачкі быў адключаны, а міліцыянты сцвярджалі, што дачку затрымалі. Са словаў Волкавай, Таццяна была ўсхваляваная, казала, што невядомыя мужчыны пераконваюць яе, нібыта яны міліцыянты. Паведаміла, што ведае Таццяну толькі з добрага боку – як спакойнага і не канфліктнага чалавека.

Сведкі Рабавы ў суд не з’явіліся. У сувязі з гэтай акалічнасцю суддзя Наталля Траццякова аб’явіла перапынак для прыняцця далейшага рашэння.

Пасля перапынку з улікам немагчымасці разглядаць справу без прысутнасці сведкаў суд пастанавіў даставіць Рабавых у суд Віцебскага раёну ў прымусовым парадку. Таксама ў суд мусіць з’явіцца пацярпелы Старчанка.



Наступнае паседжанне адбудзецца 7 траўня а 14-й гадзіне.

Нагадаем, што паводле абвінавачання, Таццяна Туравец перашкодзіла міліцыянтам рабіць у яе хаце ператрус, а калі супрацоўнікі МУС павалілі яе на падлогу, каб начапіць кайданкі, укусіла за палец аднаго з іх, пракусіла пальчатку другому і ударыла нагой трэцяга міліцыянта. Гэта адбылося пасля палуначы 10 лютага. Жанчына сваёй віны не прызнала.

**05.05.2021** Віцебскі абласны суд разгледзеў апеляцыйныя скаргі віцяблян Юліі Кашаверавай і Арцёма Ісакава на рашэнні суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, які ў лютым 2021 году прысудзіў ім адпаведна паўтара і тры гады зняволення. Праваабаронцы прызналі прысуды палітычна матываванымі, а саміх асуджаных – палітвязнямі.

Як расказаў бацька Юліі Кашаверавай, 4 траўня абласны суд не задаволіў скаргу яго дачкі і прысуд пакінуў без зменаў. Рашэнне суду Кастрычніцкага раёну набыло законную моц. Паводле яго, Юлія мусіць адбыць паўтара года ў калоніі агульнага рэжыму.

Яе прызналі вінаватай у хуліганстве (ч.1 арт. 339 КК): дзяўчына нібыта пашкодзіла міліцэйскі бус, ударыўшы па ім нагой.

«На жаль, Юля застанецца за кратамі. У яе скарзе нават не ставілася пытанне зменшыць тэрмін пакарання, была толькі просьба змяніць меру стрымання, каб не была звязаная са знаходжаннем пад вартай. Але просьбу адхілілі...» – расказаў бацька палітзняволенай.

Ён паведаміў таксама, што 4 траўня на спатканні з Юліяй у СІЗА-2 пабывалі яе бабуля і брат. Сам бацька спаткаецца з дачкой 6 красавіка. Ён мяркуе, што ўжо ў другой палове траўня Юлю этапуюць у Гомельскую калонію.

Юлія Кашаверава знаходзіцца за кратамі ўжо больш за 6 месяцаў.

Стала вядома, што Віцебскі абласны суд адхіліў таксама і скаргу яшчэ аднаго палітвязня – Арцёма Ісакава. 4 лютага суд Кастрычніцкага раёну прысудзіў хлопца да трох гадоў пазбаўлення волі за ўжыванне газавага балончыка падчас мірнага шэсця. Гэтыя дзеянні былі кваліфікаваныя як гвалт у дачыненні супрацоўнікаў унутраных спраў (арт. 364 КК).

Па стане на 5 траўня ў Беларусі прызнаныя палітычнымі вязнямі 363 чалавекі.

**07.05.2021** Як стала вядома, яшчэ ў лютым 2021 году Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3884/2020 скаргу віцебскага журналіста Вячаслава Лазарава. Журналіст настойвае на тым, што беларуская дзяржава парушыла ягонае права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі.

Падставай для падачы скаргі у Камітэт па правах чалавека (КПЧ) стала рашэнне суддзі суду Наваполацку Зінаіды Балаболавай, якая ў адкрытым судовым пасяджэнні разгледзела справу аб



адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным ч.2. арт. 22.9 (незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Паводле міліцэйскага пратаколу, журналіста Вячаслава Лазарава абінавачвалі ў тым, што ў лютым 2019 году ён сумесна з журналісткай Аленай Шабуняй, не маючы акрэдытацыі ў якасці журналістаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, знаходзячыся ў Наваполацку каля заводу «Палімір» ААТ «Нафтан», узялі інтэрв'ю ў трох грамадзян. Пазней фрагменты гэтага інтэрв’ю былі размешчаныя ў камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на сайце belsat.eu у рубрыцы «Што рабіць, калі ўдавілася дзіця».

Суд прыйшоў да высновы, што сваімі дзеяннямі журналісты парушылі арт. 35 Закону РБ «Аб сродках масавай інфармацыі», здзейснілі незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі. У судовым пасяджэнні ні Лазараў, ні Шабуня сваёй віны не прызналі і ад дачы тлумачэнняў адмовіліся.

Тым не менш, суддзя Балаболава пакарала журналістаў адміністрацыйным штрафам у памеры 637,5 рублёў.

Для абароны сваіх прафесійных і грамадзянскіх правоў Вячаслаў Лазараў абскардзіў рашэнне суду Наваполацку ў Віцебскім абласным і Вярхоўным судах.

Але суды вышэйшай інстанцыі адмовіліся абараніць яго правы, якія гарантаваныя дзейнай беларускай Канстытуцыяй і арт. 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Пасля гэтага журналіст звярнуўся са скаргай на дзеянні беларускай дзяржавы ў Камітэт па правах чалавека ААН, дзе скарга была зарэгістраваная і будзе разгледжаная па сутнасці пасля таго, як беларускі ўрад патлумачыць сваю пазіцыю ў межах пададзенага журналістам паведамлення.

**07.05.2021** 23-гадовая Лізавета Кірыенка павінна была выйсці на волю з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) позна ўвечары 6 траўня. Але за некалькі дзясяткаў хвілін да заканчэння тэрміну адміністрацыйнага арышту стала вядома, што дзяўчыну не выпусцяць. Пра гэта паведаміла маці затрыманай.

Паводле інфармацыі мамы Лізаветы Святланы, якая збіралася сустрэць дачку на выхадзе з ізалятару, яе дачку затрымалі яшчэ на трое сутак.

«Добры дзень, Кірыенка Лізавета затрыманая яшчэ на 72 гадзіны без тлумачэння прычын», – даслала паведамленне праваабаронцам спадарыня Святлана, спасылаючыся на адваката дачкі. Больш дакладнай інфармацыі пакуль няма.

Як лічыць віцебскі праваабаронца Павел Левінаў, дзяўчыну маглі затрымаць паводле новай адміністрацыйнай справы, але маглі і ў межах крымінальнай.

Нагадаем, Лізавета Кірыенка была затрыманая ў Віцебску ўвечары 26 красавіка разам з Марыяй Амасовіч. У дзень чарнобыльскай трагедыі на прыступках Уваскрасенскага храму яны запалілі дзве чырвоныя лампадкі. Суддзя Уладзімір Царыкаў палічыў гэта несанкцыянаваным масавым мерапрыемствам (арт. 24.23 КаАП) і прысудзіў Лізавеце 10 сутак адміністрацыйнага арышту, а Марыі – 20 сутак.

Лізавета Кірыенка працуе выхавальніцай у дзіцячым садку. Пасля затрымання ў кватэры, якую яна здымае ў Віцебску, прайшоўператрус.

**08.05.2021** У судзе Віцебскага раёну 7 траўня прайшлі чарговыя слуханні ў справе жыхаркі пасёлку Ноўка Таццяны Туравец. Па версіі міліцыі, 9 лютага Туравец адмовіла міліцыянтам праводзіць вобшук у сваім доме і чыніла ім супраціў. Жанчыну абвінавачваюць паводле арт. 364 КК. У сённяшнім паседжанні суд апытаў сведкаў Рабавых, заслухаў абвінавачаную і вырашыў пытанне аб правядзенні таваразнаўчай экспертызы.

Сведкі Рабавы

Сведкі Вераніка і Ірына Рабавы былі панятымі падчас ператрусу ў Таццяны Туравец 9-10 лютага. На судзе яны выказалі сваё бачанне падзеяў. Іх версія шмат у чым супадала з версіяй, прапанаванай на першым паседжанні чатырма пацярпелымі міліцыянтамі.

Вераніка Рабава сказала, што чула абразы, выказаныя Туравец на адрас міліцыянтаў. Ірына

Рабава пагрозаў з вуснаў Туравец не чула. Адзінае што прыгадала дык гэта тое, што тая абяцала вылекаваць міліцыянтам слых.

«Я ім не чыніла супраціў»
Пасля апытання Рабавых суддзя Наталля Траццякова папрасіла Туравец пракаментаваць іх паказанні і назваць прычыны, па якіх сведкі яе агаворваюць.

Сваёй віны Таццяна Туравец ізноў не прызнала. Паясніла, што праз паводзіны міліцыянтаў, якія ёй казалі няпраўду, яна тройчы ўсумнілася, што перад ёй праваахоўнікі.

«Я ім не чыніла супраціў. Мне адразу пачалі пагражаць. Яны мяне ўвесь час абвінавачвалі, што я неадэкватная і паводжу сябе неадэкватна. Казалі, што, калі буду супраціўляцца, выкарыстаюць фізічную сілу, але я не супраціўлялася», – сцвярджае Туравец.

Яна патлумачыла, што было вельмі страшна. На вуліцу не выбегла, бо ў доме было двое невядомых, а на парозе стаялі яшчэ чатыры чалавекі. Калі кусала за палец, меркавала, што на яе нападаюць, а яна абараняецца.

Туравец лічыць, што ў шэрагу момантаў канфлікту, пераказаных Рабавымі, ёсць нестыкоўкі.

Выказала меркаванне, што сведкі часам абапіраюцца не на свае ўласныя ўспаміны, а сведчаць са словаў іншых. Паводле Туравец, Рабавы стаялі за міліцыянтамі на парозе і не маглі бачыць дакладна ўсе падзеі за дзвярыма, хоць яны і шкляныя. А вось каментары, якія рабілі пры гэтым міліцыянты, чулі. Прычыны, з якіх Рабавы яе агаворваюць, Туравец не назвала.

Высветлілася таксама, што Рабавы раней сустракаліся з пацярпелым Філіпенкам, які некалі заходзіў да іх па службовых абавязках.



Суд задаволіў хадайніцтва адвакаткі

У сувязі з заявай пацярпелага міліцыянта Старчанкі аб пакрыцці матэрыяльнай страты адвакатка Тацяны Туравец заявіла хадайніцтва аб правядзенні таваразнаўчай экспертызы для вызначэння рэальнага кошту скураных пальчатак, якія нібыта Туравец пракусіла. Абвінавачаная хадайніцтва падтрымала, астатнія ўдзельнікі працэсу не пярэчылі. Суд хадайніцтва задаволіў.

Перад экспертамі стаіць задача высветліць рэштавы кошт пальчатак з улікам шэрагу азначаных акалічнасцяў. Правядзенне экспертызы даручанае ўпраўленню Дзяржаўнага камітэту судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці.

Вырашэнне хадайніцтва на правядзенне крыміналістычнай экспертызы суд адклаў да моманту атрымання вынікаў першай экспертызы.

Наступнае паседжанне пройдзе 13 траўня (пачатак а 14-й гадзіне).

**08.05.2021** За ўдзел у інтэрнэт-пікеце старшы інспектар маёр міліцыі Ўладзімір Казлоўскі склаў пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні ў дачыненні віцебскай грамадзянскай актывісткі Караліны Цярэнцьевай. Матэрыялы справы будуць разгледжаныя 17 мая 2021 года ў 10-30 суддзём суду Першамайскага раёну Віцебску Міхаілам Юрчанкам.

У пратаколе паведамляецца суду, што Караліна Цярэнцьева паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага пакарання за такое ж парушэнне ў неўстаноўлены перыяд часу, але не пазней 26.03.2021 года з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў правяла масавае мерапрыемства – пікетаванне без адпаведнага дазволу мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, шляхам размяшчэння відэазапісу для публічнай дэманстрацыі грамадзянам у глабальнай сетцы Інтэрнэт на Телеграм-канале «Віцебск 97%».

На відэа бачна, як Цярэнцьева, знаходзячыся ў «неўстаноўленым месцы» на фоне бел-чырвона-белага сцяга прамаўляла лозунгі: «Усе мы з вамі героі! І толькі ад нас залежыць наша Перамога!», дэманстравала жэсты: «Верам!», «Можам!», «Пераможам!».

Паводле пратаколу, відэазапіс была выяўлены 26 сакавіка падчас маніторынгу сеткі Інтэрнэт.

На думку старшага інспектара Казлоўскага, сваімі дзеяннямі актывістка парушыла ўстаноўлены арт. 10 закону «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» парадак правядзення пікетавання, з'яўляючыся яго ўдзельнікам, і за гэтае правапарушэнне ёй неабходна прызначыць пакаранне, прадугледжанае ч. 3 арт. 24.23 КаАП. Але суд павінен вырашыць, які від пакарання ўжыць да Караліны з магчымых прадугледжаных артыкулам варыянтаў: штраф у памеры ад 20 да 200 базавых велічынь, або грамадскія працы ад васьмі да шасцідзесяці гадзін, або адміністрацыйны арышт ад 15 да 30 сутак.

**08.05.2021** У судзе Чыгуначнага раёну Віцебску 7 траўня судзілі траіх дзяўчат – Лізавету Кірыенка, Марыю Агіевіч і Марыю Амасовіч. Усе трое знаходзяцца ў ізалятары часовага ўтрымання, таму суд праходзіў праз «Скайп». Дзяўчат прызналі вінаватымі ў несанкцыянаваным пікетаванні, якое яны нібыта здзейснілі 27-га сакавіка пад мостам імя Кірава ў Віцебску, паведамляе Беларускае Радыё Рацыя.

«Кірыенка ўзяла ўдзел у насанкцыянаваным масавым мерапрыемстве з палатнінай белага і чырвонага колеру. Разам з Агіевіч і Амасовіч, якія трымалі ў руках плакаты, знаходзячыся пад Кіраўскім мостам у горадзе Віцебску, яны пазіравалі, робячы фота для ўсеагульнага агляду ў навінавай стужцы тэлеграм-каналу «Витебск для жизни», – агучыла абвінавачанне, зафіксаванае ў міліцэйскім пратаколе, суддзя Вольга Шапавал.

Фотаздымак, пра які вялося на судзе, быў знойдзены ў тэлефоне Марыі Амасовіч. Міліцыянты правялі агляд тэлефона, пакуль дзяўчына знаходзілася за кратамі: 28 красавіка Марыю Амасовіч і Лізавету Кірыенка пакаралі арыштамі за дзве свечкі, запаленыя на ўгодкі Чарнобыльскай катастрофы.

Цяпер суддзя Вольга Шапавал асудзіла дзяўчат да новых арыштаў: Марыю Амасовіч – на 20 сутак, Лізавету Кірыенку – на 15 сутак. Такім чынам, арышт Марыі Амасовіч падвоіўся: 20 сутак ёй прысудзілі 28-га красавіка і яшчэ 20 – цяпер. Лізавета Кірыенка, раней асуджаная на

10 сутак, мае адбыць у зняволенні агулам 25 сутак. Марыя Агіевіч, якая ўпершыню трапіла пад суд паводле адміністрацыйнага артыкулу 24.23, пакараная арыштам на 10 сутак.

Таксама на судзе было згадана, што падчасператрусу ў Лізаветы Кірыенка нібыта знайшлі доказы таго, што яна мае дачыненне да «пратэставага» надпісу на адным з дамоў у Віцебску. За гэта дзяўчыне можа пагражаць крымінальная справа за псаванне гарадской маёмасці.

**09.05.2021** Віцебскі абласны суд разгледзіць прыватныя скаргі праваабаронцы Паўла Левінава на вызначэнне суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Святланы Варатынскай. Яна адмовілася адправіць у аблсуд апеляцыйныя скаргі праваабаронцы, у якіх ён патрабуе адмены забароны працы Тэлеграм-каналаў «Віцебск 97%» і «Чат невераготнага Віцебска». Пасяджэнне судовай калегіі па грамадзянскіх справах адбудзецца 24 траўня 2021 года ў будынку аблсуду ў 14-30 і 15-00 адпаведна па кожным канале.

У канцы сакавіка 2021 году ў спіс забароненых Тэлеграм-каналаў трапілі два віцебскіх паблікі - «Віцебск 97%» і «Чат невераготнага Віцебска». Ініцыятыва забароны гэтых інтэрнэт-выданняў належала галоўнаму ўпраўленню па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС па Віцебскай вобласці.

На думку праваахоўнікаў, у віцебскіх Тэлеграм-каналах неаднаразова размяшчаліся заклікі да пашкоджання маёмасці дзяржорганаў і грамадзян, да масавых беспарадкаў, хуліганства, вандалізму, супраціву міліцыянтам. Нібыта на каналах з'яўляліся абразы на адрас прадстаўнікоў праваахоўных органаў, а таксама дзяржслужбоўцаў.

Мэта такіх матэрыялаў, лічаць міліцыянты, ёсць змяненне канстытуцыйнага ладу Беларусі. Цяпер публікацыя або рэпост інфармацыі з названых каналаў пацягне адміністрацыйнае пакаранне.

У сваёй скарзе праваабаронца Павел Левінаў настойвае на тым, што сваім рашэннем суд парушыў права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі шырокага кола асоб. Бо на канале «Віцебск 97%» больш 8100 падпісчыкаў, а на канале «Чат неверагоднага Віцебска» іх - 7600. Нягледзячы на гэтая аргументы, 12 красавіка 2021 года суддзя суду Чыгуначнага раёну Віцебску Святлана Варатынская, якая, верагодна, і прыняла рашэнне аб забароне каналаў, вынесла вызначэнне аб адмове ў прыняцці апеляцыйных скаргаў Левінава, матывываўшы гэта тым, што ён не з'яўляецца юрыдычна зацікаўленай асобай.

Гэтае рашэнне праваабаронца аспрэчыў, падаўшы прыватныя скаргі ў Віцебскі абласны суд.

29 красавіка суд Чыгуначнага раёну Віцебску паведаміў Левінаву, што калегія па грамадзянскіх справах Віцебскага абласнога суда ў бліжэйшы час разгледзіць ягоныя прыватныя скаргі па сутнасці. Разляд адбудзецца 24 траўня ў будынку аблсуду ў 14-30 і 15-00 (два паседжанні па кожным канале).Віцебскі абласны суд разгледзіць прыватныя скаргі праваабаронцы Паўла Левінава на вызначэнне суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Святланы Варатынскай. Яна адмовілася адправіць у аблсуд апеляцыйныя скаргі праваабаронцы, у якіх ён патрабуе адмены забароны працы Тэлеграм-каналаў «Віцебск 97%» і «Чат неверагоднага Віцебска». Пасяджэнне судовай калегіі па грамадзянскіх справах адбудзецца 24 траўня 2021 года ў будынку аблсуду ў 14-30 і 15-00 адпаведна па кожным канале.

У канцы сакавіка 2021 году ў спіс забароненых Тэлеграм-каналаў трапілі два віцебскіх паблікі - «Віцебск 97%» і «Чат неверагоднага Віцебска».

Ініцыятыва забароны гэтых інтэрнэт-выданняў належала галоўнаму ўпраўленню па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС па Віцебскай вобласці.

На думку праваахоўнікаў, у віцебскіх Тэлеграм-каналах неаднаразова размяшчаліся заклікі да пашкоджання маёмасці дзяржорганаў і грамадзян, да масавых беспарадкаў, хуліганства, вандалізму, супраціву міліцыянтам. Нібыта на каналах з'яўляліся абразы на адрас прадстаўнікоў праваахоўных органаў, а таксама дзяржслужбоўцаў. Мэта такіх матэрыялаў, лічаць міліцыянты, ёсць змяненне канстытуцыйнага ладу Беларусі. Цяпер публікацыя або рэпост інфармацыі з названых каналаў пацягне адміністрацыйнае пакаранне.

У сваёй скарзе праваабаронца Павел Левінаў настойвае на тым, што сваім рашэннем суд парушыў права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі шырокага кола асоб. Бо на канале «Віцебск 97%» больш 8100 падпісчыкаў, а на канале «Чат неверагоднага Віцебска» іх - 7600. Нягледзячы на гэтая аргументы, 12 красавіка 2021 года суддзя суду Чыгуначнага раёну Віцебску Святлана Варатынская, якая, верагодна, і прыняла рашэнне аб забароне каналаў, вынесла вызначэнне аб адмове ў прыняцці апеляцыйных скаргаў Левінава, матывываўшы гэта тым, што ён не з'яўляецца юрыдычна зацікаўленай асобай.

Гэтае рашэнне праваабаронца аспрэчыў, падаўшы прыватныя скаргі ў Віцебскі абласны суд.

29 красавіка суд Чыгуначнага раёну Віцебску паведаміў Левінаву, што калегія па грамадзянскіх справах Віцебскага абласнога суда ў бліжэйшы час разгледзіць ягоныя прыватныя скаргі па сутнасці. Разляд адбудзецца 24 траўня ў будынку аблсуду ў 14-30 і 15-00 (два паседжанні па кожным канале).

**11.05.2021** Старшыня Магілёўскага абласнога суду Ігар Прошка не задаволіў просьбу сваякоў палітыка Паўла Севярынца аб разглядзе ягонай крымінальнай справы ў адкрытым фармаце. Пра гэта паведаміла маці апазіцыйнага палітыка Таццяна Севярынец.

Старшыня суду звярнуў увагу на тое, што крымінальная справа прызначаная да разгляду ў закрытым судовым пасяджэнні суддзёй Магілёўскага абласнога суду Ірынай Ланчавай. З гэтай нагоды ёю вынесеная матывіровачная пастанова. Кіраўнік суду растлумачыў, што такое рашэнне прынятае суддзёй у сувязі з тым, што ў крымінальнай справе ўтрымліваюцца матэрыялы, якія датычацца да ахоўванай законам тайны.

У адказе маецца тлумачэнне таго, што, згодна з арт. 22 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону. Якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па выкананні правасуддзя недапушчальнае і цягне адказнасць паводле закону. Таму ніхто не мае права ўмешвацца і даваць якія-небудзь указанні аб вытворчасці працэсуальных дзеянняў суду першай інстанцыі.

Тым не менш, не пагадзіўшыся з пазіцыяй суду і закрытым фарматам судовага працэсу, 10 мая члены сям'і Севярынцаў абскардзілі ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь адказ з Магілёўскага абласнога суду.

Невядома, аднак, ці ў сувязі са святамі гэтая скарга будзе разгледжаная да пачатку судовага працэсу ў Магілёве.

Такім чынам, 12 мая разбор крымінальнай справы ў дачыненні да Паўла Севярынца, Яўгена Афнагеля, Паўла Юхневіча, Змітра Казлова, Максіма Вінярскага і Андрэя Войніча пачнецца ў закрытым фармаце для сваякоў, прадстаўнікоў грамадскасці і СМІ.

Старшыня Магілёўскага абласнога суду Ігар Прошка не задаволіў просьбу сваякоў палітыка Паўла Севярынца аб разглядзе ягонай крымінальнай справы ў адкрытым фармаце.

Пра гэта паведаміла маці апазіцыйнага палітыка Таццяна Севярынец.

Старшыня суду звярнуў увагу на тое, што крымінальная справа прызначаная да разгляду ў закрытым судовым пасяджэнні суддзёй Магілёўскага абласнога суду Ірынай Ланчавай. З гэтай нагоды ёю вынесеная матывіровачная пастанова. Кіраўнік суду растлумачыў, што такое рашэнне прынятае суддзёй у сувязі з тым, што ў крымінальнай справе ўтрымліваюцца матэрыялы, якія датычацца да ахоўванай законам тайны.

У адказе маецца тлумачэнне таго, што, згодна з арт. 22 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, суддзі пры ажыццяўленні правасуддзя незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону. Якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па выкананні правасуддзя недапушчальнае і цягне адказнасць паводле закону. Таму ніхто не мае права ўмешвацца і даваць якія-небудзь указанні аб вытворчасці працэсуальных дзеянняў суду першай інстанцыі.

Тым не менш, не пагадзіўшыся з пазіцыяй суду і закрытым фарматам судовага працэсу, 10 мая члены сям'і Севярынцаў абскардзілі ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь адказ з Магілёўскага абласнога суду.

Невядома, аднак, ці ў сувязі са святамі гэтая скарга будзе разгледжаная да пачатку судовага працэсу ў Магілёве.

Такім чынам, 12 мая разбор крымінальнай справы ў дачыненні да Паўла Севярынца, Яўгена Афнагеля, Паўла Юхневіча, Змітра Казлова, Максіма Вінярскага і Андрэя Войніча пачнецца ў закрытым фармаце для сваякоў, прадстаўнікоў грамадскасці і СМІ.



**12.05.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 12 траўня разгледзеў адміністрацыйную справу 19-гадовай Ангеліны Туравец, затрыманай 9 мая каля плошчы Перамогі. Яе забралі толькі за тое, што назірала за афіцыйным парадам з бел-чырвона-белай усмешкай на масцы. Міліцыя ўспрыняла гэта як несанкцыянаванае пікетаванне (арт. 24.23 КаАП).

Ангеліна Туравец была затрыманая ранкам 9 мая разам з 18-гадовым Русланам Яневічам, але хлопца пазней адпусцілі. У Чыгуначным РАУС Віцебску на Ангеліну склалі пратакол паводле ч.3 арт. 24.23 КаАП і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ), дзе яна і прабыла трое сутак да суду. Арыштаваныя два тэлефоны дзяўчыны.

Судовае паседжанне 12 траўня праходзіла з выкарыстаннем Skype. Справу разбірала суддзя Алена Цыганкова.

Сваёй віны не прызнала
Паводле міліцэйскага пратаколу, Ангеліна Туравец 9 траўня, знаходзячыся каля дому 24 на вул. Калініна, мела на твары маску чорнага колеру з бел-чырвона-белай выявай на ёй «для публічнай дэманстрацыі» – і гэткім чынам правяла адзіночнае пікетаванне з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў.

Дзяўчына не згадзілася з пратаколам і сваёй віны не прызнала. Патлумачыла на судзе, што проста прыйшла паглядзець на парад Перамогі ў цэнтры Віцебску, бо штогод разам з бацькам адзначае свята менавіта такім чынам. Сцвердзіла, што ў чорнай масцы з выявай усмешкі («белыя зубы – чырвоны язык») ходзіць яшчэ са снежня 2020 году.

«Прысутнічала ў ёй на судах, была ў ёй у следчым камітэце, не здымала гэтую маску, калі размаўляла з начальнікам Віцебскага РАУС 25 сакавіка – і ніхто мне не рабіў наконт яе ніякіх заўваг, не папярэджваў і не рэкамендаваў перастаць яе насіць», – запэўніла на судзе Ангеліна Туравец. Падкрэсліла, што не мае іншай маскі.

Адвакатка прасіла спыніць справу
Пра тое, што цягам паўгода ніякіх праблем і нараканняў з боку ўладаў маска не выклікала, сцвердзіла і маці Ангеліны Таццяна Туравец, якая выступіла на судзе ў якасці сведкі. Хадайніцтва аб выкліку ў суд яшчэ аднаго сведкі – Руслана Яневіча, якога затрымлівалі разам з Ангелінай, было адхіленае.

Адвакатка Ангеліны Туравец заявіла таксама хадайніцтва, каб суддзя вярнула на дапрацоўванне ў міліцыю матэрыялы справы, бо ў іх маецца шмат недакладнасцяў – напрыклад з часам затрымання. Выявілася таксама, што Ангеліну не азнаёмілі з пратаколам затрымання. Але і гэтую просьбу суддзя Алена Цыганкова адхіліла.

Напрыканцы працэсу адвакатка прасіла спыніць справу праз адсутнасць складу правапарушэння, бо маска з выявай белых зубоў і чырвонага языка не магла быць аб'ектам меркаванага правапарушэння.



Суддзя Цыганкова: 20 сутак арышту Аднак, на думку суддзі, віна Туравец «знайшла сваё пацверджанне». Алена Цыганкова пастанавіла пакараць Ангеліну Туравец за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні (ч.3 арт. 24.23 КаАП) адміністрацыйным арыштам на 20 сутак.

Да гэтага Ангеліну Туравец ужо 4 разы прыцягвалі да адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Яе каралі штрафамі і арыштамі. У лютым 2021 году ў дачыненні маці Ангеліны Таццяны Туравец была заведзеная крымінальная справа за ўжыванне гвалту да супрацоўнікаў МУС (арт. 364 КК), якая разглядаецца зараз судом Віцебскага раёну.

Ангеліна Туравец выйдзе на волю 29 траўня.

**13.05.2021** 13 траўня суд Віцебскага раёну завяршыў даследаванне матэрыялаў справы жыхаркі пасёлку Ноўка Таццяны Туравец, абвінавачанай у гвалце ў дачыненні да супрацоўнікаў МУС (арт. 364 КК). У судзе абвесцілі перапынак да 24 траўня.

Паседжанне 13 траўня праходзіла без удзелу пацярпелых міліцыянтаў Сергіенкі, Старчанкі, Шутава і Філіпенкі. Нагадаем, паводле следства, аднаго з іх Таццяна Туравец укусіла за палец, а другому пракусіла пальчатку, калі на яе хацелі надзець кайданкі.

На паседжанні даследаваліся матэрыялы справы, якая складаецца з трох тамоў. Агучваў іх пракурор Мікіта Раманоўскі.

Высветлілася, што ў матэрыялах справы маюцца медычныя дакументы, якія сведчаць, што ў

Таццяны Туравец пасля затрымання былі выяўленыя пашкоджанні пляча.

«Міліцыянты пашкодзілі мне сухажыллі пляча, і я зараз праходжу лячэнне. І гэтыя факты пацвярджаюць тое, што на мяне было, па сутнасці, учыненае нападзенне», – заявіла Туравец, адказваючы на пытанні адвакаткі.

Абаронца Таццяны Туравец хадайнічала ў судзе аб правядзенні судова-крыміналістычнай экспертызы пальчатак міліцыянта Старчанкі, якія Туравец нібыта пракусіла.

Бо ў агучаных матэрыялах справы маецца заключэнне эксперта, паводле якога на міліцэйскай пальчатцы быў выяўлены толькі прарыў па шве, але не пашкоджанні ад чалавечых зубоў. Суддзя Наталля Траццякова пастанавіла разгледзець пытанне аб заяўленым хадайніцтве пасля таго, як будуць атрыманыя вынікі таваразнаўчай экспертызы, на якую ўжо накіравалі пальчатку пацярпелага супрацоўніка Віцебскага РАУС Старчанкі. Ён хоча атрымаць за «пашкоджаную пальчатку» 50 рублёў кампенсацыі.

У слуханнях па справе абвешчаны перапынак да 24 траўня (пачатак паседжання – у 10.30).

Нагадаем, Таццяне Туравец інкрымінуюць тое, што ўначы 10 лютага яна перашкаджала міліцыянтам рабіцьператрус у ейнай хаце, а калі тыя гвалтам хацелі надзець на яе наручнікі – пакусала іх і ўдарыла аднаго з іх нагой у вобласць галавы. Туравец пагражае да 6 гадоў зняволення.

12 траўня паводле арт. 24.23 КаАП за краты на 20 сутак трапіла дачка Таццяны Ангеліна Туравец.

**13.05.2021** 12 траўня Полацкі суд вынес тры пастановы паводле артыкулу 24.23 КаАП за нібыта ўдзел грамадзян у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. У выніку – два арышты і адзін штраф у памеры больш за 2000 рублёў.

За сцяг у Грамах
9 траўня сужэнцы Уладзімір і Юлія Яўсеевы разам з сябрамі ў двары свайго прыватнага дому ў мікрараёне Грамы адзначалі свята. Каля 22.00 яны выйшлі на вуліцу з бел-чырвона-белым сцягам. У міліцыю патэлефанавалі суседзі, праз 20 хвілін прыехала міліцыя. Сямейную пару трымалі ў пастарунку да раніцы. Уладзіміра ранкам адпусцілі, а Юлію кінулі на трое сутак у ІЧУ Полацку. Раней іх абодвух ужо прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, таму судзілі паводле ч.3 арт. 24.23.

Суддзя Віктар Баліка прызнаў іх вінаватымі ў правапарушэнні паводле арт. 24.23 і пакараў сужэнцаў арыштам і штрафам. Уладзімір Яўсееў асуджаны на 20 сутак арышту, Юлія Яўсеева аштрафаваная на 70 базавых велічынь.

За фотасесію ў лесе
Таксама 12 траўня суддзя Андрэй Дзергачоў пастанавіў пакараць палачанку Вольгу Папову адміністрацыйным арыштам на 15 сутак.

Папову абвінавацілі ў фатаграфаванні ў лесе з БЧБ-сцягам. Паводле міліцыянтаў, яна гэтым самым зладзіла незаконнае масавае мерапрыемства. Вольгу Папову таксама судзілі па частцы 3-й арт. 24.23 КаАП. Час суду над Вольгай 12 мая ўтойваўся не толькі ад грамадскасці, але і ад адваката. Сябры жанчыны дзяжурылі каля суду ад 9-й гадзіны раніцы.

Толькі ў 16.30 стала вядома час разгляду, калі міліцыянты прывезлі Вольгу і яе справу ў суд.

Вольга Папова была адвольна затрыманая 6 мая праз ілжывае абвінавачванне ў злачынстве (нібыта расфарбавала лаўку ў бел-чырвона-белыя колеры). Тры дні яе ўтрымлівалі ў ІЧУ Полацку, але ў выніку крымінальную справу не завялі. Аднак допыты і псіхалагічны ціск не спынілі і пачалі новы адміністрацыйны працэс - за фота з БЧБ-сцягам. Яшчэ праз трое сутак у ІЧУ яе асудзілі на 15 сутак арышту.

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, першыя трое сутак Вольгу Папову трымалі ў адзіночнай камеры і на допыты выводзілі ў кайданках. Перадачы для яе не прымалі.
Сябры Вольгі Паповай чакалі, што яна выйдзе на волю пасля трох сутак і сустракалі яе з кветкамі каля РАУС. Аднак замест Вольгі да чакальцаў выйшаў маёр міліцыі Ігар Емяльянаў і ўчастковы інспектар старшы лейтэнант міліцыі Віктар Кураш. Усіх, хто сустракаў сяброў, знялі на відэа і перапісалі іх дадзеныя. Емяльянаў сцвярджаў, што ў паводзінах тых, хто чакаў вызвалення сяброў, меліся прыкметы парушэння закона аб масавых мерапрыемствах. Папярэдзіў, што ўсе яны могуць быць прыцягнутыя да адказнасці. Сябры Вольгі збіраюцца скласці скаргу на дзеянні службовых асобаў.



**13.05.2021** Стала вядома, што Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3794/2020 індывідуальную скаргу аршанскага блогера Дзмітрыя Казлова («Шэры кот»). Сеткавы журналіст настойвае на тым, што беларуская дзяржава парушыла яго права на публічнае выказванне меркавання і на ўдзел у выбарах у якасці кандыдата ў дэпутаты парламенту.

Нагодай звароту ў Камітэт стала рашэнне акруговай выбарчай камісіі Аршанскай гарадской выбарчай акругі ад 8 лістапада 2019 году па адмене рэгістрацыі Дзмітрыя Казлова кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Падставай для адмены рэгістрацыі з'явілася нібыта паўторнае парушэнне Казловым выбарчага заканадаўства. Па версіі выбарчай камісіі, ён парушыў закон пры правядзенні перадвыбарчай агітацыі, а менавіта выкарыстоўваў плакаты, на якіх меліся заклікі да зрыву або адмены выбараў.

Рашэнне акруговай выбарчай камісіі журналіст абскардзіў у Віцебскую абласную выбарчую камісію і ў Віцебскі абласны суд, але яны адмовілі Дзмітрыю ў абароне яго грамадзянскіх і палітычных правоў.

Адмова суду азначала, што журналіст вычарпаў ўсе магчымыя эфектыўныя сродкі прававой абароны.

Таму для працягу змагання за свае правы і законныя інтарэсы Казлоў падаў індывідуальную скаргу на беларускую дзяржаву ў КПЧ ААН.

У сваёй скарзе Казлоў прыводзіць довады, што «дзяржава не падала доказаў таго, што лозунгі

«Фальшывым выбарам – баста!» і «Калгаснай дыктатуры – баста!» хоць нейкім чынам замахнуліся на інтарэсы дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, грамадскі парадак, ахову здароўя і маральнасць насельніцтва або на правы і свабоды іншых асоб».

У паведамленні аўтар сцвярджае, што ў адпаведнасці з артыкулам 25 Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах кожны грамадзянін павінен мець права і магчымасць быць абраным на сапраўдных перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага роўнага выбарчага права пры таемным галасаванні і якія забяспечваюць свабоднае волевыяўленне выбаршчыкаў. І мяркуе, што выбарчыя камісіі, а таксама суд не былі кампетэнтнымі, паколькі яны пры прыняцці рашэньня занядбалі ўзятыя на сябе міжнародныя абавязкі ў рамках Пакту.

Нягледзячы на актыўны пратэст з боку кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь, Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў скаргу Дзмітрыя Казлова, і яна будзе разгледжаная гэтым міжнародным органам ва ўстаноўленыя Пактам тэрміны.



**14.05.2021** 13 траўня Віцебскі абласны суд вынес рашэнне наконт прыватнай скаргі віцяблянкі Алены Шабуні на пастанову суду Кастрычніцкага раёну аб пакіданні без руху скаргі на рашэнне пракурора Віцебскай вобласці. Скаргу ў аблсудзе разглядаў суддзя Віктар Быстроў. Алена Шабуня на судзе не прысутнічала.

22 лютага пракурор Віцебску Андрэй Шклярэўскі афіцыйна папярэдзіў Алену Шабуню аб недапушчальнасці парушэння парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў. Журналістка з папярэджаннем не пагадзілася і абскардзіла яго пракурору Віцебскай вобласці Вадзіму Сушчынскаму. Той у задавальненні скаргі адмовіў.

З рашэннем абласнога пракурора Шабуня таксама не пагадзілася. На той падставе, што Канстытуцыя і міжнародныя пакты гарантуюць ёй, як і кожнаму чалавеку, неад'емнае права на мірныя сходы. Сваю нязгоду Шабуня выказала ў прыватнай скарзе, пададзенай у суд Кастрычніцкага раёну на рашэнне пракурора Сушчынскага.

19 сакавіка суд Кастрычніцкага раёну Віцебску ў асобе суддзі Вікторыі Лешчанкі пакінуў скаргу без руху. Маўляў, была пададзеная ў адным экзэмпляры і дзяржпошліна неаплачаная. Такія фармальныя прычыны адмовы. Атрымаўшы яе, Алена Шабуня звярнулася ў абласны суд. У скарзе прасіла адмяніць рашэнне пракурора Віцебскай вобласці, прынятае па скарзе на афіцыйнае папярэджанне ад 22 лютага.

У сваёй скарзе Шабуня патлумачыла, што не бачыць сэнсу марнаваць паперу на другі асобнік скаргі і аплачваць дзяржпошліну, бо рашэнне суду па скарзе загадзя вядомае.

«За апошнія 10 гадоў Віцебскі абласны суд не задаволіў ніводную скаргу на рашэнні пракурора Віцебскай вобласці, прынятыя ад грамадзян на афіцыйныя папярэджанні. Рашэнне, якое я абскарджваю, расцэньваю як, па-першае, вымаганне з пенсіянера-інваліда грашовых сродкаў, а па-другое, як парушэнне права на судовую абарону», – зазначыла Шабуня.

Прасіла рашэнне суддзі Вікторыі Лешчанкі ад 19 сакавіка адмяніць.

Суддзя Віктар Быстроў агучыў матэрыялы справы і сышоў у дарадчы пакой для прыняцця рашэння.

Пасля перапынку пастанавіў: рашэнне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 19 сакавіка пакінуць без зменаў, а прыватную скаргу Алены Шабуні – без задавальнення. Суд прыйшоў да высновы, што патрабаванні грамадзянска-працэсуальнага закону судом ніжэйшай інстанцыі былі выкананыя.

**18.05.2021** Пракуратура гораду Віцебску распачала крымінальную справу за публічную абразу пракурорскага работніка ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Гэтыя дзеянні кваліфікаваныя паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады»), паведамляе служба інфармацыі пракуратуры віцебскай вобласці.

Згодна з матэрыяламі справы, у лютым 2021 году ў адным з Telegram-чатаў з'явіўся пост з асабістымі дадзенымі пракурорскага работніка. Пазней пад пастом «неўстаноўленыя асобы размясцілі зневажальныя каментары на адрас пацярпелага».

«Супрацьпраўныя дзеянні ў гэтай частцы кваліфікаваныя паводле арт. 369 Крымінальнага кодэксу РБ. Пракурор накіраваў крымінальную справу для арганізацыі расследавання ва ўпраўленне следчага камітэту па Віцебскай вобласці», – паведамляецца.

**18.05.2021** 17 траўня ў Наваполацку былі затрыманыя каля 10 актывістаў, у тым ліку даверанная асоба Святланы Ціханоўскай на прэзідэнцкіх выбарах 2020 году Алена Радзькова і актывіст Артур Сінега. Паводле крыніцы, якая пацвердзіла факт затрымання, актывісты дагэтуль застаюцца пад вартай.

Паводле паведамленняў на інтэрнэт-каналах, Алену Радькову затрымалі раніцай, калі яна адводзіла дзіця ў садок. На якой падставе, невядома. Па непацверджанай інфармацыі, яе і Артура Сінегу этапавалі з Наваполацку ў Віцебскі СІЗА-2 і цягам 72 гадзін могуць выставіць абвінавачанне па арт. 342 КК.

Артур Сінега, па сведчаннях ягоных сяброў, якія спасылаюцца на маці затрыманага, мае праблемы са здароўем - ён хварэе на анкалогію.

Сярод затрыманых 17 траўня былі таксама сужэнцы Юлія і Аляксандр Шэлепні, актывісты Аляксандр Бондал, Яўген Іваноўскі. Прозвішчы астатніх удакладняюцца.

**19.05.2021** Суддзя Докшыцкага раённага суду Дзяніс Корсак 18 траўня спыніў адміністрацыйную справу журналіста-фрылансера з Глыбокага Змітра Лупача. Яго вінавацілі ў парушэнні Закона аб СМІ і хацелі прыцягнуць да адказнасці паводле арт. 23.5 КаАП («Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ»), паведамляе служба маніторынгу Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Падставай для складання пратаколу на Змітра Лупача стаў фельетон на YouTube-канале «Белсату» пад назвай «Леніна знайшлі загорнутым у цэлафан».

Пратакол на журналіста склаў маёр міліцыі Докшыцкага РАУС Андрэй Юргель.

Сведкам на судзе ў Лупача быў краязнаўца з Докшыцкага раёну Кастусь Шыталь, які быў героем фельетона. Кастусь сказаў, што запісвала яго жанчына, а не Зміцер Лупач. Другім сведкам павінна была быць журналістка-фрылансерка з Віцебску Алена Шабуня. Але яна на суд не з’явілася, бо знаходзілася за мяжой. Суддзя пастанавіў працягваць судовы працэс без яе прысутнасці.

Заслухаўшы паказанні сведкі, самога абвінавачанага і вывучыўшы справу, суддзя Дзяніс Корсак пасля дзесяціхвіліннага перапынку агучыў рашэнне спыніць справу праз недаказанасць віны.

Зміцер Лупач кажа, што быў здзіўлены і не чакаў такога выніку суду. Маўляў, падчас іншых працэсаў у дачыненні да яго здаралася, спадзяваўся на спыненне справаў, але зараз сапраўды не чакаў такога завяршэння. Меркаваў, што прызначаць штраф, і хваляваўся, што будуць яшчэ якія-небудзь наступствы.



Падтрымаць Змітра Лупача прыехалі яго калегі-журналісты з Глыбокага, а таксама докшыцкія грамадскія актывісты. Але на судовы працэс пусцілі не ўсіх – толькі чатырох чалавек, хоць, як казалі жыхары Докшыц, раней у залу суду пускалі пяць чалавек. Як паведаміла прысутным сакратар судовага пасяджэння, пусцяць чатырох, бо слуханне справы будзе адбывацца ў меншай зале.

Зміцер падзякаваў усім за падтрымку і салідарнасць, якія вельмі важныя ў такі няпросты час.

Наперадзе глыбоцкага журналіста чакае яшчэ адзін суд – 25 траўня ў Браславе. Яго зноў будуць судзіць за фельетон.

Да таго ж увечары 18 траўня маёр міліцыі Сяргей Цырбан выклікаў Змітра Лупача ў Глыбоцкі РАУС. Падставай выкліку таксама стаў фельетон журналіста. У выніку міліцыянты склалі чарговы пратакол паводле арт. 23.5 КаАП.

**20.05.2021** 20 траўня з ізалятару часовага ўтрымання ў Віцебску вызвалілі Алену Радзькову, Наталлю Рэфенкулаву, Аляксандра Шэлепня. Яны былі затрыманыя ў Полацку і Наваполацку на 72 гадзіны як падазраваныя ў крымінальнай справе па арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці») і этапаваныя ў Віцебск. Пазней на волю павінен быў выйсці Артур Сінега.

«Здароўе нармальнае, але маральны стан, канечне, нядобры. Спачатку сядзелі ўдвух з жанчынай, потым я адна... Вадзілі заўсёды ў наручніках.

Туды прывезлі ў наручніках, калі выводзілі таксама надзелі, і так – аж да выхаду», – расказала па вызваленні актывістка з Наваполацку Алена Радзькова.

Паводле яе, з Наваполацку іх этапавалі ў СІЗА-2 Віцебску з той прычыны, што ні ў Полацку, ні ў Наваполацку не было свабодных месцаў у камерах. Прынамсі так ёй патлумачыў адзін з міліцыянтаў.

Алена Радзькова распавяла, што яе затрымалі ранкам, калі вярталася з дзіцячага садку – адвозіла туды дзіця. Завезлі ў міліцэйскі пастарунак, а адтуль – наператрус у кватэру, дзе жыве Алена. Шукалі балончыкі і забароненыя рэчывы. Потым быў допыт у следчым камітэце, дзе ёй паведамілі, што яна затрыманая на 72 гадзіны як падазраваная. А пасля – цесны «стакан» у аддзяленні міліцыі і этап у Віцебск.

Праз міліцыю, ператрус, СК, следчы камітэт і віцебскі ІЧУ прайшлі амаль усе затрыманыя ў Полацку і Наваполацку 17 траўня.

«Калі дапытваў следчы, я сказала, што нічога такога не рабіла. Я салідны чалавек, ужо ва ўзросце, і што – мне распісваць вашыя гэтыя двары?



Я проста хачу разумець і ведаць што адбываецца ў краіне, таму я лезла ўсюды, я чытала ўсё, каб у галаве ўклалася, што здарылася ў краіне пасля 9 жніўня», – кажа палачанка Наталля Рэфенкулава, якую таксама вызвалілі 20 траўня ў Віцебску.

Паводле жанчыны, калі вызвалялі з ІЧУ, ім ніхто не паведаміў, ці будзе ў іх які суд і ў якім статусе яны наагул знаходзяцца.

Паводле неправеранай інфармацыі, навапалачанку Юлію Шэлепень – жонку вызваленага 20 траўня Аляксандра Шэлепня, пакінулі ў ізалятары часовага ўтрымання яшчэ на трое сутак.

Стала таксама вядома, што актывісты Аляксандр Бондал і Яўген Іваноўскі знаходзяцца на волі. Іх утрымлівалі ў наваполацкім ізалятары і вызвалілі да суду

**21.05.2021** 21 траўня з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ) выйшла на волю 23-гадовая Лізавета Кірыенка, якая працуе выхавальніцай у дзіцячым садку. Лізавету павінны былі вызваліць яшчэ 6 траўня, але незадоўга да заканчэння тэрміну на яе завялі новую адміністрацыйную справу – суд дадаў ёй яшчэ 15 сутак арышту. Агулам за кратамі яна правяла 25 дзён.

Лізавету Кірыенка затрымалі разам з яе сяброўкай Марыяй Амасовіч 26 красавіка. Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску палічыў дзве лампадкі, запаленыя каля храму ў памяць аб чарнобыльскай трагедыі, несанкцыянаваным масавым мерапрыемствам (арт. 24.23 КаАП). Суддзя Уладзімір Царыкаў прысудзіў дзяўчат да 10 і 20 сутак адміністрацыйнага арышту.

Пазней супрацоўнікі МУС знайшлі ў тэлефоне Лізаветы, які быў канфіскаваны падчас вобшуку, фотаздымак, на якім трое дзяўчат – Марыя Амасовіч, Лізавета Кірыенка і Марыя Агіевіч – трымалі пад Кіраўскім мостам у Віцебску бел-чырвона-белы сцяг. Зноў пратакол паводле арт. 24.23 КаАП – і судовае пакаранне на 15 сутак арышту.

Спецумовы для «палітычных»
У віцебскім ізалятары дзяўчыны знаходзіліся ў адной камеры.

«Для нас наагул нейкія спецумовы рабілі. Усе сядзелі на матрацах, як людзі, а мы – на жалезных прутах увесь час, бо матрацы ў нас забіралі. Толькі нанач выдавалі. Дарэчы, уначы начное святло не ўключалі – пастаянна свяціў яркі свет. Тым, хто паліць, не давалі цыгарэт», – расказала Лізавета Кірыенка па вызваленні.

Па словах дзяўчыны, за ўвесь тэрмін адміністрацыйнага арышту іх ні разу не адвялі на шпацыр. Таксама праблемай было атрымаць перадачы ад сваякоў.

«Сказалі, што можна толькі рэчы першай неабходнасці. Ежу наагул не бралі, маўляў, нельга праз каронавірус», – тлумачыць Лізавета.



У камеру прыходзіў пракурор
На «асаблівыя» умовы ўтрымання ў віцебскім ІЧУ для палітычных затрыманых напісала скаргу маці віцяблянкі Ангеліны Туравец, якая адбывае 20 сутак арышту за «няправільную» маску з бел-чырвона-белай усмешкай.

«З нагоды скаргі мамы Ангеліны прыходзіў пракурор з праверкай. Пахадзіў, паглядзеў, нібыта пагадзіўся з усім. І – ніякага выніку!» – расказала Лізавета Кірыенка.

Лізавету выклікаюць у СК

Па словах яе маці Святланы, пакуль Лізавета сядзела ў ізалятары, на яе імя прыйшла позва са следчага камітэту. Лізу выклікаюць у якасці падазраванай па крымінальнай справе, распачатай паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці»). Мама Лізаветы мяркуе, што супрацоўнікі міліцыі зноў нешта знайшлі ў тэлефоне яе дачкі. На допыт дзяўчыну выклікалі на 24 траўня.

У Віцебску Лізавета Кірыенка працуе выхавальніцай у адным з дзіцячых садкоў, завочна вучыцца на гісторыка ва ўніверсітэце. На кватэры, якую яна здымае ў Віцебску, напрыканцы красавіка прайшоўператрус.

**21.05.2021** У Віцебску распачалі крымінальную справу за зняважлівы каментар у сацыяльных сетках на адрас Аляксандра Лукашэнкі (арт. 368 КК). Яго нібыта зрабіў 39-гадовы жыхар абласнога цэнтру. Мужчыне пагражае да двух гадоў пазбаўлення волі, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкаму.

«На віцябляніна выйшлі аператыўнікі 7-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК МУС.

Праваахоўнікі высветлілі, што мужчына пакінуў абразлівы каментар на адрас прэзідэнта, выкарыстоўваючы свой уліковы запіс у адной з сацыяльных сетак», – гаворыцца ў паведамленні. Якія словы былі ўжытыя ў каментары, не ўдакладняецца.

Сцвярджаецца, што падазраваны раскаяўся ва ўчыненым і патлумачыў, што напісаў зняважлівы каментар пад уплывам эмоцый.

У дачыненні віцябляніна распачатая крымінальная справа па арт. 368 КК, якая прадугледжвае максімальнае пакаранне да 2 гадоў пазбаўлення волі.

Нагадаем, у лютым за абразу Лукашэнкі на 1 год і тры месяцы зняволення быў пакараны аршанец Уладзімір Шынкевіч (суд быў закрытым), якога прызналі палітвязнем. Па гэтым жа артыкуле ў закрытым судзе жыхара Полацкага раёну Яўгена Люцкага (яму інкрымінавалі тры артыкулы), асудзілі на 5 гадоў калоніі. Ён таксама мае статус палітзняволенага.

Па стане на 21 траўня ў Беларусі прызнаныя палітычнымі вязнямі 404 чалавекі.



**22.05.2021** Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3306 скаргу журналіста Змітра Лупача з Глыбокага. Журналіст настойвае на тым, што беларуская дзяржава парушыла патрабаванне арт. 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах – то бок крытычна абмежавала яму магчымасці свабодна выказваць прафесійнае меркаванне.

Пастановай суду Глыбоцкага раёну ад 22 снежня 2018 году журналіст Зміцер Лупач быў прызнаны вінаватым ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння, што выявілася ў незаконным вырабе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі. За гэта быў аштрафаваны на 612 рублёў 50 капеек.

Па скарзе журналіста законнасць і абгрунтаванасць пастановы суду Глыбоцкага раёну праверыў Віцебскі абласны суд, але не знайшоў парушэнняў закону і пакінуў рашэнне райсуду без зменаў, а скаргу Лупача – без задавальнення.

Справядліва палічыўшы, што наступнае абскарджанне рашэння Глыбоцкага суду ў старшыні Віцебскага абласнога суда, а таксама Старшыні Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь не прывядзе да аднаўлення парушаных правоў, журналіст спыніў перапіску з беларускімі судамі.

У органы пракуратуры Лупач не звяртаўся, бо якасць пракурорскага нагляду ў Беларусі не адпавядае міжнародным стандартам праз сваю перадузятасць і аднабаковы абвінаваўчы падыход пры разглядзе адміністрацыйных спраў з палітычным падтэкстам.

Беларуская дзяржава са свайго боку лічыць, што журналіст не прайшоў усе абавязковыя працэдуры абароны сваіх правоў на нацыянальным узроўні. Таму раіць Камітэту не разглядаць зварот Змітра Лупача. Сам жа факт звароту беларускага грамадзяніна ў міжнародны праваабарончы орган ўрад расцэньвае як злоўжыванне правам.

«Лічым, што права Змітра Лупача на свабоднае выказванне думкі ў адпаведнасці з артыкулам 19 Пакта парушанае не было. Пунктам 1 артыкулу 29 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ўстаноўлена, што кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы. У сілу часткі 2 артыкулу 23 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

Устаноўлены Законам Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З «Аб сродках масавай інфармацыі» парадак ажыццяўлення дзейнасці журналістаў сродкаў масавай інфармацыі не можа разглядацца як абмежаванне права на свабоднае выказванне меркавання ў сэнсе пункту 3 артыкулу 19 Пакта», – выстаўляюць свае аргументы Камітэту беларускія чыноўнікі.

Але такое тлумачэнне для КПЧ не стала вызначальным. Таму паведамленне журналіста Лупача было зарэгістраванае і, паводле працэдуры, будзе разгледжанае ў бліжэйшы час.

**23.05.2021** Праваахоўныя органы не змаглі знайсці вінаватых у з'яўленні пакаяннага відэазвароту актывіста з Віцебску Алега Баразны на тэлеграм-канале «Наши сливы». Пра адмоўны вынік сваіх намаганняў яны паведамілі праваабаронцу Паўлу Левінаву.

Гэтая скандальная следчая гісторыя пачалася з таго, як 15 красавіка 2021 году на тэлеграм-канале «Нашыи сливы» быў размешчаны відэаролік. На ім бачна, як віцебскі актывіст Алег Баразна, які знаходзіцца ад 9 лютага 2021 году у СІЗА №2 Віцебску, распавядае пра сваю дзейнасць у межах мінулай выбарчай кампаніі. Пры гэтым - выдае дадзеныя папярэдняга расследавання.

Днём пазней гэты самы відэаролік быў размешчаны на YouTube-канале «Жулики Беларусі».

На думку праваабаронцы, следствам быў парушаны артыкул 198 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу РБ, які не дапускае выдавання дадзеных папярэдняга расследавання без дазволу следчага.

Намеснік начальніка ўпраўлення СК па Віцебскай вобласці палкоўнік юстыцыі Андрэй Гушча паведаміў Паўлу Левінаву, што ўстанавіць, кім выраблены і размешчаны ў Інтэрнэце відэазапіс, не ўяўляецца магчымым.

На думку Гушчы, відэазапіс не ўтрымлівае якіх-небудзь дадзеных папярэдняга следства, разгалошванне якіх супярэчыць інтарэсам папярэдняга расследавання, а таксама дадзеных, звязаных з парушэннем правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу.

Намеснік пракурора Віцебскай вобласці старшы саветнік юстыцыі Уладзімір Гук не стаў разглядаць заяву праваабаронцы аб парушэнні следствам правоў Алега Баразны па сутнасці, спаслаўшыся на тое, што крымінальна-працэсуальным законам не прадугледжаная электронная форма падачы такога роду скаргаў трэцяй асобай на карысць ўдзельніка крымінальнага працэсу.

Павел Левінаў катэгарычна не згадзіўся з пазіцыяй высокіх службовых асобаў абласнога УСК і пракуратуры.

«Каб выявіць, кім, калі і дзе выраблены відэазапіс, трэба ўсяго толькі апытаць Алега Баразну, а затым па ланцужку апытанняў ўсталяваць таго, хто відэазапіс размясціў  у публічным доступе.

Не трэба шмат высілкаў, каб ўсталяваць і службовую асобу – гаспадара кабінета, у якім гэты відэазапіс быў праведзены, і апытаць яго», - падказвае Левінаў праваахоўнікам просты алгарытм пошуку вінаватых у парушэнні дзейнага крымінальнага заканадаўства.

**24.05.2021** 24 траўня ў судзе Віцебскага раёну мусілі працягнуцца слуханні ў справе жыхаркі пасёлку Ноўка Віцебскага раёну Таццяны Туравец, абвінавачанай паводле артыкулу 364 КК («Гвалт або пагроза ўчынення гвалту да супрацоўнікаў МУС»). Аднак праз 5 хвілін пасля пачатку паседжання ў працэсе абвясцілі чарговы перапынак.

Інтарэсы Таццяны Туравец на судовае паседжанне 24 траўня прыйшла бараніць іншая адвакатка. Абаронца, якая прадстаўляла інтарэсы Туравец ад самага пачатку, адсутнічала ў сувязі з удзелам у іншым судовым працэсе.

На замену абаронцы Туравец не пагадзілася і хадайнічала перад судом аб пераносе паседжання на іншы час. Выказала жаданне працягнуць працэс з удзелам сваёй адвакаткі, з якой у яе заключаная пісьмовая дамова на адвакацкія паслугі.

Удзельнікі працэсу не пярэчылі, суддзя Наталля Траццякова хадайніцтва Таццяны Туравец задаволіла.



Наступны судовы працэс па справе мусіць адбыцца 26 траўня (пачатак у 10.30).

Нагадаем, у якасці абвінаваўцы ў працэсе выступае пракурор Мікіта Раманоўскі.

Таццяну Туравец абвінавачваюць у тым, што ў лютым 2021 году яна нібыта перашкаджала міліцыянтам рабіць начныператрус у яе доме. Чыніла ім супраціў, а калі супрацоўнікі Віцебскага РАУС хацелі гвалтам надзець на яе кайданкі – пакусала міліцыянтаў. Жанчыне пагражае да 6 гадоў пазбаўлення волі.

**25.05.2021** 25 траўня Віцебскі абласны суд разгледзеў апеляцыйную скаргу палітвязня Уладзіміра Малахоўскага, асуджанага судом Першамайскага раёну Віцебску на тры з паловай гады зняволення. Калегія па крымінальных справах аблсуду пад старшынствам суддзі Галіны Урбановіч скаргу не задаволіла і прысуд не змяніла.

Хворы на анкалогію 54-гадовы Уладзімір Малахоўскі быў асуджаны 1 сакавіка 2021 года да трох з паловай гадоў калоніі агульнага рэжыму. Суддзя Таццяна Родзіна прызнала яго вінаватым у гвалтоўных дзеяннях у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі (арт. 364 КК). Сваёй віны мужчына не прызнаў

У сваёй апеляцыі Малахоўскі адзначыў, што вынесены прысуд не адпавядае акалічнасцям справы: гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў унутраных спраў ён не чыніў і гвалтам ім не пагражаў. Выказаў меркаванне, што міліцыянты яго агаварылі, бо «парушылі службовыя інструкцыі і збілі яго»

Уладзімір Малахоўскі лічыць, «што судом не ўстаноўлены факт ужывання гвалту ў дачыненні пацярпелых, што суду не было пададзена бясспрэчных і дакладных доказаў, якія аспрэчваюць яго сцверджанне пра неўчыненне злачынства, прадугледжанага арт. 364 КК»

Прасіў прысуд у дачыненні да яго адмяніць і спыніць судаводства ў крымінальнай справе праз адсутнасць складу злачынства

Адвакатка таксама звярнула ўвагу судовай калегіі на тое, што ўсе абвінавачванні будаваліся выключна на падставе супярэчлівых паказанняў супрацоўнікаў міліцыі і што відэа, якія маюцца ў матэрыялах справы, пацвярджаюць паказанні яе падабароннага. Таксама адвакатка падкрэсліла, што Уладзімір Малахоўскі пры затрыманні быў моцна збіты, яму зламалі палец

Аднак аргументы абаронцы не пераканалі калегію. Суддзя Галіна Урбановіч пакінула вырак суду Першамайскага раёну Віцебску «без зменаў, а апеляцыйную скаргу абвінавачанага Малахоўскага – без задавальнення»

Жонка Уладзіміра Малахоўскага Ірына, якая прысутнічала на разглядзе скаргі, не здзіўленая такім рашэннем

«Хацелася б, канечне, верыць у лепшае, але ўсё адбылося як заўсёды. У такіх, як мой муж, усё тое ж самае: прысуд пакінуць у сіле. Яны робяць як ім выгадна», – пракаментавала рашэнне абласнога суду жанчына

Уладзімір Малахоўскі плануе абскардзіць гэтае рашэнне ў Вярхоўным судзе

Пасля разгляду скаргі жонка Малахоўскага напісала заяву з просьбай даць спатканне з мужам. Суд просьбу задаволіў. Спатканне мае адбыцца 26 траўня.

**25.05.2021** Магілёўскі абласны суд абвясціў прысуд семярым палітвязням, якіх абвінавацілі ў арганізацыі масавых беспарадкаў. Самыя суровыя пакаранні прысудзілі актывістам кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўгену Афнагелю, Андрэю Войнічу і сустаршыні Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі Паўлу Севярынцу – па 7 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, паведамляе Беларускае Радыё Рацыя.

Рашэнне аб пакаранні прыняла суддзя Ірына Ланчава. Суд праходзіў у закрытым рэжыме. На абвяшчэнне прысуду пусцілі толькі найбліжэйшых сваякоў.

Павел Севярынец амаль год правёў за кратамі: яго затрымалі летась 7 чэрвеня пасля выступаў на пікетах падчас мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Бацька вядомага палітыка паэт Канстанцін Севярынец гэтак пракаментаваў прысуд сыну і іншым актывістам:

«Павел правільна сказаў: «Суду не было». Гэта маразм і параноя! Вось і ўсё! Суду не было! Суд будзе ў вольнай Беларусі, і кожны атрымае па справах сваіх. Узмоцнены рэжым – гэта даюць маньякам, забойцам. І ўвогуле гэта ўсё зроблена не дзеля Паўла: гэта робіцца дзеля ўсіх астатніх – каб напужаць».

«Стаім у праўдзе, сынок. Нас не зламаць!» – напісаў Канстанцін Севярынец на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.

Актывістам «Еўрапейскай Беларусі» Паўлу Юхневічу і Максіму Вінярскаму суддзя Ірына Ланчава прысудзіла па 5 гадоў калоніі агульнага рэжыму, столькі ж – аршанскаму відэаблогеру Дзмітрыю Казлову. Вырак актывістцы Ірыне Шчаснай – 4 гады агульнага рэжыму.

Усе падсудныя трымаліся годна: апладысментамі сустракалі сваіх блізкіх і сваякоў, якія заходзілі ў судовую залю, а пасля абвяшчэння прысудаў разам скандавалі «Беларусь будзе вольнай» і «Верым! Можам! Пераможам!»

**25.05.2021** На Віцебшчыне працягваецца крымінальнае «паляванне» і несправядлівыя судовыя пакаранні грамадзян за абразу, работнікаў міліцыі і кіраўніка дзяржавы, распаўсюджаныя ў сацыяльных сетках. 24 траўня, пракуратура Аршанскага раёна падтрымала ў судзе дзяржаўнае

абвінавачанне па крымінальнай справе ў дачыненні да жыхара Воршы, які, на думку следства, публічна абразіў прадстаўніка ўлады.

Падчас судовага следства было ўстаноўлена, што 30 верасня 2020 году, 42-гадовы жыхар Воршы, знаходзячыся ў сябе дома, з дапамогай мабільнага тэлефона са свайго ўліковага запісу размясціў у сацыяльнай сетцы абразлівы каментар у дачыненні да начальніка Дзяржынскага РАУС у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў.

З улікам пададзеных дзяржабвінаваўцам доказаў суд Аршанскага раёну і Воршы пастанавіў

абвінаваўчы прысуд. На падставе арт.369 КК мужчыну прызначылі пакаранне ў выглядзе арышту на тры месяцы. Прысуд набудзе законную сілу праз 10 дзён, у выпадку яго абскарджання ў Віцебскім абласным судзе.

Між тым, у Віцебску, 20 траўня праваахоўнікі затрымалі мясцовага жыхара, які нібыта пакінуў абразлівы каментар у сацыяльнай сетцы на адрас Аляксандра Лукашэнкі.

На 39-гадовага жыхара Віцебска выйшлі аператыўнікі 7-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК МУС. Як лічаць праваахоўнікі, мужчына пакінуў зняважлівы каментар на адрас кіраўніка дзяржавы, выкарыстоўваючы свой уліковы запіс у адной з сацыяльных сетак. Пазней сам падазраваны распавёў, што свае допісы ён рабіў паддаўшыся эмоцыям, ужо раскайваецца ва ўчыненым.

За злачынства паводле ч.1 артыкулу 368 КК РБ прадугледжваецца максімальнае пакаранне да двух гадоў пазбаўлення волі.

«Калі гаворка ідзе пра паклёп і абразу, то неабходна спалучаць гэтыя дзеянні з правам на свабоду слова і правам выказвання меркавання. Усё ўпіраецца ў форму (прыстойная або непрыстойная), з дапамогай якой грамадзяне даюць ацэнку працы палітыкаў і дзяржаўных службоўцаў. Але прыцягваць за гэта грамадзян да крымінальнай адказнасці азначае даваць нейкую асаблівую абарону службовым асобам, што заведама спараджае іх несправядлівую перавагу над астатнімі грамадзянамі. Гэта нецывілізаваны і антыдэмакратычны падыход да ўстанаўлення грамадскіх стасункаў. Таму варта прыбраць з крымінальнага заканадаўства пакаранні за абразу і паклёп ды перавесці іх у грамадзянскае справаводства», - лічыць праваабаронца Леанід Свецік.

**26.05.2021** 26 траўня ў судзе Віцебскага раёну скончылася судовае следства і адбыліся спрэчкі ў справе выхавальніцы дзіцячага садку Таццяны Туравец, якую вінавацяць паводле арт. 364 КК у гвалце і пагрозе гвалтам у дачыненні да супрацоўнікаў МУС. Пракурор Мікіта Рамаоўскі запатрабаваў для Туравец тры гады калоніі, адвакатка ж прасіла апраўдаць сваю падабаронную. Прысуд агучаць 28 траўня.

Пальчатка міліцыянта Старчанкі
На пачатку судовага паседжання ўдзельнікі працэсу азнаёміліся з вынікамі прызначанай раней таваразнаўчай экспертызы. Згодна з ёй, знос пальчатак склаў 60%, а рэшткавы кошт – 16 рублёў 15 капеек.

Адвакатка Таццяны Туравец заявіла хадайніцтва аб правядзенні крыміналістычнай экспертызы для вызначэння механізму пашкоджання скураных пальчатак пацярпелага міліцыянта Старчанкі. Але суддзя Наталля Траццякова хадайніцтва адхіліла. Сваё рашэнне патлумачыла даверам да словаў міліцыянта, які сведчыў, што да візіту ў дом Туравец пальчаткі ніякіх пашкоджанняў не мелі.

Адхіліў суд і другое хадайніцтва абаронцы. Адвакатка прасіла правесці следчы эксперымент, каб высветліць, ці магчыма было пракусіць пальчатку ў тым месцы, дзе выявілі пашкоджанне. Нагадала пры гэтым, што папярэдняя следчая экспертыза не знайшла на пальчатках слядоў сліны, разрыў здарыўся па шве, а след ад зубоў не выяўлены.

Пракурор Раманоўскі: прызнаць вінаватай

Спрэчкі бакоў пачаліся з выступу пракурора Мікіты Раманоўскага.

Пазіцыя абвінавачвання не змянілася: аказала супраціў, перашкаджала ўваходу ў дом для правядзення вобшуку, нанесла пабоі і пашкоджанні цела міліцыянтам. Прычыніла матэрыяльную шкоду пацярпеламу Старчанку на суму 16 рублёў 15 капеек.

Пракурор прасіў суд прызнаць Таццяну Туравец вінаватай паводле інкрымінаванага ёй злачынства і прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на тры гады з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Меру ўтрымання пад падпіскай прасіў замяніць заключэннем пад варту.

Адвакатка просіць апраўдаць Туравец
Адвакатка Таццяны Туравец рабіла акцэнт на недакладнасцях і супярэчнасцях, якія маюцца ў матэрыялах справы. Зняпраўдзіла шэраг спрэчных момантаў з боку абвінавачання, якія не знайшлі свайго неабвержнага пацверджання ў часе судовага следства. Зазначыла, што Туравец не давярала людзям, якія ўвайшлі ў тую ноч у яе дом, не разумела, што перад ёй знаходзяцца супрацоўнікі міліцыі.

З улікам тагачаснага псіхічнага стану Туравец і ацэнкі той сітуацыі адвакатка палічыла, што ў дзеяннях яе падабароннай адсутнічае склад злачынства, якое ёй інкрымінуецца, і папрасіла суд у дачыненні да грамадзянкі Туравец вынесці апраўдальны прысуд.

Таццяна Туравец: Я лічу сябе пацярпелай
Апошняе слова Таццяны Туравец было працяглым і эмацыйным. Вінаватай яна сябе не прызнала.

«Шчыра кажучы, у гэтай сітуацыі я лічу сябе пацярпелай. Я лічу сябе пацярпелай, таму што супрацоўнікі міліцыі, якія прыйшлі да мяне ў той вечар з вобшукам, мусілі б патлумачыць, чаго яны ад мяне хочуць, што яны мусяць зрабіць, якімі матывамі кіруюцца, а насамрэч – справакавалі ўсю гэтую сітуацыю. Сітуацыю, у якой прычынілі мне маральную, матэрыяльную і фізічную шкоду. І цяпер мае далейшае жыццё пад вялікім пытаннем. Шчыра магу сказаць, што ў мяне не было жадання прычыняць шкоду супрацоўнікам міліцыі», – сказала Таццяна Туравец.

Прысуд абвесцяць 28 траўня ў 14.30.

**27.05.2021** Марыю Волкаву з ініцыятывы пракуратуры перасуджваюць па справе «начнога пікетавання» у вёсцы Лучынаўка Віцебскага раёну. Па завяршэнні судовага паседжання 27 траўня на выхадзе з будынку суду Віцебскага раёну Волкава была затрыманая чалавекам, які назваўся следчым СК.

З якой нагоды затрымлівае дзяўчыну – не паведаміў. У СК Марыя Волкава паехала разам з адвакатам.

27 траўня суд Віцебскага раёну пачаў паўторна разбіраць адміністрацыйную справу Марыі Волкавай і Андрэя Кулакова, якіх вінавацілі ў тым, што 26 верасня яны нанеслі «разнастайныя надпісы і сімвалы» на сцяне ў вёсцы Лучынаўка Віцебскага раёну (на той час – паводле арт. 23.34 КаАП). 27 кастрычніка суд прызнаў Волкаву вінаватай і аштрафаваў на 15 базавых велічынь (справу ў дачыненні Кулакова спынілі). Але праз 8 месяцаў пасля суду пракуратура апратэставала тое рашэнне і накіравала справу на новы разгляд.

Справу разбірае суддзя Таццяна Лабацкая. Марыя Волкава і Андрэй Кулакоў, які ўдзельнічае ў працэсе праз скайп, віны не прызналі. Пасля апытання аднаго са сведкаў-міліцыянтаў суддзя пастанавіла накіраваць справу на дапрацоўку ў міліцыю.



По завяршэнні судовага паседжання да Марыі Волкавай падышоў мужчына ў штацкім адзенні, прад'явіў пасведчанне следчага СК і папрасіў дзяўчыну праехаць разам з ім. На пытанне адвакаткі, з якой нагоды той патрабуе «праехацца», супрацоўнік адказаў: «Там даведаецеся». Волкава знаходзіцца ў СК разам з адвакаткай.

Праз паўтары гадзіны пасля затрымання Марыя на сувязь не выходзіць.

У 17.50 стала вядома, што Марыю Волкаву адпусцілі са следчага камітэту, але яна пакуль не на сувязі.

Стала вядома, што з Марыяй усё добра, але дзяліцца інфармацыяй яна не можа: дала падпіску аб неразгалошванні.

**27.05.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску прысудзіў адзін год «хіміі» жыхарцы абласнога цэнтру за абразу міліцыянта ў сетцы інтэрнэт. Судом устаноўлена, што на пачатку кастрычніка 2020 году жанчына, знаходзячыся ў Віцебску, абразіла прадстаўніку ўлады. Ім аказаўся міліцыянт - кіроўца роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі АУС адміністрацыі Першамайскага раёну.

На фоне масавых пратэстаў абвінавачаная публічна размясціла каментар, у якім змяшчалася выказанае ў непрыстойнай форме знявага на адрас пацярпелага. У тэксце каментара, на думку работніка міліцыі, прысутнічала негатыўная ацэнка ягонай асобы. Каментар гэты нібыта прынізіў ягоны аўтарытэт, гонар і годнасць.

Жанчына прызнала сваю віну, чыстасардэчна раскаялася, публічна прынесла прабачэнне міліцыянту, пагадзілася на добраахвотную ліквідацыю шкоды.

У выніку жанчыну прызналі вінаватай у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе арт.369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады) суд прызначыў ёй пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на адзін год. Пры уступленні прысуду ў законную сілу яна будзе накіраваная ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Акрамя таго, судом была ўжытая спецыяльная канфіскацыя ў даход дзяржавы мабільнага тэлефона жанчыны як сродка ўчынення злачынства.

«На мой погляд, гэтае пакаранне занадта суровае і непрапарцыйнае ўчыненаму. Незразумела, чым кіравалася суддзя, прымаючы такое рашэнне. Жанчына прызнала віну, прынесла прабачэнні і добраахвотна кампенсавала шкоду. Да таго ж дзяржава канфіскавала тэлефон! То бок былі ўсе падставы, каб змягчыць прысуд. Тым больш, што ў артыкуле 369 закладзеныя менш суровыя меры пакарання.

Гэта і грамадскія або папраўчыя працы, і штраф», - пракаментаваў сітуацыю праваабаронца Леанід Свецік.



**27.05.2021** Жонка палітвязня Уладзіміра Малахоўскага, хворага на анкалогію, Ірына пабывала 26 траўня на спатканні з мужам у следчым ізалятары ў Віцебску. Уладзіміра яна не бачыла каля месяца. Напярэдадні Віцебскі абласны суд разгледзеў яго апеляцыйную скаргу і адмовіў у задавальненні. Прысуд у дачыненні Малахоўскага – тры з паловай гады калоніі – набыў законную моц.

Адразу пасля спаткання, якое доўжылася амаль 2 гадзіны і праходзіла ў віцебскім СІЗА-2, жонка палітвязня падзялілася сваімі эмоцыямі і думкамі.

«Як мяне ўбачыў, узрадаваўся, заўсміхаўся. Але вельмі бледны, на свежае паветра іх мала выводзяць. У камеры ўвесь час паляць, і ад гэтага нікуды не дзенешся. Рэчы цёплыя яго забрала, яны ўсе прапахлі цыгарэтным дымам. Ён працягвае кашляць, я яму купіла інгалятар», – расказвае Ірына.

Адмаўляюць у аперацыі на пальцы
Паводле яе слоў, за месяц, які яна не бачыла мужа, Уладзімір змяніўся і выглядае больш бледным. Зламаны пры затрыманні палец так і не стаў на месца – патрэбная аперацыя.

«Гэты палец наагул вывернуты ў іншы бок, таму трэба аперацыя. Калі Валодзю ўжо вялі ў аўтазак са зламаным пальцам, і ў аўтазаку, дык ён папярэджваў міліцыянта, каб быў асцярожны, бо ў яго зламаны палец. Але супрацоўнік, наадварот, схапіўся за гэты палец і вывернуў яго. Тады менавіта муж страціў прытомнасць», – успамінае жонка палітвязня.

Яна кажа, што, адміністрацыя ізалятару і начальнік медычнай часткі адмаўляюць Уладзіміру ў правядзенні аперацыі. «Маўляў, аперацыю рабіць не будзем, таму што «палец – не жыццёва важны орган», то бок з гэтым можна жыць», – абураецца Ірына.

«Прыкавалі ланцугом да кратаў»
Распавяла, што, як і на мінулым спатканні, Уладзіміра падчас размовы трымалі прыкутым ланцугом. «Ад наручнікаў на руках у яго глыбокія сляды, прышпілілі ланцугом да арматуры, да кратаў. Праз шкло па тэлефоне дужа не пагаворыш, там усё трашчыць», – кажа.

Уладзімір расказаў жонцы, што ў яго камеры сядзяць людзі па розных крымінальных артыкулах, стасункі паміж сукамернікамі сяброўскія: «Сказаў, што ўсе адзін аднаго падтрымліваюць. Што ні з кім там не сварыцца і да яго ніхто не чапляецца».

Палітвязень паведаміў, што на шпацыр выводзяць іх рэдка, даводзіцца ўвесь час знаходзіцца ў цеснай і душнай камеры: «Сядзіць, глядзіць у столь, часам у вакно прабіваецца сонца.

Ён вельмі рады, калі з'яўляецца сонца. А так – разгадвае крыжаванкі. Класціся на «шконкі» не даюць днём. Не дазволена».

Ірына кажа, што Уладзімір вельмі моцна сумуе па дзецях.

Куды этапуюць – не паведамляюць

Жанчына перажывае, што наступнае спатканне з мужам можа адбыцца няхутка, ужо толькі па этапаванні ў калонію. Але куды і калі яго адвязуць – няма інфармацыі. «Яму нічога не гавораць, хаця сукамернікам ужо паведамілі, хто куды едзе, у які горад, а мужу нічога не кажуць – ён нічога не ведае».

Рашэнне абласнога суду аб незадавальненні апеляцыйнай скаргі не стала для Уладзіміра нечаканасцю: «Ад суду ён чакаў тое ж самае, што і я. Чаго ад іх чакаць? Справядлівага рашэння не было і быць не магло», – падсумоўвае Ірына.

Тым не менш, Уладзімір Малахоўскі паспрабуе скарыстацца апошнім шанцам і абскардзіць пастанову Віцебскага аблсуду ў Вярхоўным судзе.

**28.05.2021** 28 траўня суд Віцебскага раёну вынес абвінаваўчы прысуд у дачыненні да выхавальніцы ў дзіцячым садку Таццяны Туравец. Суддзя Наталля Траццякова прызнала жанчыну вінаватай паводле арт. 364 КК («Гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў») і пакарала трыма гадамі абмежавання волі («хімія»). На абвяшчэнне прысуду Туравец, якая знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе, не прыйшла.

Суд пастанавіў таксама спагнаць з Таццяны Туравец на карысць пацярпелага міліцыянта Аляксея Старчанкі ў кошт кампенсацыі маёмаснай шкоды за нібыта пракушаную пальчатку 16 рублёў 15 капеек. У даход дзяржавы ў якасці пошліны – 58 рублёў і працэсуальныя выдаткі – 128 рублёў 24 капейкі.

Маёмасць Туравец – мабільнік, тэлевізар і пральную машынку LG – суд пакінуў пад арыштам да выплаты накладзенага спагнання.

Працэс над Таццянай Туравец пачаўся 3 траўня. Для прыняцця рашэння суду спатрэбілася шэсць паседжанняў. Паводле абвінавачвання, у ноч з 9 на 10 лютага Туравец перашкаджала міліцыянтам праводзіць санкцыянаваны пракурорам ператрус, чыніла супраціў, пагражала фізічнай расправай, абражала. А пры затрыманні – укусіла міліцыянтаў за пальцы, аднаго з іх ударыла нагой.

Сваёй віны 50-гадовая Таццяна Туравец не прызнала і ў апошнім слове заявіла, што лічыць сябе пацярпелай. У жанчыны былі выяўленыя пашкоджанні сухажылляў пляча, з гэтай прычыны яна лячылася.

Нагадаем, што дзяржабвінаваўца Мікіта Раманоўскі прасіў для жанчыны 3 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Але суддзя Наталля Траццякова вынесла іншае рашэнне: тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Да набыцця прысудам законнай моцы Таццяна Туравец будзе знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе.

На абвяшчэнні прысуду Таццяна Туравец адсутнічала.

**29.05.2021** 29 траўня ў Віцебску на волю выйшла актывістка Ангеліна Туравец. За маску з бел-чырвона-белым прынтам дзяўчына правяла 20 сутак у віцебскім ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). Арыштам яе пакарала суддзя Алена Цыганкова, якая палічыла з'яўленне Ангеліны ў БЧБ-масцы 9 траўня ў цэнтры гораду несанкцыянаваным пікетаваннем (арт. 24.23 КаАП).




Ангеліну Туравец затрымалі 9 траўня на плошчы Перамогі ў Віцебску разам з сябрам – яны прыйшлі паглядзець на парад Перамогі. Хлопца пазней адпусцілі, а Ангеліну кінулі да суду за краты ізалятару.

«Сёння ў мяне скончыліся дваццатыя суткі, выпусцілі своечасова. Забралі з камеры недзе ў 9 гадзін пасля ранішняй праверкі. Вывелі, пасадзілі ў бокс, рэчы вярнулі, дагледзелі, усе канверты перарылі. Сшытак хацелі забраць, у якім я пісала, але я сказала: не аддам і ўсё. Вывелі, пасадзілі ў «бобік» і павезлі ў Чыгуначны РАУС», – падзялілася па вызваленні Ангеліна.

Сябры і знаёмыя, якія чакалі дзяўчыну каля сцен віцебскага СІЗА-2, змаглі яе абняць толькі каля Чыгуначнага РАУС, дзе з Ангелінай правялі прафілактычную размову.

«Матрацаў у нас не было, на дзень іх забіралі, кнігі выдавалі на 30 хвілін. Святло не гасілі ні днём, ні ўначы – спаць немагчыма! Матрац мне выдалі толькі ў гэтую сераду, і толькі таму, што ў мяне паднялася тэмпература», – распавяла пра ўмовы ўтрымання актывістка.

Дадала, што прадуктовыя перадачы да яе не даходзілі, бо забароненыя, а якасць харчавання ў ізалятары такая, што «лепш не есці». Апошнія 10 сутак Ангеліна галадала, піла толькі гарбату і кісель.

Маці Ангеліны Таццяна Туравец пісала наконт жорсткіх умоваў утрымання ў ІЧУ скаргу ў пракуратуру. Ангеліна расказвае, што праверка сапраўды адбылася, да іх у камеру прыходзіў пракурор. Але, на жаль, зменаў пасля гэтага ніякіх не адбылося.

Нагадаем, што напярэдадні сама Таццяна Туравец, якая працуе выхавальніцай у дзіцячым садку, была прысуджаная да трох гадоў «хіміі» паводле арт. 364 КК. На абвяшчэнне прысуду, які агучвала суддзя Наталля Траццякова, жанчына не з’явілася.

**01.06.2021** 1 чэрвеня 73-гадовага віцебскага дысідэнта Барысу Хамайду зноў затрымлівала міліцыя. Яго забралі каля 13-й гадзіны на рагу так званага «сіняга дому» (вул. Леніна, 28) ў Віцебску, дзе ён амаль штодзень распаўсюджвае беларускамоўную літаратуру і прэсу. Фармальнай падставай для затрымання было тое, што Хамайда нібыта ажыццяўляў незаконны гандаль.

«Недзе ў 12.50, гляджу, паставыя некалькі разоў паўз мяне прайшлі. А потым сталі здалёк і за мной сочаць. Ну праз пару хвілін прыехала міліцэйская машына. Падышоў лейтэнант і кажа: «А што вы тут гандлюеце без дазволу?» Я яму: «Я не гандлюю – я распаўсюджваю, вялікая розніца!»

А ён: «Ну тады паехалі ў Чыгуначны РАУС, трэба з вамі правесці прафілактычную размову», – расказаў па вызваленні з пастарунку Барыс Хамайда.

З ягоных словаў, у Чыгуначным РАУС яго апыталі. Цікавіліся, чаму ў яго парасон бел-чырвона-белага колеру і стужка такая ж.




Папярэдзілі і параілі пазбягаць гэткім чынам пафарбаваных прадметаў. Пратакол апытання Хамайда падпісваць адмовіўся. Пасля гэтага мужчыну адпусцілі.

«У мяне такое ўражанне пасля сённяшняга затрымання, што яны нейкую справу на мяне кляпаюць. Нешта хочуць павесіць. Штосьці яны збіраюць, таму што ўсё гэта невыпадкова», – мяркуе Барыс Хамайда.

Гэта было ўжо чацвёртае ў гэтым годзе затрыманне Барыса Хамайды і другое – па выпісцы 17 траўня з лякарні, дзе актывіст 25 дзён змагаўся з каронавірусам. Да сённяшняга затрымання Хамайду забіралі і на мінулым тыдні – 27 траўня: таксама папярэдзілі і адпусцілі. Узімку ён атрымаў папярэджанне ад пракуратуры.

Цяпер Барыс Хамайда на волі. Ён паведаміў па тэлефоне, што з ім усё ў парадку.

**02.06.2021** Беларуская праваабарончая супольнасць 1 чэрвеня прызнала палітвязнямі яшчэ 5 чалавек, сярод якіх жыхары Воршы Арцём Кандрацьеў і Сяргей Рудзінскі. Абодва былі асуджаныя на паўтара года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Кандрацьева пакаралі за паклёп (арт. 188 КК), Рудзінскага – за абразу прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК).

Пацярпелым у справах Арцёма Кандрацьева і Сяргея Рудзінскага быў адзін і той жа чалавек – начальнік аршанскай інспекцыі па справах няпоўнагадовых Вішнеўскі. Паводле абвінавачання, 29-гадовы жыхар Воршы Арцём Кандрацьеў 12 жніўня размясціў фота Вішнеўскага, а таксама звесткі пра яго, якія следства палічыла абразлівымі ды ілжывымі. Суддзя Іна Кохава прызнала мужчыну вінаватым і прысудзіла паўтара года «хіміі». Ад 29 траўня Арцём Кандрацьеў адбывае пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу №6 у Брэсцкай вобласці.

Сяргей Рудзінскі прызнаны вінаватым у абразе таго ж самага Вішнеўскага ў каментары ў тэлеграм-чаце «Орша 97%». Суддзя Мікалай Драгуноў прызначыў аршанцу такое ж пакаранне – паўтара года «хіміі». Рудзінскі адбывае яе ў Ваўкавыску.

Праваабарончая супольнасць палічыла прысуды, вынесеныя аршанцам, палітычна матываванымі, звязанымі з мірнай рэалізацыяй выказвання меркавання, і прызнала іх палітвязнямі.

У афіцыйнай заяве выстаўленыя патрабаванні аб неадкладным вызваленні палітвязняў і спыненні ў дачыненні іх крымінальнага пераследу. Праваабаронцы таксама патрабуюць ад уладаў «зрабіць захады, скіраваныя на дэкрыміналізацыю дыфамацыйных правапарушэнняў і адмену артыкулаў

Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць адказнасць за абразу дзяржавы, дзяржаўных сімвалаў і службовых асобаў, а менавіта – арт. 188, 189, 367, 368, 369, 369-1, 370, 391 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і спыніць усе раней заведзеныя па гэтых артыкулах крымінальныя справы».

Па стане на 2 чэрвеня ў Беларусі прызнаны палітычнымі вязнямі 451 чалавек.

**04.06.2021** Вядомага віцебскага дысідэнта і распаўсюдніка незалежнай прэсы Барыса Хамайду асудзілі на 8 сутак адміністрацыйнага арышту. Пра гэта 4 чэрвеня паведамілі ў Чыгуначным РАУС Віцебску людзям, якія шукалі Хамайду пасля затрымання днём раней. 73-гадовы мужчына знаходзіцца зараз у ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ).

Цягам апошніх 10 дзён Барыса Хамайду, які выходзіў да «сіняга дому» ў Віцебску, каб распаўсюджваць беларускамоўную літаратуру і прэсу, затрымлівалі тры разы. Пасля затрыманняў 27 траўня і 1 чэрвеня яго праз некалькі гадзін выпускалі з пастарунку, зрабіўшы папярэджанні, якія тычыліся выкарыстання бел-чырвона-белага парасону і стужкі такіх жа колераў. Але 4 чэрвеня Барыс Хамайда па затрыманні на волю ўжо не выйшаў. Мясцовыя актывісты мяркуюць, што Хамайду маглі адмыслова схаваць ад вачэй кіраўніка беларускага КДБ Івана Церцеля, які 3 чэрвеня праводзіў у Віцебску перамовы са сваім расейскім калегам.

Пра тое, што Барыс Хамайда ўжо асуджаны на 8 сутак, даведаліся актывісты, якія зранку 4 чэрвеня чакалі разбору ягонай справы ў судзе Чыгуначнага раёну. У судзе пра гэта нічога не паведамілі, інфармацыяй падзяліліся ў Чыгуначным РАУС. Калі адбыўся суд і якую канкрэтна віну выставілі апазіцыянеру, невядома. Цалкам магчыма, што разгляд справы Хамайды адбыўся яшчэ ўвечары 3 чэрвеня. Найверагодней, яго прызналі вінаватым у несанкцыянаваным пікетаванні (арт. 24.23 КаАП) з выкарыстаннем сімволікі бел-чырвона-белых колераў. Вядома, што 3 чэрвеня парасон і стужку ў Хамайды канфіскавалі.

Барыс Хамайда апынуўся ў ІЧУ без лекаў, якія яму неабходныя для постковіднай рэабілітацыі. Раней ён правёў у лякарні 25 дзён з двухбаковым запаленнем лёгкіх – наступствам каронавірусу. Выпісаўся 17 траўня.

Барыс Хамайда мусіць выйсці на волю 11 чэрвеня.

**05.06.2021** Напрыканцы траўня судом Першамайскага раёну Віцебску за абразы работніка міліцыі была асуджаная на паўтара гады абмежавання волі жыхарка абласнога цэнтру. Пасля ўступлення прысуду ў законную сілу маладая жанчына будзе адбываць "хатнюю хімію» сумесна з яе двума малалетнімі дзецьмі. Яшчэ на стадыі дасудовага разгляду 26-гадовая віцяблянка, якая знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, у добраахвотным парадку выплаціла міліцыянту кампенсацыю маральнай шкоды ў суме 600 рублёў.

Гэтая гісторыя пачалася ў кастрычніку 2020 году, калі жанчына напісала каментар, выкарыстоўваючы мабільны тэлефон, са свайго ўліковага запісу ў групе «Тыповы Віцебск» у «Instagram».

Паводле абвінавачання, у публікацыі змяшчалася непрыстойны выраз у лаянкавай форме аб выкананні супрацоўнікам АУС адміністрацыі Першамайскага раёну сваіх службовых абавязкаў па ахове грамадскага парадку. Тым самым віцяблянка нібыта замахнулася на аўтарытэт, гонар і годнасць прадстаўніка ўлады.

У судзе жанчына прызнала сваю віну і датычнасць да абразы.

Патлумачыла прычыну свайго ўчынку наяўнасцю абразлівых каментароў іншых карыстальнікаў пад выстаўленым фатаздымкам міліцыянта ў «Instagram», які выклікаў у яе негатыўныя эмоцыі.

Дзяржаўны абвінаваўца палічыў віну падсуднай ў публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў даказанай і прапанаваў суду пакараць яе абмежаваннем волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў.

Пры вынясенні выраку суд пагадзіўся з меркаваннем пракурора.

**06.06.2021** Праваабаронца Павел Левінаў звярнуўся ў Віцебскі аблвыканкам з заявай аб правядзенні 14 чэрвеня ў Міжнародны дзень блогера масавага мерапрыемства ў інтэрнэце. На што намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы Пётр Гнуценка папярэдзіў заяўніка аб прававой адказнасці за распаўсюд інфармацыі, якая змяшчае прыкметы экстрэмізму. Чыноўнік тлумачыць, што законам не прадугледжанае правядзенне масавага мерапрыемства ў форме інтэрнэт-пікетавання. Але што тут не так?..

Такі адказ, на думку праваабаронцы Паўла Левінава, не адпавядае патрабаванням дзейнага заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, а чыноўнік не ведае правапрымяняльнай практыкі. Пра гэта Левінаў і паведаміў абласному начальству ў сваім зваротным лісце.

«У адпаведнасці з артыкулам 6 Закону «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» заяву аб правядзенні масавага мерапрыемства абавязаныя разгледзець старшыня аблвыканкаму або яго намеснік, а не намеснік начальніка, хай сабе і галоўнага, упраўлення аблвыканкаму», - нагадвае праваабаронца норму закону чыноўнікам, якія яе парушылі.

Павел Левінаў таксама паведамляе ў лісце, што арт. 2 закону не прадугледжвае правядзенне масавага мерапрыемства ў фармаце інтэрнэт-пікетавання, але супрацоўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкаму чамусьці заводзяць адміністрацыйныя справы на грамадзян за выказванне імі сваіх грамадска-палітычных поглядаў і інтарэсаў у Інтэрнэце.

То бок гэткая грамадзянская актыўнасць у інтэрнэце ўспрымаецца ўладамі як парушэнне закону аб правядзенне масавых акцый, якое падлягае пакаранню.

Праваабаронца лічыць, што найважнейшымі складнікамі асноў канстытуцыйнага ладу і ў той жа час фундаментальнымі канстытуцыйнымі каштоўнасцямі з'яўляюцца правы і свабоды чалавека. Гарантыі іх рэалізацыі і забеспячэння ўяўляюць сабой найважнейшую канстытуцыйную мэту, а таксама абавязак дзяржавы.

У сувязі з гэтым дзяржаўныя органы і службовыя асобы павінны рабіць усе неабходныя захады для стварэння належных умоваў для іх развіцця.

«Замест таго, каб прыняць усе неабходныя меры для стварэння належных умоваў правядзення заяўленага масавага мерапрыемства, Пётр Гнуценка вырашыў папярэдзіць мяне аб прававой адказнасці за распаўсюд інфармацыі, у тым ліку ў сетцы Інтэрнэт, якая змяшчае прыкметы экстрэмізму», - абураны прававой некампетэнтнасцю і непісьменнасцю чыноўніка-ідэолага Левінаў.

**08.06.2021** Выканаўца абавязкаў пракурора Докшыцкага раёну Надзея Міцько прынесла пратэст на рашэнне суду аб спыненні справы глыбоцкага журналіста-фрылансера Зьмітра Лупача, якую на яго завялі за незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ (арт. 23.5 КаАП ). Суд Докшыцкага раёну спыніў справу 18 траўня праз недаказанасць віны.

Пракурорскі пратэст на гэтае рашэнне разгледзяць у Віцебскім абласным судзе 9 чэрвеня.

Пра тое, што пракурорка Надзея Міцько прынесла пратэст на пастанову аб скасаванні справы, Зьмітру Лупачу паведамілі афіцыйным лістом з суду Докшыцкага раёну. Прычым падпісаў паперу суддзя Дзяніс Корсак – той самы, які вынес рашэнне аб спыненні справы.



Стала таксама вядома, што рашэнне суддзі абскардзіў яшчэ і начальнік Докшыцкага РАУС Сяргей Каралевіч.

Журналісту паведамілі, што разгляд пратэсту адбудзецца ў Віцебскім абласным судзе 9 чэрвеня (пачатак паседжання ў 11.00).

Нагадаем, падставай для складання пратаколу на Змітра Лупача стаў фельетон на YouTube-канале «Белсату» пад назвай «Леніна знайшлі загорнутым у цэлафан». Пратакол на журналіста склаў маёр міліцыі Докшыцкага РАУС Андрэй Юргель.Сведкам на судзе праходзіў мясцовы краязнаўца Кастусь Шыталь – герой фельетону. На судзе ён заявіў, што што запісвала яго падчас здымак сюжэту жанчына, а не Зміцер Лупач. Суддзя Корсак спыніў справу праз недаказанасць віны Змітра Лупача.

**09.06.2021** 9 чэрвеня Віцебскі абласны суд разгледзеў пратэст пракуроркі Надзеі Міцько і скаргу начальніка Докшыцкага РАУС падпалкоўніка Сяргея Каралевіча на рашэнне суду, які 18 траўня спыніў справу ў дачыненні да журналіста-фрылансера Змітра Лупача. Яго вінавацілі ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ (ч.3 арт. 23.5 КаАП).

Пракурорскі пратэст і міліцэйскую скаргу разглядала суддзя Ірына Смалякова. Нагадаем, справа Змітра Лупача была спыненая праз недаказанасць віны.

Пратэст на скасаванне справы быў прынесены 28 траўня. Выканаўца абавязкаў пракурора Докшыцкага раёну Надзея Міцько ўказвае на «аднабаковасць, непаўнату і неаб’ектыўнасць даследавання абставінаў адміністрацыйнага правапарушэння». У сваім пратэсце пераконвае, што суддзя Корсак не ў поўным аб’ёме прааналізаваў матэрыялы справы і не прыняў да ведама абставіны вырабу Змітром Лупачом рэпартажу пад назвай «Леніна знайшлі загорнутым у цэлафан».

У сваю чаргу начальнік докшыцкай міліцыі Сяргей Каралевіч у сваёй скарзе сцвярджае, што высновы суду аб недаказанасці віны Лупача будуюцца на аднабаковай і неаб’ектыўнай ацэнцы доказаў. Прасіў пастанову суддзі Дзяніса Корсака адмяніць, а справу накіраваць на новы разгляд.

Суддзя Ірына Смалякова, разгледзеўшы скаргу міліцыянта і пратэст пракурора, пастанавіла рашэнне суду Докшыцкага раёну адмяніць, а справу накіраваць на новы разбор у той жа суд іншым суддзём.

Зміцер Лупач на паседжанне ў Віцебскім абласным судзе не прыехаў.

**09.06.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 8 чэрвеня пастанавіў прызнаць Telegram-каналы «Браслаў для жыцця» и «Поставы для жизни» экстрэмісцкімі. Такое рашэнне было прынятае на падставе матэрыялаў, пададзеных у суд віцебскім абласным упраўленнем ГУБАЗіК МУС. Цяпер рэпост паведамленняў з гэтых чатаў можа пацягнуць адміністрацыйную адказнасць.

Як удакладняе афіцыйны сайт УУС Віцебскага аблвыканкаму, «у гэтых суполках удзельнікі неаднойчы заклікалі да несанкцыянаваных мітынгаў і масавых беспарадкаў, хуліганства, вандалізму, блакавання руху транспарту, супраціву міліцыянтам, захопу ўлады, а таксама да распальвання сацыяльнай варожасці паміж грамадзянамі краіны і прадстаўнікамі дзяржорганаў».

Удзельнікі чатаў нібыта заклікалі да дзеянняў па дэстабілізацыі працы Цэнтрвыбаркаму і дзяржаўных органаў, публікавалі зняважлівыя каментары.

Цяпер распаўсюд (рэпост) інфармацыі з гэтых Тэлеграм-чатаў можа пацягнуць за сабой адміністрацыйную адказнасць з пакараннем штрафам альбо арыштам.

**10.06.2021** 19-гадовая навучэнка аднаго з віцебскіх каледжаў Марыя Амасовіч вызвалілася ў мінулую суботу з ІЧУ пасля 40 сутак арышту, прысуджаных ёй па дзвюх адміністрацыйных справах (арт. 24.23 КаАП) яшчэ ў красавіку і траўні. Дзяўчына кажа, што за 40 дзён памяняла 5 камер, а чатыры апошнія дні сядзела адна. Прызнаецца, што вырашыла перайсці на беларускую мову. За паслугі ізалятару Марыя мусіць заплаціць 565 рублёў.

Сціплая, светлая і вельмі далікатная. З Марыяй Амасовіч сустрэліся 10 чэрвеня на выхадзе са следчага камітэту, дзе дзяўчына прабыла аж дзве з паловай гадзіны – хадзіла даваць чарговыя тлумачэнні і спрабавала вярнуць свой тэлефон, канфіскаваны яшчэ ў красавіку. Паразмаўлялі з ёй пра тое, чаго хацеў следчы і як вытрымала 40 дзён за кратамі.

Тэлефон узламаць не здолелі
«Я сама па вызваленні звязалася са следчым, бо хачу забраць свой тэлефон, які канфіскавалі. Маю статус падазраванай па справе аб надпісах на гаражы – гэта крымінальны артыкул 341. Фота сцяны знайшлі ў маёй сяброўкі на тэлефоне. А таму што і мой тэлефон забралі ў яе кватэры, то і мяне падазраванай зрабілі.

Сёння ў СК даведалася, што тэлефон дасылалі на экспертызу ў Менск. Але следчы паведаміў, што і там не змаглі яго ўзламаць і ніякай інфармацыі з яго не дасталі. Так я яго запароліла (смяецца). Сёння я ім сама назвала пароль, бо ведаю, што ў тэлефоне нічога такога няма. Следчы адкрыта выказваў незадавальненне, што вымушаны займацца такімі справамі. Папрасіў чакаць ягонага званку».

«Першае, што зрабіла, – завалілася ў ванну»
«Вызвалілі мяне з сутак не адразу. Гэта было 5 чэрвеня ўначы – у 23.34.Такі час мне пазначылі ў РАУС – час затрымання. Сімвалічна, праўда? Прыйшлі міліцыянты, сказалі: выпускаем. Але калі мяне павялі праз нейкі ангар, адразу зразумела, што нармальна не выйду – павязуць у РАУС.

Прабыла там да дзвюх гадзін ночы – размаўлялі з намеснікам начальніка Кастрычніцкага РАУС Бондаравым, здаецца. І ўжо потым ён загадаў сваім падначаленым завезці мяне дамоў. Пра што размаўлялі? Спрабаваў мне данесці сваю пазіцыю, а я – сваю. Казаў, што не супраць нас, але мы нічога не даможамся, маўляў, усё гэта бескарысна. Папярэдзіў таксама, што мне не трэба больш пападацца, бо тады могуць завесці ўжо крымінальную справу.

Першае, што зрабіла па прыездзе дамоў, – завалілася ў сваю ванну і ляжала... Заснула толькі на світанку.

«Выводзілі з камеры і чынілі шмон»



«Неяк выжылі. Спалі на матрацах – ужо нармальна. Пад'ём – а 6-й раніцы. Потым прыходзілі супрацоўнікі, падымалі, строілі і правяралі металашукальнікам на наяўнасць забароненых прадметаў. Матрацы зранку заносілі ў спецыяльны пакой. У 9.00 – праверка.

І калі было шмат палітычных, нас выводзілі з камеры, а пакуль нас там не было, – чынілі шмон. Проста бралі нашыя пакеты і выкідвалі ўсе рэчы ў агульную кучу пасярэдзіне камеры. Заходзіш у камеру пасля такогаператрусу – а там суцэльны вэрхал. Ну тады пачынаем разбіраць адзенне з гэтай агульнай купы. Калі нас стала менш, ім, відаць, стала нецікава шманаць нашыя рэчы.

Ведаеце, калі сядзела, пастаянна думала пра тое, што камусьці яшчэ горш. Некаторыя ўжо год за праўду сядзяць, дык што там мае 40 сутак…»

«З самага дзіўнага: дзве кашы ў адну мяшаюць»
«Наконт ежы скажу адно: гэта можна есці. Але не ўсё. З самага дзіўнага: дзве кашы замешаныя ў адну – гарохавая і ячная. Гэта вельмі дзіўна, ага. І мы гэта не елі. А што можна есці – гэта супчыкі. Самае смачнае ж – кісель і чай. Але вельмі мала выдавалі. На самым донцы.

Не, голаду там не адчувала, але ў апошні дзень адмовілася ад ежы. Напісала заяву. Гэта не было галадоўкай – проста вырашыла ўстрымацца. Дарэчы, наконт перадач, дык дазваляюць толькі прадметы гігіены і, можа быць, цёплыя рэчы. Харчы перадаваць не дазваляюць, спасылаючыся на каронавірус. Калі ім трэба – у іх каронавірус».

У душ хадзілі з лекарам – каб не «ўскрыліся»
«Ведаеце, я 40 сутак нармальна не спала. Можна сказаць, спала з расплюшчанымі вачыма. Ляжала. Таму што, па-першае, гэтае святло ўздзейнічае на псіхіку, а яшчэ – некалькі разоў за ноч будзяць. Грукаюць у дзверы дубінкай ці нагамі і загадваюць уставаць! І мы мусім устаць і стаць у строй, назваць прозвішча. Усё. І новы адбой. І мы зноў спрабуем заснуць. Гэта можа адбывацца два разы за ноч. Але былі змены якія нас шкадавалі і не будзілі. На здароўі гэта, я спадзяюся, не адаб'ецца, але выйшла я з СІЗА з чырвонымі вачыма праз гэтыя недасыпанні.

Дарэчы, за тыдзень да вызвалення, да нас прыходзіў начальнік СІЗА-2 Сочнеў, запытаўся, якія ёсць скаргі. Дык я сказала, што мне зімна. Трохі нечакана было, але ён прынёс мне дзве коўдры. Спачатку было сапраўды халодна ў камеры – я ж туды яшчэ ў красавіку трапіла.

А больш за ўсё не хапала свежага паветра. Прыязджаў пракурор, і я сказала, што за 30 сутак ніводнага разу не была на свежым паветры. Ён нібыта паабяцаў, што адвядуць на шпацыр. Але так і не адвялі. Ніводнай прагулянкі не было!

А ў душ вадзілі раз на тыдзень. Часам хадзілі з аховай – з доктарам, які там быў, калі нам выдавалі прылады для галення. Маўляў, можам сябе парэзаць, ускрыцца, таму патрэбны доктар. Сядзеў у раздзявальні, пакуль мы мыліся.

«Ліст можна было напісаць толькі за два заходы»

«Курцоў у камеры заўсёды была большасць. Але праз прысутнасць палітычных ім не давалі курыць. Курылі толькі раз-два на дзень. І было такое, што нас адвялі ў камеру, дзе людзі сядзелі не па палітычных артыкулах – дык у іх таксама забралі на дзень матрацы, як і ў нас. Можа, хацелі пасварыць нас. Да гэтага ў іх матрацы не забіралі.

У нас жа забіралі і кнігі, і часопісы, і сшыткі. Давалі толькі на паўгадзіны. То бок элементарны ліст можна было напісаць толькі за два заходы. Сёння палову напісаў, і заўтра палову. Атрымала я каля 10 лістоў. Паспела толькі два лісты ў адказ напісаць.

Ці лічу ўсё гэта маральным катаваннем?.. Як мне сказалі, яны гэта робяць дзеля таго, каб мы больш туды не патрапілі і больш ніколі не захацелі выходзіць на пратэсты. Ну, гэта напэўна не катаванні, але ж вялікі дыскамфорт – сядзець без нічога на голым жалезе».

«Не звар’яцела, але... цяжка»
«Чатыры апошнія дні сядзела ў камеры адна. Чаму, не ведаю. Людзі былі, але мяне да іх не падсялялі. Без кніг і паперы. Звар’яцець не звар’яцела, але так, цяжка. Час марудна цягнуўся. Аднак былі і плюсы: ніхто побач не паліў. Сядзела і думала. Паспела за гэтыя дні ўсё сваё жыццё перадумаць, асэнсаваць. Не, мой пункт гледжання на свет і палітыку гэтыя суткі не змянілі. Але трапляць у ізалятар я больш не хачу, так скажам.

Ведаеце, яшчэ думаю цалкам перайсці на беларускую мову. Пачаць размаўляць. Седзячы ў камеры, спрабавалі размаўляць на беларускай мове, і некаторыя міліцыянты таксама адказвалі па-беларуску.

З каледжу не выключылі – перавялі на вячэрняе аддзяленне
«Калі мяне вызвалілі, я пазваніла свайму майстру, і тая папрасіла падысці ў каледж.: трэба было напісаць тлумачальны ліст, дзе я была ўвесь гэты час. На наступны дзень адміністрацыя прыняла рашэнне перавесці мяне на вячэрняе аддзяленне ў іншую групу. Але не выключылі, бо пару дзён вучыцца засталося, потым экзамены – і я з дыпломам бармена.

Не, з’язджаць адсюль не збіраюся, хоць ведаю, якая сітуацыя, але ж гэта мая краіна. Папрацую па спецыяльнасці. Паступаць пакуль не збіраюся, а потым – пабачым. Будучыню ў нас не адбяруць...»

**10.06.2021** У Камітэце па правах чалавека працягваецца цяжба паміж беларускімі ўладамі і журналісткай з Глыбокага Таццянай Смоткінай, якая падала паведамленне, зарэгістраванае КПЧ пад нумарам 3235/2018. Не так даўно з нагоды разгляду ў Камітэце звароту журналісткі кампетэнтнымі органамі Рэспублікі Беларусь была перададзеная інфармацыя з тлумачэннем пазіцыі ўраду.

Згодна з тлумачэннем, беларуская дзяржава не адмаўляе, што Таццяна Смоткіна пастановай суду Докшыцкага раёну Віцебскай вобласці ад 31 мая 2018 году прызнаная вінаватай у незаконным вырабе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі і на падставе часткі 2 артыкулу 22.9 КаАП пакараная адміністрацыйным спагнаннем ў выглядзе штрафу на 735 рублёў.

Адзначаецца, што журналістка для абароны сваіх правоў і законных інтарэсаў не звярталася ў вышэй пастаўленыя суды і органы пракуратуры. З гэтага ўлады робяць выснову, што заяўніцай не былі вычарпаныя ўсе наяўныя ўнутраныя сродкі прававой абароны, што ў адпаведнасці з арт. 2 факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах



выклікае немагчымасць падавання пісьмовага паведамлення на разгляд Камітэту па правах чалавека.

«З улікам гэтага паведамленне ад імя Таццяны Смоткінай у Камітэт ААН па правах чалавека варта разглядаць як злоўжыванне правам на прадстаўленне паведамлення ў дадзены Камітэт, якое цягне прызнанне яго непрымальным», - тлумачаць беларускія ўлады.

Яны мяркуюць, што права журналісткі на свабоднае выказванне думкі ў адпаведнасці з артыкулам 19 Пакту не было парушанае. Аргументуюць сваю пазіцыю тым, што ўстаноўлены Законам РБ ад 17 ліпеня 2008 году "Аб сродках масавай інфармацыі» парадак ажыццяўлення дзейнасці журналістаў сродкаў масавай інфармацыі не можа разглядацца як абмежаванне права на свабоднае выказванне меркавання ў сэнсе артыкулу 19 Пакту.

Усе довады дзяржавы Камітэт па правах чалавека прыняў, але разгляд справы не спыніў. Таццяна ўжо накіравала ў Жэневу свае каментары, у якіх настойвае на тым, што беларускія ўлады парушылі яе права на свабоднае выказванне меркавання праз абмежаванне выканання ёю прафесійных абавязкаў журналісткі.

**11.06.2021** 73-гадовы дысідэнт і распаўсюднік незалежнай прэсы Барыс Хамайда 11 чэрвеня выйшаў на волю з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання (ІЧУ). Ён правёў за кратамі 8 сутак, якія яму прысудзілі за бел-чырвона-белы парасон і стужку такіх жа колераў (арт. 24.23 КаАП). Па вызваленні Хамайда прызнаўся, што было цяжка, але сваім турэмшчыкам ён ні на што не скардзіўся і нічога ў іх не прасіў.

Барыса Хамайду вызвалілі з ізалятару каля 12.30, але адразу пасадзілі ў міліцэйскую машыну і вывезлі ў цэнтр гораду – падалей ад людзей, якія яго сустракалі каля віцебскага СІЗА-2.

Толькі на сёмы дзень сказалі пра пасцельны рэжым
«Цяжка было. Цяжка... Можна, канечне, казаць, што я герой. Але не. Мне ўжо 73 гады, і перад гэтым я 25 дзён хварэў на каронавірус, прымаў лекі. А там, у ізалятары, для чалавека майго веку нармальна існаваць немагчыма. У прыбіральню прыйдзеш – няма ўнітазу. А я ж і сагнуцца не магу. Не ўсё мог есці, што мне там давалі – таксама даводзілася прыстасоўвацца», – прызнаўся Барыс Хамайда па вызваленні.

Па словах Барыса Хамайды, толькі на сёмы дзень яму паведамілі, што ў яго пасцельны рэжым, то бок увесь гэты час ён мог днём ляжаць на «шконцы», але пра гэта не ведаў.

«Таму – хадзіў, сядзеў і думаў. Пра пасцельны рэжым не казалі, хоць матрац удзень не забіралі. А тут дзяжурны паведамляе. Ну, слухайце, я прынцыпова апошнія суткі сядзеў – і не прылёг. Мне кажуць: дзед, у цябе ж пасцельны рэжым! А я ім: і так вытрымаю!» – расказаў Хамайда.

«Арышт – гэта кошт майго ўчынку»
Кажа, што сядзеў у камерах, дзе быў адзіным «палітычным». Уначы рабілі пад'ёмы з праверкамі, удзень – шмоны. Перыядычна знікала вада і не працаваў зліў у прыбіральні.



Пісаць і чытаць не давалі. Выказвае вялікую падзяку беларусу Варанцу (Варенец – рус.), які на наступны дзень па затрыманні перадаў яму самае неабходнае – зубную шчотку з пастай, мыла, паперу, гель і кнігу. Дарэчы, кнігу аддалі толькі на выхадзе з ІЧУ.

Хамайда кажа, што ўспрымае свой арышт як плату за годнасць пры затрыманні.

«На мяне ціснулі, каб я сам прыбраў бел-чырвона-белы парасон і стужку. Але для мяне было прынцыпова не рабіць гэтага, бо гэта было б здрадай тым ідэалам, за якія я столькі год змагаўся. Ведаў, што будзе развязка – вялікі штраф альбо арышт. І лічу, што зрабіў годна, бо гэта яны забралі ў мяне парасон і стужку, а не я сам іх прыбраў. І гэтыя 8 сутак – кошт майго ўчынку», – кажа мужчына.

«Ад сіняга дому не сыходжу!»
БЧБ-парасон і стужка канфіскаваныя, але Барыс Хамайда запэўнівае, што вернецца да «сіняга дому» – з беларускамоўнымі кніжкамі і часопісамі.

«Ад сіняга дому не сыходжу! Пакуль ногі рухаюцца – я там застаюся», – сцвярджае Хамайда.

Гаворыць, што са здароўем пакуль усё больш-менш нармальна, аднак адчувае моцную стомленасць.

«Але галоўнае, што я адтуль вынес – гэта адчуванне блізкага канца гэтага рэжыму. Гэта нябачна візуальна, але дзесьці нібыта ў паветры лунае», – падсумаваў Барыс Хамайда.

**12.06.2021** Упраўленне па Віцебскай вобласці ГУУБ МУС выйшла на чарговага інтэрнэт-карыстальніка, які нібыта мае дачыненне да публічнай абразы супрацоўніка міліцыі. На падставе атрыманых дадзеных праверкі аператыўнікі завялі крымінальную справу паводле артыкулу 369 КК (Абраза прадстаўніка ўлады).

Падазраваны ў абразе супрацоўніка МУС - 40-гадовы беспрацоўны жыхар Віцебска, які ў нецэнзурнай форме выказаўся на адрас участковага інспектара міліцыі Бабруйскага ГУУС. Следчыя выявілі, што ў дзеяннях падазраванага нібыта прысутнічаюць усе прыкметы злачынства, якія паказваюць на абразу міліцыянта.

Свае дзеянні мужчына патлумачыў эмацыйнай рэакцыяй на ілжывую інфармацыю ў сацсетках. Ён раскаяўся і папрасіў прабачэння ў супрацоўніка міліцыі.

Таксама стала вядома, што ў верасні 2020 году віцяблянін прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічныя дзеянні ў дачыненні да іншых службовых асобаў. Акрамя таго, у сакавіку 2021 году ён адбываў адміністрацыйны арышт за размяшчэнне на асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы нацысцкай сімволікі.

Матэрыялы праверкі перададзеныя ў СК.

Адзначаецца, што гэтым разам мужчыне пагражае не адміністрацыйная, а крымінальная адказнасць.

У выпадку, калі падчас судовага разгляду будзе ўстаноўлены факт абразы міліцыянта, фігуранту справы пагражае да трох гадоў абмежавання волі ("хімія").

**15.06.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 15 чэрвеня за адзін дзень разабраў справу 58-гадовага віцябляніна Васіля Глушакова, якога абвінавацілі ў публічнай абразе прадстаўнікоў улады (арт. 369 КК) – двух міліцыянтаў Дубровенскага РАУС. Абвінавачаны прызнаў віну і адмовіўся ад адваката. Пракурор просіць пакараць мужчыну трыма гадамі абмежавання волі. Прысуд агучаць 16 чэрвеня.

Справу разглядае суддзя Алена Грабянчук. Паводле абвінавачання, 7 лютага 2021 году Васіль Глушакоў пакінуў зняважлівы каментар пад здымкам міліцыянтаў у групе «Таракан вусаты» ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі». Эксперты прызналі допіс, які нібыта ўтрымліваў ненарматыўную лексіку, абразай, «якая зневажае аўтарытэт, гонар і годнасць прадстаўнікоў улады пры выкананні імі службовых абавязкаў» (арт. 369 КК).

Пацярпелыя супрацоўнікі Дубровенскага РАУС Шлупакоў і Шаўлоў на паседжанні не з'явіліся.

Васіль Глушакоў, які знаходзіцца зараз пад падпіскай аб нявыездзе, сваю віну прызнаў цалкам. Расказаў на судзе, што ўжо прынёс міліцыянтам прабачэнні, калі яго пасля затрымання здымалі на відэа. Мужчына расказаў, што пакінуў каментар пад пастом, у якім распавядалася, што два дубровенскія міліцыянты «рызыкавалі жыццём і здароўем», канфіскуючы паветраныя шарыкі.

«Я напісаў, што глупства робяць, што, маўляў, трэба мазгі ўключаць, а рызыкаваць жыццём трэба дзеля больш важных справаў», – патлумачыў падсудны.

Якія канкрэтныя словы ўтрымліваў каментар пад пастом, на судзе не агучвалася.

Васіль Глушакоў заявіў, што цалкам раскайваецца і прызнаўся, што напісаў каментар, знаходзячыся ў прыгнечаным стане пасля хваробы на каронавірус. Расказаў таксама, што ў маладосці сам служыў у міліцыі, а ў 1986 годзе быў накіраваны Кастрычніцкім РАУС Віцебску ў Чарнобыль для ліквідацыі наступстваў катастрофы (пасведчання ліквідатара не мае). Пасля гэтага меў праблемы са здароўем: перанёс аперацыю на шчытападобнай залозе. Цяпер працуе інжынерам капітальнага будаўніцтва на адным з віцебскіх прадпрыемстваў.

У гэты ж дзень, 15 чэрвеня, прайшлі судовыя спрэчкі. Дзяржаўны абвінаваўца папрасіў суд прызнаць мужчыну вінаватым паводле арт. 369 КК і пакараць яго трыма гадамі абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»).

Прысуд будзе агучаны 16 чэрвеня (пачатак – у 12.00).

**15.06.2021** Палітвязень з Шуміліна Дзмітрый Кулакоў, які адбывае пакаранне на «хіміі» ў Шклове, 12 чэрвеня праглынуў кавалак металічнай лыжкі. Ён зрабіў гэта на знак пратэсту, бо яго не пусцілі на спатканне з жонкай. На наступны дзень Дзмітрыя выпісалі з лякарні, а ўжо ў панядзелак 14 чэрвеня змясцілі ў штрафны ізалятар. Пра гэта паведаміла жонка палітвязня Юлія Кулакова.

«Усё адбылося ў мінулую суботу. Я прыехала на спатканне, а яго не выпусцілі, хоць абяцалі.



І Дзіма на знак пратэсту адламаў кавалак лыжкі і праглынуў, а потым паведаміў пра гэта начальству. Выклікалі хуткую, я таксама паехала ў лякарню, але мяне ў палату не пусцілі. У нядзелю яго раптам выпісалі, хоць звычайна ў нас нікога ў нядзелю не выпісваюць. Дзіма пазваніў і сказаў, што «лыжка выйшла», – расказала Юлія Кулакова.

Па словах жанчыны, адразу пасля выпіскі да Дзмітрыя прыехаў аператыўнік і забраў яе мужа.

«У панядзелак Дзіма пазваніў і сказаў, што ягоны ўчынак палічылі парушэннем. І за гэта яго пасадзілі ў штрафны ізалятар. Перад гэтым паведаміў, што, хутчэй за ўсё, дадуць па максімуму – 10 сутак», – падзялілася жонка палітвязня.

Яна паведаміла, што ў Дзмітрыя гэта першае парушэнне за паўгода, якія ён правёў на шклоўскай «хіміі». Працуе зараз на камбікормавым заводзе, раней працаваў на пілараме.

У снежні 2020 году шумілінцу Дзмітрыю Кулакову прысудзілі тры з паловай гады абмежавання волі («хіміі») за пагрозы і абразу маёра міліцыі (арт. 364 і 369 КК).

**15.06.2021** 14 чэрвеня судовая калегія ў грамадзянскіх справах Віцебскага абласнога суду разгледзела скаргу шасці віцяблянак на дзеянні намесніка начальніка Першамайскага РАУС Івана Доўгага. Жанчыны былі затрыманыя 13 студзеня за «пікет у лесе» і беспадстаўна кінутыя ў ізалятар. Судаводства па скарзе «лясных фей» (так іх пачалі называць у інтэрнэце) спыненае: калегія пастанавіла, што справа не падлягае разгляду ў грамадзянскім судзе.

Скаргу ў абласны суд падавалі жыхаркі Віцебску Людміла Валадкевіч, Тамара Ільіна, Людміла Камінская, Раіса Кухто, Алена Каснова і Таццяна Севярынец. Рашэнне ў справе прымала судовая калегія ў складзе суддзяў Святланы Волкавай, Таццяны Дзегцяровай і Марыны Астрыкавай.

12 сакавіка жанчыны звярнуліся спачатку ў суд Першамайскага раёну Віцебску са скаргай на незаконныя дзеянні намесніка начальніка Першамайскага РАУС Івана Доўгага, які 13 студзеня аддаў загад затрымаць віцяблянак да суду на 72 гадзіны і змясціць у ІЧУ. Скаржніцы палічылі дзеянні Доўгага незаконнымі, якія парушалі іх грамадзянскія правы на свабоду, прасілі прызнаць гэта і суд. Але суд скаргі не задаволіў і абавязаў заяўніц аплаціць судовыя выдаткі (па 4 рублі 85 капеек).

Віцяблянкі з рашэннем раённага суду не пагадзіліся. Прасілі абласны суд пастанову адмяніць і прыняць новае рашэнне па сутнасці заяўленага патрабавання. Жанчыны лічаць, што суд першай інстанцыі парушыў працэсуальныя нормы, нормы матэрыяльнага права, а таксама міжнародныя нормы.

Міліцыя баіцца Skype?..

У абласным судзе аўтаркі скаргі хадайнічалі, каб у якасці прадстаўніка грамадскасці да ўдзелу ў судовым паседжанні праз скайп быў дапушчаны сябра Беларускага Хельсінкскага камітэту (БХК) Павел Левінаў



. Праваабаронца таксама даслаў у суд аналагічнае хадайніцтва. Судовая калегія, аднак, просьбу адхіліла, спаслаўшыся на тое, што не мае на гэта згоды ўсіх удзельнікаў працэсу. Як палічыла кіраўніцтва Першамайскага РАУС, «праграма Skype не ёсць гарантавана абароненай і не можа гарантаваць бяспеку супрацоўніку РАУС». Дарэчы, супрацоўнік міліцыі на суд так і не з’явіўся.

Усе заяўніцы пададзеную апеляцыю падтрымалі. Дадалі, што Іван Доўгі не меў ніякіх аб’ектыўных падставаў для іх затрымання. Абурыла і агульнае стаўленне да іх з боку міліцыянтаў у пастарунку. Цягам васьмі гадзін жанчынам не давалі есці, у выніку ў Севярынец і Ільіной падвысіўся ціск. Тамара Ільіна трапіла ў лякарню з гіпертанічным крызам. Найбольш абурыў жанчын факт паўторнага затрымання на самым ганку Першамайскага РАУС, калі пасля апытання і складання пратаколаў іх нібыта «адпусцілі», але праз пару хвілін ізноў затрымалі і адправілі ў ізалятар часовага ўтрымання. Прычым пратаколаў паўторнага затрымання ніхто на іх ужо не складаў.

«Я цяпер не ведаю, як жыць»
Віцяблянка Раіса Кухто казала ў судзе, што пасля затрымання ў яе здарыўся маральны шок.

«Усё жыццё я імкнулася шліфаваць свае маральныя нормы, але тое, што адбылося з намі – гэта здзек. З людзьмі гэтак нельга: выпусціць і тут жа вярнуць! Гэта, відаць, было запланавана. У мяне дагэтуль – шок. І я цяпер не ведаю, як жыць, калі разбураныя ўсе маральныя нормы, тое, чым я жыла. Мяне, маленькую жанчыну, проста так могуць захапіць, паставіць тварам да сцяны і пасадзіць. Гэта здзек!» – сказала жанчына.

Пасля перапынку судовая калегія агучыла сваё рашэнне: пастанову суду Першамайскага раёну Віцебску ад 12 сакавіка адмяніць, а судаводства ў справе спыніць.

Левінаў: Суд абмежаваў доступ да правасуддзя
Прымаючы такое рашэнне, судовая калегія сыходзіла з таго, што заяўніцы, абскарджвалі дзеянні Івана Доўгага як службовай асобы, якая вядзе адміністрацыйны працэс. Пададзеная заяўніцамі скарга разгледжаная судом у парадку, прадугледжаным арт. 353 і 357 ГПК, і пры такіх абставінах рашэнне суду не можа быць прызнанае законным і мусіла быць адмененае. Справа не падлягае разгляду ў грамадзянскім судзе з прычыны яго пазаведамаснасці.

«У адпаведнасці з арт. 60 Канстытуцыі, кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом. Кіруючыся арт. 353 Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь, грамадзянін мае права звярнуцца ў суд са скаргай, калі лічыць, што неправамернымі дзеяннямі (бяздзейнасцю) дзяржаўных органаў і службовых асобаў ушчэмленыя яго правы. Аднак суд сваім рашэннем абмежаваў доступ да правасуддзя», – лічыць праваабаронца Павел Левінаў.

**16.06.2021** 58-гадовы інжынер з Віцебску Васіль Глушакоў быў прызнаны вінаватым у публічнай абразе прадстаўнікоў улады ў сувязі з выкананнем імі службовых абавязкаў (арт. 369 КК).



За кароткі каментар на адрас двух супрацоўнікаў Дубровенскага РАУС у суполцы «Вусаты Таракан» мужчыну прысудзілі да 1 году і 6 месяцам абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Прысуд агучыла 16 чэрвеня суддзя Алена Грабянчук.

Суд Чыгуначнага раёну Віцебску абавязаў таксама Васіля Глушакова выплаціць кампенсацыю маральнай шкоды пацярпелым міліцыянтам – па 1000 рублёў кожнаму. Апроч таго, суддзя Алена Грабянчук  пастанавіла канфіскаваць у мужчыны мабільны тэлефон – як прыладу злачынства.

Каментар, за які быў асуджаны Васіль Глушакоў, быў пакінуты 7 лютага 2021 году ў групе «Вусаты Таракан» у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пад постам пра тое, як дубровенскія міліцыянты канфіскоўвалі паветраныя шарыкі. Нагадаем, 15 студзеня ў Дуброўне за бел-чырвоныя стужкі быў арыштаваны і асуджаны на 7 сутак мясцовы прадпрымальнік Міхаіл Чамурака. У ягоным доме тады адбыўсяператрус – былі канфіскаваныя шарыкі, якія віселі на акне.

«Супрацоўнікі Дубровенскага РАУС канфіскоўвалі шарыкі, а два вызначыліся тым, што рызыкавалі нават здароўем і жыццём… І я не канкрэтна ім адказаў, а адказаў таму, хто даваў заўвагі. Я напісаў, што «два ДБ». Так, скарочана», – расказаў пасля абвяшчэння прысуду Васіль Глушакоў.

Мужчына знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе і збіраецца абскардзіць прысуд, які пакуль не набыў законнай моцы.

Жамчужны: Гэта жорсткі прысуд
На думку былога палітвязня і праваабаронцы Міхаіла Жамчужнага, прысуд Глушакову «не адэкватны ўчыненаму».

«Вельмі здзіўляюся жорсткасці і несправядлівасці рашэнняў судовых органаў. Я не ведаю, дзе навучаліся суддзі і якіх мэтаў дамагаюцца, але лічу, што гэта вельмі жорсткі прысуд. Некаторыя кажуць, што паўтара года «хіміі» – гэта больш жорстка, чым паўтара года ў калоніі. Хлопцы скардзяцца, што там ніякіх бытавых умоваў няма», – сказаў Міхаіл Жамчужны.

**17.06.2021** Актывіст партыі БНФ і палітвязень Уладзімір Малахоўскі быў этапаваны ў папраўчую калонію N22, вядомую як «Воўчыя норы». Пра гэта паведаміла ягоная жонка Ірына. Незадоўга да этапавання экспертная камісія пазбавіла яго групы інваліднасці і забрала пенсію (250 рублёў). Уладзімір Малахоўскі хварэе на анкалогію.

«Каб смерці прасілі…»

Папраўчая калонія «Воўчыя норы» знаходзіцца ў Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці і лічыцца адной з самых жорсткіх у Беларусі. Адпраўляюць туды ў асноўным людзей, асуджаных паводле «наркатычнага артыкулу» 328 КК. Для іх ствараюцца суровыя ўмовы ўтрымання.



«Для іх трэба стварыць невыносныя ўмовы. Усталюем ім такі рэжым, каб яны, седзячы ў гэтай калоніі, прама скажу, смерці прасілі», – заяўляў у 2014 годзе Лукашэнка.

Няма грошай на выплату прысуджанай кампенсацыі

Калі дакладна быў этапаваны Уладзімір Малахоўскі, яго жонцы не паведамілі. Калі яна прыйшла ў СІЗА, каб зрабіць харчовую перадачу, ёй сказалі, што яго ўжо ў іх няма.

«Мне сказалі, усё ўжо, прысуд набыў моц, таму ніякіх перадач. І дадалі, што яго ўжо тут няма. Я патэлефанавала ў суд і спытала, куды адвезлі мужа. І мне адказалі, што ў папраўчую калонію 22», – падзялілася Ірына.

Калі зможа паехаць на спатканне, каб пабачыць мужа, яшчэ не ведае. Плануе звязацца з адміністрацыяй калоніі.

Па рашэнні суду палітвязню да 25 чэрвеня трэба выплаціць 3000 рублёў кампенсацыі траім «пацярпелым» міліцыянтам. Знайсці такія грошы за такі кароткі тэрмін няпроста, кажа Ірына, а на маёмасць накладзены арышт.

«Машына пад арыштам, мы яе прадаць не можам. Калі разлічуся з міліцыянтамі, то яе мусяць зняць з арышту. Калі своечасова не разлічуся – яе забяруць», – непакоіцца жанчына.

Пазбавілі групы інваліднасці і пенсіі

Акрамя таго, незадоўга да этапавання экспертная камісія пазбавіла Уладзіміра пенсіі па інваліднасці.

«І пенсіі пазбавілі, і групы пазбавілі. А што ж дзяржаву рабаваць? 250 рублёў атрымліваў, ай-ай. Гэта ж так шмат!» – абураецца Ірына.

На яе думку, у яе мужа спецыяльна забралі пенсію – каб дадаць палітвязню і яго сям'і праблемаў. Ірына адна зараз выхоўвае дваіх няпоўнагадовых дзяцей.

«Не ўпэўненая, што падпіша прашэнне аб памілаванні»

Ці прапаноўвалі Уладзіміру Малахоўскага падпісаць прашэнне аб памілаванні, жонка не ведае:

«Калі і прапаноўвалі, то я не ўпэўненая, што ён пагодзіцца. Але з такім здароўем… Я б пагадзілася. Ён дагэтуль кашляе пасля бранхіту, які падчапіў у СІЗА», – кажа жонка палітвязня.

«Там жа прымушаюць працаваць. А ў яго і палец жа яшчэ зламаны, і я не ўяўляю, як ён здолее. Здзекуюцца як хочуць над людзьмі!

Па анкалогіі яму кожныя паўгода правярацца трэба. Няўжо яны адтуль будуць вазіць яго ў Віцебск?..» – пытаецца Ірына.

Яна мяркуе, што яе мужа маглі спецыяльна пазбавіць групы інваліднасці, каб не было ніякіх патуранняў у працы і каб стаўленне да яго было як і да астатніх зняволеных.

**18.06.2021** 18 чэрвеня суд Першамайскага раёну Віцебску пачаў разбіраць крымінальную справу ў дачыненні да 36-гадовага Вадзіма Ермаловіча. Мужчыну абвінавачваюць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Каментарамі ў Телеграм-чаце, па версіі следчых, Ермаловіч зняважыў начальніка менскага АМАПу палкоўніка Дзмітрыя Балабу. Журналістаў на працэс не пусцілі, на першае паседжанне трапілі толькі бацькі падсуднага і адзін слухач.

Справу разбірае суддзя Наталля Караблiна. Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, 18 і 24 снежня 2020 году Вадзім Ермаловіч зрабіў некалькі допісаў у адным з віцебскіх тэлеграм-чатаў, якія і былі расцэненыя як абраза прадстаўніка ўлады.

«Наўмысна публічна размясціў электронны тэкст паведамлення, у якім, згодна з заключэннем экспертаў, змяшчаюцца выказаныя ў непрыстойнай і грубай форме абразы на адрас Балабы. Негатыўна ацэньвае апошняга і ўтрымлівае ненарматыўную форму выказвання, якая зневажае аўтарытэт, гонар і годнасць прадстаўніка ўлады Балабы», – агучыў абвінавачванне пракурор.

Сам «абражаны прадстаўнік улады» палкоўнік Дзмітрый Балаба на працэс не з'явіўся. «Маецца заява аб разглядзе справы без ягонай прысутнасці», – паведаміла на пачатку працэсу сакратарка.

Вадзім Ермаловіч прызнаў сваю віну цалкам, але ад дачы паказанняў у судзе адмовіўся.

Паводле ягоных ранейшых паказанняў, зафіксаваных у пратаколах допыту, каментары на адрас Балабы насілі выключна жартоўны характар і не мелі на мэце абразіць камандзіра менскага АМАПу.

Нагадаем, Вадзім Ермаловіч быў затрыманы ў Віцебску 20 сакавіка. Праз 72 гадзіны яго выпусцілі з ізалятару пад падпіску аб нявыездзе. А ўжо 14 красавіка, яго зноў затрымалі недалёка ад літоўскай мяжы. У ягоным доме адбыўся ператрус: канфіскаваныя ўсе ноўтбукі і флэшкі, фотаапарат, налепкі з гербам Пагоня, грошы ды іншыя рэчы. Была канфіскаваная нават газета на ўкраінскай мове, якую, як патлумачыў сам Вадзім Ермаловіч, ён узяў бясплатна ў адным кафэ ва Украіне.

Разгляд справы працягнецца зранку ў панядзелак 21 чэрвеня. Вадзіму Ермаловічу пагражае да трох гадоў абмежавання волі.

**20.06.2021** Напрыканцы красавіка 2021 году Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў пад нумарам 3919/2021 індывідуальную скаргу Мікалая Качурца. Прычынай звароту грамадскага актывіста ў Камітэт было неаднаразовае парушэнне беларускай дзяржавай яго права на ўдзел у мірных сходах і на публічнае выказванне свайго меркавання.

25 сакавіка 2019 году падчас святкавання БНР-101 Мікалай Качурэц сфатаграфаваўся з нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам на фоне помніка князю Альгерду ў Віцебску. Доказам гэтага дзеяння сталі відэаматэрыялы, зробленыя супрацоўнікамі Кастрычніцкага РАУС Віцебску.

11 красавіка 2019 году суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні да Качурца. Суддзя Сняжана Кіндзеева прызнала актывіста парушальнікам закону аб масавых мерапрыемствах і аштрафавала яго на 102 рублі.

Дзеля абароны свайго права на ўдзел у мірных публічных акцыях Качурэц звяртаўся ў вышэйшыя судовыя інстанцыі.

Аднак беларускія суды адмовіліся абараняць ягоныя правы, матывуючы сваю адмову тым, што раённы суд вынес пастанову, заснаваную на законе і абгрунтаваную фактычнымі доказамі.

Пасля адмовы судоў вышэйшай інстанцыі адстойваць ягоныя правы, Качурэц вычарпаў усе даступныя спосабы абараніць свае грамадзянскія правы ў межах нацыянальнага заканадаўства.

Каб прадоўжыць абарону правоў, 29 лістапада 2019 году віцяблянін звярнуўся ў Камітэт па правах чалавека ААН, які палічыў, што скарга актывіста досыць аргументаваная для рэгістрацыі і далейшага разгляду.

**20.06.2021** Камандзір менскага АМАПу палкоўнік Дзмітрый Балаба падаў грамадзянскі пазоў аб кампенсацыі маральнай шкоды, якую яму нібыта нанеслі каментары віцябляніна Вадзіма Ермаловіча, апублікаваныя ў тэлеграм-чаце «Vitebsk_Юг» у снежні 2020 году. Свае маральныя пакуты амапавец ацаніў у 1000 рублёў. Вадзім Ермаловіч, працэс над якім за абразу Балабы (арт. 369 КК) пачаўся ў Віцебску 18 чэрвеня, пазоў амапаўца прызнаў часткова. Заявіў, што патрабаванні варта знізіць да 500 рублёў.

Пазоў Дзмітрыя Балабы ў межах грамадзянскага працэсу быў агучаны 18 чэрвеня пасля перапынку ў судовым паседжанні ў справе 36-гадовага віцябляніна Вадзіма Ермаловіча, якога абвінавачваюць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). У пазоўнай заяве Дзмітрый Балаба сцвярджае, што «зазнаў маральныя пакуты», прачытаўшы каментар віцябляніна. 1000 рублёў кампенсацыі ў выпадку задавальнення іску просіць пералічыць на адрас адной з устаноў аховы здароўя.

Сам пацярпелы камандзір менскага АМАПу на працэс не з'явіўся. У матэрыялах справы маецца заява аб «немагчымасці яго прысутнасці» на працэсе праз выкананне службовых абавязкаў. Справу разбіраюць без яго.

«Мае багаты практычны вопыт»
На судзе таксама агучылі характарыстыку, дадзеную Балабе з месца працы. У ёй гаворыцца, што 49-гадовы Дзмітрый Балаба, які ад 2015 году займае пасаду начальніка АМАПу Менгарвыканкаму, «зарэкамендаваў сябе як прафесійна падрыхтаваны афіцэр і патрабавальны кіраўнік, які мае добрую тэарэтычную падрыхтоўку і багаты практычны вопыт». Быў узнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць». Спагнанняў за час службы не меў.

Паводле пратаколу допыту Балабы, агучанага на паседжанні, ён у перыяд электаральнай кампаніі 2020 году забяспечваў кіраўніцтва даручанага яму падраздзялення «па спыненні масавых беспарадкаў і падтрымання парадку на тэрыторыі РБ». Сцвярджае, што яго дзеянні цалкам адпавядалі патрабаванням заканадаўства.

Каментары, з нагоды якіх была заведзеная крымінальная справа, тычыліся паведамлення пра тое, што Дзмітрый Балаба заразіўся каронавірусам і знаходзіцца ў лякарні. Аўтар каментароў ужывае слова «мусар». Вадзім Ермаловіч прызнаў, што быў аўтарам допісаў і што зняважыў супрацоўніка АМАП. Але просіць суд зменшыць іскавыя патрабаванні Балабы напалову.

Завялі крыміналку на дзень народзінаў. Што яшчэ вядома ў справе Ермаловіча
Крымінальную справу паводле арт. 369 на Вадзіма Ермаловіча завялі роўна ў ягоны дзень нараджэння – 13 красавіка.

Затрымалі за 7 км да мяжы. Вадзім Ермаловіч да 14 красавіка знаходзіўся пад падпіскай аб нявыездзе. 14 красавіка яго затрымалі на адлегласці 7 км ад дзяржаўнай мяжы РБ каля вёскі Матылі Шчучынскага раёну. На судзе сцвярджае: пра тое, што на яго днём раней завялі крымінальную справу, ён не ведаў.

«Схільны да экстрэмізму».

Пасля затрымання ў памежнай зоне Вадзіму Ермаловічу змянілі меру стрымання і ўзялі пад варту. Ён утрымліваецца ў СІЗА-2 Віцебску. З характарыстыкі, пададзенай у суд начальнікам СІЗА, стала вядома, што Ермаловіча паставілі на прафілактычны ўлік як «схільнага да экстрэмісцкай дзейнасці».
Камеру слухалі. Матэрыялы справы Ермаловіча ўтрымліваюць аўдыёзапіс яго размовы з сукамернікамі ў следчым ізалятары.

Яго чакалі ў Варшаве на працы. Яшчэ да таго, як на яго завялі «крыміналку», Ермаловіч быў гатовы выехаць працаваць у Польшчу: меў візу і запрашэнне на працу, набыў нават білет у Варшаву.
Чакаецца, што 21 чэрвеня ў працэсе адбудуцца судовыя спрэчкі. З боку абвінавачання выступае пракурор Аляксандр Філімонаў, інтарэсы падсуднага бароніць адвакатка.

**21.06.2021** 21 чэрвеня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску ў межах крымінальнай справы, распачатай у дачыненні да 36-гадовага Вадзіма Ермаловіча, адбыліся спрэчкі бакоў. Пракурор Аляксандр Філімонаў папрасіў суд прызнаць віцябляніна вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) і пакараць яго абмежаваннем волі на 1 год і 6 месяцаў. Адвакатка падсуднага папрасіла абмежавацца арыштам на тэрмін, які мужчына ўжо адбыў у следчым ізалятары.

Працэс вядзе суддзя Наталля Карабліна. На пачатку судовага пасяджэння 21 чэрвеня стала вядома, што бацькі Вадзіма Ермаловіча аплацілі пазоўныя патрабаванні (1000 рублёў), якія выставіў пацярпелы кіраўнік менскага АМАПу Дзмітрый Балаба ў якасці кампенсацыі маральных пакутаў. Дакумент аб аплаце далучылі да матэрыялаў крымінальнай справы.

Пракурор: Падае прэстыж дзяржаўнай улады ўвогуле
Падчас судовых спрэчак дзяржаўны абвінаваўца Філімонаў папрасіў суд «Ермаловіча Вадзіма прызнаць вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў». Меру стрымання да набыцця прысудам законнай моцы пракурор папрасіў замяніць з заключэння пад варту на падпіску аб ня выездзе.

«Грамадская небяспека публічнай абразы прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім сваіх службовых абавязкаў уяўляе павышаную небяспеку, паколькі такія дзеянні здольныя парушыць нармальнае функцыянаванне апарату ўлады. У выніку падобных дзеянняў падрываецца аўтарытэт таго органа ўлады, які прадстаўляе пацярпелы. Таксама падае прэстыж дзяржаўнай улады ўвогуле. Зніжэння аўтарытэту ўлады ў свядомасці грамадзян негатыўна адбіваецца на функцыянаванні дзяржаўнага апарату», – патлумачыў пракурор.

Адвакатка: Ён не хаваўся ад следства

Адвакатка Вадзіма Ермаловіча звярнула ўвагу суддзі на змякчальныя акалічнасці: кампенсаванне маральнай шкоды, поўнае прызнанне віны яе падабаронным, а таксама на тое, што той атрымаў станоўчую характарыстыку з працы.



Заўважыла, што Ермаловіч быў затрыманы каля

літоўскай мяжы неўзабаве пасля завядзення крымінальнай справы, але пры гэтым ён не ведаў, што ў дачыненні да яго была вынесеная пастанова.

Акурат таму ягоную паездку нельга трактаваць як спробу схавацца ад следства.

Адвакатка прасіла суд абмежавацца пакараннем у выглядзе арышту на тэрмін, які яе падабаронны ўжо адбыў. Вадзім Ермаловіч знаходзіцца ў СІЗА ад 14 красавіка 2021 году.
Падсудны: Я і так законапаслухмяны
Ад апошняга слова Вадзім Ермаловіч адмовіўся. Сказаў, што яму няма чаго дадаць. «Жыццё як свае будаваць збіраецеся?» – спытала суддзя Наталля Карабліна. «Працаваць буду», – адказаў падсудны. «Да жніўня 2020 году яно ў мяне даволі стабільнае было. Так і буду працягваць», – дадаў. На пытанне суддзі, ці збіраецца быць законапаслухмяным грамадзянінам, Вадзім Ермаловіч адказаў: «Я і да гэтага сябе законапаслухмяна паводзіў».

Прысуд Вадзіму Ермаловічу абвесцяць 22 чэрвеня ў 10.00.

**22.06.2021** Адзін год і 6 месяцаў абмежавання волі – менавіта такое рашэнне 22 чэрвеня прыняла ў дачыненні віцябляніна Вадзіма Ермаловіча суддзя Наталля Карабліна. Суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў мужчыну вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) – камандзіра менскага АМАПу палкоўніка Дзмітрыя Балабы. Падставай былі некалькі каментароў у Тэлеграм-чаце. Пасля абвяшчэння прысуду Ермаловіча вызвалілі з-пад варты ў зале суду.

«Вадзіма Ермаловіча прызнаць вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе артыкулу 369 КК РБ прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу», – пастанавіла суддзя Наталля Карабліна.

Акурат такога пакарання прасіў напярэдадні і пракурор Аляксандр Філімонаў. Суддзя таксама пастанавіла змяніць меру стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе ды канфіскаваць мабільны тэлефон як прыладу злачынства.

Прысуд не набыў законнай моцы.

Пад арыштам у следчым ізалятары Вадзім прабыў больш за два месяцы – ад 14 красавіка, з моманту ягонага затрымання ў Шчучынскім раёне недалёка ад мяжы з Літвой.

«На словах гэта не патлумачыш...»
«Калі ты там знаходзішся або сустракаеш людзей, якія там знаходзіліся, пачынаеш разумець, што гэта такое. Чалавеку, які там ніколі не быў, немагчыма патлумачыць, што гэта такое. Таму што на словах гэта не патлумачыш...» – сказаў аб знаходжанні ў віцебскім следчым ізалятары Вадзім Ермаловіч па вызваленні.

У СІЗА-2 яго паставілі на прафілактычны ўлік як «схільнага да экстрэмізму». Але ў дадзены спіс, паводле слоў асуджанага, пападаюць там усе, хто знаходзіцца пад следствам па «палітычных артыкулах».

Крымінальная справа паводле арт. 369 была распачатая супраць Вадзіма Ермаловіча за некалькі каментароў «Тэлеграме», якія ён размясціў 18 і 24 снежня 2020 году ў чатах «Vitebsk_Юг» і «Невероятный Витебск». На судзе ён прызнаў сваю віну ў поўным аб'ёме і заплаціў 1000 рублёў пацярпеламу за «маральныя пакуты», якія нібыта спазнаў палкоўнік Балаба.

Вадзім Ермаловіч збіраецца абскардзіць пастанову суддзі Караблінай у Віцебскім абласным судзе.

**23.06.2021** 23 чэрвеня Віцебскі абласны суд разгледзеў дзве скаргі журналіста-фрылансера з Глыбокага Змітра Лупача. Журналіст спрабаваў аспрэчыць рашэнні Глыбоцкага і Браслаўскага раённых судоў, якія 25 траўня прызналі яго вінаватым паводле ч.3 арт.23.5 КаАП («Незаконны выраб прадукцыі СМІ») і аштрафавалі агулам на 60 базавых велічынь.

Скаргу Змітра Лупача на пастанову суду Глыбоцкага раёну ад 25 траўня разглядала суддзя Святлана Іванова. Пастановай райсуду Лупач прызнаны вінаватым у незаконным вырабе прадукцыі СМІ і паводле ч.3 арт. 23. 5 КаАП аштрафаваны на 30 базавых велічыняў (870 рублёў) без канфіскацыі прадмета адміністрацыйнага правапарушэння. Зміцер Лупач нібыта ўзяў інтэрв'ю ў глыбачаніна Аляксандра Шарабайкі і перадаў матэрыял для публікацыі на ютуб-канале Белсату. Паводле судовага рашэння, сваімі дзеяннямі журналіст парушыў заканадаўства аб СМІ.

З рашэннем Глыбоцкага суду журналіст не пагадзіўся. У скарзе выказаў меркаванне, што былі парушаныя ягоныя правы, гарантаваныя Канстытуцыяй і Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Прасіў абласны суд пастанову адмяніць і спыніць справу праз адсутнасць у ягоных дзеяннях складу адміністрацыйнага правапарушэння.

Суддзя Святлана Іванова сваім рашэннем пакінула пастанову суду першай інстанцыі без зменаў, а скаргу без задавальнення.

Суддзя Ірына Смалякова разгледзела скаргу Змітра Лупача на пастанову суддзі Браслаўскага раённага суду ад 25 траўня. На падставе ч.3 арт. 23.5 КаАП суд прыцягнуў журналіста да адміністрацыйнай адказнасці, аштрафаваўшы на 30 базавых велічынь (870 рублёў). Лупач быў прызнаны вінаватым у незаконным вырабе відэасюжэту, размешчанага на ютуб-канале Белсату.

У сваёй скарзе Зміцер Лупач выказаў нязгоду з пастановай. Палічыў, што суд недакладна выканаў норму, якая ўстанаўлівае адміністрацыйную адказнасць. Даводзіў, што сваімі дзеяннямі не нанёс шкоды грамадскаму парадку, дзяржаўнай бяспецы, здароўю, маральнасці, правам і інтарэсам грамадзянаў. Прасіў пастанову адмяніць, а справу спыніць з тых жа прычын – у сувязі з адсутнасцю складу правапарушэння.

Суддзя Ірына Смалякова пакінула скаргу журналіста без задавальнення. Рашэнне суду Браслаўскага раёну ад 25 траўня пакінула без зменаў.

На разгляд кожнай скаргі і прыняцце рашэння суддзям Івановай і Смаляковай спатрэбілася менш за тры хвіліны.

**23.06.2021** Жыхарам Наваполацку Віктару Шауру і Віталю Шыцікаву замест «хіміі» прысудзілі «калонію», паведамляе ПЦ «Вясна».

22 чэрвеня такое рашэнне прыняў Віцебскі абласны суд, разгледзеўшы ў апеляцыйным парадку пратэст пракурора на рашэнне суду Наваполацку, які прысудзіў навапалачанам па два гады «хіміі» паводле арт. 342 КК. Абласны суд задаволіў пратэст і ўзмацніў пакаранне.

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, Віцебскі абласны суд задаволіў пратэст пракурора на мяккасць выраку суду першай інстанцыі і змяніў пакаранне для палітвязняў Віктара Шауры і Віталя Шыцікава з «абмежавання волі» («хімія») на «пазбаўленне волі». Для Шауры – на 2 гады калоніі, для Шыцікава – на 2 гады і 6 месяцаў калоніі.

Навапалачан затрымалі 10 жніўня 2020 году. Абодвум выставілі абвінавачанні паводле арт. 342 КК («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх»).

У студзені 2021 году іх справу разбіраў суд гораду Наваполацку.

Паводле абвінавачвання, «Віктар Шаура разам з Віталём Шыцікавым і іншымі неўстаноўленымі асобамі ўвечары 10 жніўня бралі актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушылі грамадскі парадак... разам з іншымі рухаліся па праезнай частцы вуліцы Маладзёжнай Наваполацку, ішлі наперадзе групы грамадзян на забаронены сігнал святлафора, перакрывалі рух транспарту, гучна крычалі «Жыве Беларусь!», «Ганьба», «Позор», «Уходи!», пляскалі ў далоні, нецэнзурна лаяліся ў бок прадстаўнікоў праваахоўных органаў».

21 студзеня суддзя Віталь Лапко прызнаў мужчын вінаватымі і прысудзіў абодвух да двух гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Менавіта на гэты прысуд пракуратура Наваполацку прынесла пратэст, а Віцебскі абласны суд яго задаволіў.

Па стане на 23 чэрвеня ў Беларусі прызнаныя палітычнымі вязнямі 502 чалавекі.

**24.06.2021** Начальнік галоўнага ўпраўлення працэсуальнага кантролю СК РБ Сяргей Цішук не ўбачыў парушэнняў у дзеяннях сваіх падначаленых у сувязі са з'яўленнем у інтэрнэце відэароліку, у якім віцяблянін Алег Баразна прызнаецца ў тым, што ён з'яўляецца каардынатарам руху «Краіна для жыцця» ў Віцебску, і ўказвае на махінацыі з грашовымі сродкамі палітыкаў Ціханаўскіх. Аб гэтым паведамляецца ў адказе са следчага камітэту, які атрымаў праваабаронца Павел Левінаў.

Перапіска праваабаронцы са следчымі органамі і пракуратурай пачалася пасля таго, як 15 красавіка 2021 году на тэлеграм-канале «Вашы слівы» быў размешчаны відэаролік, дзе Алег Баразна, які знаходзіцца ад пачатку лютага 2021 году ў СІЗА №2 Віцебску, чытае з відэасуфлёру тэкст, які мае дачыненне да дадзеных папярэдняга расследавання.

Гэтак жа, 16 красавіка 2021 году зліты відэаролік быў размешчаны на YouTube-канале "Жулікі Беларусі".

У публікацыі відэароліку маюцца прыкмета парушэння артыкулу 198 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, які не дапускае выдавання дадзеных папярэдняга расследавання без дазволу следчага. Акурат з гэтай прычыны праваабаронца Павел Левінаў звярнуўся ў следчыя органы з просьбай устанавіць асобу следчага, які перадаў дадзеныя папярэдняга расследавання телеграмканалу «Вашы слівы», і даць прававую ацэнку ягоным дзеянням.

Намеснік начальніка упраўлення следчага камітэта РБ па Віцебскай вобласці Гушча паведаміў Левінаву, што ўстанавіць, кім выраблены і размешчаны ў глабальнай камп'ютэрнай сетцы

Інтэрнэт відэазапіс не было магчымым. Пасля гэтага Левінаў быў вымушаны звярнуцца са скаргай у галоўнае ўпраўленне СК.

У сваім звароце праваабаронца характарызуе працу упраўлення следчага камітэту Рэспублікі

Беларусь па Віцебскай вобласці па устанаўленні следчага, які парушыў арт. 198 КПК РБ у справе Алега Борозны, «бездапаможнасцю».

«Па сутнасці довадаў паведамляем, што згаданы ў Вашым звароце відэазапіс, размешчаны ў агульным доступе ў сетцы Інтэрнэт, не ўтрымлівае якіх-небудзь дадзеных папярэдняга следства, разгалошанне якіх супярэчыць яго інтарэсам, і не звязаны з парушэннем правоў і законных інтарэсаў удзельнікаў крымінальнага працэсу", - растлумачыў Левінаву пазіцыю СК начальнік ГУПК Сяргей Цішук.

А калі так, то следчыя органы не бачаць падставаў для правядзення праверкі, а таксама прыняцця рашэння ў парадку, устаноўленым Крымінальна-працэсуальным законам.

Праваабаронца ўпэўнены, што знайсці, кім, калі і дзе выраблены відэазапіс, было лёгка. На яго думку, трэба было ўсяго толькі апытаць Алега Баразну, а потым па ланцужку устанавіць таго, хто відэазапіс размясціў у публічным доступе. Няма таксама ніякіх праблем, каб знайсці і службовую асобу - гаспадара кабінету, у якім гэты відэазапіс рабіўся, і апытаць яго. Але з якіх прычын следчы камітэт не стаў гэтага рабіць, праваабаронцу невядома.

**25.06.2021** Падпалкоўнік расейскай паліцыі ў адстаўцы, грамадзянін РФ і беларускі палітвязень Андрэй Новікаў больш за два месяцы ўтрымліваецца ў менскім СІЗА-1 на вул. Валадарскага. Гэтым разам яму інкрымінуюць незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы (арт. 371 КК). Следства ўжо завершанае. Пра гэта паведаміла жонка палітвязня.

«Чакаем суду. Калі будзе суд, пакуль не ведаю. Дату пакуль не ўстанавілі. Дзе адбудзецца суд, таксама не ведаю. Дзесьці ў Віцебскай вобласці пройдзе», – кажа жонка Андрэя Новікава Вольга.

Спаткання не дазволілі
Жанчына адна выхоўвае дваіх няпоўнагадовых дзяцей, адзін з іх мае групу інваліднасці. За два месяцы яна ніводнага разу не пабачыла мужа.

«Спатканне ніхто не дазваляе. Не даюць пакуль што. Маўляў, пакуль следства – ніякіх спатканняў. Цяпер ужо, відаць, пабачымся на судзе», – кажа.

Ад амбасады РФ - нуль рэакцыі
Па словах Вольгі, тое, што Андрэй мае расейскае грамадзянства, пакуль што ніякім чынам яму не дапамагае. З боку амбасады РФ – нуль рэакцыі.

«Расейскае пасольства ніякага ўдзелу ў гэтым не бярэ. Чакаем, чакаем, а ніхто не прыходзіць, не прыязджае. Хоць звярталіся. І з Расеі звярталіся, і сам муж звяртаўся. Але ніякай рэакцыі. Чакаем...» – падзялілася жанчына.

Паводле Вольгі, у Расеі ў яе мужа амаль нікога няма. Пасля дэпартацыі ён папрацаваў там некалькі месяцаў.



«Выперлі чалавека, вырвалі з жыцця. І пакінулі без усяго. Тут усё ў яго, у Беларусі – і сям'я, і маёмасць. Усе сваякі на Пастаўшчыне», – абураецца Вольга.

Лісты з Валадаркі
Андрэй Новікаў пасля дэпартацыі з Беларусі прыняў рашэнне вярнуцца дадому, у вёску Прусы Пастаўскага раёну, каб адвезці ў Менск на лячэнне хворага дзіцяці.

Але зрабіць гэтага так і не здолеў – яго зноў затрымалі.

«У Менск на лячэнне я дзіця адвезла-ткі. Прыйшлося ўсё мяняць, усё зрываць, усё перарабляць. І наагул кучу ўсяго вырашаць, але ўсё ж паехалі», – распавядае Вольга.

Яна расказала, што атрымала з Валадаркі некалькі лістоў ад мужа.

«Лісты піша. Піша, што адчувае сябе нармальна. Ён аптыміст. Трымаецца як звычайна. Малайчына!» – кажа жонка палітвязня.

Андрэй Новікаў, падпалкоўнік расейскай паліцыі ў адстаўцы, быў затрыманы 14 красавіка 2021 года ў вёскі Прусы, што на Пастаўшчыне, куды таемна прыехаў да сваёй сям’і, каб адвезці хворага дзіця на лячэнне. Яго абвінавацілі ў незаконным перасячэнні дзяржаўнай мяжы (арт. 371 КК), у доме прайшоў перагрус, была канфіскаваная тэхніка і дакументы.

Раней, падчас прэзідэнцкай кампаніі 2020 году, ён браў актыўны ўдзел у якасці валанцёра «Краіны для жыцця». Супраць яго была распачатая крымінальная справа па ч.1 арт. 342 («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак»). Справа дагэтуль не спыненая. 7 месяцаў Новікаў правёў у следчым ізалятары, пасля ўлады дэпартавалі яго ў Расею, забараніўшы цягам 10 гадоў уязджаць на тэрыторыю Беларусі. Андрэй быў прызнаны палітвязнем.

**27.06.2021** На пачатку чэрвеня 2021 году Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў індывідуальную скаргу Алега Паўлава пад нумарам 3952/2021. Прычынай звароту грамадскага актывіста ў Камітэт было парушэнне беларускай дзяржавай ягонага права на ўдзел у мірных сходах.

29 снежня 2019 году Алег Паўлаў узяў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні з мэтай публічнага выказвання свайго пратэсту супраць інтэграцыі Беларусі і Расіі. Падчас пікету актывіст трымаў у руках бел-чырвона-белы сцяг і плакат “Незалежнасць”.

15 студзеня 2020 году суд Чыгуначнага раёну Віцебску разгледзеў адміністрацыйныя справы ў дачыненні да Паўлава. Суддзя Алена Цыганкова прызнала мужчыну парушальнікам заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і аштрафавала яго на 675 рублёў.

Для абароны свайго права на ўдзел у масавых мерапрыемствах і публічнае выказванне сваёй грамадзянскай пазіцыі

Алег Паўлаў звяртаўся ў вышэйшыя судовыя інстанцыі. Аднак беларускія суды адмовіліся бараніць яго правы, матывавалі сваю адмову тым, што суд Чыгуначнага раёну вынес пастанову законна і абгрунтаваў сваё рашэнне фактычнымі доказамі.

Пасля адмовы вышэйшых судоў абараняць ягоныя канстытуцыйныя правы Паўлаў вычарпаў усе даступныя юрыдычныя магчымасці абараніць сябе ў межах нацыянальнага заканадаўства.

Для абароны сваіх правоў 6 лютага 2020 году актывіст звярнуўся ў Камітэт па правах чалавека, які палічыў, што зварот Паўлава досыць аргументаваны для рэгістрацыі і далейшага разгляду згодна з працэдурамі ААН.

**28.06.2021** 28 чэрвеня суд Віцебскага раёну працягнуў разгляд адміністрацыйнай справы ў дачыненні да актывістаў Андрэя Кулакова і Марыі Волкавай, вернутай 27 траўня суддзёй Таццянай Лабацкай на дапрацоўванне ў міліцыю. Андрэй Кулакоў удзельнічаў у судовым паседжанні праз скайп. Віны сваёй фігуранты адміністрацыйнай справы не прызналі, але на вынесены прысуд гэта не паўплывала.

Як раней паведамляла «Віцебская Вясна», паўторны разгляд справы Марыі Волкавай і Андрэя Кулакова ініцыявала пракуратура. У кастрычніку 2020 году суд Віцебскага раёну абвінаваціў Марыю Волкаву ў правядзенні несанкцыянаванага пікетавання (арт. 23.34 КаАП) у вёсцы Лучынаўка, прызнаў яе вінаватай і аштрафаваў на 15 базавых велічынь. Справа ў дачыненні да Кулакова летась была спыненая.

На паседжанні 28 чэрвеня Марыя Волкава заявіла, што абставіны той ночы амаль не памятае і адаслала суд да сваіх першапачатковых паказанняў, зафіксаваных у матэрыялах справы. Маўляў, ніякіх малюнкаў і сімвалаў на сцены не наносіла, а ўцякаць кінулася абсалютна інстынктыўна, бо не ўспрыняла людзей, якія выбеглі з машыны, з міліцыянтамі.

Андрэй Кулакоў, як і мінулым разам, праз скайп быў вельмі актыўны. У нейкі момант суддзі Таццяне Лабацкай гэта не спадабалася, і яна загадала адключыць злучэнне. Далейшыя слуханні прайшлі без удзелу Кулакова.

Як і летась, супрацоўнікі ДПС Віцебскага раёну Чаплыгін і Ануфрыеў засведчылі ў судзе, што ў тую ноч тры разы праязджалі праз Лучынаўку. На другі раз бачылі, як мужчына і жанчына наносілі малюнкі на сцяну шынамантажа ля кавярні «Сава», пра што і паведамілі дзяжурнаму. На трэці раз пасля непрацяглага пераследу затрымалі Волкаву і Кулакова. Засведчылі, што рукі Волкавай нібыта былі запэцканыя чорнай фарбай, якую яна імкнулася сцерці.

Вялікі адрэзак працэсу заняў прагляд відэафайлаў, пададзеных службай ДПС. Часткай інфармацыі, зафіксаванай на відэа, скарыстаўся бок абароны. Так адвакатка Волкавай адзначыла, што пры затрыманні Кулакова першапачаткова размова пра малюнкі на сценах наагул не ішла. Міліцыянты хацелі праверыць яго на датычнасць да ўскрыцця фураў, якія былі прыпаркаваныя паблізу. Таксама супрацоўнікі ДПС да затрымання Кулакова і Волкавай нідзе не казалі, што тыя малююць. А да Волкавай і наагул некалькі разоў была ўжытая фраза «другі пабег», а не «пабегла», то бок пэўнасці, што гэта была дзяўчына, не было.

На погляд адвакаткі, суду ізноў не было пададзена дастаткова доказаў, якія б пацвердзілі факт учынення яе падабароннай адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжанага арт. 23.34 КаАП.



Абаронца прасіла адміністрацыйную справу ў дачыненні да Волкавай спыніць з прычыны недаказанасці яе віны.

Выслухаўшы довады абароны, суддзя Таццяна Лабацкая, не выходзячы з залы, пастанавіла на падставе ч. 1 арт. 23. 34 КаАП ізноў аштрафаваць Марыю Волкаву на 15 базавых, а Андрэя Кулакова на падставе ч. 3 арт. 34. 34 КаАП – на 40 базавых велічыняў.

**29.06.2021** Суд Чашніцкага раёну прызнаў вінаватай 59-гадовую жыхарку аграгарадку Лукомль у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў (арт. 369 КК). Жанчына ў снежні 2020 году напісала нібыта зняважлівы каментар у дачыненні прэс-сакратаркі МУС Вольгі Чамаданавай. За гэта ёй прысудзілі паўтара года «хатняй хіміі», паведамляе служба інфармацыі пракуратуры Віцебскай вобласці.

Паводле матэрыялаў справы, грамадзянка П., знаходзячыся ў аграгарадку Лукомль Чашніцкага раёну, са свайго персанальнага камп'ютара размясціла ў сацыяльнай сетцы зняважлівы каментар у дачыненні прэс-сакратаркі Міністэрства ўнутраных спраў. Каментар стаў даступны для прачытання «неабмежаванай колькасці карыстальнікаў сеткі Інтэрнэт», гаворыцца ў паведамленні.

Сцвярджаецца, што жанчына на судзе прызнала сваю віну цалкам, раскаялася ва ўчыненым і «добраахвотна кампенсавала прычыненую маральную шкоду».

«З улікам пазіцыі дзяржабвінаваўцы і пададзеных доказаў суд Чашніцкага раёну пастанавіў абвінаваўчы прысуд. На падставе арт. 369 КК суд прызначыў пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 1 год і 6 месяцаў», – паведамляе абласная пракуратура.

Камп’ютар, які выкарыстоўваўся як сродак учынення злачынства, канфіскаваны на карысць дзяржавы.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**30.06.2021** Пра затрыманне 35-гадовага жыхара Наваполацку паведамілі ва ўпраўленні ГУБАЗіК у Віцебскай вобласці. Паводле ведамства, мужчына браў удзел у масавых беспарадках у Наваполацку ў жніўні 2020 году. У дачыненні яго заведзеная крымінальная справа. Паведамляецца, што навапалачанін дае прызнальныя паказанні.

«Увечары 10 жніўня мужчына знаходзіўся сярод дзясяткаў агрэсіўна настроеных пратэстоўцаў, якія руйнавалі камунальную маёмасць і ўдзельнічалі ў сутычках з міліцыяй.

Падчас нападу гараджанін зламаў нос вайскоўцу ўнутраных войск», – гэтак падаецца афіцыйная версія здарэння, апублікаваная на сайце УУС Віцебскага аблвыканкаму.

Сцвярджаецца, што затрыманы навапалачанін раскайваецца і дае прызнальныя паказанні.

Са слоў затрыманага, да ўдзелу ў жнівеньскіх падзеях у горадзе яго справакавала інфармацыя ў тэлеграм-каналах.

«Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням мужчыны і распачалі крымінальную справу за ўдзел у масавых мерапрыемствах», – паведамляецца. Верагодна, што справа заведзеная паводле ч.2 арт. 293 КК, якая прадугледжвае максімальнае пакаранне да 8 гадоў пазбаўлення волі.

Фігурант справы працуе электразваршчыкам на адным з прадпрыемстваў Наваполацку. Ягонае прозвішча ўдакладняецца.

**01.07.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску 1 ліпеня пачаў разглядаць чарговую крымінальную справу, заведзеную за публічную абразу прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). На лаве падсудных – віцяблянін Сяргей Ільюшэнка.

Нягледзячы на «адкрытасць» працэсу, у залу суду амаль нікога не пусцілі. Журналісты і валанцёры-праваабаронцы засталіся за дзвярыма.

Справу разбірае суддзя Таццяна Родзіна. У лютым і сакавіку 2020 году гэтая ж суддзя разглядала справу цяперашняга палітвязня Уладзіміра Малахоўскага (прысудзіла яму тры з паловай гады калоніі) – на той працэс журналісты і нават сваякі падсуднага таксама трапіць не маглі. У судзе Першамайскага раёну гэта ўжо стала сумнай тэндэнцыяй. Гэтак, зусім нядаўна тут адбыўся разгляд крымінальнай справы па тым жа арт. 369 КК у дачыненні Вадзіма Ермаловіча. Тады, апроч бацькоў падсуднага, у залу запускалі толькі аднаго слухача. На працэс жа Сяргея Ільюшэнкі не пусцілі ніводнага. Суд стаўся па сутнасці закрытым.

На думку віцебскай праваабаронца Ірыны Траццяковай, гэтая з'ява носіць зусім невыпадковы характар, і пандэмія каронавірусу тут зусім ні прычым.

«Яны баяцца публічнасці, таму што з працэсаў з’яўляюцца фотаздымкі, тысячы людзей бачаць, як затрыманых, яшчэ да вынясення прысуду, заводзяць у суд у позе «ластаўкі». Прыклад таму – Ермаловіч. Тэндэнцыя такая: рабіць усё, каб ніхто нічога не ведаў. Ціхенька засудзіць і пасадзіць. Тады і пытанняў няма. І скаргі ніякай не напішаш. Тады і з «кампетэнтнымі органамі» няма пра што гаварыць, бо праваабаронцы не могуць прывесці нейкія факты і довады пра парушаныя правы», – кажа Ірына Траццякова.

Паводле праваабаронцы, падобная сітуацыя назіралася восенню 2020 году, калі ў горадзе толькі пачыналіся палітычныя працэсы. Многіх актывістаў, журналістаў і праваабаронцаў не пускалі ў залы судовых пасяджэнняў, спасылаючыся на каронавірус і цеснату ў памяшканнях. Толькі шматлікія звароты са скаргамі ў Вярхоўны і абласны суды крыху палепшылі сітуацыю. Цяпер яна зноў адкацілася назад – трапіць на суд стала вялікай праблемай.

Праваабаронца раіць пісаць скаргі на дзеянні суддзяў і дамагацца адкрытага разбору справаў.

Падрабязнасці першага судовага паседжання ў справе Сяргея Ільюшэнкі высвятляюцца. Сочым за працэсам.



**02.07.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 2 ліпеня працягнуўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да Сяргея Ільюшэнкі, якога абвінавачваюць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК РБ). Абвінавачаны выступіў з апошнім словам. На папярэднім пасяджэнні, куды не пусцілі журналістаў, пракурорка Наталля Гаўрылюк запатрабавала для мужчыны два з паловай гады «хіміі». Адвакат прасіў абмежавацца штрафам.

Сяргей Ільюшэнка цалкам прызнаў сваю віну. Зараз ён знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе.

«Злога намеру не меў. Кагосьці канкрэтна пакрыўдзіць не хацеў. Калі б была магчымасць папрасіць прабачэння ў пацярпелага – папрасіў бы. Прашу суд не быць дужа суровым пры вынясенні мне выраку», – сказаў у апошнім слове Сяргей Ільюшэнка.

«Краіна мусіць ведаць сваіх герояў у твар»
Пасля судовага паседжання ён распавёў падрабязнасці справы.

«12 жніўня 2020 году раніцай пабачыў у сацсетцы «ВКонтакте» пост пра Сташэўскага. Што, маўляў, чыноўнік прымушае сваіх падначаленых змяняць вынікі выбараў, заклікае фальсіфікаваць іх. Вядома, усе пачалі абурацца. І я напісаў кшталту «як табе не сорамна ў вочы людзям глядзець», «краіна мусіць ведаць сваіх герояў у твар».

Я і забыўся, што напісаў. А вясной 2021-га прыехалі да мяне і адвезлі ў СІЗА на Гагарына, «закрылі» на трое сутак. У красавіку выйшаў з СІЗА, быў пад следствам. І вось суд...» – расказаў Ільюшэнка.

Паводле ягоных слоў, пад допісам пра чыноўніка Сташэўскага гнеўныя каментары напісала тады некалькі дзясяткаў чалавек. Кажа, што, па словах следчых, усе людзі, якія пракаментавалі той пост, прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. За выключэннем аднаго, асобу якога не ўдалося ідэнтыфікаваць.

Кампенсацыі Сташэўскі не просіць
Дарэчы, фінансавай кампенсацыі за маральныя пакуты, як гэта часта бывае ў такіх выпадках, пацярпелы чыноўнік прасіць не стаў. Сяргей Сташэўскі, былы кіраўнік Кастрычніцкага раёну Віцебску, атрымаў «шырокую вядомасць» пасля публікацыі ў інтэрнэце аўдыязапісу, на якім ён прымушае настаўнікаў перапісваць выніковы пратакол, памяняўшы месцамі прозвішчы Лукашэнкі і Ціханоўскай. Неўзабаве пасля скандалу ён быў звольнены і пераведзены ў Менск на новую пасаду.

Дадамо, што па месцы жыхарства ў Сяргея прайшоўператрус, былі канфіскаваныя тэлефон і сістэмны блок.

Прысуд па крымінальнай справе Сяргея Ільюшэнкі абвесцяць 5 ліпеня ў 10.00. Агучыць яго суддзя Таццяна Родзіна.

**02.07.2021** 1 ліпеня ў Віцебску прайшла ператрусы ў віцебскіх актывістак Таццяны Севярынец, Людмілы Камінскай і Тамары Ільіной. Яны былі фігуранткамі так званай справы «лясных фей». Ператрусы праводзілі супрацоўнікі аддзялення па наркакантролю і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Чыгуначнага РАУС. У маці палітвязня Паўла Севярынца Таццяны забралі кнігі, бел-чырвона-белы парасон і некалькі нацыянальных сцяжкоў.

Як паведаміла Таццяна Севярынец, падставай для правядзення ператрусу была крымінальная справа, распачатая яшчэ летась  паводле «антынаркатычнага» арт. 328 супраць віцебскага актывіста Аляксандра Мацеюка.

Галоўным у «перытрусавай» брыгадзе быў міліцыянт Ілья Іваноў.

«Прынеслі пастанову, што ў сувязі са справай Мацеюка трэба правесці перытрус у мяне, бо мы знаёмыя», – расказала Таццяна.

«Дзе што паказвала, дзе што казала, дзе сароміла, дзе здзекавалася над імі. Я кажу, вы спачатку пакажыце мне вашыя кішэні. Што вы прынеслі? А яны раз – і палезлі ў кішэні. Але спахапіліся, кажуць: не, мы вам не будзем паказваць. Я кажу, маўляў, ага, вы мне не будзеце паказваць, а я вам мушу паказаць усю хату па вось гэтай справе ганебнай?» – падзялілася дэталямі актывістка.

Падчас вобшуку, які рабілі тры міліцыянты, прысутнічалі двое панятых.

Супрацоўнікі забралі з кватэры 16 кніжак «Люблю Беларусь» Паўла Севярынца, а таксама кнігі іншых аўтараў, некалькі невялікіх бел-чырвона-белых сцяжкоў і парасон у бела-чырвоных колерах.

«Зайшлі ў пакой Пашы. Убачылі кніжкі. Я кажу, гэта кнігі майго сына, пакладзіце на месца. Супрацоўнік пайшоў тэлефанаваць. Потым прыйшоў і сказаў: забіраем. Яны забралі ўсе, бо кнігі – з бел-чырвона-белай вокладкай: чырвонымі літарамі «Люблю Беларусь» – на белым фоне», – распавяла Таццяна.

Ўсе канфіскаваныя рэчы супрацоўнікі МУС паклалі ў скрынку ад пасылкі, якую таксама знайшлі ў кватэры. Тую пасылку з харчамі даслалі для палітвязня неабыякавыя беларусы.

«Пытаюцца, ці чытала я гэтыя кнігі? Слухайце, кажу, калі б вы былі пісьменнікам, дык вашая мама чытала б вашыя кнігі ці не? Што вы мне такія пытанні задаяце?» – абураецца актывістка.

Цалкам магчыма, што супрацоўнікі сілавых структур прыходзілі, каб падкінуць наркотыкі, мяркуе Таццяна.

«Пяць чалавек па кватэры ходзяць. Дзе яны двума пальцамі ў якую шчыліну маглі засунуць, я не ведаю. Калі яшчэ раз прыйдуць і знойдуць – значыць пайду я па 328», – падсумавала Таццяна Севярынец.

**05.07.2021** У Віцебскім абласным судзе 5 ліпеня пачаўся крымінальны працэс у справе 26-гадовага жыхара Наваполацку Яўгена Харашкевіча, затрыманага ў студзені 2021 году. У дачыненні мужчыны выстаўленыя абвінавачанні паводле трох артыкулаў, у тым ліку паводле арт. 342 КК («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх»). Журналістаў і праваабаронцаў на паседжанне не пусцілі: суд закрыты.

Паводле афіцыйнай інфармацыі аб працэсе, Яўген Харашкевіч абвінавачваецца ў распальванні сацыяльнай варожасці (ч.1 арт. 130 КК), публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК), арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх (ч.2. арт. 342 КК і падрыхтоўка да злачынства - ч.1 арт. 13 КК).

Найбольшы максімальны тэрмін пакарання прадугледжвае арт. 130 КК (да 5 гадоў пазбаўлення волі).

Якія канкрэтныя дзеянні выстаўляюць Харашкевічу па гэтых артыкулах – невядома.

Яўгена Харашкевіча затрымалі 19 студзеня 2021 году ў Наваполацку. Прэс-служба МУС паведамляла, што на Харашкевіча выйшлі супрацоўнікі віцебскага ГУБАЗіКа ў межах «пошуку асобаў з экстрэмісцкімі поглядамі, якія падтрымліваюць прыхільнікаў масавых беспарадкаў».

Як раней расказвала «Нашай Ніве» жонка затрыманага, у іхнім доме адбыўсяператрус: забралі камп'ютарную тэхніку і тры страйкбольныя аўтаматы. Падставай для затрымання, паводле жонкі, былі каментары ў сацсетцы, на якія нібыта пакрыўдзілася выкладчыца фізічнага выхавання Акадэміі МУС Наталля Петухова.

Да снежня 2020 году Яўген Харашкевіч працаваў кіроўцам на Полацкім малочным камбінаце, але яму не працягнулі кантракт. На выбарах 9 жніўня Харашкевіч быў назіральнікам у роднай вёсцы Фарынава Полацкага раёну. 12 жніўня быў затрыманы проста на працоўным месцы, але праз два дні яго вызвалілі.

Ад студзеня Яўген Харашкевіч утрымліваецца ў СІЗА-2 Віцебску. Суд над ім – закрыты.

**05.07.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 5 ліпеня скончыўся разгляд крымінальнай справы, распачатай супраць Сяргея Ільюшэнкі. 34-гадовы віцяблянін быў прызнаны вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Прысуд – два гады і шэсць месяцаў абмежавання волі за каментар на адрас экс-кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску Сяргея Сташэўскага. Такое рашэнне прыняла суддзя Таццяна Родзіна.

«Сяргея Ільюшэнку прызнаць вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе артыкулу 369 КК РБ прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 2 гады і 6 месяцаў з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу», – агучыла прысуд суддзя Таццяна Родзіна.

Каментар, за які быў асуджаны мужчына, быў размешчаны ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» пад постам пра Сяргея Сташэўскага, які «праславіўся» пасля публікацыі аўдыёзапісу, на якім ён прымушае настаўнікаў перапісваць выніковыя пратаколы выбараў.

Праваабаронцы задаюцца пытаннем, якія ж менавіта «службовыя абавязкі» выконваў Сташэўскі, прымушаючы фальсіфікаваць вынікі выбараў. Тым больш, што ўдзел у выбарах не ўваходзілі ў ягоныя службовыя абавязкі як кіраўніка раённай адміністрацыі.

Сяргей Ільюшэнка шакаваны рашэннем суддзі. Пасля паседжання прызнаўся, што не разлічваў на апраўдальны прысуд, але думаў, што дадуць менш – года паўтара, не больш.

Шакаваныя былі і слухачы, якія прыйшлі яго падтрымаць.

«Я прыйшоў на гэты суд пераканацца ў тым, што ўсё, што кажуць людзі і пішуць у незалежнай прэсе, – не выдумка. І пасля пачутага прысуду пераканаўся, што гэта так. Усё, што патрабуе пракуратура, суддзі выконваюць, усё задавальняецца ў поўным аб'ёме. Ясна, што ў нармальныя часы гэта скончылася б адно адміністрацыйным спагнаннем. Але ж цяпер – гэта крыміналка і рэальныя тэрміны», – пракаментаваў рашэнне суду адзін са слухачоў.

Сяргей Ільюшэнка мае намер падаць апеляцыю ў Віцебскі абласны суд, каб абскардзіць вырак. Законнай моцы прысуд пакуль не набыў.

**06.07.2021** Прадпрымальніка і актывіста з Дуброўна Міхаіла Чамураку вінавацяць у паклёпе (арт. 188 КК). Пацярпелымі прызнаныя дырэктарка аршанскай школы №3, якая ў жніўні 2020 году кіравала выбарчай камісіяй, а таксама інспектар ДАІ. Крымінальную справу разбірае суд Дубровенскага раёну. Судовы працэс працягваецца ад 29 траўня, Міхаілу Чамураку пагражае да трох гадоў абмежавання волі («хімія»).

Чарговае судовае паседжанне ў справе Міхаіла Чамуракі адбудзецца 7 ліпеня. Справу разглядае суддзя Марыя Цыклінская. Крымінальны арт. 188 («Паклёп») прадугледжвае пакаранне штрафам, або папраўчымі працамі (да 2-х гадоў), або арыштам, або абмежаваннем волі да трох гадоў.

Як ужо паведамляла «Віцебская Вясна», мясцовыя міліцыянты трымалі сям’ю Чамуракаў пад асаблівай увагай. Пасля жнівеньскіх падзеяў супрацоўнікі Дубровенскага РАУС і СК правялі ў дачыненні Чамуракаў каля 10 розных праверак, адбыліся ператрусы. У дачыненні Міхаіла завялі некалькі адміністрацыйных спраў, ягоная жонка Людміла таксама была фігуранткай адміністрацыйнага працэсу.

Што вядома пра справу за паклёп
Падчас прэзідэнцкіх выбараў 2020 году на адным з выбарчых участкаў Воршы назіральнікі зафіксавалі заўважнае разыходжанне паміж колькасцю выбарцаў на ўчастку і колькасцю тых, хто прагаласаваў паводле выніковага пратаколу. Інфармацыя пра гэта з'явілася ў інтэрнэце. У адказ старшыня камісіі Ала Сіняўская напісала заяву на Міхаіла Чамураку, бо палічыла, што інфармацыю распаўсюдзіў менавіта ён і яна «ілжывая». Гэтай версіі прытрымліваецца на судзе і бок абвінавачання.

Заяву на Чамураку падаў і супрацоўнік аршанскага ДАІ Казакоў, які палічыў паклёпам звесткі пра тое, што ён браў удзел у затрыманнях людзей. Міліцыянт запатрабаваў 2000 рублёў кампенсацыі за прычыненую яму маральную шкоду.

У якасці сведак з боку абвінавачання давалі паказанні старшыня раённай выбарчай камісіі Давідовіч і інспектарка аддзелу прафілактыкі Аршанскага РАУС Вікторыя Давыдзенка.

**07.07.2021** 7 ліпеня суд Дубровенскага раёну прызнаў даказанай віну мясцовага актывіста Міхаіла Чамуракі, абвінавачанага паводле арт. 188 КК («Паклёп»). Суддзя Марыя Цыклінская ў поўным аб’ёме задаволіла хадайніцтва пракурора і прысудзіла Чамураку тры гады абмежавання волі («хімія»). Цягам 10 дзён вырак можа быць абскарджаны ў судзе вышэйшай інстанцыі.

Суд задаволіў таксама хадайніцтвы пацярпелых аб грашовай кампенсацыі за прычыненую ім маральную шкоду. Дырэктарка аршанскай школы №3 Ала Сіняўская, якая раней адмаўлялася ад кампенсацыі, і супрацоўнік аршанскага ДАІ Казакоў, які патрабаваў у якасці кампенсацыі 2000 рублёў, мусяць атрымаць па 1000 рублёў кожны.



Міхаіл Чамурака прызнаецца, што пакуль не можа прыняць той факт, што, распаўсюдзіўшы ўжо вядомую раней інфармацыю, можна стаць асуджаным за крымінальнае злачынства.

Кажа, што, сыходзячы з такой логікі, да адказнасці пры жаданні можна было б прыцягнуць яшчэ 250 асобаў, якія ставілі свае падабайкі пад постам. Бо атрымліваецца, што ўсе, хто гэта рабіў, спрыялі распаўсюду інфармацыі.

«Тэлефон, ці прыладу, з якой быў зроблены каментар, яны не знайшлі, але сцвярджаюць, што «каментар быў зроблены з тэлефону ці іншай прылады». Дайце спіс «іншых прыладаў»! Што за «іншая прылада», пра якую ў матэрыялах справы ніякай інфармацыі няма? Але ж няма і доказаў таго, што каментар быў зроблены з майго тэлефону, якім карысталіся ўсе сямейнікі. Канкрэтыкі няма, але бок абвінавачання ўсё задавальняе», – кажа асуджаны.

Міхаіла Чамураку да гэтага 11 разоў кідалі ў ІЧУ, таму да выраку суду ён паставіўся стрымана.

«Уявіце, мяне затрымлівалі на трое сутак і распачыналі крымінальную справу за тое, што супрацоўнік міліцыі парушаў заканадаўства ў дачыненні да грамадзянаў.

Дык чаго можна было чакаць ад гэтага прысуду?.. Жывы, здаровы – і дзякуй Богу! Адзінае, каб была праца», – кажа Міхаіл Чамурака.

**07.07.2021** 7 ліпеня суд Першамайскага раёну Віцебску пачаў разглядаць крымінальную справу ў дачыненні віцябляніна Аляксандра Мацвеева. Былога кіроўцу-міжнародніка абвінавачваюць у абразе прадстаўніка ўлады пры выкананні ім службовых абавязкаў (арт. 369 КК). Падставай для завядзення крымінальнай справы стаў каментар, нібыта размешчаны мужчынам 3 кастрычніка ў групе «Типичный Витебск» у Instagram.

Справу разбірае суддзя Наталля Карабліна. Паводле следства, Аляксандр Мацвееў, які быў зарэгістраваны ў групе пад нікам «Астроўна», размясціў каментар наконт дзеянняў старшага сяржанта ППС Віталя Шнявіна, які, як палічыў аўтар каментара, праявіў агрэсію ў дачыненні да ўдзельнікаў нядзельных маршаў пратэсту ў Віцебску. Каментар, які нібыта ўтрымлівае элементы ненарматыўнай лексікі, быў зроблены з тэрыторыі Італіі, дзе на той момант знаходзіўся абвінавачаны.

Мацвееў прызнаў сваю віну цалкам, папрасіў прабачэння і ўжо заплаціў пацярпеламу частку з заяўленых тым 1000 рублёў маральнай кампенсацыі. Сяржант міліцыі Шнявін на суд не з'явіўся, але праз адваката абвінавачанага перадаў суду распіску, у якой адмовіўся ад недаплачаных 700 рублёў кампенсацыі.

Аляксандр Мацвееў быў затрыманы ў канцы красавіка 2021 году ў менскім аэрапорце пры спробе вылецець у Вільню, дзе працаваў кіроўцам. Пасля затрымання мужчыну этапавалі ў Віцебск і на 3 дні змясцілі ў СІЗА. Да суду ён знаходзіўся пад падпіскай аб нявыездзе. За гэты час уладкаваўся на працу лагістам.

Як патлумачыў на судзе Мацвееў, падставай для напісання абразлівага каментару стала крыўда на супрацоўнікаў міліцыі. Летась падчас жнівеньскіх пратэстаў, ён быў незаконна затрыманы, калі проста выйшаў у краму па закупы. Ноч яго пратрымалі пад вартай, а раніцай без складання пратаколу адпусцілі дамоў.

Што да ненарматыўнай лексікі, ужытай Мацвеевым у каментары, то, паводле вынікаў лінгвістычнай экспертызы, ўжытае ў каментары слова не фіксуецца ў слоўніках літаратурнай мовы, а ў тлумачальным слоўніку субстандартнай лексікі рускай мовы падаецца з стылістычнай пазнакай «лаянка».

У якасці сведкі ў судзе была апытаная хатняя гаспадыня Наталля С. Яна паведаміла, што ў адным з дзяржаўных тэлеграм-каналаў яна пабачыла пост са спасылкай на групу «Типичный Витебск» з Instagram. Сябры прадзяржаўнага тэлеграм-каналу скардзіліся на ўдзельнікаў гэтай групы, якія дазволілі сабе нібыта зняважлівыя выразы ў дачыненні прадстаўнікоў улады падчас паслявыбарчых акцый пратэсту. Наталля перайшла па спасылцы, прачытала і абурылася з «каментароў рэвалюцыянераў» на адрас супрацоўніка МУС Шнявіна. Сведка сцвярджае, што ў некаторых каментарах «меўся непрыхаваны заклік да гвалту». Гэта так абурыла дзяўчыну, што яна зрабіла скрыншоты, прыклала іх да электроннага звароту і накіравала ва ўпраўленне ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкаму.

Акурат зварот пільнай грамадзянкі Наталлі С. у міліцыю і стаў падставай для завядзення крымінальнай справы, ахвярай якой можа стаць Аляксандр Мацвееў.

Наступнае судовае паседжанне ў справе прызначылі на 8 ліпеня (пачатак – у 14.00).

**08.07.2021** 8 ліпеня ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску пачаўся судовы працэс над 36-гадовым Аляксандрам Ждановым, якога абвінавачваюць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Падставай для завядзення крымінальнай справы быў каментар пад допісам пра чыноўніка Сяргея Сташэўскага, які прымушаў настаўнікаў перапісваць пратаколы выбараў. Гэта ўжо не першы ў Віцебску працэс за знявагу Сташэўскага.

Справу Аляксандра Жданава разбірае суддзя Дзяніс Аляксеенка. Сам пацярпелы чыноўнік на суд не з'явіўся, даслаў заяву з просьбай разгледзець яе ў яго адсутнасць – спаслаўся на занятасць на працы. Адвакат жа абвінавачанага заявіў, што «паказанні пацярпелага павінны быць дадзеныя абавязкова». І папрасіў суд выклікаць на працэс Сташэўскага. Суд прыняў рашэнне пачаць разбіраць справу без яго.

«12 жніўня 2020 году Аляксандр Жданаў, знаходзячыся па месцы жыхарства, маючы намер на публічную абразу прадстаўніка ўлады – кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску Сташэўскага Сяргея ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, ускладзеных органамі выканаўчай улады, і выкарыстоўваючы мабільны тэлефон «айфон», са сваёй старонцы у сацыяльнай сетцы «Вконтакте» ў групе «Это Витебск, детка!» размясціў тэкст каментара, які змяшчае выраз у непрыстойнай і прастамоўнай форме», – зачытаў тэкст абвінавачання пракурор Бізуноў.

Аляксандр Жданаў часткова прызнаў віну, сказаўшы, што размяшчаў каментар, але не на адрас чыноўніка.

«Я не адмаўляю, што каментар меў месца, але фармулёўка няправільная. Абраза была, але не Сташэўскага. Да гэтага быў каментар, на які я адказваў. На аўдыёзапісе гаварылася пра Віктара Цоя і Элвіса Прэслі.

А папярэдні каментатар выказаўся некультурна пра іх, і я яму адказаў, бо з'яўляюся прыхільнікам мастацтва гэтых асобаў», – патлумачыў на судзе Жданаў.

«Скаціна прадажная. Хоць бы Цоя з Прэслі не прыплятаў. Яны б табе за такія словы ў рожу плюнулі», – прачытаў каментар пракурор. «Гэта ваш каментар?» – спытаў у падсуднага. Жданаў пацвердзіў, што так.

Паводле пракурора Бізунова, «скаціна прадажная» адрасавалася Сташэўскаму. Паводле экспертаў, фраза «негатыўна характарызуе чалавека як непрыстойнага, грубага, подлага, які дзеля грошай і выгады гатовы на ганебныя ўчынкі».

Пракурор пацікавіўся ў Жданава, як паставіліся да завядзення крымінальнай справы на прадпрыемстве «Віцебскаблгаз», дзе ад 2007 году працуе абвінавачаны. Жданаў паведаміў, што яму прапаноўвалі напісаць заяву аб звальненні па ўласным жаданні, але ён адмовіўся.

Паводле інфармацыі пракурора пост пра Сташэўскага набраў больш за тысячу падабаек і 116 рэпостаў. Сам каментар, за які судзяць Аляксандра, набраў 10 лайкаў.

Ад 14 да 16 красавіка Аляксандр Жданаў правёў віцебскім ізалятары, пасля гэтага знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Мабільны тэлефон «Айфон», канфіскавалі, а на аўтамабіль быў накладзены арышт.

Гэта ўжо не першы выпадак, калі ў Віцебску судзяць за каментар пад постам пра Сташэўскага. Так, зусім нядаўна ў судзе Першамайскага раёну разглядалася справа Сяргея Ільюшэнкі.

Яго прызналі вінаватым і прысудзілі да двух з паловай гадоў «хіміі».

**08.07.2021** 8 ліпеня прайшлі ператрусы ў віцебскіх незалежных журналістаў Змітра Казакевіча, Вячаслава Лазарава, Уладзіміра Лунёва. Журналіст-фрылансер Віталь Скрыль быў затрыманы на 72 гадзіны ў якасці падазраванага ў крымінальнай справе.

Пра затрыманне журналіста Віталя Скрыля праваабаронцам паведаміла яго адвакатка. Паводле яе, Скрыль быў дапытаны ў следчым камітэце як падазраваны ў злачынстве, прадугледжаным арт. 369 КК («Публічная абраза прадстаўніка ўлады»). Пасля допыту яго затрымалі на 72 гадзіны і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання.

У гэты ж дзень адбыўся ператрус у кватэры журналіста-фрылансера Змітра Казакевіча. Пасля ператрусу, які працягваўся каля трох гадзін, міліцыянты забралі ноўтбукі жонкі і дачкі журналіста, два сістэмныя блокі, стары тэлефон, два фотаапараты і невялікі бел-чырвона-белы сцяжок. Паводле жонкі журналіста Ірыны, падставай для ператрусу была крымінальная справа, заведзеная паводле арт. 188 КК на нявызначаную асобу, якая быццам бы «ачарніла» ў сацсетках лепельскага міліцыянта Міхно. Падчас ператрусу журналіста дома не было, ён на волі.

Ператрусы адбыліся таксама ў маці журналіста Вячаслава Лазарава, а таксама па месцы прапісцы фрылансера Уладзіміра Лунёва. Падрабязнасці удакладняе.

**08.07.2021** Увечары 7-га ліпеня прайшоў ператрус у віцебскага актывіста Міколы Качурца. Супрацоўнікі КДБ распытвалі яго пра датычнасць да падрыхтоўкі выбухаў, якія нібыта рыхтаваліся ў Вілейцы: 2-га ліпеня Аляксандр Лукашэнка заяўляў, што тыя «атрады самаабароны» спрабавалі падарваць вузел сувязі Ваенна-марскога флоту Расеі, паведамляе Беларускае Радыё Рацыя.

Пасля ператрусу ў віцябляніна забралі ўсю аргтэхніку.

«Прыехалі трое «кадэбэшнікаў», сказалі, што я з’яўляюся ўдзельнікам «экстрэмісцкіх Тэлеграм-чатаў». І забралі ноўтбук, планшэт, два тэлефоны, флэшку з відэакамеры… А потым у КДБ дапыталі, ці ведаю я мадэратараў гэтых груп і ці атрымліваў я ад іх грошы або нейкія заданні. Я сказаў, што нікога не ведаю і што ўвогуле падпісаны на 30 ці нават 40 розных чатаў – каб проста ведаць інфармацыю», – паведаміў Мікола Качурэц, якога пасля размовы ў КДБ адпусцілі дамоў.

Ператрусы і канфіскацыі аргтэхнікі «для праверкі на датычнасць да падрыхтоўкі выбухаў у Вілейцы» працягваюцца ў Віцебску ўжо некалькі дзён.

Так, 3-га ліпеня ператрус адбыўся ў кватэры Кірыла Бародзіча, якога таксама звінавацілі ў тым, што ён падпісаны на «экстрэмісцкія Тэлеграм-чаты». Сярод маёмасці, забранай пасля ператрусу, былі і рэчы каханай дзяўчыны Кірыла, віцебскай грамадскай актывісткі Станіславы Цярэнцьевай. Маладыя людзі палічылі за лепшае пакінуць Беларусь у мэтах асабістай бяспекі.

**09.07.2021** 8 ліпеня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску скончыліся слуханні па справе былога кіроўцы-міжнародніка Аляксандра Мацвеева, якога вінавацяць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Падчас судовых спрэчак прадстаўніца пракуратуры папрасіла прызначыць Мацвееву пакаранне абмежаваннем волі («хімія») на 1 год і шэсць месяцаў.

Перад пачаткам судовых спрэчак бок абароны хадайнічаў аб допыце сведкаў.

Суд задаволіў хадайніцтва, дапытаў жонку Аляксандра Мацвеева Раду і дырэктара прадпрыемства, на якім цяпер працуе Мацвееў. Сведкі падкрэслілі, што абвінавачаны як сем'янін, бацька, муж і добры спецыяліст характарызуецца шэрагам станоўчых якасцяў. Прасілі прызначыць яму найменшае пакаранне, прадугледжанае дадзеным артыкулам, спасылаючыся на тое, што на волі ён прынясе больш карысці сям’і, прадпрыемству і грамадству.

У сувязі з тым, што пацярпелы былы старшы сяржант ППС Віталь Шнявін знаходзіцца па-за межамі Беларусі, суд пастанавіў праводзіць слуханні без яго прысутнасці. Былы міліцыянт адмовіўся ад пачаткова заяўленай сумы (1000 рублёў) маральнай кампенсацыі, задаволіўся прабачэннем і кампенсацыяй у памеры 300 рублёў.

Пракурорка ў сваім выступе заявіла, што віна Мацвеева даказаная, ніякіх акалічнасцяў, якія абцяжарваюць віну, не вызначана. Разам з тым, «з улікам грамадскай небяспекі злачынства, мэтаў і матываў учыненага, істотнай шкоды, нанесенай дзяржаўным інтарэсам у выглядзе падрыву аўтарытэту і прэстыжу прадстаўнікоў праваахоўных органаў, прыніжэння гонару і годнасці пацярпелага» пракурорка заявіла, што мэты крымінальнай адказнасці ў дачыненні Мацвеева будуць дасягнутыя прызначэннем яму пакарання ў выглядзе абмежавання волі.

На гэтай падставе яна папрасіла суд прызнаць Аляксандра Мацвеева вінаватым у асабістай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе санкцый арт. 389 КК прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін адзін год і шэсць месяцаў з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Адвакатка Аляксандра Мацвеева адзначыла, што ў ходзе папярэдняга следства дзеяннем яе падабароннага дадзеная дакладная ацэнка.

Разам з тым, звярнула ўвагу, што Мацвееў раскаяўся ў злачынстве, папрасіў прабачэння ў пацярпелага і яшчэ да пачатку судовага следства зрабіў захады, каб кампенсаваць маральную шкоду. Звярнула ўвагу на тое, што падабаронны не ўдзельнічаў у несанкцыяваных мерапрыемствах і з'яўляецца законапаслухмяным грамадзянінам. Заявіла, што прапанаваны абвінавачаннем тэрмін абмежавання з'яўляецца суровым пакараннем для яе падабароннага.

У апошнім слове Мацвееў запэўніў, што ўсвядоміў свой учынак.

«Быў час паразважаць над сітуацыяй. Хачу запэўніць, што надалей не дапушчу падобных парушэнняў. Я перагледзеў сваю жыццёвую пазіцыю. Прашу высокі суд, прызначыць мне мінімальна магчымае па гэтым артыкуле пакаранне.

Раскайваюся ва ўчыненым. Больш дадаць няма чаго», – скончыў Мацвееў.

Прысуд будзе агучаны 9 ліпеня (пачатак у 9.15).

**09.07.2021** 9 ліпеня суд Першамайскага раёну Віцебску, разгледзеўшы крымінальную справу віцябляніна Аляксандра Мацвеева, абвінавачанага паводле арт. 369. КК, прызнаў яго вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Суддзя

Наталля Карабліна цалкам задаволіла патрабаванне пракуратуры і прысудзіла Мацвееву адзін год і шэсць месяцаў «хіміі».

Летась 3 кастрычніка Александр Мацвееў размясціў у групе «Типичный Витебск» у Instagram «крытычны каментар з эмацыйнай афарбоўкай і ўжываннем неўнармаванай лексікі адносна дзеянняў старшага сяржанта ППС Віталя Шнявіна». Міліцыянт ужыў супраць удзельнікаў нядзельных маршаў газавы балончык. Шнявін у сваіх тлумачэннях паясняў, што такога намеру ён не меў і гэта адбылося адвольна. У дадзены момант пацярпелы ў органах МУС не працуе і па працы знаходзіцца па-за межамі Беларусі.

Тэрмін адбыцця пакарання Мацвеевым мусіць адлічвацца са дня пастаноўкі на ўлік у выхаваўчай установе адкрытага тыпу. Таксама суд пастанавіў залічыць у адбыванне пакарання тэрмін утрымання пад вартай з 29 красавіка па 2 траўня, прыраўняўшы адзін дзень пад вартай да двух дзён абмежавання волі.

Да набыцця прысудам законнай моцы меру стрымання для віцябляніна пакінулі ранейшую – падпіска аб нявыездзе. Арышт, накладзены на маёмасць Мацвеева, суд пастанавіў не адмяняць да выплаты ў дзяржбюджэт 31 рубля 90 капеек пошліны.

Аляксандр Мацвееў мае намер абскардзіць рашэнне суду Першамайскага раёну ў судзе вышэйшай інстанцыі.

**12.07.2021** 11 ліпеня з віцебскага ізалятару часовага ўтрымання выйшаў журналіст Віталь Скрыль. За кратамі ён прабыў трое сутак як падазраваны ў крымінальнай справе паводле арт. 369 КК РБ («Абраза прадстаўніка ўлады»). З яго ўзятая падпіска аб неразгалошванні. Сустрэць яго на выхадзе з ІЧУ прыйшлі некалькі чалавек, але не дачакаліся – Скрыля вызвалілі амаль на гадзіну раней адведзенага 72-гадзіннага тэрміну.

Віталь Скрыль быў затрыманы 8 ліпеня. У гэты ж дзень у іншых віцебскіх журналістаў адбыліся ператрусы з адабраннем лічбавай тэхнікі. Супрацоўнікі сілавых структур прыходзілі дадому да журналістаў-фрылансераў Змітра Казакевіча, Вячаслава Лазарава, Уладзіміра Лунёва.

Крымінальная справа, па якой затрымліваўся Віталь Скрыль, была заведзеная ў дачыненні «нявызначанай асобы» за абразлівы каментар у сацсетках. Віталь Скрыль мае зараз статус падазраванага. Можа ў любы момант быць выкліканы ў СК для правядзення следчых дзеянняў. Падпіскі аб нявыездзе з яго не ўзялі. Віталь не выключае, што гэта зроблена спецыяльна, каб прымусіць яго выехаць за межы Беларусі.

У ізалятары ён знаходзіўся з іншымі затрыманымі ў той дзень актывістамі, у тым ліку з навапалацкімі прафсаюзнымі лідарамі «Нафтану». Для Скрыля гэта першы падобны досвед. Раней яго некалькі разоў судзілі быў паводле адміністрацыйных справаў за незаконны выраб прадукцыі СМІ (раней ч.2 арт. 22.9 КаАП), але тады былі толькі штрафы.

Па артыкуле 369 КК раней прадугледжвалася максімальнае пакаранне да 3 гадоў абмежавання волі (так званая «хімія»). У траўні 2021 году ў крымінальны кодэкс былі ўнесеныя змены, зараз па гэтым артыкуле прадугледжваецца да 3 гадоў пазбаўлення волі.

**17.07.2021** У Віцебскім рэгіёне, як і па ўсёй краіне, 14 ліпеня прайшоў масавы пераслед людзей за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю. З раніцы сілавікі прыйшлі да актывістаў недзяржаўных арганізацый, партый і рухаў ва ўсёй Віцебскай вобласці.

Затрыманні ў Полацку

У Мікалая Шараха, кіраўніка суполкі Свабоднага прафсаюзу з Полацку і сябры Полацкага праваабарончага таварыства, адбыўсяператрус. Яго праводзіл супрацоўнікі Полацкага РАУС у межах распачатай 29 сакавіка 2021 году крымінальнай справы паводле арт. 341 КК ("Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці»).

Пасляператрусу трое супрацоўнікаў паехалі з Міколам у офіс Цэнтру інфармацыйна-прававой падтрымкі сацыяльна не абароненых груп насельніцтва "Адвакацыя", каб зрабіцьператрус і там. Пасля гэтага Мікола Шарах быў затрыманы на 72 гадзіны.17 ліпеня яго адпусцілі на волю. Працэсуальны статус Шараха невядомы.

У гэты жа дзень у Полацку была затрыманая мясцовая паэтку Лера Сом. У яе правяліператрус, забралі тэхніку, жанчыну павезлі на допыт у следчы камітэт па Віцебскай вобласці. З нагоды якой справы праводзіліся следчыя мерапрыемствы - невядома. Потым Леру Сом адпусцілі.

У Воршы затрымлівалі Казмерчака і Леўчанкава
У Воршы сілавікі затрымалі і адвязлі на допыт рэдактара мясцовага парталу orsha.eu і праваабаронцу Ігара Казмерчака. Ад пачатку ліпеня гэта было другое ягонае затрыманне. Казмерчака затрымлівалі 8 ліпеня.Тады ў ягоным доме прайшоўператрус. Праз трое сутак журналіста выпусцілі з СІЗА. Як і тады, пасля допыту Ігара выпусцілі на волю.

У гэты ж дзень дваператрусы прайшлі ў былога сябры ПЦ "Вясна" з Барані Аршанскага раёну Васіля Леўчанкава.

Пасля першагаператрусу яго адвезлі ў Віцебск у СК на допыт, а па вяртанні ў Воршу адбыўся другіператрус. Ён зараз на волі.

У Віцебску затрымлівалі сястру палітвязня Малахоўскага
13 ліпеня а 6-й раніцы была затрыманая сястра жонкі палітвязня Уладзіміра Малахоўскага Ларыса Сняткова.

Вынікамператрусаў стала канфіскацыя ноўтбуку. Пакуль невядома, у якім працэсуальным статусе знаходзіцца Ларыса. Ці яна на волі - немаведама.

**17.07.2021** Былы прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта краіны, экс-кіраўнік "Белгазпрамбанка" дастаўлены ў папраўчую калонію №1 Наваполацка.Там яго наведаў адвакат.

Адвакат палітвязня Яўген Пыльчанка паведаміў, што ў пятніцу 16 ліпеня атрымаў ліст ад падабароннага. Ліст быў датаваны 11 ліпенем. У лісце Віктар Бабарыка пісаў, што "ўвечары 10 ліпеня яго адправілі на этап, ужо 11 ліпеня ён быў у СІЗА-2 Віцебску". Напісаў, што, як мяркуецца канчатковым пунктам будзе Наваполацк.

Экс-кіраўніка "Белгазпрамбанку" Віктара Бабарыку Вярхоўны суд Беларусі прысудзіў да 14 гадоў пазбаўлення волі. Былы банкір прызнаны вінаватым у атрыманні хабару ў асабліва

буйным памеры арганізаванай групай, а таксама легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, у асабліва буйным памеры (ч.3 арт. 430 і ч.2 арт. 235 Крымінальнага кодэксу).

Суд пастанавіў спагнаць з Бабарыкі ў даход дзяржавы больш за Br47,7 млн.

Сваю віну экс-банкір не прызнаў. У цяперашні час яго абаронцы рыхтуюць дакументы для падачы наглядной скаргі.

**19.07.2021** У Беларусі прызнаныя экстрэмісцкімі яшчэ 10 тэлеграм-каналаў і адзін канал у YouTube. Пра гэта 19 ліпеня публічна паведаміла Генпракуратура Беларусі. Сярод закрытых і рэсурс "ЛЕПЕЛЬ-Тэлеграм", які падаваў інфармацыю для жыхароў горада Лепеля, размешчанага ў Віцебскай вобласці.

На думку пракуратуры тэлеграм-канал ўтрымліваў заклікі да масавых беспарадкаў і хуліганскіх дзеянняў, прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў, пашкоджання і знішчэння іх маёмасці, а таксама размяшчалася інфармацыя (каментары, паведамленні) абразлівага характару, якая распальвае сацыяльную варожасць і розніца.

Пасля гэтай ацэнкі і на падставе Закона" Аб супрацьдзеянні экстрэмізму " органы пракуратуры падрыхтавалі і накіравалі ў суд заяву аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі "ЛЕПЕЛЬ-тэлеграм" экстрэмісцкімі матэрыяламі.

Суд цалкам задаволіў зварот пракуроры, што на практыцы азначае неадкладнае блакаванне інфармацыйнага рэсурсу "ЛЕПЕЛЬ-тэлеграм" і робіць яго недаступным у інтэрнеце.

**19.07.2021** Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску 19 ліпеня пачаў разглядаць крымінальную справу ў дачыненні грамадзяніна РФ і актывіста «Краіны для жыцця» Андрэя Новікава. Падпалкоўніка расейскай паліцыі ў адстаўцы абвінавачваюць у злачынствах, прадугледжаных ч.1 арт. 342 і заўв.2 арт. 371 КК РБ.

Справу палітвязня разбірае суддзя Сняжана Кіндзеева. У якасці дзяржабвінаваўцы выступае пракурор Віжбовіч. 51-гадовы нараджэнец Варапаева Віцебскай вобласці Андрэй Новікаў знаходзіцца пад вартай.

Андрэя Новікава абвінавачваюць у «арганізацыі групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, спалучаных з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням



прадстаўнікоў улады, якія выклікалі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў і арганізацый» (ч.1. арт. 342 КК). А таксама – у наўмысным незаконным перасячэнні дзяржаўнай мяжы РБ замежным грамадзянінам да завяршэння тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь (арт. 371 заўвага 2 КК РБ).

Палітвязень цалкам прызнаў віну ў незаконным перасячэнні мяжы (арт. 371) і часткова – паводле арт. 342.

Андрэй Новікаў прызнаў, што ўдзельнічаў у масавых мерапрыемствах, стварыў тэлеграм-канал, у якім размяшчаў відэаролікі. Але адмовіўся прызнаваць факт змовы з Сяргеем Ціханоўскім і Мікалаем Статкевічам ды іншымі людзьмі і арганізацыі масавых мерапрыемстваў у Менску, Гомлі і Гародні.

«Ва ўсіх гэтых дзеяннях я выказваў выключна ўласную пазіцыю», – заявіў ён.

Падчас судовага паседжання Новікаў згадзіўся даваць паказанні. Пытанні суддзі і пракурора тычыліся стаўлення падсуднага да беларускай дзяржавы («Што вас наагул тут не задавальняла?» – «Я сутыкнуўся з неразуменнем і машынай бюракратыі»), стасунках і сустрэчах з Ціханоўскім, арганізацыі пікетаў для збору подпісаў за Святлану Ціханоўскую.

Суд працягнецца 20 ліпеня. На паседжанні будзе апытаны сведка з боку абвінавачання Віталь Бугаёў.

Андрэй Новікаў, падпалкоўнік расейскай паліцыі ў адстаўцы, быў затрыманы 14 красавіка 2021 года ў вёскі Прусы, што на Пастаўшчыне, куды таемна прыехаў да сваёй сям'і, каб адвезці хворага дзіця на лячэнне. Яго абвінавацілі ў незаконным перасячэнні дзяржаўнай мяжы (арт. 371 КК), у доме прайшоўператрус, была канфіскаваная тэхніка і дакументы.

Раней, падчас прэзідэнцкай кампаніі 2020 году, ён браў актыўны ўдзел у якасці валанцёра «Краіны для жыцця». Супраць яго была распачатая крымінальная справа па ч.1 арт. 342. Сем месяцаў Новікаў правёў у следчым ізалятары, пасля ўлады дэпартавалі яго ў Расею, забараніўшы цягам 10 гадоў уязджаць на тэрыторыю Беларусі.

Андрэй Новікаў быў прызнаны палітвязнем.

**19.07.2021** 15 ліпеня 2021 года суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебска Будрэвіч пры ўдзеле пракурора Мацвеевай разгледзеў крымінальную справу па абвінавачванні пяцідзесяцігадовага жыхара абласнога цэнтра ў здзяйсненні злачынстваў звязаных з публічнай абразай службовых асоб і прадстаўнікоў улады і суддзяў. Суд прызначыў пакаранне ў выглядзі двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Таксама мужчына павінен выплаціць сямі пацярпелым матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў суме 12,5 тысяч рублёў.

Пад час судовага следства было ўстаноўлена, што ў лютым - сакавіку 2021 года абвінавачаны, знаходзячыся па месцы свайго жыхарства, з мабільнага тэлефона ў сацыяльнай сетцы ў адной з груп у публікацыях у дачыненні да прадстаўнікоў улады размяшчаў каментары, у якіх утрымліваліся выяўленыя ў непрыстойнай форме.

Абразы прагучалі на адрас асоб, якія займаюць пасады прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі, прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта, а таксама суддзяў, службовых асоб МУС, пракуратуры і іншых дзяржаўных органаў.

У каментарах негатыўна ацэньваліся названыя асобы і ўтрымлівалі нецэнзурную лексіку, якая прыніжала аўтарытэт, гонар і годнасць прадстаўнікоў улады ў сувязі з выкананнем імі сваіх службовых абавязкаў.

У судовым пасяджэнні абвінавачаны віну прызнаў. Змякчальным адказнасць акалічнасцю прызнана чыстасардэчнае раскаянне ў здейсненым злачынстве.

Прысудам суда абвінавачаны прызнаны вінаватым у публічнай абразе прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і на падставе ч. 1 арт. 368 КК яму прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 1 год 6 месяцаў.

Ён жа прызнаны вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе арт. 369 КК яму прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 2 гады 6 месяцаў.

Ён жа прызнаны вінаватым у абразе суддзі ў сувязі з ажыццяўленнем ім правасуддзя і на падставе арт. 391 КК яму прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 2 гады.

Шляхам частковага складання прызначаных пакаранняў канчаткова прызначана абвінавачанаму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2 гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Спагнаная з абвінавачанага матэрыяльная кампенсацыя маральнай шкоды на карысць 5 пацярпелых па 2000 рублёў кожнаму, на карысць 1 пацярпелага – 1500 рублёў, на карысць 1 пацярпелага-1000 рублёў.

Таксама судом прыменена спецыяльная канфіскацыя ў даход дзяржавы мабільнага тэлефона «HUAWEI P9» як сродкі здзяйснення злачынства.

Прысуд не ўступіў у законную сілу і можа быць абскарджаны і апратэставаны ва ўстаноўленым законам парадку.

**21.07.2021** Былы зняволены Максім, які адбываў пакаранне за махлярства ў папраўчай калоніі №3 «Віцьба» і вызваліўся ў ліпені, распавёў праваабаронцам "Вясны" пра ўмовы ўтрымання палітвязняў, пра іх побыт і працу, а таксама пра стаўленне да іх з боку іншых зняволеных і адміністрацыі.

Папраўчую калонію №3 "Віцьба" называюць яшчэ "Тройкай". Максім распавёў, што "Тройка" — гэта спецыфічная зона, у ёй адбывае пакаранне "спецкантынгент" - былыя супрацоўнікі

міліцыі, суддзі, чыноўнікі і карупцыянеры featured рознага кшталту, у тым ліку замежнікі (рускія, украінцы, туркі, казахі, малдаване, індусы, кітайцы і г.д.). Але пасля жнівеньскіх падзеяў, калі па ўсёй Беларусі сілавікі разганялі мірныя акцыі пратэсту, у "тройцы" апунуліся і палітвязні. Як адзначыў Максім, першыя «палітычныя» там з’явіліся вясной.

Ён распавёў, што змянілася ў ПК №3 пасля з’яўлення палітвязняў.

«Пасля выбараў і ўсіх падзеяў у калоніі забаранілі падпісваць зняволенных на выданні па каталогу «Белпошты». Цяпер падпіску можна аформіць толькі з асабістага рахунку праз напісанне заявы. Гэтую заяву разглядае намеснік начальніка калоніі, а потым цэнзуруе на ўласны погляд (гэтая працэдура не прапісаная ў крымінальна-выканаўчым кодэксе).

Апроч таго, у калоніі адключылі канал «Еўраньюс», які паказвалі у спадарожнікавым вяшчанні (у калоніі дзве спадарожнікавыя талеркі - «НТВ ПЛЮС» і «Трыкалор ТБ», аплачваюцца за кошт зняволеных)».

Палітвязняў пазбаўляюць працяглых спатканняў, званкоў і прымаюць лісты толькі ад сваякоў

«Палітыка адміністрацыі ўстановы простая — зрабіць акцэнт на іншых асуджаных і паказаць, якімі быць не трэба і як не трэба жыць і "рухацца" ў калоніі. Супрацоўнікі калоніі не даюць палітычным асуджаным званкі (астатнім дазволена тры разы на месяц), бо яны даюцца для палітычных толькі супрацоўнікамі аператыўнага аддзелу калоніі, астатнія асуджаныя тэлефануюць пад наглядам простых афіцэраў згодна з графікам званкоў, зацверджаным начальнікам калоніі. Па шматлікіх скаргах ад палітычных асуджаных у месяц яны могуць патэлефанаваць не больш за адзін раз, але кожны раз яны чуюць адгаворкі: няма дзяжурнага аператыўніка, няма тэхнічнай магчымасці і т. п.", - расказаў былы зняволены.

Негалоснае правіла для супрацоўнікаў — пазбавіць палітычных асуджаных працяглага спаткання для таго, каб тыя не змаглі сваякам распавесці пра сітуацыю з "палітычнымі" ў калоніі. Так здарылася з палітвязнем Аляксандрам Бабічам. Па пастанове начальніка калоніі, за парушэнне Бабіч пазбаўлены доўгатэрміновага спаткання са сваякамі. Пры гэтым парушэнні, за якія могуць караць пазбаўленнем званкоў і спатканняў, могуць быць розныя: не пагаліўся, не выйшаў на працу, адмовіўся ад прыбірання памяшкання, не павітаўся з супрацоўнікамі калоніі, трымаў рукі ў кішэнях, не зашпіліў верхні гузік і г.д.

У калоніі працуе два цэнзары карэспандэнцыі. Ад начальніка калоніі пайшло негалоснае распараджэнне: лісты «палітычныя» могуць атрымліваць толькі ад блізкіх сваякоў, якія запісаныя ў картку для пасылак, перадач і працяглых, кароткіх спатканняў (кожнага сваяка трэба пацвярджаць дакументальна, дазволеныя толькі ад маці, бацька, родных брата і сястры, мужа ці жонкі). Ад іншых людзей лісты вяртаюцца адпраўніку, а асуджаным нават не паведамляецца пра паступленне ў іх адрас такіх лістоў. З-за вялікага аб'ёму карэспандэнцыі выдача лістоў асуджаным ўсёй калоніі адбываецца на працягу дзесяці дзён з моманту паступлення ліста і цэнзуры».

*Падобныя паведамленні праваабаронцы атрымліваюць і з папраўчай калоніі №15, у якой таксама да палітычных зняволенных даходзяць лісты толькі ад сваякоў.

Камунікацыю з "палітычнымі" супрацоўнікі калоніі не ўхваляюць

Максім кажа, што акрамя маральнага ціску, з палітвязнямі ўсё добра. У "Тройцы", па словах мужчыны, у адрозненне ад наваполацкай ПК №1, ён нават ніколі не бачыў за два гады, каб кагосьці збівалі ці катавалі, нават ніколі не было размоваў пра гэта.

Палітвязні, якія стаяць на прафуліках за экстрэмізм (носяць бірку жоўтага колеру), працэдуру паверкі праходзяць, акрамя двух "стандартных" разоў на дзень, — яшчэ тры дадатковых. Зняволеныя, якіх асудзілі не па палітычных артыкулах, пазбягаюць адносін з «палітычнымі», бо ў калоніі адзін на аднаго «даносіць», а адносіны з «пратэстоўцамі» супрацоўнікі калоніі не ўхваляюць.

Зняволеным плацяць па 10 рублёў у месяц, а пераводы дазволены толькі ад сваякоў

«Раней асуджаным, ад якіх праз пазоў патрабуюць сплаціць кампенсацыю, можна было атрымліваць дзве базавыя за месяц, без пазову ў калоніі агульнага рэжыму — шэсць базавых, а на ўзмоцненым рэжыме — пяць. Цяпер можна атрымліваць грашовыя пераводы паводле паправак выключна ад сваякоў. Гэта згодна з нядаўнімі папраўкамі ў Крымінальна-выканаўчым Кодэксе.

У калоніі на прамысловай зоне зняволеныя атрымліваюць за адзін паддон — 4 капейкі (гэта ўжо з вылікам камуналкі і іншага, "чыстымі" на баланс), адзін выраб для ўборкі падлогі (махровая ануча для швабры) — 1 капейка за штуку. Гэта для ўсіх. На пякарні атрымліваюць 10-12 рублёў у месяц, у сталовай — каля 15 рублёў, але гэта ўсё гаспадарчы атрад».

У калоніі Максім пазнаёміўся з чатырма палітычнымі зняволенымі

Аляксандр Бабіч, асуджаны да трох з паловай гадоў зняволення, знаходзіцца ў дзевятым атрадзе і працаўладкаваны ў швейным цэху на поўны працоўны тыдзень. Ілля Туркоў, асуджаны да чатырох гадоў калоніі, знаходзіцца ў трэцім атрадзе. Анатоль Хіневіч, асуджаны да двух з паловай гадоў, знаходзіцца ў пятым-шостым атрадзе, працаўладкаваны ў швейным цэху на поўны працоўны тыдзень.

Віталь Пракапчук, асуджаны да чатырох гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, знаходзіцца ў другім атрадзе, працаўладкаваны ў цэху разобркі металу. Віталь быў накіраваны ў ПК №3 у

траўні. Сына Віталя Ягора Пракапчука таксама пазбавілі волі на 4 гады ўзмоцненага рэжыма і накіравалі ў калонію №22 ("Воўчыя норы"). Падчас 14-дзённага каранціну, куды Віталя змясцілі пасля этапу ў калонію, яму дазволілі патэлефанаваць жонцы і супакоіць яе, негледзячы на тое, што званкі ў гэты час забароненыя. Па словах Максіма, Віталь адчувае сябе добра, а да ліпеня яго нават не каралі за парушэнні (Максім бачыўся з ім літаральна два тыдні таму). Але Пракапчук ужо два месяцы знаходзяцца без працы. Цэх па разборкі металу, які пастаўляў метал у адну з краін Еўрасаюза, часова зачынены з-за санкцый супраць уладаў Беларусі.

**22.07.2021** У Віцебскім рэгіёне на бягучым тыдні сілавыя структуры працягнулі праводзіць інтэнсіўныя мерапрыемствы, ў межах крымінальнага заканадаўства, з мэтай аказаць ціск на прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.

Докшыцы і Глыбокае

Раніцай, 22 ліпеня, у Докшыцах сілавікі прыйшлі зператрусам да Юрыя Стадольніка. Прычыны зацікаўленасці сілавікоў мясцовым жыхаром пакуль невядомыя.

У Глыбокім Кіру Кісялёву выклікалі ў аддзел крымінальнага вышуку Глыбоцкага РАУС.

Сілавікі правялі ператрус ва ўласным доме ў журналісткі-фрылансера Таццяны Смоткінай. У выніку, у яе забралі тэлефон і сістэмны блок кампутара.

Працэсуальныя мерапрыемствы праводзіліся ў межах крымінальнай справы па першай частцы артыкула 130 КК РБ - распальванне рэлігійнай, сацыяльнай няроўнасці і варожасці. Справу вядуць работнікі мясцовай міліцыі. Полацк

21 ліпеня ператрус адбыўся ў старшыні рэвізійнай камісіі Свабоднага прафсаюза ААТ Полацк-Шкловалакно Віктара Стукава ў Полацку. Сілавікі забралі мабільны тэлефон, але Віктара не затрымлівалі для вытворчасці следчых дзеянняў. Віцебск

Таксама, 21 ліпеня, сілавымі структурамі былі праведзеныя шэсць ператрусаў у гарадскіх актывістаў грамадзянскай супольнасці, якія, магчыма, бралі ўдзел ў працы мясцовага тэлеграм-канала.

**25.07.2021** Грамадзянскі актывіст блогер Дзмітрый Казлоў, прызнаны праваабаронцамі палітвязням, настойліва дамагаецца ў Камітэце ААН па правах чалавека прызнанне факта парушэння з боку беларускіх уладаў права ўдзельнічаць у кіраванні дзяржаўнымі справамі праз удзел у выбарах у якасці кандыдата ў дэпутаты парламента.

Згодна інфармацыі кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь у сувязі з паведамленнем у Камітэт ААН па правах чалавека, зарэгістраваным пад нумарам 3794/2020, рашэннем акруговай выбарчай камісіі Аршанскай гарадской выбарчай акругі ад 8 лістапада 2019 адменена рэгістрацыя Дзмітрыя Казлова кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Падставай да адмены рашэння аб рэгістрацыі заяўніка кандыдатам у дэпутаты з'явілася паўторнае парушэнне ўстаноўленых выбарчым заканадаўствам патрабаванняў пры правядзенні перадвыбарнай агітацыі, а менавіта выкарыстанне блогерам плакатаў, якія маюць заклікі да

зрыву выбараў. Названае рашэнне акруговай выбарчай камісіі Аршанскага гарадскога выбарчай акругі № 25 было абскарджана заяўнікам у Віцебскую абласную выбарчую камісію, якой у задавальненні скаргі было адмоўлена.

Не пагадзіўшыся з рашэньнем Віцебскай абласной выбарчай камісіі па выбарах, Казлоў падаў адпаведную скаргу ў Віцебскі абласны суд.

Рашэннем Віцебскага абласнога суда яму было адмоўлена ў задавальненні скаргі на рашэнне Віцебскай абласной выбарчай камісіі.

Такім чынам, рашэнне Віцебскага абласнога суда ад 16 лістапада 2019 г. уступіла ў законную сілу.

Так як Казлоў не стаў звяртацца ў вышэйстаячыя судовыя інстанцыі, на думку беларускіх чыноўнікаў, ён не ў поўнай меры вычарпаў усе магчымасці па абароне сваіх правоў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. А гэта цягне немагчымасць прадстаўлення ім пісьмовага паведамлення на разгляд Камітэта і прызнанне яго паведамленне непрымальным.

На ўсе гэтыя сцвярджэнні дзяржавы Казлоў паведамляе Камітэту, што суд вынес канчатковае рашэнне, не быў кампетэнтным, незалежным і бесстароннім, з'яўляюцца беспадстаўнымі. Суд не разгледзеў усе довады скаргі і свае высновы ў вырашэнні належным чынам не матываваў. Вынесенае судом рашэнне не адпавядала патрабаванням нацыянальнага заканадаўства, таму не з'ўляецца законным і абгрунтаваным.

Такім чынам, палітвязнь Казлоў настойвае на тым, што не ў поўнай меры было забяспечана права на справядлівае і публічнае разбіральніцтва справы кампетэнтным, незалежным і бесстароннім судом, створаным на падставе закона, (пункт 1 артыкула 14 Пакта аб палітычных і грамадзянскіх правах).

Ён нагадвае ААНаўцам аб тым, што ў Рэспубліцы Беларусь парушаецца прынцып незалежнасці суддзяў, пацвярджаецца дакладам спецдакладчыка ААН па незалежнасці суддзяў і адвакатаў у Беларусі, рэкамендацыі якога да цяперашняга часу ўрадам Беларусі не выкананы.

Больш таго, Казлоў прыводзіць неабвержныя дзяржавай довады аб парушэнні Рэспублікай Беларусь яго правоў, прадугледжаных артыкулам 19 (права на свабоднае выказванне меркавання), артыкулам 25 (права на недыскрымінацыю) і артыкулам 26 (права на роўную абарону закона) Пакта.

Так для прыкладу, артыкул 19 Пакта гарантуе кожнаму чалавеку права на свабоднае выказванне свайго меркавання.

Каментуючы пазіцыю беларускай дзяржавы па гэтаму артыкулу Пакта, Дзмітрый паведамляе Камітэту, што яна не прадставіла доказаў таго, што лозунгі «фальшывым выбарам – Баста!» , "Калгаснай дыктаруры-Баста!», хоць якім-небудзь чынам замахнуліся на інтарэсы дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскі парадак, ахову здароўя і маральнасць насельніцтва або на правы і свабоды іншых асоб.

У адпаведнасці з артыкулам 25 Пакта кожны грамадзянін павінен мець права і магчымасць быць абраным на сапраўдных перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага роўнага выбарчага права пры таемным галасаванні і забяспечваюць свабоднае волевыяўленне выбаршчыкаў.

Рэалізуючы палажэнні артыкула 26 Пакта, Рэспубліка Беларусь абавязалася паважаць і забяспечваць правы, якія прызнаюцца ў Пакце, без якога-небудзь адрознення, як у дачыненні да палітычных, так і іншых перакананняў або абставінаў. Што ў яго выпадкі не было зроблена дзяржавай.

Ён мяркуе, што акруговая і абласная выбарчыя камісіі, а таксама суды не былі кампетэнтнымі, паколькі яны прымалі рашэнні насуперак міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

Далейшае абскарджанне ў судах і іншых органах улады, па меркаванні блогера, не паспрыяла дзейснай абароне яго грамадзянскіх правоў. Зыходзячы з гэтага ў Казлоў прыйшоў да высновы, што ім былі вычарпаныя ўсе наяўныя эфектыўныя ўнутраныя сродкі прававой абароны, а таму яго індывідуальнае паведамленне з'яўляецца прымальным і падлягае Камітэтам разгляду.

“Пры такіх абставінах мяркую, што права мае правы, гарантаваныя артыкуламі 14, 19, 25 і 26 Пакту, былі парушаныя» - рэзюмуе палітвязень блогер Дзмітрый Казлоў, які ў наступы час знаходзіцца ў зняволенні.

**26.07.2021** Як стала вядома, 15 ліпеня 2021 году дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю "Савіка" А. Гуйвік паведаміў кіраўніку Цэнтру інфармацыйна-прававой падтрымкі сацыяльна ўразлівых груп насельніцтва "Адвакацыя" Мікалаю Шараху аб скасаванні з сярэдзіны жніўня дамовы арэнды. У інфармацыйным лісце паведамляецца, што прычынай разрыву арэндных адносінаў стала змена ўласніка памяшканняў.

У выпадку, калі не будзе аредованае новае памяшканне, установа "Адвакацыя" парушыць умову рэгістрацыі – наяўнасць юрыдычнага адрасу ў нежылым памяшканні, і на гэтай падставе ўладамі будзе ліквідаванае.

У цяперашняй сітуацыі, калі ідзе дэклараваная ўладамі "зачыстка" няўрадавых арганізацый, гэта можа азначаць, што полацкая праваабарончая арганізацыя неўзабаве перастане існаваць у якасці юрыдычнай асобы.

"Калі ўсе падаткі сплачаныя, тады установу можна ліквідаваць, пазбавіўшы яе юрыдычнага адрасу", – публічна пракаментаваў сітуацыю дырэктар "Адвакацыі" Мікола Шарах.

Можна меркаваць, што ніякая камерцыйная і тым больш дзяржаўная арганізацыя ў Полацку не возьме на сябе смеласць даць праваабарончай арганізацыі юрыдычны адрас, стаўшы ў апазіцыю да памкненняў уладаў знішчыць незалежны "трэці сектар".

Ці так гэта, дазнаемся пасля 15 жніўня, калі скончыцца тэрмін арэнды.

**27.07.2021** Права на захаванне і развіццё культурнай спадчыны і нацыянальнай ідэнтычнасці важнае для людзей і мусіць ўсяляк падтрымлівацца дзяржавай. У нашай краіне гэтае права абмяжоўваецца ўладамі, імі ствараюцца перашкоды, іншым разам - непасрэдныя забароны на яго рэалізацыю.

Апошнім прыкладам падобнай контрпрадуктыўнай дзейнасці дзяржавы стала закрыццё сацыяльна-культурнай установы "Мова Нанова", якая прапагандавала беларускую мову як сродак камунікацыі беларусаў, усяляк развівала беларускую культуры і натхняла беларусаў на саматоеснасць сярод славянскіх народаў.

Адна з вядоўцаў курсаў "Мова Нанова Віцебск" Таццяна Дубоўская на пытанне, што рабіць далей, раіць працягваць размаўляць па-беларуску і любіць Беларусь. Пра гэта яна напісала на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.

“Сябры! Хутчэй за ўсё вы сочыце за навінамі і ўжо ведаеце, што сацыяльна-культурную ўстанову "Мова Нанова" ліквідавалі. Мы, вядоўцы курсаў удзячныя ўсім, хто быў з намі 7 год. Мы ўдзячныя гасцям, якія знаходзілі час, каб завітаць да нас.

Вялікая просьба да вас, шаноўныя слухачы: не губляйцеся! Мы заўсёды побач і гатовыя прыйсці вам на дапамогу ў моўных пытаннях!

Мова Нанова - гэта тысячы людзей, якія за 7 гадоў прайшлі праз курсы. І атрыманыя веды ды любоў да беларушчыны немагчыма ліквідаваць.

Што рабіць далей? Размаўляць па-беларуску, любіць Беларусь, вывучаць нашую вялікую мову, гісторыю і культуру. Пасля кожнай ночы наступае дзень, і пасля гэтай цёмнай ночы дзень наступіць абавязкова таксама.

Усім шчасця, здароўя і кахання! Пахне чабор!”, - напісала Таццяна Дубоўская.

**28.07.2021** У Камітэце ААН па правах чалавека адбываецца актыўная фаза разгляду скаргаў віцебскай блогеркі Алены Янушкоўскай супраць Рэспублікі Беларусь. Дзяржава настойвае на тым, што скаргі Янушкоўскай непрымальныя для разгляду, бо дзяржава яе правоў не парушала.

Ніжэй прыведзены поўны тэкст каментара, у якім адлюстраваная пазіцыі дзяржавы. Падаем яго тут, каб чытачы самастойна змаглі ацаніць аргументацыю і доказную базу афіцыйнай пазіцыі адносна парушаных правоў на свабоду слова і свабоду мірных сходаў.

Інфармацыя кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь у сувязі з паведамленнямі ў Камітэт ААН па правах чалавека, зарэгістраванымі пад нумарамі 3745/2020, 3746/2020, 3747/2020, 3748/2020, 3749/2020, 3753/2020.

1. Паведамленне 3745/2020 ад 27 лютага 2020 г.

Суд Чыгуначнага раёну г. Віцебску пастановай ад 21 студзеня 2020 г. прызнаў Е. В. Янушковскую вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення масавага мерапрыемства. На падставе часткі 1 артыкулу 23.34 Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей - КаАП), яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 25 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 675 рублёў.

Парадак абскарджання не ўступіў у законную сілу пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні усталяваны артыкуламі 12.1 - 12.3 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей – ПВКаАП).

Віцебскі абласны суд па скарзе Е. В. Янушковской праверыў законнасць і абгрунтаванасць, які не ўступіў у законную сілу пастановы суда Чыгуначнага раёна г. Віцебска ад 21 студзеня 2020 г. Пастановай Віцебскага абласнога суда ад 12 лютага 2020 г. пастанову суда Чыгуначнага раёна г. Віцебска ад 21 студзеня 2020 г. пакінута без змены, а скарга Е. В. Янушковской – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Чыгуначнага раёна г. Віцебска ад 21 студзеня 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 12 лютага 2020 г.

Паведамленне 3746/2020 ад 19 сакавіка 2020 г.
Суд Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 23 студзеня 2020 г. прызнаў Я. В. Янушкоўскую вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення масавага мерапрыемства. На падставе часткі 1 артыкула 23.34 КаАП яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 25 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 675 рублёў.

Законнасьць і абгрунтаванасьць пастановы суду Віцебскага раёну Віцебскай вобласьці ад 23 студзеня 2020 г. па скарзе Е. В. Янушкоўскай праверыў Віцебскі абласны суд. Пастановай Віцебскага абласнога суда ад 19 лютага 2020 г. пастанову суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 23 студзеня 2020 г. пакінута без змены, а скарга Е. В. Янушковской – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 23 студзеня 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 19 лютага 2020 г.

Паведамленне 3747/2020 ад 27 красавіка 2020 г.
Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска пастановай ад 9 студзеня 2020 г. прызнаў Я. В. Янушкоўскую вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення масавага мерапрыемства. На падставе часткі 1 артыкула 23.34 КаАП яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 810 рублёў.

Законнасць і абгрунтаванасць пастановы суда Цэнтральнага раёна г. Мінска, які не ўступіў у законную сілу, ад 9 студзеня 2020 г. па скарзе Я. В. Янушкоўскай правераны ў Мінскім гарадскім судзе. Пастановай Мінскага гарадскога суда ад 28 лютага 2020 г. пастанова суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г. пакінута без змены, а скарга Я. В. Янушкоўскай – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 28 лютага 2020 г.

Паведамленне 3748/2020 ад 29 красавіка 2020 г.
Суд Цэнтральнага раёна г. Мінска пастановай ад 9 студзеня 2020 г. прызнаў Я. В. Янушкоўскую вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення масавага мерапрыемства. На падставе часткі 1 артыкула 23.34 КаАП яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 810 рублёў.

Законнасць і абгрунтаванасць пастановы суда Цэнтральнага раёна г. Мінска, які не ўступіў у законную сілу, ад 9 студзеня 2020 г. па скарзе Я. В. Янушкоўскай правераны ў Мінскім гарадскім судзе. Пастановай Мінскага гарадскога суда ад 28 лютага 2020 г. пастанова суда

Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г. пакінута без змены, а скарга Я. В. Янушкоўскай – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 28 лютага 2020 г.

Паведамленне ад 3749/2020 31 сакавіка 2020 г.

Суд Віцебскага раёна Віцебскай вобласці пастановай ад 24 студзеня 2020 г. прызнаў Я. В. Янушкоўскую вінаватай у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення масавага мерапрыемства. На падставе часткі 1 артыкула 23.34 КаАП яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 810 рублёў.

Законнасць і абгрунтаванасць, які не ўступіў у законную сілу пастановы суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 24 студзеня 2020 г. па скарзе Е. В. Янушковской правераны ў Віцебскім абласным судзе. Пастановай Віцебскага абласнога суда ад 19 лютага 2020 г. пастанову суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 24 студзеня 2020 г. пакінута без змены, а скарга Е. В. Янушковской – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 24 студзеня 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 19 лютага 2020 г.

Паведамленне ад 3753/2020 11 мая 2020 г.
Суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці пастановай ад 18 лютага 2020 г. прызнаў Я. В. Янушкоўскую вінаватай у ажыццяўленні публічных заклікаў да правядзення масавага мерапрыемства з парушэннем устаноўленага парадку яго арганізацыі і правядзення. На падставе часткі 1 артыкула 23.34 КаАП яна падвергнутая адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафу ў памеры 30 базавых велічынь, што на момант вынясення пастановы складала 810 рублёў.
Законнасць і абгрунтаванасць, які не ўступіў у законную сілу пастановы суда Віцебскага

раёна Віцебскай вобласці ад 18 лютага 2020 г. па скарзе Е. В. Янушковской праверaны ў Віцебскім абласным судзе. Пастановай Віцебскага абласнога суда ад 11 сакавіка 2020 г. пастанова суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 18 лютага 2020 г. пакінутая без змены, а скарга Е. В. Янушкоўскай – без задавальнення.

Такім чынам, пастанова суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 18 лютага 2020 г. у дачыненні да Я. В. Янушкоўскай уступіла ў законную сілу 11 сакавіка 2020 г.

Магчымасць абскарджання які ўступіў у законную сілу пастановы суда па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні асобай, у дачыненні да якога яно вынесена, старшыні вышэйшага суда прадугледжана часткамі 1 і 2 артыкула 12.11 ПВКаАП.

Акрамя таго, згодна з часткай 1 артыкула 12.11 Пвкаап якое ўступіла ў законную сілу пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні можа быць перагледжана па пратэсту пракурора.

У органы пракуратуры А. В. Янушковская з скаргамі на якія адбыліся ў дачыненні да яе судовыя пастановы не звярталася, у сувязі з чым іх законнасць не правяралася і не даследавалася.

Пры гэтым часткай 3 артыкула 12.11 ПВКаАП ўсталяваны шасцімесячны тэрмін з дня ўступлення ў законную сілу пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні, на працягу якога можа быць пададзена скарга (прынесены пратэст) на пастанову.

Варта адзначыць, што А. В. Янушкоўская можа рэалізаваць права падаць скаргу на пастановы суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г., пастанову суда Чыгуначнага раёна г.

Віцебска ад 21 студзеня 2020 г., пастановы суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 23 студзеня 2020 г., ад 24 студзеня 2020 г. і ад 18 лютага 2020 г. асобам, названым у частцы 1 артыкула 12.11 ПИКоАП, у пэўны часткай 3 артыкула 12.11 ПВКаАП тэрмін.

Аўтарам у паведамленнях у Камітэт ААН па правах чалавека сцвярджаецца, што адмова ад звароту са скаргамі ў органы пракуратуры абумоўленая неэфектыўнасцю пракурорскага нагляду як сродкі прававой абароны.

Падобныя довады незаможныя зыходзячы з наступнага.
Толькі ў 2019 годзе органамі пракуратуры Рэспублікі Беларусь на судовыя пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях прынесены 4061 пратэст, з якіх 3996 задаволены (98,4%).

Прыведзеныя дадзеныя пераканаўча сведчаць аб тым, што пракурорскі нагляд па дадзеным кірунку нагляднай дзейнасці з'яўляецца дастаткова эфектыўным сродкам прававой абароны.

На падставе выкладзенага мяркуем, што заяўнікам не былі вычарпаныя ўсе наяўныя ўнутраныя сродкі прававой абароны, што ў адпаведнасці з артыкулам 2 Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах цягне немагчымасць прадстаўлення заяўнікам пісьмовага паведамлення на разгляд Камітэта і прызнанне яго непрымальным (артыкул 3 Факультатыўнага пратаколу).

Довады А. В. Янушкоўскай аб парушэнні пункта 1 артыкула 19 (права на свабоднае выказванне меркавання) і артыкула 21 (права на свабоду мірных сходаў) Пакта таксама не знайшлі свайго пацверджання.

Так, у адпаведнасці з часткамі першай, трэцяй і чацвёртай артыкула 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1997 года №114-3 «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь "(далей - Закон “Аб масавых мерапрыемствах”) заява аб правядзенні масавага мерапрыемства падаецца яго арганізатарам (арганізатарамі) у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога плануецца правядзенне масавага мерапрыемства, а ў выпадку правядзення масавага мерапрыемства ў г. Мінску – у Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт не пазней чым за 15 дзён да мяркуемай даты правядзення масавага мерапрыемства.

Згодна з часткі першай артыкула 6 Закона “Аб масавых мерапрыемствах” кіраўнік мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ці яго намеснік абавязаны разгледзець заяву і не пазьней чым за пяць дзён да даты правядзення масавага мерапрыемства ў пісьмовай форме паведаміць яго арганізатару (арганізатарам) аб прынятым рашэнні.

У адпаведнасці часткай другой артыкула 8 Закона “Аб масавых мерапрыемствах” да атрымання дазволу на правядзенне масавага мерапрыемства (падачы паведамлення аб правядзенні масавага мерапрыемства) яго арганізатар (арганізатары), а таксама іншыя асобы не маюць права публічна заклікаць да арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства, у тым ліку аб'яўляць у сродках масавай інфармацыі, глабальнай кампутарнай сеткі Інтэрнэт ці іншых

інфармацыйных сетках аб даце, месцы і часе яго правядзення, вырабляць і распаўсюджваць у гэтых мэтах улёткі, плакаты і іншыя матэрыялы.

Звяртаем увагу, што Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам рашэння аб дазволе правядзення 7 снежня, 8 снежня, 20 снежня, 21 снежня, 29 снежня 2019 г. на пл. Кастрычніцкай у г.Мінску,

а Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэтам 29 снежня 2019 г. на пл. Перамогі ў г. Віцебску мітынгаў, удзельнікам якіх з'яўлялася А. В. Янушкоўская, не прымаліся.

Больш за тое, рашэнні Мінскага гарвыканкама ад 2 чэрвеня 2011 года № 1554 "Аб вызначэнні ў горадзе Мінску месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў" правядзенне масавых мерапрыемстваў у г. Мінску на плошчы Кастрычніцкай не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, калі іх арганізатарамі выступаюць дзяржаўныя органы.

Такім чынам, пастановамі суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 9 студзеня 2020 г., суда Чыгуначнага раёна г. Віцебска ад 21 студзеня 2020 г., суда Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ад 23 студзеня 2020 г., ад 24 студзеня 2020 г. і ад 18 лютага 2020 г. Е. В. Янушкоўская абгрунтавана прызнана вінаватай у здзяйсненні адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 23.34 КаАП і якія выявіліся публічным заклiку да правядзення 29 снежня 2019 г. мітынгу на пл. Кастрычніцкай у г. Мінску, а таксама ў прыняцці актыўнага ўдзелу 7 снежня, 8 снежня, 20 снежня, 21 снежня, у несанкцыянаваных мітынгах без адпаведнага дазволу Менскага і Віцебскага гарадскіх выканаўчых камітэтаў, з мэтай выказвання пратэсту супраць інтэграцыі Рэспублікі Беларусь і Расейскай Федэрацыі.

Палажэнні, якімі гарантуецца свабода меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выказванне, а таксама свабода сходаў, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь, замацаваныя адпаведна ў частцы першай артыкула 33 і артыкулу 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей - Канстытуцыя).

Як неаднаразова адзначалася рашэннямі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, Закона “Аб масавых мерапрыемствах” адпавядае Канстытуцыі, а ўстаноўленыя абмежаванні правоў і свабод асобы не выключаюцца нормамі міжнародных актаў.

Так, у адпаведнасці з падыходамі, выпрацаванымі ў практыцы Еўрапейскага Суда па правах чалавека, «паведамляльны і нават дазвольны парадак для публічнага мерапрыемства, як правіла, не замахваецца на істоту права, прадугледжанага артыкулам 11 Канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, паколькі мэта дадзенага парадку складаецца ў тым, каб даць уладам магчымасць прыняць разумныя і мэтазгодныя меры для забеспячэння спакойнага правядзення любога сходу, мітынгу ці іншага мерапрыемства палітычнага, культурнага або іншага характару» (пункт 40 пастановы ад 10 ліпеня 2012 года).

Парадак арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў вызначаны Законам “Аб масавых мерапрыемствах” у мэтах стварэння ўмоў для рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, забеспячэння грамадскай бяспекі і парадку пры правядзенні гэтых мерапрыемстваў на вуліцах, плошчах і ў іншых грамадскіх месцах.

Згодна з пунктам 3 артыкула 19 Пакта карыстанне правам на свабоднае выказванне свайго меркавання накладае асаблівыя абавязкі і асаблівую адказнасць. Такім чынам, яно можа быць спалучана з некаторымі абмежаваннямі, якія павінны быць устаноўлены Законам і з'яўляцца неабходнымі для аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя або маральнасці насельніцтва. Аналагічныя абмежаванні прадугледжаны і артыкулам 21 Пакта.

Правядзенне масавых мерапрыемстваў у розных грамадскіх месцах горада тычыцца правоў не толькі яго ўдзельнікаў, але і іншых грамадзян, якія ў масавым мерапрыемстве ўдзелу не прымаюць. У сілу часткі другой артыкула 23 Канстытуцыі ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

У сувязі з выкладзеным мяркуем, што ўстаноўлены Законам “Аб масавых мерапрыемствах” парадак арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў, з улікам палажэнняў пункта 3 артыкула 19 і артыкула 21 Пакта, не можа разглядацца як абмежаванне названых правоў.

**29.07.2021** Паводле працэдуры, устаноўленай Камітэтам ААН па правах чалавека, аўтар паведамлення аб парушэнні яго грамадзянскіх і палітычных правоў мае магчымасць выказаць сваё меркаванне і даць ацэнку пазіцыі ўладаў. Алена Янушкоўская скарысталася гэтай магчымасцю і дала грунтоўны і юрыдычна аргументаваны адказ КПЧ наконт пазіцыі беларускага ўраду ў яе справе.

Каментар Алена Янушкоўскай на інфармацыю кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь на паведамленні ў Камітэт ААН па правах чалавека, зарэгістраваны пад нумарамі 3745/2020, 3746/2020, 3747/2020, 3748/2020, 3749D020, 3753/2020.

У адпаведнасці са стандартамі Камітэта па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, сродкі прававой абароны павінны быць не толькі даступнымі, але і эфектыўнымі. Адпаведна, сродкі прававой абароны лічацца вычарпанымі, калі яны не задавальняюць аднаму з гэтых патрабаванняў. У практыцы Камітэта эфектыўным прызнаецца такі сродак, які здольны даць заяўніку пакрыццё шкоды ў дачыненні да яго скаргі і мае разумныя шанцы на поспех.

Камітэт неаднаразова падкрэсліваў, што перагляд у парадку нагляду з'яўляецца распаўсюджаным у былых рэспубліках Савецкага Саюзу дыскрэцыйным пераглядам вынесеных рашэнняў, які Камітэт не прызнае ў якасці эфектыўнага сродку прававой абароны для мэтаў вычарпання ўнутраных сродкаў прававой абароны» (N21418/2005 ад 22 красавіка 2009).



Аналагічных стандартаў прытрымліваецца і Еўрапейскі Суд па правах чалавека (далей-ЕСПЧ), які выпрацаваў практыку эфектыўнасці такога ўнутранага сродку прававой абароны як наглядныя скаргі ў святле стандартаў Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека (далей Канвенцыя). У рашэнні па справе Туміловіч супраць Расіі (№24703Y99 ад 22 чэрвеня 1999) ЕСПЧ вырашыў, што заявы для перагляду рашэнняў у парадку нагляду ўтвараюць надзвычайныя сродкі прававой абароны, выкарыстанне якіх залежыць ад дыскрэцыйных паўнамоцтваў «службовых асобаў суду і пракуратуры і таму яны» не ўтвараюць эфектыўных сродкаў прававой абароны ў сэнсе п.1 артыкула 35 Канвенцыі".

Я, Алена Янушкоўская, не выкарыстала дзейнае нацыянальнае заканадаўства, якое тычыцца права на падачу скаргаў у парадку нагляду службовым асобам вышэйшых судоў і органаў пракуратуры Рэспублікі Беларусь, паколькі лічу, што толькі разгляд скаргі ў судзе другой інстанцыі мог пацягнуць перагляд справы па сутнасці. Працэдуры нагляднай вытворчасці, у дачыненні да якіх уступілі ў сілу рашэнні судоў, уяўляюць сабой надзвычайныя сродкі прававой абароны, якія залежаць ад дыскрэцыйных паўнамоцтваў суддзі альбо пракурора.
У рашэнні №1784/2008 ад 05 верасня 2012, Шумілін супраць Беларусі Камітэт паказаў, што перагляд судовых рашэнняў, якія ўступілі ў законную сілу, у рамках нагляднай працэдуры не складае сродку прававой абароны, які абавязаны быць вычарпаны ў мэтах параграфу 2(b) артыкулу 5 Факультатыўнага пратаколу.

Прыведзеная Рэспублікай Беларусь статыстыка ў дачыненні да прынесеных пракуратурай пратэстаў па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях некарэктная, бо не прадстаўленая статыстыка прынясення пракурорскіх пратэстаў па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях за рэалізацыю правоў, гарантаваных артыкуламі 19 і 21 Пакта.

Такім чынам, мной былі вычарпаныя ўсе наяўныя эфектыўныя ўнутраныя сродкі прававой абароны, а таму яе індывідуальныя паведамленні з'яўляюцца прымальнымі і падлягаюць разгляду.

Артыкул 19 Пакта гарантуе кожнаму чалавеку права на свабоднае выказванне свайго меркавання. Гэта права ўключае свабоду распаўсюджваць усялякага роду інфармацыю і ідэі, незалежна ад дзяржаўных межаў, вусна, пісьмова або шляхам друку або мастацкіх формаў выказвання, ці іншымі спосабамі па свайму выбару.

Артыкул 21 Пакту гарантуе кожнаму чалавеку права на мірныя сходы.

Карыстанне гэтымі правамі не падлягае ніякім абмежаванням, акрамя тых, якія накладаюцца ў адпаведнасці з законам і якія неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, аховы здароўя і маральнасці насельніцтва ці абароны правоў і свабод іншых асоб.

У заўвагах агульнага парадку №34 Камітэт ААН паказаў, што свабода выказвання меркаванняў мае важнае значэнне для любога грамадства і з'яўляецца асновай для любога свабоднага і дэмакратычнага грамадства.

Любое абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў не павінна быць празмерна шырокім па сваім характары, гэта значыць яно павінна быць найменш дакучлівым сярод мер, якія могуць забяспечыць адпаведную ахоўную функцыю, і павінна быць прапарцыйна інтарэсам, якія падлягаюць абароне.

Заўвагі агульнага парадку № 37 Камітэту ААН па правах чалавека абвяшчаюць: калі ўдзельнікі сходу паводзяць сябе мірна, то той факт, што яго арганізатары ці ўдзельнікі не выканалі асобныя ўнутраныя прававыя патрабаванні да правядзення сходу, сам па сабе не выводзіць удзельнікаў з сферы абароны, прадугледжанай артыкулам 21 Пакта, а стыхійныя сходы, як правіла, уяўляюць сабой непасрэдную рэакцыю на бягучыя падзеі, у роўнай ступені абаронены артыкулам 2 .

Разгляданыя масавыя мерапрыемствы і заклік да ўдзелу ў адным з іх, былі стыхійнымі, тычыліся захавання незалежнасці Рэспублікі Беларусь і насілі асабліва мірны характар, што не абверглі кампетэнтныя органы Рэспублікі Беларусь.

Дзяржава не прадставіла доказаў таго, што мае дзеянні хоць якім-небудзь чынам замахнуліся на інтарэсы дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскі парадак, ахову здароўя і маральнасць насельніцтва або на правы і свабоды іншых асоб.

Кампетэнтныя органы Рэспублікі Беларусь не падалі доказаў таго, што нацыянальнае заканадаўства мае легітымныя мэты, абмяжоўваючы свабоду мірных сходаў і выказвання меркавання.

Акрамя таго, Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права (Венецыянская камісія) і Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (АБСЕ/БДІПЧ) у 2012 прынялі сумеснае заключэнне «аб законе Аб масавых мерапрыемствах Рэспублікі Беларусь», у якім правялі аналіз

адпаведнасці Закона «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека, у якім пазначана: «Беларусь у адпаведнасці з міжнародна-прававым абавязацельствам павінна паважаць і абараняць фундаментальныя правы на свабоду сходаў і на свабоду выказвання меркаванняў. Права на арганізацыю і ўдзел у мірных сходах з'яўляецца асноўнай свабодай і краевугольным каменем свабоды палітычных і іншых пунктаў гледжання ў дэмакратычным грамадстве. Нацыянальнае заканадаўства, якое рэгулюе свабоду сходаў, павінна выразна сфармуляваць і ўвасабляць у жыццё асноўныя прынцыпы, якія прымяняюцца для ажыццяўлення гэтага права, якімі з'яўляюцца: прэзумпцыя на карысць правядзення сходаў, пазітыўнае абавязацельства дзяржавы абараняць мірныя сходы, а таксама прынцыпы законнасці, суразмернасці, не дыскрымінацыі і добрага кіравання"»

У сувязі з выкладзеным лічу, што ўстаноўлены законам Рэспублікі Беларусь "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" парадак арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў, з улікам палажэнняў пункта 3 артыкула 19 і артыкула 21 Пакта, абмяжоўвае названыя правы.

Довад кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь у дачыненні да рашэння Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 02 чэрвеня 2011 №1154 "аб вызначэнні ў горадзе Мінску месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў", які забараняе правядзенне масавых мерапрыемстваў у г. Мінску на Кастрычніцкай плошчы, не вылучаўся ў Нацыянальным разглядзе і ўпершыню быў заяўлены ў каментуемай інфармацыі.

Судовыя пастановы былі прынятыя пасля мерапрыемстваў і не ўтрымлівалі адэкватнага аналізу суразмернасці, што з'яўляецца парушэннем патрабаванняў артыкулаў 19 і 21 Пакта.

Нягледзячы на тое, што нацыянальнае заканадаўства дазваляе ўжываць санкцыі да асоб, якія ўдзельнічаюць у масавых мерапрыемствах без дазволу ўладаў, лічу, што рашэнні беларускіх уладаў па сапраўдных справах не ўтрымліваюць дастатковых матываў, якія маглі б апраўдаць умяшанне ў маё права на свабоду сходаў і выказвання меркавання.

Так, у адпаведнасці з падыходамі, выпрацаванымі ў практыцы Еўрапейскага Суда па правах чалавека, «калі неадкладная рэакцыя на палітычную падзею ў форме дэманстрацыі можа быць прызнаная апраўданай, і ў адсутнасць падстаў бачыць пагрозу грамадскаму парадку, рашэнне спыніць мірнае сход, якое працягваецца выключна ў сувязі з невыкананнем патрабаванняў аб паведамленні, без якіх-небудзь прыкмет незаконных дзеянняў дэманстрантаў, было несуразмерным» (пастанова ад 17 ліпеня 2007 па справе №25691/04).

Камітэт у сваіх рашэннях пры аналагічных абставінах неаднаразова прызнаваў Рэспубліку Беларусь парушальнікам абавязацельстваў па артыкулах

19 і 21 Пакта і абавязваў яе прыняць усе неабходныя меры для прадухілення падобных парушэнняў у будучыні, у тым шляхам перагляду нацыянальнага заканадаўства аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў у мэтах прывядзення яго ў адпаведнасць з патрабаваннямі артыкула 19 Пакта.

Пры такіх абставінах мяркую, што прыводныя ў індывідуальных паведамленнях довады аб парушэнні Рэспублікай Беларусь палажэнняў артыкулаў 19 і 21 Пакта — поўныя і дакладныя.

**29.07.2021** Гэта Мікалай Шарах, кіраўнік ячэйкі свабоднага прафсаюзу з Полацку, які падазраецца ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага арт. 341 КК ("Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці"), і актывіст Аляксандр Бажкоў, асуджаны судом Аршанскага раёну на тры месяцы арышту па гэтым жа артыкуле.

Аляксандар Бажкоў ужо адбывае тэрмін у Віцебскім арыштным доме, які месціцца на тэрыторыі Віцебскага абласнога следчыга ізалятару №2.

Чаму гэтыя людзі сталі палітвязнямі, тлумачаць праваабаронцы. На іх думку, нанясенне надпісаў такога кшталту не з'яўляецца праявай хуліганства і вандалізму. Змест надпісаў у кантэксце грамадска-палітычных падзей і публічных грамадскіх дыскусій, палітычных пратэстаў, якія праходзяць у краіне з лета 2020 году, сведчаць аб тым, што матывам іх нанясення было выказванне ўласнага меркавання наконт грамадска значных тэмаў.

Абаронцы правоў чалавека лічаць, што такая форма выказвання меркавання трапляе пад абарону Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і не мае нічога агульнага з прад'яўленымі ім абвінавачваннямі. У адпаведнасці з арт. 19 Пакту, кожны чалавек мае права на свабоднае выказванне свайго меркавання; гэта права ўключае ў сябе свабоду шукаць, атрымліваць усякага роду інфармацыю і ідэі, незалежна ад дзяржаўных межаў, вусна, пісьмова або праз сродкі друку або мастацкія формы выяўлення, ці іншымі сродкамі на свой выбар. Карыстанне гэтым правам можа накладаць асаблівыя абавязкі і асаблівую адказнасць. Яно можа быць, адпаведна, звязанае з некаторымі абмежаваннямі, якія, аднак, павінны быць устаноўленыя законам і з'яўляцца неабходнымі: для павагі правоў і рэпутацыі іншых асоб, для аховы грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя і маральнасці насельніцтва.

Асуджаныя не замахваліся на значныя каштоўнасці, не знішчылі іх. Самі надпісы не ўтрымліваюць мовы варожасці і нянавісці па прыкметах нацыянальнай, расавай, рэлігійнай прыналежнасці або сацыяльнага паходжання ды іншых прыкметах. Нецэнзурная лексіка, якую выкарыстоўвалі некаторыя з іх, не сведчыла сама па сабе аб наяўнасці ў іх дзеяннях складу крымінальнага злачынства.

Матэрыяльная шкода праз такія дзеянні насіла чыста сімвалічны характар.

**31.07 2021** Судом Чыгуначнага раёну 21 ліпеня 2021 году вынесены абвінаваўчы прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні 36-гадовага віцябляніна Аляксандра Жданава. Ён пакараны за публічную абразу прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і праўдзе, па рашэнні суду, на "хіміі" 2,5 года.

Судом устаноўлена, што летась у жніўні мужчына наўмысна, з мэтай прыніжэння гонару і годнасці прадстаўніка ўлады, з выкарыстаннем свайго мабільнага тэлефона ў адной з публічных груп “ВКонтанте” размясціў абразлівы каментар на адрас колішняга кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску Сяргея Сташэўскага ў сувязі з выкананнем ім сваіх службовых абавязкаў.

Суддзя Чыгуначнага раёна Дзяніс Аляксеенка, пагадзіўся з пазіцыяй пракуратуры і на падставе артыкулу 369 КК Рэспублікі Беларусь прызначыў Жданаву пакаранне ў выглядзе двух гадоў і шасці месяцаў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Адначасова суд канфіскаваў мабільны тэлефон ў адпаведнасці з часткай 1 артыкула 46-1 КК Рэспублікі Беларусь.

Прысуд у законную сілу не ўступіў і можа быць абскарджаны або апратэставаны ў апеляцыйным парадку ў Віцебскім абласным судзе.

Як лічаць праваабаронцы, якія назіралі за працэсам, Аляксандр Жданаў можа атрымаць статус палітвязня.

**02.08.2021** "Сёння, 2 жніўня, у 9 гадзін раніцы адвакат Наталля Мацкевіч прыехала да Віктара Бабарыкі ў ПК №1 у Наваполацку, каб аказаць юрыдычную дапамогу. Начальнік калоніі паведаміў, што спатканне да 17.00 немагчымае, бо Віктар Бабарыка на працы і зняць яго з яе нельга", - паведаміў телеграм-канале Бабарыкі ў панядзелак 2 жніўня.

Удакладняецца, што адвакат чакае каб яго дапусцілі да падабароннага. Ён падаў пісьмовую заяву з указаннем на тое, што моцай арт. 62 Канстытуцыі кожны мае права ў любы момант карыстацца юрыдычнай дапамогай адваката.

Як паведамлялася раней, 6 ліпеня 2021 году Вярхоўны суд прысудзіў Бабарыку да 14 гадоў пазбаўлення волі. Цяпер ён знаходзіцца ў калоніі ў Наваполацку.

Віктар Бабарыка ў маі 2020 году пакінуў пасаду кіраўніка Белгазпрамбанку ў сувязі з рашэннем вылучацца кандыдатам на пасаду прэзідэнта Беларусі. Зарэгістравацца кандыдатам ён не змог, бо супраць яго распачалі крымінальную справу і арыштавалі. Разам з Бабарыкам арыштавалі і ягонага сына Эдуарда, які быў кіраўніком перадвыбарчага штабу бацькі.

**03.08.2021** Віцебскага праваабаронцу Паўла Левінава падазраюць у фінансаванні пратэставай дзейнасці.

Такую выснову зрабіла актывістка Таццяна Севярынец, якую выклікалі ў Следчы камітэт, піша Беларускае Радыё Рацыя.

«Пытанні былі звязаныя з Левінавым, BY HELP і «Вясной». Падчасператрусу ў Паўла Левінава забралі камп'ютар, і як мне сказалі, на носьбітах інфармацыі былі квітанцыі за аплату штрафаў. Я казала, што штрафы мы аплачвалі самі, а потым і квітанцыі, і пратаколы – увесь пакет дакументаў, аддавалі Левінаву, і ён рыхтаваў судовыя скаргі. Гэта ўсё бясплатна», – расказала Таццяна Севярынец.

Таксама следчыя распытвалі, ці абяцалі ўдзельнікам пратэстаў аплаціць іхныя штрафы і ці даваў ім праваабаронца грошы. На такія пытанні былі вымушаныя адказваць дзясяткі жыхароў Віцебску, пакараныя за нібыта ўдзел у несанкцыянаваных акцыях. Кагосьці выклікалі ў Следчы камітэт, а да некаторых следчыя прыходзілі проста дахаты.

Што да праваабаронцы Паўла Левінава, то ён не атрымліваў са Следчага камітэту аніякіх афіцыйных звестак пра крымінальную справу, у межах якой праводзяцца допыты віцяблян.

«Я звярнуўся ў цэнтральны апарат Следчага камітэту Рэспублікі Беларусь. Запытаўся, ці распачатыя нейкія крымінальныя справы, па якіх артыкулах, які ў мяне статус – ці я падазраваны, ці я абвінавачаны, ці была абраная нейкая мера стрымання.

І прасіў патлумачыць лёс забраных у мяне рэчаў і грашовых сродкаў», – патлумачыў Павел Левінаў.

Ператрус у Паўла Левінава быў праведзены 16-га лютага. Праваабаронца цвердзіць, што не рабіў ніякіх супрацьпраўных дзеянняў.

Але яму дагэтуль не вярнулі аргтэхніку і дакументы, якія цяпер вывучае Следчы камітэт.

**04.08.2021** Мясцовыя ўлады вырашылі, што гэтая грамадзянская ініцыятыва, якая актыўна працавала ў прасоўванні культурных і гендарных праектаў у Полацкім рэгіёне, мусіць быць ліквідаваная, бо яе дзейнасць носіць дэструктыўны характар і прыносіць шкоду грамадству і дзяржаве.

У рэчаіснасці інфармацыйная-культурніцкі цэнтр “ІніцыАрт” дапамагаў жыхарам рэгіёну рэалізоўваць ідэі, падвышаў ролю грамадзянскіх ініцыятыў у развіцці Полацкага рэгіёну. Многім запомніліся мерапрыемствы, якія праводзіліся арганізацыяй у межах ініцыятывы па развіцці беларускай мовы «Жывая мова». Падчас рэалізацыі ініцыятывы "Ля вакна" праводзіліся індывідуальныя псіхалагічныя кансультацыі для жанчын, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі развіцця.

У межах праекту "Мова Жанчын" удзельніцам давалася магчымасць атрымаць навыкі пабудовы ўзаемаадносін з іншымі людзьмі. Праект дапамагаў удзельніцам усвядоміць розныя мадэлі паводзінаў, пераадольваць страхі, слабасці і пачуццё віны.

Як відаць з пералічаных спраў, інфармацыйна-культурніцкі цэнтр займаўся канкрэтнай дапамогай людзям, на якіх ва ўладаў не было ані часу, ані жадання вырашаць звычайныя жыццёвыя праблемы.

Тым не менш, арганізацыя трапіла ў лік «непажаданых» і «шкодных» і ў бліжэйшы час будзе ліквідаваная.

**05.08.2021** Абвінавачанні супраць падпалкоўніка расейскай паліцыі ў адстаўцы Андрэя Новікава былі выстаўленыя па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ: 371-2 («Незаконнае перасячэнне мяжы») і 342 ч. 1 («Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак»). Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску 5 жніўня прызнаў яго вінаватым па абодвух артыкулах і прысудзіў да двух з паловай годоў няволі. Падтрымаць на судзе актывіста «Краіны для Жыцця» прыехалі яго знаёмыя з Паставаў.

Рашэнне аб пакаранні палітвязня прыняла суддзя Сняжана Кіндзеева.

«Суд пастанавіў Новікава Андрэя Анатольевіча прызнаць вінаватым у прыездзе ў РБ замежнага грамадзяніна, высланага з РБ да заканчэння тэрміну забароны ўезду ў РБ і на падставе артыкула 371-2 прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 1 год», – агучыла суддзя частку выраку.

Таксама – «прызнаць вінаватым у арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады, якія прывялі да парушэння працы транспарту, прадпрыемстваў і арганізацый, і на падставе часткі 1 артыкулу 342 КК РБ прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2 гады».

Па сукупнасці злачынстваў суддзя пастанавіла «шляхам частковага складання прызначаных пакаранняў канчаткова вызначыць Новікаву пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2 гады 6 месяцаў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму».

Андрэй Новікаў у якасці валанцёру руху «Краіна для Жыцця» прымаў актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі 2020 года. Супраць яго была распачатая крымінальная справа па арт. 342.
Сем месяцаў ён правёў у следчым ізалятары і быў дэпартаваны. Але вымушаны быў вярнуцца ў Беларусь, каб адвезці дзіця на лячэнне.

Па вяртанні быў затрыманы. Праведзены тэрмін у СІЗА яму будзе залічаны: адзін дзень у ізалятары роўны паўтара дня калоніі. Арышт, накладзены на маёмасць (тэлевізар, лядоўня, сістэмны блок і іншыя рэчы), мусіць быць зняты.

Разгляд крымінальнай справы супраць Андрэя Новікава пачаўся ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 19 ліпеня. Дзяржаўным абвінаваўцам выступала Вольга Вяржбовіч – старшы пракурор аддзелу пракуратуры Віцебскай вобласці. Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.

**05.08.2021** 4 жніўня суд Докшыцкага раёну разгледзеў адміністрацыйную справу журналіста-фрылансера з Глыбокага Змітра Лупача. Суддзя Дзяніс Корсак прызнаў журналіста вінаватым у незаконным вырабе і распаўсюдзе прадукцыі СМІ (арт. 23.5 КаАП) і пастанавіў спагнаць з Лупача 30 базавых велічыняў (870 рублёў).

Як стала вядома «Віцебскай вясне», падставай для чарговага адміністрацыйнага працэсу над журналістам стаўся фельетон «Дуб, які ўсіх перастаяў», размешчаны на YouTube-канале «Белсату». Яшчэ да моманту разгляду справы матэрыял быў выдалены з YouTube-каналу праз малую наведвальнасць, але міліцыянты паспелі зрабіць копію, якую і падалі на працэсе ў якасці доказу адміністрацыйнага правапарушэння.

Зміцер Лупач на судзе не прысутнічаў, але ў якасці сведкі заявіў докшыцкага краязнаўцу і блогера Кастуся Шыталя, сведчанні якога, аднак, на выніковае судовае рашэнне ніяк не паўплывала. Суд доўжыўся блізу 25 хвілінаў.

Суддзя Дзяніс Корсак, які 18 траўня спыніў адміністрацыйную справу адносна Зьмітра Лупача за фельетон «Леніна знайшлі загорнутым у цэлафан» (праз адсутнасць складу правапарушэння), гэтым разам пастанавіў аштрафаваць журналіста на 870 беларускіх рублёў.

Гэтае рашэнне докшыцкага суду сталася для Зьмітра Лупача дзявятым па ліку прысудам за прафесійную дзейнасць журналіста ў 2021 годзе.

**06.08.2021** У цяперашні час мясцовыя ўлады прыступілі да ліквідацыі сацыяльна-асветніцкай ўстановы ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны "УНОВІС-ФОРУМ", якая была зарэгістраваная рашэннем адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску ў сярэдзіне 2019 года. Прычынай ліквідацыі, на думку чыноўнікаў, стала "неажыццяўленне камерцыйнай арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці на працягу дваццаці чатырох месяцаў запар".

"УНОВІС-ФОРУМ" праіснаваў з рэгістрацыяй крыху больш за два гады. Тым не менш, гэтая арганізацыя пакінула яркі след у прасоўванні ў Віцебскім рэгіёне лепшых узораў культурнагістарычнай спадчыны. Дастаткова нагадаць жыхарам Віцебска аб правядзенні ў кастрычніку 2020 года крэатона

«Адукацыя і гісторыка-культурная спадчына для будучыні Віцебска», які сабраў творчых студэнтаў з ідэямі як палепшыць гарадскую прастору праз прызму спадчыны УНОВІС.

Важна сказаць пра тое, што мерапрыемства было арганізаванае пры падтрымцы Віцебскага гарвыканкаму і Міністэрства замежных спраў Каралеўства Нідэрландаў у межах міжнароднага праекта " праз мастацтва і беларуска-галандскае супрацоўніцтва да навучэнцаў гарадоў», прысвечанага 100-годдзю творчага аб'яднання УНОВІС.

У тым жа годзе ў Віцебску намаганнямі "УНОВІС-ФОРУМ" і Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэту быў праведзены міжнародны конкурс " Арт-эскіз. УНОВІС 100".

У гэтых мерапрыемствах бралі ўдзел больш за сотню студэнтаў мясцовых ВНУ, вопытныя мастакі і дызайнеры-пачаткоўцы.

Застаецца загадкай, чаму гэтая культурная ініцыятыва не прыйшлася да спадобы дзяржаве, але стане фактам тое, што з ліквідацыяй "УНОВІС-ФОРУМ" творчая грамадскасць страціць магчымасць прасоўваць лепшыя ўзоры беларускага мастацтва ў масы, а таксама развіваць мастацкі густ у мастакоў-пачаткоўцаў і дызайнераў.

**07.08.2021** 5 жніўня прэс-сакратар МУС РБ Вольга Чамаданава паведаміла, што пастановай суду Чыгуначнага раёну Віцебску інфармацыйны рэсурс «Чорная кніга артыстаў Беларусі / Белая кніга артыстаў Беларусі» прызнаны экстрэмісцкім. Падставай для такога рашэння сталі матэрыялы праверкі ўпраўлення ГУБОПіК МУС па Віцебскай вобласці.

Акрамя таго ў спіс экстрэмісцкіх рэсурсаў унесеныя Telegram-каналы «Віцебск. Я гуляю! / Навіны Віцебску», « Live Віцебск, я гуляю!», а таксама іх старонкі ў сацыяльных сетках.

Паводле МУС, у гэтых супольнасцях былі апублікаваныя наўпроставыя заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці, скіраванай на дэстабілізацыю грамадскага парадку.

Нагадаем, паводле існага заканадаўства, наступствамі распаўсюду (рэпосту) інфармацыі з экстрэмісцкіх крыніцаў з'яўляецца прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ці арышту.

**10.08.2021** Ад 14 ліпеня 2021 году ўлады распачалі ліквідацыю культурна-асветніцкай установы «Цэнтр урбаністычных праектаў і ініцыятыў «Прастора». Гэтае грамадскае аб'яднанне было зарэгістраванае ў якасці юрыдычнай асобы ў студзені 2016 году ў Віцебскім раёне. Называецца і прычына закрыцця ўстановы: «Неажыццяўленне камерцыйнай арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці на працягу дваццаці чатырох месяцаў запар».

За больш пяцігадовы перыяд свайго існавання «Прастора» ператварылася ў вядучае грамадскае аб'яднанне Віцебску, якое прадуктыўна працавала ў сферы ўрбаністыкі. Нагадаем хаця б пра праект «Устойлівае гарадское кіраванне: практыкі партнёрства». Ён быў накіраваны на аб'яднанне намаганняў гарадскога ўпраўлення і экспертных арганізацый, прадстаўнікоў рабочай групы ініцыятывы «Пагадненне мэраў у Віцебску» і іншых зацікаўленых супольнасцяў.

Да таго ж гэты праект быў зарэгістраваны ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Ўпраўлення справамі Прэзідэнта РБ, і яму было прысвоена пасведчанне ад 24.11.2020 №13-08 / 155.

Магчыма, прычынай ліквідацыі «Прасторы» стала тое, што партнёрам у праекце было германскае Таварыства па міжнародным супрацоўніцтве, а фінансаваў яго, у межах падтрымкі Беларусі, Дортмундскі міжнародны адукацыйны цэнтр па даручэнні Федэральнага міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця.

«Мы застаемся супольнасцю экспертаў і журналістаў, арт-куратараў і дызайнераў, урбаністаў і архітэктараў, якія змяняюць культурныя і прасторавыя ландшафты гарадоў Беларусі!» - напісалі віцебскія ўрбаністы.

**11.08.2021** У апошнія тыдні віцебскімі судамі былі вынесеныя абвінаваўчыя прысуды ў дачыненні да ўдзельнікаў пратэставых падзей 2020 і 2021 гадоў. Два з паловай гады калоніі прысудзілі дзісненцу Аляксею Каршуну (ч.1 арт. 130 КК).

Гэтак, 20 ліпеня 2021 году суддзя Віцебскага абласнога суду Ігар Стэфаноўскі вынес абвінаваўчы вердыкт у дачыненні да жыхара гораду Дзісна Мёрскага раёну Аляксея Каршуна.

Суд прызнаў яго вінаватым у распальванні ў інтэрнэце сацыяльнай варожасці да прадстаўнікоў улады.

Суддзя пагадзіўся з абвінаваўчымі дазадамі следства і пракурора і ўжыў у дачыненні да абвінавачанага пакаранне ў рамках часткі 1 артыкулу 130 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь у выглядзе двух гадоў і шасці месяцаў папраўчай калоніі агульнага рэжыму.

Па рашэнні суду, смартфоны і камп'ютар будуць знаходзяцца пад арыштам да таго моманту, пакуль не будуць аплачаныя судовыя выдаткі і паслугі адваката, які браў удзел у справе падчас папярэдняга следства.

На апецы Каршуна знаходзяцца двое малалетніх дзяцей. Суд не вызначыў іхняга лёсу.

Пасля набыцця прысудам законнай моцы, праваабаронцы разгледзяць выпадак Каршуна на прадмет прызнання яго палітычным зняволеным.



**12.08.2021** Некалькі віцебскіх тэлеграм-каналаў паведамілі пра тое, што на гарадзенскага музыку і грамадзянскага актывіста Ігара Банцэра, які адбывае крымінальнае пакаранне ў віцебскай папраўчай установе адкрытага тыпу №9, адміністрацыяй установы складзены другі пратакол аб парушэнні рэжыму знаходжання.

У цяперашні час Ігар Банцэр змешчаны ў ШІЗА, дзе ён адбывае 10 сутак за парушэнне рэжыму. Паводле новага пратаколу, яму таксама пагражае пакаранне ў выглядзе знаходжання ў ізаляцыі да дзесяці сутак.

Нагадаем, музыку і лідара гурту Mister X Ігара Банцэра судзілі за вулічны перфоманс, які ён зладзіў у ноч з 4 на 5 верасня - танчыў ў ружовых шортах перад міліцэйскай машынай, а потым скінуў шорты і застаўся ў стрынгах. Пазней яму інкрымінавалі артыкул 339 Крымінальнага кодэксу РБ.

Пад вартай Ігар Банцэр знаходзіцца ад 20 кастрычніка 2020 году. На самым пачатку судовага працэсу 3 сакавіка 2021 году ён абвясціў сухую галадоўку. На папярэднім пасяджэнні 18 сакавіка пракурор прапанаваў пакараць Банцэра паўтара гадамі абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову.

Суддзя Наталля Козел пагадзілася з прапановай дзяржаўнага абвінаваўцы і прысудзіла Банцэру паўтара года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу ("хімія").

15 сакавіка 2021 году праваабаронччая супольнасць прызнала Ігара палітзняволеным. На думку праваабаронцаў, кваліфікацыя дзеянняў Ігара Банцэра як крымінальнага злачынства (хуліганства) і ягонае ўтрыманне пад вартай на працягу некалькіх месяцаў ёсць абсалютна непрапарцыйнай мерай, што сведчыць аб палітычных матывах пераследу музыкі з боку беларускіх уладаў.

**13.08.2021** Віцяблянін Юры Серабро быў прызнаны вінаватым у публічнай абразе прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ч. 1 арт. 368 КК РБ). За невялікі каментар у «Інстаграм», у якім мужчына параўнаў Лукашэнку з Люцыферам, суддзя Сняжана Кіндзеева асудзіла яго на 1 год і 6 месяцаў калоніі. Серабро ўзялі пад варту проста ў зале суду.

Увесь працэс, не лічачы перапынку, доўжыўся ўсяго 40 хвілін.

«Суд пастанавіў Серабро Юрыя Аляксандравіча прызнаць вінаватым у публічнай абразе прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і паводле часткі 1 артыкулу 368 КК РБ прызначыць яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў з адбываннем пакарання ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму», – агучыла прысуд суддзя Сняжана Кіндзеева.

Яна пастанавіла таксама змяніць меру стрымання з падпіскі аб нявыездзе на арышт. Юры Серабро быў узяты пад варту проста ў зале суду: трое супрацоўнікаў МУС зайшлі ў судовую залу падчас пасяджэння, яшчэ да таго як быў агучаны прысуд – загадзя гатовыя да выраку зняволення.



Мабільны тэлефон «Самсунг», з якога быў напісаны каментар, канфіскуецца ў даход дзяржавы, арышт з легкавога аўтамабіля здымаецца.

Трое сутак, ад 19 да 22 траўня, праведзеныя ў ІЧУ, будуць залічаныя. Да суду Юры Серабро знаходзіўся на волі пад падпіскай аб нявыездзе. На працэсе ён цалкам прызнаў сваю віну і прасіў суд не адпраўляць яго за краты.

**13.08.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 13 жніўня пачалі разглядаць крымінальную справу паводле ч.1 арт. 368 («Публічная абраза прэзідэнта РБ»). 41-гадовага Юрыя Серабро абвінавачваюць у тым, што 1 сакавіка ў «Інстаграм» ён размясціў абразлівы каментар на адрас Аляксандра Лукашэнкі. Пракурор папрасіў 2 гады калоніі. Рашэнне мусіць прыняць суддзя Сняжана Кіндзеева. Сам абвінавачаны адмовіўся ад адваката і прызнаў віну ў поўным аб'ёме.

Разгляд крымінальнай справы прайшоў у хуткасным рэжыме. На апытанне абвінавачанага, разгляд пісьмовых матэрыялаў справы і спрэчкі бакоў спатрэбілася крыху больш за 30 хвілін. Сведкаў не апытвалі.

Паводле пракурора, Юры Серабро, «маючы намер публічна абразіць прэзідэнта рэспублікі Беларусь Лукашэнку Аляксандра Рыгоравіча і выкарыстоўваючы мабільны тэлефон» на старонцы «Публічны Віцебск» у «Інстаграме» размясціў каментар, у якім, згодна з заключэннем экспертаў ад 12 траўня 2021 году, утрымліваюцца публічна выказаныя ў «пагардлівай і лаянкавай форме абразы на адрас Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча, якія негатыўна ацэньваюць апошняга».

«Разумееце, што сваімі дзеяннямі вы зняважылі прэзідэнта?» – спытала суддзя Сняжана Кіндзеева.

Юры патлумачыў, што «быў на эмоцыях» і «захапіўся тэлеграм-каналамі, захапіўся Інстаграмам».

«Што ў вас такія эмоцыі? Чым вы незадаволеныя?» – удакладніла суддзя.

Абвінавачаны заявіў, што не задаволены беспрацоўем у краіне і што ён вымушаны пастаянна ездзіць на заробкі ў Расею.

Сказаў, што на дадзены момант межы зачыненыя, і таму ў яго праблемы з працаўладкаваннем, пры гэтым ён мае на ўтрыманні малалетняе дзіцяці, а жонка зарабляе ўсяго 500 рублёў.

Падчас судовых спрэчак пракурор заявіў, што, «улічваючы характар і небяспеку ўчыненага злачынства, мэты і матывы», а таксама прымаючы пад увагу тое, што «дзеянні Юрыя Серабро прынеслі істотную шкоду дзяржаўным інтарэсам у выглядзе падрыву аўтарытэту, гонару і годнасці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», папрасіў «прызначыць яму пакаранне ў выглядзе двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі агульнага рэжыму».

«Два гады пазбаўлення волі – гэта вельмі жорстка. Жонка не вытрымае з дзіцём на 500 рублёў. Я не пра сябе думаю, а пра сям'ю», – адказаў Юры.

У апошнім слове ён папрасіў не адпраўляць яго ў турму.

**14.08.2021** 13 жніўня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску пачаўся судовы працэс над 35-гадовым віцяблянінам Сяргеем Думавам. Супраць яго выставілі абвінавачанні ў трох артыкулах Крымінальнага кодэксу. Паводле ч. 1 арт. 293 («Арганізацыя масавых беспарадкаў) Думаве пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі. Яго таксама вінавацяць у падрыхтоўцы да злачынства (ч. 1 арт. 13 КК), у навучанні для ўдзелу ў масавых беспарадках (ч.3 арт. 293 КК), у апаганьванні збудаванняў і псаванні маёмасці ( арт. 341 КК).

Справу разглядае судовая калегія пад старшынёўствам суддзі Міхаіла Юрчанкі, побач з ім – двое народных засядальнікаў.

Пракуратура: арганізоўваў беспарадкі, навучаў пратэстоўцаў…

22 сакавіка Сяргей Думава быў затрыманы ў сувязі з пачаткам адміністрацыйнага працэсу паводле арт. 23. 4 КаАП па факце расклейвання налепак. 23 сакавіка падчас вобшуку ў гаражы Думавы былі знойдзены дымавыя шашкі, страйкбольныя гранаты, петарды, металічны трафарэт герба «Пагоня», металёвыя шыпы ды іншае.

Абвінавачанні выстаўленыя Сяргею Думаве гучалі і пагрозліва, і сюррэалістычна. Гэтак, у прыватнасці, сцвярджалася, што ён «дзейнічаў наўмысна і мэтанакіравана па матывах палітычнай і ідэалагічнай варожасці ў адносінах да органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку ў адносінах да супрацоўнікаў праваахоўных органаў», «планаваў выкарыстоўваць у мэтах правакацыі для распальвання агрэсіўнасці натоўпу з мэтай уключэння іх у гвалт над асобай з ажыццяўленнем пагромаў, падпалаў, знішчэння маёмасці і ўзброенага супраціву».

Паводле абвінавачання, мужчына з дапамогай айфона і планшэту ажыццяўляў у сеціве распаўсюд інфармацыі аб правілах і спосабах перасоўвання ў ходзе несанкцыянаваных масавых беспарадкаў, выкарыстання асабістых транспартных сродкаў для перашкоды дзеянням супрацоўнікам праваахоўных органаў.

Збіраў і распаўсюджваў інфармацыю аб месцах размяшчэння і маршрутах руху супрацоўнікаў МУС.

У перыяд ад 1 кастрычніка да 22 сакавіка займаўся дзейнасцю скіраванай на «сістэматычнае псаванне маёмасці». З выкарыстаннем аэразольнай фарбы наносіў на маёмасць УП «Віцебскводаканал» надпісы: «Жыве Беларусь!», «3 %», « Чырвоны партызан», «Сыходзь» ды інш.

Ад дачы паказанняў адмовіўся

Пасля агучанага пракуроркай абвінавачвання суд меў намер апытаць Сяргея Думаву, але падсудны адмовіўся ад дачы паказанняў. Таксама заявіў, што не гатовы адказваць на ўдакладняльныя пытанні, і адклаў адказ на пытанне аб сваёй вінаватасці.

Суд агучыў усе паказанні Думавы, якія маюцца ў матэрыялах справы. 23 сакавіка ў межах адміністрацыйнай справы ён прызнаўся, што планаваў выкарыстаць знойдзеныя ў яго рэчы супраць праваахоўных органаў. Пацвердзіў, што гэта ён нанёс чырвонай фарбай надпіс «Жыве Беларусь!» на адной з вуліц і ў іншых месцах гораду.

У межах крымінальнай справы Думава ўжо не даваў прызнальных паказанняў і віны сваёй не прызнаў. Патлумачыў, што агаварыў сябе пад пагрозай псіхалагічнага ўздзеяння і запалохвання, датычнага яго сям'і. Запалохваў Думаву нявысветлены міліцыянт у званні старшага лейтэнанта, які падчас апытання дэманстратыўна трымаў у руках гумавы дручок. Менавіта ён суправаджаў Думаву з дзяжурнай часткі да службовага кабінету, перад якім паклаўшы руку на шыю Сяргея, папярэдзіў пра «правільны выбар» падчас апытання: або дае патрэбныя прызнанні – або прызнаецца нават у тым, чаго не рабіў.

Сведка-міліцыянт: ціску не чынілася…
У якасці сведкі быў апытаны супрацоўнік РАУС Першамайскага раёну Тарасенка, які ў дзень затрымання Думавы ў складзе следчай групы выязджаў на месца нанясення надпісу «Жыве Беларусь!» у вёсцы Арэхава. Пасля вяртання ў РАУС міліцыянт стаў сведкам апытання падсуднага.

На судзе супрацоўнік МУС цвердзіў, што падчас апытання на Сяргея Думаву не чынілася ні псіхалагічнага, ні фізічнага ціску. Разам з тым, Тарасенка адмовіўся ад таго, што гэта ён суправаджаў Думаву з дзяжурнай часткі да службовага кабінету. Прыгадаў, што 23 сакавіка падчас апытання Думава сцвярджаў, што баяўся выкарыстоўваць знойдзеныя ў яго рэчы, бо разумеў крымінальныя наступствы, з гэтым звязаныя.

Як распавялі знаёмыя абвінавачанага, Сяргей Думава – былы канструктар прамысловых і грамадскіх будынкаў. Займаўся праектаваннем гарадской забудовы Віцебску, але два гады таму ягоны талент аказаўся незапатрабаваны. Добры спецыяліст застаўся без працы, доўга не мог нідзе ўладкавацца і вымушаны быў пайсці працаваць вартаўніком.

Сяргей выхоўвае двух няпоўнагадовых дзетак.

Наступнае паседжанне адбудзецца 16 жніўня (пачатак у 10.00).

**16.08.2021** 16 жніўня ў судзе Першамайскага раёну Віцебску працягнуліся судовыя слуханні ў справе віцяляніна Сяргея Думавы. Як і мінулым разам, на паседжанне прыйшлі знаёмыя падсуднага і неабыякавыя віцябляне. Аднак па хадайніцтве пракуратуры суд прыняў рашэнне выдаліць з залы ўсіх прысутных. Суддзя Міхаіл Юрчанка дазволіў застацца толькі жонцы падсуднага.

Сяргея Думаву – былога канструктара прамысловых і грамадскіх будынкаў, абвінавачваюць паводле ч. 1 і ч. 3 арт. 293 («Арганізацыя масавых беспарадкаў і навучанне для ўдзелу ў масавых беспарадках), ч. 1 арт. 13 КК (падрыхтоўка да злачынства), арт. 341 КК (апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці).

Перад пачаткам судовых слуханняў прадстаўніца пракуратуры заявіла хадайніцтва. Яна паведаміла, што ў пракуратуру паступілі сведчанні ад старшага ўпаўнаважанага ГУБАЗіК МУС па Віцебскай вобласці пра тое, што без дазволу суду на інтэрнэт-рэсурсе, які ўказаны ў рапарце, быў размешчаны фотаздымак абвінавачанага Думавы. У сувязі з тым, што фота зробленае без дазволу і апавяшчэння суду, пракурорка папрасіла праводзіць судовае паседжанне ў закрытым рэжыме.

Суд задаволіў хадайніцтва пракуратуры.



Кіруючыся ч.2 артыкулу 23 КПК і пастановай Вярхоўнага суду «Аб забеспячэнні галоснасці пры ажыццяўленні правасуддзя…», суд спаслаўся на тое, што «пры разглядзе судом асабліва цяжкіх злачынстваў, скіраваных супраць грамадскай бяспекі і ў мэтах забеспячэння належнага парадку ў судовым паседжанні і бяспекі ўдзельнікаў працэсу», судовае паседжанне можа праходзіць у закрытым рэжыме.

Суддзя Міхаіл Юрчанка папрасіў усіх прысутных, апроч блізкіх сваякоў, пакінуць судовую залу.

**17.08.2021** Напачатку жніўня 2021 году Камітэт ААН па правах чалавека зарэгістраваў пад нумарам 3991/2021 індывідуальную скаргу Таццяны Севярынец. Грамадзянская актывістка лічыць, што беларуская дзяржава парушыла яе правы: на свабоднае выказванне свайго меркавання і на ўдзел у мірным сходзе.

24 снежня 2019 году на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» грамадзянская актывістка Таццяна Севярынец разьмясціла тэкст, у якім заклікала віцяблян да ўдзелу ў мірным пратэсце «супраць інкарпарацыі краіны ў склад Расеі».

Падчас суду Таццяна пацвердзіла, што заклікала грамадзянаў паўдзельнічаць 29 снежня ў мірным сходзе, каб выказаць сваё меркаванне наконт захавання незалежнасці Беларусі. 23 студзеня 2020 году суддзя суду Першамайскага раёну Віцебску Міхаіл Юрчанка аштрафаваў Севярынец на 810 рублёў. 19 лютага суддзя Віцебскага абласнога суду Святлана Іванова, разгледзеўшы скаргу Севярынец на рашэнне суддзі Юрчанкі, пакінула яе без змены, а патрабаванні спыніць справу без задавальнення.

Такім чынам, не дамогшыся абароны сваіх грамадзянскіх правоў у беларускіх судах, Таццяна Севярынец звярнулася ў Камітэт па правах чалавека, які зарэгістраваў яе паведамленне ў межах дзейнай працэдуры.

Цяпер беларуская дзяржава мусіць даслаць у Камітэт пераканаўчыя аргументы з нагоды скаргі актывісткі.

**18.08.2021** Вядомы віцебскі краязнаўца і фотамастак Віктар Барысенкаў 18 жніўня падаў у абласны суд скаргу на пастанову суду Кастрычніцкага раёну Віцебску. Тым самым ён выказаў нязгоду з рашэннем суддзі Уладзіміра Царыкава, згодна з якім мусіў быць арыштаваны на сем сутак за публічнае дэманстраванне ў сетцы Інтэрнэт нацысцкай сімволікі.

13 жніўня 2021 году суддзя Уладзімір Царыкаў, разгледзеўшы справу аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным ч. 1 арт. 19.10 КаАП, пакараў фотамастака адміністрацыйным арыштам на 7 сутак.

Віктара Барысенкава вінавацілі ў размяшчэнні і захоўванні ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте" ў адкрытым доступе чатырох фотаздымкаў з выявай нацысцкай сімволікі (свастыкі). З падобнай кваліфікацыяй Барысенкаў не пагадзіўся.

Ён лічыць, што суддзя не цалкам даследаваў абставіны справы, а самое судовае следства было праведзенае аднабакова, няпоўна і неаб'ектыўна.

У судзе ён прызнаў факт размяшчэння на асабістай старонцы ў адкрытым доступе сярод 2289 фотаздымкаў, знятых нямецкімі ваеннымі фатографамі і вайскоўцамі нацысцкай Германіі за тры гады акупацыі Віцебску. Сярод гэтых фота апынулася ўсяго некалькі, на якіх відаць малюнак нацысцкай сімволікі. Віктар Барысенкаў таксама не адмаўляўся ад таго, што калекцыя знаходзіцца ў вольным доступе, адкрытая для даследчыкаў і выкарыстоўваецца гісторыкамі, краязнаўцамі, архітэктарамі, рэстаўратарамі, а таксама ўсімі, хто цікавіцца гістарычным мінулым Віцебску.

Падчас суду краязнаўца настойваў на тым, што фотаздымкі Віцебску часоў акупацыі маюць велізарную каштоўнасць, бо на іх зафіксаваныя месцы і падзеі ў многіх выпадках невядомыя ў

іншых крыніцах. Такім чынам, гэтыя фота з'яўляюцца для гісторыкаў унікальнымі артэфактамі. Сабраныя разам, яны сведчаць з максімальнай паўнатой аб рэальных падзеях тых трагічных гадоў. Ваенны Віцебск на пераважнай большасці здымкаў паказаны амаль цалкам разбураным, і ў гэтым кантэксце адзінкавыя выпадкі малюнка нацысцкай сімволікі, на фотаздымках не можа не выклікаць пачуццё асуджэння і нянавісці да нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На думку Віктара, суддзя Царыкаў праігнараваў заўвагу да артыкулу 19.10. КаАП, згодна з якім не з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем публічнае дэманстраванне і захоўванне нацысцкай сімволікі ў сувязі з калекцыянаваннем культурных каштоўнасцяў і адукацыйнай дзейнасцю пры адсутнасці прыкмет прапаганды нацысцкай сімволікі. Не разабраўся суддзя, што калекцыя выкарыстоўвалася і ў адукацыйных мэтах.

Барысенкаў настойвае на тым, што матэрыялы справы аб адміністрацыйным правапарушэнні не ўтрымліваюць ніводнага доказу таго, што 4 з 6239 фотаздымкаў калекцыі прапагандуюць нацысцкую сімволіку.

«Наадварот, матэрыяламі справы ўстаноўлена адваротнае, у тым ліку тое, што знаходжуся ў 25-ці супольнасцях гістарычнай тэматыкі», – дадаў «правапарушальнік».

Падаўшы скаргу ў вышэйшы суд, Віктар спадзяецца, што ягоная справа будзе разгледжаная "строга па законе", будуць улічаныя ягоныя довады, выкладзеныя ў скарзе, і гэта прывядзе да адмены пастановы суддзі Царыкава. Віктар Барысенкаў спадзяецца, што справа будзе спыненая праз адсутнасць складу адміністрацыйнага правапарушэння.

**19.08.2021** З 15 ліпеня 2021 года Наваполацкі гарадскі выканаўчы камітэт прыступіў да ліквідацыі дабрачыннай сацыяльна-інфармацыйнай установы «Прастора поспеху».

Гэтае грамадскае аб'яднанне было зарэгістраванае ў якасці юрыдычнай асобы ў чэрвені 2016 года ў пасёлку Баравуха Полацкага раёну.

Прычына закрыцця ўстановы чыста фармальная: «неажыццяўленне камерцыйнай арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці цягам 24 месяцаў запар».

Установа «Прастора поспеху» – грамадская арганізацыя з некамерцыйнай скіраванасцю і займалася збольшага рэалізацыяй адукацыйных міні-праектаў для жанчын і моладзі.



Паводле інфармацыі, якая размешчаная на старонцы арганізацыі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», актывісты ўстановы займаліся не палітычнай дзейнасцю, а дапамагалі жанчынам навучацца практычным навыкам сацыяльнай камунікацыі і ўзаемадзеяння. Былі праведзеныя трэнінгі: «Я ў сям'і», «Дзеці і падлеткі: дазволіць або забараніць?», «Матывацыя да захавання здароўя». Яны былі накіраваныя на паляпшэнне камунікацыяў у сем’ях, мінімізацыі канфліктаў і іх вырашэнню, а таксама прапагандавалі здаровы лад жыцця.

Трэнінг па арт-тэрапіі «Прамяністая жанчына» навучаў разбірацца ва ўнутраных праблемах і прымяняць атрыманы падчас навучання досвед у розных жыццёвых сітуацыях – як дома, так і на працы.

У выпадку закрыцця ўстановы «Прастора поспеху» ўлады на доўгі час пазбавяць жанчын Баравухі магчымасці вучыцца цывілізавана вырашаць сямейныя праблемы.

Фактычна чыноўнікі, якія вырашылі ліквідаваць установы «Прастора поспеху», парушылі права грамадзян на асацыяцыі. Такія дзеянні есць грубым парушэннем Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Але беларускія ўлады даўно адмовіліся ад сваіх міжнародных абавязкаў у сферы правоў чалавека.

**20.08.2021** 20 жніўня Віцебскі абласны суд разгледзеў скаргу вядомага краязнаўцы і фотамастака Віктара Барысенкава. Ён абскардзіў рашэнне суддзі Уладзіміра Царыкава, які пакараў яго адміністрацыйным арыштам на 7 сутак за тры фотаздымкі часоў фашысцкай акупацыі, размешчаныя ў інтэрнэце. Суддзя трактаваў гэта як публічную дэманстрацыю нацысцкай сімволікі (ч.1 арт.19.10 КаАП). На разгляд скаргі Барысенкаў прыйшоў з асабістымі рэчамі, гатовы да таго, што яго возьмуць пад варту ў зале суду.

«Барысенкаў прызнаны вінаватым у публічнай дэманстрацыі ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте» у глабальнай сетцы Інтэрнэт нацысцкай сімволікі. У сваёй скарзе Барысенка ўказвае, што з пастановай аб накладанні спагнання нязгодны», – агучыла скаргу суддзя Ірына Смалякова.

Віктар Барысенкаў патлумачыў суддзі, што апублікаваныя ім фотаздымкі маюць вялікую гістарычную каштоўнасць, і размясціў ён іх разам з іншымі фота таго перыяду, каб людзі мелі магчымасць убачыць, як выглядаў Віцебск падчас акупацыі. Іншай магчымасці зрабіць гэта ў віцяблянаў няма: большасць будынкаў і збудаванняў проста не захавалася.

«Гэты альбом налічвае 2300 фатаграфій, прысвечаных акупацыі, і я думаў, што гэтыя фатаграфіі сведчаць пра гэты час. Яны ніякім чынам не прапагандуюць нацысцкую сімволіку. Яны паказваюць, якім Віцебск быў у той перыяд», – заўважыў на судзе Віктар Барысенкаў.

Ён заявіў, што не з'яўляецца скінхэдам ці наагул прыхільнікам фашысцкай ідэалогіі.

«Я гэтыя свастыкі не маляваў і не падмалёўваў. Гэта свастыкі, якія трапілі ў кадр», – заявіў сп. Віктар.

Ён таксама патлумачыў, што дзве фатаграфіі, за якія яго асудзілі, былі зробленыя нямецкімі вайскоўцамі падчас акупацыі, а трэцяя, на якой савецкія салдаты ў руках трымаюць фашысцкі сцяг, была зробленая савецкім фатографам ва ўжо вызваленым горадзе.

Краязнаўца прынёс у суд шматлікія граматы ад розных навучальных і адукацыйных установаў, у якіх чытаў лекцыі па краязнаўстве. Тлумачыў, што займаецца адукацыйнай дзейнасцю, калекцыянуе і размяшчае ў агульны доступ гістарычныя фатаграфіі менавіта з гэтай мэтай. Падзяліўся, што да яго звяртаюцца многія гісторыкі і архітэктары па фотаздымкі, каб ведаць, як выглядаў горад у розных гістарычных эпохах. У ягонай калекцыі маюцца фота аж ад XIX-га стагоддзя.

Аднак усе довады навукоўца і фотамастака аказаліся марнымі. Суддзя Ірына Смалякова прыняла рашэнне пакінуць у сіле вырак суду Кастрычніцкага раёну Віцебску.

Пасля абвяшчэння такога рашэння Віктар пацікавіўся, што яму рабіць далей і калі яго возьмуць пад варту. Супрацоўнікі суду адказалі, каб ён не турбаваўся – за ім прыйдуць, калі будзе трэба…

**21.08.2021** Па пратэсце пракурора, жыхарам Наваполацку - палітвязням Віктару Шаўру і Віталю Шыцікаву, якія былі асуджаныя на два гады абмежавання волі за ўдзел у акцыях пратэсту ў жніўні 2020 году, суд замяніў пакаранне на больш строгае - на пазбаўленне волі.

Паводле абвінавачвання, злачынства Віктара Шаўры і Віталя Шыцікава палягала ў тым, што яны «разам з іншымі людзьмі ішлі па праезнай частцы наперадзе групы грамадзян, на чырвоны сігнал святлафору, выкрыквалі лозунгі, пляскалі ў далоні і нецэнзурна лаяліся на міліцыянтаў».

У студзені 2021 года суд прызнаў абодвух фігурантаў справы вінаватымі і вынес ім пакаранне ў выглядзе двух гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Мужчыны абскардзілі выракі, але Віцебскі абласны суд пакінуў прысуды без змены.

Аднак пракуратура не пагадзілася з рашэннем судоў, палічыўшы іх за занадта мяккія і прынесла пратэст на прысуды. У чэрвені 2021 году суд апеляцыйнай інстанцыі паўторна разгледзеў справы ўдзельнікаў наваполацкіх пратэстаў. Суд прысудзіў Віктару Шаўру замест «хіміі» - два гады, а Віталю Шыцікаву - два з паловай гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Напрыканцы ліпеня асуджаныя былі этапаваныя да месцы адбыцця пакарання.

**22.08.2021** Упраўленне ўласнай бяспекі па Віцебскай вобласці МУС паведамляе, што ідэнтыфікавала асобу жыхара Наваполацку, які ў сетцы Інтэрнэт «дапусціў зняважлівыя вы

казванні на адрас супрацоўніка міліцыі ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў». Прынамсі гэтак трактуе дзеянні навапалачаніна следства.

Гэтым правапарушальнікам аказаўся 42-гадовы працаўнік аднаго з акцыянерных таварыстваў Наваполацку, які ў чэрвені 2021 году ў сацыяльнай сетцы пакінуў абразлівы каментар пра начальніка ІСН Аршанскага РУУС Дзмітрыя Вішнеўскага. Мужчына раскаяўся ва ўчыненым і прынёс свае прабачэнні падпалкоўніку Вішнеўскаму - начальніку інспекцыі ў справах непаўналетніх, сцвярджае ведамства.

Праваабаронцы адзначаюць, што раскаянне і прабачэнні перад пацярпелым не прадугледжаныя дзейным крымінальным заканадаўствам. Да таго ж - гэта парушэнне з боку праваахоўных органаў прэзумпцыі невінаватасці, бо віна абвінавачанага не была яшчэ даказаная ў судзе.

Тым не менш, следчым органам у дачыненні мужчыны распачатая крымінальная справа паводле арт. 369 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь па факце публічнай абразы прадстаўніка ўлады.

Калі ў судзе будзе даказаная віна навапалачаніна, яму будзе пагражаць максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да трох гадоў.

**24.08.2021** 23 жніўня праваабарончая супольнасць прызнала шэраг грамадзян Беларусі, асуджаных па розных крымінальных артыкулах, палітычнымі зняволенымі. Сярод іх – 41-гадовы жыхар Віцебску Юры Серабро, які за каментар у сацсетцы на адрас Лукашэнкі быў асуджаны па ч. 1 арт. 368 КК («Публічная абраза прэзідэнта РБ») на паўтара года калоніі агульнага рэжыму.

Сумесную заяву прадстаўнікоў беларускай праваабарончай супольнасці падпісалі 9 праваабарончых арганізацый.

Юры Серабро быў асуджаны судом Кастрычніцкага раёну гораду Віцебску 13 жніўня 2021 году. Суддзі Сняжане Кіндзеевай хапіла ўсяго 40 хвілін, каб цалкам разабраць крымінальную справу і прыняць такое рашэнне. На судзе мужчына прызнаў сваю віну і ад паслуг адваката адмовіўся. Падставай для судовага разбору паслужыў каментар у сацыяльнай сетцы «Інстаграм» пад постам у групе «Тыповы Віцебск», які Юры пакінуў 1 сакавіка 2021 году. У ім ён параўнаў прэзідэнта Лукашэнкі з д'яблам, напісаўшы, што ён «Люцыфер у абліччы чалавека».

На працэсе суддзю цікавілі палітычныя погляды абвінавачанага.

«Нейкая асабістая непрыязь у вас ёсць да прэзідэнта?» – запытвала Кіндзеева. «Не», – апраўдваўся Юры. І тлумачыў, што напісаў каментар на эмоцыях, бо ў краіне няма для яго працы і даводзіцца «жыць за капейкі». У Расею ж, куды ён ездзіў працаваць раней, яго не пускаюць праз пандэмію.

«Разумееце, што так рабіць нельга?» – пыталася суддзя. «Зразумеў, калі за мной прыехаў ГУБАЗіК», – адказаў Серабро. Ён таксама тлумачыў, што ў пратэставых акцыях не браў удзелу і сцягоў удома не трымае, палітычнымі працэсамі не цікавіўся.

«Гэта адзінае што вы зрабілі?» – удакладніла суддзя. «Так, на эмоцыях», – адказаў сп. Юры.

Беларускія праваабарончыя арганізацыі палічылі гэты судовы працэс, а таксама сам прысуд «палітычна матываваным, звязаным з мірнай рэалізацыяй выказвання меркавання».

Праваабаронцы заклікалі беларускія ўлады неадкладна вызваліць Юрыя Серабро, як і астатніх грамадзян, прызнаных палітычнымі зняволенымі.

**24.08.2021** Актывістка партыі «Народная Грамада» з Дуброўна Наталля Стрэльчанка атрымала афіцыйны ліст з камітэту ААН па правах чалавека. Яе індывідуальная скарга зарэгістраваная пад нумарам 3946/2021. Падчас прэзідэнцкай кампаніі 2020 году яна вылучалася ў межах стратэгіі «30 кандыдатаў пратэсту». Але яе ініцыятыўная група, як і групы Мікалая Статкевіча, Сяргея Ціханоўскага ды іншых кандыдатаў, не была зарэгістраваная выбарчай камісіяй.



20 студзеня 2020 году суд Дубровенскага раёну пакараў Наталлю Стрэльчанку за ўдзел у мірнай акцыі ў падтрымку незалежнасці Беларусі і супраць інтэграцыі з Расеяй, якая праходзіла ў Менску 20 снежня 2019 года. Суддзя Марыя Цыклінская аштрафавала актывістку на 25 базавых велічынь (на той час – 675 рублёў). Суд трактаваў дзеянні Стрэльчанкі як «удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве» (арт. 23.34 КаАП). У інтэрв'ю «Віцебскай Вясне» у 2019 годзе Наталля Стрэльчанка заявіла, што выступае супраць інтэграцыі з Расеяй бо не хоча, каб яе дзеці служылі ў расейскім войску.

З выракам райсуду актывістка не пагадзілася і абскардзіла штраф у абласным судзе. 5 лютага 2020 году суддзя Ірына Смалякова пакінула яе скаргу без задавальнення, а рашэнне Дубровенскага суду без зменаў. Прайшоўшы ўсе ступені нацыянальнай судовай сістэмы (у тым ліку і Вярхоўны суд), актывістка была вымушаная звярнуцца ў Камітэт па правах чалавека. Напісаць скаргу ў КПЧ ёй дапамог праваабаронца Леанід Судаленка. Цяпер дзяржава Беларусь мусіць адказаць КПЧ і прывесці свае довады.

На дадзены момант Наталля Стрэльчанка знаходзіцца па-за межамі Беларусі. «Я ўжо не вытрымала іх рэгулярных «наведванняў» і ціску, праз магчымае затрыманне і арышт вымушаная была з’ехаць», – кажа Наталля.

Усяго за апошні час у доме дубровенскай актывісткі адбыліся 5 ператрусаў. Апошніператрус прайшоў 30 траўня, пасля чаго яна прыняла рашэнне з’ехаць з краіны.

Канфіскаваныя рэчы ёй так і не вярнулі.

**27.08.2021** 27 жніўня Вярхоўны суд разгледзеў апеляцыйную скаргу асуджаных Магілёўскім абласным судом паводле артыкулу 293 КК («Арганізацыя масавых беспарадкаў») Паўла Севярынца, Яўгена Афнагеля, Андрэя Войніча, Паўла Юхневіча, Максіма Вінярскага, Дзмітрыя Казлова і Ірыны Шчаснай. Як стала вядома, Вярхоўны суд пакінуў рашэнне абласнога суду без зменаў, а скаргу асуджаных без задавальнення.

25 траўня Магілёўскі абласны суд паводле ч.1 арт.13 і ч.2 арт.293 КК прызнаў Паўла Севярынца, Яўгена Афнагеля, Андрэя Войніча, Паўла Юхневіча, Максіма Вінярскага, Дзмітрыя Казлова і Ірыну Шчасную вінаватымі ў падрыхтоўцы да ўдзелу ў масавых беспарадках. Суддзя Ірына Ланчава прысудзіла Севярынцу, Афнагелю, Войнічу – 7 гадоў зняволення ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Астатнія абвінавачаныя атрымалі ад 4 да 5 гадоў зняволення.

Сённяшняе рашэнне Вярхоўнага суду пракаментавала «Віцебскай Вясне» актывістка Таццяна Севярынец – маці палітвязня Паўла Севярынца.

«Спадзяванняў на змяншэнне тэрміну і не было – прысуды пакінулі без зменаў. Але я веру, што даседжваць гэтыя тэрміны будуць тыя, хто выносіў несправядлівы вырак», – сказала маці палітвязня.



«Як мне распавялі, суддзі Вярхоўнага суду рабілі сёння выгляд, што яны глыбока і сур'ёзна разбіраюцца ў акалічнасцях справы.

Але задоўга да прыняцця рашэння яны ведалі, што справа не проста шытая белымі ніткамі – яна зляпаная адно для таго, каб гэтых людзей пазбавіць волі і змясціць за краты. Толькі таму, што гэтыя асобы як вулічныя барацьбіты, як харызматычныя лідары – асабліва небяспечныя для рэжыму. Так, цяпер яны будуць пакутаваць, пойдуць на зону, але яшчэ раз паўтаруся: гэтыя тэрміны людзі адбываць не будуць. Змены не за гарамі. Няхай пра гэта ведаюць усе, хто мае дачыненне да гэтага злачынства», – дадала Таццяна Севярынец.

Нагадаем, Паўла Севярынца затрымалі 7 чэрвеня 2020 года. 75 сутак палітык правёў на Акрэсціна. Затым яго перавялі ў СІЗА на Валадарскага, выставіўшы абвінавачанне па арт. 293 КК («Арганізацыя масавых беспарадкаў»).

**30.08.2021** У жніўні 2021 году сябра праваабарончай арганізацыі «Беларускі Хельсінкскі Камітэт» (БХК) Ірына Траццякова накіравала індывідуальнае паведамленне ў Камітэт ААН па правах чалавека. Яна лічыць, што беларуская дзяржава парушыла яе правы на свабоду слова і мірныя сходы, а таксама права на справядлівы разбор яе справы кампетэнтным, незалежным і бесстароннім судом.

19 чэрвеня 2020 году Ірына Траццякова па заданні БХК ажыццяўляла ў Віцебску маніторынг мірнага сходу. Незразумела, з якой прычыны ўлады палічылі яе удзельнікам масавага мерапрыемства, а не назіральнікам, і 10 сакавіка 2021 году суд Чыгуначнага раёна Віцебску (суддзя Святлана Варатынская) прыцягнуў Траццякову да адміністрацыйнай адказнасці. Згодна з пастановай суду, за ўдзел у акцыі Ірына была аштрафаваная на 580 рублёў.

Згодна з працэсуальным законам, праваабаронца абскардзіла пастанову суддзі Варатынскай у Віцебскім абласным судзе. Аднак аблсуд, у асобе суддзі Андрэя Прэйса, пакінуў скаргу без задавальненьня, і рашэнне суду Чыгуначнага раёну набыла законную моц.

Прайшоўшы ўсе інстанцыі па абароне сваіх грамадзянскіх правоў і права публічна выконваць абавязкі ў межах статуту праваабарончай арганізацыі, Ірына Траццякова звярнулася з індывідуальным паведамленнем у Камітэт ААН па правах чалавека.

Трэба нагадаць, што ў заўвагах агульнага парадку №37 Камітэт звярнуў увагу уладаў на тое, што асабліва важную ролю ў поўным ажыццяўленні права на мірныя сходы адыгрываюць журналісты, праваабаронцы, назіральнікі на выбарах і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у маніторынгу або справаздачнасці. Гэтыя асобы маюць права на абарону ў адпаведнасці з Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Ім не можа быць забаронена выконваць гэтыя функцыі, нельга неабгрунтавана абмяжоўваць іх выкананне, у тым ліку ў частцы маніторынгу дзеянняў супрацоўнікаў праваахоўных органаў.



У заўвагах таксама пазначана, што грамадзянскія актывісты і журналісты не павінны падвяргацца рэпрэсіям або пераследам у іншай форме, а іх абсталяванне не мусіць

канфіскоўвацца або быць пашкоджаным. Нават калі сход абвешчана незаконным або разагнаны, гэта не азначае спынення права весці маніторынг. Маніторынг сходаў з'яўляецца адным з прыкладаў належнай практыкі для незалежных нацыянальных праваабарончых установаў і няўрадавых арганізацый.

«Пры разглядзе справы Ірыны Траццяковай суд не быў кампетэнтным. Накладанне на яе адміністрацыйнага спагнання за ажыццяўленне маніторынгу мірнага сходу ёсць не што іншае, як ухіленне Рэспублікі Беларусь ад узятых на сябе абавязкаў па недапушчальнасці ўчынення дзеянняў, накіраваных на знішчэнне правоў і свабод, прадугледжаных Пактам», – лічыць праваабаронца Павел Левінаў.

Праваабаронца спадзяецца, што скарга будзе зарэгістраваная і КПЧ ва ўстаноўленыя тэрміны разгледзіць зварот Ірыны Траццяковай па сутнасці.

**01.09.2021** 27 жніўня суд Мёрскага раёну прысудзіў 33-гадовага мужчыну да аднаго з паловай году калоніі агульнага рэжыму. Зняты ім відэаролік палічылі «публічнай абразай прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (ч. 1 арт. 368 КК РБ). Таксама суд пастанавіў адправіць мужчыну на прымусовае лячэнне ад алкагалізму, паведамляе прэс-служба Вярхоўнага суду РБ. Суд, відаць, палічыў, што такі ролік мог зняць толькі чалавек у нецвярозым стане...

Згодна з абвінавачаннем, грамадзянін Л. 27 сакавіка 2021 году, знаходзячыся дома ў сваёй сястры ў Мёрах, запісаў на тэлефон «Xiaomi» відэаролік, які ўтрымліваў «ненарматыўную форму маўленчага выказвання ў дачыненні прэзідэнта Рэспублікі Беларусь». Потым мужчына выклаў яго ў адну з сацыяльных сетак.

На думку суду, гэты кантэнт быў накіраваны «на падрыў аўтарытэту кіраўніка дзяржавы», які ў выніку быў публічна зняважаны.

Аўтар відэа пра Лукашэнку цалкам прызнаў сваю віну і раскаяўся.

Суд прыняў рашэнне пакараць мужчыну пазбаўленнем волі на тэрмін 1 год 6 месяцаў з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Апроч таго, у дачыненні мужчыны будзе ўжытае прымусовае лячэнне ад алкагалізму. Мабільны тэлефон, з дапамогай якога быў зняты відэаролік, канфіскаваны як прылада злачынства.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ці апратэставаны ў абласным судзе.

Гэта не першы выпадак у Віцебскай вобласці, калі судзяць за публічныя выказванні грамадзян у бок Аляксандра Лукашэнкі. Так, зусім нядаўна за каментар у «Інстаграм» быў асуджаны жыхар Віцебску Юры Серабро.

Яму таксама прысудзілі паўтара года калоніі паводле арт. 368 КК РБ. Пазней яго прызналі палітвязнем.

**01.09.2021** 31 жніўня ў Віцебскім абласным судзе адбылося чарговае паседжанне ў справе жыхара Наваполацку Яўгенія Харашкевіча, супраць якога выстаўленыя крымінальныя абвінавачанні адразу па трох крымінальных артыкулах. Прадстаўніка праваабарончай арганізацыі, які прыйшоў назіраць за працэсам, у залу не пусцілі. Першае пасяджэнне адбылося 5 ліпеня.

Былы кіроўца малочнага камбінату Яўген Харашкевіч быў затрыманы 19 студзеня 2021 году ў Наваполацку. Супраць яго распачалі крымінальную справу адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу РБ: ч.1 арт.130 («Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці»), арт. 369 («Публічная абраза прадстаўніка ўлады») і ч.1. арт. 342 («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх»). Найбольшы тэрмін пакарання прадугледжвае абвінавачанне за распальванне варожасці – да 5 гадоў няволі.

Паводле Ніны Харашкевіч, жонкі Яўгена, прычынай для затрымання і завядзення крымінальная справы паслужылі каментары ў сацыяльных сетках на адрас выкладчыка акадэміі МУС Наталлі Петуховай. У хаце ў іх прайшоўператрус, была канфіскавана камп'ютарная тэхніка.

Што паслужыла прычынай зрабіць судовы разбор закрытым, незразумела.

«Я нават не здагадваюся, чаму закрылі суд. Падставаў ёсць некалькі, і яны запісаныя ў

Крымінальна-працэсуальным кодэксе. Паводле якой з іх закрылі пасяджэнне – ніхто не ведае», – кажа віцебская праваабаронца Ірына Траццякова.

Згодна з артыкулам КПК «Галоснасць судовага разбору», закрыты разбор дапускаецца ў некалькіх выпадках. У тым ліку – «у інтарэсах забеспячэння аховы дзяржаўных сакрэтаў» і «ў мэтах перадухілення выдавання звестак аб інтымных баках жыцця асобаў, якія ўдзельнічаюць у справе, або звестак, якія зневажаюць іх годнасць».

Варта нагадаць, што многія суды ў палітычных справах робяць закрытымі з фармальных прычын. Наўрад ці на іх агучваюць нейкія дзяржаўныя таямніцы.

**02.09.2021** Праваабаронцы пацвердзілі інфармацыю пра тое, што віцяблянін Аляксандр Мацвееў, прызнаны судом Першамайскага раёну Віцебску вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, пакінуў межы краіны. Як паведамляла «Віцебская вясна», 9 ліпеня суддзя Наталля Карабліна асудзіла Мацвеева на адзін год і шэсць месяцаў «хіміі» (паводле арт. 369 КК).

Да папраўчай установы адкрытага тыпу Аляксандр так і не даехаў, абраўшы жыццё на волі ў сумежнай з Беларуссю краіне.

Да крымінальнай адказнасці Александра Мацвеева прыцягнулі за тое, што 3 кастрычніка ён нібыта размясціў у групе «Типичный Витебск» у Instagram эмацыйны каментар, ужыўшы ненарматыўную лексіку адносна дзеянняў старшага сяржанта ППС Першамайскага РАУС Віталя Шнявіна. Падчас мірнага маршу пратэсту міліцыянт ужыў газавы балончык супраць яго ўдзельнікаў. Учынак Шнявіна абурыў Мацвеева і падштурхнуў да напісання каментару.

На судзе Шнявін не прысутнічаў, ад матэрыяльнай кампенсацыі ў 1000 рублёў за нанесеную маральную шкоду адмовіўся, задаволіўшыся 300 рублямі, выплачанымі яшчэ да пачатку судовага працэсу.

Жамчужны: «Хімія» ператвараецца ў вар'яцкі дом»

«Частыя апошнім часам уцёкі асуджаных з адбыцця пакарання ва ўстановах адкрытага тыпу балюча б'юць па іміджу ўсёй пенітэнцыярнай сістэмы. Рэакцыя на такія выпадкі хваравітая: адразу пачынаюцца праверкі, «хімія» ператвараецца ў вар'яцкі дом», – кажа былы палітвязень і праваабаронца Міхаіл Жамчужны.

**03.09.2021** У судзе Чыгуначнага раёну Віцебску 3 верасня адбыўся разгляд яшчэ адной крымінальнай справы за публічную абразу прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Гэтым разам на лаве падсудных апынулася 51-гадовая Вера Струніна, якая працуе вахцёркай у віцебскім інтэрнаце. За кароткі каментар на адрас ужо былога міліцыянта з Віцебску суддзя Дзяніс Аляксеенка прысудзіў ёй 1 год і 6 месяцаў «хіміі». Пракурор Антон Гарохаў прасіў пакараць трыма гадамі. Ад адваката жанчына адмовілася.

Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, Вера Струніна вечарам 3 кастрычніка, знаходзячыся на працы ў інтэрнаце, размясціла кароткі каментар на адрас віцебскага міліцыянта Віталя Шнявіна.

Шнявін распыляў газ – гэта абурыла жанчыну
Допіс быў апублікаваны ў «Інстаграм» (паблік «Типичный Витебск») пад пастом з фотаздымкамі Шнявіна.

Адзін са здымкаў быў зроблены 13 верасня ў Віцебску падчас масавай акцыі. На ёй міліцыянт Шнявін распыльвае газ на грамадзян. Сам пост суправаджаўся допісам: «Шнявін Віталь Валянцінавіч, супрацоўнік патрульна-паставой службы, старшы сяржант міліцыі – збіваў беларускі народ у Віцебску на Маршы Герояў 13 верасня 2020 года. Больш за тое, цішком распыляў газ на жанчын, што стаяць побач. Жыве ў Білеве».

Вера Струніна заявіла на судзе, што не чытала гэтага допісу, а ўбачыла толькі фатаграфію, на якой міліцыянт распыляе газ, і яе гэта вельмі абурыла. Пракурор Антон Гарохаў цікавіўся, што падштурхнула напісаць «нядобры» каментар на адрас невядомага чалавека. Жанчына патлумачыла, што перад гэтым за некалькі дзён у яе скралі тэлефон і яна пайшла пісаць заяву ў РАУС. «Мяне там у «вельмі культурнай» форме «паслалі» і сказалі: калі не хочаш праблем – валі адсюль. У мяне не ўзялі заяву. Мне выразна сказалі хуценька адсюль «валіць», калі не хачу непрыемнасцяў», – расказала Вера Струніна.

«Ну, гэта нашай справы не тычыцца...» – адрэагаваў пракурор.

Сведка Селюкова: Нельга гэта пакідаць беспакараным
На судзе ў якасці сведкі выступіла 34-гадовая хатняя гаспадыня Наталля Селюкова. Яна патлумачыла, што ўбачыла спасылку на дадзены пост у адным з дзяржаўных Тэлеграм-каналаў, перайшла па ёй у «Інстаграм» і вельмі абурылася зместам.

«Я палічыла, што гэта «нехарошыя» каментары. Палічыла, што гэта няправільна. І пост такі няправільны, і каментары. Нельга гэта пакідаць беспакараным», – сказала сведка з боку абвінавачання.



Селюкова зрабіла скрыншоты паста і каментароў і адправіла па электроннай пошце ў абласное ўпраўленне ўнутраных спраў з просьбай даць ім прававую ацэнку. Усіх каментароў сведка не чытала, бо, па яе словах, іх было вельмі шмат, толькі «лайкаў» было больш за 2000. Паводле яе інфармацыі, сам пост быў выдалены праз некалькі дзён. Яна заявіла, што не знаёмая з пацярпелым. Між тым, Вера Струніна запэўнівала на судзе, што ў яе ёсць доказы таго, што сведка добра ведае сяржанта Шнявіна.

Пацярпелы: Нікога не збіваў – толькі ўжываў спецсродкі
Сам міліцыянт на суд не прыйшоў, але даслаў на «Вайбер» паведамленне, у якім тлумачыць, што на дадзены момант знаходзіцца за мяжой, што абвінавачанні цалкам падтрымлівае, як і іскавыя патрабаванні – 1000 рублёў кампенсацыі маральнай шкоды.

У судзе агучылі пісьмовае тлумачэнне міліцыянта, з якога вынікала, што яго асабістыя фотаздымкі, апроч той, дзе ён распыляе газ, былі ўзятыя са старонцы яго маці Давідоўскай, якая пражывае ў Польшчы. «Таму што яшчэ да выбараў усе асабістыя старонкі ў маіх акаўнтах і акаўнтах маёй жонкі былі намі выдаленыя, а самі акаўнты – закрытыя», – агучыў суддзя пісьмовыя тлумачэнні пацярпелага.

Навошта напярэдадні выбараў закрываць акаўнты ў сацсетках – супрацоўнік МУС не патлумачыў. Затое выказаўся пра распыленне газу. Паводле яго, балончык «адвольна пацёк, бо, верагодна, быў пашкоджаны». Таксама запэўніў, што «нікога не збіваў на акцыях, а толькі ўжываў спецсродкі ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам».

На судзе стала вядома, што Шнявін ужо звольніўся з міліцыі – «па ўласным жаданні».

Суддзя Аляксеенка прызнаў жанчыну вінаватай

Вера Струніна раскаялася ў зробленым і прызнала віну, але кампенсаваць 1000 рублёў кампенсацыі адмовілася, палічыўшы суму завялікай. Заявіла, што больш за 500 рублёў выплаціць не ў стане.

Суддзя Дзяніс Аляксеенка прызнаў жанчыну вінаватай і пастанавіў пакараць яе абмежаваннем волі на 1 год і 6 месяцаў з адбываннем тэрміну ў папраўчай установе адкрытага тыпу. Таксама Вера Струніна мусіць выплаціць пацярпеламу 500 рублёў кампенсацыі. Мабільны тэлефон «Самсунг», за які яшчэ не выплачаная растэрміноўка, канфіскаваны.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.

**03.09.2021** Палітзняволенай віцяблянцы Юліі Кашаверавай адмовілі ў памілаванні. Як паведаміў бацька Юліі, прашэнне аб памілаванні напісала ейная бабуля. Камісія ў пытаннях памілавання і вызвалення ад крымінальнай адказнасці прашэнне разгледзела, але не задаволіла. Як паведамлялася раней, Кашаверава ўжо дасылала прашэнне аб памілаванні ў так званы "Круглы стол дэмакратычных сіл" (КСДС), які ўзначальвае Юрый Васкрасенскі.



Нядаўна Сяргей Кашавераў быў на спатканні з дачкой ў папраўчай калоніі №4 Гомля, дзе адбывае пакаранне Юлія. Сустрэча доўжылася суткі. Перад тым дзяўчына крыху хварэла, але трымалася бадзёра. Бацька паведаміў, што Юля працуе на швейнай фабрыцы, робіць лякалы.

Нагадаем, Юлію Кашавераву абвінавацілі ў тым, што на вулічным маршы пратэсту 4 кастрычніка 2020 году ў Віцебску яна пашкодзіла міліцэйскі бус і сарвала маску і форменную кепку

з галавы супрацоўніка МУС (ч.1 арт. 339 КК - "Хуліганства"). Суддзя Сяргей Будрэвіч (суд Кастрычніцкага раёну) асудзіў былую медсястру дэсантнай брыгады 22-гадовую Юлію

Кашавераву на паўтара года калоніі з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага рэжыму. Пракуратура патрабавала для Юліі 6 гадоў зняволення. 4 траўня Віцебскі абласны суд адмовіў у задавальненні скаргі Юліі Кашаверавай і пакінуў прысуд без зменаў.

Сваю віну Юлія Кашаверава прызнала часткова. Не адмаўляла, што была раззлаваная, бо ёй не далі аказаць дапамогу пацярпеламу ад дзеянняў супрцоўніка МУС, нанесла тры ўдары па задніх дзвярах міліцэйскага мікрааўтобуса. Але пераконвала , што па правых бакавых – udараў не наносіла, маску і кепку з супрацоўніка МУС не зрывала.

Пакаранне Юлія адбывае ў гомельскай папраўчай калоніі № 4.

На волю мусіць выйсці ў сярэдзіне студзеня 2022 году.

**03.09.2021** 26 жніўня 2021 Камітэтам ААН па правах чалавека пад нумарам 4000/2021 была зарэгістраваная скарга Наталлі Трошчанкі. Грамадзянская актывістка мяркуе, што беларуская дзяржава парушыла яе правы на свабоду слова і мірныя сходы.

Падставай для звароту ў КПЧ былі наступныя падзеі. 29 снежня 2019 году больш за 15 жыхароў Віцебску выйшлі на плошчу Перамогі і зладзілі акцыю ў падтрымку незалежнасці краіны. Актывісты трымалі ў руках расцяжку "Незалежнасць" і плакаты з лозунгамі. Акцыя доўжылася 20-25 хвілін. У гэтай акцыі брала ўдзел і Наталля Трошчанка.

Згодна з пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэнні, які паступіў з міліцыі ў суд, Трашчанка актыўна ўдзельнічала ў несанкцыянаваным пікетаванні з мэтай публічнага выказвання свайго стаўлення да інтэграцыі Расеі і Беларусі, трымала ў руках бел-чырвона-белай сцяжок. У сярэдзіне студзеня 2020 году Наталля Трашчанка была прыцягнутая да адміністрацыйнай адказнасці за ўдзел у мірным сходзе. Згодна з пастановай суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Алены Грабянчук, грамадзянская актывістка была аштрафаваная на 648 рублёў.

Гэтую пастанову Трашчанка абскардзіла ў Віцебскім абласным судзе. Суддзя Святлана Іванова пастановай ад 5 лютага 2020 году пакінула скаргу без задавальнення, а рашэнне суду першай інстанцыі – без змены. З гэтага моманту рашэнне суду Чыгуначнага раёну аб прыцягненні



Наталлі Трошчанка да адміністрацыйнай адказнасці набыла законную моц.

Далейшую абарону сваіх правоў у наглядных судовых інстанцыях грамадзянская актывістка палічыла бесперспектыўным затратным заняткам, адмовілася весці цяжбу на нацыянальным узроўні і звярнулася з індывідуальным паведамленнем у КПЧ.

"Адмова ад абскарджання ў наглядных інстанцыях - гэта разумная стратэгія. Камітэт неаднаразова падкрэсліваў, што праверка правільнасці і законнасці судовых рашэнняў у Беларусі з'яўляецца неэфектыўным і вельмі затратным механізмам у аднаўленні парушаных правоў", - лічыць праваабаронца Павел Левінаў.

Ён упэўнены, што Камітэт, разгледзеўшы скаргу Наталлі Трошчанкі, знойдзе факты парушэння яе правоў на свабоду слова і мірныя сходы з боку беларускай дзяржавы.

**04.09.2021** 3 верасня ў Наваполацку затрымалі прафсаюзнага актывіста Вадзіма Міхайлава. Мужчына быў затрыманы супрацоўнікамі ДАІ падчас абедзеннага перапынку, калі выехаў у горад на сваім аўтамабілі. Міхайлава адвезлі ў ГАУС Наваполацку, адкуль ён ужо не выйшаў. Як паспеў паведаміць Вадзім Міхайлаў, прычынай затрымання стала налепка з Пагоняй на багажніку ягонага аўто.

Вадзім Міхайлаў - намеснік старшыні першаснай прафсаюзнай арганізацыі Беларускага Незалежнага прафсаюзу (БНП) на ААТ "Нафтан". БНП лічыць затрыманне актывіста невыпадковым. У цэху №103, дзе працуе Міхайлаў, адбываецца так званая "аптымізацыя персаналу". Вадзім Міхайлаў спрабаваў адстойваць інтарэсы працаўнікоў, якія патрапілі пад скарачэнне. Апроч таго, сёлета Міхайлаў ужо судзіўся з адміністрацыяй прадпрыемства.

У прафсаюзе адзначаюць, што, згодна з папраўкамі ў Працоўным Кодэксе, унесенымі ў 2021 годзе, наймальнікам дазволілі звальняць супрацоўнікаў "у сувязі з адбываннем адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту". Калі суд прызнае віну Міхайлава і прысудзіць яму "суткі", прафсаюзны актывіст пасля адбывання арышту можа быць звольнены з прадпрыемства.

Суд па адміністрацыйнай справе Вадзіма Міхайлава мае адбыцца 6 верасня.

**06.09.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 6 верасня пачаўся працэс над 50-гадовым Міхаілам З. Дырэктара прыватнага прадпрыемства судзяць за гвалт альбо пагрозу ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў (арт. 364 КК РБ). Паводле пракурора, мужчына «прыняў баявую стойку» і выказваў пагрозы на адрас міліцыянтаў. Цяпер яму пагражае да 7 гадоў пазбаўлення волі.

Справу разглядае суддзя Наталля Караблiна.

Паводле абвінавачання, увечары 16 траўня ў Міхаіла З., які, сцвярджаецца, быў нападпітку, адбыўся ўдома канфлікт з дзяўчынай. На «месца падзеяў» прыехалі супрацоўнікі міліцыі. Там міліцыянты Шылаў і Пятроўскі сутыкнуліся «з пагрозай ужывання гвалту… у выглядзе пагроз прычынення пашкоджанняў цела рознай ступені цяжкасці». А таксама – «прычынення фізічнага болю, нанясення пабояў, якое выявілася ў выказваннях на адрас міліцыянтаў вусных пагроз аб ужыванні гвалту» і «прыняцці баявой стойкі са сціснутымі кулакамі».

На думку абвінаваўцы, Міхаіл З. «дэманстраваў тым самым свой намер прымяніць да апошніх гвалт, якое супрацоўнікі органаў унутраных спраў Шылаў і Пятроўскі ўспрынялі як рэальную пагрозу свайму жыццю і здароўю». Апроч таго, абвінавачаны «у мэтах перашкодзіць законнай дзейнасці супрацоўнікаў унутраных спраў і прымусіць іх да змены характару гэтай дзейнасці адштурхнуў ад сябе Шылава, чым нанёс апошняму фізічную боль». Пры гэтым – «чыніў супраціў міліцыянтам Пятроўскаму і Шылаву, якое выявілася ў адмове выконваць законныя патрабаванні».

Мужчына прызнаў сваю віну часткова, сказаў, што не ўжываў гвалту ў дачыненні супрацоўнікаў, а толькі не хацеў пускаць іх на свой участак і спрабаваў іх выштурхнуць.

На думку праваабаронцаў, раней за такія дзеянні маглі распачаць адно «адміністрацыйку», бо па факце ніякага гвалту ў дачыненні супрацоўнікаў МУС не было. Аднак у сувязі з палітычнай сітуацыяй, якая склалася ў краіне, цяпер за гэта заводзяцца крымінальныя справы. Супрацоўнікі сілавых структур сталі, па сутнасці, прывілеяванай і недатыкальнай кастай.

**06.09.2021** верасня з ШІЗА віцебскай папраўчай установы адкрытага тыпу №9 пасля 30 сутак пакарання мусіў выйсці гарадзенскі панк-музыка Ігар Банцэр. Аднак, як стала вядома, музыка атрымаў чарговыя 10 сутак. Першапачаткова пасля ўзмацнення ціску з боку адміністрацыі Банцэр трапіў у штрафны ізалятар за адмову прыбіраць памяшканне.

Віцебскі праваабаронца Міхаіл Жамчужны пацвердзіў інфармацыю пра чарговыя 10 сутак ШІЗА, спаслаўшыся на асобаў, якія адбываюць пакаранне разам з Ігарам Банцэрам.

«У яго стандартная сітуацыя для зняволенага па палітычных матывах. Я па сто сутак адседжваў у ШІЗА. Нічога тут дзіўнага няма. Яго па адпрацаванай схеме справакавалі на прыборку памяшкання. Гэткія прыёмы выкарыстоўвалі заўжды.

І гэта яшчэ па-боску, калі можна так сказаць, бо правакуюць і на прыборку «парашы», што зусім непрымальна. Ад гэтага адмаўляюцца адразу», – кажа Міхаіл Жамчужны.

Ігар Банцэр атрымаў паўтара года «хіміі» за вулічны перформанс, які суд расцаніў як «злоснае хуліганства» (арт. 411 КК ).

**07.09.2021** Затрыманых на фестывалі «Аршанская бітва» асудзілі на 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Як паведамляе тэлеграм-канал «Вясна» назірае», трох чалавек прызналі вінаватымі ва ўдзеле ў «несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве». Гэта - Юрась Копцік, Ігар Уласенка і Васіль Міраповіч. Іх затрымалі ў ноч з 4 на 5 верасня.

Міліцыя заявіла, што арганізатары мерапрыемства не падавалі заяўку на яго правядзенне ў райвыканкам. У затрыманых была «пратэставая сімволіка».
Фестываль бардаўскай песні праводзіцца ў гонар перамогі 8 верасня 1514 году войскаў ВКЛ над маскоўскім войскам. Фэст ладзіцца ўжо шмат гадоў.



**07.09.2021** У судзе Чыгуначнага раёну Віцебску 7 верасня пачаўся судовы працэс над актывістамі «Краіны для жыцця» Алегам Баразной і Аляксандрам Мацеюком. Ім выставілі абвінавачанні паводле «групавой» часткі 3 арт. 328 КК («Незаконны абарот наркатычных сродкаў»). Мацеюка абвінавачваюць, апроч таго, паводле ч. 2 арт. 332 КК («Арганізацыя альбо ўтрыманне прытонаў для ўжывання наркотыкаў»). Зазначым, што ч.3 арт. 328 КК прадугледжвае пакаранне да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Працэс вядзе суддзя Дзяніс Аляксеенка. З боку абвінавачвання выступае памочнік пракурора гораду Віцебску Аляксандр Філіпенка. На першае паседжанне змаглі трапіць не ўсе слухачы.

Паводле абвінавачання, 3 лістапада 2020 году супрацоўнікі МУС сачылі за актывістамі. У гаражы Мацеюка былі ўсталяваныя прылады для аўдыё- і відэазапісу. Таксама вялася праслухоўка тэлефонных перамоваў. Некаторыя перамовы былі агучаныя пракурорам падчас паседжання. Аказваецца, яшчэ да моманту затрымання супрацоўнікі МУС фіксавалі ўсе наведванні гаража Мацеюка. Апроч Мацеюка, Баразны, яго наведвалі яшчэ некалькі чалавек, у тым ліку «неўстаноўленыя асобы».

«Ніякага прытону не было»

Сваю віну Алег Баразна і Аляксандр Мацяюк па арт. 328 цалкам адмаўляюць.

Аляксандр Мацяюк часткова прызнаў сябе вінаватым па арт. 332 КК. Заявіў, што прызнае сябе вінаватым па першай частцы, але не па другой, якою яму інкрымінуюць. «Ніякага прытону не было. Я даваў памяшканне», – заявіў напачатку працэсу падсудны.

Алег Баразна паскардзіўся суддзі на дзеянні канваіраў і адміністрацыі СІЗА-2. Па яго словах, на яго справе ёсць чырвоная палоска - як падазраванага ў крымінальнай справе па падрыхтоўцы масавых беспарадкаў, таксама ён пастаўлены на ўлік як чалавек схільны да экстрэмізму.

Але крымінальную справу ў дачыненні яго за падрыхтоўку масавых беспарадкаў закрылі.

Палітыка ці марыхуана?..
Аляксандр Мацяюк і Алег Баразна былі затрыманыя ўвечары 9 лютага 2021 году напярэдадні так званага Усебеларускага народнага сходу. Супраць іх завялі крымінальную справу за незаконны абарот наркотыкаў (артыкул 328 КК РБ). Праз 2 месяцы, 15 красавіка, на Тэлеграм-канале «Вашы сливы» з'явіўся відэаролік, на якім Баразна распавядае пра свой удзел у перадвыбарным штабе Святланы Ціханоўскай. На думку праваабаронцаў, аўтары роліку, якія яго знялі, а затым выклалі ў інтэрнэт парушылі правы актывіста, бо размясцілі ў адкрыты доступ дадзеныя папярэдняга расследавання.

Алег Баразна і Аляксандр Мацяюк прымалі актыўны ўдзел у электаральнай кампаніі 2020 году як актывісты каманды Святланы Ціханоўскай.



За гэта ім паводле адміністрацыйных пратаколаў выносілі шматлікія штрафы і «суткі» – як удзельнікам «несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў». У жніўні 2020 году падчас выбараў іх кінулі за краты ізалятару часовага ўтрымання.

Няма сумненняў, што пільная ўвага да прыватнага жыцця актывістаў з боку віцебскіх «сілавых структур» была звязаная з іх палітычнай актыўнасцю.

Сочым за працэсам. Наступнае паседжанне адбудзецца 8 верасня (пачатак у 10.00).

**08.09.2021** 8 верасня Віцебскі абласны суд задаволіў пазоў галоўнага ўпраўлення юстыцыі віцебскага абласнога выканаўчага камітэту да аршанскага моладзевага аб'яднання «Звяз». Сваёй пастановай суддзя Марына Острыкава прыняла рашэнне ліквідаваць арганізацыю. Прадстаўнік «Звязу» у суд не з'явіўся. Кіраўнік «Звязу» – вядомы аршанскі актывіст Ігар Казмерчак.

У сваім пазове ўпраўленне юстыцыі ўказала, што моладзевае аб'яднанне «Звяз» парушае патрабаванне ч. 6 арт. 24 Закону «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (1994г.). Нібыта ад 2018 году аб'яднанне не падавала ў орган рэгістрацыі штогадовую інфармацыю аб працягу сваёй дзейнасці, колькасці сябраў і спісаў выбарных органаў, не падавала таксама звесткі аб праведзеных імпрэзах.

14 траўня 2021 году МА «Звяз» было вынесенае пісьмовае папярэджанне пра неабходнасць выпраўлення парушэнняў, аднак патрабаванне не было выкананае. Гэта акалічнасць і была падставай для звароту ў Віцебскі абласны суд з пазовам аб ліквідацыі аб'яднання.

У судовым паседжанні прадстаўніца ўпраўлення юстыцыі пазоў падтрымала, прасіла суд заяўленыя патрабаванні задаволіць у поўным аб'ёме.

Заслухаўшы тлумачэнні прадстаўніцы пазоўніка і даследаваўшы пісьмовыя доказы, суд прыняў рашэнне пазоў задаволіць. На падставе арт. 29 Закону «Аб грамадскіх аб'яднаннях» і кіруючыся арт. 300 і 306 ГПК, суд пастанавіў ліквідаваць аршанскае моладзевае аб'яднанне «Звяз», зарэгістраванае ўпраўленнем юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму.

Рашэнне Віцебскага абласнога суду можа быць абскарджанае ў Вярхоўным судзе РБ у 15-дзённы тэрмін.

**09.09.2021** 9 верасня суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў 46-гадовага віцябляніна Аляксандра Васейкіна вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў (арт. 369 КК). Суд задаволіў патрабаванні пракуратуры і прысудзіў

Васейкіну два гады і шэсць месяцаў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хатняя хімія»).

Першае паседжанне прайшло 8 верасня, справу разбіраў суддзя Міхаіл Юрчанка.

Судовае следства вялося хуткімі тэмпамі: была агучаная пазіцыя абвінавачання, апытаны Аляксандр Васейкін, даследаваныя матэрыялы справы. Пасля спрэчкі бакоў абвінавачанаму далі апошняе слова.

Ён быў лаканічны: сказаў, што ўсвядоміў сваю віну і нагадаў, што папрасіў ужо прабачэння.

«Падарваў аўтарытэт, прынізіў гонар…»
Паводле абвінавачання, 22 чэрвеня 2020 году Аляксандр Васейкін са свайго мабільнага тэлефона, «маючы намер абразіць прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў», са старонкі Вольгі Карач у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пад фотаздымкам супрацоўніка МУС, які затрымлівае ўдзельніка несанкцыянаванага мерапрыемства ў перадвыбарчы перыяд, «размясціў аднаслоўны абразлівы каментар». Ужыў яго двойчы, сваім допісам «негатыўна ацэньваў дзеянні» пацярпелага старшага лейтэнанта ДАІ Ігара Вольніча – у «ненарматыўнай форме немаўленчага выказвання».

Сваімі дзеяннямі, паводле пракурора, Васейкін «падарваў аўтарытэт, прынізіў гонар і годнасць асобы прадстаўніка ўлады».

Пацярпелы прасіў завесці справу на Вольгу Карач
Пацярпелы супрацоўнік МУС Ігар Вольніч з Ганцавічаў у судовым слуханні не ўдзельнічаў, прасіў правесці суд без яго.

У пісьмовым тлумачэнні Вольніч адзначыў, што Васейкін сваім каментаром сапраўды прынізіў ягоны гонар і годнасць, публічна абразіў яго як прадстаўніка ўлады. Адзначыў, што ад каментароў «адчуў пачуццё ўнутранага дыскамфорту, сорам, крыўду, абурэнне». Прасіў прыцягнуць Аляксандра Васейкіна да крымінальнай адказнасці.

Таксама Вольніч прасіў прыцягнуць да крымінальнай адказнасці і Вольгу Карач, бо размешчаны пад фота тэкст не адпавядае рэчаіснасці і прыніжае ягоны гонар і годнасць. Агулам пад фота абразлівыя каментары размясціў 21 карыстальнік. У якасці маральнай кампенсацыі ганцавіцкі міліцыянт запатрабаваў ад Васейкіна 1500 рублёў.

Напісаў «для прыколу»

Сваю віну Васейкін прызнаў цалкам, але нагадаў, што адразу пасля затрымання папрасіў прабачэння ў міліцыянта на відэакамеру.

Запэўніў, што, каб ведаў пра наступствы, ніколі не каментаваў бы дзеянні супрацоўніка ДАІ. Патлумачыць суду прычыну, якая змусіла зрабіць каментар, не здолеў: напісаў «для прыколу», не думаў, што будзе такая рэакцыя.

Адвакатка прасіла не ізаляваць Васейкіна ад грамадства
Пракурор прапанаваў прызнаць Аляксандра Васейкіна вінаватым ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага арт. 369 КК, і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе 2 гадоў і шасці месяцаў абмежавання свабоды без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Але прасіў улічыць стан здароўя абвінавачанага (мае 3 групу інваліднасці) і факт шчырага раскаяння, прабачэнні пацярпеламу.

Пазоў супрацоўніка ДАІ прапанаваў задаволіць у поўным аб’ёме.

Абаронца прасіла пры вызначэнні прысуду ўлічыць той факт, што на стан 22 чэрвеня 2020 году санкцыя арт. 369 КК прадугледжвала абмежаванне волі як максімальнае пакаранне. Выказала меркаванне, што два з паловай гады будуць для Васейкіна празмерна суровым пакараннем і прасіла прызначыць яму мінімальна магчымае пакаранне, не звязанае з ізаляцыяй Васейкіна ад грамадства.

Суд задаволіў прапанову пракуратуры
Вырак агучыў суддзя Міхаіл Юрчанка. На падставе арт. 369 КК суд прызнаў Аляксандра Васейкіна вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і пакараў абмежаваннем волі без накіроўвання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два з паловай года.

Пастанавіў таксама спагнаць з Аляксандра Васейкіна 1000 рублёў на карысць Ігара Вольніча ў якасці кампенсацыі маральнай шкоды. Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ў Віцебскім абласным судзе.

**11.09.2021** Крымінальную справу за псаванне маёмасці (арт. 341 КК) завялі ў дачыненне траіх віцяблян, затрыманых 8 верасня ў Віцебску. Як паведамляе прэс-служба УУС Віцебскага аблвыканкаму, ім інкрымінуюць псаванне двух банераў з выявай супрацоўнікаў МУС на вуліцы Навалучоскай у Віцебску. Нібыта затрыманыя 6 верасня аблілі банеры з выявамі міліцыянтаў чырвонай фарбай.

«Фотаздымкі сапсаваных банераў з'явіліся ў дэструктыўных чатах. Усяго двое сутак спатрэбілася супрацоўнікам крымінальнага вышуку Першамайскага РАУС, каб затрымаць удзельнікаў гэтай выхадкі. Па месцы жыхарства затрыманых былі знойдзеныя і адабраныя налепкі, газеты, кніга, сцягі ды іншая атрыбутыка з незарэгістраванай сімволікай», – паведаміла УУС аблвыканкаму.

Паводле інфармацыі праваабаронцаў, гаворка ідзе пра затрыманне 8 верасня жыхароў Віцебску Юліі Лабуновай, Святланы Гуркоўскай і Арцёма Латышава. Яны былі затрыманыя адначасова, але паасобку. У кватэрах усіх траіх прайшліператрусы. Нічога «забароненага» не знайшлі толькі ў Лабуновай – яна на волі. Святлана Гуркоўская і Арцём Латышаў былі змешчаныя ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ) у Віцебску.

Праваабаронцы пацвердзілі інфармацыю, што супраць віцяблян распачалі крымінальную справу паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці»). У справе яна пакуль што маюць статус падазраваных.

**12.09.2021** 9 верасня беларуская праваабарончая супольнасць прызнала палітвязнем 65-гадовага Сяргея Купрэшына, якога суд Пастаўскага раёну адправіў на тры гады ў калонію ўзмоцненага рэжыму за публічную абразу прадстаўніка ўлады (арт. 368 КК) і захоўванне выбуховых рэчываў (ч.2 арт. 295).

25 сакавіка 2020 году яго пазбавілі дазволу на захоўванне і выкарыстанне паляўнічай стрэльбы. У садовым доміку пры ператрусе ў Купрэшына знайшлі порах.

Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, Сяргей Купрэшын адправіў тры электронныя лісты ў дзяржаўныя органы: 2 красавіка – у Пастаўскі раённы выканаўчы камітэт і пракуратуру Віцебскай вобласці, 11 красавіка яшчэ адзін email даслаў на адрас Пастаўскага райвыканкаму. Частка тэксту гэтых лістоў нібыта змяшчае «ненарматыўную форму маўленчага выказвання».

На думку следства, Сяргей такім чынам «выказаў негатыўную ацэнку асобаў дзейных пракурорскага работніка і дзяржаўнага службоўцы выканкаму ў сувязі з ажыццяўленнем тымі службовых абавязкаў, у выніку чаго наўмысна зняважыў іх аўтарытэт, гонар і годнасць, публічна абразіў апошніх як прадстаўнікоў улады».

За гэтыя лісты суд прысудзіў мужчыне два з паловай гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову («хатняя хімія»).

За знойдзены пасля анулявання дазволу на захоўванне дымавы порах суд пакараў Купрэшына трыма гадамі калоніі. У сукупнасці пакаранняў канчатковы вердыкт, які Пастаўскі суд вынес 1 верасня, – тры гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. Таксама Купрэшын павінен аплаціць штраф у памеры 100 базавых велічынь. Рашэнне аб пакаранні прымала суддзя Наталля Максімовіч.

Апроч таго, у даход дзяржавы ў яго канфіскавалі ноўтбук і спагналі 1000 рублёў на карысць супрацоўніка пракуратуры.

Прадстаўнікі праваабарончай супольнасці заявілі, што крымінальны пераслед Сяргея Купрэшына з'яўляецца палітычна матываваным, і патрабуюць ад беларускіх уладаў неадкладнага яго вызвалення. Адзначаецца, што пакаранне паводле арт. 295 КК прызначанае значна стражэйшае за тое, што звычайна ўжываецца у падобных выпадках.

**12.09.2021** Разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да вартаўніка-жывёлавода Міхаіла Лінтоўскага, якога абвінавацілі ў абразе прэзідэнта (арт. 368 Крымінальнага кодэксе) у судзе Мёрскага раёне адбыўся яшчэ 27 жніўня. Справу разглядала суддзя Ірына Яскевіч, бок дзяржабвінавачання прадстаўляла намесніца пракурора Мёрскага раёне Святлана Раманоўская – піша «Наша Ніва».

Паводле абвінавачання, Міхаіл Лінтоўскі 27 сакавіка 2021 года зняў на тэлефон відэа, у якім выкарыстаў у дачыненні да Лукашэнкі слова, якое «мае негатыўную ацэнку і ненарматыўную форму маўленчага выказвання, якое наносіць шкоду гонару і годнасці кіраўніка дзяржавы, накіраванае на падрыў ягонага аўтарытэту, на фармаванне негатыўнага стэрэатыпу і адмоўнага вобразу Лукашэнкі, у выніку чаго, публічна абразіў прэзідэнта».

Пасля мужчына апублікаваў відэа на сваёй старонцы ў «Аднакласніках».

Як расказаў на судзе ўчастковы інспектар Андрэй Талапіла, які выступіў сведкам, пра ролік з абразамі на адрас Лукашэнкі яму паведамілі некалькі мясцовых жыхароў, якія пазванілі ў міліцыю. Па словах міліцыянта, у відэа было каля 800 праглядаў, калі ён вырашыў выклікаць следча-аператыўную групу для затрымання Міхаіла Лінтоўскага.

Сам абвінавачаны распавёў, што ў той вечар купіў два піва і пайшоў у госці да сястры, дзе яны разам выпівалі. Затым ён пайшоў на працу і распіваў там гарэлку, затым вярнуўся да сястры. Сядзелі і размаўлялі, што заробак маленькі, у адпачынак не адпускаюць. І тады ён зняў відэа на мабільны. У роліку распавёў анекдот пра Лукашэнку, а ў канцы абразіў яго, назваўшы дэбілам.

Ролік выклаў у «Аднакласнікі». Пазней хацеў выдаліць, пакуль ніхто не паглядзеў, але пайшоў на працу і забыўся. Потым прыехалі супрацоўнікі міліцыі і затрымалі яго.

У абвінавачанага ёсць псіхічныя расстройствы і захворванне — лёгкая разумовая адсталасць, а таксама хранічны алкагалізм.



Суддзя вынес прысуд: 1 год 6 месяцаў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі агульнага рэжыму. Абвінавачанага ўзялі пад варту ў зале суде. Таксама суддзя пастанавіла прыняць меры па прымусовым лячэнні ад хранічнага алкагалізму.

**13.09.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў 50-гадовага дырэктара прыватнага прадпрыемства Міхаіла Захаранку вінаватым у гвалце да супрацоўніка органаў унутраных спраў (арт. 364 КК РБ). Суддзя Наталля Карабліна пастанавіла накіраваць яго на тры гады ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»).

Супрацоўнікі міліцыі абвінавачвалі мужчыну ў тым, што ён «прыняў стойку са сціснутымі кулакамі» і пагражаў ім ужываннем гвалту.

Па словах сяброўкі Міхаіла Захаранкі Наталлі, такога суровага прысуду «на пустым месцы» яны не чакалі.

«Мы з ім пасварыліся. Прыехала міліцыя, ён папрасіў іх выйсці за тэрыторыю, чаго яны не зрабілі. І вось… Тое, што ты дакрануўся да абмундзіравання – гэта ўжо ўсё! Крымінальны артыкул! Панапісалі там яму ўсяго. У тым ліку – што гэта было грамадскае месца. А гэта ягоны прыватны ўчастак зямлі. Быў яшчэ на судзе нязначны сведка, той, які, нічога не бачыў. Вядома, мы будзем звяртацца ў абласны суд, потым у Вярхоўны і аж да Лукашэнкі будзем пісаць», – паабяцала жанчына.

Рашэнне аб пакаранні прыняла суддзя Наталля Карабліна. Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.

Судовы працэс над мужчынам пачаўся 6 верасня. На першым пасяджэнні Міхаіл Захаранка часткова прызнаў сябе вінаватым, сказаў, што сапраўды быў нападпітку. Але сцвярджаў, што ніякага гвалту ў дачыненні супрацоўнікаў міліцыі не ўжываў і такога жадання не меў.

Супрацоўнікі міліцыі Шылаў і Пятроўскі прыехалі ў прыватны дом да Міхаіла па выкліку. У гэты дзень у яго здарыўся канфлікт са сваёй сужыцелькай Наталляй. Пускаць на сваю прыватную тэрыторыю сілавікоў ён не хацеў. Як вынікала з абвінавачання, Захаранка «прыняў стойку са сціснутымі кулакамі» і выказваў пагрозы на адрас супрацоўнікаў. Тым самым нібыта выказваў «намер ужыць да апошніх гвалт, які супрацоўнікі органаў унутраных спраў Шылаў і Пятроўскі ўспрынялі як рэальную пагрозу для свайго жыцця і здароўя».

**14.09.2021** 13 верасня пасля 5 сутак, праведзеных за кратамі наваполацкага цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў (ЦІП), на волю выйшла жонка ўдзельніка стачкі на «Нафтане» Аляксея Маліноўскага Юлія, паведамляе «Стачкам ААТ «Нафтан». Маці дваіх дзяцей Юлію Маліноўскую затрымалі ў Наваполацку 8 верасня за наклейку на аўтамабілі і судзілі па двух адміністрацыйных артыкулах.

Як стала вядома актывістам стачкаму, Юлію Маліноўскую вінавацілі ў парушэнні парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 24.23 КаАП), а таксама ў распаўсюдзе, вырабе, захоўванні, перавозцы інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 19.11 КаАП).

Справу 10 верасня разглядала сумна вядомая суддзя Зінаіда Балаболава. Яна прызнала Маліноўскую вінаватай па абодвух артыкулах і аштрафавала жанчыну агулам на 230 базавых велічынь (6670 рублёў): 200 базавых велічынь – паводле арт. 24.23 і 30 базавых – паводле арт. 19.11.

Як паведамляе стачкам, пасля таго, як было вынесенае рашэнне па справе, проста ў зале суду

Юліі Маліноўскай выставілі яшчэ адно абвінавачанне – за рэпост у сацсетках навіны «Белсату» пра стачку на «Нафтане» (рэпост нібыта быў зроблены яшчэ ў сакавіку 2021 году).

**14.09.2021** 27 жніўня адміністрацыя Чыгуначнага раёну Віцебску прыняла рашэнне аб ліквідацыі сацыяльна-культурнай установы «Віцебск для мяне» (Vitebsk4me). Прычынай, на падставе якой улады закрываюць гэтую грамадскую структуру, стала «неажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці цягам 24 месяцаў запар».

Цягам пяці апошніх гадоў грамадскае аб'яднанне Vitebsk4Me было лідэрам і наватарам культурнай прасторы Віцебску. Маючы невялікі колькасны склад, камандзе «Віцебск для мяне» ўдавалася ахопліваць розныя сферы дзейнасці на высокім прафесійным і крэатыўным узроўні. Пачынаючы ад красавіка 2016 году, сябры арганізацыі здолелі правесці больш за 100 паспяховых імпрэзаў у адукацыйнай, культурнай і сацыяльнай сферах.

Узгадаем толькі некалькі інавацыйных культурніцкіх праектаў, якія арганізацыя зладзіла ў Віцебску.

«Віцебск для мяне» запомніцца віцяблянам штогадовым фэстам паветраных змеяў «Свята Ветру», у якім можна было не толькі паўдзельнічаць у конкурсе на лепшага паветранага цмока, але і далучыцца да майстар-класу па ёзе, наведаць лекцыі «Наука вне себя».

Пры падтрымцы Віцебскага гарвыканкаму была арганізаваная платформа для супрацоўніцтва ўстаноў культуры і моладзевых ініцыятыў «Творчы чацвер». Гэтае супрацоўніцтва дапамагло арганізаваць сустрэчы для моладзі з работнікамі ўстаноў культуры і адукацыі, арт-менеджарамі. Спецыялісты здолелі дапамагчы актывістам і ўсім ахвочым рэалізаваць свае ідэі ў межах Году культуры.

Пасля закрыцця арганізацыі ў культурнай сферы Віцебску замест творчасці можа запанаваць бюракратызм і чынавенскі фармалізм.

**15.09.2021** 15 верасня суд Полацкага раёну і гораду Полацку пакараў адміністрацыйным арыштам на 7 сутак лекара-псіхіятра Полацкай абласной псіхіятрычнай лякарні Віталя Савіцкага за перапост артыкулу ў сацыяльнай сетцы. Рашэнне аб арышце лекара прыняў суддзя Віктар Баліка. Пратэстуючы супраць несправядлівага, на ягоную думку, рашэння, Віталь Савіцкі заявіў пра пачатак галадоўкі адразу пасля абвяшчэння прысуду.

Перапост матэрыялу быў зроблены яшчэ 16 чэрвеня ў «Вконтакте» ў групе «Плошча», якую прызналі экстрэмісцкай. Тэкст паста распавядаў пра жыццё жонкі Аляксандра Тарайкоўского, які загінуў у Менску падчас акцый пратэсту.

Распавядалася, як дзіця Тарайкоўскага перажывае смерць бацькі, пра дапамогу псіхолага.

Віталя Савіцкага затрымалі зранку 14 верасня, калі ён прыйшоў у Полацкі РАУС па позве, якую яму ўручыў на працы ўчастковы Віктар Кураш. Лекара абвінавацілі ў распаўсюдзе інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці ці прапагандуе такую дзейнасць (арт. 19.11 КаАП). Гэты артыкул прадугледжвае штраф да 30 базавых велічынь або арышт.

На судзе Віталь Савіцкі не прызнаў сваёй віны, пагадзіўшыся з тым, што сапраўды перапосціў артыкул пра сям'ю Тарайкоўскага. Зазначыў, што ў тэксце артыкулу не было ніякіх заклікаў да гвалту ці «экстрэмісцкай дзейнасці». Медык заявіў, што не ведаў пра тое, што група «Плошча» лічыцца «экстрэмісцкай». Суддзя Віктар Баліка адказаў на гэта, што ўрач-псіхіятр «павінен быў разумець істотную пагрозу бяспецы ад перапосту экстрэмісцкіх матэрыялаў». «Некаторыя нашы дзеянні павінны мець пэўную падрыхтоўку і прадбачлівасць», – сказаў суддзя.

Віталь Савіцкі быў прызнаны вінаватым. Ён і ягоныя сябры, якія прысутнічалі на паседжанні, спадзяваліся на штраф, аднак суддзя Баліка пакараў лекара арыштам на 7 сутак.

Адразу пасля абвяшчэння прысуду Віталь Савіцкі заявіў аб пачатку галадоўкі. Такім чынам мужчына выказвае пратэст супраць несправядлівага рашэння суду. Суддзя Баліка зрабіў выгляд, што не пачуў заявы падсуднага.

Адзначым таксама, што на выхадзе з суду ўчастковы міліцыянт Віктар Кураш папярэдзіў усіх сяброў Віталя, каб ніякіх фотаздымкаў з судовага паседжання не з’явілася ў сацыяльных сетках, прыгразіў чарговымі штрафамі і арыштамі.

**15.09.2021** 5 верасня ў Віцебскім абласным судзе прайшлі тры грамадзянскія працэсы, на якіх разглядаліся пазовы па ліквідацыі грамадскіх аб'яднанняў. За некалькі гадзін тры суддзі ліквідавалі тры недзяржаўныя арганізацыі (НДА) экалагічнай і турыстычнай скіраванасці. Пазоў у суд аб іх закрыцці падавала галоўнае ўпраўленне юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэту.

Першай «ахвярай» стала грамадскае аб’яднанне «Турысцкі клуб «Лучоса». Арганізацыя была заснаваная ў 2002 годзе і размяшчалася ў будынку адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску. Паводле статуту, «прадметам яе дзейнасці з’яўлялася спартовая праца ў галіне развіцця турызму».

Начальніца аддзелу дзяржаўнай рэгістрацыі камерцыйных (некамерцыйных) арганізацый галоўнага ўпраўлення юстыцыі аблвыканкаму Святлана Жойдзь заявіла на судзе, што гэтая

«арганізацыя па юрыдычным адрасе не размяшчаецца». Сказала, што турклуб больш за тры гады не падаваў ім ніякіх справаздач, як таго патрабуе заканадаўства. На падставе гэтага і прасіла яе ліквідаваць. Прадстаўнікі турысцкага клубу на паседжанне не прыйшлі.

Суддзя Наталля Хількевіч прыняла рашэнне задаволіць пазоў галоўнага ўпраўлення юстыцыі і ліквідавала «Турысцкі клуб Лучоса».

Рашэнне аб ліквідацыі абласнога грамадскага аб’яднання садзейнічання развіццю аграэкатурызму «Экоокотур» прымаў ужо суддзя Віктар Быстроў. Гэтая структура, па словах суддзі, была створаная «для садзейнічання павышэнню турыстычнай прывабнасці», а таксама – для «захавання культурнай спадчыны, народных традыцый і самабытнасці рэгёну».

Прадстаўніца ўпраўлення юстыцыі заявіла, што арганізацыя была зарэгістраваная ў 2015 годзе, але ні разу не падавала справаздачы.

На пасяджэнне прыйшоў кіраўнік арганізацыі Сяргей Галкін, але не змог паказаць суду дакументы аб тым, што ён сапраўды дырэктар «Экоокотур». Мужчыне давялося прысутнічаць у зале толькі ў якасці слухача і моўчкі назіраць, як ліквідуецца ягоная арганізацыя.

Віцебскае гарадское маладзёвае грамадскае аб’яднанне аўтааматараў «Клуб «Нитроус Гараж» было створанае ў 2008 годзе і таксама, па словах Святланы Жойдзь, больш за тры гады не падавала справаздач аб сваёй дзейнасці.

«Вы хаця б ведаеце, чым яны займаліся?» – запыталася ў яе суддзя Святлана Волкава. «Нейкімі аўтагонкамі...» – адказала прадстаўніца ўпраўлення юстыцыі.

Суддзя Волкава прыняла рашэнне аб ліквідацыі арганізацыі.

Рашэнні не набылі законнай моцы і могуць быць абскарджаныя ў Вярхоўным судзе.

**16.09.2021** Віцебскі абласны суд 16 верасня вынес рашэнне ў крымінальнай справе 27-гадовага жыхара Наваполацку Яўгена Харашкевіча. Мужчыну абвінавачвалі адразу па трох артыкулах крымінальнага кодэксу, у тым ліку ў падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак. Рашэнне агучыў суддзя Андрэй Прэйс. Бок абвінавачання прадстаўляў пракурор Аляксандр Філімонаў. Суд над Харашкевічам праходзіў у закрытым рэжыме.

Суддзя Андрэй Прэйс пастанавіў «прызнаць Яўгена Харашкевіча вінаватым у наўмысных дзеяннях, накіраваных на распальванне сацыяльнай варожасці па прыкметах сацыяльнай прыналежнасці і на падставе ч. 1 арт. 130 КК прызначыць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 3 гады і 6 месяцаў». Апроч таго: «прызнаць вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе арт. 369 КК прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 3 гады з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу». Таксама Харашкевіча прызналі вінаватым у падрыхтоўцы і арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (ч.1 арт. 342 КК) – 2 гады пазбаўлення волі.

Па сукупнасці пакаранняў Яўгена Харашкевіча асудзілі на 4 гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.

Згодна з прысудам, ён мусіць выплаціць супрацоўнікам МУС, якія былі прызнаныя пацярпелымі, кампенсацыю маральнай шкоды: старэйшаму оперупаўнаважанаму групы па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Наваполацкага ГАУС Дзянісу Свяцкаму –

1500 рублёў і выкладчыцы кафедры прафесійна-прыкладной фізкультуры акадэміі МУС Наталлі Петуховай – 1000 рублёў.

Яўген Харашкевіч быў затрыманы 19 студзеня 2021 году ў Наваполацку, з таго часу ён знаходзіцца СІЗА.

Пакуль сядзеў у СІЗА - нарадзілася дачка Мілана
Як расказаў бацька абвінавачанага Аляксандр, праблемы пачаліся пасля таго, як сын пайшоў назіральнікам на выбарчы ўчастак па месцы прапіскі ў вёсцы Фарынава.



Напісаў скаргу ў пракуратуру з нагоды грубага парушэння Выбарчага кодэксу, у якой інфармаваў пра не апячатаную урну для галасавання.

Пасля гэтага, 12 жніўня, да Яўгена на працу прыехалі супрацоўнікі міліцыі і затрымалі яго. Але неўзабаве адпусцілі. 19 студзеня 2021 ён зноў быў затрыманы, але ўжо ў межах крымінальнай справы.

За гэты час бацька бачыў сына толькі аднойчы. Чаму суд зрабілі закрытым, ён так і не зразумеў. Па словах сваякоў, таму што «ім няма чаго рэальна прад'явіць». Усе абвінавачанні будаваліся вакол некалькіх каментароў у чатах, якія Яўген нібыта напісаў у дачыненні да некалькіх міліцыянтаў.

На абвяшчэнне прысуду бацькі Яўгена прынеслі ў залу раздрукаваныя каляровыя фотаздымкі яго трохмесячнай дачкі Міланы. Пакуль ён быў за кратамі, у яго нарадзілася дзіця, якога ён яшчэ не бачыў...

Прысуд не набыў законнай моцы і будзе абскарджаны ў Вярхоўным судзе.

**16.09.2021** У судзе Чыгуначнага раёну Віцебску 16 верасня разбіралі адміністрацыйную справу, заведзеную за «несанкцыянаваная масавае мерапрыемства» (арт. 24.23 КаАП) на прадпрымальніка Уладзіміра Пунько. На яго склалі пратакол за бел-чырвона-белую сурвэтка, якую супрацоўнік МУС пабачыў у салоне аўтамабіля Пунько. Суд палічыў гэта за «несанкцыянаванае пікетаванне» і адправіў уласніка аўто і сурвэткі на 20 сутак у мясцовы ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ).

Справу разглядала суддзя Алена Цыганкова. Згодна з пратаколам, 2 верасня Уладзімір Пунько, «знаходзіўся на вуліцы Кірава ў Віцебску, кіруючы аўтамабілем Toyota, у якім на пярэдняй панэлі пад лабавым шклом знаходзілася палотнішча бел-чырвона-белага колеру для публічнай дэманстрацыі на агульны агляд, незарэгістраванае ў адпаведнасці з Законам РБ «Аб афіцыйных геральдычных сімвалах». Тым самым, паводле пратаколу, мужчына «наўмысна правёў адзіночны пікет без адпаведнага дазволу ўладаў». На думку міліцыянтаў, гэтае пікетаванне «не было звязанае з выбарчай кампаніяй», але ўяўляла з сябе публічнае выказванне «грамадска-палітычных настрояў».

«Гэта проста пераблыталі, калі запісвалі»
На судзе ў якасці сведкі выступіў намеснік начальніка Чыгуначнага АУС Віцебску Дзмітры Курыленка.

Ён патлумачыў, што ішоў з працы і ўбачыў прыпаркаваны аўтамабіль: «Праходзячы міма, звярнуў увагу, што пад лабавым шклом на пярэдняй панэлі ляжыць сцяг бел-чырвона-белага колеру». Пасля гэтага ён сфатаграфаваў аўтамабіль і патэлефанаваў у дзяжурную частку.

Гаспадара машыны затрымалі 8 верасня, але праз суткі адпусцілі, а аўтамабіль арыштавалі і паставілі на паркоўку пры Чыгуначным АУС.



Уладзімір Пунько звярнуў на судзе ўвагу на разыходжанні ў паказаннях міліцыянта: на судзе той заявіў, што не бачыў, як уладальнік машыны выходзіў з яе, а ў пісьмовым апытанні сцвярджаў, што бачыў яго. На што міліцыянт адказаў, што «гэта проста пераблыталі, калі запісвалі». Абвінавачаны таксама звярнуў увагу, што ўказаны хатні адрас міліцыянта з'яўляецца насамрэч адрасам ягонага месца працы. «Не можа ж ён жыць на працы?..» – спытаў ён суддзю. Адказу не атрымаў.

Суддзя: А дзе такія сурвэткі можна купіць?..
Уладзімір Пунько заявіў, што ў ягоным аўто ляжаў не бел-чырвона-белы сцяг, а – простая сурвэтка, якой ён працірае пыл з лабавога шкла. Цэлы пачак такіх сурвэтак яму падарылі яшчэ ў траўні.

«Дзе такія сурвэткі можна купіць?» – пацікавілася суддзя. «У Смаленску», – адказаў Уладзімір. Суддзя таксама зацікавілася, якімі асаблівымі якасцямі «валодаюць дадзеныя сурвэткі». «Сухія ці вільготныя?» – удакладняла. І ў выніку прыйшла да высновы, што з дапамогай той сурвэткі мужчына яшчэ «праводзіў несанкцыянаванае пікетаванне».

Уладзімір Пунько працуе дырэктарам фірмы і прыехаў на вуліцу Кірава ў краму з паліграфіяй, каб купіць бланкі строгай справаздачнасці. У 2020 годзе яго неаднаразова судзілі па адміністрацыйным артыкуле як удзельніка масавых мерапрыемстваў. Гэтак, за чырвоную паласу, якую ён намаляваў у сябе на балконе, яму давялося правесці 7 сутак арышту. Колькасць адбытых за кратамі сутак пераваліць ужо за паўсотні.

Пасля абвяшчэння вердыкту суддзі Цыганковай Уладзіміра Пунько ўзяў пад варту супрацоўнік міліцыі – проста на выхадзе з залы паседжанняў. Адзначым, што супрацоўнік МУС чакаў у калідоры яшчэ ад самага пачатку працэсу, верагодна, ужо ведаючы вынік суду.

**17.09.2021** 17 верасня, у дзень так званага «народнага адзінства», суд Першамайскага раёну Віцебску вынес жыхару абласнога цэнтру Сяргею Думаве ці не самы жорсткі за апошнія часы «палітычны» прысуд – 9 гадоў і 15 сутак калоніі ўзмоцненага рэжыму. «Ні за што! Ніякіх доказаў не было пададзена», – заявіла адразу пасля абвяшчэння прысуду маці Сяргея Думавы Алена. Працэс праходзіў у закрытым рэжыме, але маці дазволілі папрысутнічаць на пасяджэннях.

Віцябляніна Сяргея Думаву абвінавачвалі адразу па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэксу: ч.1 арт.293 («Арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся гвалтам над асобай, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці або ўзброеным супрацівам прадстаўнікам

улады), ч.3 арт. 293 (»Навучанне ці іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадках«), арт. 341 (»Апаганьванне будынкаў ці іншых збудаванняў цынічнымі надпісамі або малюнкамі«).

Па ўсіх абвінавачваннях суддзя Міхаіл Юрчанка прызнаў Думаву вінаватым. Найбольшае пакаранне – 9 гадоў калоніі, прызначыў па артыкуле аб арганізацыі масавых беспарадкаў.



Апроч гэтага, 2 гады – за нібыта навучанне і падрыхтоўку да ўдзелу ў масавых беспарадкаў. І 1 месяц арышту – за «апаганьванне будынкаў».

Па сукупнасці пакаранняў і «шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім» агульны тэрмін зняволення склаў 9 гадоў і 15 сутак калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Сяргей Думава быў затрыманы 22 сакавіка 2021 году, калі расклейваў у горадзе налепкі. Пасля затрымання ён прызнаўся ў тым, што нанёс яшчэ чырвонай фарбай некалькі надпісаў «Жыве Беларусь». У абвінавачванні таксама фігуруюць надпісы «3%», «Чырвоны партызан», «Сыходзь».

23 сакавіка, на наступны дзень пасля затрымання, у ягонай хаце адбыўся ператрус. У гаражы быў знойдзены жалезны трафарэт гербу Пагоня, а таксама петарды, страйкбольныя гранаты, дымавыя шашкі ды іншыя не забароненыя для захоўвання прадметы.

Першае судовае паседжанне адбылося 13 жніўня. На ім Сяргей адмовіўся даваць якія-небудзь паказанні. Як вынікала з пісьмовых паказанняў, сваю віну ў выстаўленых абвінавачаннях ён цалкам адмаўляў. Наступнае пасяджэнне, 16 жніўня, зрабілі ўжо закрытым. Фармальнай прычынай нібыта паслужыў фотаздымак, зроблены на працэсе і размешчаны ў інтэрнэце. Падчас вынясення прысуду суддзя Міхаіл Юрчанка забараніў не толькі фатаграфаваць, але нават весці запіс на дыктафон.

Адвакаты Сяргея Думавы збіраюцца абскарджваць дадзенае рашэнне ў абласным судзе.

**17.09.20211** 6 верасня ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску прайшло чарговае паседжанне ў крымінальнай справе актывістаў «Краіны для жыцця» Алега Баразны і Аляксандра Мацеюка. Іх абвінавачваюць паводле ч.3 арт. 328 КК («Незаконны абарот наркатычных сродкаў»), а Мацеюка – і паводле ч. 2 арт. 332 КК («Арганізацыя альбо ўтрыманне прытонаў для ўжывання наркотыкаў»). Суд завяршыў вывучэнне матэрыялаў папярэдняга следства, сабраных у 9 тамах крымінальнай справы.

Справу разглядае судовая калегія пад старшынёўствам суддзі Дзяніса Аляксеенкі.

Напачатку паседжання суддзя агучыў рапарт, паводле якога сведка ў справе Павел Пруднікаў пакінуў межы Беларусі і выехаў ва Украіну. Раней Пруднікава спрабавалі апавясціць пра неабходнасць прысутнасці на судовым працэсе.

Былі агучаныя матэрыялы дасудовага следства, сабраныя ў 9 тамах крымінальнай справы.

За абвінавачанымі з лістападу 2020 году вялося аператыўнае відэаназіранне, іхныя тэлефоны праслухоўваліся.

Большая частка матэрыялаў тычыцца падзей, якія адбываліся ў гаражы Аляксандра Мацеюка. Падрабязна апісваюцца шматразовыя маніпуляцыі з прыстасаваннямі для прыгатавання і ўжывання сумесі для курэння марыхуаны, размовы падчас ужывання наркатычнага сродку.

Справа Алега Баразны і Аляксандра Мацеюка стала падставай для правядзення вобшукаў у сваякоў і знаёмых Баразны і Мацеюка.Ператрусы прайшлі ў вядомых грамадскіх актывістаў Віцебску. Следчыя не абмінулі ўвагай нават удзельніц рэзананснай адміністрацыйнай справы, якія займаліся скандынаўскай хадой у лесе ля станцыі «Лучоса», затрыманых міліцыянтамі 13 студзеня.

Паводле следства, удзельнікі крымінальнай справы займаліся вырошчваннем, прыгатаваннем і ўжываннем наркатычнага рэчыва. У дасудовых следчых дзеяннях Александр Мацяюк паказаў месцы вырошчвання, сушкі і ўжывання каноплі.

Значная частка матэрыялаў справы тычылася вынікаў генетычнай і дактыласкапічнай экспертызаў знойдзенага ў фігурантаў справы «небяспечнага наркатычнага сродку марыхуаны», насення, сродкаў ужывання і захоўвання.

Судовы працэс над Баразной і Мацеюком пачаўся 7 верасня. Сваю віну паводле арт. 328 Алег Баразна і Аляксандр Мацеюк адмаўляюць.

Наступнае паседжанне пройдзе 27 верасня (пачатак 10.00).

**21.09.2021** 21 верасня ў актывістаў і супрацоўнікаў наваполацкіх прадпрыемстваў прайшліператрусы і затрыманні, а напярэдадні – суды. У старшыні першаснай прафсаюзнай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) ААТ «Нафтан» Вольгі Брыцікавайператрус прайшоў у доме і ў асабістым аўтамабілі. Канфіскаваная аргтэхніка. Самую Брыцікаву затрымалі, але пазней адпусцілі.

Пра ператрус у актывісткі паведаміў тэлеграм-канал «Рабочы Рух». Па дадзеных каналу, раніцай да Вольгі Брыцікавай прыйшлі супрацоўнікі КДБ. Ператрус праводзілі ў кватэры і ў асабістым аўто актывісткі. Была канфіскаваная аргтэхніка. Як паведамілі пазней у Незалежным прафсаюзе, Вольгу адпусцілі. Што было нагодай для ператрусу, пакуль невядома.

Вольга Брыцікава 17 жніўня 2020 году выступіла на мітынгу супрацоўнікаў «Нафтану» і агучыла патрабаванні аб адстаўцы Лукашэнкі. Неўзабаве яна была звольненая з прадпрыемства, якому аддала больш за 15 гадоў жыцця.

Апроч таго, 20 верасня, адбыліся суды над іншымі актывістамі. Паводле інфармацыі тэлеграм-каналу «Стачка Нафтана», за рэпост у сацыяльных сетках на 7 сутак адміністрацыйнага арышту быў асуджаны апаратчык цэху на «Паліміры» Андрэй Беразоўскі, на 30 базавых велічынь аштрафаваны старшыня Беларускага незалежнага прафсаюзу Максім Пазнякоў. Судзілі іх па ч.2 арт. 19.11 КаАП («Распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці»). Як паведамляе крыніца, «рэпосты былі зробленыя асуджанымі людзьмі шмат месяцаў назад, калі матэрыялы яшчэ не лічыліся «экстрэмісцкімі».

Раней, 16 верасня, па гэтым жа артыкуле на 15 сутак быў асуджаны супрацоўнік «Нафтану» Раман Шкодзін.

Паводле «Стачкі Нафтану», прайшоў таксама ператрус у офісе БНП, будынку заводупраўлення і ў аддзеле маркетынгу. Гаворыцца пра, як мінімум, адно затрыманне. Прозвішча затрыманага не паведамляецца.

**22.09.2021** Пра затрыманне ўдзельнікаў «экстрэмісцкай ячэйкі» ў Віцебску паведаміў тэлеграм-канал прэс-сакратаркі МУС Беларусі Вольгі Чамаданавай. Нібыта затрыманыя сем жыхароў абласнога цэнтру ва ўзросце ад 26 да 39 гадоў, якія датычныя да групавога хуліганства і «стварэння экстрэмісцкага фармавання».

Праваабаронцам сталі вядомыя прозвішчы віцяблян, якім шыюць арганізацыю «экстрэмісцкага фармавання». Гэта Марына Праслава, Павел Сокалаў, Кацярына Макарэвіч, Юлія Лабунова, Арцём Латышаў, Ірына Пярцова, Канстанцін Бодэ і Святлана Гуркоўская.

Як паведамляе тэлеграм-канал Вольгі Чамаданавай, мінулым летам затрыманыя стварылі закрытую тэлеграм-групу, у якой абмяркоўвалі «акцыі прамога дзеяння». Планавалі «шкодзіць маёмасць, а таксама чыніць шкоду іміджу дзяржаўных органаў і праваахоўнай сістэмы». Удакладняе, што падазраваныя працавалі ва ўстановах адукацыі, гандлю, медыцыны, а таксама ў дзяржарганізацыях.

«Таксама ўстаноўленая датычнасць некаторых фігурантаў да бессаромнага перформансу на гарадскіх могілках. Затрыманыя цынічна дэмантавалі шыльдачку на месцы пахавання чалавека, пасля чаго ўначы распівалі там спіртовыя напоі, разліваючы алкаголь на магілу і дэманструючы там самым пахаванне рэжыму», – паведамляецца.

У дачыненні затрыманых распачатыя крымінальныя справы за злоснае хуліганства і стварэнне экстрэмісцкага фармавання.

Начальнік віцебскага абласнога ўпраўлення ГУБАЗіК Сяргей Калантаеў сцвярджае, што акцыі фінансаваліся з-за мяжы і што зараз «устанаўліваюцца іншыя ўдзельнікі забароненай суполкі, якія знаходзяцца за межамі Беларусі».

**27.09.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 27 верасня пачаўся разгляд крымінальнай справы, распачатай паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці») у дачыненні былой студэнткі віцебскага «худграфу» Юліі Алейнік. Яе абвінавачваюць у тым, што на бетоннай трубе яна напісала 7 літар: «БЧБ Жыве». Дзяўчыну ўжо адлічылі з універсітэту.

Справу Юліі Алейнік разглядае суддзя Сняжана Кіндзеева.

Пра тое, што яна ўжо не студэнтка, Юлія Алейнік паведаміла на самым пачатку судовага паседжання. Паводле дзяўчыны, напісаць заяву з просьбай аб адлічэнні яе прымусіла адміністрацыя навучальнай установы. Юлію адлічылі з трэцяга курсу мастацка-графічнага факультэту ВДУ імя Машэрава.

Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, раніцай 30 траўня 2021 года дзяўчына зрабіла пры дапамозе аэразольнага балончыка з фарбай залацістага колеру надпіс «БЧБ Жыве» на каналізацыйным калектары, размешчаным на «эстакадным пераходзе» паміж вуліцай Праўды і праспектам Фрунзе над ручаём Дунай.

Сваімі дзеяннямі, на думку пракурора Лазарэнкі, дзяўчына «знізіла эстэтычныя характарыстыкі гэтай маёмасці, што пацягнула неабходнасць ліквідавання названых надпісаў шляхам зафарбоўвання».

У якасці сведкі на працэсе выступіла юрысконсульт прадпрыемства «Віцебскводаканал», якому належыць калектар, Наталля Ганчарова. Яна паведаміла, што прычыненая прадпрыемству шкода складае 28 рублёў 17 капеек.

Грошы пайшлі на паліва для аўтамабіля і на заробак маляру, а таксама – на набыццё 6 кілаграмаў акрылавай фарбы.

Адвакат абвінавачанай выказаў сумненні, што на зафарбоўванне невялікага ўчастку трубы магло пайсці аж 6 кг фарбы. Паводле ягоных дадзеных, гэтага б хапіла, каб зафарбаваць 24 квадратных метра паверхні. Надпіс жа займаў менш за 1 метр. Адвакат заявіў хадайніцтва аб выкліку ў суд маляра, які зафарбоўваў надпіс. На думку абаронцы, прычыненая шкода нашмат завышаная.

Суддзя паабяцала «падумаць» аб хадайніцтве і абвесціла перапынак да 28 верасня.

Юлія Алейнік цалкам прызнала сваю віну. Ад 6-га па 8-га ліпеня яна знаходзілася ў віцебскім ізалятары па гэтай справе. Апроч таго, у жніўні 2020 году, яе затрымлівалі ў Вушачах за распаўсюд улётак з надпісам «Несумленныя выбары». Тады дзяўчыну аштрафавалі. Цяпер ёй пагражае арышт да 3 месяцаў. Як вынікае з характарыстыкі, дасланай у суд, Юлія Алейнік вучылася вельмі добра, мела выдатныя адзнакі на іспытах. Пасля выключэння з ВНУ дзяўчыну выселілі з інтэрнату.

**27.09.2021** На тэрыторыі Расейскай Федэрацыі без законных на тое падстаў быў затрыманы былы юрысконсульт ААТ «Нафтан» заводу «Палімір» Аляксандр Капшуль, які 4 снежня 2020 году далучыўся да нацыянальнай стачкі. Па затрыманні Капшуля адвезлі на памежны пераход і перадалі беларускім уладам. Цяпер ён – у СІЗА КДБ.

З якой прычыны быў затрыманы Аляксандр Капшуль – дакладна невядома. Нагадаем, што цягам 21-23 верасня па краіне пракацілася хваля затрыманняў працаўнікоў заводаў і стачкамаўцаў. Паводле папярэдняй інфармацыі, атрыманай ад праваабаронцаў, затрыманні адбываліся ў межах арт. 356 КК («Здрада дзяржаве»). Вядома, што Аляксандра Капшуля, затрыманага ў РФ, у экстраным парадку перадалі супрацоўнікам КДБ Беларусі, якія з памежнага пераходу «Троебортное» таемна вывезлі яго ў Менск.

Цяпер Аляксандр Капшуль знаходзіцца ў СІЗА КДБ, у яго зламаная нага і пашкоджаная рука. Праваабаронцы паведамляюць, што ў СІЗА КДБ і гомельскім СІЗА-3 знаходзяцца на сёння 13 чалавек, затрыманых па справе «Рабочага руху».

Аляксандр Капшуль ў 2000 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Міжнароднае права», адпрацаваў больш за 20 гадоў юрысконсультам у юрыдычным аддзеле юрыдычнага ўпраўлення ААТ «Нафтан». Ён жанаты, мае двух няпоўнагадовых дзяцей.

**28.09.20212** 8 верасня ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску скончыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 19-гадовай Юліі Алейнік, якую абвінавачвалі ў нанясенні надпісу «БЧБ Жыве» на каналізацыйным калектары (арт. 341 КК). Суд прызнаў яе вінаватай у псаванні маёмасці і аштрафаваў на 90 базавых велічынь (2610 рублёў). Дзяржаўны абвінаваўца патрабаваў прызначыць Юліі 100 базавых штрафу.

Рашэнне па справе былой студэнткі трэцяга курсу «худграфу» ВДУ імя Машэрава прыняла суддзя Сняжана Кіндзеева.

Крымінальная справа паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці» была заведзеная на студэнтку мастацка-графічнага факультэту ВДУ Юлію Алейнік за тое, што

30 траўня 2021 году яна нанесла кароткі надпіс «БЧБ Жыве» на каналізацыйным калектары, размешчаным паміж вуліцай Праўды і праспектам Фрунзе ў Віцебску. На першым судовым паседжанні прадстаўніца «Віцебскводаканалу» заявіла, што шкода ад яе дзеянняў склала 28 рублёў 17 капеек. Гэтую суму дзяўчына ўжо кампенсавала прадпрыемству.

Дзяўчына прызнала сваю віну.

На працэсе ў Юліі Алейнік спыталі, чаму яна напісала слова «Жыве», а не, прыкладам, «Жыве Беларусь!». Дзяўчына адказала, што ёй проста не хапіла часу і фарбы. Таксама заявіла, што зрабіла гэта, каб падтрымаць людзей, якія пішуць такія ж надпісы ў гэтым месцы, але іх рэгулярна зафарбоўваюць.

Пракурор Лазарэнка запатрабаваў для Юліі Алейнік прызначыць штраф у памеры 100 базавых велічынь. У выніку суддзя вырашыў зменшыць суму на 10 базавых і прызначыць штраф у памеры 90 базавых велічынь.

Пасля суду Юлія сказала, што такая сума для яе «непад'ёмная» – яна не ведае, дзе знайсці столькі грошай.

Нагадаем, што пасля завядзення крымінальнай справы Юлію Алейнік адлічылі з Віцебскага дзяржуніверсітэту імя Машэрава і выселілі з інтэрнату. Зараз дзяўчына арандуе жыллё. Да паступлення ў ВДУ Юлія жыла ў Вушацкім раёне разам з бабуляй і дзядулем. Прызнаецца, што паступала ва ўніверсітэт, каб «вучыць дзяцей». Але цяпер кажа, што наўрад ці ёй дазволяць стаць педагогам.

Калі жадаеце дапамагчы Юліі Алейнік з выплатай штрафу, звяжыцеся, калі ласка, з намі - падзелімся яе кантактам.

**29.09.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 29 верасня прыняў рашэнне змяніць меру пакарання для рок-музыкі Ігара Банцэра і адправіць яго на 1 месяц і 25 дзён у калонію агульнага рэжыму. Суд быў выязным і праходзіў у папраўчай установе адкрытага тыпу (ПУАТ) №9, дзе палітвязень адбываў пакаранне. Рашэнне прымаў суддзя Дзяніс Аляксеенка.

Заяву ў суд аб замене пакарання на больш жорсткае ў дачыненні Ігара Банцэра падала адміністрацыя папраўчай установы. Музыку абвінавацілі ў парушэнні правілаў адбыцця пакарання. А менавіта ў тым, што палітвязень на некалькі хвілін спазніўся на адбой, быў непаголены і г.д.

Першапачаткова суд меўся адбыцца 23 верасня ў памяшканні суду Чыгуначнага раёну Віцебску. Але суддзя Дзяніс Аляксеенка прыняў рашэнне правесці выязное пасяджэнне ў папраўчай установе. На працэс збіралася прыйсці шмат людзей, некаторыя прыехалі нават з іншых гарадоў. Напэўна, гэта і паўплывала на рашэнне суддзі правесці паседжанне, па сутнасці, у закрытым рэжыме. На пачатку працэсу Банцэр папрасіў даць яму адваката і суддзя перанёс паседжанне на 29 верасня.

У выніку ў сераду 29 верасня суд вырашыў змяніць Ігару Банцэру ўмовы адбыцця пакарання на больш жорсткія:

1 месяц і 25 дзён палітвязень будзе адбываць у калоніі агульнага рэжыму. Пасля суду музыку змясцілі ў віцебскі СІЗА-2.



Музыкант Ігар Банцэр быў асуджаны 19 сакавіка на паўтара года «хіміі». На судзе віны не прызнаў. Падчас следства 5 месяцаў правёў у гарадзенскім следчым ізалятары. Адбываў пакаранне на «хіміі» ў Віцебску ад 17 чэрвеня. Мужчына 40 сутак правёў у штрафным ізалятары, некалькі разоў абвяшчаў галадоўкі. Паводле ягоных слоў, у яго была магчымасць з'ехаць з краіны, але ён вырашыў застацца.

**30.09.2021** Суд Полацкага раёну і гораду Полацку 29 верасня пакараў мясцовага прадпрымальніка Генадзя Бердзянёва 10 суткамі адміністрацыйнага арышту за рэпосты ў сацсетцы «Аднакласнікі» навінаў Белсат і TUT.BY, зробленыя яшчэ 2020 годзе. Рашэнне аб арышце палачаніна прымаў суддзя Андрэй Дзергачоў. Справу Бердзянёва (арт. 19.11 КаАП) ён разбіраў не больш за 20 хвілін.

Адвакат Генадзя Бердзянёва спрабаваў давесці суду, што ягоны падабаронны ўжо цягам паўгода не меў доступу да свайго акаўнту ў сацсетцы, бо ягоны планшэт быў канфіскаваны міліцыяй. А рэпосты – леташнія. У 2020 годзе навіны згаданых СМІ не лічыліся «экстрэмісцкімі».

Довады адваката, аднак, не падзейнічалі на суддзю Андрэя Дзергачова. Ён прызнаў Генадзя Бердзянёва вінаватым у «распаўсюдзе інфармацыйнай прадукцыі, якая ўтрымлівае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці» (арт. 19.11 КаАП) і пакараў яго адміністрацыйным арыштам на 10 сутак.

«Вось так проста і з густам: за 20 хвілін прыняць рашэнне і пасадзіць чалавека ні за што. Нічога не перашкодзіла вынесці вердыкт, нават не пераймаўся, чым можна матываваць. А навошта!» – пракаментаваў рашэнне суддзі адзін са слухачоў на працэсе.

Адзначым, што міліцэйская машына стаяла каля суду, а ў фае ўжо дзяжурылі тры міліцыянты, чакаючы заканчэння паседжання, каб узяць мужчыну пад варту. Відавочна, што рашэнне суду ім было вядомае загадзя.

Вядома, што 5 кастрычніка Полацкі суд будзе разбіраць яшчэ адну справу паводле арт. 19.11

**30.09.2021** 30 верасня суд Першамайскага раёну Віцебску пачаў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні 50-гадовага грузчыка аднаго з віцебскіх прадпрыемстваў Аляксандра Шматава. Мужчыну абвінавачваюць у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем тым службовых абавязкаў (арт. 369 КК). У свой час Шматаў працаваў у ППС у Віцебску. А раней, падчас тэрміновай службы, сам разганяў дэманстрацыі, прызнаўся.

Справу разбірае суддзя Наталля Караблiна.

Паводле пракуратуры, 25 чэрвеня 2020 году ў «Аднакласніках« на старонцы Вольгі Карач пад фота, на якім супрацоўнік ганцавіцкага ДАІ Ігар Вольніч разам з калегам затрымлівае аднаго з дэманстрантаў, Аляксандр Шматаў пры дапамозе свайго мабільнага тэлефону пакінуў каментар:

«Такіх недан…аў паўсюль хапае з лішкам».

Прызнаў віну і раскаяўся
Віну абвінавачаны Шматаў прызнаў у поўным аб'ёме і чыстасардэчна раскаяўся. Абяцаў падобнага ніколі не рабіць. Прынёс Вольнічу прабачэнне на відэакамеру. Заявіў, што цалкам усвядоміў тое, што пакрыўдзіў супрацоўніка ДАІ негатыўным каментаром, і пагадзіўся кампенсаваць прычыненую маральную шкоду.

Ні Вольгу Карач, ні Ігара Вольніча Шматаў не ведаў. Па ягоных словах, на старонку Карач у стужцы «Аднакласнікаў» трапіў выпадкова. Яго абурыў факт выкарыстання супрацоўнікам МУС фізічнай сілы да дэманстранта. Палічыў ягоныя дзеянні неправамернымі, паверыў інфармацыі выкладзенай у публікацыі, паддаўся эмоцыям і вырашыў напісаць каментар. Ніякая палітычнай дзейнасцю не займаецца, дадаў.

«Падумаеш, пакрыўдзіліся на слова…»
У ходзе судовага следства Аляксандр Шматаў заявіў, што каментар тычыцца не канкрэтна Вольніча, а ўсіх трох асобаў, размешчаных на фотаздымку. Ягонае сцвярджэнне ўвайшло ў супярэчнасць з тымі паказаннямі, якія абвінавачаны даваў падчас дасудовага следства. Як ні намагаліся суддзя і пракурорка – патлумачыць прычыны разыходжання Шматаў не здолеў. Не змагла дабіцца ад Шматава ўцямнага адказу і ягоная адвакатка. Урэшце ён цалкам пагадзіўся з тымі паказаннямі, якія даваў у ходзе папярэдняга следства пасля свайго трохдзённага затрымання ў чэрвені 2021 году.

«Адно было на словах, потым другое! Ён сказаў: «Ну, ты захадзіў?». «Так, захадзіў». «Пускай так будзе». «Пускай». Ну, падпісаў. Я яго знаць не знаю. Ну, падпісаў – і ўсё. І забыў пра яго. Пакуль не прыехалі і не нагадалі. Падумаеш, пакрыўдзіліся на слова «недан…ак«. Цяпер па тэлевізары паглядзіш, там такое кажуць! А тут чамусьці за адно слова. Такое абстрактнае», - казаў абвінавачаны на судзе.

Паводле заключэння судова-лінгвістычнай экспертызы, «лексема «неданосак» – гэта груба аб неразвітым, разумова адсталым чалавеку».

«Я служыў у белпалку міліцыі. Мы таксама разганялі дэманстрацыі…»
На судзе Аляксандр Шматаў паведаміў, што праходзіў тэрміновую службу ў Менску, пасля служыў у ППС аднаго з віцебскіх раёнаў.

«Я служыў тэрміновую ў белпалку міліцыі. Таксама разганялі дэманстрацыі. Тады яны крышылі-ламалі, а тут я ня ведаю што. І паказваюць, і паказваюць з кожнага прасу. Столькі ім увагі надаюць», – недаўменна кажа Шматаў.

На пытанне суддзі, ці мае ён права ацэньваць чыесьці разумовыя здольнасці, Шматаў адказаў, што не, не мае. Зарокся хадзіць на «Аднакласнікі», паабяцаў суду, што ў далейшым будзе паводзіць сябе «нармальна» і «добра».

Судовае паседжанне скончылася агучваннем двух тамоў крымінальнай справы.

Наступнае паседжанне прызначанае на 1 кастрычніка (пачатак – 10.00).

**01.10.2021** 1 кастрычніка ў судзе Першамайскага раёну Віцебску прайшло другое паседжанне ў справе 50-гадовага віцябляніна Аляксандра Шматава, абвінавачанага паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады»).

Як і першае, паседжанне прайшло без удзелу пацярпелага старшага лейтэнанта ДАІ Ігара Вольніча. Міліцыянт у пісьмовай форме патлумачыў, што адсутнічае ў сувязі з «аб'ектыўнымі службовымі абставінамі».

Шматаў пагадзіўся на 1000 рублёў кампенсацыі

Суддзя Наталля Карабліна агучыла паказанні Ігара Вольніча, дадзеныя падчас папярэдняга следства, і пазоўную заяву да абвінавачанага Шматава аб кампенсацыі прычыненай маральнай шкоды. Інспектар ганцавіцкага ДАІ ацаніў нанесеныя яму маральныя пакуты і прыніжэнне гонару і годнасці ў 1500 рублёў.

Аляксандр Шматаў пагадзіўся выплаціць грашовую кампенсацыю, але папрасіў суд зменшыць яе да 1000 рублёў. На пытанні суддзі адказаў, што грошай катастрафічна не хапае, бо даглядае хворую маці, якой штомесяц неабходна купляць лекі, а ягоны працоўны заробак складае не больш за 400 рублёў. Да таго ж паведаміў пра неабходнасць штомесячнага пагашэння банкаўскага крэдыту і пра тое, што ніякіх грашовых зберажэнняў не мае.

Пракуратура патрабуе 2 гады «хіміі»

Пракурорка прыйшла да высновы, што віна абвінавачанага знайшла сваё поўнае пацверджанне, а ягоным дзеянням дадзеная дакладная прававая ацэнка. Следства высветліла, што пад фота з затрыманнем дэманстранта ганцавіцкімі супрацоўнікамі ДАІ свае каментары пакінулі 1788 карыстальнікаў, сярод якіх і Аляксандр Шматаў (пад нікам «Рулявы абозу»). Паводле заключэнняў экспертаў, у каментары ўтрымліваецца негатыўная ацэнка дзеянняў інспектара Вольніча, якая мае «ненарматыўную форму маўленчага выражэння».

Ацэньваючы дзеянні абвінавачанага Шматава ў дачыненні да пацярпелага Войніча, які выконваў свае абавязкі па ахове грамадскага парадку, бок абвінавачання прыйшоў да высновы, што яны непасрэдна звязаныя з публічнай абразай апошняга як прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем службовых абавязкаў і кваліфікуюцца паводле арт. 369 КК.

З улікам усіх акалічнасцяў справы, пракурорка палічыла, што мэта крымінальнай адказнасці будзе дасягнутая, калі прызначыць падсуднаму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі. Прасіла суд прызнаць Шматава вінаватым паводле арт. 369 КК і асудзіць на два гады з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Настойвала канфіскаваць мабільны тэлефон абвінавачанага як сродак учынення злачынства. Пазоўныя патрабаванні пацярпелага Вольніча аб кампенсацыі маральнай шкоды прасіла задаволіць у поўным аб'ёме – 1500 рублёў.

Адвакатка: Шматаў даглядае 76-гадовую маці

Выступ адвакаткі юрыдычнай кансультацыі быў непрацяглым. Абаронца прасіла суд улічыць, што Шматаў адразу прызнаў сваю віну ў поўным аб'ёме. Звярнула ўвагу на прынесенае пацярпеламу прабачэнне і раскаянне ва ўчыненым. Нагадала, што Шматаў апякуецца 76-гадовай маці, даглядаць яе больш няма каму. Пры вызначэнні сумы, заяўленай пацярпелым у пазове, прасіла ўлічыць матэрыяльны стан і рэальныя магчымасці абвінавачанага. Настойвала прызначыць Шматаву мінімальна магчымае пакаранне.

На гэтым суддзя Карабліна спыніла судовае паседжанне і абвесціла перапынак да панядзелку 4 верасня.

**01.10.2021** Суд Чыгуначнага раёну гораду Віцебску 1 кастрычніка прызнаў тэлеграм-канал, тэлеграм-чат і ютуб-канал EXOMON экстрэмісцкім.

Разгляд грамадзянскай справы заняў усяго 5 хвілін. Рашэнне прымала суддзя Святлана Варатынская. Заяву ў суд з патрабаваннем прызнаць гэтыя рэсурсы экстрэмісцкімі падавала сёмае ўпраўленне ГУБАЗіК МУС па Віцебскай вобласці.

Апроч суддзі Святланы Варатынскай удзел у працэсе браў пракурор Ананенка. Прадстаўнікі ГУБАЗіКу, а таксама Міністэрства інфармацыі, якое выступала ў якасці адказчыка, на грамадзянскі працэс не з'явіліся. Справа разглядалася без іх удзелу.

Паводле заявы ГУБАЗіК, дадзеныя інтэрнэт-рэсурсы ўтрымліваюць «матэрыялы з заклікам да блакавання руху на аўтамабільных дарогах і чыгуначных пуцях, да масавых беспарадкаў, хуліганскіх дзеянняў, забастовак, здзяйснення актаў вандалізму, аказання супраціву супрацоўнікам органаў унутраных спраў з мэтай змены канстытуцыйнага ладу РБ».

Суддзя агучыла заяву, хутка прагледзела з дыску на ноўтбуку запіс з гэтых рэсурсаў і пасля кароткага перапынку прыняла рашэнне прызнаць згаданыя рэсурсы «экстрэмісцкімі матэрыяламі». Ніякія лінгвістычныя экспертызы ці яшчэ якія-небудзь довады, апроч меркавання ГУБАЗіК, у судзе не разглядаліся.

«Гэтае рашэнне суду з'яўляецца падставай для знішчэння дадзеных матэрыялаў, блакавання інтэрнэт-рэсурсаў, якія садзейнічаюць іх распаўсюду на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ўключэння ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Рашэнне падлягае неадкладнаму выкананню», – абвясціла Варатынская.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджанае цягам 15 дзён у Віцебскім абласным судзе.

На момант судовага паседжання ў тэлеграм-чаце EXOMON было 642 удзельніка, на тэлеграм-канал рэсурсу было падпісана 2634 карыстальнікі, а на ютуб-канал было падпісана больш за 8 тысяч чалавек.

На дадзеных інтэрнэт-рэсурсах распаўсюджваліся матэрыялы на актуальныя грамадска-палітычныя тэмы. Людзі дзяліліся сваім меркаваннем.

**04.10.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску 4 кастрычніка вынес два аднолькавыя рашэнні за кароткія каментары пад постам актывісткі Вольгі Карач у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі». Спачатку на два гады «хіміі» быў асуджаны Аляксандр Шматаў. А праз некалькі гадзін аналагічнае рашэнне было прынятае ў дачыненні да 35-гадовага віцябляніна Мікалая Берднікава. Яго таксама прызналі вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК).

Справу Мікалая Берднікава разбірала суддзя Таццяна Родзіна.

Як вынікае з матэрыялаў крымінальнай справы, 23 чэрвеня 2020 году Берднікаў напісаў кароткі каментар пад постам Вольгі Карач у сацсетцы «Аднакласнікі» з фотаздымкам супрацоўніка міліцыі Ігара Вольніча. На здымку меўся надпіс: «Гэта я так спрытна прыціснуў да тратуару галаву мірнага дэманстранта падчас затрымання. Ігар Вольніч, супрацоўнік ДПС ДАІ г. Ганцавічы».

Як сказаў пасля суда Берднікаў, ён напісаў у каментары пад постам усяго толькі кароткае слова «чмо», і больш нічога.

На першым судовым паседжанні віцяблянін цалкам прызнаў сваю віну і раскаяўся. Сказаў, што не меў намеру абразіць супрацоўніка міліцыі.

А пасля гэтага раптам заявіў, што напісаў каментар не на адрас міліцыянта, а на адрас Вольгі Карач, каб «не пісала ўсякія глупствы».

Пракурорка Драгель спытала, навошта тады наагул ён прызнае сваю віну, калі не пісаў каментар на адрас ганцавіцкага міліцыянта. На гэта Мікалай адказаў, што супрацоўнікі ГУБАЗіКу, якія яго затрымалі, сказалі, што «віну лепш прызнаць». Калі не прызнае, паабяцалі надоўга адправіць у турму.

«Я напісаў паказанні, якія яны хацелі», – патлумачыў на судзе Мікалай Берднікаў.

Адвакат хадайнічаў аб далучэнні да матэрыялаў справы медычных даведак, з якіх вынікала, што жонка абвінавачанага мае сур'ёзнае захворванне, ёй неабходнае доўгатэрміновае лячэнне і рэабілітацыя. Да таго ж Берднікавы выхоўваюць няпоўнагадовае дзіця. Папрасіў суд улічыць гэта і не прымаць рашэнне, звязанае з абмежаваннем волі.

Пра гэта ж у апошнім слове казаў і сам Мікалай, прасіў «не чыніць шкоды ягонай сям’і».

Тым не менш, пракурорка Драгель запатрабавала для Берднікава два з паловай гады «хіміі».

Суддзя Таццяна Родзіна прызнала ў выніку мужчыну вінаватым і пастанавіла накіраваць яго ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на два гады. Таксама Берднікаў мусіць кампенсаваць 500 рублёў маральнай шкоды міліцыянту Вольнічу (у пазове той прасіў 1500). У тэрмін пакарання будуць залічаныя трое сутак, праведзеныя мужчынам у ІЧУ. Арышт, накладзены на маёмасць, не здымаецца, пакуль не будзе кампенсаваная маральная шкода.

Мікалай Берднікаў плануе абскардзіць рашэнне ў Віцебскім абласным судзе.

**04.10.2021** 4 кастрычніка суд Першамайскага раёну Віцебску, разгледзеўшы ў судовым паседжанні крымінальную справу 50-гадовага віцябляніна Аляксандра Шматава, прызнаў яго вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем тым службовых абавязкаў (арт. 369 КК). Суд пастанавіў пакараць Шматава двума гадамі абмежавання свабоды з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»).

У апошнім слове Аляксандр Шматаў быў лаканічны. Сказаў, каб суд прызначыў яму мінімальна магчымае пакаранне.

Пасля перапынку суддзя Наталля Карабліна абвесціла вырак. На падставе арт. 369 КК суд прызначыў Шматаву пакаранне ў выглядзе абмежавання свабоды на тэрмін 2 гады з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Тэрмін адбыцця пакарання будуць вылічваць са дня пастаноўкі на ўлік у папраўчай установе адкрытага тыпу. Тэрмін утрымання пад вартай ад 23 да 26 ліпеня залічаны ў тэрмін адбыцця пакарання з разліку адзін дзень утрымання пад вартай – гэта два дні абмежавання волі.

У адпаведнасці з ч. 1 арт. 46 КК прынята рашэнне прымяніць адмысловую канфіскацыю мабільнага тэлефона Шматава, які стаў сродкам учынення злачынства. Да набыцця прысудам законнай моцы меру стрымання пакінулі ранейшую: падпіска аб нявыездзе.



Пазоўныя патрабаванні старшага лейтэнанта Ігара Вольніча аб кампенсацыі маральнай шкоды суд задаволіў у памеры 1000 рублёў з заяўленых 1500. У частцы грамадзянскага пазову для

добраахвотнага выканання прысуду вызначаны тэрмін у адзін месяц.

Арышт, накладзены на маёмасць Шматава, вырашана не адмяняць.

Прысуд можа быць абскарджаны і апратэставаны ў Віцебскім абласным судзе.

Нагадаем, 9 верасня Першамайскі суд па гэтым жа артыкуле, за абразу гэтага самага супрацоўніка ДАІ на старонцы Вольгі Карач у «Аднакласніках» прыгаварыў 46-гадовага віцябляніна Аляксандра Васейкіна да двух з паловай гадоў «хатняй хіміі».

Справы нібы спісаныя пад кальку, але прысуды розныя.

Тую акалічнасць, што Шматаў даглядае 76-гадовую маці, суд пад увагу не ўзяў.

**05.10.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 5 кастрычніка агучыў рашэнне ў справе актывістаў «Краіны для жыцця» Алега Баразны і Аляксандра Мацеюка, абвінавачаных паводле арт. 328 КК («Незаконны абарот наркатычных сродкаў») і паводле ч. 2 арт. 332 КК (Мацяюк) – «Арганізацыя альбо ўтрыманне прытонаў для ўжывання наркотыкаў». Суд прызнаў мужчын вінаватымі і пакараў Баразну – на 2 гады і 3 месяцы калоніі агульнага рэжыму, Мацеюка – на 9 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Напачатку паседжання суддзя Дзяніс Аляксеенка абвесціў, што суд узнаўляе судовае следства ў справе для ўдакладнення пытання ў частцы, якая тычыцца паказанняў Алега Баразны аб месцазнаходжанні ў ягонай кватэры насення каноплі. У адпаведнасці з заўвагай да арт. 328 КК, асоба, якая добраахвотна выдала наркатычнае рэчыва, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці.

У якасці сведкі быў выкліканы начальнік аддзялення наркакантролю Чыгуначнага АУС Віцебску Іваноў, які не пацвердзіў словы Баразны аб добраахвотнай выдачы насення. Заявіў, што была атрымаў інфармацыю, быццам Баразна праз трэціх асобаў хацеў знішчыць сляды захоўвання рэчыва, і яны працавалі на апярэджанне.

Пасля высвятлення дэталяў былі абвешчаныя судовыя спрэчкі. Бакі заявілі, што дадаць да сказанага на папярэднім паседжанні ім няма чаго. А адвакатка Алега Баразны заявіла пра невінаватасць свайго падабароннага і прасіла суд вынесці апраўдальны прыгавор.

Аляксандра Мацеюка суд прызнаў вінаватым у незаконным, з мэтай збыту, набыцці, захоўванні і перавозцы наркатычных рэчываў у буйным памеры і на падставе ч. 3 арт. 328 КК прыгаварыў яго да пазбаўлення волі тэрмінам на 8 гадоў без штрафу. Яго ж суд прызнаў вінаватым у арганізацыі і ўтрыманні прытону для ўжывання наркатычных рэчываў і на падставе ч. 2 арт. 332

КК прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады і 6 месяцаў са штрафам у памеры 100 базавых велічынь (2900 рублёў).

Па сукупнасці злачынстваў шляхам частковага складання асноўных пакаранняў і далучэння дадатковага пакарання суд прызначыў Мацеюку канчатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 9 гадоў са штрафам у суме 2900 рублёў з адбываннем пакарання ў папраўчай

калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

Алега Баразну суд таксама прызнаў вінаватым у незаконным, з мэтай збыту, набыцці, захоўванні і перавозцы наркатычных рэчываў і на падставе ч.1 арт. 328 КК прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 2 гады і 3 месяцы з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Тэрмін адбывання пакарання абвінавачаным суд пастанавіў адлічваць са дня набыцця прысудам законнай моцы. У гэтыя тэрміны залічыў Мацеюку і Баразне час знаходжання ў СІЗА – ад 9 лютага да набыцця прысудам законнай моцы з разліку адзін дзень утрымання пад вартай – паўтара дня пазбаўлення волі.

Мера стрымання пакінутая ранейшая – утрыманне пад вартай.

З Мацеюка ў даход дзяржавы суд пастанавіў спагнаць працэсуальныя выдаткі ў памеры 1108 рублёў 54 капейкі, з Баразны – 568 рублёў 98 капеек выдаткаваных на судовыя экспертызы.

Нагадаем, судовы працэс над Баразной і Мацеюком пачаўся 7 верасня. Затрымалі абвінавачаных 9 лютага, а праслухоўванне тэлефонаў, а таксама аўдыё- і відэаназіранне праз усталяваныя ў гаражы Мацеюка прылады вялося ад лістапада 2020 году.

**06.10.2021** 6 кастрычніка Віцебскі абласны суд разгледзеў дзве скаргі і пратэст пракурора на рашэнне суду гораду Наваполацку ў справах Вадзіма Міхайлава і Юліі Маліноўскай. Прафсаюзны лідар «Нафтану» Вадзім Міхайлаў быў аштрафаваны наваполацкім судом (ч. 1 арт. 24.23) на 100 базавых велічынь. Віцебскі аблсуд адмяніў гэтую пастанову і накіраваў справу на новы разгляд. Рашэнне ў справе Юліі Маліноўскай, якую аштрафавалі за распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў» (ч.2 арт. 19.11), пакінулі без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

На разгляд скаргаў у Віцебскі абласны суд ніхто з удзельнікаў не з'явіўся, таму разбор прайшоў вельмі хутка. Скаргі разбірала суддзя Святлана Іванова.

Вадзім Міхайлаў 6 верасня судом гораду Наваполацку быў «прызнаны вінаватым у тым, што ў неўстаноўлены перыяд часу з мэтай выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў правёў масавае мерапрыемства – пікетаванне – шляхам размяшчэння на багажніку свайго аўто герба Пагоня – для дэманстрацыі грамадзянам, і не зрабіў захадаў, каб яго зняць». Пагоню на машыне Міхайлава знайшлі, па словах суддзі, 3 верасня, на аўтастаянцы. Наваполацкага актывіста ў выніку аштрафавалі на 100 базавых велічынь.

З такім рашэннем суду не пагадзілася адвакатка Алена Герман, якая бараніла інтарэсы Міхайлава, а таксама наваполацкі пракурор, прозвішча якога суддзя не агучыла.

Адвакатка ў сваёй скарзе спаслалася «на неабгрунтаванасць прыцягнення да адказнасці падабароннага, бо ў ягоных дзеяннях адсутнічаў намер на правядзенне масавага мерапрыемства».

А таксама ўказала на тое, што суд не ўлічыў шэраг змякчальных абставінаў і прызначыў максімальна вялікі штраф.

Пракурор жа ў пратэсце паставіў пытанне аб адмене пастановы, «паколькі суд не ўлічыў, што правапарушэнне мела працяглы характар». Таму прасіў пастанову адмяніць і накіраваць справу на новы разгляд».

Суддзя Іванова падтрымала пратэст пракурора і адправіла справу на новы разгляд.

Юлію Маліноўскую суд Наваполацку аштрафаваў 13 верасня на 30 базавых велічынь. Яна была «прызнаная вінаватай у тым, што, знаходзячыся ў неўстаноўленым месцы 24 сакавіка 2021 году ў інтэрнэце на сваёй асабістай старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» распаўсюдзіла інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, што было выяўлена 10 верасня». Пад экстрэмісцкімі матэрыяламі разумеўся кантэнт тэлеканалу «Белсат».

Адвакатка Герман сцвярджала ў скарзе што «пастанова падлягае адмене з прычыны таго, што абвінавачанні Маліноўскай будуюцца на здагадках: згаданую інфармацыйную прадукцыю яна не распаўсюджвала, а віна яе не даказаная». Таксама звярнула ўвагу на тое, што «Маліноўская не выключае той факт, што ў сакавіку 2021 году сапраўды магла размясціць ролік «Белсату» на сваёй старонцы, бо на той момант гэтая інфармацыйная крыніца не была яшчэ прызнаная «экстрэмісцкай». Прасіла адмяніць пастанову, а справаводства спыніць.

Суддзя Святлана Іванова пастанавіла пакінуць скаргу без задавальнення.

**07.10.2021** Пасля вынясення прысуду Зміцер Фурманаў быў пераведзены ў калонію №3, што у пасёлку Віцьба (Віцебскі раён), але так і не з'явіўся ў атрадзе. Палітвязень прыбыў у калонію яшчэ ў жніўні і пасля каранціну быў адразу кінуты ў ШІЗА, дзе з невядомых прычынаў знаходзіцца да гэтай пары - больш за 35 дзён.

Сваякі Змітра Фурманава занепакоеныя сітуацыяй. 8 кастрычніка ў калонію паедзе бацька палітвязня Аляксандр Фурманаў. Ён просіць падтрымкі і агалоскі. Дабірацца будзе з Горадні на грамадскім транспарце, разлічвае дабрацца да віцебскай калоніі раніцай. Ён будзе вельмі ўдзячны, калі яго змогуць сустрэць і падвезці да калоніі, а таксама маральна падтрымаць там.

Зміцер Фурманаў - сябра ініцыятыўнай групы па вылучэнні ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай. Быў затрыманы падчас выбарчага пікету ў Горадні 29 мая 2020 году падчас збору подпісаў разам з Сяргеем Ціханоўскім ды іншымі актывістамі.

Фурманаў асуджаны паводле ч. 1 арт. 342 КК («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак») да 2 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

**07.10.2021** Праваабаронцы прызналі 53-гадовага віцябляніна Антона Сомава, затрыманага ў Віцебску 30 верасня, палітычным зняволеным. Яго затрымалі ў межах крымінальнай справы, распачатай за каментары ў інтэрнэце пасля гібелі ў менскай кватэры супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка і праграміста Андрэя Зельцара. Зараз Антон Сомаў знаходзіцца ў ІЧУ на Акрэсціна ў Менску. Кадры яго затрымання з'явіліся на канале «Жулики Беларуси».

Затрыманне Антона Сомава фіксавалася на відэа ад самага пачатку.

Гэтым разам «сілавікі» ў поўнай экіпіроўцы дзейнічалі так, быццам сапраўды затрымлівалі ўдзельніка тэрарыстычнай групоўкі. На аператыўным відэа называюць сябе супрацоўнікамі КДБ. Даюць гаспадару 5 секунд, каб адчыніў дзверы. Адзін з іх гучна пачынае зваротны адлік…

На пытанне сілавіка, ці пакідаў гаспадар нейкія абразлівыя каментары ў інтэрнэце Сомаў заяўляе, што не пакідаў, а ў сацыяльнай сетцы «Укантакце» зарэгістраваны пад сваім уласным прозвішчам Антон Сомаў.

Праваабаронцы паведамляюць, што Антон Сомаў праходзіць у крымінальнай справе па артыкулах 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») і 130 КК («Распальванне сацыяльнай варожасці»). Яго ўтрымліваюць у ізалятары часовага ўтрымання на Акрэсціна ў Менску.

Пасля забойства супрацоўніка КДБ у сеціве шмат беларусаў выказалі падтрымку забітаму Зельцару. У адказ з боку па краіне прайшла хваля затрыманняў за каментары ў сацсетках. 7 кастрычніка кіраўнік МУС Іван Кубракоў заявіў, што колькасць затрыманых вырасла да 200 чалавек.

**07.10.2021** Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 6 кастрычніка прызнаў чарговы інтэрнэт-рэсурс «экстрэмісцкімі матэрыяламі». На гэты раз – тэлеграм-чат «Глубокое для жизни!». Рашэнне прымала суддзя Святлана Варатынская. Прычым спачатку яна называла рэсурс «тэлеграм-групай», а потым – «тэлеграм-каналам». Суполка «Глыбокае для жыцця» у «Тэлеграме» мае 1129 удзельнікаў.

З заявай у суд аб прызнанні рэсурсу «экстрэмісцкімі матэрыяламі» звярнулася 7-е ўпраўленне ГУБАЗіК па Віцебскай вобласці. Супрацоўнік, які прадстаўляў на судзе інтарэсы ГУБАЗіК, заявіў, што ў гэтым чаце «распаўсюджваюцца матэрыялы, якія распальваюць ідэалагічную варожасць у дачыненні да супрацоўнікаў дзейнай улады і якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь, падрываюць аўтарытэт улады».

На думку супрацоўніка ГУБАЗіК, «Глубокое для жизни!» «распаўсюджвае матэрыялы, у якіх высмейваецца і падаецца ў негатыўным ключы інфармацыя пра прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, службовых асобаў Рэспублікі Беларусь». «Папулярызуецца пратэставая дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Размяшчаюцца асабістыя анкетныя дадзеныя супрацоўнікаў праваахоўных органаў, спартоўцаў, суддзяў. Публікуюцца заклікі да хуліганскіх дзеянняў», – пералічыў службовец.

Паводле яго, удзельнікі чату маюць на мэце змяніць канстытуцыйны лад у краіне. Пры гэтым ніякіх канкрэтных прыкладаў ён не прыводзіў. Не патлумачыў таксама, які акурат палітычны лад хочуць стварыць удзельнікі глыбоцкай суполкі.

Пракурор Ананенка заявіў, што выкладзеныя ў скарзе патрабаванні ГУБАЗіКу абгрунтаваныя і падлягаюць задавальненню.

Суддзя Святлана Варатынская задаволіла скаргу і прыняла рашэнне «прызнаць экстрэмісцкімі матэрыяламі інфармацыйную прадукцыю тэлеграм-групы з назвай «Глубокое для жизни!» Заявіла, што гэтае рашэнне з'яўляецца падставай для блакавання інтэрнэт-рэсурсаў, якія спрыяюць іх распаўсюду на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**09.10.2021** Былога палітвязня Сяргея Каваленку, які ў 2010 годзе вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на калядным ялінцы ў цэнтры Віцебску, цяпер абвінавачваюць у зняваге дзяржаўных сімвалаў (арт. 370 КК РБ). Пра гэта паведаміла былая жонка актывіста Алена Каваленка.



Артыкул прадугледжвае пакаранне да трох гадоў пазбаўлення волі. Аднак ужо больш за два гады Сяргей Каваленка жыве і працуе на тэрыторыі іншай краіны.

Пра тое, што супраць былога мужа была распачатая крымінальная справа, Алена Каваленка даведалася з тэлефоннай размовы са следчым Валянцінам Сухавеявым, які выклікаў яе на допыт у якасці сведкі па справе. Інфармацыяй супрацоўнік дзяліўся неахвотна.

«Спачатку наагул нічога не казаў. Маўляў, трэба дапытаць вас у якасці сведкі, шмат пытанняў, вось прыйдзеце і пагаворым. Але праз 10 хвілін размовы пачаў казаць больш канкрэтна. Паведаміў, што супраць Сяргея распачалі крымінальную справу», – расказала Алена Каваленка.

Паводле яе, у дачыненні Сяргея Каваленкі ў жніўні 2021 году менскім СК сумесна з КДБ была заведзеная крымінальная справа паводле арт.370 КК («Знявага дзяржаўных сімвалаў»). Нагодай нібыта паслужыў нейкі відэазапіс у інтэрнэце. Які менавіта і на якім рэсурсе, следчы не ўдакладніў.

Алена Каваленка папрасіла следчага даслаць афіцыйную позву, але ён адмовіўся. Таму яна вырашыла пакуль не хадзіць на допыт. Кажа, што невядома чым можа скончыцца такі візіт. Менавіта гэтак быў калісьці арыштаваны Сяргей Каваленка: яго выклікалі на размову і ўжо не адпусцілі. Спадарыня Алена будзе чакаць афіцыйнай паперы.

Актывіст партыі КХП-БНФ Сяргей Каваленка стаў вядомым ва ўсёй краіне, калі на Каляды 7 студзеня 2010 году вывесіў нацыянальны сцяг на верхавіне святочнай яліны на плошчы Перамогі ў Віцебску. За гэты ўчынак быў прысуджаны да трох гадоў «хатняй хіміі». Потым быў зноў затрыманы (за парушэнне рэжыму адбывання) і асуджаны на два гады і адзін месяц калоніі агульнага рэжыму. Сяргей трымаў працяглыя галадоўкі. Праваабаронцамі быў прызнаны палітвязнем. 26 верасня 2012 года яго вызвалілі.

**10.10.2021** Пятнаццаць сутак адміністрацыйнага арышту прысудзілі 8 кастрычніка ў судзе Полацкага раёну і гораду Полацку выкладчыцы вакальнай студыі ў мясцовым цэнтры культуры Ірыне Гражэўскай. Яе прызналі вінаватай у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў (ч.2 арт. 19.11 КаАП). Нібыта жанчына зрабіла рэпост навіны TUT.BY у сацсетцы «ВКонтакте». Пастанову аб арышце выкладчыцы вынес суддзя Андрэй Дзергачоў.

Каб разабраць справу, спатрэбіліся два паседжанні. 5 кастрычніка суддзя Андрэй Дзергачоў адправіў справу на дапрацоўванне. Ірына Гражэўская хадайнічала аб выкліку сведкі з яе боку і дамаглася гэтага. Сведка станоўча характарызаваў абвінавачаную – як заслужанага педагога па вакале, якая аддана працуе з дзецьмі ў полацкім Цэнтры культуры.

У сваёй прамове на судзе 5 кастрычніка Ірына Гражэўская даводзіла безгрунтоўнасць выкарыстання ў якасці доказаў скрыншотаў з яе старонкі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Скрыншоты былі зробленыя з тэлефона супрацоўніцай МУС Тамашэвіч, якую, таксама па хадайніцтве

Ірыны, выклікалі ў суд, каб апытаць. Гражэўская даказала, што яе рэпост быў выдалены са старонкі ВК пасля ўнясення крыніц інфармацыі ў так званы спіс «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. У выніку суддзя быў вымушаны адправіць справу на дапрацоўванне.

Участковы інспектар Полацкага РАУС старшы лейтэнант міліцыі Віктар Кураш вельмі аператыўна «дапрацаваў» пратаколы і папрасіў Ірыну Гражэўскую «зайсці ў суд» у пятніцу 8 кастрычніка для размовы з суддзём. Як аказалася, на гэты дзень і было прызначанае новае судовае паседжанне. Яно доўжылася 30 хвілін, суддзя Дзергачоў прызнаў жанчыну вінаватай і вынес пастанову аб адміністрацыйным арышце Ірыны на 15 сутак.

Прысутныя на судзе сябры Ірыны Гражэўскай былі вельмі абураныя такой пастановай.

Па просьбе Ірыны Гражэўскай, яны апублікавалі паведамленне для тых карыстальнікаў, хто чытае Ірыну ў сацсетках.

«Шаноўныя сябры! Гэтыя словы пішу не я, бо зараз я знаходжуся пад арыштам у ІЧУ Полацкага РАУС. Учора працягнуўся той суд, пра які я пісала раней. І ўчора была пастаўленая тлустая кропка. Суддзя не ўзяў да ўвагі ані шматлікія парушэнні ў рапартах і пратаколах, ані хадайніцтвы бацькоў маіх выхаванцаў, не хвалюе яго і тое, што дзеці нашай вакальнай студыі, пазбаўленыя магчымасці развіваць свае здольнасці, панясуць інтэлектуальныя і маральныя страты…» – гаворыцца ў паведамленні.

Ірына Гражэўская адзначае, што пачаткова суд быў прызначаны на аўторак, але, калі ўчастковы Кураш даведаўся, што 8 кастрычніка Ірына адзначае сваё прафесійнае свята – Дзень працаўніка культуры, адразу паведаміў пра выклік у суд, нібыта «на размову». Суд тэрмінова перанеслі на пятніцу: напэўна, каб ніхто на яго не трапіў і каб жанчына не паспела падрыхтавацца.

А можа, проста хацелі зрабіць ёй незабыўны «падаруначак» на свята. Але прыйшлі ўсе, і падрыхтавацца Ірына паспела.

**11.10.2021** 11 кастрычніка суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаў яшчэ адзін тэлеграм-канал экстрэмісцкім. Гэта канал «Дактрына V». Грамадзянская справа «па заяве пракурора Віцебскай вобласці ў інтарэсах рэспублікі Беларусь аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкімі матэрыяламі» разгледзела суддзя Марыя Лапшова. Інтарэсы заяўніка прадстаўляла пракурорка Таццяна Іванова.

Прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, якое выступала зацікаўленым бокам, на працэс не з'явіліся. Справа разглядалася без іх.

Суддзя Марыя Лапшова паведаміла, што была праведзена экспертыза і было ўстаноўлена, што «інфармацыя, апублікаваная на тэлеграм-канале «Дактрына V», утрымлівае прыкметы экстрэмісцкай». У сваёй заяве пракурор Віцебскай вобласці прасіў прызнаць «інфармацыйную прадукцыю тэлеграм-каналу «Дактрына V» экстрэмісцкімі матэрыяламі» і накіраваць копію судовага рашэння ў Міністэрства інфармацыі для ўключэння рэсурсу ў пералік экстрэмісцкіх матэрыялаў.

Па дадзеных пракуроркі Івановай, гэты рэсурс быў створаны 7 верасня 2020 году, на ім сістэматычна распаўсюджваліся матэрыялы, накіраваныя на распальванне варожасці «у дачыненні да сацыяльных груп, аб'яднаных па прыкметах прыналежнасці да супрацоўнікаў праваахоўных органаў і органаў улады».

Сваё сцверджанне пракурорка падмацавала некалькімі прыкладамі. Так, паводле ейнай інфармацыі, 28 кастрычніка 2020 году на канале быў апублікаваны «заклік да ігнаравання выканання адукацыйных праграм і забастовак, адрасаваны да студэнтаў і выкладчыкаў».

Апроч таго, 30 кастрычніка таго ж году была змешчаная «публікацыя пад назвай «Жаночы марш салідарнасці са страйкоўцамі», якая матывавала грамадзян на ўдзел у незаконных масавых мерапрыемствах». Гэтак жа, па яе словах, маецца шэраг публікацый, якія змяшчаюць заклікі да забастовак і падтрымкі працаўнікоў прадпрыемства «ГорадняАзот», якія далучыліся да агульнанацыянальнага страйк.

Пракурорка заявіла, што мае досыць доказаў, каб прызнаць канал «Дактрына V» экстрэмісцкім і ўключыць яго ў адпаведны спіс, а таксама абмежаваць доступ да яго на тэрыторыі нашай

краіны. З гэтай нагоды папрасіла задаволіць пазоўную заяву ў поўным аб’ёме.

Суддзя Лапшова прыняла рашэнне прызнаць тэлеграм-канал «Дактрына V» экстрэмісцкім.

**11.10.2021** У Віцебскім абласным судзе 11 кастрычніка разглядалася скарга намесніка першаснай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) працаўнікоў ААТ «Нафтан» Аляксандра Балонкіна, якога 1 кастрычніка наваполацкі суд пакараў 15 суткамі адміністрацыйнага арышту. Балонкін быў прызнаны вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 19.11 КаАП), бо нібыта размясціў у Instagram фота з плакатам «Я / МЫ ТУТ.бай».

Скаргу ў Віцебскім абласным судзе разглядала суддзя Святлана Іванова.

41-гадовы Аляксандр Балонкін быў затрыманы проста на працоўным месцы 27 верасня пасляператрусу. Яму выставілі абвінавачанне ў распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў (ч.2 арт. 19.11 КаАП). На судзе ў Наваполацку (суддзя Зінаіда Балаболава) інжынер-канструктар не прызнаў сябе вінаватым і заявіў, што ён наагул не мае акаўнту ў «Інстаграме».

У абласным судзе суддзя Іванова паведаміла, што Аляксандр быў «прызнаны вінаватым у тым, што, знаходзячыся ў неўстаноўленым месцы ў неўстаноўлены час 18 траўня распаўсюдзіў у інтэрнэце на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «Інстаграм» інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, што было выяўлена ў выніку маніторынгу супрацоўнікамі Наваполацкага РАУС».

У сваёй скарзе Аляксандр Балонкін заявіў, што справа была разгледжаная «аднаасобна, няпоўна і неаб'ектыўна, з істотнымі парушэннямі патрабаванняў заканадаўства». Зазначыў, што ягоная віна не была даказаная матэрыяламі справы. І на гэтай падставе прасіў пастанову наваполацкага суду адмяніць.

Суддзя Святлана Іванова не стала ўлічваць довады супрацоўніка «Нафтану». Яна пастанавіла пакінуць скаргу без задавальнення, а рашэнне суду гораду Наваполацку – без зменаў.

**12.10.2021** Палітвязень Яўген Харашкевіч з Наваполацку, якому Віцебскі абласны суд прысудзіў 4 гады калоніі, прызнаўшы вінаватым па трох крымінальных артыкулах, знаходзіцца зараз у санчастцы СІЗА-2 у Віцебску. Пра гэта паведаміў бацька палітвязня. Пасля суду ён быў на спатканні з сынам, але брата Яўгена праз нейкі час на спатканне з ім ўжо не пусцілі: паведамілі, што ён «прыхварэў», але нібыта неўзабаве мае ўжо выпісацца.

«Я хадзіў на спатканне, маці хадзіла, жонка Ніна хадзіла. Брат ездзіў на спатканне ў гэтыя выходныя, але яго не пусцілі, сказалі, што ён цяпер у санчастцы, што прыхварэў. Але нібыта хутка павінны выпісаць», – расказаў бацька Яўгена Харашкевіча.

У віцебскім СІЗА-2 Яўген будзе знаходзіцца, пакуль не будзе разгледжаная ягоная скарга ў Вярхоўным судзе. Калі адбудзецца працэс – пакуль невядома. Бацька асуджанага мае надзею, што ў Вярхоўным судзе тэрмін могуць знізіць. «Трэба выкарыстоўваць усе магчымасці», – кажа ён.

Спадар Аляксандр сцвярджае, што ніякіх істотных доказаў віны ягонага сына ў судзе першай інстанцыі не было пададзена, усе абвінавачанні грунтаваліся на здагадках. Прыкладам, абвінавачанне падало ў суд фотаздымкі 2018 году, на якіх Яўген знаходзіцца ў складзе каманды па страйкболу.

«Яму выставілі 342-і артыкул толькі на падставе таго, што ў сына былі страйкбольныя гранаты. Але фотаздымкі толькі за 2018 год, дык суддзя расцаніла гэта так: калі ён з 2018 году не займаўся гэтым – значыцца, рыхтаваў масавыя беспарадкі. А доказаў ніякіх», – кажа Аляксандр Харашкевіч.

Нагадаем, Віцебскі абласны суд 16 верасня прызнаў 26-гадовага Яўгена Харашкевіча вінаватым адразу па трох артыкулах крымінальнага кодэксу: ч. 1 арт. 130 («Распальванне сацыяльнай варожасці»), арт. 369 («Публічная абраза прадстаўніка ўлады») і ч.1 арт. 342 («Падрыхтоўка і арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак»). Суд праходзіў у закрытым рэжыме. Рашэнне прымаў суддзя Андрэй Прэйс.

Харашкевіч быў затрыманы 19 студзеня 2021 году ў Наваполацку за каментары ў інтэрнэце. Падчасператрусу была канфіскаваная аргтэхніка. Пакуль ішло следства, у Яўгена нарадзілася дачка Мілана, фота якой змог пабачыць толькі падчас абвяшчэння выраку на судзе.

Сваёй віны Яўген Харашкевіч не прызнаў.

**14.10.2021**. У верасні ў Віцебску адбыліся два выпадкі знеслаўлення дзяржаўнага сцягу РБ. Як паведамляюць міліцэйскія тэлеграм-каналы, падазраваныя ўжо знаходзяцца пад арыштам у межах арт. 370 КК («Здзек з дзяржаўных сімвалаў»). Калі следства дакажа датычнасць віцяблян да гэтага злачынства, ім пагражае максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на тры гады.

Першы інцыдэнт адбыўся ў ноч з 25-га на 26-е верасня і трапіў у аб'ектывы камеры відэаназірання. На запісы відаць, што невядомы мужчына, праходзячы міма сцяга, паспрабаваў сарваць яго. Першая спроба аказалася няўдалай, тады вярнуўся і яшчэ раз падскочыў. На гэты раз мужчыне ўдалося ўхапіцца за палатно, сарваць чырвона-зялёны сцяг і кінуць яго на зямлю. Пасля гэтага чалавек збег.

Як паведамляецца, асобу падазраванага - 38-гадовага віцябляніна, устанавілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Чыгуначнага РАУС Віцебску. Ён распавёў, што вечарам ужываў алкаголь, а вяртаючыся дадому, звярнуў увагу на сцяг і вырашыў сарваць яго. Свой учынак мужчына так і не здолеў патлумачыць.

Падобны выпадак адбыўся таксама ў Віцебску 9 верасня.



У гэты дзень у Першамайскі РАУС Віцебску звярнуўся ахоўнік крамы на вуліцы Багатырова: ён убачыў парваны сцяг, які вісеў да гэтага на будынку гандлёвага пункту.

Камеры вонкавага назірання зафіксавалі парушэнне: невядомы сарваў сцяг, разарваў яго і выкінуў у сметніцу. Праз некалькі дзён аператыўнікі высветлілі асобу мужчыны. Падазраваны - 26-гадовы слесар прыватнага прадпрыемства. Мужчына назваў свае дзеянні «неабдуманым учынкам».

У абодвух выпадках распачатыя крымінальныя справы.

**18.10.2021** Суд Віцебскага раёну прызнаў 41-гадовага Сяргея Іванова вінаватым у прывядзенні ў непрыдатны стан сродкаў чыгуначнага транспарту, шляхоў спалучэння, сродкаў сігналізацыі (ч.1 арт. 309 КК) ды ў замаху на такія дзеянні (ч.1 арт. 14 КК) і пакараў яго пазбаўленнем волі на тры гады.

Справу разбірала суддзя Таццяна Лабацкая.

Падчас судовага следства Сяргей Іваноў прызнаў толькі адзін эпізод, які нібыта ўчыніў пад уплывам асабістых матываў - страты дзіцяці: паехаў на сваёй таксоўцы ў лес і пры дапамозе дроту закараціў рэйкавы ланцуг. Па іншых эпізодах віну не прызнаў. Заявіў, што сам сябе абгаварыў падчас следства.

У сваіх дзеяннях раскаяўся. Прызнаўся, што і не падазраваў, што можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, спадзяваўся выйсці на волю пасля суду.

Прысуд не набыў законнай моцы. У Іванова ёсць магчымасць абскардзіць рашэнне ў Віцебскім абласным судзе.

**19.10.2021** Прадстаўнікі беларускай праваабарончай супольнасці прызналі актывіста з Дуброўна Міхаіла Чамураку палітычным зняволеным. 7 ліпеня 2021 году Дубровенскі раённы суд прызнаў мужчыну вінаватым у паклёпе (арт. 188 КК) і прыгаварыў да трох гадоў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»). Пакаранне пачаў адбываць ад 10 кастрычніка.

Звязацца з блізкімі Міхаіла Чамуракі пакуль не ўдалося. Тэлефон жонкі Міхаіла Людмілы не адказвае. Паводле ПЦ «Вясна», Чамураку затрымалі 3 кастрычніка, адбываць пакаранне ён пачаў з 10-га. Зараз ён знаходзіцца ў папраўчай установе адкрытага тыпу №29 у Ваўкавыску (Гарадзенская вобласць).

Нагадаем, Міхаіл Чамурака быў абвінавачаны ў распаўсюдзе інфармацыі (ужо вядомай да гэтага) аб удзеле ў выбарчай кампаніі дырэктаркі аршанскай школы №3 Алы Сіняўскай і супрацоўніка аршанскага ДАІ Казакова (суд прызнаў іх пацярпелымі). Чамурака быў прызнаны вінаватым і асуджаны на тры гады «хіміі».

У якасці кампенсацыі за прычыненую маральную шкоду суд абавязаў выплаціць па 1000 рублёў кожнаму з пацярпелых.

**20.10.2021** У судзе Полацка і Полацкага раёна 14 кастрычніка пачаўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 52-гадовай прадаўшчыцы Зухры Берасневай, якая абвінавачваецца адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: абраза прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК), гвалт альбо пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў (арт. 364 КК) і паклёп (арт.188 КК РБ).

Справу разглядае суддзя Андрэй Дзергачоў. Дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівае памочнік пракурора Мікіта Белавусаў.

Ураджэнку Узбекістану абвінавацілі ў тым, што яна 22 кастрычніка 2020 года публічна абразіла начальніка і супрацоўнікаў Полацкага РАУС Аляксандра Гаруса, Віталя Шашукова і Дзяніса Карасёва. Паводле абвінавачання Зухра Бераснева пад нікнэймам «Ачумець» ў тэлеграм-супольнасцях «Новополоцк97» і «Полоцк97» у 21 гадзіну 20 хвілін пакінула паведамленне, якое супярэчыць агульначалавечай маралі, установленым правілах зносін, якое, згодна з

заключэннем, судова-лінгвістычнай экспертызы змяшчае негатыўную ацэнку дадзеных супрацоўнікаў і з'яўляецца ненарматыўнай формай маўленчага выказвання, а таксама мае прыкметы вербальнай агрэсіі (арт. 369 КК).

22 кастрычніка мінулага года ў 21.25 выказала пагрозу «Смерць Карасёву» ў дачыненні да начальніка аддзела аховы правапарадку аддзела прафілактыкі грамадскай бяспекі падпалкоўніка Дзяніса Карасёва, якую ен ўспрымаў як рэальную.

23 кастрычніка мінулага года ў 10.15 наўмысна размясціла паведамленне «Шашукоў брыдота, будзем знішчаць цябе да апошняга, цябе ... (нецэнзурнае слова)», якое змяшчае пагрозу ў адрас намесніка начальніка Полацкага ІЧУ маёра Віталя Шашукова, якую ен ўспрымаў як рэальную і ў яго былі падставы асцерагацца ажыццяўлення дадзеных пагроз. Абедзве пагрозы ўжывання гвалту размешчаныя ў супольнасці «Новополоцк97» і «Полоцк97».

18 снежня мінулага года Зухра пераслала публікацыю з супольнасці "Чорная кніга Беларусі" пра Дзяніса Карасёва аб месцы яго працы і ілжывыя звесткі аб тым, што ён з'яўляецца арганізатарам і адказным за затрыманне мірных пратэстоўцаў у горадзе Полацку, а менавіта, 10 і 11 жніўня 2020 года асабіста ўдзельнічаў у збіцці грамадзян, а таксама затрыманнях выбаршчыкаў на выбарчых участках 9 жніўня 2020 года, у чат «Стоп таракан. Свабоду Сяргею Ціханоўскаму».

Зухра Бераснева прызнала віну часткова. У самым пачатку пасяджэння жанчына адмовілася ад абаронцы.

Жанчыну затрымлівалі і змяшчалі ў ізалятар на трое сутак з 12 па 14 сакавіка. У дачыненні да яе праводзіліся аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы.

Пацярпелы Аляксандр Гарус, у 2020 годзе ўзначальваў Полацкі РАУС, а зараз начальнік упраўлення па барацьбе з кіберзлачыннасцю УУС Віцебскага аблвыканкама, растлумачыў суду, што падчас маніторынгу сеткі інтэрнэт былі выяўлены шэраг надпісаў у адрас супрацоўнікаў РАУС: «Падлы, гарыце». Пасля рапарту супрацоўнікі адшукалі нікнэйм карыстальніка, пасля чаго скарысталіся магчымасцямі па ўсталяванні асобы, якая пакінула каментар.

На думку пацярпелага, абвінавачаная павінна панесці пакаранне, але не звязанае з пазбаўленнем або абмежаваннем волі. На пытанне суддзі аб тым, ці знаёмы пацярпелы з абвінавачванай, Гарус паведаміў, што муж абвінавачванай да яго прыходу на пасаду працаваў у РАУС, але быў звольнены за ўчыненне ДТЗ у нецвярозым стане.

Пацярпелы намеснік начальніка Полацкага ІЧУ Віталь Шашукоў, у службовыя абавязкі якога ўваходзіць забеспячэнне аховы і размяшчэнне асоб у ізалятары, растлумачыў, што выяўленыя яго калегамі пагрозы ён успрымаў як рэальныя ў дачыненні да сябе і блізкіх. Шашукову стала вядома пра тое, хто размясціў публікацыю ў яго адрас ад следчага.

На ягоную думку, абвінавачаная павінна быць прыцягнутая да адказнасці, але пакаранне не павінна быць звязанае з пазбаўленнем або абмежаваннем волі, каб чалавек зразумеў сваю памылку. На пытанне суддзі аб тым, ці мог хто-небудзь паддацца на такія дзеянні і заклікі, пацярпелы адказаў сцвярджальна.

Пацярпелы Дзяніс Карасёў, які працуе начальнікам спецізалятара Полацкага РАУС суду растлумачыў, што муж абвінавачванай працаваў пад яго кіраўніцтвам, на навагоднім карпаратыве пазнаёміўся з абвінавачванай. Калі даведаўся, чыя жонка змясціла публікацыі - «быў у шоку».

Карасёў растлумачыў, што падчас маніторынгу сеткі Інтэрнэт супрацоўнікі

выяўлялі дэструктыўна настроеных карыстальнікаў, пасля чаго складалі рапарты.

Па словах пацярпелага, размешчаная яго фатаграфія ў тэлеграм-супольнасцях зроблена ў 2018 годзе, калі ён яшчэ не займаў сваёй пасады. Як растлумачыў пацярпелы, размешчаныя звесткі аб тым, што ён нібыта «ўдзельнічаў у затрыманнях на выбарчых участках і катаваннях у пост-электаральны перыяд» не адпавядае рэчаіснасці, таму што ён у дні пратэстаў не выбываў з РАУС і нават дадому не хадзіў, на тэрыторыі Полацка не прысутнічаў і ў названых дзеяннях не прымаў ніякага ўдзелу.

Дзяніс Карасёў растлумачыў суду, што жадае прыцягнуць да адказнасці Зухру Берасневу, але не пазбаўляць волі, ён спадзяецца, што гэта была памылка і жанчына ўжо раскаялася. Пасля ўбачанага каментара Карасёў стаў баяцца за сваё жыццё, сваіх сваякоў, паколькі ў яго адрас былі пагрозы смерці, абмяркоўвалася яго месца жыхарства, у сувязі з чым ён баяўся за сваю маёмасць. Начальнік спецізалятара таксама распавёў, што пасля публікацый у яго адрас паступалі званкі з пагрозамі па вайберу.

**23.10.2021** 22 кастрычніка суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні да 39-гадовага супрацоўніка транспартнай інспекцыі Юрыя Шылько. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – пікетаванні (ч.1 арт. 24.23 КаАП). Інспектара затрымалі падчас нясення службы – трое сутак ён правёў за кратамі. Прычынай затрымання сталася пратэставая налепка на бамперы ягонага аўто. На судзе Юрый Шылько заявіў, што гэта была правакацыя...

Справу інспектара разбіраў суддзя Уладзімір Царыкаў.

Паводле пратаколу, супрацоўнік інспекцыі Юрый Шылько 30 верасня 2021 году «ўзяў удзел у масавым мерапрыемстве – пікетаванні, без адпаведнага дазволу адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску, што выявілася ў дэманстрацыі для няпэўнага кола асобаў выявы «сэрца, кулака і двух пальцаў рукі, накіраваных угору» на заднім бамперы аўтамабіля, які належыць яму – з мэтай публічнага выказвання сваіх поглядаў на падзеі грамадска-палітычнага жыцця».

«Якая пазіцыя? Якія масавыя мерапрыемствы?..»
На судзе Шылько заявіў, што падчас нясення службы яму патэлефанаваў супрацоўнік стаянкі і паведаміў, што на ягонай машыне пашкоджанае кола, прасіў пад'ехаць. Калі прыехаў на стаянку на вуліцы Панкова, яго там чакаў супрацоўнік міліцыі і папрасіў праехаць у Кастрычніцкі РАУС. Паводле словаў Шылько, ён нават не здагадваўся, навошта яго выклікаюць. Толькі прыехаўшы ў аддзяленне, зразумеў, у чым справа.

«Падышоў оперупаўнаважаны і кажа: а што гэта вы ўдзельнічаеце ў масавых мерапрыемствах, выказваеце сваю пазіцыю? Я кажу: якія яшчэ масавыя мерапрыемствы? У мяне яшчэ працоўны дзень. Якая пазіцыя? Якія масавыя мерапрыемствы? І ён падвёў мяне да задняй часткі бампера...» – успамінае інспектар.

У Кастрычніцкім РАУСе яго затрымалі. У машыне быў праведзеныператрус. Паводле словаў абвінавачанага – без панятых, што, на ягоную думку, было грубым парушэннем. Потым 30 гадзін Шылько правёў у міліцэйскім «стакане» – без ежы і сну. А пасля гэтага быў дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ).

Хто наляпіў налепку

Адвакат запытаўся ў супрацоўніка Кастрычніцкага РАУС Віталя Праліча, які прысутнічаў на працэсе, навошта трэба было затрымліваць чалавека, які быў на службе і ў форменнай вопратцы. «Санкцыя артыкулу прадугледжвае адміністрацыйны арышт, таму ўсе асобы па гэтым артыкуле затрымліваюцца на 72 гадзіны», – патлумачыў Праліч.

Юрый Шылько заявіў на судзе, што налепка была, хутчэй за ўсё, прыклееная напярэдадні затрымання ўначы на паркоўцы каля гандлёвага цэнтру «Green», дзе ён звычайна пакідае машыну. І выказаў здагадку, што гэта мог зрабіць хто-небудзь з дальнабойнікаў, якіх ён часта штрафуе на вялікія сумы. Альбо – іншы супрацоўнік транспартнай інспекцыі, прозвішча якога назваць адмовіўся. Сам жа ён ніколі такога рабіць не стаў бы, бо «далёкі ад палітыкі».

На працэсе выступілі 5 сведак – бацькі Шылько і трое супрацоўнікаў транспартнай інспекцыі. Усе яны пацвердзілі, што Юрый ніколі не выказваў ніякіх палітычных поглядаў і не мог учыніць такое правапарушэнне.

«Адзін з лепшых па выпісванні штрафаў»
«Ніводнага разу не чуў, каб хто-небудзь з супрацоўнікаў абураўся і быў незадаволены палітыкай дзяржавы. Калі б так было, то я б, натуральна, зрабіў адпаведныя захады», – сказаў на судзе начальнік упраўлення кантролю аўтамабільнага транспарту Сяргей Глушчук. Патлумачыў, што сам ён кадравы вайсковец у запасе, быў старшынём каардынацыйнай рады грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партыі пры аблвыканкаме і «займае актыўную пазіцыю, накіраваную на кансалідацыю грамадства і канструктывізм». Заявіў таксама, што мае «дастатковы досвед выяўлення і спынення дэструктыўных элементаў на тэрыторыі дзяржавы». Таму, маўляў, калі б з боку Шылько былі хоць якія «намеры», то ён бы ўжо ў іх не працаваў.

Глушчук расхвальваў падначаленага і казаў, што той з'яўляецца «адным з лепшых па выпісванні штрафаў». «Ён штомесяц недзе каля трох-чатырох тысяч прыносіць у даход дзяржаве. Я яго стаўлю ў прыклад іншым супрацоўнікам. Калі б усе так працавалі, то мы б перавыконвалі план па ўсіх паказніках», – казаў начальнік.

Яшчэ адзін супрацоўнік інспекцыі падтрымаў версію Шылько аб тым, што налепку яму мог наклеіць калега па працы.

Паводле яго слоў, атмасфера ў калектыве не вельмі добрая: шмат зайздроснікаў, канфліктныя сітуацыі, маюць месца розныя «ананімкі». Між тым, абвінавачанага якраз збіраюцца павысіць.

Бацька Шылько расказаў, што хадзіў у «Green», дзе на паркоўцы стаяў аўтамабіль сына, і папрасіў паказаць запісы з відэакамер. Паводле яго, на запісах відаць, што, калі Юрый заязджаў увечары на паркоўку, налепкі на машыне не было, а ўжо раніцай на бамперы «праглядалася нейкая пляма». Што здарылася ўначы, устанавіць немагчыма, бо на ноч там адключаюць святло.

Царыкаў скасаваў справу
Выслухаўшы сведкаў і вывучыўшы матэрыялы справы, суддзя Уладзімір Царыкаў прыйшоў да высновы, што ў ёй не маецца якіх-небудзь доказаў таго, што менавіта Шылько наляпіў гэтую налепку.

Суддзя пастанавіў справу спыніць праз адсутнасць доказаў віны інспектара.

Аўтамабіль Шылько на момант суду знаходзіўся яшчэ ў міліцыі. Высветлілася, дарэчы, што транспартны інспектар ездзіў без тэхагляду...

Гэта зусім не першы выпадак, калі людзей судзяць за налепкі на машынах. Але, як правіла, суд у такіх выпадках выносіць абвінаваўчыя рашэння. Гэтак, 6 верасня ў Наваполацку суд аштрафаваў на 100 базавых велічынь прафсаюзнага лідара з «Нафтану» Вадзіма Міхайлава – за налепку з Пагоняй на багажніку аўто. Ён таксама не прызнаў сваёй віны. Але пракурору і гэтага паказалася мала – і ён праз абласны суд адмяніў гэтае рашэнне: справу накіравалі на новы разгляд.

Ці будзе апратэставанае рашэнне Царыкава ў справе інспектара Шылько – невядома.

**23.10.2021** 13 кастрычніка на полацкага старшыню кантрольна-рэвізійнай камісіі Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) Віктара Стукава супрацоўнік Полацкага РАУС Віктар Кураш склаў пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. На думку міліцыі, Стукаў распаўсюджваў у інтэрнэце экстрэмісцкія матэрыялы. Абвінавачанні яму выставілі завочна, бо меркаваны правапарушальнік у аддзяленне міліцыі для складання пратаколу не прыйшоў.

«23 верасня супрацоўнікамі Полацкага РАУС устаноўлена, што Стукаў, знаходзячыся ў неўстаноўленым месцы, выкарыстоўваючы прылады з выхадам у Інтэрнэт, размясціў і захоўваў у адкрытым доступе ў сацыяльнай сетцы Facebook на асабістай старонцы «Віктар Стукаў» інфармацыйную прадукцыю, уключаную ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў», - гаворыцца ў міліцэйскім пратаколе.

Для пераследу праваахоўнікі выкарысталі пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 23.04.2007 № 513 «Аб парадку вядзення і апублікавання рэспубліканскага спісу экстрэмісцкіх матэрыялаў». Яны мяркуюць, што Віктар Стукаў 16 і 23 ліпеня 2021 году «ў неўстаноўлены час размясціў і захоўваў да моманту выяўлення супрацоўнікамі Полацкага РАУС відэа ў сацыяльнай сетцы Facebook з лагатыпам, лічбавым вадзяным знакам «Белсат TV», чым ажыццявіў яго распаўсюд».

На думку капітана міліцыі Віктара Кураша, у дзеяннях Стукава маюцца ўсе прыкметы складу правапарушэння, якія адпавядаюць ч. 2 арт. 19.11 КаАП РБ («Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці ці прапагандуе такую дзейнасць»).

Дата суду пакуль не вызначаная. Але калі суд прызнае датычнасць прафсаюзнага лідара да распаўсюду экстрэмісцкіх відэаматэрыялаў, то яму пагражае штраф да 870 рублёў або адміністрацыйны арышт да 15 сутак.

**24.10.2021** Міліцыя працягвае паведамляць пра затрыманні і завядзенні крымінальных справаў у дачыненні грамадзян, якія нібыта прынізілі гонар і годнасць чыноўнікаў і прадстаўнікоў праваахоўных органаў. Такіх «ідэнтыфікаваных» людзей у Віцебскай вобласці даволі шмат, што сведчыць аб тым, што пратэставыя настроі ў грамадстве нікуды не зніклі і не знікнуць у бліжэйшы час.

Так, мінулым летам трое жыхароў Віцебскай вобласці ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» пад рознымі публікацыямі размясцілі каментарыі з абразамі на адрас супрацоўнікаў міліцыі.

Паводле інфармацыі УУС, абвінавачаныя раскаяліся ва ўчыненым і патлумачылі, што паддаліся ўплыву разбуральных Telegram-каналаў.

Ужо маюцца публічныя заявы пра тое, што 41-гадоваму жыхару Лепельскага раёну, 52-гадоваму жыхару Воршы і 41-гадоваму жыхару Полацку пагражае да трох гадоў пазбаўлення

волі са штрафам.

А жыхар Верхнядзвінску, які быў, на думку міліцыянтаў, адміністратарам дэструктыўнага чату, быў затрыманы за абразу памочніка пракурора.

34-гадовы майстар з Верхнядзвінску быў затрыманы супрацоўнікамі ГУБАЗіК. Мужчыну вінавацяць у абразе праз каментаванне фатаграфій вайскоўцаў, пракурораў, журналістаў і кіраўніка дзяржавы.

Меркаваны парушальнік быў прызнаны падазраваным па крымінальнай справе, распачатай за негатыўнае выказванне на імя старшага памочніка пракурора аднаго з раёнаў Менску, з якім мужчына не быў знаёмы. Астатнія факты правяраюцца праваахоўнікамі. Пасля затрымання адміністратара інфармацыйны рэсурс быў ліквідаваны.

**27.10.2021** Суд Полацку і Полацкага раёну 26 кастрычніка завяршыў разгляд крымінальнай справы, заведзенай на 51-гадовую прадавачку аднаго з гандлёвых цэнтраў. Жанчыну вінавацілі ў злачынствах, прадугледжаных адразу трыма артыкуламі Крымінальнага кодэксу -188, 364, 369. Суд прызнаў яе вінаватай у паклёпе, абразе прадстаўніка ўлады і пагрозе ўжывання гвалту да супрацоўніка ўнутраных спраў. Вырак – тры гады «хіміі».

Як перадае афіцыйны сайт Вярхоўнага суду РБ, палачанка сваёй віны не прызнала.

Паведамляецца, што ў кастрычніку 2020 году ў адным з публічных тэлеграм-каналаў жанчына напісала паведамленне, якое ўтрымлівала «ненарматыўную форму моўнага выказвання», а таксама «вербальную агрэсію ў форме пагрозы ў дачыненні начальніка Полацкага РАУС».

У тым жа месяцы размясціла яшчэ адно паведамленне, у якім выказала пагрозы ўжывання гвалту ў дачыненні начальніка аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі, а таксама – на адрас намесніка начальніка ІЧУ Полацкага РАУС. У снежні 2020-га палачанка пераслала фотаздымак таго самага начальніка аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі МГБ у публічны тэлеграм-канал, «наўмысна распаўсюдзіўшы аб ім заведама непраўдзівыя звесткі».




Раней дзяржаўныя СМІ паведамлялі, што на след падазраванай міліцыянты выйшлі нібыта выпадкова – калі правяралі жанчыну на датычнасць да іншага злачынства.

Суд прызнаў жанчыну вінаватай па ўсіх трох крымінальных артыкулах – 188 («Паклёп»), 364 («Гвалт або пагроза ўчынення гвалту да супрацоўніка ОУС») і 369 («Абраза прадстаўніка ўлады»). Канчатковы прысуд – тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.

**28.10.2021** Раніцай 24 кастрычніка, вяртаючыся з забаўляльнай установы, віцяблянін некалькі разоў штурхнуў нагой дзверы адміністрацыйнага будынку органаў унутраных спраў. Гэты факт прычыніўся да пачатку крымінальнага пераследу «крыўдзіцеля» дзяржаўнай маёмасці. Міліцыя выявіла яго пры дапамозе камер відэаназірання.

Камеры відэаназірання захавалі паядынак з дзвярыма каля 7.30 нядзельнай раніцы. 24-гадовы віцяблянін, вяртаючыся з начнога клубу, не дайшоў да свайго дому літаральна з дзясятак метраў.
Праходзячы міма ўваходных дзвярэй міліцэйскага будынку, ён з нейкіх прычын вырашыў уступіць з ёй у сутычку.

Пасля адпрацоўкі трох-чатырох удараў нагамі жыхар абласнога цэнтру ўсё ж рушыў дадому. На думку міліцэйскага начальства, нападнік прычыніў маёмасную шкоду будынку. Праўда, суму шкоды міліцыянты пакуль не называюць.

Як стала вядома, следства спрабуе даць прававую ацэнку гэтаму кур'ёзнаму выпадку. Распачатая крымінальная справа паводле ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Хуліганства»).

**29.10.2021** Віцебскі абласны суд 29 кастрычніка разгледзеў скаргу аднаго з прафсаюзных лідараў наваполацкага прадпрыемства «Нафтан» Вадзіма Міхайлава. Ён спрабаваў адмяніць рашэнне наваполацкага суду, які 20 кастрычніка прысудзіў яму 15 сутак адміністрацыйнага арышту за нібыта ўдзел у масавым мерапрыемстве (ч.1 арт. 24.23). Суддзя Ірына Смалякова скаргу не задаволіла, а рашэнне суду пакінула без зменаў.

Вадзім Міхайлаў быў прызнаны вінаватым у арганізацыі і правядзенні несанкцыянаванага масавага мерапрыемства – пікетаванні. Менавіта так трактавала суддзя невялікую налепку на багажніку аўтамабіля навапалачаніна, якую ўбачылі супрацоўнікі міліцыі.

Пачаткова, 6 верасня, суд гораду Наваполацку аштрафаваў за гэта Міхайлава на 100 базавых велічынь. Але пракурору такое пакаранне падалося занадта лагодным. Ён падаў пратэст у абласны суд, патлумачыўшы, што «правапарушэнне мела працяглы характар», таму справу трэба накіраваць на новы разгляд.

6 кастрычніка суддзя абласнога суду Святлана Іванова адмяніла рашэнне аб штрафе і адправіла справу на новы разбор.

Суд у Наваполацку адбыўся 20 кастрычніка. Гэтым разам Вадзіму Міхайлаву прысудзілі 15 сутак адміністрацыйнага арышту.

У сваёй скарзе Міхайлаў зазначыў, што з пастановай суддзі аб накладанні такога спагнання не згодны. Лічыць, што высновы суду не адпавядаюць фактычным абставінам справы, што самі абставіны справы даследаваныя няпоўна, аднабакова і неаб'ектыўна. Выказаў меркаванне, што высновы аб ягонай вінаватасці заснаваныя выключна на здагадках. Прасіў адмяніць пастанову і спыніць справу аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Агучыўшы скаргу, суддзя Ірына Смалякова без якой-небудзь замінкі прыняла рашэнне: «Пастанову суддзі суду гораду Наваполацку ад 20 кастрычніка 2021 году ў дачыненні Міхайлава пакінуць без зменаў, а ягоную скаргу – без задавальнення».

Таксама 29 кастрычніка ў Віцебскім абласным судзе разглядаліся пратэст намесніка пракурора Віцебску і прыватная скарга музыкі Ігара Банцэра на пастанову суду Чыгуначнага раёну аб змяненні «хіміі» на адбыванне пакарання ў калоніі агульнага рэжыму. Вынікі гэтага паседжання ўдакладняем.

**29.10.2021** Па дадзеных следства, у жніўні, кастрычніку і лістападзе мінулага года 21-гадовая дзяўчына і 19-гадовы юнак нанеслі фарбай з аэразольных балончыкаў надпісы на кіёск і прыпынак, размешчаныя ў Віцебску на вуліцы Яроменкі, і на сцены трох гаражоў на вуліцы Лазо. На думку следчых, сваімі дзеяннямі маладыя людзі ўчынілі псаванне маёмасці і прычынілі прадпрыемствам маёмасную шкоду. Ці мелі надпісы пратэставы характар, міліцыя не паведамляе.

Асобы людзей, якія, магчыма, учынілі вышэйзгаданыя дзеянні, былі ўстаноўленыя супрацоўнікамі міліцыі падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў. На момант размалёўкі сцен хлопцу было 17 гадоў. Свае супрацьпраўныя дзеянні ён запісваў на камеру мабільнага тэлефона ягонай знаёмай.

Цяпер удзельнікі мастацкага флэш-мобу знаходзяцца на волі. Да дзяўчыны прымянілі меру стрымання ў выглядзе падпіскі аб нявыездзе, за маладога чалавека паручыліся. Следства завершанае, матэрыялы перададзеныя пракурору для накіравання ў суд.

Па выніках расследавання маладым людзям выставілі абвінавачанне паводле арт. 341 КК ("Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці"). Калі суд прызнае іх вінаватымі і датычнымі да нанясення надпісаў, то ім пагражае пазбаўленне волі ад аднаго да трох месяцаў (максімальнае пакаране).

**30.10.2021** Палітвязень Ігар Банцэр, якога 29 верасня суд Чыгуначнага раёну Віцебску асудзіў да 1 месяц і 25 дзён калоніі за парушэнне турэмных правілаў, вярнуўся ў віцебскую папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Падобны разварот адбыўся праз неправільнае прымяненне дзейнага заканадаўства з боку суддзі.

Музыку Ігара Банцэра ў сакавіку 2021 года асудзілі на 1,5 года «хіміі» за акцыю пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў – танец у стрынгах перад міліцыянтамі.



29 верасня віцебскі суддзя Дзяніс Аляксеенка пастанавіў накіраваць палітвязня на 55 дзён ў калонію за нібыта шасціразовае парушэнне рэжыму папраўчай установы. Парушэнні былі такія: «заснуў на крэсле», «не пагаліўся», «не выканаў каманду «адбой». Адміністрацыя палічыла, што гэтага дастаткова, каб замяніць Банцэру абмежаванне волі на пазбаўленне волі ў калоніі.

Але «парушэнні парадку», якія нібыта ўчыніў Банцэр, былі зафіксаваныя яшчэ да ўвядзення новага заканадаўства. Таму Банцэра не павінны былі судзіць па артыкуле «замена пакарання на больш жорсткае». Аднак чамусьці судзілі. Пракурор быў вымушаны апратэставаць рашэнне суду.

29 кастрычніка палітвязня зноў даставілі ў ПУАТ № 9 у Віцебску.

**01.11.2021** Судовая пастанова чакае на пошце жыхара Полацкага раёну Анатоля Каханчыка – гаспадара «апазіцыйнай» хаты, расфарбаванай у колеры нацыянальнага сцяга. Чакае суду і полацкі актывіст Свабоднага прафсаюзу Беларускага Віктар Стукаў. На яго складзеныя два пратаколы, піша Беларускае Радыё Рацыя.

За гэта Анатоля Каханчыка пакаралі яшчэ ў лютым, а цяпер прызналі вінаватым яшчэ і за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў (паводле артыкулу 19.11 КаАП).

«Нешта там перапосціў у траўні ці ў чэрвені, з Белсату і з Tut.by. Раней жа яны не былі забароненыя!

Вось ёсць такі Аляксей Панамароў. Ён за такое ж адсядзеў 7 сутак, прычым ён з Полацку, але адбываць пакаранне яго накіравалі ў Воршу. Каб не маглі перадаць перадачы, і ўвогуле, кажа, усё вельмі жорстка: цыгарэты – нельга, кіпень – нельга, удзень і ўночыператрусы – «шмон»,- кажа спадар Анатоль.

Сам Анатоль Каханчык на ўласны суд не трапіў – ён на самаізаляцыі як кантакт першага ўзроўню з хворым на каронавірус.

Чакае суду і полацкі актывіст Свабоднага прафсаюзу Беларускага Віктар Стукаў.

Ён кажа, што рэпосты рабіў яшчэ да таго, як інфармацыйныя рэсурсы былі прызнаныя экстрэмісцкімі, але людзей караюць без увагі на гэта.

«Даслалі мне два пратаколы. Першы за два рэпосты з «Белсату» у Фэйсбуку, а другі – за «Одноклассники», дык там ужо цэлы спіс рэпостаў… Дарэчы, і позву мне выдалі проста ў судзе: я прыйшоў, калі судзілі жанчыну па тым самым артыкуле. Яна выкладчыца вакалу ў Палацы культуры. Прысудзілі ёй 15 сутак», – расказвае.

Віктар Стукаў адзначае, што толькі яму вядомыя 6 ці 7 выпадкаў, калі жыхароў Полаччыны пакаралі за рэпосты, асудзіўшы да арыштаў ад 7 да 15 сутак. Насамрэч такіх фактаў значна болей, бо не ўсе асуджаныя паведамляюць пра гэта праваабаронцам ці грамадскім актывістам.

**02.11.2021** Пры спробе зайсці на сайт «Народныя навіны Віцебска» з Беларусі з'яўляецца паведамленне аб тым, што доступ да іх абмежаваны «на падставе рашэння Міністэрства інфармацыі». Прычына блакавання не ўдакладняецца. У падобным стане апынуўся і сайт віцебскі праваабарончы сайт «Віцебская вясна».

Першыя скаргі на доступ да сайту «Народныя навіны Віцебска» з'явіліся 29 кастрычніка ад карыстальнікаў «Белтэлекаму». З часам паведамленне аб блакіроўцы ад Мінінфарма з'явілася і на іншых аператарах.

«У жніўні 2020 года Мініформ заблакаваў адзін з нашых паддаменаў - news.vitebsk.cc. Зараз, па ўсёй верагоднасці, заблакавалі ўсе існыя паддамены і асноўны дамен vitebsk.cc», - распавёў БелаПАН галоўны рэдактар «Народных навін Віцебска» Сяргей Серабро.

Падобнае блакаванне з боку Міністэрства інфармацыі зазнаў і рэгіянальны праваабарончы сайт «Віцебская вясна».

Чытаць навіны Віцебшчыны можна з гэтых і іншых заблакаваных недзяржаўных рэсурсаў толькі пасля ўстаноўкі на гаджэтах VPN-праграм.

**03.11.2021** Чарговую справу аб абразе ў сацсетцы «Аднакласнікі» супрацоўніка ДАІ з Ганцавічаў Ігара Вольніча разгледзеў 3 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску.

Гэтым разам па справе паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») праходзіў 41-гадовага цясляр аднаго з менскіх будтрэстаў Аляксандр Сафонаў. Яго абвінавачваюць у абразе ажно двух супрацоўнікаў МУС. Апроч Вольніча, ён «пакрыўдзіў» капітана міліцыі з Бабруйску Андрэя Комара.

Справу разглядае суддзя Алена Жук. Пацярпелыя ў сувязі з рознымі абставінамі ў судовым паседжанні ўдзелу не бралі. Аляксандр Сафонаў віну прызнаў, ад паслугаў адваката адмовіўся.

«Пад уплывам агульнага негатыўнага настрою»
Паводле папярэдняга следства, Аляксандр Сафонаў, знаходзячыся ў вёсцы Бароўка Лепельскага раёну, 24 чэрвеня 2020 году са свайго мабільнага тэлефону ў сацсетцы «Аднакласнікі» наўмысна зрабіў каментар зневажальнага зместу ў дачыненні да старшага лейтэнанта ДАІ Ігара Вольніча. Допіс з ужываннем ненарматыўнай лексікі быў пакінуты на старонцы Вольгі Карач пад фота з надпісам: «Гэта я так спрытна прыціснуў да тратуару галаву мірнага дэманстранта падчас затрымання. Ігар Вольніч, супрацоўнік ДПС ДАІ г. Ганцавічы». «Пад уплывам агульнага негатыўнага настрою» Сафонаў пакінуў пад фота некалькі сказаў, ужыўшы словы «г…он», «м…зи», «т…ри».

Таксама ў перыяд ад 9-га па 11 ліпеня, знаходзячыся ў Менску, Сафонаў у «Аднакласніках» на старонцы Карач пакінуў другі абразлівы каментар – у дачыненні да супрацоўніка Першамайскага РАУС Бабруйску капітана міліцыі Андрэя Комара. Выкарыстаў словы «ж...па», «очередной мус...нок», «пид...к».

Паабяцаў, што напіша пацярпелым лісты



Аляксандр Сафонаў віну прызнаў. Запэўніў, што неўзабаве напіша лісты абодвум пацярпелым і папросіць прабачэння. Патлумачыў, што ў той час «знаходзіўся ў складаным псіхаэмацыйным стане», выкліканым сямейнымі абставінамі. Праглядаў каментары ў «Аднакласніках», якія ў асноўным былі негатыўнага зместу, і не думаў пра наступствы. Прыгадаў, што аднойчы быў незаконна затрыманы міліцыянтам ППС і спантанна выплюхнуў эмоцыі на Вольніча і Комара.

Запэўніў, што ў палітычных пратэстах 2020 году ўдзелу не браў.

«Падарваў прэстыж упраўленчай дзейнасці»
Падчас судовых спрэчак пракурорка заявіла, што «прыведзеныя ў судзе факты ў сваёй сукупнасці могуць быць пакладзеныя ў аснову абвінаваўчага прысуду, бо віна Сафонава даказана ў поўным аб’ёме». На думку пракуратуры, абодва каментары прыніжаюць гонар і годнасць супрацоўнікаў міліцыі, падрываюць аўтарытэт улады. Пракурорка засяродзіла ўвагу, што ўчыненае Сафонавым злачынства ёсць злачынствам, «скіраваным супраць парадку кіравання». Яно «падрывае прэстыж упраўленчай дзейнасці», «ставіць пад пагрозу нармальнае функцыянаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання».

Пракурорка прасіла суд прызнаць Сафонава вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе санкцый арт. 369 КК прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання свабоды з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага

тыпу на два гады і шэсць месяцаў.

Таксама прасіла задаволіць пазоў аб кампенсацыі маральнай шкоды, заяўлены пацярпелымі Вольнічам і Комарам. Меру стрымання да набыцця прысудам законнай моцы прасіла пакінуць ранейшую – падпіску аб нявыездзе.

Прасіў не абмяжоўваць свабоды

У сувязі з адсутнасцю адваката Аляксандр Сафонаў абараняў сябе сам.

У прыватнасці, ён заявіў, што «не з’яўляецца палітычным інтрыганам і не мае нянавісці да сілавых структураў». Адзначыў, што ён добры чалавек. Запэўніў, што, застаўшыся на волі, сваёй працай прынясе больш карысці, дапаможа маці-пенсіянерцы і сыну, якія патрабуюць ягонага клопату. Прасіў не абмяжоўваць ягонай свабоды.

Сказаў, што вельмі раскайваецца.

Вырак у справе абвесцяць 5-га лістапада ў 14.30.

**04.11.2021** 03 лістапада Васілевостраўскі суд гораду Пецярбургу арыштаваў да 10 снежня грамадзянку Беларусі Яну Пінчук. У Беларусі супраць яе распачатая крымінальная справа паводле ч. 3 арт. 130 КК РБ

(«Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці») і ч. 1 арт. 361-1 («Стварэнне экстрэмісцкага фармавання»). Калі яе дэпартуюць, то ў Беларусі ёй пагражае да 12 год няволі.

Як паведамляе аб'яднаная прэс-служба судоў Санкт-Пецярбургу, дзяўчыну ўзялі пад варту 1 лістапада ў Санкт-Пецярбургу па запыце беларускіх праваахоўнікаў. На іхную думку, Яна Пінчук адміністравала тэлеграм-канал «Віцебск 97», у якім «публікавала паведамленні з негатыўнай ацэнкай праваахоўных органаў, заклікі прычыняць шкоду супрацоўнікам міліцыі ды іншыя экстрэмісцкія матэрыялы».

У Расеі дзяўчына жыла цягам 4 гадоў, прычым цалкам легальна, працавала ў Пецярбургу афіцыянткай. Аб тым, што была ў вышуку ў Беларусі і што супраць яе на радзіме завялі крымінальную справу, даведалася толькі 1 лістапада ад супрацоўнікаў расейскай паліцыі.

Узгадаем, што тэлеграм-канал «Віцебск 97» паводле рашэння беларускага суду быў прызнаны «экстрэмісцкім».

Падчас прэзідэнцкіх выбараў 2020 году ў Беларусі дзяўчына брала ўдзел у мірных пратэставых акцыях. Пасля выехала ў Расейскую Федэрацыю. У Беларусі за ўдзел у акцыях яе не затрымлівалі і не судзілі.

Пад вартай у Пецярбургу Яна прабудзе да 10 снежня. Яе ўтрымліваюць у мясцовым СІЗА-5.

**05.11.2021** 5 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску вынес рашэнне ў справе, распачатай паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») у дачыненні да 41-гадовага цесляра аднаго з менскіх будтрэстаў Аляксандра Сафонава. За абразлівыя каментары пад допісамі Вольгі Карач у «Аднакласніках» суддзя Алена Жук прыгаварыла Сафонава да двух з паловай гадоў абмежавання волі – «хіміі».

Паводле абвінавачання, 24 чэрвеня, а таксама ў перыяд з 9-га па 11 ліпеня 2020 году, пад двума допісамі Вольгі Карач у сацсетцы «Аднакласнікі» Аляксандр Сафонаў пакінуў са свайго мабільнага тэлефону каментары з негатыўнай ацэнкай службовай дзейнасці супрацоўніка ДАІ з Ганцавічаў Ігара Вольніча і міліцыянта з Бабруйску Андрэя Комара.

На судзе Сафонаў віну цалкам прызнаў і раскаяўся.

Ён даводзіў, што не меў намеру абразіць супрацоўнікаў міліцыі, а грубасць у каментарах дапусціў, бо знаходзіўся ў дэпрэсіўным стане да пад негатыўным уплывам каментароў, пакінутых раней іншымі наведнікамі. У апошнім слове абвінавачаны прасіў суд быць «прыхільным да яго» і не абмяжоўваць ягонай свабоды.

Падчас судовых спрэчак пракурорка Вікторыя Драгель запатрабавала для Сафонава два з паловай гады «хіміі».

На абвяшчэнне прысуду 5 лістапада журналістаў не пусцілі, бо абвінавачаны пажадаў, каб судовае рашэнне было агучанае «без прысутнасці пабочных асобаў».

Пасля суду Аляксандр Сафонаў паведаміў, што суддзя Алена Жук прызнала яго вінаватым і пастанавіла накіраваць у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на два з паловай гады. Апроч таго, суд абавязаў яго кампенсаваць міліцыянтам маральную шкоду. Агульная сума кампенсацыі склала 1500 рублёў.

Ці будзе абскарджваць Аляксандр Сафонаў вырак у Віцебскім абласным судзе, пакуль не вырашыў.

**05.11.2021** 15 студзеня 2020 года пастановай суду Чыгуначнага раёну Віцебску Алег Паўлаў быў прызнаны вінаватым у парушэнні ўстаноўленага парадку правядзення пікетавання і таму падвергнуты адміністрацыйнаму спагнанню ў выглядзе штрафа ў памеры 675 рублёў. Цяпер грамадзянскі актывіст дамагаецца праз КПЧ, каб на міжнародным узроўні было прызнанае парушаным ягонае права на свабоду слова і на ўдзел у мірных сходах.

15 студзеня 2020 году суд пагадзіўся з міліцыяй, якая палічыла пікет на плошчы Перамогі ў Віцебску 29 снежня 2019 года, у якім браў удзел Алег Паўлаў, правапарушэннем. Праваахоўнікі аргументавалі гэта тым, што масавае мерапрыемства не было санкцыянаванае мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

Тым не менш, грамадзянскі актывіст палічыў, што быў аштрафаваны за рэалізацыю свайго права на ўдзел у мірным сходзе і свабоду выказваць публічна сваё меркаванне. Таму - абскардзіў яго ў Віцебскім абласным судзе.

Рашэннем Віцебскага абласнога суду ад 29 студзеня 2020 году пастанова суду Чыгуначнага раёну была пакінутая без змены, а скарга Паўлава - без задавальнення.

У органах пракуратуры Паўлаў не абскарджваў судовыя пастановы ў сувязі з тым, што пракурорскі нагляд па палітычных справах у Беларусі неэфектыўны.

Тым не менш, Алег Паўлаў звярнуўся ў Камітэт ААН па правах чалавека з паведамленнем аб парушаных грамадзянскіх і палітычных правах дзяржавай Рэспублікай Беларусь.

На скаргу ў міжнародную праваабарончую арганізацыю дзяржава адказала звычайнай фармальнай адпіскай. Яна палічыла, што заяўнікам не былі вычарпаныя ўсе існыя ўнутраныя сродкі прававой абароны, а довады Паўлава аб парушэнні арт. 19, то бок - на права на свабоднае выказванне меркавання і арт. 21 - на права на свабоду мірных сходаў, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (далей - Пакт) не знайшлі свайго пацверджання.

«У адпаведнасці з артыкулам 2 Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах цягне за сабой немагчымасць прадстаўлення заяўнікам пісьмовага паведамлення на разгляд Камітэту. У адпаведнасці з артыкулам 3 Факультатыўнага пратаколу, Камітэт можа прызнаць такое паведамленне непрымальным», - паведамляюць у Камітэт сваю пазіцыю чыноўнікі.

Нягледзячы на пазіцыю уладаў, Паўлаў вырашыў, што працягне настойваць на тым, што беларуская дзяржава парушыла ягоныя канстытуцыйныя правы, і будзе дамагацца, каб гэтыя парушэнні былі прызнаныя на высокім міжнародным узроўні.

**06.11.2021** Напрыканцы чэрвеня 2021 году ў аддзел унутраных справаў Кастрычніцкага раёну Віцебску паступіла заява ад дырэктара аднаго з дзяржпрадпрыемстваў аб тым, што невядомы залатой фарбай нанёс надпісы ў грамадскім месцы. Міліцыянты вывучылі запісы з камер відэаназірання і ўстанавілі, што гэта зрабіла 21-гадовая жыхарка Віцебску. У дачыненні яе завялі крымінальную справу. Ці мелі надпісы пратэставы характар, не паведамляецца.

Суд Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаў дзяўчыну вінаватай і асудзіў паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці») – яе аштрафавалі на 2610 рублёў.

У залік пакарання пайшоў таксама час, які дзяўчына правяла пад вартай.

Артыкул 341 КК таксама прадугледжвае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ або арышту на тэрмін да трох месяцаў. Адказнасць за такое злачынства надыходзіць з 14 гадоў.

Гэта не першы прысуд па гэтым артыкуле за апошні час у Віцебску. У кастрычніку 2021 году штрафам у памеры 2900 рублёў пакаралі былую студэнтку адной з ВНУ абласнога цэнтру.

**10.11.2021** 10 лістапада Віцебскі абласны суд разгледзеў скаргу полацкай актывісткі і мастачкі Нэлі Алфёравай на пастанову суду Полацкага раёну і гораду Полацку, які прыцягнуў яе да адміністрацыйнай адказнасці паводле ч.1 арт. 19.10 КаАП («Распаўсюд нацысцкай сімволікі») і ч.2 арт. 19.11 КаАП («Распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў») ды аштрафаваў на 1160 рублёў.

Суддзя Ірына Смалякова, якая разглядала скаргу, пакінула пастанову без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

На судовым паседжанні Алфёрава не прысутнічала.

5 кастрычніка суд Полацкага раёну і гораду Полацку прызнаў Нэлі Алфёраву вінаватай у публічным дэманстраванні нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі ў сацыяльнай сетцы «Вконтакте», а таксама абвінавацію у распаўсюдзе экстрэмісцкай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, і наклаў на жанчыну адміністрацыйнае спагнанне ў памеры 40 базавых велічынь (1160 рублёў) з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння.

У сваёй скарзе Нэлі Алфёрава выказала нязгоду з пастановай суду. Палічыла неабгрунтаваным разгляд справы без яе. Таксама выказала меркаванне, што абставіны справы былі даследаваныя судом няпоўна, аднабакова і неаб’ектыўна.

Прасіла пастанову, вынесеную па справе адмяніць, бо пры накладанні спагнання суд не ўлічыў факт знаходжання на яе ўтрыманні дзіця з інваліднасцю.

Рашэнне, агучанае па скарзе Ірынай Смаляковай было прадказальнае: пастанову суду Полацкага раёну і гораду Полацку ад 5 кастрычніка ў дачыненні Нэлі Алфёравай пакінуць без зменаў, а скаргу – без задавальнення.

**10.11.2021** Віцебская транспартная пракуратура накіравала ў суд Полацкага раёну крымінальную справу ў дачыненні 38-гадовага жыхара Наваполацку Руслана Слуцкага. Яму ставяць у віну прывядзенне ў непрыдатнасць чыгуначных шляхоў (ч.1 арт. 309 КК РБ) і акт тэрарызму (ч.1 ст. 289 КК РБ). Па выстаўленых абвінавачаннях суд можа прызначыць Слуцкаму максімальнае пакаранне - 15 гадоў пазбаўлення волі.

Па версіі следства, абвінавачаны ўчыніў злачынныя дзеянні, адгукнуўшыся на заклікі пратэставых тэлеграм-каналаў разбураць інфраструктуру «Беларускай чыгункі». Следства сцвярджае наяўнасць доказаў таго, што ў кастрычніку 2020 году ў Віцебскім рэгіёне абвінавачаны ў мэтах замыкання рэйкавага ланцугу чыгуначных пуцей спрабаваў замацаваць падрыхтаваныя загадзя фрагменты металічнага кабелю.

Таксама следчыя ўпэўненыя ў тым, што Руслан Слуцкі ўласнаручна вырабіў металічныя «вожыкі», каб пашкодзіць аўташыны, і 14 лістапада 2020 году раскідаў іх на ўчастку шашы «Віцебск – Полацк». Гэтыя дзеянні прывялі да таго, што некалькі аўтамабіляў, якія ўдзельнічалі ў аўтапрабегу «За адзіную Беларусь!», пракалолі шыны.




Паводле экспертаў, сваімі дзеяннямі Слуцкі нанёс шкоду, роўную 600 рублям.

На думку следчых, менавіта ў гэтым дзеянні і заключаецца «акт тэрарызму» Руслана Слуцкага.

Таксама, следства прыйшло да высновы, што злачынствы не былі даведзеныя да завяршэння «па незалежных ад выканаўца прычынах».

На днях транспартная пракуратура пагадзілася з абвінаваўчым актам і накіравала крымінальную справу ў суд.

**11.11.2021** Намеснік першаснай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) работнікаў ААТ «Нафтан» Аляксандр Балонкін быў звольнены з прадпрыемства 4 лістапада.

Як паведамляе тэлеграм-канал «Беларускі Незалежны Прафсаюз Наваполацк», на заводзе ён адпрацаваў больш за 19 гадоў, да заканчэння кантракту заставалася менш за тры месяцы. Загад аб звальненні падпісаў генеральны дырэктар прадпрыемства Андрэй Сойка. У Балонкіна – трое няпоўнагадовых дзяцей.

Аляксандр Балонкін быў затрыманы 17 верасня проста на працоўным месцы супрацоўнікамі КДБ, у ягоным доме адбыўсяператрус. 1 кастрычніка суда Наваполацку (суддзя Зінаіда Балаболава) прызнала мужчыну вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 19.11 КаАП) – праз фота з плакатам «Я/МЫ ТУТ.бай», якую Балонкін нібыта размясціў у «Інстаграме». Яму прысудзілі 15 сутак адміністрацыйнага арышту. На судовым паседжанні мужчына не прызнаў сваёй віны і заявіў, што наагул не мае акаўнту ў «Інстаграме».

11 кастрычніка праз абласны суд Аляксандр паспрабаваў абскардзіць арышт. У скарзе зазначаў, што справа была разгледжаная «няпоўна і неаб'ектыўна, з істотнымі парушэннямі заканадаўства», прасіў адмяніць рашэнне наваполацкага суду. Але суддзя абласнога суду Святлана Іванова скаргу не задаволіла.

Каб пазбегнуць звальнення за прагул, актывіст спрабаваў аформіць адпачынак за свой кошт без захавання заробку. Аднак працадаўца адмовіўся падпісваць заяву. Балонкіну прапанавалі звольніцца па дамове бакоў. Аляксандр на гэта не пайшоў, палічыўшы, што такім чынам пагодзіцца з дзеяннямі кіраўніцтва і з самім фактам звальнення.

Паводле загаду аб звальненні, якое падпісаў гендырэктар «Нафтану» Андрэй Сойка, інжынер-канструктар мантажна-тэхнічнага аддзелу звольнены «праз адсутнасць на працы ў сувязі з адбываннем адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе адміністрацыйнага арышту».

Лідар незалежнага прафсаюзу мае магчымасць абскардзіць гэтае рашэнне праз суд.

**12.11.2021** 12 лістапада суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў адміністрацыйную справу паводле арт. 24.23 КаАП, заведзеную на лекарку-пульманолага Марыну Бурбліс.

Яе прызналі вінаватай у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і аштрафавалі на 1450 рублёў за налепку герба Літвы на багажніку аўто. На судзе стала вядома, што крышка багажніку была «няродная», яе мянялі ў Літоўскай Рэспубліцы. На ёй засталася налепка з гербом гэтай краіны. Адвакат прасіў не пазбаўляць медыка свабоды, бо яна працуе ў чырвонай зоне...

Справу разбіраў суддзя Уладзімір Царыкаў.

Паводле рапарту супрацоўніка Кастрычніцкага РАУС Віцебску, інфармацыя аб аўтамабілі «Опель Вектра» з Пагоняй на багажніку, які рухаецца па вуліцы Гагарына ў бок выезду з гораду, паступіла 14 кастрычніка. Амаль праз тыдзень, 20 кастрычніка, быў праведзены агляд аўтамабіля і складзены пратакол агляду.

На першым судовым пасяджэнні, якое адбылося 2 лістапада, муж Марыны Бурбліс тлумачыў, што крышка на багажніку была замененая. Яе прывезлі з Літвы, мужчына паказаў на судзе перапіску з прадаўцом.

На судзе ў якасці сведкі выступіў непасрэдны начальнік жанчыны – выканаўца абавязкаў загадчыка першага тэрапеўтычнага аддзялення Віцебскай гарадской цэнтральнай паліклінікі Вадзім Парфенцьеў. Ён ахарактарызаваў сваю падначаленую станоўча, паведаміў, што Марына Бурбліс ад самага пачатку пандэміі ў складзе брыгады выязджала да хворых на каронавірус.

Цяпер таксама працуе ў чырвонай зоны.

Суддзю Царыкава цікавіла іншае. Ён запытваўся, ці абмяркоўвала на працы лекарка палітычныя тэмы і ці не стаяў у яе кабінеце бел-чырвона-белы сцяжок. Загадчык аддзялення адказаў, што нічога не бачыў, ніякіх палітычных тэм у аддзяленні не абмяркоўваюць.

Адвакат Марыны заявіў, што сімвал Пагоня не прызнаны экстрэмісцкім або забароненым. Таму нельга трактаваць яго толькі як сімвал пратэсту. І што ў дадзенай сітуацыі быў толькі «збег абставін, але не масавая акцыя». Ён патлумачыў, што літоўскі герб жанчына не стала здымаць з багажніка, каб не пашкодзіць пакрыццё аўтамабіля.

Зазначыў, што насамрэч падчас пандэміі галава ягонай падабароннай была занятая зусім іншымі пытаннямі, звязанымі з працай. І дадаў: «Не ведаю, ці звярталі яны ўвагу на тое, што гэта за сімволіка: беларуская ці літоўская? Для мяне, напрыклад, стала адкрыццём супастаўленне літоўскіх і беларускіх сімвалаў».

Адвакат прасіў, каб у выпадку, калі Марыну Бурбліс прызнаюць вінаватай, яе б не адпраўлялі за краты, бо ёй трэба дапамагаць хворым на COVID-19.

Суддзя Уладзімір Царыкаў прызнаў лекарку вінаватай і прыняў рашэнне аштрафаваць жанчыну на 50 базавых велічынь (1450 рублёў).

Присуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ў абласным судзе.

**12.11.2021** 27 жніўня рашэннем №819 Наваполацкі гарвыканкам прыступіў да ліквідацыі культурна-асветніцкай установы «Калюмна». Гэта апошняя ўстанова ў полацкім рэгіёне, якая дапамагала маладым людзям прымяняць свае веды і набываць валанцёрскі досвед у сферы культуры і асветы.

КПУ «Калюмна» было заснаваная ў канцы 2011 году групай ініцыятыўных навапалачан, якія былі гатовыя займацца вырашэннем праблем мясцовай моладзі.

Гэтая арганізацыя дапамагала маладым людзям і спецыялістам, якім была неабходная падтрымка ў самарэалізацыі.

Усе дзесяць гадоў існавання ўстановы яе супрацоўнікі і валанцёры актыўна вывучалі грамадскую думку з мэтай выявіць найбольш значныя праблемы рэгіёну. Для маладых людзей арганізоўваліся семінары і трэнінгі.

Не засталіся без падтрымкі арганізацыі маладыя спецыялісты, якія займаюцца даследаваннямі ў розных навуковых напрамках.

У фокусе працы арганізацыі пастаянна прысутнічала тэма экалогіі прамысловага Наваполацку, прадпрыемствы якога робяць істотную шкоду навакольнаму асяроддзю.

За свае ўласныя сродкі маладыя людзі аказвалі дапамогу бяздомным жывёлам.

Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле КПУ «Калюмна» сябры арганізацыі прымалі ўдзел у краязнаўчых пошуках, знаходзілі і аднаўлялі габрэйскія пахаванні, шукалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці парэшткі ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны.

**13.11.2021** Суд Аршанскага раёна і Воршы за абразу ў сацыяльных сетках работніка міліцыі прысудзіў мясцовага 55-гадовага жыхара да пакарання ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на адзін год і шэсць месяцаў з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу. Суд таксама абавязаў аршанца выплаціць міліцыянту матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды.

Падчас судовага следства ўстаноўлена, што 19 студзеня 2021 году падсудны з выкарыстаннем ноўтбука размясціў са свайго акаўнту ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» абразлівы каментар на адрас супрацоўніка РАУС адміністрацыі Ленінскага раёну Горадні.

На судзе мужчына прызнаў віну ў поўным аб'ёме, прынёс пацярпеламу супрацоўніку міліцыі прабачэнне.

Свой учынак патлумачыў тым, што кіраваўся агульнымі негатыўнымі настроямі ў грамадстве ў дачыненні да супрацьпраўных дзеянняў работнікаў міліцыі, якія сілавымі метадамі душылі пратэставыя выступы беларускіх грамадзян.

Пагадзіўшыся з бокам абвінавачвання, суд пастанавіў абвінаваўчы прысуд паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») і прызначыў пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 1 год 6 месяцаў.

Суд таксама задаволіў грамадзянскі пазоў міліцыянта і абавязаў аршанца выплаціць яму матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

Прысуд яшчэ не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ці апратэставаны ў апеляцыйнай інстанцыі – Віцебскім абласным судзе.

**15.11.2021** Адміністрацыя Першамайскага раёну Віцебску пачала ліквідацыю сацыяльна-дабрачыннай установы «Свет без сірот».

Працэдуру распачалі яшчэ 25 жніўня. Неўзабаве чыноўнікі зробяць справаздачу ў вышэйшыя інстанцыі аб паспяховым закрыцці арганізацыі, якая дапамагала сацыялізавацца самай бяздольнай частцы беларускага грамадства – дзецям-сіротам.

Сацыяльна-дабрачынная ўстанова «Свет без сірот» было зарэгістраваная ў снежні 2013 году. Да гэтага актывісты дабрачыннага сацыяльнага руху працавалі з сіротамі на валанцёрскіх пачатках больш за два гады.

Арганізацыя пачала сваю дзейнасць з гучнага праекту. Была створаная і прадэманстраваная грамадскасці выстава фотаздымкаў віцебскіх дзяцей-сірот пад агульнай назвай «Беларусь без сірот». Вынік той акцыі стаў нечаканы для яе стваральнікаў: 16 адзінокіх і кінутых дзяцей набылі новых бацькоў і сямейную ўтульнасць.

Наступнай ініцыятывай «Свету без сірот» быў адукацыйны праект «Урокі Маральнасці», накіраваны на выхаванне дзяцей-падлеткаў. На працягу доўгага часу падлеткі атрымлівалі веды пра такія важныя паняцці, як сяброўства, дабрыня, узаемаразуменне.

Але ж гонарам арганізацыі стаў праект «Настаўніцтва». У яго межах спецыялісты «Свету без сірот» падрыхтавалі настаўнікаў, здольных прышчапіць сацыяльныя навыкі і стандарты паводзінаў дзецям з сіроцкіх установаў. У выніку дзеці, які пражывалі па-за сям'ёй, змаглі атрымаць алгарытмы жыцця ў нармальных хатніх умовах, якія абавязкова спатрэбяцца ім у будучым дарослым жыцці.

Цяпер улады беспадстаўна і ганебна пазбаўляюць Віцебск арганізацыі, якая вырашала важную задачу – сацыялізацыю асірацелых дзяцей.

**15.11.2021** Віцебская блогерка Алена Янушкоўская ўжо некалькі месяцаў знаходзіцца за межамі Беларусі, але міліцыянты з'явіліся зператрусам ў яе хату ў вёсцы Суйкава Віцебскага раёну, дзе зараз жыве прыёмная дачка блогеркі з двума дзецьмі. Дачцэ паведамілі, што вобшук робяць праз тое, што яе маці «нешта не тое размясціла ў інтэрнэце», паведамляе служба маніторынгу Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Як распавяла прыёмная дачка Алены Янушкоўскай Святлана, міліцыянты шукалі незарэгістраваную сімволіку ды распытвалі, ці вярталася яе маці дахаты і ці не збіраецца зрабіць гэта найбліжэйшым часам. Пра тое самае міліцыянты распытвалі і суседзяў-аднавяскоўцаў, а прыёмнай дачцэ патлумачылі, штоператрус робяць, бо маці «нешта не тое размясціла ў інтэрнэце».

Алена Янушкоўская мусіла пакінуць Беларусь праз судовы пераслед і пакаранні адміністрацыйнымі арыштамі нібыта за ўдзел у мінулагодніх пратэстах. Блогерка рабіла з іх стрымы і размяшчала на сваім відэаканале «Настоящая Беларусь». Адзін з апошніх відэаролікаў і стаў непасрэднай прычынай ператрусу.

«Мой відэаролік «Малітва за Беларусь з Вячаславам Барком» трапіў у пералік так званых «экстрэмісцкіх» матэрыялаў. Ініцыявала гэта ўсё пракуратура Расонскага раёну. Ксёндз Вячаслаў Барок служыў у Расонскам касцёле і таксама з'ехаў з Беларусі, бо яго вінавацілі ў «экстрэмісцкіх» выказваннях у ягоным відэаблогу», – патлумачыла Алена Янушкоўская.

«Малітва за Беларусь» – гэта цыкл акцый, якія праводзяць у Варшаве беларусы, што былі вымушаныя з'ехаць у Польшчу. Алена Янушкоўская дапамагае ў арганізацыі гэтых сустрэч і вядзе з іх наўпроставыя трансляцыі.



**16.11.2021** Віцебскую блогерку Алену Янушкоўскую абвесцілі ў вышук, а расследаванне ў крымінальнай справе, заведзенай на яе за абразу прэзідэнта (арт. 368 КК), прыпынілі. Гэта вынікае з паведамлення, якое атрымала са следчага камітэту дачка Алены Янушкоўскай. Нядаўна ў доме блогеркі ў вёсцы Суйкава Віцебскага раёну прайшоўператрус. Сама Алена Янушкоўская знаходзіцца ў небяспецы – за межамі Беларусі.

«Атрымліваецца, што на мяне завялі крымінальную справу за абразу прэзідэнта, хаця я Святлану Ціханоўскую ніколі не абражала, таму гэта хлусня чыстай вады. Справу, распачатую супраць мяне, прыпынілі, абвесціўшы мяне ў вышук», – паведаміла Алена Янушкоўская.

Блогерка прызнаецца, што нават не здагадваецца, які дакладна стрым стаў падставай для завядзення справы. Кажа, што, у прынцыпе, любы ролік на яе канале «Настоящая Беларусь» пры жаданні ўлада можа прызнаць экстрэмісцкім і абразлівым. Прынамсі адзін са стрымаў Алены – «Малітва за Беларусь з Вячаславам Барком» – ужо дакладна прызнаны экстрэмісцкім матэрыялам.

Алена Янушкоўская мяркуе, што справа за абразу прэзідэнта – не адзіная «крыміналка», якую распачалі ў дачыненні яе.

«Бо зуб на мяне даўно вастрылі. Я і з краіны выязджала, бо мяне папярэдзілі міліцыянты, якія мне спачуваюць, што на мяне завялі крыміналку.

Потым, за некалькі тыдняў да прызнання экстрэмісцкай «малітвы», старшыня сельсавету Ярошкіна разносіла чуткі па вёсцы, што мне пагражае 7 гадоў турмы, калі вярнуся. То бок я мяркую, што не адна справа на мне вісіць. Але гэта першая афіцыйная папера, якая пацвярджае мае здагадкі», – кажа Алена Янушкоўская.

Расказала, што раней ёй на «Вайбер» званіў супрацоўнік Віцебскага РАУС Недзведзь, прапаноўваў прыехаць і забраць тэхніку, якую канфіскоўвалі ў 2020 годзе. Сцвярджаў, што блогерцы нічога не пагражае.

«Я думаю, што яны такім чынам спрабуюць мяне выманіць туды», – мяркуе Алена Янушкоўская

**16.11.2021** 10 лістапада суддзя Кастрычніцкага раёну Віцебску Сняжана Кіндзеява вынесла прысуд жыхару віцябляніну Расціславу Чаховічу. Яго прызналі вінаватым у апаганьванні збудаванняў і псаванні маёмасці (арт. 341 КК РБ). Маладога чалавека пакаралі штрафам у памеры 290 рублёў. На судзе высветлілася, што графіці не мела палітычнага характару.

Згодна з мататэрыяламі справы, у жніўні, кастрычніку і лістападзе 2020 году Расціслаў Чаховіч разам з іншым чалавекам нанеслі фарбай з аэразольных балончыкаў надпісы на кіёск і прыпынак, размешчаныя ў Віцебску на вуліцы Яроменкі, і на сцены трох гаражоў на вуліцы Лазо.



На думку следчых, сваімі дзеяннямі маладыя людзі ўчынілі псаванне маёмасці і прычынілі прадпрыемствам маёмасную шкоду.

Пры вынясенні рашэння суд прызнаў, што надпісы не мелі палітычнага і пратэставага характару.

Неўзабаве справа другога ўдзельніка флэш-мобу будзе разгледжаная ў адным з судоў Віцебску.

**17.11.2021** Суд Першамайскага раёну Віцебску 17 лістапада пачаў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні 21-гадовай віцяблянкі Александрыны Міхаложынай, абвінавачанай паводле арт. 341 КК («Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці»). У 2020 годзе на шапік, які належыць філіялу «Віцебск-тытунь» СЗАТ «Энерга-оіл» дзяўчына нанесла надпіс, звязаны з падзеямі прэзідэнцкай кампаніі. Ёй пагражае да трох месяцаў арышту.

Справу разглядае суддзя Наталля Карабліна. Паводле матэрыялаў папярэдняга следства, Александрына Міхаложына ў перыяд ад 5 кастрычніка да 25 лістапада 2020 году (дакладна вызначыць дату следчым не ўдалося) на тытунёвы шапік «Табакерка» фарбай чырвонага колеру нанесла «дэструктыўны» надпіс «3%».

Шапік размешчаны на аўтобусным прыпынку паблізу дому №16 па вуліцы актораў Яроменкаў у мікраараёне Білева ў Віцебску.

На погляд следства, дзяўчына мела намер папсаваць маёмасць, бо выкарыстоўвала неабходныя інструменты і матэрыялы, а менавіта – аэразольны балончык, запраўлены фарбай чырвонага колеру. Сума шкоды склала 70 рублёў.

На судзе Міхаложына прызнала віну цалкам. Распавяла, што знаходзілася ў закрытых Telegram-групах, але на несанкцыянаваныя мітынгі не хадзіла. Праўда, адзін раз была затрыманая міліцыянтамі на прыпынку гарадскога транспарту ля месца, дзе нібыта меўся адбыцца мітынг. Падчасператрусу ў яе знайшлі бел-чырвона-белы сцяг.

Дзяўчына распавяла, што надпіс на шапіку наносіла ўначы разам са сваёй знаёмай, ад якой нібыта і сыходзіла ініцыятыва. Даты дакладна не памятае, але пераконвала, што гэта быў кастрычнік. Нанесла на шапіку лічбу «3». А вось хто дадаў знак «%» і чырвоныя гарызантальныя лініі, не ведае. Заявіла, што яны з'явіліся на шапіку праз тры-чатыры дні пасля гэтага. Прызналася і ў тым, што размяшчала ўлёткі палітычнага зместу. Клеіла іх на дошках аб'яваў каля пад'ездаў, але тыя не хацелі трымацца і падалі долу. Усё гэта адбывалася цягам адной ночы. Сцвярджала, што больш такім ні яна, ні яе знаёмая не займаліся.

У якасці сведкі на судзе апыталі і сяброўку абвінавачанай Валерыю, справа ў дачыненні якой спынілі праз адсутнасць доказаў яе віны. Сведка даводзіла, што ў тую ноч менавіта Александрына прапанавала ёй прагуляцца, а калі яны падышлі да прыпынку, Міхаложына рэзка дастала з заплечніка балончык і нанесла надпісы «3%». Сцвярджала, што пабачыўшы, што робіць Александрына, яна напалохалася і збегла з прыпынку.

У судзе апыталі яшчэ трох сведкаў. Прадстаўнік філіялу «Віцебск-тытунь» СЗАТ «Энерга-оіл» пацвердзіў факт афарбоўкі сценаў прыпынку і шапіку на суму 70 рублёў. Прадстаўнікі МУС пацвердзілі факт нанясення надпісаў на шапік і сцены прыпынку.

Напрыканцы паседжання абвінавачаная заявіла, што раскайваецца ва ўчыненым і больш не будзе псаваць чужую маёмасць.

Спрэчкі бакоў адбудуцца 18 лістапада. Паседжанне прызначанае на 14.30.

**17.11.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 17 лістапада пачаўся судовы працэс над Андрэем Кузняцовым, у дачыненні якога распачалі крымінальную справу за знявагу менскай суддзі Вікторыі Шабуні (арт. 391 КК РБ). Калі мужчыну прызнаюць вінаватым, яму будзе пагражаць да трох гадоў абмежавання волі. На першае паседжанне ён не прыйшоў праз хваробу. Зняважаная суддзя Шабуня таксама не з'явілася.

Справу разбірае суддзя Ганна Тылец. На пачатку паседжання адвакат Андрэя Кузняцова заявіў хадайніцтва аб далучэнні да матэрыялаў справы даведкі з Віцебскага абласнога клінічнага цэнтру пульманалогіі і педыятрыі, паводле якой ягоны падабаронны ад 12 лістапада знаходзіцца там на стацыянарным лячэнні.

Суддзя далучыла дакумент да справы і разгледзела пытанне «аб магчымасці прадоўжыць разгляд справы без абвінавачанага Кузняцова і пацярпелай Шабуні». Старшая пракурорка аддзелу пракуратуры Віцебскай вобласці Драгель заявіла, што «судовае следства без удзелу названых асоб не ўяўляецца магчымым».

Пасля невялікага перапынку суддзя пастанавіла «спыніць судаводства ў справе па абвінавачанні Кузняцова ў сувязі з хваробай абвінавачанага да ягонага выздараўлення». Меру стрымання для Андрэя Кузняцова пакінулі ранейшай. Ён знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе.

Суддзя Вікторыя Шабуня з’яўляецца адным з «лідараў» па вынясенні палітычных прысудаў. Журналісты назвалі яе «ўдарным малатком рэжыму». Прыкладам, у жніўні 2020 году яна асудзіла на 10 сутак арышту «дыджэяў перамен» Уладзіслава Сакалоўскага і Кірыла Галанава. Як палічылі журналісты «Еўрарадыё», толькі за чатыры месяцы, якія прайшлі пасля прэзідэнцкіх выбараў, яна адправіла за краты (па адміністрацыйных справах) удзельнікаў масавых мірных акцый агулам на 532 дні арышту.

Апроч таго, Вікторыя Шабуня вынесла прынамсі 12 абвінаваўчых палітычных прысудаў у крымінальных справах і адправіла ў калонію 9 чалавек. Сябра ініцыятыўнай групы Віктара Бабарыкі Сяргея Канапца прысудзіла да пяці з паловай гадоў няволі. Яго прызналі вінаватым у перадачы інфармацыі ў чат-бот аб перамяшчэнні тэхнікі сілавікоў.

**18.11.2021** 21 кастрычніка Браслаўскі райвыканкам ліквідаваў сацыяльна-інфармацыйную ўстанову «Майстэрня братоў Лабуць». Закрытая ўладамі ўстанова давала ўнікальны анлайн сэрвіс для замовы і аплаты прадуктаў уласнага вырабу прадстаўнікам сацыяльна ўразлівай групе грамадзян. Браты Лабуці былі вядомыя тым, што цягам некалькіх гадоў праводзілі адзіны ў краіне пляжны оўпэн-эйр «Viva Braslav».

Два браты – Алег і Яўген Лабуці – нарадзіліся і выраслі ў Браслаўскім раёне.

СІУ «Майстэрня братоў Лабуць» праіснавала крыху больш за год, але была сапраўды інавацыйнай у сферы аказання інфармацыйных і іншых паслуг людзям з інваліднасцю.

У сакавіку 2021 году «Майстэрня братоў Лабуць» стала пераможцам Другога рэспубліканскага конкурсу ініцыятыў па развіцці прадпрымальніцтва. Гэты конкурс быў праведзены ПРААН у рамках праекта «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». І быў прафінансаваны Еўрапейскім саюзам у партнёрства з Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь.

У недалёкім мінулым улады заяўлялі аб развіцці рэгіёнаў з улікам унікальных канкурэнтных пераваг тэрыторый і стымулявання дзелавога патэнцыялу насельніцтва ў фокусе інтарэсаў сацыяльна-эканамічнай палітыкі краіны на бліжэйшыя пяць гадоў. Памяняліся: прыкладам негатыўнага развароту палітыкі ўладаў можна лічыць закрыццё перспектыўнай браслаўскай установы, здольнай у сваім патэнцыяле садзейнічаць развіццю малога прадпрымальніцтва ў Віцебскім рэгіёне.

**18.11.2021** Суд Глыбоцкага раёну асудзіў 48-гадовага Андрэя Кулікоўскага на 5 сутак адміністрацыйнага арышту за публічную дэманстрацыю фашысцкай сімволікі і атрыбутыкі (ч.1 арт. 19.10 КаАП). Мужчына – аматар гістарычнай рэканструкцыі, а нямецкая форма – тэатральны касцюм, у якім збіраўся здымацца ў кіно. Віцебскі абласны суд 17 лістапада адхіліў ягоную скаргу, а значыцца прысуд набыў законную моц. На разглядзе скаргі мужчына не прысутнічаў.

Апеляцыйную скаргу Андрэя Кулікоўскага разглядала ў Віцебскім абласным судзе 17 лістапада суддзя Святлана Іванова.

«Пастановай суду Глыбоцкага раёну ад 9 лістапада 2021 году Андрэй Кулікоўскі прызнаны вінаватым у тым, што з выкарыстаннем глабальнай сеткі Інтэрнэт на сайце, які прыналежыць яму, размясціў фотавыявы, якія дэманструюць нацысцкую сімволіку і атрыбутыку, доступ да якіх быў неабмежаваны», – агучыла суддзя Іванова.

Паводле рашэння суду першай інстанцыі, кінакасцюмы мусяць быць канфіскаваныя.

У скарзе Андрэй Кулікоўскі сцвярджаў, што яго прызналі вінаватым неабгрунтавана, бо на форме не было ніякай атрыбутыкі. Патлумачыў, што «свастыка была выдаленая», «знакі адрознення на нямецкай форме – адсутнічалі». Звярнуў увагу на тое, што не праводзілася ніякай экспертызы наконт таго, ці згаданыя рэчы могуць быць прапагандай фашызму. На думку Кулікоўскага, іх канфіскацыя таксама неабгрунтаваная, бо рэчы «з'яўляюцца тэатральнымі кінакасцюмамі», у якіх ён здымаўся ў кіно.

У скарзе паведаміў суддзі, што «гэтыя рэчы планавалася ў далейшым выкарыстоўваць па прызначэнні – для кіназдымак у гістарычных рэканструкцыях, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне».

**19.11.2021** 19 лістапада ў Віцебску каля «сіняга дому» быў затрыманы найстарэйшы прадстаўнік дэмакратычнага руху ў Віцебску Барыс Хамайда. Для прафілактычнай размовы яго даставілі ў Чыгуначны РАУС. На прадмет наяўнасці экстрэмісцкіх матэрыялаў міліцыянты вырашалі праверацъ усе 12 кніг, адабраных у Хамайды адмыслова для гэтай мэты.

Як распавёў Барыс Хамайда, у 11.00 ён заняў сваё звычайнае месца на рагу дому № 28 па вуліцы Леніна («сіні дом»). Недзе праз паўгадзіны падышоў невядомы ў цывільным, патэлефанаваў камусьці – з’явіліся міліцыянты і прапанавалі «праехаць на прафілактычную размову з кіраўніком Чыгуначнага РАУС». Мужчыну трымалі ў пастарунку каля трох гадзін і выпусцілі толькі пасля 15.00.

Хамайда паведаміў, што за гэты час супрацоўнікі МУС перапісалі ўсе беларускамоўныя кнігі, якія Хамайда распаўсюджваў. Сярод кніг былі «Слоўнік беларускай мовы Чэрвеньшчыны», «Жартоўныя беларускія песні», некалькі кніг з серыі «Бібліятэка замежнай прозы», сярод якіх Праспэр Мэрымэ, была і кніга Фрэйда. Забралі і кнігу Геніка Лойкі пра Скарыну.

«Дарэчы, кнігі забіралі ўпершыню за столькі гадоў. Мне адказалі, што пашлюць на экспертызу на прадмет наяўнасці ў іх змесце экстрэмісцкіх матэрыялаў. Абы-што! Забралі ўсе 12 кніг, а трынаццатай запісалі нават не кнігу, а сшытак са спісам кніг, якія можна замовіць. Стужкай перакруцілі, пячатку паставілі і паведамілі, што будуць накіроўваць на экспертызу», – распавёў Барыс Хамайда.

Копію пратакола аб адабранні кніг Хамайду ўдалося атрымаць.

«У мяне ёсць афіцыйны дакумент вынятых кніжак. Беларускае заканадаўства не забараняе распаўсюд беларускай літаратуры, таму знайшлі іншую зачэпку – трэба праверыць на экстрэмізм», – кажа Хамайда.

Нягледзячы ні на што, у панядзелак Барыс Ханонавіч Хамайда мае намер патрапіць на сваю пляцоўку з новай партыяй беларускай літаратуры.

«Я так мяркую: яны мяне, магчыма, пераблыталі, але ж я грамадзянін Беларусі і на беларускай зямлі распаўсюджваю беларускую літаратуру. Мо прынялі мяне за сірыйца ці курда, але гэта не так. Я ў Віцебску нарадзіўся і ў мяне яшчэ ёсць кніжкі!» – кажа Хамайда.

**19.11.2021** 19 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску абвесціў вырак у справе 21-гадовай віцяблянкі Александрыны Міхаложынай, абвінавачанай паводле арт. 341 КК. За псаванне маёмасці і «дэструктыўны» надпіс «3%» на шапіку «Табакерка», які належыць «Віцебск-тытунь» СЗАТ «Энерга-оіл», суд пакараў Міхаложыну штрафам у памеры 100 базавых велічынь і, такім чынам, цалкам задаволіў патрабаванне пракуратуры.

Са згоды бакоў суддзя Наталля Карабліна агучыла толькі выніковую частку прысуду. За псаванне маёмасці ў грамадскіх месцах пры адсутнасці прыкметаў больш цяжкага злачынства паводле арт. 341 КК суд прызначыў Александрыне Міхаложынай пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 100 базавых велічыняў (2900 рублёў).

Меру стрымання да набыцця прысудам законнай моцы суд пакінуў ранейшую – падпіска аб нявыездзе. Абмежаванне права на выезд з Рэспублікі Беларусь суд пастанавіў адмяніць таксама пасля набыцця прысудам законнай моцы.

Аптычныя дыскі, носьбіты інфармацыі, як рэчавыя доказы, вырашана пакінуць пры крымінальнай справе цягам усяго тэрміну захоўвання. Саскробы чырвонай фарбы і БЧБ-палотнішча суддзя пастанавіла знішчыць. Арышт, накладзены на маёмасць Міхаложанай, не адменены.

Тэрмін для добраахвотнай аплаты штрафу – два месяцы пасля набыцця прысудам законнай моцы. Суддзя Карабліна папярэдзіла Міхаложыну, што ў выпадку злоснага ўхілення ад выканання пакарання, штраф можа быць заменены на арышт або абмежаванне волі.

Падчас судовага следства Міхаложына папярэджвала суд, што пасля выплаты двух крэдытаў з яе заробку на жыццё застаецца толькі 150-200 рублёў. Таксама сцвярджала, што ёй дапамагаюць фінансава бацька і бабуля.

**19.11.2021** У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 18 лістапада разглядалася чарговая адміністрацыйная справа за налепку на аўтамабілі. 43-гадовага Уладзіслава Цітова асудзілі на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за невялікі герб Пагоня на багажніку. Суддзя Уладзімір Царыкаў палічыў гэта ўдзелам у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (ч.1 арт. 24.23 КаАП). Цітоў віны не прызнаў і заявіў, што не мае ніякага дачынення да налепкі.

Згодна з пратаколам адміністрацыйнага правапарушэння, спецыяліст па лагістыцы прыватнага прадпрыемства Уладзіслаў Цітоў у перыяд ад 23-га да 26 кастрычніка, знаходзячыся ў Віцебску, «узяў удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве – пікетаванні, якое выразілася ў дэманстрацыі для нявызначанага кола асобаў выявы герба Пагоня на крышцы багажніку аўтамабіля, які належыць яму – з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных поглядаў і настрояў на падзеі грамадска-палітычных жыцця».

Легкавы аўтамабіль «Пежо» белага колеру быў выяўлены і агледжаны супрацоўнікамі міліцыі 23 кастрычніка на праспекце Люднікава побач з прадпрыемствам «Белвест». Быў складзены пратакол агляду і рапарт.

Раніцай 26 кастрычніка Уладзіславу Цітову патэлефанавалі з Кастрычніцкага РАУС, паведамілі пра налепкі і прасілі прыехаць.

Паводле ягоных словаў, менавіта тады ён і даведаўся аб існаванні налепкі на багажніку свайго аўто – і тут жа яе зняў. Хто і калі яе наклеіў, не ведае. Паведаміў на судзе, што машына была ў аварыі, ёй пашкодзілі багажнік, крышка не адкрываецца. З таго часу багажнікам ён не карыстаецца, а таму і не звяртае на яго ўвагу. З салону аўтамабіля ўбачыць, што прылеплена ззаду аўтамабіля, немагчыма.

Суддзя Уладзімір Царыкаў пацікавіўся, ці ведае ён, што Пагоню выкарыстоўваюць людзі, не згодныя з дзеяннямі ўладаў, удзельнікі масавых акцыяў пратэсту. Уладзіслаў адказаў, што не ўдзельнічаў у пратэставых акцыях, і толькі ведае, што ўдзельнікі выкарыстоўваюць бел-чырвона-белыя сцягі.

«Ну, каб з гербамі хадзілі – я не бачыў», – адказаў ён. «Вы якія асацыяцыі маеце ў дадзеным выпадку з такой выявай?» – удакладніў суддзя. «Абсалютна нейтральныя. У мяне атэстат з такім гербам аб заканчэнні сярэдняй школы. Ну то бок герб як герб», – патлумачыў Уладзіслаў.

Перш чым вынесці вердыкт, суддзя Царыкаў агучыў высновы, да якіх прыйшоў суд, і заявіў, што «працяглы перыяд часу знаходжання налепкі», а таксама «белы колер аўтамабіля, які дазваляе з адлегласці выявіць наяўныя на ёй пабочныя прадметы», сведчаць аб тым, што «Цітоў не мог не ведаць аб наяўнасці дадзенай налепкі». А яго довады «аб тым, што яму не было вядома аб яе наяўнасці на крышцы багажніку, суд знаходзіць непераканаўчымі».

Суддзя паведаміў, што «у якасці змякчальнай адміністрацыйную адказнасць акалічнасці суд прызнае наяўнасць на ўтрыманні малалетняга дзіцяці, якое пражывае з маці» і прысудзіў Уладзіславу Цітову 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

На выхадзе з будынку суду мужчына быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. За кратамі яму трэба будзе правесці 7 дзён, бо трое сутак (ад 2-га да 5-га лістапада) ён ужо адбыў у мясцовым ізалятары.

Гэта далёка не першы выпадак у Віцебску, калі судзяць за налепкі на аўтамабілі.

Той жа суддзя Царыкаў 22 кастрычніка судзіў супрацоўніка транспартнай інспекцыі Юрыя Шылько за налепку на заднім бамперы аўтамабіля. Супрацоўнік інспекцыі таксама заяўляў, што не клеіў яе. Тады суддзя стаў на яго бок і заявіў, што немагчыма ўстанавіць, хто наклеіў налепку. А 12 лістапада, усё той жа суддзя Царыкаў, судзіў ужо лекарку Марыну Бурбліс за налепку літоўскага герба на крышкі багажніка. Ён прызнаў яе вінаватай і аштрафаваў на 50 базавых велічынь. На працэсе стала вядома, што крышку багажніка прывезлі з Літвы ўжо з налепкай і ўсталявалі на аўтамабіль.

**20.11.2021** 19 лістапада ў Полацкім раёне быў затрыманы гаспадар памаляванай у бел-чырвона-белыя колеры хаты Анатоль Каханчык. У той жа дзень яго судзілі, прызналі вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкай інфармацыі (арт. 19.11 КаАП) і пакаралі 15 суткамі адміністрацыйнага арышту. Пра гэта паведамілі праваабаронцы ПЦ «Вясна».

«Нешта там перапосціў у траўні ці ў чэрвені, з Белсату і з Tut.by. Раней жа яны не былі забароненыя!» – каментаваў на пачатку лістапада Анатоль Каханчык інфармацыю пра тое, што на пошце яго чакае судовая пастанова.

10 лістапада на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» Каханчык паведамляў, што некалькі дзён таму ў вёску прыязджалі «па заяве прэдседацеля» супрацоўнікі СК і апытвалі ўсіх суседзяў. Пыталіся, дзе можа хавацца гаспадар БЧБ-хаты.

Чырвоную паласу на яго доме замазалі карычневай фарбай.

**20.11.2021** Судом Дубровенскага раёну быў вынесены прысуд паводле арт. 369 КК («Знявага прадстаўніка ўлады») у дачыненні 40-гадовага мясцовага жыхара Юрыя Свіцына. Па версіі следства, ён абразіў пракурора Дубровенскага раёну Міхаіла Пацеева. Суд прызначыў пакаранне абвінавачанаму ў выглядзе трох гадоў абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу і штрафам у 2900 рублёў.

Падчас судовага следства было ўстаноўлена, што у жніўні 2021 году Юры Свіцын, знаходзячыся ў Барані Аршанскага раёну, з дапамогай мабільнага тэлефона Xiaomi Redmi 7A са свайго ўліковага запісу ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» размясціў абразлівы каментар на адрас пракурора Міхаіла Пацеева. Нібыта гэта была помста пракурору за тое, што раней ён у грамадскім месцы спыніў супрацьпраўныя дзеянні абвінавачанага.

У судовым паседжанні мужчына цалкам прызнаў віну і раскаяўся ва ўчыненым.

Суд палічыў віну дубровенца даказанай і, кіруючыся арт. 369 КК РБ, прызначыў яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 3 гады са штрафам 100 базавых велічынь, прызначыў таксама абвінавачанаму прымусовае лячэнне ад алкагалізму.

Таксама суддзя пастанавіў спагнаць са Свіцына на карысць пракурора Пацеева кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў і канфіскаваць тэлефон абвінавачанага ў даход дзяржавы.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**23.11.2021** У судзе Першамайскага раёну Віцебску 23 лістапада пачаўся разгляд крымінальнай справы за здзек над дзяржаўным сцягам (арт. 370 КК). 26-гадовага Дзмітрыя Карпінскага абвінавачваюць у тым, што ён сарваў з будынку сцяг, надарваў яго і выкінуў у сметніцу, а дрэўка зламаў. Калі віна будзе даказаная, мужчыне пагражае да трох гадоў калоніі. Сваю віну Карпінскі прызнаў часткова. Матэрыяльную шкоду ацанілі ў 36 рублёў 67 капеек.

Справу разбірае суддзя Алена Жук. Згодна з выстаўленым абвінавачаннем, супрацоўнік прыватнага прадпрыемства Дзмітрый Карпінскі ў ноч з 8 на 9 верасня 2021 году, знаходзячыся на паркоўцы ля крамы «Веста» у мікраараёне Білева, «на віду ў мінакоў, рэалізуючы свой злачынны намер, накіраваны на здзек над дзяржаўным сімвалам РБ – дзяржаўным сцягам РБ, тым самым выказваючы зняважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў РБ, наўмысна дастаў з насценнага краштэйну дрэўка з дзяржаўным сцягам РБ, пасля чаго дэманстратыўна, праяўляючы паказную смеласць і дзёрзкія паводзіны, панёс дзяржаўны сімвал РБ ад фасада будынку крамы», – агучыла пракурорка Ганчарэнка.

Далей, па версіі следства, Дзмітрый «наўмысна адарваў палотнішча дзяржаўнага сімвала РБ ад дрэўка, прычыніўшы пашкоджанне ў выглядзе надрываў матэрыі, скамячыў гэтае палотнішча і выкінуў яго ў сметніцу». Сам флагшток ён разламаў на некалькі частак і таксама выкінуў іх.

Пракурорка заявіла, што хлопец «меў імкненне дэманстраваць сваё непаважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў РБ і прычыніць шкоду аўтарытэту РБ».

Дзмітрый часткова прызнаў сваю віну, заявіўшы, што сапраўды зняў сцяг з будынку крамы і затым выкінуў яго ў сметніцу. Але пры гэтым заявіў, што ніякай «паказной смеласці» і «дзёрзкіх паводзін» не было. Сказаў, што не было жадання зневажаць афіцыйны сцяг. Проста хацеў ад яго пазбавіцца – як ад доказу, спалохаўшыся магчымага пакарання. Навошта ён яго зняў, не змог патлумачыць. Сказаў, што рашэнне было спантаннае, магчыма, пад уздзеяннем выпітага піва.

Пракурорка пацікавілася, на якія тэлеграм-каналы «дэструктыўнай накіраванасці» ён быў падпісаны. «У якім сэнсе – дэструктыўнай накіраванасці?» – удакладніў Дзмітрый. «Антыпалітычныя, скажам так», – патлумачыла абвінаваўца. І прывяла ў якасці прыкладаў каналы «Nexta», «Віцебск, я гуляю» ды іншыя вядомыя тэлеграм-рэсурсы.

Дзмітрый сказаў, што, магчыма, і быў падпісаны на якія-небудзь з тых каналаў, але ў дадзены момант «Тэлеграмам» не карыстаецца.

На працэсе ў якасці сведкаў выступілі сябры Дзмітрыя, якія ў той вечар знаходзіліся разам з ім на паркоўцы побач з крамай. Пракурорка цікавілася, ці абмяркоўвалі яны палітычныя тэмы.

Працэс працягнецца 24 лістапада. Інтарэсы Дзмітрыя на судзе абараняе адвакат.

**23.11.2021** Віцебскія чыноўнікі адмянілі паказы спектаклю «Ціль» у Нацыянальным акадэмічным драмтэатры імя Якуба Коласа. Пасля прэм’еры, якая абылася 21 лістапада, пастаноўку наагул забаранілі і знялі з рэпертуару, піша Zerkalo.io. Прэм'ерай трагікамедыі «Ціль» коласаўцы адзначалі 95-годдзе тэатру.

21 лістапада ў Нацыянальным тэатры імя Якуба Коласа ў Віцебску адбылася прэм’ера спектаклю «Ціль». Спектакль паставілі паводле п’есы драматурга Рыгора Горына, якую ён напісаў на падставе раману бельгійскага пісьменніка Шарля Дэ Кастэра

«Ціль Уленшпігель». Раман і спектакль распавядаюць пра барацьбу фламандцаў супраць іспанскага валадарства ў 16 стагоддзі.

На пастаноўцы былі кіраўнікі Віцебшчыны і прадстаўнікі Мінкульту. Але, як кажуць артысты, чыноўнікам спектакль не спадабаўся. Асаблівае раздражненне ў іх выклікалі выкарыстанне на сцэне чырвоных стужак і выкрыкі са сцэны «Жыве Фландрыя!».

У выніку спектакль знялі з рэпертуару. Паказ, запланаваны на 11 снежня, адменены – інфармацыя аб гэтым з’явілася на сайце kvitki.by.

**24.11.2021** .Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 24 лістапада адмовіў кіраўніцтву папраўчай установы адкрытага тыпу (ПУАТ) №9 накіроўваць палітвязня Ігара Банцэра у калонію за нібыта шматлікія парушэнні рэжыму ўтрымання. Колькі дзён з тэрміну засталося адседзець палітвязню, стане вядома пазней, пасля пераліку, паведамляе belraz.eu.

Нагадаем, раней суддзя Дзяніс Аляксеенка пастанавіў замяніць пакаранне на больш жорсткае праз тое, што Банцэр нібыта шэсць разоў парушыў рэжым «хіміі». Напрыклад, ляжаў, а не сядзеў удзень на ложку, калі знаходзіўся на карантыне. Яшчэ адным парушэннем, на думку адміністрацыі, стала адмова засяліцца ў вызначаную «хату»: адміністрацыя ведала, што Ігар адмовіцца, паколькі там змяшчаліся так званыя «апушчаныя».

24 лістапада адбылося абскарджванне гэтага прысуду. Вырак быў зменены.

Ігару Банцэру засталося адседзець менш за месяц. Аднак ціск на яго не спыняецца. Так, са жніўня актывіст правёў у штрафным ізалятары ажно 60 содняў.

Ігару Банцэру 41 год. Гарадзенец, вядомы як панк-музыка, гарадскі актывіст, удзельнік анархісцкага і антыфашысцкага рухаў. Некалі быў прэс-сакратаром Саюзу палякаў Беларусі.

**24.11.2021**.25 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску пачаў разглядаць справу, заведзеную на 45-гадовага прадпрымальніка Алега Дзмітрачэнку. Паводле арт. 369 КК мужчыну абвінавачваюць у абразе былога старшыні адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску Сяргея Сташэўскага пры выкананні ім службовых абавязкаў. Пацярпелы Сташэўскі ў сувязі са службовымі акалічнасцямі на судовае паседжанне не з’явіўся. Суд прыняў рашэнне разглядаць справу без яго.

Справу разглядае Міхаіл Юрчанка.

У ходзе папярэдняга следства было высветлена, што 12 жніўня 2020 году Алег Дзмітрачэнка, выкарыстаўшы свой мабільны тэлефон, са свайго ўліковага запісу «ВКонтакте», пад публікацыяй «Чыноўнік Сяргей Сташэўскі прымусіў чальцоў камісіі падрабіць пратакол» у суполцы «Гэта Віцебск, дзетка» пакінуў допіс абразлівага зместу. Напісаў нібыта ў дачыненні чыноўніка фразу «Адзін з мр…яў».

Цягам некалькі дзён пост сабраў больш за тысячу лайкаў і 116 рэпостаў. Пад допісам абвінавачанага было пастаўлена каля 20 лайкаў. У судзе было агучана сем прозвішчаў з шэрагу асобаў, якія пакінулі каментары абразлівага зместу пад публікацыяй. Некаторыя з іх за абразу былога старшыні адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Сяргея Сташэўскага ўжо асуджаныя.

Падчас папярэдняга следства Дзмітрачэнка віны не прызнаваў.

Спачатку наагул адмаўляў факт учынення ім злачынства, мяркуючы, што ягоная старонка «ВКонтакте» была ўзламаная. Потым спаслаўся на тое, што перад ягоным каментаром ужо былі каментары з негатыўнай ацэнкай учынку Сташэўскага і ягоны допіс тычыцца не чыноўніка, а менавіта аднаго з каментатараў.

Аднак на судзе Дзмітрачэнка змяніў пазіцыю: цалкам прызнаў віну і заявіў, што раскайваецца ва ўчыненым, а абразлівы допіс зрабіў пад уплывам эмоцыяў. Таксама выказаў гатоўнасць прынесці пацярпеламу публічныя прабачэнні.

Сяргей Сташэўскі таксама змяніў сваю першапачатковую пазіцыю, і ў пісьмовай заяве ўказаў, што не настойвае на прыцягненні Дзмітрачэнкі да крымінальнай адказнасці.

У судзе былі агучаныя матэрыялы двух тамоў справы разам з паказаннямі пацярпелага. Удзельнікі працэсу пагадзіліся з тым, што ў сувязі ў прызнаннем Дзмітрачэнкам сваёй віны ў поўным аб'ёме патрэба ў апытанні выкліканых раней сведкаў адпала. Але пасля перапынку ўсё ж была апытаная ўчастковая міліцыянтка, якая першая выклікала да сябе абвінавачанага для праўдзення працэсуальных дзеянняў.

Дзмітрачэнка цалкам пагадзіўся з усімі паказаннямі, якія ўчастковая агучыла на судзе.

Са згоды бакоў судовыя спрэчкі вырашана перанесці на 26 лістапада. Судовае паседжанне прызначана на 10.00.

**25.11.2021** 25 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску абвясціў рашэнне ў крымінальнай справе паводле артыкулу 370 КК РБ («Здзек над дзяржаўнымі сімваламі»). Суддзя Алена Жук прызнала 26-гадовага Дзмітрыя Карпінскага вінаватым у знеслаўленні афіцыйнага сцягу і прысудзіла мужчыну да 1 года і 6 месяцаў абмежавання волі. Першае паседжанне адбылося 23 лістапада.

Віцябляніна Дзмітрыя Карпінскага абвінавачвалі ў тым, што ён уначы з 8-га на 9-га верасня, знаходзячыся побач з крамай «Веста» у мікрараёне Білева, зняў з будынку афіцыйны сцяг, а пасля, сарваўшы з дрэўка, скамячыў яго і выкінуў у сметніцу. Па версіі следства, сваімі дзеяннямі ён зняславіў дзяржаўны сцяг. Пры гэтым – праяўляў «дзёрзкія паводзіны» і «паказную смеласць», «непаважлівае стаўленне да дзяржаўных сімвалаў».

Віну хлопец прызнаў часткова, заявіў, што не хацеў здзекавацца над сцягам, толькі хацеў ад яго пазбавіцца.

Суддзя Алена Жук прыняла рашэнне Дзмітрыя Карпінскага «прызнаць вінаватым і на падставе артыкулу 370 КК РБ прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 1 год 6 месяцаў з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу».

Тэрмін адбывання пакарання будзе адлічвацца з дня пастаноўкі на ўлік у папраўчай установе. У дадзены момант Дзмітрый знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Тры дні, з 15 па 18 верасня, якія ён адбыў у ізалятары, будуць залічаныя ў тэрмін з разліку адзін дзень у ізалятары роўны двум дням на «хіміі».

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны ў абласным судзе. Дзмітрый яшчэ не вырашыў ці будзе абскарджваць прысуд, бо не мае надзеі, што абласны суд перагледзіць рашэнне і зменшыць пакаранне.




Пасля абвяшчэння прысуду, Дзмітрый Карпінскі выказаў жаданне, каб далёка ад Віцебску яго не адпраўлялі.

**25.11.2021** На выкананне прадстаўлення пракуратуры Полацкага раёну мясцовы выканкам прыняў рашэнне аб ліквідацыі Цэнтру інфармацыйна-прававой падтрымкі сацыяльна неабароненых груп насельніцтва «Адвакацыя». Падстава - ажыццяўленне дзейнасці, якая не адпавядала заяўленым у статуце прадмету і мэтам.

Пры вывучэнні пракуратурай даведкі аб рухах на валютным рахунку арганізацыі ў ЗАТ «Альфа-Банк» было ўстаноўлена паступленне грашовых сродкаў ад рэзідэнтаў Літоўскай Рэспублікі.

Згодна з тлумачэннямі заснавальніка і дырэктара ўстановы Мікалая Шараха, а таксама прададзенымі ім дамовамі, Цэнтр аказваў паслугі кансультавання ў пытаннях камерцыйнай дзейнасці ў Беларусі дабрачыннаму і спонсарскаму фонду «Forum Syd Baltika» і фонду дабрачыннасці і падтрымкі «ForumCiv Eastern Europe». Гэта адзін і той жа фонд, проста падчас рэалізацыі праекту фонд памяняў назву.

Пракуратура не даказала, што ў межах праекту былі незаконна атрыманыя і патрачаныя Цэнтрам 16820 еўра.

«З адкрытых інтэрнэт-крыніц устаноўлена, што названыя дабрачынныя фонды праз выдзяленне грантаў «падтрымліваюць грамадскія групы і ініцыятывы, якія працуюць у галіне дэмакратыі, правоў чалавека, абароны навакольнага асяроддзя і гендэрнай роўнасці», – выявіла пракуратура »крамол«.

Тым не менш, пракуратура не змагла дакументальна і фактычна высветліць, што ўстанова «Адвакацыя» выкарыстоўвала атрыманыя сродкі для фінансавання масавых пратэстаў у Полацкім рэгіёне. Аднак зрабіла заснаваную на пракурорскіх фантазіях выснову аб тым, што Цэнтр фінансаваў дзеянні асобаў, якія імкнуліся паўплываць на палітычную абстаноўку ў краіне.

Цяпер, па волі ўладаў, у Полацку не будзе каму легальна займацца прававой асветай грамадзян, садзейнічаць самаадукацыі беспрацоўных, грамадзян старэйшых за 50 гадоў, інвалідаў, прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей і іншых сацыяльна ўразлівых груп насельніцтва.

**26.11.2021** Па рашэнню адміністрацыі Віцебскай папраўчай установы адкрытага тыпу №9 палітвязня Дзмітрыя Абрамука, які адбывае трохгадовае пакаранне, паставілі на ўлік як «схільнага да самавольнага сыходу з установы». Дзмітрый Абрамук быў асуджаны ў Берасці па так званай «карагоднай справе».

Адміністрацыя «хіміі» вырашыла, што палітвязень хоча ўцячы ў Расею, хаця сам ён ніколі не казаў пра намер збегчы. Больш за тое, Дзмітрыя пастаянна правакавалі пытаннямі, калі і куды ён збіраецца ўцякаць.



Раней Абрамука ўжо ставілі на прафілактычны ўлік паводле катэгорыі «схільны да экстрэмісцкай ды іншай дэструктыўнай дзейнасці». Таксама адміністрацыя «хіміі» больш як паўгода не пускае яго на працу.

Дзмітрый Абрамук – фігурант берасцейскай «карагоднай справы», распачатай па падзеях 13 верасня 2020 году, калі пратэстоўцы выйшлі на праезную частку, а іх разагнаў вадамёт.

Усім выстаўленыя абвінавачанні паводле арт. 342 («Актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак») Крымінальнага кодэксу РБ.

Суд Ленінскага раёну Берасця 15 сакавіка 2021 году вынес прысуды па дадзенай крымінальнай справе. Суддзя Дзмітрый Шурын асудзіў адразу восем чалавек, прызначыўшы ім пакаранне ад 1,5 года «хатняй хіміі» да 1 года і 8 месяцаў калоніі.

Дзмітрый Абрамук атрымаў 2 гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія») і пачаў адбываць пакаранне ў ПУАТ №9 Віцебска.

17 чэрвеня 2021 года ў Маскоўскім судзе Берасця суддзя Брэган разгледзеў другую справу ў дачыненні да палітвязня.

Дзяржабвінаваўца Ціхановіч агучыла версію абвінавачання: нецвярозы Абрамук патэлефанаваў у міліцыю на лінію 102 і абразіў Лукашэнку, чым здзейсніў злачынства па ч. 1 арт. 368 КК. Дзяржабвінавачанне запытала для мужчыны два гады абмежавання волі. З улікам неадбытага пакарання шляхам складання – прызначыць тры гады «хіміі». Прыгавор суддзі цалкам супаў з запатрабаваным бокам абвінавачання.

**27.11.2021** 26 лістапада суд Першамайскага раёну Віцебску завяршыў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні 45-гадовага прадпрымальніка Алега Дзмітрачэнкі. Суд прызнаў мужчыну вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) і прыгаварыў да аднаго года і шасці месяцаў абмежавання волі («хімія»). Прысуд агучыў суддзя Міхаіл Юрчанка. Пракуратура прасіла суд пакараць Дзмітрачэнку двума з паловай гадамі абмежавання волі.

Паседжанне 26 лістапада пачалося са спрэчкі бакоў. Прадстаўнік пракуратуры, агучыўшы свае аргументы, палічыў віну Дзмітрачэнкі цалкам даказанай. Пракурор папрасіў суд прызнаць Алега Дзмітрачэнку вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў і на падставе арт. 369 КК прызначыць яму пакаранне ў выглядзе двух гадоў і шасці месяцаў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Адвакат у сваім выступе прывёў шэраг змякчальных акалічнасцяў, якія, з яго пункту гледжання, мусяць паўплываць на канчатковы прысуд. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на тое, што ягоны падабаронны ў судовым паседжанні цалкам прызнаў віну, усвядоміў сур’ёзнасць сваёй памылкі і шчыра раскаяўся. Прасіў суд таксама ўлічыць і тыя акалічнасці, што Дзмітрачэнка раней не прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, рэгулярна выплачваў падаткі, мае праблемы са здароўем…

Настойваў улічыць заяву Сяргея Сташэўскага, які не мае намеру прыцягваць Дзмітрачэнку да крымінальнай адказнасці і не збіраецца настойваць на матэрыяльнай кампенсацыі маральнай шкоды.

Адвакат прасіў суд прызначыць Дзмітрачэнку пакаранне, не звязанае з ізаляцыяй ад грамадства.

У апошнім слове Алег Дзмітрачэнка, у прыватнасці, заявіў, што пры магчымасці гатовы прынесці асабістае прабачэнне пацярпеламу. Прасіў высокі суд праявіць гуманнасць і даць магчымасць прыносіць карысць грамадству, застаючыся на волі.

Пасля перапынку суд вынес свой вердыкт. За публічную абразу прадстаўніка ўлады на падставе арт. 369 КК суд Першамайскага раёну Віцебску прызначыў Алегу Дзмітрачэнку пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 1 год і 6 месяцаў з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.

Суд пастанавіў залічыць у тэрмін адбывання пакарання час утрымання пад вартай з 27 па 30 красавіка 2021 году з разліку адпаведнасці аднаго дня ўтрымання пад вартай двум дням

абмежавання волі. Меру стрымання суд пакінуў ранейшую – падпіска аб нявыездзе. Арышт, накладзены на маёмасць у сувязі з адсутнасцю матэрыяльных прэтэнзій з боку пацярпелага, суд адмяніў.

Пасля абвяшчэння прысуду суддзя Міхаіл Юрчанка патлумачыў асуджанаму, што ў выпадку парушэння адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання свабоды прадугледжаная замена пакарання на больш строгае, аж да пазбаўлення волі.

**27.11.2021** У пятніцу 26 лістапада ў Віцебску затрымалі актывіста, музыку і арганізатар культурніцкіх праектаў Уладзіміра Булаўскага. Яго змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ). З якой прычыны яго затрымалі, невядома. Як паведамілі сябры затрыманага, у ізалятар удалося перадаць цёплыя рэчы, але харчы не прынялі.

«Адвакат сказаў, што не прымаюць харчы і цыгарэты пры затрыманні на трое сутак. Калі ў панядзелак не выйдзе ці калі не будзе суду, то будзем разбірацца... Уладзімір Булаўскі ў СІЗА га Гагарына. Падрабязнасцяў не ведаю», – напісала 26 лістапада на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» віцяблянка Вольга Бізікава.

У верасні 2020 году Уладзімір Булаўскі быў асуджаны 8 сутак адміністрацыйнага арышту. Яго прызналі вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП) адразу па двух пратаколах.

**29.11.2021** Віцебскага актывіста і музыку Уладзіміра Булаўскага асудзілі яшчэ ў дзень затрымання 26 лістапада на 7 сутак адміністрацыйнага арышту. Як паведамілі праваабаронцы, Уладзімір Булаўскі прызнаны вінаватым у «непадпарадкаванні законнаму патрабаванню службовай асобы» (арт. 24.3 КаАП). Стала вядома, што 29 лістапада ў ізалятары часовага ўтрымання для Булаўскага прынялі перадачу.

Рашэнне аб пакаранні Уладзіміра Булаўскага адміністрацыйным арыштам прымаў суддзя Мікалай Атрахімовіч (суд Кастрычніцкага раёну Віцебску).

Уладзіміра Булаўскага затрымалі ў пятніцу 26 лістапада, пасля чаго змясцілі ў віцебскі ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ). Актывіст мае выйсці на волю 3 снежня.

У верасні 2020 году Уладзімір Булаўскі быў пакараны 8 суткамі адміністрацыйнага арышту. Яго прызналі вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП) адразу па двух пратаколах.

**29.11.2021** На думку працаўнікоў пракуратуры Віцебскай вобласці, з боку рэдакцыі аршанскага рэгіянальнага парталу ORSHA.EU меліся значныя парушэнні Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі». Нібыта праверкай ведамства былі выяўленыя факты размяшчэння на сайце інфармацыі, зместам якой была нанесеная шкода нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь.

Пракуратурай было ўстаноўлена, што ў некаторых артыкулах змяшчалася недакладная інфармацыя, якая негатыўна характарызуе грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне пасля заканчэння выбарчай кампаніі 2020 году.

Пракуратура палічыла, што гэтая інфармацыя была накіраваная на дыскрэдытацыю дзейнасці прэзідэнта РБ, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў.

Маўляў, на інтэрнет-рэсурсе сістэматычна размяшчаліся публікацыі, якія матывавалі грамадзян да ўдзелу ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах.

Аднак пасля праверкі пракуратурай не было дакладна паказана, якімі менавіта матэрыяламі было ўчыненае парушэнне патрабавання пп.1.3 п.1 арт.38 Закону аб СМІ. І акурат якую інфармацыю, распаўсюджаную аршанскім інтэрнэт-рэсурсам, трэба лічыць забароненай, накіраванай на прапаганду вайны і экстрэмісцкай дзейнасці ці якая змяшчала заклікі да такой дзейнасці.

Такі агульны падыход пракуратуры да забароны працы сайту носіць агульны валюнтарысцкі характар, не спрыяе слушнаму і аднастайнаму разуменню грамадзянамі патрабаванняў дзейных законаў. Гэтая акалічнасць не дазваляе аспрэчыць рашэнне ведамства ў судовым парадку, то бок пракуратура сама парушыла права грамадзянаў на разгляд у судзе законнасці абмежавання доступу да сайту «ORSHA.EU Аршанскі рэгіянальны партал».

Тым не меньш, па фактах выяўленых парушэнняў пракурор Віцебскай вобласці Ігар Украінец вынес пастанову аб абмежаванні доступу да інтэрнэт-сайту «ORSHA.EU Аршанскі рэгіянальны партал», якую хутка выканалі працаўнікі Міністэрства сувязі і інфармацыі.

**30.11.2021** Віцебскі абласны суд 30 лістапада разгледзеў апеляцыйную скаргу 46-гадовага Ігара Галубоўскага на рашэнне суду Першамайскага раёну, які пакараў яго абмежаваннем волі на 1 год і 6 месяцаў за каментар на адрас міліцыянта з Ганцавічаў Ігара Вольніча. Мужчына быў прызнаны вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК РБ). Ён ужо выплаціў «пацярпеламу» 1500 рублёў маральнай кампенсацыі.

Скаргу ў абласным судзе разглядала калегія пад старшынствам суддзі Галіны Урбановіч, у складзе таксама былі суддзі Яўген Буруноў і Дзяніс Губанаў.

Суд Першамайскага раёну Віцебску 14 верасня 2021 году прысудзіў кіроўцы дзяржаўнага прадпрыемства Ігару Галубоўскаму паўтара года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Па звестках суду, мужчына «21 чэрвеня 2020 году, знаходзячыся ў Віцебску і маючы намер на публічную абразу прадстаўніка ўлады – Ігара Вольніча, прадстаўніка аўтамабільнай інспекцыі, са свайго ўліковага запісу ў «Аднакласніках» на агуль надаступнай старонцы карыстальніка



Вольгі Карач пад публікацыяй у дачыненні да Вольніча публічна размясціў электронны тэкст – каментар». Гэты каментар, на думку абвінавачання, утрымліваў «ненарматыўную форму маўленчага выказвання, якая прыніжае аўтарытэт, гонар і годнасць асобы прадстаўніка ўлады Вольніча ў сувязі з выкананнем ім сваіх службовых абавязкаў».

«Усё наладзілася – і ў адзін момант можа абрынуцца»

У скарзе Ігар Галубоўскі зазначыў, што, хоць прызнаў цалкам сваю віну і раскаяўся, але лічыць прызначанае пакаранне занадта строгім. Таму прасіў прызначыць пакаранне, не звязанае з абмежаваннем волі – на паўтара года хіміі без накіравання ў папраўчую ўстанову. Патлумачыў, што выхоўвае малалетняга сына і робіць з ім урокі.

«Я ўчыніў злачынства несвядома, на эмоцыях, нават не задумваўся. Напісаў і забыўся пра гэта. І ўжо нагадалі мне пра гэта органы міліцыі, што я зрабіў усё не так, як трэба», – тлумачыў Ігар.

«У мяне сын малалетні, наладзілася ўсё. Працы не было. Працаваць пачаў. Усё наладзілася – і ў адзін момант можа ўсё абрынуцца», – звярнуўся ён да судовай калегіі.

Адвакат падаў два хадайніцтвы з месца працы – ад дырэктара і калектыву, у якіх Галубоўскі характарызаваўся як добры працаўнік. Калегі прасілі не адпраўляць яго на «хімію», бо ў гэтым выпадку яму давядзецца звольніцца з прадпрыемства.

Абаронца падтрымаў довады скаргі і заявіў, што «ўзнікае пытанне аб адпаведнасці прызначанага пакарання ступені цяжкасці злачынства». Таксама папрасіў калегію прызначыць пакаранне, не звязанае «з ізаляваннем ад грамадства». Звярнуў увагу, што яго падабаронны не з'яўляецца небяспечным злачынцам, а працуе і прыносіць карысць грамадству, не спрабаваў ухіліцца ад адказнасці.

Пракурор: «Падрываў аўтарытэт дзяржаўнага ладу»

Пракурор Антон Гарохаў заявіў, што рашэнне суду Першамайскага раёну правільнае, у ім улічаныя ўсе неабходныя акалічнасці. Заявіў, што падсуднаму і так была прызначаная палова ад максімальнага тэрміну. А таксама паведаміў, што «пасля пакідання featзнага роду каментароў, непахвальных, на адрас прадстаўнікоў улады, падрываецца аўтарытэт улады, а таксама – дзяржаўнага ладу». І папрасіў нічога не змяняць і пакінуць скаргу без задавальнення

Калегія параіўшыся, прыйшла да высновы, падтрымаць меркаванне пракурора і пакінуць прысуд без зменаў.

Гэта далёка не першы прысуд за каментары на адрас міліцыянта Вольніча. Так, 4 кастрычніка суд Першамайскага раёну Віцебску агучыў адразу два аднолькавыя рашэнні за падобныя каментары. Спачатку Аляксандр Шматаў быў прысуджаны да двух гадоў «хіміі», а пасля да такога ж тэрміну прыгаварылі Міхаіла Бердрікава. Яны таксама выказалі сваё стаўленне да дзеянняў супрацоўніка міліцыі на старонцы Вольгі Карач пад фотаздымкам Вольніча. На фатаграфіі быў подпіс: «Гэта я так спрытна прыціснуў да тратуару галаву мірнага дэманстранта падчас затрымання. Ігар Вольніч, працаўнік ДПС ДАІ г. Ганцавічы».

Карыстальнікі інтэрнэту абурыліся.

Пры затрыманні пратэстоўцаў супрацоўнік ДАІ Ігар Вольніч неапраўдана ўжываў гвалт – душыў каленам.

**30.11.2021** У Віцебскім абласным судзе 30 лістапада адбыўся разгляд апеляцыйнай скаргі Юліі Алейнік і яе адваката на рашэнне суду Кастрычніцкага раёну Віцебску, які аштрафаваў яе на 90 базавых велічыняў за надпіс «БЧБ Жыве» на каналізацыйным калектары ў Віцебску. Суддзя Сняжана Кіндзеева палічыла яе вінаватай у пашкоджанні маёмасці (арт. 341 КК РБ). Незадоўга да суду яе адлічылі з мастацка-графічнага факультэту («худграф») ВДУ.

На разгляд скаргі ў абласны суд Юлія Алейнік не пайшла. Патлумачыла, што ейная прысутнасць наўрад ці паўплывае на вынік. Рашэнне прымала калегія па крымінальных справах у складзе суддзяў Андрэя Прэйса і Ларысы Сініцынай.

На працэсе, які пачаўся 27 верасня ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску, Юлія заяўляла, што нанесла надпіс на каналізацыйным калектары, каб падтрымаць людзей, якія маюць такія ж погляды, як яна.

У сваёй скарзе таксама зазначыла, што, «робячы надпісы, ажыццяўляла сваё неад'емнае права на свабоду меркаванняў».

Дзяўчына спаслалася на Канстытуцыю і заявіла, што «сваімі дзеяннямі не замахвалася на інтарэсы дзяржаўнай і грамадскай бяспекі». Звярнула ўвагу суддзяў, што надпісы былі праз некалькі дзён зафарбаваныя, і на тое, што каналізацыйны калектар не з'яўляецца грамадскім месцам.

Аднак пракурор Аляксей Бізуноў меў супрацьлеглае меркаванне пра каналізацыйны калектар. Маўляў, ён знаходзіцца на балансе Віцебскага водаканалу, і міма яго ходзяць людзі. «Судом дакладна вызначана, што сэнсавы змест надпісаў скіраваны на прычыненне шкоды грамадскаму парадку і грамадскай маральнасці, зніжае эстэтычнае ўспрыманне названага аб'екта», – заявіў пракурор. І папрасіў калегію пакінуць прысуд суду Кастрычніцкага раёну без зменаў, а апеляцыйную скаргу адхіліць.

Пасля невялікага перапынку судовая калегія пастанавіла: «Прысуд у дачыненні Алейнік пакінуць без зменаў, а апеляцыйную скаргу абвінавачанай і яе абаронцы без задавальнення».

Надпіс «БЧБ Жыве» Юлія зрабіла 30 траўня на каналізацыйным калектары, размешчаным паміж вуліцай Праўды і праспектам Фрунзе ў Віцебску. «Водаканал», якому належыць гэты аб'ект, налічыў шкоду ў памеры 28 рублёў 17 капеек. Да пачатку працэсу дзяўчына кампенсавала заяўленую суму. Пасля прысуду яна заявіла, што прызначаны штраф у памеры 90 базавых велічыняў для яе «непад'ёмны» і дзе ўзяць грошы яна не ведае. З універсітэту яе адлічылі, з інтэрнату – выселілі.

**01.12.2021** 1 снежня ў праваабаронцы і былога палітвязня Міхаіла Жамчужнага адбыўся ператрус, у выніку якога супрацоўнікі следчых органаў забралі з кватэры электронныя прыстасаванні. Пасля ператрусу Жамчужнага адвезлі на допыт. Былы палітвязень кажа, што ў працэсе размовы следчыя згубілі да яго цікавасць, бо паказанні ён не даваў. Дапытвалі яго супрацоўнікі 3-га аддзелу ДФР па Віцебскай вобласці. Жамчужнага вызвалілі ў той жа дзень пасля абеду.

«У асноўным шукалі гаджэты, камп'ютары, дакументы якія б сведчылі, што я, на іх думку, з'яўляюся арганізатарам нейкіх экстрэмісцкіх фармаванняў, што я трымаю сувязь з замежжам, што фінансую гэтыя арганізацыі нейкім чынам. Нічога не знайшлі», – расказаў Міхаіл Жамчужны пасля вызвалення.

Па ягоных словах, гаджэты, якія ў яго забралі, былі абсалютна чыстыя. Напярэдадні ў Жамчужнага меўся адбыцца суд па прэвентыўным наглядзе, і ён добра да гэтага падрыхтаваўся.

Наконт допыту заўважыў, што ён быў «даволі працяглы і з правакацыямі».

«Нумары артыкулаў не запомніў, але а па іх змесце – гэта фінансаванне экстрэмісцкіх арганізацый і арганізацыя пратэстаў. Называлі шэраг прозвішчаў, якія я ніколі ў жыцці не чуў. Запытвалі, на што я жыву, хто мне дапамагае, хто мяне сустракаў з "зоны", хто фатаграфаваў, у якіх я чатах знаходжуся», – расказаў Жамчужны.

«Яны, канечне, разумелі, што з мяне пасля 11 гадоў адседкі нічога не даб'ешся, Пратакол я не падпісваў, паказанні не даваў, так і разышліся», – патлумачыў.

1 снежня праз допыт іператрус прайшоў таксама віцебскі актывіст Мікола Качурэц.

Стала вядома, што ён таксама ўжо на волі. Віцяблянін Уладзімір Кійко змог пазбегнуць ператруса і затрымання, ён на свабодзе.

**01.12.2021** У Віцебску ад самага ранку 1 снежня супрацоўнікі МУС прыходзілі з ператрусамі да віцебскіх актывістаў Міколы Качурца і Уладзіміра Кійко. Таксама не выходзіў на сувязь праваабаронца і былы палітвязень Міхаіл Жамчужны, у якога на 1 снежня быў прызначаны суд з нагоды зменаў патрабаванняў прэвентыўнага нагляду.

Пра тое, што да яго «ломяцца міліцыянты», актывіст Уладзімір Кійко сам паспеў паведаміць у сацыяльных сетках, пасля чаго сувязь з ім знікла. Ад самай раніца супрацоўнікі МУС прыйшлі і да віцябляніна Міколы Качурца. Пра гэта паведаміла ягоная жонка.

Як паведамляюць праваабаронцы, былі затрыманыя Уладзімір Кійко, Мікола Качурэц і Міхаіл Жамчужны. Праз некаторы час з тэлеграм-акаўнта Жамчужнага нам напісалі: «На званкі не адказваю. Я на волі». Удакладняем імнфармацыю.

Міхаіл Жамчужны паведаміў у 13.30, што толькі што выйшаў з допыту. У яго прайшоў ператрус. Ён на волі. «Паказанняў ніякіх не даваў. Беражыце сябе. Менск шукае арганізатараў і фінансістаў пратэстаў», - паведаміў Жамчужны.

Пасля 14.00 на сувязь з праваабаронцамі выйшаў Уладзімір Кійко. Па ягоных словах, да яго прыходзілі з ператрусам, але ён пазбег затрымання і ператрусу. Зараз знаходзіцца на волі.

Пазней стала вядома, што пасля вобшуку і ператрусу адпусцілі і Міколу Качурца.

Вобшукі і затрыманні адбываліся 1 снежня ва ўсёй краіне.

**02.12.20212** снежня 2021 году тэлеграм-канал вядомага беларускага палітолага і журналіста Арцёма Шрайбмана быў прызнаны экстрэмісцкім.

Адпаведную пастанову вынес суд Чыгуначнага раёну Віцебску. Рашэнне прымала суддзя Святлана Варатынская. Матэрыялы, па якіх было прынятае гэтае рашэнне, былі падрыхтаваныя сёмым упраўленнем (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК МУС РБ.

Палітолаг Арцём Шрайбман неаднаразова рабіў прагнозы на разьвіццё палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Палітычны аналітык у сваім тэлеграм-канале таксама камэнтуе дзеянні дзяржавы, у тым ліку рэпрэсіўныя.

Арцём Шрайбан нарадзіўся ў 1991 годзе ў Гомелі. Вучыўся ў гімназіі №71 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы. Быў узнагароджаны прэміяй спецыяльнага фонду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па працы з таленавітымі навучэнцамі. У 2014-м кончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і атрымаў званне бакалаўра па спецыяльнасці «Міжнароднае права». Чатыры гады вучыўся ў Лонданскай школе эканомікі, дзе быў атэставаны як Магістр па спецыяльнасці "Палітыка і камунікацыя".

3 чэрвеня 2021 году Арцём Шрайбман разам з сям’ёй з’ехаў з Беларусі ва Украіну. Сігналам для выезду стала згадка пра яго як аднаго з каардынатараў вулічных пратэстаў, якая было агучаная Раманам Пратасевічам на дзяржаўным канале ОНТ.

**04.12.2021** Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Андрэй Швед вынес пастанову аб абмежаванні доступу да сайта арганізацыі "Міжнародны Цэнтр Грамадзянскіх Ініцыятыў "Наш дом"", якую ўзначальвае ўраджэнка Віцебска палітык Вольга Карач.

Падставай, на думку Генпракурора стала тое, што рэдакцыяй сайта неаднаразова парушала патрабаванні законаў Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі" і “А супрацьдзеянні экстрымізму”.

Генпракуратура лічыць, што сайт МЦГІ "Наш дом" на працягу апошніх паўтара года агрэсіўна і бяздоказна крытыкаваліся грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі і яе кіраўніцтва.

Пракуроры ацанілі некаторыя матэрыялы, як накіраваныя на распальванне нацыянальнай варожасці або варожасці ў адносінах да грамадзян Расійскай Федэрацыі і яе кіраўніцтва, а асобных артыкулах убачылі свядомую дыскрэдытацыю ўзаемаадносін Беларусі і Расіі.

Больш за тое, Генпракурор Швед зрабіў адназначную выснову аб тым, што сайце «Нашага дома» сістэматычна размяшчалася недакладная альбо наўмысна скажоная інфармацыя. Праўда сваю выснову ён не даказвае публікацыямі спасылак на гэтыя матэрыялы.

Таксама пастановай устаноўлена забарона на тэрмін 6 месяцаў на аднаўленне доступу да ўказанага інтэрнет-рэсурсу па заяве яго ўладальніка.

Пастанову Генеральнага пракурора Шведа аператыўна выканала кіраўніцтва рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства па наглядзе за электрасувяззю "БелДІЭ".

**05.12.2021** 30 лістапада суд Кастрычніцкага раёну Віцебску не задаволіў просьбы Кастрычніцкага РАУС аб змяненні патрабаванняў прэвентыўнага нагляду ў дачыненні былога палітвязня Міхаіла Жамчужнага. Супрацоўнікі РАУС хацелі зрабіць рэжым нагляду больш жорсткім, бо, на іх думку, Жамчужны «не стаў на шлях выпраўлення» – парушыў на ровары правілы дарожнага руху. Суд палічыў патрабаванні міліцыянтаў неабгрунтаванымі.



Справу разглядаў суддзя Сяргей Будрэвіч. Сам Міхаіл Жамчужны на паседжанні не прысутнічаў.

18 студзеня 2021 году суд Горацкага раёну Магілёўскай вобласці ўстанавіў у дачыненні Міхаіла Жамчужнага прэвентыўны нагляд на 2 гады (Жамчужны выйшаў на волю 19 лютага). Былы палітвязень цягам гэтага тэрміну абавязаны 2 разы на месяц з'яўляцца для рэгістрацыі ў органы ўнутраных спраў. Яму таксама забараняецца наведваць крамы, кавярні і гандлёвыя палаткі ў мэтах набыцця алкагольных напояў.

Але наглядныя органы прыйшлі да высновы, што Міхаіл Жамчужны не стаў на шлях выпраўлення, бо 8 красавіка 2021 году быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху (арт. 18.20 КаАП) – яго папярэдзілі. З гэтай прычыны супрацоўнікі МУС падалі прадстаўленне ў суд з просьбай змяніць патрабаванні прэвентыўнага нагляду: з'яўляцца для рэгістрацыі ў АУС 4 разы на месяц у прызначаны час і не наведваць месцы правядзення масавых мерапрыемстваў.
На судзе старшая памочніца пракурора Віцебску Крысціна Мацвеева выказала меркаванне, што прадстаўленне Кастрычніцкага АУС не падлягае задавальненню. З пададзеных у суд матэрыялаў вынікае, што Жамчужны не чыніў парушэнняў правіл прэвентыўнага нагляду, хоць і атрымаў папярэджанне за парушэнне правілаў дарожнага руху.

«Учыненае Жамчужным адміністрацыйнае правапарушэнне, прадугледжанае ч.1 арт. 18.20 КаАП, не сведчыць аб неабходнасці абавязаць Жамчужнага не наведваць месцы масавых мерапрыемстваў», – гаворыцца ў пастанове суду.

Абавязак жа з'яўляцца ў органы для рэгістрацыі ад 1-го да 4-х разоў на месяц і так прапісаны ў заканадаўстве.

У сваёй пастанове суддзя Сяргей Будрэвіч прадстаўленне АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску пакінуў без задавальнення.

«Матэрыялы справы ўсяляк ад мяне хавалі – і міліцыянты, і суд. Гэтак і не далі. Наконт жа рашэння – яно чаканае. Бо я змагаўся, змагаюся і буду змагацца з незаконнымі прысудамі. Усе суддзі, пракуроры і следакі гэта ведаюць. З улікам, што цяперашняя сітуацыя нявечная, яны не хочуць падпасці пад люстрацыю», – пракаментаваў рашэнне суду былы палітвязень і праваабаронца Міхаіл Жамчужны.

**07.12.2021** 7 снежня суд Кастрычніцкага раёну Віцебску агучыў прысуд у справе, заведзенай на былога супрацоўніка МУС Аляксандра Жалязоўскага за абразу ў інтэрнэце прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). 50-гадовага віцябляніна прызналі вінаватым і асудзілі на тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Апроч таго, Жалязоўскі мусіць выплаціць пацярпеламу кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

Справу разбіраў суддзя Сяргей Будрэвіч. У якасці дзяржаўнага абвінаваўцы выступаў пракурор Шкурко. «Пацярпелы» – участковы міліцыянт з Бабруйску Андрэй Комар – на паседжаннях не прысутнічаў.

Паводле следства, Аляксандр Жалязоўскі ў чэрвені 2020 году пакінуў пад допісам у сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» каментар: «У яго на лбе напісана: мра...ь кончаная». У публікацыі, пад якой быў зроблены каментар, вялася гаворка пра міліцыянта з Бабруйску Андрэя Комара. «Гэта я даваў паказанні, каб невінаватых адправілі ў турму» – такі подпіс стаяў пад фотаздымкам Комара. На погляд абвінавачання, Жалязоўскі сваім каментаром пад допісам абразіў прадстаўніка ўлады пры выкананні ім службовых абавязкаў.

Абвінавачаны віны не прызнаў.

Адвакат Жалязоўскага падчас судовых спрэчак сцвярджаў, што каментар не меў канкрэтнага адрасату і што ягоны падабаронны не абражаў «прадстаўніка ўлады», а «эмоцыямі рэагаваў на тое, што аўтар допісу прыпісваў Комару». Прасіў суд цалкам апраўдаць віцябляніна.

У сваім апошнім слове Аляксандр Жалязоўскі прасіў даць яму апошні шанец.

«Апошнім часам усе ганяць суды і суддзяў. Я ж да апошняга веру, таму што сам служыў. Веру, што суды і суддзі робяць усё слушна. Дайце мне, калі ласка, апошні шанец...» – прасіў падсудны.

Суддзя Сяргей Будрэвіч прызнаў Жалязоўскага вінаватым у злачынстве, прадугледжаным арт. 369 КК, і цалкам задаволіў патрабаванні пракурора. Прысуд: тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Задаволеныя таксама пазоўныя патрабаванні «пацярпелага» Комара аб кампенсацыі маральнай шкоды. Жалязоўскі мусіць выплаціць яму 1000 рублёў.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў Віцебскім абласным судзе.

**08.12.2021** Стала вядома, што ў дачыненні былой журналісткі «Еўрарадыё» Юліі Матузавай следчыя органы распачалі крымінальную справу за нібыта дачыненне да каналу «Карнікі Беларусі». Міліцыянты правяліператрус у яе бацькоў у Наваполацку. Па якім артыкуле ідзе расследаванне, яны не паведамілі. Гэта першая крымінальная справа, заведзеная на журналістаў "Еўрарадыё".

7 снежня ў доме бацькоў Юліі Матузавай у Наваполацку работнікі УУС па Віцебскай вобласці правяліператрус і забралі тэхніку журналісткі. Па якім артыкуле распачатая справа, міліцыянты не паведамілі, але, верагодна,ператрус быў звязаны з яе прафесійнай дзейнасцю. У выніку быў канфіскаваны жорсткі дыск кампутара, планшэт і каляндар мастачкі Вольгі Якубоўскай з бчбкацянятамі.

Юлія ў размове з "Медыязонай" сказала, што не мае дачынення да працы ТГ "Карнікі Беларусі", які ад сакавіка 2021 году ўнесены ў спіс "экстрэмісцкіх матэрыялаў". Яна паведаміла, што не знаёмая з Соф'яй Сапегай, у дачыненні якой завершанае следства і якой выставілі злачынствы, звязаныя з распальваннем сацыяльнай варожасці, злачынства супраць інфармацыйнай бяспекі, пагрозы на адрас сілавікоў. Адзінае, што пацвярджае Юлія, гэта сваё знаёмства з Раманам Пратасевічам і Яўгенам Юшкевічам, але кажа, што ў іх палітычных справах, звязаных з пратэстамі, удзелу не брала.

Юлія Матузава скончыла журфак БДУ ў 2017 годзе, пасля па размеркаванні патрапіла ў газету «СБ. Беларусь сёння». Крыху болей года, да лістапад 2021 года, працавала на "Еўрарадыё". Цяпер жыве ў Гішпаніі.




**09.12.2021** Супрацоўнікі аддзелу прымусовага выканання Першамайскага раёну Віцебску 3 снежня арыштавалі і адабралі маёмасць і грошы бацькоў віцебскага актывіста Андрэя Кулакова – уладальніка легендарнага «Жывемабіля». Канфіскацыю правялі ў межах выканаўчага дакументу з патрабаваннем спагнаць з Кулакова 1160 рублёў штрафу, прысуджаных яму за «начны пікет» у верасні 2020 году. Андрэй Кулакоў, які знаходзіцца зараз за межамі краіны, назваў арышт маёмасці ягоных бацькоў рабаваннем.

Судовыя выканаўцы забралі ў бацькоў Андрэя Кулакова рэчы, ацэненыя імі на агульную суму 561 рубель, і грошы – 100 рублёў гатоўкай.

Акт арышту і канфіскацыі падпісала загадчыца сектарам аддзелу прымусовага выканання Першамайскага раёну Віцебску Святлана Багдановіч.

«Гэта грабеж. Таму што ім было добра вядома, што я па тым адрасе не пражываў, што там жывуць мае бацькі і што маёмасць, якую яны забралі, мне не належыць. Той жа тэлевізар, які канфіскавалі, быў выраблены 15 гадоў таму, калі мне было ўсяго 13. Ясна, што я не мог тады набыць для сябе гэтую плазму ва ўласнасць. Мозг уключыць – і зразумела, што гэта не мая маёмасць, а бацькоў», – кажа Андрэй Кулакоў.

«Судовыя выканаўцы не мелі ніякага права гэта ўсё канфіскоўваць і наагул уваходзіць у кватэру, таму што на той момант у іх не было яшчэ рашэння суду», – дадае.

Гэта выглядае тым больш дзіўна, што, як сцвярджае Кулакоў, ён цягам апошніх месяцаў штодзень спраўна гасіў запазычанасць па штрафе невялікімі сумамі – па 10, 20, 30 капеек. Па ягоных падліках, зрабіў ужо каля сотні плацяжоў. Мае дакументальнае пацверджанне таго, што гэтыя сумы залічваліся ў кошт доўга: з аддзелу прымусовага выканання на хатні адрас дасылаліся заказнымі лістамі справаздачы.

«Гэта нейкі дзяржаўны рэкет»
6 снежня бацькі Кулакова цалкам пагасілі запазычанасць па штрафе сына. Арышт, накладзены на маёмасць, быў зняты.

«Гэта нейкі дзяржаўны рэкет: забралі маёмасць, якая не належыць даўжніку, і вымаганнем прымусілі людзей аплачваць чужы штраф», – кажа Андрэй Кулакоў.

Бліжэйшымі днямі Кулакоў мае намер накіраваць у Першамайскі РАУС Віцебску заяву з просьбай правесці праверку па факце рабавання і перавышэння службовых паўнамоцтваў супрацоўнікамі аддзелу прымусовага выканання ды распачаць супраць іх крымінальную справу.

Андрэй Кулакоў – віцебскі актывіст, вядомы як уладальнік і кіроўца «Жывемабіля», які сваёй прысутнасцю падтрымліваў удзельнікаў мірных маршаў у Віцебску ў 2020 годзе. «Жывемабіль» некалькі разоў арыштоўвалі.

У верасні 2020 году на Андрэя Кулакову і віцяблянку Марыю Волкаву завялі адміністрацыйную справу за «начны пікет» у вёсцы Лучынаўка Віцебскага раёну. У кастрычніку справу ў дачыненні Кулакова спынілі, але ў чэрвені 2021-га перагледзелі і аштрафавалі паводле арт. 23.34 КаАП на 40 базавых велічынь. У лістападзе 2020 году яго таксама судзілі за сярэдні палец супрацоўнікам МУС (арт. 17.1 КаАП). Праз пераслед вымушаны быў пакінуць Беларусь.

**09.12.2021** Суд Наваполацку асудзіў 40-гадовага мясцовага жыхара на два з паловай года калоніі за тое, што падчас пратэставай акцыі ў жніўні 2020 году ён, па версіі следства, чыніў супраціў міліцыянту пры выкананні ім абавязкаў па ахове грамадскага парадку, пры гэтым нібыта ўжыў у дачыненні супрацоўніка МУС гвалт. Суд таксама пастанавіў выплаціць міліцыянту матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

Згодна з матэрыяламі справы, 9 жніўня 2020 году каля палацу культуры ААТ «Нафтан» мужчына, які знаходзіўся нібыта ў нецвярозым стане, браў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве. На неаднаразовыя законныя патрабаванні праваахоўнікаў спыніць супрацьпраўныя дзеянні не адрэагаваў. Пасля гэтага наблізіўся да пацярпелага, які ахоўваў грамадскі парадак, і паспрабаваў гвалтам сарваць з ягонага твару маску.

Паведамляецца, што падчас затрымання навапалачанін не падпарадкаваўся законным патрабаванням супрацоўніка і нанёс яму пабоі, пашкодзіўшы пры гэтым форменнае абмундзіраванне.

Дзяржаўнае абвінавачанне кваліфікавала дзеянні мужчыны па ч.2 арт.363 КК РБ («Супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак»). Суд пагадзіўся з пазіцыяй Наваполацкай пракуратурай, прызнаў мужчыну вінаватым і прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2 гады і 6 месяцаў з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Суд таксама пастанавіў спагнаць з абвінавачанага на карысць пацярпелага матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

На судовым паседжанні абвінавачаны віну не прызнаў.

Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў Віцебскім абласным судзе.

**11.12.2021** 27 жніўня 2021 году адміністрацыя Чыгуначнага раёну Віцебску пачала ліквідацыю прыватнай выдавецкай ўстановы «Рэдакцыя газеты «Віцебская трыбуна». Аб прычынах і законных падставах ліквідацыі ўлады не паведамляюць. Цягам 17 гадоў, паводле нейкіх дзіўных бюракратычных законаў, рэдакцыя «Віцебскай трыбуны» не была закрытая. І толькі зараз, калі ў краіне адбываецца татальнае знішчэнне незалежных СМІ і сектара недзяржаўных грамадскіх арганізацый, улады ўспомнілі і пра «Віцебскую трыбуну».

«Віцебская трыбуна» было зарэгістраваная 13 сакавіка 2001 году рашэннем Віцебскага аблвыканкаму. А ўжо 15 лютага 2004 году ўлады пазбавілі ліцэнзіі газету «Віцебская трыбуна» – у той час адзінае недзяржаўнае выданне ў Воршы і Аршанскім раёне.

Як пісалі ў той час праваабарончыя выданні, «пра пазбаўленні ліцэнзіі калектыў рэдакцыі даведаўся, калі прыйшоў час аднаўляць дамову з друкарняй». Паведамлялася, што ў друкарню дакумент аб пазбаўленні ліцэнзіі прыйшоў поштай яшчэ ў сярэдзіне лютага, аднак рэдактару «Віцебскай трыбуны» Сяргею Серабра аб пазбаўленні ліцэнзіі не паведамілі. Тым самым пазбавіўшы яго права абскардзіць адпаведную пастанову Міністэрства інфармацыі ў судзе.

Міністэрства патлумачыла, што падставай для пазбаўлення ліцэнзіі была ліквідацыя заснавальніка выдання – Віцебскага Цэнтру моладзевых ініцыятыў «Контур».

Але «Контур» быў ліквідаваны яшчэ ў 2003 годзе, а пастанова аб пазбаўленні ліцэнзіі з'явілася толькі праз сем месяцаў. На думку рэдактара газеты, выданне пазбавілі ліцэнзіі за падтрымку акцыі пратэсту віцебскіх прадпрымальнікаў: на сайце газеты змяшчалася хроніка іх галадоўкі, фотаздымкі ды іншыя матэрыялы. Галадоўка доўжылася з 2 па 14 лютага і роўна праз дзень пасля гэтага ліцэнзія «Віцебскай трыбуны» была скасаваная.

Цягам 17 гадоў, паводле нейкіх дзіўных бюракратычных законаў, установа «Рэдакцыя газеты «Віцебская трыбуна» не была закрытая.

І толькі зараз, калі ў краіне адбываецца татальнае знішчэнне незалежных СМІ і сектара недзяржаўных грамадскіх арганізацый, улады ліквідавалі і рэдакцыю газеты «Віцебская трыбуна».

**12.12.2021** 10 снежня судом Наваполацка быў вынесены абвінаваўчы прысуд у дачыненні да 35-гадовага жыхара Наваполацка. Суд палічыў даказаным, што ён, у жніўні 2020 года, удзельнічаў у горадзе нафтавікоў у сутыкненнях з міліцыяй і прымяніў гвалт у дачыненні да супрацоўніка мясцовага АУС.

Падчас судовага следства былі разгледжаны матэрыялы справы, паводле якіх абвінавачаны, 10 жніўня 2020 года на адной з вуліц Наваполацка ў нецвярозым стане пратэставаў супраць фальсіфікацыі вынікаў галасавання на прэзідэнцкіх выбарах.

Падчас сутычкі з работнікамі міліцыі ён нанёс аднаму з іх, пацярпеламу, рукамі не менш за чатыры ўдары ў галаву. Такім чынам падсудны прычыніў траўмы міліцыянеру ў выглядзе пералому касцей носа, сінякоў правага вока і ранак.

У судовым паседжанні абвінавачаны прызнаў віну і прынёс прабачэнні пацярпеламу праваахоўніку і растлумачыў суду, што ўдзельнічаў у пратэсце выпадкова і па цікаўнасці.

Суд Наваполацка пагадзіўся з пазіцыяй боку пракурора па кваліфікацыі дзеянняў падсуднага па арт. 364 (Гвалт або пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў) КК РБ і прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 4 гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Акрамя таго, на карысць пацярпелага з навапалачан судом спагнана матэрыяльнае пакрыццё маральнай шкоды ў памеры 5000 рублёў.

Пазбегнуць максімальнага пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі да сямі гадоў, падсуднаму дапамагло прызнанне віны і наяўнасці на ўтрыманні малалетніх дзяцей.

**13.12.2021** 10 снежня 2021 году калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду ў складзе старшыні – суддзі Дзяніса Губанава, суддзяў Святланы Івановай і Ларысы Сініцынай разгледзела апеляцыйную скаргу асуджанага і прызнанага праваабаронцамі палітвязнем Сяргея Іванова. Калегія не знайшла з боку суду першай інстанцыі парушэнняў матэрыяльнага і працэсуальнага законаў. І прыняла рашэнне скаргу палітвязня пакінуць без задавальнення, а рашэнне суду Віцебскага раёну – без зменаў.

Падчас разгляду скаргі суддзі калегіі Дзяніс Губанаў, Святлана Іванова і Ларыса Сініцына пагадзіліся, што ў дзеяннях Сяргея Іванова ўгледжваюцца прыкметы блакавання транспартных камунікацый (шляхам стварэння перашкод, усталявання пастоў ці іншым спосабам), дастатковыя для кваліфікацыі іх як крымінальнага злачынства. Суд адмовіўся прымаць довады абароны пра тое, што ў дзеяннях Іванова няма складу злачынства, і тое, што ён аплаціў матэрыяльную шкоду «Беларускай чыгунцы».

Прысуд набыў законную моц. Іванова накіруюць у папраўчую калонію, дзе ён будзе, паводле прысуду па ч. 1 арт. 14, ч. 1 арт. 309 Крымінальнага кодэксу, адбываць пакаранне ў выглядзе трох гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму.

**14.12.2021** 14 снежня суд Полацкага раёну працягнуў разбор крымінальнай справы па абвінавачванні Руслана Слуцкага ў замаху на прывядзенне ў непрыдатнасць чыгуначных шляхоў зносін (ч. 1 арт. 14, ч. 1 арт. 309 КК), а таксама ў акце тэрарызму (ч. 1 арт. 289 КК). Справу разглядае суддзя Андрэй Дзергачоў і два народныя засядацелі, дзяржаўнае абвінавачванне падтрымлівае Таццяна Шабека.

На лаве падсудных — 38-гадовы жыхар Наваполацка, рамеснік Руслан Слуцкі. Ён быў затрыманы 20 студзеня, а 23 студзеня ў адносінах да яго абраная мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту.

Паводле версіі абвінавачання, мужчына нанёс шкоду не менш як чатыром аўтамабілям, агульны памер шкоды склаў 63 рублі 51 капейка. Пацярпелымі па справе прызнаныя ўдзельнікі аўтапрабегу: Азаронак, Башкірцаў, Багдановіч, Гаўрош, Гацік, Войцік, Герашчанка, Гіль, Громаў, Громаў, Дзёміна, Святаслаўскі, Дудараў, Ягораў, Ягорава, Яськоў, Жызнеўскі, Зарубіцкі, Казак, Карась, Качан, Клімаў, Клыга, Кавалёва, Канавалава, Красоўскі, Кулага, Кулік, Латышкевіч, Лепановіч, Матур, Мяшукоў, Осіпава, Павярховіч, Пёрышкін, Раманоўскі, Семчанка, Сабалеўская, Сташэўская, Сцягашова, Троцкі, Фядотаў, Фелісаў, Хрыстафораў. Агулам пацярпелымі па справе прызнана больш за 70 грамадзянаў, якія ўдзельнічалі ў аўтапрабегу.

Руслан Слуцкі віну прызнаў часткова.

У першы дзень судовага разгляду 13 снежня ў справе былі апытаныя 12 пацярпелых, ніводны з іх не заявіў пазоўныя патрабаванні аб спагнанні кампенсацыі маральнай шкоды.

Пацярпелыя распавядалі, што арганізатарамі аўтапрабегу выступілі тры гарадскія структуры: «Белая Русь», «Федэрацыя прафсаюзаў» і БРСМ. Падчас руху ўдзельнікі аўтапрабегу абменьваліся інфармацыяй з дапамогай радыёстанцый і мабільнай сувязі. Інфармацыя пра аўтапрабег анансавалася як у працоўных калектывах, гэтак і ў сацыяльных сетках. Некаторыя пацярпелыя адзначалі, што аўтапрабег праводзіўся адразу пасля смерці Рамана Бандарэнкі, у сувязі з чым на месцы іх збору збіраліся людзі з бчб-сімволікай, а таксама журналісты.

На пытанне прадстаўніка дзяржаўнага абвінавачвання пра мэты аўтапрабегу адзін з пацярпелых растлумачыў свае дзеянні наступным чынам: «Быў час выказаць грамадзянскую пазіцыю, неспакойны час быў, грамадзянская пазіцыя за нашу Беларусь».

Пацярпелыя распавядалі суду, што ім стала вядома пра тое, што аўтамабілі, якія рухаліся першымі ў калоне, наехалі на шыпы ў сувязі з тым, што яны зменшылі хуткасць і спынілі рух транспартных сродкаў, прыпаркаваўшы іх справа на ўзбочыне. Першыя два аўтамабілі належалі мясцовым рэгіянальным СМІ, яшчэ адзін – аднаму з кіраўнікоў грамадскай арганізацыі «Патрыёты Беларусі».

Пракурорка цікавілася ў пацярпелых, якія маюць стаж кіравання аўтамабілем, пра магчымыя наступствы наезду машыны, што рухаецца на хуткасці 60-70 км/г, на раскіданыя шыпы і «вожыкі». Адзін з кіроўцаў адзначыў, што наступствы могуць быць розныя, можа змяніцца траекторыя руху аўтамабіля, у залежнасці ад гэтага магло адбыцца ўсё што заўгодна: з'езд у кювет, выезд на праезную частку з наступным дарожна-транспартным здарэннем. Некаторыя кіроўцы, спасылаючыся на шматгадовы стаж кіравання аўтамабілем, адзначалі, што «гэта справа выпадку, залежыць ад абстаноўкі і якасцяў кіроўцы, ягонага досведу».

На пытанне пра тое, якая рэакцыя ва ўдзельнікаў аўтапрабегу была на інфармацыю пра раскіданыя на іх дарозе «вожыкі», пацярпелыя нешматслоўна адказвалі, што некаторыя адчувалі злосць, наогул негатыўна ўспрынялі дадзеныя звесткі, хоць і чакалі перашкодаў у руху. Пацярпелыя адзначалі, што кіроўцы аўтамабіляў, якія былі пашкоджаныя ў выніку наезду на шыпы і «вожыкі», засталіся на ўзбочыне рамантаваць транспартныя сродкі; асноўная частка ўдзельнікаў аўтапрабегу працягнула рух. На ўдакладняльнае пытанне дзяржаўнай абвінаваўцы пра тое, ці не чулі пацярпелыя, каб хтосьці выказваў сумнеў, ці варта працягваць аўтапрабег, пацярпелыя адказвалі адмоўна.

Абарона абвінавачанага ўдакладняла ў пацярпелых, якія кіравалі транспартнымі сродкамі, ці можна было заўважыць раскіданыя «вожыкі» і шыпы на праезнай частцы. Кіроўцы тлумачылі, што зрабіць гэта было складана, бо гэтаму перашкаджалі пахмурнае надвор'е і колер металічных прадметаў, падобны да асфальтавага пакрыцця.

Судовы разгляд працягнецца 15 снежня, у судовае пасяджэнне выклікаюцца пацярпелыя.

Плануецца, што разгляд справы зойме не менш за два тыдні.

**16.12.2021** 26 лістапада на інтэрнэт-сайце Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь з'явілася паведамленне аб тым, што па рашэнні пракурора Віцебскай вобласці Ігара Украінца ад 23 лістапада абмяжоўваецца доступ да інтэрнэт-сайту «ORSHA .EU Аршанскі рэгіянальны партал». Каб высветліць прычыны блакіроўкі, уладальнік парталу праваабаронца Ігар Казмерчак звярнуўся ў абласную пракуратуру.

У сваім звароце Ігар Казмерчак прасіў пазначыць артыкулы, у якіх змяшчалася недакладная інфармацыя, якая негатыўна характарызуе грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне пасля заканчэння выбарчай кампаніі 2020 году. Таксама прасіў назваць матэрыялы, змест якіх быў накіраваны на дыскрэдытацыю дзейнасці прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў. І пералічыць артыкулы, змест якіх матываваў грамадзян да ўдзелу ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах.

Апроч таго, у сваім звароце ў пракуратуру Казмерчак указаў пракурору на тое, што блакаванне сайту з'яўляецца прамым парушэннем канстытуцыйных правоў грамадзян па распаўсюд і атрыманне інфармацыі. Праваабаронцу адказаў намеснік пракурора Віцебскай вобласці Уладзімір Гук.

«Па выніках аналізу інфармацыйнай прадукцыі, размешчанай на інтэрнэт-сайце пад назвай «ORSHA.EU Аршанскі рэгіянальны партал», устаноўленыя парушэнні патрабаванняў падп. 2.3, 2.5 п. 2 арт. 30-1 Закону аб СМІ, якія выявіліся ў тым, што на дадзеным інтэрнэт-сайце сістэматычна дапускаліся факты размяшчэння інфармацыі, якая не адпавядае рэчаіснасці, ганьбіць дзелавую рэпутацыю дзяржаўных органаў і здольная нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь», - напісаў у адказе Гук.

З пракуратуры на электронную ўладальніка рэсурсу была высланая таксама копія пастановы аб абмежаванні доступу да парталу. У пастанове прапісаныя назвы і даты васьмі матэрыялаў, апублікаваных у 2020-м і 2021-м гадах. Аўтары тых тэкстаў распавядалі пра працу дзяржаўных органаў і арганізацый, выбарчых камісіяў падчас апошняй электаральнай кампаніі і аб пратэстах пасля падліку галасоў.

У пастанове, аднак, не ўказваецца, якія пададзеныя ў артыкулах факты, на думку пракуратуры, трэба лічыць не адпаведнымі рэчаіснасці, а якія - дыскрэдытуюць уладу.

Нечаканай для рэдактара стала і інфармацыя пра тое, што цягам 6 месяцаў уладальнік сайту не можа аднавіць доступ да яго. Механізм узнаўлення працы партала пракуратура не патлумачыла.

**16.12.2021** 4 снежня ў Санкт-Пецярбургу адбыўся суд аб абранні меры стрымання да экстрадыцыі ў Беларусь 24-гадовай жыхаркі Віцебску Яны Пінчук. На думку адваката, дзяўчына будзе знаходзіцца ў СІЗА-5 у Санкт-Пецярбургу мінімум да сярэдзіны снежня. Пасля пракуратура будзе вырашаць яе лёс і пытанне аб экстрадыцыі ў Беларусь.

Па дадзеных следства, 24-гадовая жыхарка Віцебска з верасня 2020 году па лістапад 2021-га ў месэнджэры Telegram адміністравала тры каналы.

Следства лічыць, што Яна Пінчук, дзейнічаючы з іншымі асобамі, збірала і размяшчала ў каналах персанальную інфармацыю грамадзян, публікавала паведамленні, у якіх змяшчаліся заклікі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнай змене канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, размяшчала ў дачыненні пацярпелых заведама ілжывыя звесткі, якія іх зневажаюць, абвінавачванні ва ўчыненні злачынстваў.

25 сакавіка 2021 году рашэнням суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Святланы Варатынскай прадукцыя гэтых каналаў прызнаная экстрэмісцкімі матэрыяламі.

Цяпер адносіна дзяўчыны распачатыя і расследуюцца крымінальныя справы па ч.3 арт.130 (распальванне сацыяльнай варожасці і варожасці, учыненыя групай асоб); арт.188 (паклёп); ч.3 арт.203-1 (незаконныя дзеянні ў адносінах да персанальных даных іншай асобы); ч.3 арт.361 (заклікі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, ажыццяўленню дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, учыненыя з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт); ч.1 і ч.2 арт.361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання і кіраўніцтва ім) КК Рэспублікі Беларусь.

Зараз усе эпізоды справы злучаныя ў адну вытворчасць, а саўдзельнікі па справе Яны Пінчук знаходзяцца ў вышуку.

**17.12.2021** Супрацоўнікаў міліцыі цікавіла, ці наведвае актывітска тэатральныя пастаноўкі віцебскага тэатра імя Якуба Коласа, і ці яна глядзела спектакль “Ціль”, што быў зняты з рэпертуару адразу ж пасля прэм’еры 21-га лістапада. А таксама ці не брала яна ўдзел у “партызанскай” акцыі салідарнасці са звольненым дырэктарам і акцёрамі, якія страцілі працу пасля ўдзелу ў пастаноўцы. Паведамляе Беларускае Радыё Рацыя.

Афіцыйнай прычыны, чаму спектакль “Ціль” быў зняты з рэпертуара, шырокай публіцы не паведамляюць.

Ёсць меркаванне, што чыноўнікам не спадабаўся радок з песні “Жыве Фландрыя!”, якая гучала са сцэны. Неўзабаве пасля з’яўлення інфармацыі пра звальненне дырэктара тэатра Аляксандра Старых і некалькіх акцёраў , у інтэрнэце з’явіліся фотаздымкі з акцыі салідарнасці: людзі ў масках з бел-чырвона-белымі сцягамі трымаюць плакат з тымі самымі словамі “Жыве Фландрыя!” Літаратурнай асновай для п’есы “Ціль” быў вядомы раман бельгійскага пісьменніка Шарля дэ Кастэра “Легенда пра Уленшпігеля”. Гэты твор расказвае пра барацьбу фламандцаў супраць іспанскага валадарства ў XVI стагоддзі, якая завяршылася вызваленнем сучасных Нідэрландаў. Верагодна, цяперашнія чыноўнікі ўбачылі ў пастаноўцы паралелі з сённяшняй палітычнай сітуацыяй у Беларусі.

**17.12.2021** Год таму жыхар Полацку Анатоль Каханчык пафарбаваў бацькоўскую хату ў вёсцы Алёшча Полацкага раёну ў нацыянальныя колеры: намаляваў на сценах дзве белыя і чырвоную палосы, а ў акне павесіў Пагоню. За такую расфарбоўку ў лютым 2021 году Каханчыка прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці (на той момант – арт. 23.34 КаАП) і асудзілі на 7 сутак. Ужо ў лістападзе, калі адбываў чарговы арышт, следчыя прыгразілі яму крымінальнай справай, калі не перафарбуе дом. Пра гэта піша Беларускае Радыё Рацыя.

«Мяне выклікалі, калі я сядзеў, да следчага. Следчы паказаў мне стос папер, сказаў, што рыхтуецца супраць мяне крымінальная справа за злоснае хуліганства, калі я не перафарбую сваю хату. Я сказаў, што ледзь толькі вы распачняце крымінальную справу або адміністратыўную, я ў той самы дзень і ў тую самую гадзіну пішу заяву на сухую галадоўку», – расказаў выданню Анатоль Каханчык.

Бел-чырвона-белая хата даўно муляе вока мясцовым уладам. Старшыня Маласітнянскага сельсавету неаднаразова звяртаўся ў міліцыю з гэтае нагоды. І аднойчы ноччу на падворку хаты Анатоля Каханчыка з’явіліся невядомыя людзі, якія зафарбавалі карычневым колерам чырвоную паласу паміж дзвюх белых. А герб Пагоня, які быў вывешаны ў акне, запэцкалі карычневай фарбай проста па шкле звонку. Вярнуўшыся пасля арышту, Анатоль Каханчык аднавіў першапачатковую расфарбоўку. І суседзі зноўку бачылі, як старшыня сельсавету Леанід Буханцоў чарговы раз фатаграфаваў яе з розных бакоў.

**17.12.2021** Напачатку снежня 2021 году па рашэнні судоў Віцебску 7 тэлеграм-каналаў і 3 друкаваныя выданні былі залічаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Пры гэтым суды скарысталіся правам дапусціць неадкладнае выкананне сваіх рашэнняў, бо нібыта «прамаруджванне можа прывесці да значнай шкоды для пазоўніка або зрабіць немагчымым самое выкананне».

Так, рашэннем суддзі суда Чыгуначнага раёну Віцебску Святланай Варатынскай ад 2 снежня 2021 году былі аднесеныя да экстрэмісцкіх telegram-канал і друкаванае выданне пад назвай «Сумленная газета», telegram-канал «Віцебскі Веснік», Telegram-чат «Віцебскі веснік» і друкаванае выданне «Віцебскі веснік».

У гэтым шэрагу аказаўся інтэрнэт-рэсурс «Рэальныя навіны» і друкаванае выданне «Рэальныя навіны» грамадскага руху «Краіна для жыцця», а таксама telegram-канал «Shraibman».

У той самы дзень судом Кастрычніцкага раёну Віцебску прызнаныя небяспечнымі для дзяржавы і грамадства telegram-канал«-ОТПОР-» і telegram-група з назвай «КУСЬ ЗА БЕЛАРУСЬ».

Днём раней гэтым жа судом telegram-канал з назвай «Крытыка чыстага розуму» быў прылічаны да ліку экстрэмісцкіх.

Зыходзячы з таго, што рэпрэсіі ў дачыненні да інтэрнэт-СМІ працягваюцца больш за паўтара года і ганенням на крыніцы, якія распаўсюджваюць альтэрнатыўныя палітычныя думкі, не відаць канца, можна сцвярджаць, што гэта не апошнія інфармацыйныя рэсурсы, якія будуць прызнаныя віцебскімі судамі экстрэмісцкімі.

**20.12.2021** 8 снежня 2021 году з ініцыятывы ўпраўлення юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэту Віцебскі абласны суд ліквідаваў дзве некамерцыйныя арганізацыі: «Наваполацк. Чарнобыль-цэнтр» і «Моладзевы культурна-адукацыйны цэнтр «Ростань». Толькі ў другім паўгоддзі 2021 году з ініцыятывы выканаўчых уладаў вобласці былі закрытыя 28 грамадскіх арганізацыяў і некамерцыйных установаў.

Гэтак, ліквідаванае судом ГА МКАЦ «Ростань», садзейнічала сацыяльнай абароне моладзі Віцебску, адраджала мову і культуру беларусаў, аказвала падтрымку моладзеваму актывізму. Гэтая арганізацыя ў 2006-м і 2007-м гадах паспяхова рэалізавала ў абласным цэнтры праект «Моладзевы рух у барацьбе супраць СНІДу». У межах гэтага праекту для маладых віцяблян праводзіліся навучальныя трэнінгі «Асновы ведаў па ВІЧ/СНІД», «Наркаспажыванне і ВІЧ/СНІД», «ІППШ, як фактар рызыкі заражэння ВІЧ/СНІД», «Жыццё з ВІЧ», « Стыгма і дыскрымінацыя».

Быў таксама выдадзены зборнік інфармацыйна-практычных матэрыялаў »Прафілактычная праца ў школе па праблеме ВІЧ/СНІД«, календары і плакаты па праблеме ВІЧ/СНІДу.

У іншай закрытай уладамі грамадскай арганізацыі «Наваполацк. Чарнобыль – дапамога» была вельмі вузкая спецыялізацыя. Усе намаганні членаў гэтай арганізацыі былі накіраваныя на аказанне медычнай, юрыдычнай і іншай спецыялізаванай дапамогі і на падтрымку людзей, якія пацярпелі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Цяпер чарнобыльцы Полаччыны будуць вымушаныя вырашаць свае надзённыя праблемы без дапамогі грамадскага аб'яднання, засталіся сам-насам са сваімі болямі і бедамі.

«Мяне здзіўляе згодніцкая пазіцыя дэпутатаў віцебскіх гарадскога і абласнога Саветаў у сувязі з парушэннем выканкамамі правоў выбарцаў на стварэнне грамадскіх арганізацыяў і ўдзел у іх. На мой погляд, кіраўніцтва саветаў усіх узроўняў павінны ў тэрміновым парадку склікаць пазачарговыя сесіі дэпутатаў. Дэпутаты, у абарону правоў усіх выбарцаў, павінны прыняць рашэнне аб спыненні органамі выканаўчай улады практыкі ліквідацыі грамадскіх арганізацыяў. Бо публічныя аб’яднанні людзей з’яўляюцца асновай грамадзянскай супольнасці, апірышчам для ўладаў у дэмакратычнай дзяржаве», – даў ацэнку сітуацыі праваабаронца Павел Левінаў.

**20.12.2021** Пра затрыманне гаспадара бел-чырвона-белай хаты Анатоля Каханчыка паведамілі 20 снежня праваабаронцы «Вясны». Паведамляецца, што яго затрымалі, калі ён сам пайшоў у аддзяленне міліцыі па позве. Раней Каханчыку пагражалі крымінальнай справай, калі ён не перафарбуе БЧБ-хату ў нейтральныя колеры.

«Жыхар Полацку Анатоль Каханчык быў затрыманы, калі прыйшоў па позве ў міліцыю. Па папярэдняй інфармацыі, ён трымае сухую галадоўку», – паведамляюць праваабаронцы. Раней мужчыне пагражалі крымінальнай справай, калі ён не перафарбуе сваю хату ў нейтральныя колеры.

У 2020 годзе Анатоль Каханчык пафарбаваў бацькоўскую хату ў вёсцы Алёшча Полацкага раёну ў нацыянальныя колеры: намаляваў на сценах дзве белыя і чырвоную палосы, а ў акне павесіў Пагоню.




За такую расфарбоўку ў лютым 2021 году Каханчыка прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці (на той момант – арт. 23.34 КаАП) і асудзілі на 7 сутак. У лістападзе яго зноў судзілі і прызналі вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкай інфармацыі (арт. 19.11 КаАП) - пакаралі за гэта 15 суткамі адміністрацыйнага арышту.

Калі адбываў арышт, следчыя прыгразілі яму крымінальнай справай, калі не перафарбуе дом. «Мяне выклікалі, калі я сядзеў, да следчага. Следчы паказаў мне стос папер, сказаў, што рыхтуецца супраць мяне крымінальная справа за злоснае хуліганства, калі я не перафарбую сваю хату. Я сказаў, што ледзь толькі вы распачняце крымінальную справу або адміністратыўную, я ў той самы дзень і ў тую самую гадзіну пішу заяву на сухую галадоўку», – расказваў Анатоль Каханчык.

**21.12.2021** Жыхары Віцебску Віталь і Уладзіслаў Кузнечыкі, якія ўжо больш за год жывуць у пасольстве Швецыі ў Менску, падалі скаргу ў Камітэт супраць катаванняў. Пра гэта распавёў абаронца Кузнечыкаў юрыст Вадзім Драздоў. Камітэт супраць катаванняў абавязаў амбасаду Швецыі зрабіць неабходныя захады для забеспячэння асабістай недатыкальнасці заяўнікаў, пакуль іх скарга не будзе разгледжаная камітэтам.

У сярэдзіне кастрычніка 2021 году Сакратарыят упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека атрымаў ліст ад Камітэту супраць катаванняў наконт сітуацыі з Кузнечыкамі.

У сваім звароце да міжнароднай праваабарончай арганізацыі Віталь і Уладзіслаў Кузнечыкі паведамляюць, што калі яны будуць выдвараныя з тэрыторыі шведскай амбасады, то будуць затрыманыя беларускай міліцыяй, якая практыкуе жорсткае і бесчалавечнае стаўленне да апанентаў улады.

Камітэт супраць катаванняў скаргу прыняў да разгляду і абавязаў амбасаду Швецыі зрабіць неабходныя захады для забеспячэння асабістай недатыкальнасці заяўнікаў, пакуль іх скарга не будзе разгледжаная Камітэтам.

У скарзе Кузнечыкі прыводзяць факты рэпрэсіяў, якія пачаліся пасля мірнага маршу 6 верасня 2020 году ў Віцебску. Тады ў дачыненні абодвух Кузнечыкаў міліцыя распачала адміністрацыйную справу за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Пасля праверкі па факце нападу на супрацоўнікаў міліцыі ў дачыненні бацькі і сына следствам 15 верасня было вылучанае абвінавачанне ў межах крымінальнай справы паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка органаў унутраных спраў»). Па гэтым артыкуле ім пагражае пакаранне да 7 гадоў пазбаўлення волі.

Усведамляючы перспектыву стаць зняволенымі, яны 22 верасня 2020 году пералезлі праз агароджу і апынуліся на тэрыторыі амбасады Швецыі ў Менску. Амбасада, з меркаванняў гуманнасці, дала Кузнечыкам часовы прытулак ад пераследу з боку беларускіх карных органаў.

У будынку амбасады ім выдзелілі пакой, у якім ёсць усё неабходнае для нармальнага жыцця. Харчы Кузнечыкам купляюць супрацоўнікі пасольства, ежу яны гатуюць сабе самі. Са сваякамі віцябляне не бачыліся ўжо 15 месяцаў, але маюць магчымасць размаўляць з імі па відэасувязі.

**21.12.2021** 21 снежня гаспадара БЧБ-хаты ў вёсцы Алёшча Полацкага раёну Анатоля Каханчыка прызналі вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 24.23 КаАП) і асудзілі на 25 сутак адміністрацыйнага арышту. Суд Полацку і Полацкага раёну вырашыў, што Каханчык зладзіў «несанкцыянаванае пікетаванне», пафарбаваўшы свой дом у Алёшчы ў бел-чырвона-белыя колеры. Перафарбоўваць яго мужчына катэгарычна адмовіўся.

Пра прысуд Анатолю Каханчыку паведамілі праваабаронцы «Вясны». Паводле папярэдняй інфармацыі, Анатоль Каханчык абвясціў сухую галадоўку.

Анатоль Каханчык быў затрыманы 20 снежня. Яго затрымалі, калі ён сам пайшоў у аддзяленне міліцыі па позве. Раней Каханчыку пагражалі крымінальнай справай, калі ён не перафарбуе БЧБ-хату ў нейтральныя колеры.

У 2020 годзе Анатоль Каханчык пафарбаваў бацькоўскую хату ў вёсцы Алёшча Полацкага раёну ў нацыянальныя колеры: намаляваў на сценах дзве белыя і чырвоную палосы, а ў акне павесіў Пагоню. За такую расфарбоўку ў лютым 2021 году Каханчыка прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці (на той момант – арт. 23.34 КаАП) і асудзілі на 7 сутак. У лістападзе яго зноў судзілі і прызналі вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкай інфармацыі (арт. 19.11 КаАП) - пакаралі за гэта 15 суткамі адміністрацыйнага арышту.

**21.12.2021** 20 снежня 2021 году пракурор Віцебскай вобласці Ігар Украінец вынес пастанову аб абмежаванні доступу да інтэрнэт-сайту «Віцебскі Кур'ер news». На думку пракурора, у шэрагу матэрыялаў, размешчаных на сайце, меліся прамыя парушэнні законаў Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» і «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму». Гэта апошні недзяржаўны электронны рэсурс у Віцебскім рэгіёне, які быў бесперашкодна даступны беларускім чытачам.

У пракурорскай пастанове падаюцца фактычныя матэрыялы, якія нібыта ганьбяць дзелавую рэпутацыю і дыскрэдытуюць дзяржаўныя органы і службовых асобаў. Таксама пракурор знайшоў у шэрагу артыкулаў забароненыя звесткі, «патэнцыйна здольныя нанесці фатальную шкоду нацыянальным інтарэсам беларускай дзяржавы».

Як лічаць у пракуратуры, большасць матэрыялаў «Віцебскага Кур'ера news» правакавала грамадзян да экстрэмісцкіх паводзінаў. У асобных артыкулах пракурор Ігар Украінец выявіў шматлікія няпэўныя дадзеныя аб прыняцці службовымі асобамі дзяржорганаў незаконных актаў, утрыманне якіх масава парушалі канстытуцыйныя правы грамадзян.

На думку абласнога пракурора, у «Віцебскім Кур’еры news» прысутнічалі паведамленні, у якіх сцвярджалася, што суды сістэматычна, у закрытых судовых працэсах, выносілі для ўдзельнікаў пратэстаў незаконныя прысуды. Гэта, маўляў, укараняла ў свядомасці жыхароў краіны негатыўнае ўспрыманне работнікаў міліцыі, следчых, пракурораў, суддзяў і іншых дзяржаўных службоўцаў, узмацняла недавер да прыманых імі рашэнняў, падахвочвала грамадзян да супрацьпраўных дзеянняў.

Дадатковым чыннікам прынятай пастановы пракурор назваў шэраг артыкулаў, у якіх мелася інфармацыя, прызнаная беларускімі судамі як экстрэмісцкая.

Цяпер пастанова пракурора Віцебскай вобласці Украінца выкананая, і доступ да сайту «Віцебскі Кур’ер news» абмежаваны для жыхароў Беларусі.

**21.12.2021** 21 снежня праваабарончая супольнасць заявіла аб прызнанні шасці палітвязняў. Сярод іх – 24-гадовая жыхарка Віцебску Таццяна Карповіч. Улады інкрымінуюць ёй распальванне сацыяльнай варожасці (арт. 130 КК). Дзяўчына знаходзіцца ў менскім СІЗА-1 на Валадарцы. Палітвязнямі таксама прызнаныя Рыгор Кастусёў, Сяргей Петрушэнка, Андрэй Гарун, Руслан Кузьміч, Андрэй Аўсіевіч.

24-гадовая Таццяна Карповіч была затрыманая ў Менску 17 лістапада 2021 году. Ёй выставілі абвінавачанне паводле арт. 130 КК («Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці»). Нібыта – за перадачу дадзеных супрацоўнікаў МУС, настаўнікаў, суддзяў у тэлеграм-канал «Чорная кніга Беларусі». Таццяну Карповіч утрымліваюць у СІЗА-1 на Валадарцы.

Праваабаронцы адзначаюць у заяве, што крымінальная адказнасць за распальванне іншай сацыяльнай варожасці ўжываецца следствам і судамі селектыўна і дыскрымінацыйна – выключна дзеля абароны інстытутаў улады.

Праваабаронцы лічаць, што вылучэнне прадстаўнікоў улады, супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, вайскоўцаў і г.д. у якасці сацыяльных груп, якія падпадаюць пад абарону ў кантэксце арт. 130 КК, – неабгрунтаванае.

Праваабарончая супольнасць патрабуе перагледзець прынятыя ў дачыненні палітвязняў Сяргея Петрушэнкі, Андрэя Гаруна, Таццяны Карповіч, Руслана Кузьміча, Рыгора Кастусёва і Андрэя Аўсіевіча меры і працэсуальныя рашэнні, неадкладна вызваліць усіх палітычных зняволеных і спыніць палітычныя рэпрэсіі супраць грамадзянаў краіны.

Па стане на 21 снежня ў Беларусі былі прызнаныя палітвязнямі 933 чалавекі.

**23.12.2021** 5 кастрычніка 2021 году суд Чыгуначнага раёну Віцебску асудзіў Аляксандра Мацеюка да 9 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі па ч. 3 арт. 328 і арт. 332 КК са штрафам – за незаконныя з мэтай збыту набыццё, захоўванне і перавозку марыхуаны ў буйным памеры і ўтрыманні прытона, для ўжывання наркатычных сродкаў. Гэтым жа прыгаворам асудзілі і Алега Баразну – да 2 гадоў і 3 месяцаў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі за незаконныя дзеянні ў адносінах да наркатычных сродкаў без мэты збыту.

Аляксандр Мацяюк і Алег Баразна – актывісты ініцыятывы «Краіна для жыцця». Паводле праваабаронцаў, памяшканне, якое належыць Мацеюку, знаходзілася пад аператыўным наглядам у сувязі з грамадскай дзейнасцю абвінавачаных, і аператыўнікі мелі магчымасць весці відэа- і аўдыёзапіс таго, што адбываецца ў памяшканні. У адсутнасць уладальніка памяшкання супрацоўнікі МУС таемна пранікалі ў гэтае памяшканне і рабілі маніпуляцыі з рэчывам, захоўванне якога інкрымінавалі Мацеюку.

Дзяржаўным абвінавачаннем не было пададзена дастатковых доказаў у пацвярджэнне выстаўленых абвінавачанняў, не зняпраўджаныя пярэчанні абароны, а судом – пры ацэнцы доказаў – не ліквідаваныя супярэчнасці паміж імі. Пры гэтым перавага была аддадзеная версіі абвінавачання, поўнай дапушчэнняў, загадак і здагадак.

Аб'ектыўна ўстаноўленыя абставіны не супярэчаць версіі абароны.

Такім чынам, у дачыненні Аляксандра Мацеюка абвінавачанне ў збыце наркотыкаў не даказаная.

У дачыненні абвінавачанага Алега Баразны дзеянні з наркотыкамі, за выключэннем знойдзеных і канфіскаваных у яго 0,0057 г марыхуаны, не даказаныя. А пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, прызначанае пры такіх абставінах, з’яўляецца празмерна жорсткім.

Прааналізаваўшы ўсе абставіны ў справе віцебскіх актывістаў, праваабаронцы прызналі Аляксандра Мацеюка і Алега Баразну палітвязнямі і патрабуюць перагледзець прысуд, улічваючы права асуджаных на справядлівы судовы разбор.

**24.12.2021** З 8 па 15 снежня рашэннямі судоў Віцебску і Віцебскай вобласці былі залічаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх 4 тэлеграм-рэсурсы, 2 каналы відэахостынгу «Youtube» і адна старонка ў сацсетцы «ВКонтатце» . Пры гэтым суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэнняў можа нанесці значную шкоду дзяржаве або зрабіць немагчымым самое іх выкананне.

Так, 8 снежня суд Расонскага раёну Віцебскай вобласці прызнаў «экстрэмісцкім» тэлеграм-канал «Вызваленне Беларусі», суд жа Гарадоцкага раёну Віцебскай вобласці 9 снежня прыняў такое ж рашэнне ў дачыненні тэлеграм-чату «Гарадок Для Жыцця Чат (Віцебская вобласць)».

У Міжнародны дзень абароны правоў чалавека, 10 снежня, суд Першамайскага раёну Віцебску прызнаў «экстрэмісцкай» старонку суполкі сацыяльнай сеткі «ВКонтатце» з назвай «Стоп таракан (лукашэнка)».

14 снежня падобнае рашэнне прыняў суд Чыгуначнага раёну Віцебску ў дачыненні тэлеграм-групы «Віцебск для жыцця» і групы з назвай «vul. Haharyna». І 15 снежня – для каналаў «Youtube» з назвамі «samakrutkin» і «S@m@!KRUT!kin».

Неабходна адзначыць, што ва ўсіх выпадках ініцыятыва падачы заяваў у суды аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкімі матэрыяламі сыходзіла ад кіраўніцтва 7 упраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗІКа МУС Рэспублікі Беларусь.

**24.12.2021** Жыхар Полацку Анатоль Каханчык, асуджаны 21 снежня на 25 сутак арышту за расфарбоўку сваёй хаты ў бел-чырвона-белыя колеры (арт. 24.23 КаАП), трапіў у шпіталь. Пра гэта паведамілі праваабаронцы «Вясны». Паводле іх звестак, Каханчык пасля абвяшчэння прысуду абвясціў сухую галадоўку. Праз некалькі дзён галадоўкі яму стала кепска, ён трапіў у лякарню.

Праваабаронцы паведамілі, што Анатоля Каханчыка пасля суду перавялі адбываць пакаранне з Полацку ў Віцебск. Каханчык, як і папярэджваў, трымаў сухую галадоўку. Але праз гэта пагоршыўся стан ягонага здароўя – пачаліся сутаргі, рвота, моцна павысіўся ціск. Зараз ён знаходзіцца ў шпіталі ў Віцебску і збіраецца спыніць галадоўку.

Анатоль Каханчык быў затрыманы 20 снежня, калі сам пайшоў у аддзяленне міліцыі па позве. Раней Каханчыку пагражалі крымінальнай справай, калі ён не перафарбуе БЧБ-хату ў нейтральныя колеры.

У 2020 годзе Анатоль Каханчык пафарбаваў бацькоўскую хату ў вёсцы Алёшча Полацкага раёну ў нацыянальныя колеры: намаляваў на сценах дзве белыя і чырвоную палосы, а ў акне павесіў Пагоню.

За такую расфарбоўку ў лютым 2021 году Каханчыка прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці (на той момант – арт. 23.34 КаАП) і асудзілі на 7 сутак. У лістападзе яго зноў судзілі і прызналі вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкай інфармацыі (арт. 19.11 КаАП) – пакаралі за гэта 15 суткамі адміністрацыйнага арышту.

**26.12.2021** 22 снежня расейскі праваабарончы цэнтр «Мемарыял» уключыў у спіс палітвязняў віцяблянку Яну Пінчук. На думку праваабаронцаў, крымінальны перслед у дачыненні яе звязаны выключна з яе палітычнымі перакананнямі і рэалізацыяй права на свабоду выказвання меркавання, а крымінальная справа супраць яе – палітычна матываваная. Нягледзячы на гэта, расейскія ўлады збіраюцца экстрадаваць дзяўчыну ў Беларусь.

Расейскія праваабаронцы зважаюць на тое, што пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў жніўні 2020 году беларускія ўлады разгарнулі ў краіне масавыя рэпрэсіі супраць нязгодных, і працэдуры крымінальнага пераследу ўдзельнікаў мірных пратэстаў не адпавядаюць мінімальным стандартам справядлівага суду і захоўвання правоў чалавека.

Віцебскія следчыя абвінавачваюць Яну Пінчук ў распальванні варожасці да супрацоўнікаў міліцыі і экстрэмізме праз тое, што яна падчас пратэстаў нібыта адміністравала апазіцыйны тэлеграм-канал.

Вывучыўшы даступныя матэрыялы крымінальнай справы, «Мемарыял» прыйшоў да высновы, што пераслед Пінчук палітычна матываваны і неправамерны.

«Матэрыялы справы не ўтрымліваюць інфармацыі аб канкрэтных падставах для абвінавачання, у іх адсутнічаюць доказы падбухторвання да незаконных дзеянняў у тэлеграм-канале, а сама Пінчук сцвярджае, што перастала быць адміністратарам каналу яшчэ да яго абвяшчэння экстрэмісцкім», – гаворыцца ў заяве праваабаронцаў аб прызнанні віцяблянкі палітзняволенай.

«Мемарыял» не мае падставаў чакаць, што беларускія ўлады забяспечаць абарону правоў Яны ў выпадку яе экстрадыцыі. А таму ўпэўненыя, што Расея павінна адмовіць у яе экстрадыцыі ў Беларусь і надаць ёй статус уцекача.

«Мы патрабуем неадкладна вызваліць Яну Пінчук з-пад варты. Мы патрабуем ад расейскіх уладаў выконваць свае міжнародныя абавязкі ў рамках Канвенцыі аб статусе ўцекачоў 1951 году: запыт аб экстрадыцыі Пінчук у Беларусь мусіць быць адхілены, ёй павінен быць дадзены часовы прытулак», – запатрабавалі ад расейскіх уладаў праваабаронцы «Мемарыялу».

**27.12.2021** 24 снежня каля «сіняга дому» ў Віцебску ў чарговы раз быў затрыманы апазіцыянер Барыс Хамайда. Як перадае Беларускае Радыё Рацыя, Хамайда правёў у міліцэйскім пастарунку тры гадзіны. Пратакол на яго не складалі, але забралі беларускамоўныя кнігі і выданні, якія ён распаўсюджвае ў цэнтры гораду. Хамайда падлічыў, што ў Чыгуначным РАУС Віцебску ляжаць ужо 25 кніжак, адабраных у яго падчас затрыманняў.

Барыс Хамайда расказаў выданню, што міліцыянты затрымлівалі яго «па падазрэнні ў несанкцыянаваным пікетаванні».

«Калі мяне забіралі, я спытаў: «Пратакол складаць будзеце?» Міліцыянт сказаў: «Буду!» Але ў пастарунку пратакол не складалі, проста забралі 12 кніг, перапісалі іх, апячаталі… А гэта ж звычайныя беларускія кнігі, афіцыйна выдадзеныя. Там няма за што зачапіцца, звычайныя беларускія кнігі!» – распавёў Барыс Хамайда.



Месяц таму ў Барыса Хамайды ўжо забіралі кнігі, якія ён бясплатна прапаноўваў гараджанам. Тады было канфіскавана 13 кніг, і апазіцыянер ужо атрымаў паведамленне з міліцыі, што распачынаць супраць яго адміністрацыйную справу не будуць – няма падстаў. Але кнігі дагэтуль не вярнулі.

Цяпер у аддзеле міліцыі Чыгуначнага раёну Віцебску ўжо 25 ягоных кніжак, падлічыў Барыс Хамайда. Што да падазрэнняў у несанкцыянаваным пікетаванні, то яны таксама беспадстаўныя. На працягу апошняга году ў спадара Хамайды міліцыянты забралі ўсё, што толькі магло б быць атрыбутам пікета: бел-чырвона-белы парасон, стужкі, вышытую чырвоным на белай палатніне малітву «Ойча наш», паштоўкі… Засталася ў яго толькі стужка з беларускім арнаментам, але і тая выклікала падазрэнні ў міліцыянтаў.

**27.12.2021** У лістападзе 2021 году праваабаронца Наталля Міхалькова накіравала зварот у пракуратуру Віцебскай вобласці з патрабаваннем правесці праверку па факце парушэння кіраўніцтвам і супрацоўнікамі папраўчай калоніі №3 (пас. Віцьба, Віцебская вобласць) правоў Валадара Цурпанава. Аднак пракуратура і ўпраўленне дэпартаменту выканання пакаранняў МУС адмовілася рабіць захады для абароны правоў палітвязня.

У сваім звароце праваабаронца Наталля Міхалькова звярнула ўвагу пракуратуры Віцебскай вобласці на паведамленні ў СМІ, паводле якіх палітвязню не перадалі лісты і бандэроль з лекамі, медычныя маскі і цёплае адзенне. Адміністрацыя калоніі неабгрунтавана пазбавіла палітзняволенага Валадара Цурпанава доўгатэрміновых спатканняў, з сям'ёй ён можа звязацца толькі па тэлефоне.

На думку Міхальковай, жорсткае і бесчалавечнае стаўленне да Цурпанава – гэта рэакцыя кіраўніцтва калоніі на адмову палітвязня падпісаць заяву аб памілаванні.

Пракуратура не стала разбірацца па сутнасці заяўленых парушэнняў і пераслала зварот праваабаронцы ва ўпраўленне ДВП МУС РБ па Віцебскай вобласці. Адтуль паведамілі, што разбірацца з ціскам, які чыняць на Цурпанава ў калоніі, не будуць, бо праваабаронца «не падала дакументаў, якія пацвярджаюць яе права прадстаўляць інтарэсы Цурпанава».

Праваабаронца не згодная з бяздзейнасцю службовых асобаў пракуратуры і ДВП у сувязі з парушэннямі правоў зняволенага і будзе дамагацца абароны і аднаўлення парушаных правоў усімі законнымі спосабамі.

Валадар (Уладзімір) Цурпанаў - актывіст і праваабаронца з Магілёву. 24 снежня 2020 году яго асудзілі на тры гады абмежавання волі за абразу суддзі (арт. 391 КК). Але ўжо ў сакавіку палітвязня перавялі ў СІЗА і выставілі абвінавачанне паводле арт. 415 КК («Ухіленне ад адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі»). У выніку яго прызналі вінаватым і асудзілі на 2 гады калоніі агульнага рэжыму, якія адбывае ў калоніі Віцьба-3 пад Віцебскам.

**30.12.2021** 29 снежня суд Чыгуначнага раёну Гомля прызнаў экстрэмісцкімі матэрыялы тэлеграм-канала «Вясна / Правы чалавека ў Беларусі». Праваабаронцы сачылі за вялікай колькасцю справаў і працэсаў, іх валанцёры заўсёды былі надзейнай крыніцай інфармацыі. Дык што цяпер – «Вясна» ўсё? Пра гэта піша «Наша ніва».

Юрыст «Вясны» Павел Сапелка перад судом даў выданню кароткі каментар.

«Дакладна мы даведаемся, якія нашы сродкі камунікацыі з аўдыторыяй прызнаныя экстрэмісцкімі, калі будуць унесеныя змены ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Але, спадзяюся, прызнанне нашай прадукцыі экстрэмісцкай не нашкодзіць валанцёрам і нашай працы. Бо валанцёры не займаюцца вырабам інфармацыйнай прадукцыі. Ну і будзем мяняць фармат назірання. Насамрэч, гэта ўжо мяняецца.

Зразумела, што гэтая гісторыя з боку дзяржавы была заўсёды: закрывалі раты адвакатам, закрывалі раты СМІ. Я памятаю часы, калі я сам працаваў адвакатам: суд не так хвалявала, што ты скажаш на працэсе, колькі хвалявала тое, што ты скажаш пасля працэсу ў СМІ. Пасля яны пайшлі яшчэ далей, пачалі думаць, што будзе сказана на працэсе, бо прыйдуць журналісты і рэтранслююць гэта.

Але дзейнасць мы не спынім, «Вясна» будзе вечна, — пасміхаецца Сапелка. — Пакуль няма прадумоваў для закрыцця.

За апошні час мы не страцілі ніводнага накірунку дзейнасці, нават нягледзячы на тое, што частка з’ехала, частка засталася. Яшчэ калі пачаўся кавід, мы пачалі праяўляць гнуткасць, пачынаць працаваць па-новаму».

**31.12.2021** 27 снежня праваабарончыя арганізацыі Беларусі заявілі аб прызнанні васьмі чалавек палітвязнямі. Сярод іх - віцяблянін Аляксандр Васін, асуджаны на 1 год і 6 месяцаў абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу за абразу супрацоўніка міліцыі. Цяпер ён адбывае пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу №55, якая знаходзіцца ў Менску.

Паводле абвінавачання, 15 мая 2020 года Аляксандр Васін у «Аднакласніках» змясціў пад публікацыяй з фотаздымкамі супрацоўніка міліцыі ў форменным абмундзіраванні абразлівы каментар. У судовым паседжанні віну Аляксандр прызнаў цалкам і раскаяўся ў зробленым. Ён матываваў свой учынак тым, што здзейсніў яго пасля прачытання негатыўных каментароў да дадзенай публікацыі.

3 жніўня ў судзе Першамайскага раёну гораду Віцебску паводле арт. 369 КК яго прызналі вінаватым. Суддзя Міхаіл Юрчанка прысудзіў яго да аднаго года і шасці месяцаў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ («хімія»).

Аляксандр Васін выплаціў пацярпеламу працаўніку міліцыі матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 800 рублёў.

Выдадзена праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
У выданьні выкарстоўваюцца матэрыялы, апубліка-
ваныя сайтамvitebskspring.org і іншымі інтэрнэт-
рэсурсамі.
*Для вольнага распаўсюду*